БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

4

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ АКАДЭМІІ НАВУК
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

у 6 тамах

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1994

ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ АКАДЭМІІ НАВУК
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

ТОМ 4

ЛАЗАРУК — ПЕРКІН

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1994

ББК 91.09:83.3Бел
Б 43
УДК 012(476)+016:882.6(092)+882.6(092)

Пад рэдакцыяй
доктара філалагічных навук,
прафесара А. В. МАЛЬДЗІСА

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

І. Э. БАГДАНОВІЧ, А. Л. ВЕРАБЕЙ, П. К. ДЗЮБАЙЛА, В. А. КАВАЛЕНКА, Я. В. МАЛАШЭВІЧ, А. В. МАЛЬДЗІС, У. І. МАРХЕЛЬ, І. Я. НАВУМЕНКА, Л. С. САВІК, С. П. САМУЭЛЬ, Б. І. САЧАНКА, В. С. СЕМЕНЯКОЎ, В. У. СКАЛАБАН, І. П. ХАЎРАТОВІЧ, І. П. ШАМЯКІН.

This edition is a table reference book for all those who have an interest and concern in the Byelorussian culture. The book comprises more than 1100 articles containing full, manysided and systematized information on the Byelorussian literature representatives who created their works in Old Slavonic, Byelorussian, Russian, Latin, Polish and other literary languages of Belarus. The bibliographic references represent more than 600 thousand various publications.

0160000000—016
Б ——————— 30—94
М 318(03)—94

ISBN 5-85700-153-6 (Т. 4)
ISBN 5-85700-060-2

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1994

Л

ЛАЗАРУК МІХАСЬ

Лазарук Міхаіл Арсеньевіч (н. 5.7.1926, в. Ушаловічы Слуцкага р-на Мінскай вобл.), крытык, літаратуразнавец, педагог. Доктар філалагічных навук (1970), прафесар (1971). Акадэмік АПН СССР (1982, член-карэспандэнт, 1978). Член СП Беларусі з 1972.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька родам з-пад Брэста. Зямлі сваёй не меў, рэвалюцыю сустрэў прыхільна. У час грамадзянскай вайны служыў у Чырвонай Арміі. У 1929 разам з сялянамі суседніх вёсак арганізаваў калгас, дзе працаваў да апошняга дня (1966). Маці памерла у 1935. У 1933—40 М. Лазарук вучыўся ў пачатковай, затым сярэдняй школе. У 1940 ён паступіў у Мінскі дарожна-механічны тэхнікум, але правучыўся там адзін год. Пачалася вайна і 15-гадовы юнак вярнуўся ў родную вёску. Да 1944 жыў у доме бацькоў, дапамагаў у гаспадарцы. Пасля вызвалення Беларусі (1944) мабілізаваны ў Чырвоную Армію і дайшоў да Берліна. Пасля Перамогі некаторы час служыў у Савецкіх войсках у Германіі. У 1946 дэмабілізаваўся. У 1947 паступіў на падрыхтоўчыя курсы пры Мінскім педінстытуце імя М. Горкага. Экстэрнам здаў экзамены за сярэднюю школу і паступіў на філалагічны факультэт педінстытута, які скончыў у 1951. Потым вучыўся ў аспірантуры па спецыяльнасці беларуская літаратура. У 1954 абараніў кандыдацкую дысертацыю і стаў выкладчыкам беларускай літаратуры ў Мінскім педінстытуце. У 1959—60 па камандзіроўцы Міністэрства вышэйшай адукацыі выязджаў у Польскую Народную Рэспубліку, працаваў там на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. З 1968 дэкан філфака Мінскага педінстытута, адначасова выконваў абавязкі загадчыка кафедры беларускай літаратуры. У 1970 абараніў доктарскую дысертацыю і прызначаны прарэктарам па вучэбнай рабоце педінстытута. З 1978 — дырэктар навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР. З 1990 загадчык лабараторыі праблем літаратурнай адукацыі гэтага ж інстытута. Быў дэпутатам Мінскага гарсавета, Фрунзенскага райсавета, старшынёй Педагагічнага таварыства БССР, членам Прэзідыума АПН СССР. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Друкавацца пачаў з 1949. Спачатку пісаў вершы, потым захапіўся тэорыяй літаратуры, крытыкай. Выкладчыцкую дзейнасць ён увесь час спалучае з навукова-даследчыцкай і літаратурна-крытычнай. Выступае ў друку з артыкуламі і рэцэнзіямі, даючы аб'ектыўныя ацэнкі надзённым здабыткам беларускай літаратуры. Пісаў пра паэзію П. Панчанкі — з гэтай работы яго ўвагу займае пераважна паэзія. Аўтар даследаванняў пра беларускую паэму («Станаўленне беларускай паэмы», «Беларуская паэма ў другой палавіне XIX — пачатку XX стагоддзя»). Уласны паэтычны вопыт, добрае веданне тэорыі літаратуры, шырокі гістарычны погляд на літаратурныя з'явы далі яму магчымасць не толькі паказаць, як зараджаўся ў беларускай літаратуры жанр паэмы, якія гістарыч-

ныя этапы прайшоў гэты жанр і якімі сувязямі ён звязаны з паэзіяй братніх народаў, але і пранікнуць у жывую душу паэзіі, паказаць яе зменлівы твар. Даследаванне агульных эстэтычна-стылёвых тэндэнцый беларускай літаратуры, распрацоўка тэарэтычных пытанняў, жанравых асаблівасцей беларускай паэзіі сталі тым грунтам, на якім нарадзіліся падручнікі для студэнтаў-філолагаў («Уводзіны ў літаратуразнаўства», з А. Ленсу), вучняў сярэдніх школ («Тэорыя літаратуры», «Беларуская літаратура», з В. Івашыным). М. Лазарук з'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў па пытаннях беларускай літаратуры, ім выдадзены зборнік літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў («Часу непадуладнае»). Сумесна з А. Ленсу ім складзены слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў.

Жыве ў Мінску. *Л. С. Савік.*

Бібліяграфія

1.2.

Поэзия Пимена Панченки: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1954.

Пімен Панчанка: Літаратурна-крытычны нарыс. Мн., 1959. Рэц.: Грынчык М. Пра паэта-сучасніка // ЛіМ. 1960. 26 сак.

Пытанні тэорыі літаратуры. Мн., 1964 / Сааўт. А. Ленсу. Рэц.: Дзюбайла П. Прастата і спрошчанасць // ЛіМ. 1965. 5 студз.; Мітраховіч С. Дапаможнік па тэорыі літаратуры // Наст. газ. 1965. 9 чэрв.

Тэорыя літаратуры ў школе: Дапаможнік для вучняў сярэд. школы. Мн., 1967. Рэц.: Разанаў І. Тэорыя літаратуры ў школе // Нар. асвета. 1968. № 7; Пякарскі А. Тэорыя літаратуры — школьнікам // ЛіМ. 1967. 24 кастр.; 2 выд. Мн., 1971. Рэц.: Мітраховіч С. І навукова, і даступна // Наст. газ. 1972. 5 студз.

Станаўленне беларускай паэмы: (Жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця бел. літаратуры ў першай палавіне XIX ст.). Мн., 1968. Рэц.: Жураўлёў В. Даследуецца беларуская паэма // Вяч. Мінск. 1970. 5 чэрв.; Коваленко В. Поэма — жанр ведущий // Вопр. литературы. 1971. № 4; Мальдзіс А. Ля вытокаў беларускай паэмы // ЛіМ. 1969. 14 студз.; Семяновіч А. Даследуецца беларуская паэма // Звязда. 1969. 25 студз.; Ярош М. Роздум над паэмай // Полымя. 1969. № 8.

Белорусская поэма в XIX — начале XX века: Становление жанра: Автореф. дис. ... д-ра филол. н. Мн., 1969.

Беларуская паэма ў другой палавіне XIX — пачатку XX стагоддзя. Мн., 1970. Рэц.: Жураўлёў В. Даследуецца беларуская паэма // Вяч. Мінск. 1970. 5 чэрв.; Коваленко В. Поэма — жанр ведущий // Вопр. литературы. 1971. № 4; Майсеенка А. Панарама беларускай паэмы // Маладосць. 1970. № 10; Семяновіч А. Працяг размовы // Звязда. 1970. 27 кастр.; Юрэвіч У. На мяжы эпохі // Полымя. 1971. № 2; Ярош М. Працяг размовы // ЛіМ. 1970. 17 ліп.

Уводзіны ў літаратуразнаўства: Для філал. фак. вышэйш. навуч. устаноў. Мн., 1970 / Сааўт. А. Ленсу; 2 выд., дапрац. і дап. Мн., 1982 / Сааўт. А. Ленсу. Рэц.: Бабишкин О. Становлення білоруської поеми // Жовтень. 1971. № 4; Бутэвіч А. Аб беларускай паэме // Беларусь. 1970. № 11; Каспрук А. Поема в сучасному літературознавстві // Рад. літ.-знавство. 1972. № 5; Ціханчук М. Доўгачаканы дапаможнік // Наст. газ. 1983. 14 мая.

Беларуская літаратура: Падручнік для 8-га кл. сярэд. школы. Мн., 1979 / Сааўт. В. Івашын. Рэц.: Гніламёдаў У. З веданнем справы // ЛіМ. 1980. 25 студз.; Шаўлоўская М., Мішчанчук М. Глыбока, доказна, зацікаўлена // Наст. газ. 1980. 27 лют.; 2 выд. Мн., 1980 / Сааўт. В. Івашын; 3 выд. Мн., 1981 / Сааўт. В. Івашын; 4 выд. Мн., 1982 / Сааўт. В. Івашын; 5 выд. Мн., 1984 / Сааўт. В. Івашын; 6 выд. Мн., 1986 / Сааўт. В. Івашын; 7 выд. Мн., 1988 / Сааўт. В. Івашын; 8 выд. Мн., 1990 / Сааўт. В. Івашын.

Часу непадуладнае: Літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы. Мн., 1981. Рэц.: Мішчанчук М. Назіранні даследчыка // Наст. газ. 1982. 9 кастр.

Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: Дапаможнік для настаўнікаў. Мн., 1983 / Сааўт. А. Ленсу. Рэц.: Крот М. Тым, каго вабіць мастацкае слова // Наст. газ. 1983. 16 ліст.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі. Мн., 1985 / У сааўт.

Изучение русской литературы во взаимосвязи с белорусской: Пособие для учителя. Мн., 1988 / У сааўт. з В. Івашыным, А. Ленсу.

1.3.

1949. Паэзія жыцця // ЛіМ. 28 мая.

1950. Мастак: Байка // ЛіМ. 1 крас.; Повесть о наших современниках // Сталин. молодежь. 9 июня; Интересная и полезная книга: Заметки читателя // Там жа. 11 авг.

1951. Ліса: Байка // Вожык. № 3; Квактуха: Байка // Там жа. № 10; Сучаснікам: [Верш] // Полымя. № 6; Лыска і воўк: [Байка] // Чырв. змена. 7 чэрв.; Мір будзе: [Верш] // Там жа. 8 вер.

1952. Сасна: [Байка] // На сонечных сцежках. Мн.; Сябру ў Мелітопаль: [Верш] // Беларусь. № 11; В ногу с жизнью: [Рэц. на кн.: Кірэенка К. Маякі. Мн., 1952] // Сталин. молодежь. 1 июля.

1953. Малады будаўнік; Сябру ў Мелітопаль: [Вершы] // На сонечных сцежках. Мн.; «В добрый час» // Сталин. молодежь. 5 авг.; Книга о драматургии К. Крапивы: [Рэц. на кн.: Усікаў Я. Драматургія Кандрата Крапівы. Мн., 1953] // Там жа. 18 окт.

1955. «Іранскі дзённік» Пімена Панчанкі // Полымя. № 7.

1956. Паэзія Пімена Панчанкі // Панчанка П. Выбр. тв. Мн.; Некаторыя асаблівасці паэтычнага майстэрства П. Панчанкі // Уч. зап. Мин. пед. ин-та. Вып. 6.

1957. Глубже освещать историю белорусской литературы // Сов. Бел. 25 янв. / Сааўт. М. Пятровіч; Першая кніга: [Рэц. на кн.: Навуменка І. Семнаццатай вясной. Мн., 1957] // Маладосць. № 11; Серьезный труд по истории белорусской литературы: [Рэц. на кн.: Барысенка В. Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX века. Мн., 1957] // Там жа. 2 авг.

1958. Адзін верш // Маладосць. № 1; Асаблівасці жанра // ЛіМ. 14 мая; Пошукі і знаходкі // Там жа. 28 чэрв.

1959. Творчасць П. Панчанкі перыяду Айчыннай вайны // Беларуская літаратура: Даследаванні і публікацыі. Мн. Вып. 2.

1961. Разглядаючы літаратурны працэс... // ЛіМ. 10 студз.

1962. Шлях народнага паэта: Да 80-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 2; Шляхі беларускай паэзіі // Маладосць. № 5; Упоравень з часам: [Рэц. на кн.: Лось Е. Палачанка. Мн., 1962] // Там жа. № 8.

1963. Гісторыка-літаратурнае значэнне паэмы «Энеіда навыварат» // Беларуская літаратура: Даследаванні. Мн. Вып. 5; Купалазнаўства ў апошнія два дзесяцігоддзі (1941—1962 гг.); Дакастрычніцкая лірыка Янкі Купалы: [Метадычныя рэкамендацыі] // Янка Купала: Семінарый. Мн.; Глыбока, пераканаўча: [Рэц. на кн.: Ивашин В. У истоков социалистического реализма. Мн., 1963] // ЛіМ. 13 вер.

1967. Паэма Я. Коласа «Сымон-музыка» // У сэрцы народным. Мн.

1968. Паэтычны вопыт Янкі Лучыны // Полымя. № 2; Праблемы тэорыі і сучасная проза: [Рэц. на кн.:

Дзюбайла П., Жураўлёў В., Лупераў М. Праблемы сучаснай беларускай прозы. Мн., 1967] // Там жа. № 6.

1970. Невычэрпная тэма: [Рэц. на кн.: У. І. Ленін і літаратура. Мн., 1970] // Звязда. 19 ліп.

1971. І з'явяцца новыя творы: Нататкі аб мастацкай Купаліяне // ЛіМ. 9 ліп.; У цеснай дружбе // Наст. газ. 2 кастр.; Мы и мир // Учит. газ. 30 нояб.

1972. «Частицей Родины себя я ощущаю»: (К 90-летию со дня рождения Янки Купалы) // Культура и жизнь. № 6; Заўсёды помніць... // Звязда. 21 ліст.; Без канікулаў // Наст. газ. 29 студз.

1973. «Роднай нівы я мільённая часціна...» // Народныя паэты Беларусі. Мн.; 2 выд. Мн., 1981; Воспитывать всей деятельностью вуза // Подготовка студентов к воспитательной работе в школе. Мн.; Снежань парадніў нас: [Рэц. на кн.: Панчанка П. Снежань. Мн., 1972] // Полымя. № 12; На пачатку стагоддзя: [Рэц. на кн.: Лойка А. Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя. Мн., 1972] // ЛіМ. 26 кастр.; Людзі высокай гатоўкі // Наст. газ. 14 лют.; Шчырая садружнасць // Там жа. 28 сак.; Кіраваць у пошук // Там жа. 11 ліп.; Служэнне людзям // Там жа. 25 жн.; Сувязям мацнець // Там жа. 5 снеж. / Сааўт. К. Аргеткіна.

1974. «І крыла дужэе ўзмах...»: [Рэц. на кн.: Лужанін М. Прага крыла. Мн., 1974] // ЛіМ. 22 снеж.; Дабрата і талент: [Рэц. на кн.: Лойка А. Шчырасць. Мн., 1973] // Наст. газ. 26 чэрв.; Першакурснік // Там жа. 18 снеж.

1975. Заглядваючы ў заўтра // Наст. газ. 30 жн.; Студэнт 70-х: які ён // Там жа. 8 кастр.; Педагогический всеобуч // Сов. Бел. 26 апр. / Сааўт. А. Грымаць; В сердце каждом отзовется... // Учит. газ. 17 апр.

1976. Главная служба жанра: Развитие современной белорусской поэмы // Коммунист Бел. № 6; Школа, літаратура, пісьменнік // Полымя. № 5; Аб вытоках і традыцыях — па-новаму: [Рэц. на кн.: Каваленка В. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Мн., 1975] // Наст. газ. 14 лют.; Дапамога інстытута // Там жа. 24 ліп.

1977. Куба — далёкая і блізкая: Нарыс // Полымя. № 2; Гістарызм як найважнейшы прынцып: [Рэц. на кн.: История белорусской советской литературы. Мн., 1977] // Там жа. № 11; Грамадзянская пазіцыя крытыка: [Рэц. на кн.: Усікаў Я. Грамадзянскае сумленне мастака. Мн., 1976] // Звязда. 26 кастр.; Паэма «Тарас на Парнасе» // Наст. газ. 6 крас.; Кафедра і выхаваўчы працэс // Там жа. 17 жн.

1978. Развіццё навукі аб літаратуры // Уводзіны ў літаратуразнаўства: Хрэстаматыя. Мн.; Гавана — сталіца фестывалю // Вясёлка. № 7; Прысяжны павераны праўды // Полымя. № 1; Пра беларускае вершаскладанне: [Рэц. на кн.: Ралько І. Вершаскладанне. Мн., 1977] // Там жа. № 11; Праз наяўнасць перспектывы // Наст. газ. 22 ліп. / Сааўт. А. Грымаць.

1979. Сельский учебно-производственный комбинат: опыт и проблемы // Подготовка старшеклассников к труду. Мн. / Сааўт. Ф. Івашчанка; Цэнтр педагагічнай думкі: НДІ педагогікі — 50 гадоў // Нар. асвета. № 10; На новай вышыні: [Рэц. на кн.: Навуменка І. Кніга адкрывае свет. Мн., 1978] // Полымя. № 8; Служыць школе // Наст. газ. 17 кастр.

1980. Навуковаму пошуку — дакладную кардынацыю // Наст. газ. 22 сак.; Компас исследователя // Учит. газ. 5 февр.

1981. Уводзіны; Пачатковы этап станаўлення новай беларускай літаратуры; Беларуская літаратура ў сярэдзіне XIX ст. // Гісторыя беларускай літаратуры XIX — пачатак XX ст. Мн.; Уводзіны // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры 1917—1940. Мн.

1982. Дзве паэмы // Энеіда навыварат; Тарас на Парнасе. Мн.; «Магіла льва» як філасофская паэма // Янка Купала і Якуб Колас. Мн.; В строю самых действенных творений // Агитатор. № 20; На новыя рубяжы // Наст. газ. 4 снеж.

1983. Педагагічная спадчына Якуба Коласа // Разам з народам. Мн.; Навучанне літаратуры як творчасць // Полымя. № 10; Творчы пошук: [Інтэрв'ю] / Зап. Н. Ваніна // Наст. газ. 16 крас.

1984. Сталенне вопыту: [Інтэрв'ю] / Зап. У. Наркевіч // Звязда. 29 сак.

1985. Уводзіны // Гісторыя беларускай літаратуры. Мн. / Сааўт. В. Чамярыцкі; На главном направлении // Патриотическое воспитание на уроках литературы и во внеклассной работе. М.; Патрабуецца творчасць // Звязда. 8 студз.; У арсенал асветнікаў // Наст. газ. 30 студз.

1.5.

На англійскую мову. «I feel I am part of my country dear...» // National Poets of Byelorussia. Mn., 1973; National Poets of Byelorussia Yanka Kupala and Yakub Kolas. Mn., 1981.

На нямецкую мову. Als Teil der Heimat fühl' ich mich...: Zur 90. Wiederkehr d. Geburtstags Janka Kupala // Kultur Leben. 1972. Nr. 6; Seine größte Leidenschaft war der Kampf: Zum 100. Geburtstag des belorussischen Volksdichters Janka Kupala // Presse der Sowjetunion. 1982. Nr. 13.

На французскую мову. «Je fais partie de ma patrie» // Poèts nationaux de la Biélorussie. Mn., 1973.

1.6.

Уводзіны ў літаратуразнаўства: Хрэстаматыя [Для філал. фак. ВНУ БССР]. Мн. 1978 / Скл. з М. Мішчанчуком, М. Шаўлоўскай. Рэд.; 2 выд., дапрац. і дап. Мн., 1991.

НИИ педагогики. Минск. Научно-исследовательский институт педагогики Белорусской ССР (1929—1979). Мн., 1979 / Рэд. з інш.

Гісторыя беларускай літаратуры. XIX — пачатак XX ст.: Падручнік для філал. фак. пед. ін-таў. Мн., 1981 / Рэд. з А. Семяновіч.

Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, 1941—1980: Падручнік для філал. фак. пед. ін-таў / Рэд. з А. Семяновіч.

Адзінства навучання і выхавання на ўроках літаратуры: Тэмат. зб. навук. прац. Мн., 1982 / Рэд.

Выкладанне беларускай мовы і літаратуры. Мн., 1983 / Рэд.

Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, 1941—1980: Падручнік для філал. фак. пед. ін-таў БССР. Мн., 1983 / Рэд. з А. Семяновіч.

Шляхі ўдасканалення літаратурнай адукацыі ў школе: Зб. навук. прац. Мн., 1983 / Рэд. з А. Ленсу.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі. Мн., 1985 / Рэд.

Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд. Мн., 1985 / Рэд. з А. Семяновіч.

Методыка аналізу літаратурнага твора ў школе: Зб. навук. прац. Мн., 1985 / Рэд.

Патриотическое воспитание на уроках литературы и во внеклассной работе. М., 1985 / Рэд.

Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Бойка У. Шлях да ісціны // Наст. газ. 1975. 22 ліст.; Кісялёў Г. Пошукі імя. Мн., 1978. С. 129—132; Падгайскі Л. Шчасце ў працы // Наст. газ. 1976. 3 ліп.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Пшыркоў Ю. Летапісец свайго народа. Мн., 1982. С. 116—118; Семяновіч А., Мішчанчук М. Нястомны працаўнік асветы // ЛіМ. 1976. 2 ліп.; Шкраба Р. Пра спецыфіку літаратуры // Полымя. 1984. № 5.

М. П. Барташэвіч.

ЛАМАН ПЁТР



Ламан Пётр Аляксандравіч (н. 11.7.1949, в. Маласельцы Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.), паэт, празаік, акцёр. Член СП Беларусі з 1983.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1966 скончыў Ярэміцкую сярэднюю школу, працаваў трактарыстам у калгасе імя Чарняхоўскага ў сваім раёне. У 1967 паступіў у тэатральна-мастацкі інстытут. Пасля яго заканчэння ў 1971 прыняты акцёрам у Беларускі тэатр імя Я. Коласа (Віцебск).

Першы верш надрукаваны ў 1970 у газеце «Чырвоная змена». Падборка вершаў «Споведзь агню» ўвайшла ў калектыўны зборнік «Нашчадкі». Вершы П. Ламана друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Беларусь», газеце «Літаратура і мастацтва», зборніках «Дзень паэзіі». Аўтар кніг вершаў «Зерне імгненняў», «Стары млын» і аповесцяў «Астравы». Творчасць П. Ламана суаднесена з уласным жыццёвым вопытам. Апяванне хараства роднай зямлі, спадзяванні, трывогі і клопат сучасніка, які адчувае сваю непарыўную сувязь з зямлёй, назіральнасць, уменне сказаць вобразна пра вядомае, адкрыць прыгожае ў звычайным, будзённым, псіхалагічная дакладнасць пачуццяў, выразнасць малюнка — такія асноўныя рысы яго паэзіі і прозы.

Жыве ў Віцебску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Зерне імгненняў: Вершы. Мн., 1983. Рэц.: Кавалёў С. Песня, якая плыве // ЛіМ. 1984. 20 ліп.; Навумчык С. У кожным імгненні — сэнс // Віцеб. рабочы. 1984. 21 сак.

Стары млын: Вершы. Мн., 1988.

Астравы: Аповесці. Мн., 1989.

1.3.

1970. Рабіны: [Верш] // Чырв. змена. 18 кастр.

1971. Ноч: [Верш] // Віцеб. рабочы. 4 снеж.; «...Як жа ты вырас...»; «Ты ведаеш, што столькі год жыву чаканнямі сустрэч...»: [Вершы] // Знамя юности. 12 марта.

1973. Айчына: [Верш] // Чырв. змена. 29 крас.; «Паласкала матуля...»; «Вяселле гуло на ўсю вёску...»; Падсечаны бор; Калыханка: [Вершы] // Там жа. 3 чэрв.

1974. «Паласкала матуля...»: [Верш] // Знамя юности. 18 апр.; Край мой крынічны: [Верш] // Там жа. 10 сент.; Смага: [Верш] // Чырв. змена. 21 ліп.

1975. Айчына: [Верш] // Дзень паэзіі — 75. Мн.; «Хацелася б пакласці...»; «Да паўдня гаравала маці...»; «Зрабіўшы ласку...»; «Вечна дзявочая постаць жыцця...»: [Вершы] // Маладосць. № 2.

1976. Яшчэ адна вясна; Вырай; «Ах, які цудоўны вечар!..»: [Вершы] // ЛіМ. 9 крас.

1977. «Ідуць камбайны...»; «Галубіная ноч...»; Сустрэча; «Вятрыскам скалануўшы сонны одум...»; «Мой сябрук, мой дарадчык...»: [Вершы] // Маладосць. № 3; Ідуць камбайны; Завіруха; Ачышчэнне: [Вершы] // Полымя. № 12.

1979. Высокі бераг; «Ручаямі вуліц і завулкаў...»; «Са змроку выплыў жураўліны клін...»; Прасёлак; «Складаюць апошнія копы...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 79. Мн.; Споведзь агню: [Цыкл вершаў] // Нашчадкі. Мн.; Музыка Фадзей: [Верш] // Віцеб. рабочы. 16 чэрв.; «Маленькая сенажаць...»: [Верш] // Там жа. 28 жн.; Айчына: [Верш] // Чырв. змена. 1 мая.

1980. «Зноў вясна празрыстым птахам...»; «Дрыготкі цуд пявучай цішыні...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 80. Мн.; Родны дом; «Над імшарай крычаць журавы...»: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 18 ліст.

1981. Стары млын; «Рэкі Радзімы цякуць у акіян...»; «Паласуй, навальніца...»; «Няхай палае чарнакрылы вецер...»: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 31 снеж.; «Паласкала матуля...»; Родны дом: [Вершы] // Чырв. змена. 9 кастр.

1982. Каложа: [Верш] // Дзень паэзіі — 82. Мн.; Белы дождж; «Шырэюць дарогі...»: [Вершы] // Чырв. змена. 11 снеж.

1983. Астравы: Аповесць // Маладосць. № 3. Рэц.: Клямята С. Паэтыка прыгажосці // Віцеб. рабочы. 1983. 10 ліст.; Далёкі бераг; «Мяцеліца змроку...»; «Дзед надламаную гольку...»; «Дагарае ночы зорны прысак...»: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 2 крас.; Гаючыя дарогі: [Верш] // Там жа. 22 ліст.; Купалле; «Курганы на Беларусі»; Браслаўшчына; «Абложны дождж»; «Рэчка... Цяпельца... Золак»; «Над галавой гайдаецца бяроза»: [Вершы] // ЛіМ. 27 мая.

1984. Стары млын: [Верш] // Дзень паэзіі — 84. Мн.

1985. Дажынкі; «Цёплыя далоні...»: [Вершы] // Беларусь. № 4.

1.5.
На рускую мову. «Поезда покидают перроны...»: [Верш] / Пер. В. Липневич // Неман. 1980. № 9.
2.3.
На беларускай мове. [Біябібліяграфічная даведка] // Нашчадкі. Мн., 1979; Скрыган Я. Вашаю моваю лёгка тварыць характары // Скрыган Я. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1985. Т. 2.
На рускай мове. Тычина М. Притяжение реальности // Неман. 1984. № 8.

Я. А. Гарадніцкі.

ЛАПО ДЗМІТРЫЙ

Лапо Дзмітрый Еўдакімавіч (крыпт. Л-о; кастр. 1861, г. Беліца Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер у межах Гомеля — люты 1936, Краснаярск), пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік народніцкага рэвалюцыйнага руху. Пісаў на рускай мове.

Па бацькоўскай лініі паходзіў з мяшчан Беліцы (прадмесце Гомеля), па маці — з сялян. Рана страціў бацьку. Неўзабаве маці выйшла замуж за рабочага гомельскага цукровага завода, і сям'я пераехала ў Гомель. У гады вучобы ў Гомельскай прагімназіі Д. Лапо зблізіўся з рэвалюцыйна настроенай моладдзю. З 3-га класа быў удзельнікам тайных гурткоў самаразвіцця, прапагандаваў антыўрадавыя ідэі сярод рабочых. З 1879 ён вучыўся ў Кіеўскай гімназіі, вылучаўся сярод навучэнцаў актыўнасцю і сталасцю. Нейкі час быў старшынёй аб'яднанага камітэта рэвалюцыйных груп сярэдніх навучальных устаноў Кіева. Пасля заканчэння гімназіі паступіў на юрыдычны факультэт Кіеўскага універсітэта. Быў актыўным членам кіеўскай групы нарадавольцаў, уваходзіў у «тэхнічную» падгрупу, якая займалася справамі падпольнай друкарні. Прыязджаючы дамоў, вёў агітацыю сярод рабочых у Гомелі і ў вёсках. У 1885 арыштаваны ў Гомелі і сасланы ў Табольскую, потым у Енісейскую губерні. У ссылцы пачаў пісаць свае апавяданні з беларускага жыцця, дзе выкарыстаў уражанні дзяцінства і юнацтва.

Яго літаратурны дэбют адбыўся ў 1888 — апавяданнямі «Стукачка на р. Сожы» і «Патап і Цяроха» (пад крыпт. Л-о). Пасля заканчэння тэрміну ссылкі (1890) вярнуўся ў Гомель і ўключыўся ў работу па ўзнаўленні мясцовых нарадавольніцкіх арганізацый. У 1892 пасяліўся ў г. Чыстапалі Казанскай губ., займаўся там прыватнай адвакатурай, служыў сакратаром гарадской управы, выдаў кнігу па гісторыі Чыстапаля. У 1896 па ўласнай ініцыятыве пераехаў на жыццё ў Сібір, пасяліўся ў Краснаярску. Праз 2 гады вытрымаў экзамен на званне юрыста ў Казанскім універсітэце. У 1900 атрымаў месца міравога суддзі пры Краснаярскім акруговым судзе з адкамандзіраваннем у Мінусінск, дзе пражыў 3 гады. У 1903 вярнуўся ў Краснаярск, працаваў міравым суддзёй, членам, потым пракурорам акруговага суда. У Сібіры актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, быў гарадскім сакратаром і гласным думы ў Краснаярску. З 1898 супрацоўнічаў у многіх сібірскіх газетах, дзе пад псеўданімамі Кама, Кантыграў, Некарэспандэнт, Павел Ачкоў змяшчаў публіцыстычныя артыкулы і допісы. Як член, а потым старшыня вучылішчнай камісіі пры Краснаярскай гарадской управе шмат зрабіў для развіцця ў горадзе асветы, марыў аб увядзенні ў Краснаярску ўсеагульнай адукацыі. Займаўся педагагічнай дзейнасцю — выкладаў гісторыю і заканадаўства ў мясцовай гімназіі і гандлёвай школе. Па яго ініцыятыве быў адкрыты Марцьянаўскі дзіцячы прытулак. Узімку 1901—02 актыўна дапамагаў галадаючаму насельніцтву Мінусінскай акругі, быў членам камітэта Мінусінскага музея. Прымаў удзел у падзеях 1905 у Краснаярску. Належаў да буржуазна-ліберальнай партыі кадэтаў, прымыкаў да т. зв. «абласнікоў». Вывучаў побыт і норавы карэннага сібірскага насельніцтва, адстойваў яго правы, прапанаваў стварыць у Томскім універсітэце кафедры стэпавога права і цюрка-мангольскіх гаворак, адкрыць шлях качавым народам да асветы. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўключыўся ў культурнае будаўніцтва ў Сібіры, у 1923 склаў асноватворныя дакументы, якія вызначылі нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва народнасцей енісейскай Поўначы. Працу юрыста сумяшчаў з выкладчыцкай работай у Краснаярскім тэхнікуме. Захапляўся краязнаўствам, выступаў з дакладамі ў Сярэдне-Сібірскім аддзеле Рускага геаграфічнага таварыства (быў яго старэйшым членам), з лекцыямі ў рабочых клубах Краснаярска.

Асноўнае месца ў творчай спадчыне Д. Лапо займае зборнік «Беларускія апавяданні». Ва ўключаных у яго творах праўдзіва, з дэмакратычных пазіцый паказана цяжкае жыццё сялян Пасожжа («На канікулах», «Дурань парабак і мудры пан»), выкарыстаны гомельскія паданні («Легенда пра замак»), апісаны народныя заняткі, звычаі («Стукачка на р. Сожы», «Святы вечар»). Некаторыя сюжэты ўзяты з арыштанцкага побыту («Патап і Цяроха»). Д. Лапо пісаў на рускай мове, але як аўтар «Беларускіх апавяданняў», дзе шырока выкарыстаны беларускі фальклор, народная лексіка беларусіка, прычыніўся да мастацкага пазнання Беларусі, да развіцця яе літаратуры. *Г. В. Кісялёў.*

Бібліяграфія

1.2.
Белорусские рассказы. Казань, 1895.
Город Чистополь накануне реформы 17 июня 1870 г. Казань, 1897.
Общественное управление минусинских иногородцев. Томск, 1904.
Преступление и наказание по степовому праву Сибирских кочевых инородцев. Красноярск, 1905.

О введении всеобщего образования в Красноярске. [Красноярск], 1909.
1.3.

1888. Потап и Цероха: Рассказ // Северо-Западный календарь на 1888 г. М.; Стукачка на р. Соже: Рассказ // Мин. листок. № 63—66 / Пад крыпт. Л-о.
2.3.

На беларускай мове. П ш ы р к о ў Ю. Беларуская савецкая проза (20-я — пачатак 30-х гадоў). Мн., 1960. С. 10—11; Х р о м ч а н к а К. Беларуская мастацкая проза (канец XIX — пачатак XX ст.). Мн., 1979. С. 19—21.

На рускай мове. К у з н я е в а С. Судьба автора «Белорусских рассказов» // Неман. 1986. № 12.

М. П. Барташэвіч.

ЛАРЧАНКА МІХАСЬ

Ларчанка Міхась [Міхаіл Рыгоравіч; псеўд. М і х а с ь В і с а ж а р, М. Ч а б о р, М. С в я т л а н і н; крыпт. М. Л.; 1(14).11.1907, в. Хварасцяны Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Слаўгарадскі р-н Магілёўскай вобл.— 31.7.1981, Мінск; пахаваны на Паўночных могілках], літаратуразнавец, крытык. Член СП Беларусі з 1939. Доктар філалагічных навук (1956), прафесар (1957). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1971).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Азарыцкай пачатковай школе. Працягваць вучобу далей не мог з-за беднасці. Працаваў на гаспадарцы, з вялікім душэўным гарэннем аддаўся грамадскай працы. У 1922 стаў першым камсамольцам у сваёй вёсцы. У 17 гадоў паступіў у Княжыцкую школу сялянскай моладзі (Магілёўскі р-н), дзе многа чытаў, спрабаваў пісаць вершы, загадваў школьнай бібліятэкай, удзельнічаў у самадзейнасці. Скончыўшы школу, паступіў у Магілёўскі педтэхнікум. У 1929 з 2-га курса тэхнікума перайшоў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ. Свае вершы друкаваў у газетах «Чырвоная Беларусь», «Піянер Беларусі». У 1932 датэрмінова закончыў крытычна-творчую секцыю літфака Беларускага Вышэйшага педінстытута, арганізаванага на базе педфака БДУ. У 1932—35 вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР. У 1936 абараніў кандыдацкую дысертацыю «Лірыка Якуба Коласа». Працаваў у гэтым жа інстытуце старшым навуковым супрацоўнікам (1935—41), чытаў лекцыі ва універсітэце. Член КПСС з 1941. З першых дзён вайны ваяваў на Бранскім фронце. У 1942 цяжка паранены, у 1943 дэмабілізаваны і вярнуўся ва універсітэт, які ў час вайны знаходзіўся на ст. Сходня пад Масквой. З 1944 у Мінску. Працаваў загадчыкам кафедры беларускай літаратуры (1943—52, 1955—71), дэканам філфака (1944—52; адначасова быў навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР). Вучыўся ў дактарантуры Інстытута сусветнай літаратуры імя М. Горкага АН СССР (1952—55). Чытаў лекцыі па беларускай літаратуры ў Варшаўскім (1958) і Сафійскім (1960) універсітэтах.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Як паэт дэбютаваў у 1930, як крытык у 1932 (першы артыкул, прысвечаны Віцебскай філіі «Маладняка», надрукаваны ў газеце «Віцебскі пралетарый»). Апублікаваў каля 180 літаратуразнаўчых прац, артыкулаў і рэцэнзій. У манаграфіях «На шляхах да рэалізма» і «Па шляху рэалізма» даследаваў праблемы станаўлення і развіцця рэалізму ў беларускай літаратуры 19 — пачатку 20 ст. У даследаванні «Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў у другой палове XIX ст.», зборніках артыкулаў «Славянская супольнасць», «Яднанне братніх літаратур» аналізаваў гістарычныя карэнні ўзаемасувязей беларускай літаратуры з славянскімі літаратурамі. Займаўся пытаннямі старажытнай беларускай літаратуры і фальклору, традыцый і наватарства. Даследаваў творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, П. Панчанкі і інш. Складальнік хрэстаматыі для сярэдняй школы «Родная літаратура», адзін з аўтараў дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры», «Беларуская вуснапаэтычная творчасць», «Старажытная беларуская літаратура», «Беларуская народна-паэтычная творчасць».

М. Р. Міхайлаў.

1.2.

Творчасць Максіма Багдановіча: Стэнаграма публічнай лекцыі, прачытанай у г. Мінску. Мн., 1949.

А. М. Горкі і беларуская літаратура: Стэнаграма публічнай лекцыі, прачытанай у г. Мінску. Мн., 1951.

Гогалеўскія традыцыі ў беларускай літаратуры: Стэнаграма публічнай лекцыі, прачытанай у г. Мінску. Мн., 1952.

Становление и развитие реализма в белорусской литературе XIX века: Автореф. дис. ... д-ра филол. н. Мн., 1955.

На шляхах да рэалізма. Мн., 1958. Рэц.: Майхровіч С. Цікавае літаратуразнаўчае даследаванне // Звязда. 1959. 13 сак.; Макарэвіч А. Важная праблема літаратуразнаўства // ЛіМ. 1958. 23 ліп.; Усікаў Я. Каштоўнае даследаванне // Маг. праўда. 1959. 10 лют.; Яго ж. Новая літаратурная праца // Полымя. 1958. № 11; Цішчанка І. На шляхах да рэалізма // Беларусь. 1959. № 4.

Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў у другой палове XIX ст. Мн., 1958. Рэц.: Пётух А. Важная праблема і яе вырашэнне // ЛіМ. 1959. 21 сак.

Па шляху рэалізма: Развіццё рэалізма ў беларускай літаратуры дакастрычніцкай пары. Мн., 1959. Рэц.: Макарэвіч А. Працяг ранейшай тэмы // ЛіМ. 1960. 2 сак.

Славянская супольнасць. Мн., 1963. Рэц.: Александровіч С. Славянская супольнасць // ЛіМ. 1963. 17 вер.; Есакоў А. Літаратурная славянская супольнасць // Чырв. змена. 1964. 17 чэрв.

Старажытная беларуская літаратура: Вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў ВНУ. Мн., 1968 / Сааўт. П. Ахрыменка. Рэц.: Усікаў Я. Дапаможнік па літаратуры // Полымя. 1969. № 7; Яго ж. Для студэнтаў і настаўнікаў // Маг. праўда. 1969. 16 жн.

Яднанне братніх літаратур. Мн., 1974. Рэц.: Короткая Л. С позиций сегодняшнего дня // Неман. 1975. № 4; Хромчанка К. У сям'і славян // ЛіМ. 1974. 6 вер.; Яфімава М. Садружнасць літаратур // Беларусь. 1975. № 5; Rahojsza W. // Sl. Orient. 1977. Nr. 3.

Жывая спадчына. Мн., 1977. Рэц.: Жыгоцкі М. З увагай да спадчыны // Звязда. 1977. 16 чэрв.; Яго ж // ЛіМ. 1977. 29 крас.; Яго ж. Кніга пра спадчыну // Беларусь. 1978. № 1.

Літаратурнае пабрацімства славян: Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1984. Рэц.: Янаў В. // ЛіМ. 1984. 13 крас.

1.3.

1930. У спевах машын: [Верш] // Чырв. Бел. № 7/ Пад псеўд. М. Вісажар; У спевах Кастрычніка: [Верш] // Піянер Бел. 5 ліст. / Пад псеўд. М. Вісажар.

1931. Голас на пераклічцы: [Урывак з паэмы] // Чырв. змена. 26 лют. / Пад псеўд. Міхась Вісажар; У. Маякоўскаму: [Верш] // Там жа. 14 крас. / Пад псеўд. Міхась Вісажар; У рабселькораўскім маршы: [Верш] // Там жа. 23 кастр. / Пад псеўд. Міхась Вісажар.

1932. Літаратурны шлях віцебскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў // Віцеб. пралетарый. 7 сак.

1933. Пра творчую перабудову П. Глебкі // Полымя рэвалюцыі. № 10; Памылкі і недахопы т. Модэля // За пралет. н. 10 ліст.; Пра добрую кнігу паэзіі і дрэнны мастацкі пераклад // ЛіМ. 31 кастр.

1934. Пра драму «Вайна да пабеднага канца» Якуба Коласа // Драматургія. Мн.; Кніга рэвалюцыйнай пралетарскай паэзіі: [Рэц. на кн.: Гідаш А. Венгрыя спраўляе ўрачыстасць. Вершы. Мн., 1933] / Пад крыпт. М. Л.; Аўладаць мастацкім паказам рэчаіснасці: [Рэц. на кн.: Шаповалов М. Ян Рэндзя. Поэма-повесть. Мн., 1932] // Крытыка-бібл. зб. Мн.; Паэзія бальшавіцкай маладосці: [Рэц. на кн.: Ушакоў А. Праца і маладосць. Мн., 1933] // Крытыка-бібл. бюл. № 1—2; Першы камсамольскі літаратурны альманах // Там жа. № 6; Аб новым выданні «Новай зямлі» Коласа і прадмове паэта: [Рэц. на кн.: Колас Я. Новая зямля. 3 выд. Мн., 1934] // Там жа. № 7; Авалодаць мастацкім майстэрствам: [Рэц. на кн.: Шынклер Х. Запіскі інструктара Томана. Мн., 1934] // Там жа. № 8; Перамагчы творчыя недахопы: [Рэц. на кн.: Мікуліч Б. Дужасць. Мн., 1934] // Там жа. № 10; Праверыць якасць усваення новага беларускага правапіса // За пралет. н. 11 сак.; Пра нацдэмаўскае ахвосце на старонках «Полымя рэвалюцыі» // ЛіМ. 20 студз.; Пра паэзію ў «Полымі рэвалюцыі» // Там жа. 12 лют.; Першы вытап // Там жа. 16 лют.; Пра драму Я. Коласа «Вайна да пабеднага канца» // Там жа. 12 сак.; Аб перакладах паэтычных твораў // Там жа. 28 мая; За вывучэнне паэтычнай спецыфікі: [Рэц. на кн.: Александровіч А. Выбр. тв. Мн., 1934] // Там жа. 15 ліст.

1937. Памылкі, што мяжуюць са злачынствам // ЛіМ. 24 чэрв.; Шкодныя хрэстаматыі // Там жа. 23 вер.; Горький и белорусский народ // Рабочий. 18 июня; Обломовщина и бухаринско-троцкистская клевета на народы СССР // Там жа. 30 июня; Сатыра Пушкіна // Чырв. змена. 15 лют.

1938. Паэтычныя асаблівасці лірыкі Якуба Коласа // Полымя рэвалюцыі. № 1; Аб некаторых пытаннях падручніка па беларускай літаратуры // Звязда. 10 жн.; Аб рамане «Будучыня» Э. Самуйлёнка // Там жа. 30 жн.; Някрасаўскія матывы ў творчасці Я. Купалы і Я. Коласа // ЛіМ. 10 студз.; Да пытання аб гісторыі старажытнай і пачатку новай беларускай літаратуры // Там жа. 10, 16 лют.; Сталін у беларускай савецкай паэзіі // Там жа. 22 сак.; Горкі і беларуская літаратура // Там жа. 27 сак.; Тэма пралетарскага інтэрнацыяналізма ў беларускай савецкай паэзіі // Там жа. 1 мая; Аб паэме А. Куляшова «У зялёнай дуброве» // Там жа. 11 кастр.; Першыя помнікі новай беларускай літаратуры: («Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе») // Там жа. 23 кастр.; Маяковский детям // Сталин. молодежь. 20 июля.

1939. Новыя матэрыялы аб беларускай літаратуры XIX стагоддзя // Калоссе. № 3 / Сааўт. Л. Фіглоўская; Заходняя Беларусь у савецкай паэзіі // Звязда. 30 вер.; Сялянскае жыццё і вобразы паноў у творчасці Ф. Багушэвіча // ЛіМ. 9 лют.; Новыя матэрыялы аб беларускай літаратуры XIX стагоддзя / Сааўт. Л. Фіглоўская; Пад жыватворчым уплывам Шаўчэнкі // Там жа. 9 сак.: Паэмы вялікай мастацкай сілы: Пра «Новую зямлю» і «Сымона музыку» Я. Коласа // Там жа. 11 чэрв.; Творчасць Максіма Багдановіча // Там жа. 11 жн.; Аб новых ананімных паэмах беларускай літаратуры XIX стагоддзя: («Панская ласка» і «Васкрасенне Хрыстова») // Там жа. 21 вер.; Горький и культура белорусского народа // Сов. Бел. 24 июня.

1940. Творчасць М. А. Багдановіча // Багдановіч М. Выбр. тв. Мн.; Ф. К. Багушэвіч // Багушэвіч Ф. Выбр. тв. Мн.; Апавяданні Ядвігіна Ш. // Ядвігін Ш. Апавяданні. Мн.; Патрыятычная тэма ў творчасці Янкі Купалы // Полымя. № 7—8; Да 100-годдзя з дня нараджэння Ф. К. Багушэвіча // Звязда. 1 сак.; Асновапаложнік беларускай літаратуры: (Да 100-годдзя з дня нараджэння Ф. К. Багушэвіча) // Там жа. 22 сак.; На радзіме Ф. К. Багушэвіча // Чырв. змена. 1 сак.; Супроць пошласці // Там жа. 4 кастр.; Звязда. 26 вер.; Сатыра Я. Купалы // Там жа. 8 снеж.; Эстэтычныя погляды Ф. К. Багушэвіча // ЛіМ. 3 сак.; Сатыра і гумар Ф. Багушэвіча // Там жа. 23 сак.; Янка Купала // Піянер Бел. 8 снеж.; Мицкевич и белорусская литература // Сов. Бел. 26 нояб.; Горкі і беларуская літаратура // Чырв. змена. 18 чэрв.; Камсамольскі гарт юначы... // Там жа. 8 снеж.; На ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным 30-годдзю літаратурнай дзейнасці Я. Купалы // Там жа. 11 снеж.

1941. Цётка (Алаіза Пашкевіч) // Цётка. Выбр. тв. Мн.; [Рэц. на кн.: Бядуля З. Хлопчык з-пад Гродна. Мн., 1940] // Полымя. № 1; Творчасць Цёткі // Там жа. Мн., 1940] // Полымя. № 1; Творчасць Цёткі // Там жа. № 2; Францыск Скарына // Звязда. 11 студз.; Алаіза Цётка: (Да 25-годдзя з дня смерці) // Там жа. 5 лют.; Читайте эти стихи // Сталин. молодежь. 14 янв.; Пясняр народа // Чырв. змена. 23 сак.

1943. Душа народа // Сав. Бел. 26 чэрв.

1944. Вялікі асветнік // Беларусь. № 1; Гераічны эпас нашых дзён: [Рэц. на кн.: Танк М. Янук Сяліба. М., 1943] // Там жа. № 2; Паэзія любві і помсты: [Рэц. на кн.: Панчанка П. Дарога вайны. М., 1943] // Там жа. № 3; Песні помсты і гневу: [Рэц. на кн.: Машара М. Беларусі. Мн., 1944] // Там жа. № 6; Крылоў і беларуская літаратура // Звязда. 24 ліст.; Четверть века белорусской советской литературы // Лит. и искусство. 1 янв.

1945. Першы вялікі нацыянальны паэт // Беларусь. № 1; Пятрусь Броўка / Пад псеўд. М. Чабор; Першыя помнікі новай беларускай літаратуры: «Энеіда навыварат» // Там жа. № 2; Партызанская лірыка: [Рэц. на кн.: Астрэйка А. Крамлёўскія зоры. Мн., 1945] / Пад псеўд. М. Чабор; Першыя помнікі новай беларускай літаратуры: «Тарас на Парнасе» // Там жа. № 3; Вершы пра Айчынную вайну: [Рэц. на кн.: Лужанін М. Шырокае поле вайны. Мн., 1945] / Пад псеўд. М. Чабор; Творчасць Алеся Гаруна // Там жа. № 5; Паэма пра бяссмерце: [Рэц. на кн.: Куляшоў А. Прыгоды цымбал. Мн., 1945] / Пад псеўд. М. Чабор; Янка Купала — вялікі асветнік // Там жа. № 6; Аповесць пра народных мсціўцаў: [Рэц. на кн.: Гурскі І. Лясныя салдаты. Мн., 1945] // Там жа. № 7—8; Ранак ідзе: [Рэц. на кн.: Кірэенка К. Ранак ідзе. Мн., 1945] // Там жа. № 11—12; Апавяданні жыццёвай праўды / Пад псеўд. М. Святланін; Іван Андрэевіч Крылоў // Полымя. № 1; Апавяданні пра душу простага чалавека; У. У. Маякоўскі //Там жа. № 4; Патрыятычная тэма ў творах Янкі Купалы // Там жа. № 7—8; [Рэц. на кн.: Машара М. Выбраная лірыка. Мн., 1945] // Там жа. № 11—12; Народны паэт // ЛіМ. 1 чэрв.; Белорусская литература в Великую Отечественную войну // Сталин. молодежь. 2 сент.; Паэт-патрыёт // Чырв. звязда. 1 ліп.

1946. Апавяданні Ядвігіна Ш. // Ядвігін Ш. Апавяданні. Мн.; Лірыка Змітрака Бядулі // Беларусь. № 3; Мастацкая проза перыяду Вялікай Айчыннай вайны // Там жа. № 5—6 / Сааўт. У. Агіевіч; Змітрок Бядуля: (Да 60-годдзя з дня нараджэння) // Звязда. 23 крас.; Горький и белорусская литература // Сов. Бел. 16 июня.

1947. Максим Богданович: К 30-летию со дня смерти // Сов. Бел. 25 мая.

1948. Народны паэт: Да 6-й гадавіны з дня смерці Я. Купалы // За Радзіму. 29 чэрв.; Максім Горкі і беларуская літаратура // Зара. 2 крас.

1949. [Слова на пленуме ССПБ, прысвечаным пытанням крытыкі] // ЛіМ. 15 кастр.

1950. Заснавальнікі крытычнага рэалізму // Беларусь. № 5; Поэт-демократ // Известия АН БССР. № 3; Жыватворчы ўплыў // Звязда. 14 крас.; Паэзія шырокіх далягляда ў // ЛіМ. 20 мая; Аб паэме Максіма Лужаніна «Кладкі Градоўскага» // Там жа. 15 ліп.; Вялікі помнік літаратуры // Там жа. 16 снеж.

1951. Паэзія барацьбы за шчасце, за мір: [Рэц. на кн.: Панчанка П. За шчасце, за мір. Мн., 1950] // Беларусь. № 4; Янка Купала і беларуская паэзія // Там жа. № 6; Паэтычная творчасць Пімена Панчанкі // Полымя. № 7; З гісторыі руска-беларускіх літаратурных сувязей: «Слова аб палку Ігаравым» і беларуская літаратура // Уч. зап. БГУ [спецвыпуск да 30-годдзя ун-та]; Друг і настаўнік беларускіх пісьменнікаў // ЛіМ. 16 чэрв.; Горкі і беларускія пісьменнікі // Мін. праўда. 17 чэрв.

1952. Янка Купала і Максім Горкі // Беларусь. № 6; Н. В. Гоголь и белорусская литература // Известия АН БССР. № 2; Народны паэт Беларусі // Камуніст Бел. № 11; М. В. Гогаль і беларуская літаратура // Звязда. 22 лют.; Якуб Колас і руская класічная літаратура // Там жа. 13 ліст.; Класік беларускай літаратуры // Калг. праўда. 25 мая; Традыцыі вялікай рускай літаратуры ў творчасці Я. Купалы // Там жа. 5 ліп.; Гогалеўскія традыцыі ў беларускай літаратуры // Мін. праўда. 4 сак.; Народны паэт // Наст. газ. 10 ліп.; Горьковские мотивы в творчестве Янки Купалы // Сов. Бел. 4 июля.

1953. Ф. Богушевич // Богушевич Ф. Избранное / С бел. М.; Горкі і беларуская культура // Беларусь. № 3; Янка Купала і Тарас Шаўчэнка // Полымя. № 6; Максім Горкі і Янка Купала // Наст. газ. 2 крас.

1954. Зборнік вершаў Я. Аношкі: З архіўных матэрыялаў // ЛіМ. 17 ліп.; О литературной критике и литературоведении // Сов. Бел. 10 авг.

1955. Янка Купала і Тарас Шаўчэнка // Янка Купала. Мн.; Аб некаторых праблемах рэалізма ў творчасці Ф. Багушэвіча // Полымя. № 12.

1956. Літаратура першай палавіны XIX ст. (Уступ); Дунін-Марцінкевіч, Янка Лучына // Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Мн.; Некаторыя пытанні гісторыі беларускай літаратуры //ЛіМ. 17 ліст.

1957. Аб характары рэалізма ў фальклоры // Полымя. № 3; Неразрывные связи: (О русско-белорусском литературном единении во второй половине XIX века) // Сов. Отчизна. № 3; К вопросу о русско-белорусском литературном единении в 50—90 годах XIX в. // Уч. зап. БГУ. Серия филол. Вып. 39; Пачынальнік новай беларускай літаратуры // ЛіМ. 21 снеж.

1958. Да землякоў // За вярт. на Радзіму. № 98; Творчыя сувязі // ЛіМ. 30 жн.

1959. Па шляху сацыялістычнага рэалізма // ЛіМ. 14 студз.

1960. Братэрская дружба: Нататкі аб паездцы ў Польшчу // Голас Радзімы. № 32; Заснавальнік рэалізма // ЛіМ. 19 сак.; Слова ў спрэчках: Да пытання перыядызацыі гісторыі беларускай літаратуры // Там жа. 11 кастр.

1961. Великое творческое единение // Сов. Бел. 11 авг.

1962. Гордасць народа // Мін. праўда. 6 ліп.

1963. Пясняр яднання народаў // Полымя. № 6.

1964. Тарас Шаўчэнка і Янка Купала // Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура. Мн.; Віцеб. рабочы. 7 сак.; Яго магутны ўплыў // Наст. газ. 14 кастр.

1965. Заўвагі на палях (Пра некаторыя пытанні гісторыі беларускай савецкай літаратуры) // Полымя. № 7.

1966. Прадмова; Развіццё беларускай фальклярыстыкі / Сааўт. В. Бандарчык; Песні і частушкі савецкай эпохі / Сааўт. П. Ахрыменка; Заключэнне // Беларуская вуснапаэтычная творчасць. Мн. Рэц.: Цараноў Л. Творчасць народа // Беларусь. 1967. № 3; Шлях да мэты // Пра час і пра сябе. Мн.

1967. Праблема вывучэння ўзаемасувязей беларускай літаратуры з літаратурамі славянскіх народаў // Тыпалогія і гісторыя славянскіх моў і ўзаемасувязі славянскіх літаратур. Мн.; А выхаванне эстэтычнае? // Наст. газ. 11 кастр.

1968. А. М. Горкі і культура беларускага народа // М. Горький и вопросы литературы. Мн.; М. Горкі і культура беларускага народа // Максім Горкі і Беларусь. Мн.; Исследования по истории белорусской литературы: [Рэц. на кн.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1] // Коммунист Бел. № 11; Ён адкрываў нам новы свет // Заря. 16 марта; Мін. праўда. 27 сак.

1969. Тарас Шаўчэнка і Якуб Колас // Матэрыялы першай навуковай канферэнцыі па вывучэнню беларуска-ўкраінскіх літаратурных і фальклорных сувязей. Гомель; Ленин и вопросы перевода // Веснік БДУ. Сер. 4. № 3 / Сааўт. Л. Трохан; Великий русский баснописец и белорусская литература // Гомел. праўда. 13 лют.; Заря. 13 февр.

1970. Эстэтычныя ідэі Леніна і беларуская літаратура // Веснік БДУ. Сер. 4. № 2; Фольклорные традиции в белорусской поэзии: [Рэц. на кн.: Грынчык М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. Мн. 1969] // Вопр. литературы. № 10; Святло яго ідэй // Вяч. Мінск. 8 студз.

1971. Песня маладосці: [Верш] // Універсітэт паэтычны. Мн.; Развіццё літаратуразнаўства БДУ // Веснік БДУ. Сер. 4. № 2; На современном уровне: [Рэц. на кн.: Чамярыцкі В. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Мн., 1969] // Вопр. литературы. № 2; «Зорка зорцы голас падае...»: [Рэц. на кн.: Лермантаў М. Выбр. паэзія. Мн., 1969] // Неман. № 1; Удача исследователя: [Рэц. на кн.: Подокшин С. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI — начало XVII вв.). Мн., 1970] // Там жа. № 12; Выдатны паэт і грамадзянін //

Віцеб. рабочы. 8 снеж.; Маг. праўда. 9 снеж.; Мін. праўда. 8 снеж.; Час патрабуе // ЛіМ. 15 кастр.

1972. Горкаўскія традыцыі ў рэалізме Я. Купалы і Я. Коласа // Народныя песняры. Мн.; Полымя. № 9; Некрасовские мотивы в творчестве Янки Купалы и Якуба Коласа // Некрасов и литература народов СССР. Ереван; Братство народов — братство литератур // Неман. № 12; Наш Купала // Віцеб. рабочы. 7 ліп.; Гомел. праўда. 7 ліп.; Гродн. правда. 7 июля; Начало сокрушения божьего: {Рэц. на кн.. Каротк а я Л. На путях к атеизму. Мн., 1971} // Знамя юности. 17 авг.; Вялікі пясняр роднай зямлі // Маг. праўда. 7 ліп.

1973. Праблемы вывучэння ўзаемасувязей славянскіх літаратур // Тыпалогія і ўзаемадзеянне славянскіх моў і літаратур. Мн.; Праблема параўнаўчага вывучэння славянскіх літаратур // Веснік БДУ. Сер. 4. № 2.

1974. К вопросу о героическом эпосе в белорусских сказках // Прозаические жанры фольклора народов СССР. Мн.

1975. Гравюры Ф. Скарыны // Беларусь. № 8; Да пытання аб асветніцтве і асветніцкім рэалізме ў беларускай літаратуры // Веснік БДУ. Сер. 4. № 1.

1976. «Слова аб палку Ігаравым» і беларуская літаратура // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн. Вып. 4; Да праблемы рамантызму ў беларускай літаратуры // Веснік БДУ. Сер. 4. № 1.

1977. Да праблемы ўзаемаўзбагачэння савецкіх нацыянальных літаратур // Веснік БДУ. Сер. 4. № 2; Начинать с хорошей программы // Вопр. литературы. № 10.

1979. Уводзіны; Фальклярыстыка савецкага перыяду; Заключэнне // Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мн.

1981. Янка Купала і традыцыі рускай культуры // Песні беларускай валадар. Мн.

1.5.

На балгарскую мову. Янка Лучына — бележит поет на Белорусия // Славяни. 1961. № 9; Българо-белоруските литературни взаисоотношения // Лит. фронт. 1970. 26 ноем.

На польскую мову. Etapy rozwoju literatury białoruskiej // Szt. Wolności. 1941. 23 marca.

На ўкраінскую мову. Братерська едність // Рад. Укр. 1957. 22 вер.

1.6.

Беларуская літаратура XIX ст.: Зб. тэкстаў. Мн., 1940 / Апрац. з інш.

Родная літаратура: Хрэстаматыя для 8-га класа. Мн., 1945 / Скл. Рэц.: Барысенка В. Аб ідэалагічных скажэннях у працах асобных літаратуразнаўцаў і крытыкаў // Сав. школа. 1948. № 1; Василёнок С. Фальсификаторы и невежды // ЛГ. 1947. 4 окт.; Войніч Е. Праграмы і падручнікі па беларускай літаратуры для сярэдняй школы // Полымя. 1948. № 4.

Беларуская літаратура XIX стагоддзя: зб. тэкстаў. Мн., 1950 / Скл. з В. Барысенкам, Л. Фіглоўскай.

Падарунак. Мн., 1958 / Рэд.

Гісторыя беларускай літаратуры: Праграма для пединстытутаў і Белдзяржуніверсітэта. Мн., 1965 / Скл. з інш.

Беларуская вуснапаэтычная творчасць: Вучэбны дапаможнік для філал. фак. ВНУ. Мн., 1966 / Рэд.

Рагойша В. Паэтыка Максіма Танка. Мн., 1968 / Рэд.

Народныя песняры: Да 90-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа. Мн. 1972 / Рэд. з інш.

Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. Мн., 1977 / Рэд.

Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мн., 1979 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Александровіч С. Вечны агонь маладосці: Да 60-годдзя з дня нараджэння // Голас Радзімы. 1967. № 47; ЛіМ. 1967. 17 ліст.; Апанасовіч Л. Невуцтва і абарона нацыяналізма // ЛіМ. 1948. 31 студз.; Барысенка В. Аб некаторых пытаннях гісторыі беларускай літаратуры // Полымя. 1948. № 2; ЛіМ. 1947. 19 ліп.; Яго ж. Ідэйныя скажэнні ў асобных артыкулах крытыкаў і літаратуразнаўцаў // Там жа. 1948. 17 студз.; Батурын І. «Шурпатасці на мастацкім целе» // Там жа. 1945. 2 жн.; Бурносаў В. З марай аб маладосці // Беларусь. 1967. № 11; Віцьбіч Ю. Коўзанне па паверхні гісторыі // ЛіМ. 1939. 23 мая; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 41—42; Іваноў М. Паэт і яго крытыкі // ЛіМ. 1947. 21 чэрв.; Казлова В. Слова пра настаўніка // Веснік БДУ. Сер. 4. 1977. № 3; Колас Я. Актуальныя праблемы // Зб. тв.: У 14 т. Мн., 1976. Т. 11; Кудраўцаў І. Пра аргументаванасць і шчырасць у крытыцы // ЛіМ. 1952. 15 сак.; Лойка А. На службе ў літаратуры: Да 75-годдзя з дня нараджэння М. Ларчанкі // Там жа. 1982. 19 ліст.; Майхровіч С. Слова аб палку Ігаравым. Мн., 1968. С. 150—154; Макарэвіч А. Выдатны літаратуразнаўца: Да 60-годдзя з дня нараджэння Міхася Ларчанкі // Маг. праўда. 1967. 18 ліст.; Маляўка М., Родчанка М. Літаратурныя сувязі ў сістэме літаратурных дысцыплін на філалагічным факультэце // Беларуская мова і літаратура ў ВНУ. Брэст; Марціновіч А. Сумленна і аддана // Беларусь. 1977. № 11; Міхаіл Рыгоравіч Ларчанка: [Некралог] // ЛіМ. 1981. 7 жн.; Міхась Рыгоравіч Ларчанка: (Памяці беларускага літаратуразнаўцы) // Веснік БДУ. Сер. 4. 1981. № 2; Мушынскі М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 40-я — першая палавіна 60-х гадоў. Мн., 1985. С. 64—65, 69, 244—245; Навуменка І. Настаўнік // ЛіМ. 1981. 7 жн.; Яго ж. Яго галоўная любоў // Навуменка І. Зб. тв.: У 6 т. Мн., 1984. Т. 6; Перкін Н. За правільную ацэнку спадчыны М. Багдановіча // ЛіМ. 1949. 20 жн.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Рубін І. Педагог і вучоны // Мін. праўда. 1977. 15 ліст.; Фядосік А. Шчаслівы лёс педагога і вучонага // Звязда. 1977. 13 ліст.; Чыгрынаў І. Слова, якое не было сказана // Чыгрынаў І. Новае ў жыцці, новае ў літаратуры. Мн., 1983; Шарахоўскі Я. Аб крытыцы: (Некаторыя заўвагі) // ЛіМ. 1939. 11 чэрв.

2.4.

Барадулін Р. Лёгкая рука: [Верш] // ЛіМ. 1977. 7 студз.

В. М. Грышкевіч.

ЛАСКОЎ ІВАН

Ласкоў Іван Антонавіч (н. 19.6.1941, г. Гомель), паэт, празаік, перакладчык, крытык. Член СП Беларусі з 1973. Піша на беларускай і рускай мовах.

На беларускай мове. Прыгодзіч З. Праблемы сучаснасці ў люстры літаратуры // Полымя. 1978. № 12.

М. П. Барташэвіч.

ЛЕВАНОВІЧ ЛЕАНІД

Левановіч (сапр. Л я в о н а ў) Леанід Кірэевіч (н. 14.9.1938, в. Клеявічы Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл.), празаік, драматург. Член СП Беларусі з 1975.

Нарадзіўся ў сям'і калгаснікаў. У 1945—52 вучыўся ў Клеявіцкай сямігадовай школе, якую закончыў на «выдатна». Пасля паступіў у Магілёўскае культасветвучылішча. Закончыўшы яго ў 1956, працаваў інструктарам Дзяржынскага раённага дома культуры Мінскай вобл. (1956—57), загадчыкам сельскага клуба ў в. Гаўрыленка Касцюковіцкага р-на (1957—58), дырэктарам РДК у г. Касцюковічы (1958). У 1957 паступіў на завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі БДУ. У 1958—61 служыў на Балтыйскім флоце і адначасова вучыўся. Пасля дэмабілізацыі перавёўся на стацыянар і закончыў універсітэт (1963). Працаваў літсупрацоўнікам газеты «Знамя юности» (1963—65), уласным карэспандэнтам «Сельской газеты» (1965—69), літсупрацоўнікам «ЛіМа» (1969—71), рэдактарам аддзела мастацтва, крытыкі і бібліяграфіі часопіса «Неман» (1971—74), адказным сакратаром (1974—75) і загадчыкам аддзела навукі і мастацтва (1975—79) часопіса «Полымя», галоўным рэдактарам галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання (1979—82). У 1982—86 на творчай рабоце. З 1986 рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Дэбютаваў у 1963 апавяданнем «Русакова дарога». У 1960—70-я гады актыўна выступаў як нарысіст. Журналісцкім творам Л. Левановіча ўласціва праблемнасць, доказнасць, уменне бачыць у чалавеку тое, што вызначае яго характар. Праца ў жанры нарыса дапамагала шліфаваць майстэрства, прывучала да лаканічнасці. Для апавяданняў пісьменніка характэрна маральна-этычная праблематыка. У аповесці «Валанцёр свабоды» стварыў запамінальны вобраз барацьбіта-інтэрнацыяналіста П. Варанецкага (прататыпам паслужыў Фадзей Варанішча), былога камсамольца Заходняй Беларусі, пасля падпольшчыка ў Аргенціне, абаронца рэспубліканскай Іспаніі, удзельніка Супраціўлення ў Францыі. Аб праблемах аднаўлення калгаса, навучання ў пасляваеннай школе расказвае ў рамане «Шчыглы», дзе стварыў вобразы дзяцей вайны. У п'есах Л. Левановіча ўзнімаюцца праблемы чалавечых адносін, сям'і. Апошнія значныя творы пісьменніка — раманы «Паводка сярод зімы», «Дзікая ружа».

Жыве ў Мінску.

Я. І. Клімуць.

Бібліяграфія

1.2.

Гаспадар зямлі: Нарыс. Мн., 1971. (Праца ўпрыгожвае чалавека) / Пад сваім прозв.

Зялёны трохкутнік: Нарыс. Мн., 1973. Рэц.: Л е ц к а Я. Вокам руплівага гаспадара // ЛіМ. 1973. 2 ліст.; М а р ц і н о в і ч А. З любоўю да ўсяго зямнога // Вяч. Мінск. 1974. 5 жн.

Мадонна з кветкаю: Апавяданні. Мн., 1976. Рэц.: В ы ш ы н с к і М. Людзі і кветкі // ЛіМ. 1976. 10 снеж.; Ф о м ч а н к а А. На скрыжаванні лёсу // Вяч. Мінск. 1977. 31 сак.

Якар надзеі: Аповесці і апавяданні. Мн., 1979. Рэц.: В і к т а р а ў Р. На плынь — з паднятым якарам! // Беларусь. 1980. № 7; Д з м і т р ы е ў М. Прачытаўшы кнігу... // Нар. асвета. 1980. № 9; Е р м а л о в і ч М. Прага чысціні // Чырв. змена. 1980. 22 студз.; К р ы с к а в е ц Я. Адзіная на ўсё жыццё // Маг. праўда. 1980. 31 мая; Н і к і ф а р о в і ч В. Героі — нашы сучаснікі // ЛіМ. 1980. 11 студз.; С ц я ц к о П. Споведзь душы // Наст. газ. 1981. 11 сак.; Т а р а с е в і ч С. Чалавеку патрэбна дабрата // Вяч. Мінск. 1980. 6 лют.

Валанцёр свабоды: Аповесць і апавяданні. Мн., 1983. Рэц.: К л і м у ц ь Я. У пошуках героя // Маг. праўда. 1985. 28 мая; М а р ц і н о в і ч А. Адысея Паўла Варанецкага // Голас Радзімы. 1985. 29 жн.; П е т к е в и ч А. Повесть о мужестве // Гродн. правда. 1984. 26 дек.

Шчыглы: Раман. Мн., 1986.

Хлеб і мужнасць: Нарысы. Мн., 1987. (Рэспубліка. Час. Людзі.)

Паводка сярод зімы: Раман. Апавяданні. Мн., 1989.

1.3.

1963. Русакова дарога: Апавяданне // Сав. Бел. 17 крас.; На рыбалке: [Апавяданне] // Сел. газ. 28 июля.

1968. Иванова роща; Белорусский мед: [Нарысы] // Неман. № 2, 9 Пад сваім прозв.

1969. Сад ты наш, батюшка: [Нарыс] // Неман, № 8 / Пад сваім прозв.

1970. Второй хлеб: [Нарыс] // Неман. № 6; Трэці ордэн: Нарыс // ЛіМ. 4 снеж. / Пад сваім прозв.

1971. Чатыры цюльпаны: Апавяданне // Беларусь. № 5; Белорусская Советская... // Неман. № 9; Кароткія апавяданні // Полымя. № 11; Песня дзятла; Брытва: [Апавяданні] // ЛіМ. 14 мая; Чалавек і яго работа: [Рэц. на кн.: Раманаў А. Бурштын. Мн., 1970] // Там жа. 18 чэрв.

1972. Ці любіце вы грэчку?: Сцэна ў адной дзеі // Беларусь. № 11; Антонава лазня: Апавяданне // Маладосць. № 8; Признание в любви: [Рэц. на кн.: Сіпакоў Я. Па зялёную маланку. Мн., 1971] // Неман. № 8; [Рэц. на кн.: Герасимов В. Стенография. Мн., 1971] // Там жа. № 12; Дырэктар: Апавяданне // Полымя. № 12.

1973. Зялёны дубочак: Апавяданне // Бярозка. № 8; Загадка Янки Мавра: [Нарыс] // Неман. № 5; Год роздуму, творчасці, пошукаў // ЛіМ. 2 лют.

1975. Старэйшая сястра: Апавяданне // Маладосць. № 4; Не толькі ўзнёсла і шчыра...: [Рэц. на кн.: Праскураў В. Людзі-суседзі. Мн., 1974] // Полымя. № 3; Песня дзятла; Апавяданне // Родная прырода. № 4.

1976. Пушок: Апавяданне // Бярозка. № 5; Белая крыніца: Апавяданне // Маладосць. № 7.

1977. Познія грыбы: Апавяданне // Полымя. № 2; Шчырасць: Апавяданне // ЛіМ. 8 ліп.; «Няма правоў без абавязкаў...» // Там жа. 19 жн.

1978. Выспяванне народнага гневу: [Рэц. на кн.: Чыгрынаў І. Апраўданне крыві. Мн., 1977] // Беларусь. № 10; Апошні аўтобус: Апавяданне // Маладосць. № 6; Прызнанне: Апавяданне // Полымя. № 3; Шыпшына Саласпілса: Апавяданне // Работніца і сялянка. № 5; «Мастацтва ёсць вялікая справа» // ЛіМ. 8 вер.

1979. Хлеб і мужнасць: [Нарыс] // Сучаснік. Мн.; ЛіМ. 16 сак.; Живут на целине белорусы // Коммунист Бел. № 12; Закон жыцця // ЛіМ. 5 кастр.; Якар надзеі // Чырв. змена. 12 жн.

1980. Жывуць на цаліне беларусы: [Нарыс] // Сучаснік. Мн.; Нет земли безымянной: [Рэц. на кн.: Козлович А. Пора идти. Мн., 1979] // Лит. обозрение. № 9; Пасля разводу: Драма // Маладосць. № 12; Незабыўныя хвіліны: [Рэц. на кн.: Скрыган Я. Некалькі хвілін чужога жыцця. Мн., 1979] // Полымя. № 3; Хлеб — всему голова: (Заметки писателя) // Сов. Бел. 24 авг.

1981. Чалавек і яго клопат // Сучаснік. Мн.; Як памагчы полю // Чырв. змена. 31 студз.

1982. Імантаўскі аксакал: [Нарыс] // Беларусь. № 4; Зямля і людзі: Старонкі дакументальнай аповесці // Вяч. Мінск. 18, 20, 22, 28 вер.; Два аўтографы // Там жа. 16 снеж.; Энергия братского единения // Сел. газ. 25 авг.

1983. Баркун: Апавяданне // ЛіМ. 11 сак.; Там дзе горы Алатаў: Нарыс // Там жа. 23 вер.; Жыць па законах сумлення: [Рэц. на кн.: Ласкоў І. Чароўны камень. Мн., 1983] // Там жа. 14 кастр.; Валанцёр свабоды: [Урыўкі з аповесці] // Чырв. змена. 12, 13 ліп.

1984. Ці хутка вернецца тата?: [Урывак з рамана «Шчыглы»] // Бярозка. № 12; [Рэц. на кн.: Радкевич Е. Плотогоны. М., 1983] // Неман. № 5; Ад роднай Бесядзі // ЛіМ. 3 лют.; Смачны праснак: Урывак з рамана // Там жа. 30 сак.; Бацькоўскі наказ: Нарыс // Там жа. 17 жн.; Дырэктар: [Урывак з рамана «Шчыглы»] // Наст. газ. 24 сак.; Вяртанне: Урывак з рамана // Чырв. змена. 18 крас.

1985. Чалавек на зямлі [Нарыс] // Сучаснік. Мн.; Глыбокія карані: Нарыс // Беларусь. № 8; Барозны ідуць за далягляд // Маладосць. № 7; Чалавек на зямлі: Нарыс // Полымя. № 3; Час не вернеш назад // Звязда. 21 ліп.; Ганна Дзянісаўна: Быль // ЛіМ. 14 чэрв.

1.4.

1974. Балёнене Э. Хрысціна: Апавяданне / З літ. // Бярозка. № 8.

1984. Балёнене Э. Хрысціна: Апавяданне / З літ. // Бурштынавыя пацеркі. Мн.

1.5.

На казахскую мову. Саласпилс итмурыны / Ауд. Жакыпов // Полесье энгімелері. Алматы, 1984.

На літоўскую мову. Genio daina: Novele / Vert. E. Balioniene // Komjaunimo tiesa. 1974. Kovo. 22.

На рускую мову. Якорь надежды: Повести, рассказы. М., 1991; Четыре тюльпана: [Новелла) / Пер. С. Куваев // Неман. 1972. № 3; Директор: [Апавяданне] / Пер. С. Кагарлицкая // Учитель. К., 1973; Песня дятла; Бритва; Антонова баня: (Рассказы) / Пер. С. Куваев // Неман. 1974. № 1; Камень; Поздние грибы: (Рассказы) / Пер. С. Куваев // Неман. 1978. № 10.

На ўкраінскую мову. Чотыри тюльпани: [Апавяданне] / Пер. О. Ленік / // Рідня. К., 1980.

1.6.

Сучаснік — 86: Нарысы; Публіцыстыка; Хроніка. Мн., 1986 / Рэд. з інш.

Сучаснік — 87: Нарысы; Публіцыстыка; Хроніка. Мн., 1987 / Рэд. з інш.

Сучаснік — 88: Нарысы, публіцыстыка. Мн., 1988 / Рэд. з інш.

Сучаснік — 89: Нарысы, інтэрв'ю, публіцыстыка. Мн., 1989 / Рэд. з інш.

Зона бяды. М., 1991 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Акуліч Д. У пампе сенакос пачынаецца... // ЛіМ. 1984. 26 кастр.; Лысенка А. Сучасны беларускі нарыс. Мн., 1978. С. 101—108; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Шупенька Г. Цеплыня чалавечнасці. Мн., 1977. С. 194—197; Юрэвіч У. На быстрыні жыцця // На арбіце часу. Мн., 1974. С. 177—179; Ягож. Нарыс — гэта даследаванне // Юрэвіч У. Абрысы. Мн., 1976.

М. П. Барташэвіч.

ЛЕВАНОВІЧ ПАВЕЛ

Левановіч Павел Антонавіч (3.11.1914, в. Мазалава Мсціслаўскага пав., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл.— 20.12.1943, пахаваны ў в. Старынка Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), празаік, публіцыст.

Біяграфічныя звесткі пра П. Левановіча амаль не захаваліся. Вядома, што паходзіў ён з сялянскай сям'і. Меў сярэднюю адукацыю, скончыў першы курс геафака БДУ. Удзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь (1939). З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Трапіў у палон, уцёк з Крычаўскага лагера ваеннапалонных, памагаў партызанам. З кастрычніка 1943 зноў на фронце. Быў цяжка паранены, ад чаго і памёр.

Першыя творы П. Левановіча (нарысы, апавяданні, вершы) з'явіліся ў друку ў 1934. З 1936 яго імя рэгулярна сустракалася на старонках рэспубліканскай перыёдыкі. Яго творы вызначаліся ўважлівымі адносінамі да рэчаіснасці. Аўтар спрабаваў прасачыць псіхалогію ўчынкаў сваіх персанажаў (вобразы плытагона Кірылы і брыгадзіра плытагонаў Ягора ў апавяданні «На Сожы»). Тагачасная крытыка адзначала ў прозе пісьменніка дынамічнасць фабулы, трапнасць дэталяў, жывую вобразную мову. Прыхільныя водгукі выклікала і проза П. Левановіча для дзяцей (кніга апавяданняў «Дружба»), дзе выявілася добрае веданне аўтарам дзіцячай псіхалогіі. У 1940 падрыхтаваў да друку другі зборнік апавяданняў, які быў абмеркаваны і ўхвалены на секцыі прозы ў Саюзе пісьменнікаў (у час вайны рукапіс загінуў). Ёсць звесткі, што П. Левановіч выступаў у франтавым друку (1943).

Адна з вуліц г. Мсціслава носіць імя П. Левановіча.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

Дружба: Зборнік апавяданняў. Мн., 1938. Рэц.: Пармон А. Апавяданні Паўла Левановіча // ЛіМ. 1939. 23 ліп.; Шарапов А. О рассказах Павла Левановича // Сталин. молодежь. 1940. 10 марта.

1.3.

1934. Боркаў аўтамабіль: Нарыс // Іскры Ільіча. № 9; Пачынаю нанава: Апавяданне // ЛіМ. 22 сак.; Радкі бальшавіцкія: [Верш] // Палес. праўда. 12 мая; Дружба з вясной: [Верш] // Там жа. 13 ліп.; Дарогаю па вадзе: Апавяданне // Там жа. 9 жн.

1935. Будзем багаты: [Верш] // Палес. праўда. 18 крас.

1936. Пра вавёрачку і кошку: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 4; Заяц: Апавяданне // Там жа. № 6; На Сожы: Апавяданне // Полымя. № 7; Ноч у пасечніка: Апавяданне // ЛіМ. 27 вер.

1937. Сарока белабока: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 2; Удодава гняздо: Апавяданне // Там жа. № 6; Хамелеён: Апавяданне матроса // Там жа. № 7; Мой знаёмы: Нарыс // Звязда. № 45; Пеоны: Апавяданне // ЛіМ. 17 вер.; Шызы голуб: Апавяданне // Піянер Бел. 5 мая; Куток цішыні і недатыкальнасці // Там жа. 24 ліп.; Бабровая хата: Апавяданне лесніка // Там жа. 28 ліп.; Паляванне на мядзведзя: [Апавяданне] // Там жа. 30 ліп.; Паласатая кошка: [Апавяданне] // Там жа. 3 жн.; Каса выратавала; Рагаты прыгажун: [Апавяданні] // Там жа. 18 вер.; Сказ удавы: [Верш] // Чырв. змена. № 249.

1938. Дружкі: Апавяданне // Піянер Бел. 17 ліст.; Разговор у окна: [Апавяданне] // Сталин. молодежь. 1 мая; Згублены сшытак: [Апавяданне] // Чырв. змена. 2 жн.; Нерпа: [Апавяданне] // Там жа. 24 жн.; Даўнія знаёмствы: [Апавяданне] // Там жа. 9 кастр.; Два студэнты аднаго факультэта // Там жа. 17 кастр.

1939. Універсітэт ордэнаноснай рэспублікі // Звязда. 14 кастр.; Галубы: Апавяданне // ЛіМ. 12 вер.; Ля помніка // Там жа. 11 кастр.; Гомель: (Города Советской Белоруссии) // Сталин. молодежь. 12 сент.; У доміку Лермантава: (Запіскі турыста) // Чырв. змена. 8 жн.; Коста Хетагураў // Там жа. 12 жн.; Нерпа: Апавяданне // Там жа. 24 жн.

1940. Беларускі дзяржаўны запаведнік // Піянер Бел. 11 крас.; Вялікі мастак-рэаліст // Там жа. 29 вер.; Приданое: [Апавяданне] // Сталин. молодежь. 1 мая; Дзед-Мароз: [Казка] // Чырв. змена. 1 студз.; Крылатае пакаленне: [Апавяданне] // Там жа. 26 лют.; Апавяданне пра адну школу // Там жа. 6 крас.; На граніцы // Там жа. 1 мая; Прыход жаданняў: Як Г. Ю. Грыгоніс стаў заслужаным артыстам БССР // Там жа. 22 мая; Сімфонія шчасця // Там жа. 26 мая; Нараджэнне песні: [Апавяданне] // Там жа. 20 чэрв.

1941. 19 студзеня 1905 г. // Піянер Бел. 22 студз.; Ф. М. Дастаеўскі: 120 год з дня нараджэння // Там жа. 13 лют.; У дарозе: Апавяданне // Там жа. 2 сак.; Коста Хетагураў: Нарыс // Там жа. 3 крас.; Буслы: Апавяданне // Там жа. 1 чэрв.; На іспытах: Навела // Сялян. газ. 25 мая.
2.3.
На беларускай мове. Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Самуйлёнак Э. «Бацькава пісьмо» П. Левановіча // ЛіМ. 1936. 17 снеж.; Творчы вечар у Клёнках // Палес. праўда. 1935. 22 чэрв.; Юрчанка Г. Ен назаўсёды застаўся маладым // ЛіМ. 1965. 20 жн.; Яго ж. Новае пра Паўла Левановіча // Там жа. 1978. 7 крас.; Яго ж. Палымянасць // Чырв. змена. 1966. 11 студз.

З. У. Драздова.

ЛЕГАТОВІЧ ІГНАТ

Легановіч Ігнат Сымонавіч [крыпт.: I. L., I. P. L.; 30.7(10.8).1796, в. Малая Капліца Гродзенскага пав., цяпер Гродзенскі р-н — 28.9(10.10).1867, Мінск], беларуска-польскі паэт, педагог.

Нарадзіўся ў сям'і шляхціца Самсона Легатовіча, жанатага з Магдаленай Стшалкоўскай. У пяцігадовым узросце страціў бацьку, выхоўваўся айчымам Якубам Вішнеўскім, небагатым, але клапатлівым шляхціцам. Пасля заканчэння дамініканскай школы ў Гродне вучыўся ў Віленскім ун-це, на аддзяленні літаратуры і мастацтва, дзе атрымаў ступень магістра (1817). У 1817—39 выкладаў лацінскую мову і літаратуру ў Мінскай гімназіі. У 1839 пераехаў у Лепель, затым у Вілкамір, працаваў інспектарам лепельскай, полацкай і вілкамірскай школ. Быў узнагароджаны ордэнам Святога Станіслава 3-га класа і адзнакай за бездакорную 25-гадовую працу. Страціўшы зрок, у 1846 выйшаў у чыне калежскага саветніка на пенсію і вярнуўся ў Мінск, дзе займаўся рэпетытарствам па лацінскай мове, збіраннем бібліяграфічных рэдкасцяў і паэтычнай творчасцю, запісваў трапныя выслоўі, перакладаў з рускай і французскай моў, вершаваныя мініяцюры і эпіграмы.

Упершыню ў друку выступіў з навуковай працай «Даследаванне пра лісты» [«Tygodnik Wileński», («Віленскі штотыднёвік»). 1817. Т. 3]. Пазней пісаў на польскай мове павучальныя кнігі для дзяцей і юнацтва, дыдактычныя двухрадковыя максімы, эпіграмы, якія карысталіся асаблівай папулярнасцю на Міншчыне. Антыпрыгонніцкія погляды І. Легатовіча выявіліся і ў беларускім вершы «Скажы, вяльможны пане...», за публікацыю якога неўзабаве пасля выхаду быў канфіскаваны альманах «Bojan» («Баян», Вільня, 1838). Значную ўвагу І. Легатовіч надаваў бібліяфільству, сабраў багатую бібліятэку, у якой былі каштоўныя, не зафіксаваныя бібліёграфамі выданні. Пра некаторыя з іх ён расказаў у часопісе «Dziennik Wileński» («Віленскі дзённік»).

У. І. Мархель.

Бібліяграфія

1.2.
Wiersz na obchód przez Dworzaństwo imienin JW Wincentego z Gieczan Giecewicza, gubernatora Mińskiego... [Mn.], 1822.
Epigrammata. Wilno, 1848; Wilno, 1854.
Prawdy, prawidła życia, maksymy, zdania, przysłowia i myśli rozmaite... Wilno, 1848.
Gościniec dla dziatek, to jest prawdy i zdania moralne dla pożytku uczących się obojej płci wydane. Wilno, 1849.
Poradnik dla młodzieży, to jest Prawdy i zdania moralne dla użytku uczących się obojej płci. Wilno, 1851.
Prawidła poczciwego życia czyli Zdania rozmaite z różnych autorów... do moralnej nauki zastosowane. Wilno, 1852.
Prawy, to jest Nauka moralna dla dzieci. Wilno, 1853.
Apoftegmata. Wilno, 1854.
Myśli. Wilno, 1857.
Dawna prodków naszych obyczajność, to jest ustawy obyczajności, przyzwoitości i grzeczności. Wilno, 1858.
Gościniec dla dziatek, to jest Prawdy i zdania moralne dla pożytku uczących się obojej płci wydane. Wilno, 1859.
1.3.
1817. Rozprawa o listach // Tygodnik Wileński. T. 3.
1821. Epigrammata // Dz. Wileński. T. 3. Nr 2.
1822. Epigrammata // Dz. Wileński. T. 2. Nr 6.
1825. Wiadomość o dziełach polskich, o ktorych żaden z naszych bibliografów dotąd nie uczynił wzmianki // Dz. Wileński. T. 1. Nr 4.
1826. Epigrammata // Dz. Wileński. T. 1. Nr 6.
1827. Epigrammata // Dz. Wileński. T. 2. Nr 9.
1829. Epigrammata // Dz. Wileński. T. 4. Nr 12.
1838. Z białoruskiego narzecza: «Skaży Wielmożny Panie...» // Bojan (Wilno). Cz. 1 / Аўт. спрэчнае.
1971. Скажы, вяльможны пане: [Верш] // Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. Мн. / Аўт. спрэчнае.
1.4.
1822. Epigrammata / Z fr., ros. // Dz. Wileński. T. 1. Nr 2.
1825. Epigrammata / Z fr., ros. // Dz. Wileński. T. 1. Nr 4.
1826. Epigrammata / Z fr. // Dr. Wileński. T. 1. Nr 9.
1.5.
На польскую мову. Powiedz mnie, wielmożny panie / Tł. J. Huszcza // Antologia poezji białoruskiej. Wrocław, 1978 / Аўт. спрэчнае.
1.6.
Kopa z naddatkiem bajek naszych pisarzy dla młodzieży płci obojej. Wilno, 1858 / Скл.
2.3.
На беларускай мове. Бас І. Малавядомы верш на беларускай мове // Беларусь. 1954. № 7; Мархель У. Лірнік вясковы. Мн., 1983. С. 146—147; Яго ж. «Нічога такога я не пісаў...» // Голас Радзімы. 1980. 29 мая.
На польскай мове. Jelski A. Listy z prowincyi: Mińsk lietewski // Kraj. 1888. Nr 49; Sabowski W. Ignacy Piotr Legatowicz // Tyg. Il. 1885. Nr. 134.

На рускай мове. Цыхун А. Поэт и педагог // Гродн. правда. 1984. 4 авг.

3.1.

Б-ка Асалінскіх у Вроцлаве (Польшча), аддз. рукап., адз. зах. 3150; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 541, 542, 543, 544, ф. 158, адз. зах. 719; ЦДГА Беларусі ў Мінску, ф. 3157, воп. 1, спр. 499; ЦДГА Літвы, ф. 567, воп. 2, спр. 3041, 4227, 5570, ф. 1135, воп. 11, спр. 7, л. 15; Ягелонскі ун-т у Кракаве, аддз. рукап., адз. зах. 2790, 2791.

Т. М. Махнач.

ЛЕЙКА КАНДРАТ

Лейка Кандрат Тодаравіч (крыпт. К. Л-к а, К. Л.; 17.9.1860, в. Збочна Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Слонімскі р-н — 6.9.1921, м. Здалбунаў Ровенскага пав., цяпер г. Здалбунаў Ровенскай вобл., Украіна), празаік, паэт, драматург.

Нарадзіўся ў мнагадзетнай сялянскай сям'і. Бацька, Тодар Якаўлевіч, часта хварэў, гаспадарка ляжала на маці, Тэклі Данілаўне, да вобраза якой К. Лейка не раз звяртаўся пазней у сваіх творах. Змалку Кандрату давялося працаваць пастушком, хадзіць босаму па халоднай расе за статкам. У выніку захварэў рэўматызмам, усё жыццё балелі ногі. Вучыўся ў Азярніцкім народным вучылішчы непадалёк ад роднай вёскі. Добры ўплыў на яго меў настаўнік В. Вікторскі. Пасля заканчэння вучылішча К. Лейку як лепшага вучня накіравалі ў 1876 у Свіслацкую настаўніцкую семінарыю вучыцца за казённы кошт. У 1879 ён скончыў семінарыю, 5 гадоў працаваў у мяст. Косава (цяпер Іванцэвіцкі р-н Брэсцкай вобл.). Мяркуецца, што ў гэты час пачаў пісаць вершы на беларускай мове, бо некаторыя з іх датаваны 1883. У сувязі з абвастрэннем рэўматызму ўрачы запрапанавалі змяніць клімат на больш сухі. У 1884 К. Лейка пераехаў на Украіну, на Харкаўшчыну, дзе і пражыў большую частку свайго жыцця. Працаваў настаўнікам у Лініўскім і Аснавянскім народных вучылішчах, у 1893 выдаў у Харкаве падручнік «Руская азбука». У 1896 вытрымаў экзамен на званне настаўніка павятовага вучылішча, і яго прызначылі інспектарам Харкаўскага вучылішча сляпых дзяцей, паслалі ў Пецярбург на спецыяльныя курсы. К. Лейка праявіў сябе як вопытны педагог, спецыяліст у галіне навучання сляпых. Друкаваўся ў часопісе «Слепец», газеце «Школа и жизнь» (Пецярбург), газетах «Харьковские губернские ведомости», «Южный край» (Харкаў). Працуючы ў вучылішчы, слухаў лекцыі ў Харкаўскім універсітэце. У 1908 па стану здароўя пакінуў службу ў Харкаве. Ёсць звесткі, што ён некаторы час працаваў выкладчыкам рускай мовы ў Елісаветградскім камерцыйным вучылішчы і прыватнай жаночай гімназіі. З 1911 загадчык вучэбнага аддзела ў Валкаўскім павятовым земстве Харкаўскай губ. У 1917 здароўе К. Лейкі значна пагоршылася. У пачатку 1918 ён быў спаралізаваны. Давялося пакінуць службу і пераехаць на Валынь у мяст. Здалбунаў да брата Івана. Цяжка перажываў разлуку з адзіным сынам Віталем (нарадзіўся ў 1916, маці памерла адразу пасля родаў), якога забралі сваякі на Палтаўшчыну і з якім яго неўзабаве падзялілі франты і межы (мяст. Здалбунаў апынулася ў Польшчы). К. Лейка стварыў для сына рукапісны «Альбом», дзе выказваў пяшчотныя бацькоўскія пачуцці, прасіў не губляць сувязей з радзімай. Хворы пісьменнік не пераставаў пісаць, падтрымліваў сувязь з выдавецтвамі, перапісваўся з Г. Леўчыкам, Л. Дубейкаўскім, што жылі тады ў Варшаве. У лютым 1921 паслаў у Вільню ў Беларускае навуковае таварыства 8 сшыткаў сваіх твораў — апавяданняў, вершаў, казак (лёс гэтых сшыткаў пакуль што невядомы). Знойдзены некаторыя рукапісы вершаў, баек, казак, апавяданняў на бытавыя, маральныя, сацыяльныя тэмы. Асобныя яго рукапісы зберагаюцца ў рукапісным аддзеле Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы ў Вільнюсе, а таксама ў Слоніме (школьны музей «Літаратурная Слонімшчына»).

Пачынаючы з 1911 творы К. Лейкі друкаваліся ў «Нашай ніве». У 1912 асобным выданнем у Вільні выйшла яго п'еса «Снатворны мак». У 1914

Я. Купала прапанаваў яму выдаць зборнік. Пісьменнік з радасцю згадзіўся і рыхтаваў да друку кніжку пад назвай «Засеўкі», у якую былі ўключаны 9 празаічных твораў і верш. Але 1-я сусветная вайна перашкодзіла здзейсніць гэтую задуму.

Творы К. Лейкі былі высока ацэнены ў свой час М. Гарэцкім, які пісаў пра яго: «...надта здольны нашаніўскі апавядальнік», «... ён зробіцца адным з самых відных беларускіх белетрыстаў» (Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня. 1920. С. 202—203). Проза пісьменніка, праблемная для свайго часу, вызначаецца паглыбленнем у сацыяльныя канфлікты, у пытанні агульнакультурнага, нацыянальнага жыцця, у паводзіны чалавека, яго ўнутраны свет. Апавяданні К. Лейкі засведчылі, што ён не толькі назіральны бытапісальнік і адкрывальнік унутранага свету сваіх герояў, а і лірык, гумарыст, сатырык. Яго проза разнастайная і па жанру, большасць яго празаічных твораў мяжуюць з мастацкім нарысам, некаторыя нагадваюць лірычную імпрэсію. У апавяданні «Кульгавы дзед Раман» створаны прывабны вобраз селяніна-працаўніка, паказана багацце яго духоўнага жыцця. У апавяданні «Панас Крэнт» намаляваны супрацьлеглы тып — вобраз кулака-крывасмока. П'еса К. Лейкі «Снатворны мак», заснаваная на фальклорна-казачным сюжэце, лічыцца першай спробай у беларускай літаратуры стварыць драматычны твор для лялечнага тэатра. *З. П. Мельнікава.*

Бібліяграфія

1.2.

Снатворны мак: Сцэна для дзіцячых тэатраў. Вільня. 1912.

1.3.

1911. Успамін: [Апавяданне] // Н. н. 20 кастр.; Зязюлька: [Верш] // Там жа. 27 кастр.

1912. Кульгавы дзядзька Раман: [Апавяданне] // Зборнік Нашай нівы. Вільня. № 1; Н. н. 19 крас.; Таклюся — сухотніца: [Апавяданне] // Зборнік Нашай нівы. Вільня. № 2; Н. н. 28 чэрв.; Снатворны мак: (Сцэна для дзіцячых тэатраў) // Там жа. 14, 21 снеж.

1913. Лес шуміць: [Апавяданне] // Н. н. 3 кастр.; Панас Крэнт: З беларускага жыцця: [Апавяданне] // Там жа. 7, 14 ліст.

1914. Лепей смерць, чым грэх: Carte postale: [Апавяданне] // Велікодная пісанка. Вільня; Наша нядбайшчына // Н. н. 7 лют. / Пад крыпт. Л-ка К.; Навальніца: [Верш] // Там жа. 13 лют.; Пан Трудоўскі: [Апавяданне] // Там жа. 25 крас.

1915. Абмылка: [Апавяданне] // Н. н. 29 мая, 5 чэрв.

1916. Таклюся — сухотніца: (Беларускія тыпы): [Апавяданне] // Беларускі каляндар на 1916 год. Вільня.

1917. У гадаўшчыну // Гоман. 16 лют. / Пад крыпт. К. Л.

1919. Без хлеба: (Віленскі абразок): [Апавяданне] // Бел. думка. 2 чэрв. / Пад крыпт. К. Л.

1921. Бабуся: (З натуры): [Апавяданне] // Наша думка. 14 студз.

1965. Кульгавы дзядзька Раман; Таклюся — сухотніца: (Беларускія тыпы); Панас Крэнт: (З беларускага жыцця): [Апавяданні] // Беларуская дакастрычніцкая проза. Мн.

1967. Таклюся — сухотніца: [Апавяданне] // Анталогія беларускага апавядання: У 2 т. Мн. Т. 1.

1968. Таклюся — сухотніца: [Апавяданне] // Работніца і сялянка. № 12.

1978. Снатворны мак: Сцэна для дзіцячых тэатраў // Беларуская дакастрычніцкая драматургія. Мн.

1990. З літаратурнай спадчыны // Маладосць. № 3.

1.4.

1912. Думка: [Верш] / З укр. // Н. н. 15 сак. / Пер. пад крыпт. К. Л.

1.6.

Руская азбука. Харьков, 1893 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Гарэцкі М. Лейка Кандрат // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня. 1920; Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Мн., 1983. Т. 1. С. 400; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1969. Т. 2. С. 257—258; Кабржыцкая Т., Рагойша В. Карані дружбы. Мн., 1976. С. 69—71; Лойка А. Плеяда старэйшых адраджэнцаў // Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1980. Ч. 2; Семяновіч А. Беларуская драматургія: (Дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961. С. 228—229; Хромчанка К. Беларуская мастацкая проза: (Канец XIX — пачатак XX ст.). Мн., 1979. С. 106—110.

3.1.

ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 254, 256—258.

Т. М. Махнач.

ЛЕНСУ АЛЕНА

Ленсу (Лянсу) Алена Якаўлеўна [н. 18.4(1.5).1914, Пецярбург], літаратуразнавец, крытык. Кандыдат філалагічных навук (1943). Дацэнт (1943).

Нарадзілася і выросла ў сям'і педагогаў. Бацька, Якаў Якаўлевіч, працаваў сельскім настаўнікам, пазней служачым. Маці, Жураўская Алена Станіславаўна, таксама настаўніца. Спачатку бацькі працавалі ў сельскіх школах каля Токсава пад Ленінградам, пазней жылі ў Ленінградзе. У 1930 А. Ленсу скончыла 8 класаў школы № 73 Ленінграда. У 1931—35 работніца, потым лабарантка ленінградскай папяровай фабрыкі «Дзяржзнак». У 1935 паступіла на факультэт літаратуры і гісторыі, які пазней рэарганізаваны ў філалагічны факультэт Ленінградскага універсітэта. Пасля заканчэння яго (1940) вучылася ў аспірантуры. Калі універсітэт знаходзіўся ў эвакуацыі ў Саратаве, абараніла там кандыдацкую дысертацыю на тэму «Ранняя творчасць Л. М. Талстога». У 1943 уступіла ў партыю. У 1943—51 дацэнт, загадчык кафедры літаратуры Шадрынскага педінстытута (г. Шадрынск Курганскай вобл.). У 1951—80 дацэнт, загадчык кафедры рускай і зарубежнай літаратуры Мінскага педінстытута. У 1980—85 узначальвала аддзел метадыкі навучання літаратуры Навукова-даследчага інстытута педагогікі (Мінск). Узнагароджана медалямі, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Упершыню А. Ленсу выступіла ў друку ў 1953. У сваіх артыкулах і рэцэнзіях распрацоўвае пытанні літаратурных традыцый і ўзаемасувязей (М. Ламаносаў, М. Гогаль, Ф. Дастаеўскі, Л. Талстой, А. Чэхаў, М. Някрасаў, Т. Шаўчэнка, Я. Купала, Я. Колас), тэорыі і методыкі выкладання літаратуры, методыкі аналізу мастацкага твора. Аўтар манаграфій і вучэбна-метадычных дапаможнікаў «Фальклорныя традыцыі ў дакастрычніцкай творчасці Я. Купалы», «Задума. Мастацкая ідэя і вобразны свет літаратурнага твора», «Вывучэнне тэорыі літаратуры ў школе (IV—VII кл.)» і інш.

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

За тесную связь пропаганды литературных знаний с жизнью народа. Мн., 1958.

Ленинская теория отражения и вопросы литературы. Мн., 1958.

Пісьменнікі Савецкай Беларусі аб працоўных подзвігах свайго народа. Мн., 1959.

Станаўленне метаду сацыялістычнага рэалізму ў творчасці Янкі Купалы. Мн., 1962. Рэц.: Цараńкоў Л. Які разгляд, такія і вывады // ЛіМ. 1962. 19 чэрв.

Пытанні тэорыі літаратуры. Мн., 1964 / Сааўт. М. Лазарук. Рэц.: Дзюбайла П. Прастата і спрошчанасць // ЛіМ. 1965. 5 студз.; Мітраховіч С. Дапаможнік па тэорыі літаратуры // Наст. газ. 1965. 9 чэрв.

Фольклорные традиции в дооктябрьском творчестве Янки Купалы. Мн., 1965. Рэц.: Грынчык М. Янка Купала і народная паэзія // Полымя. 1966. № 8.

Уводзіны ў літаратуразнаўства. Мн., 1970 / Сааўт. М. Лазарук; 2 выд., дапрац. і дап. Мн., 1982.

Дооктябрьское творчество Янки Купалы в свете литературных связей и традиций. Автореф. дис. ... докт. филол. н. Мн., 1972.

Дооктябрьское творчество Купалы в свете литературных связей и традиций: Учеб.-метод. пособие. Мн., 1976.

Художественная идея и образ. Мн., 1978.

Курсовые работы по русской литературе XIX века и советской литературе. Мн., 1978 / Сааўт. І. Разанаў.

Замысел. Художественная идея и образный мир литературного произведения. Мн., 1980.

Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: Дапаможнік для настаўнікаў. Мн., 1983 / Сааўт. М. Лазарук. Рэц.: Крот М. Тым, каго вабіць мастацкае слова // Наст. газ. 1983. 16 ліст.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі. Мн., 1985 / У сааўт.

Вывучэнне тэорыі літаратуры ў школе (IV—VII кл.). Мн., 1985. (Б-ка настаўніка бел. мовы і літ.). Рэц.: Боган У. Аналіз мастацкага твора // Наст. газ. 1985. 21 жн.; Шкраба Р. Асцярожна: школа! // Полымя. 1985. № 12.

Художественная идея и образный мир литературного

произведения: Учеб. пособие для филол. фак. пединститутов БССР. Мн., 1986.

1.3.

1953. Поверхностная статья // Сов. Бел. 16 июня.

1956. «Раскіданае гняздо» Я. Купалы: (Да пытання аб жанры п'есы) // Полымя. № 9; Ф. М. Достоевский // Сов. Бел. 9 февр.

1958. «Раскіданае гняздо» Я. Купалы: (Да пытання аб жанры п'есы) // Янка Купала ў беларускім мастацтве. Мн.; Грунтоўнае даследаванне // ЛіМ. 5 ліп.

1959. Раман аб нашых сучасніках // Полымя. № 2.

1961. Вісарыён Бялінскі // Работніца і сялянка. № 6; Первый поэт Руси // Сов. Бел. 19 нояб.; Большой друг народа: К 140-летию со дня рождения Н. А. Некрасова // Там жа. 10 дек.

1963. З чым нельга пагадзіцца // ЛіМ. 26 крас.

1968. К проблеме горьковских традиций в дооктябрьском творчестве Я. Купалы // Доклады межвузовской научной конференции, посвященной 100-летию со дня рождения А. М. Горького. Мн.; Стих призывный, страстный // Сов. Бел. 15 июня.

1969. «С землей и небом связывает нить...» // Неман. № 12.

1971. Образная сила слова В. И. Ленина // В. И. Ленин и художественная литература. Мн.; Дакастрычніцкая творчасць Купалы і Някрасаў // Полымя. № 12.

1974. Пра стылёвае багацце: [Рэц. на кн.: Залесская Л. О романтическом течении в советской литературе. М., 1973] // Полымя. № 1 / Сааўт. А. Семяновіч; Ад беларускіх ніў і ўдзячных сэрцаў братніх // Там жа. № 6.

1976. О петербургских повестях // Гоголь Н. Петербургские повести. Мн.; Художественное время в белорусской поэзии XIX в. // Филологические исследования. Мн.

1977. Художественное время в лирике Ф. Богушевича // Проблемы жанра. Мн.; На шасцідзесяцігадовым рубяжы // Звязда. 3 снеж.

1978. Писатель и действительность; В. И. Ленин о Толстом // Учебное пособие по специальному курсу для студентов-заочников филфака педагогического института. Мн.; Рысы эпасу // Маладосць. № 11.

1980. Художественное время в дооктябрьской поэзии Я. Купалы // Жанр и стиль художественного произведения. Мн.

1982. Фарміраванне і развіццё літаратурных здольнасцей у вучняў сярэдніх класаў у працэсе вывучэння тэарэтычна-літаратурных паняццяў // Адзінства навучання і выхавання на ўроках літаратуры. Мн.; Янка Купала і творчасць Тараса Шаўчэнкі // Янка Купала і Якуб Колас: Некаторыя аспекты творчасці. Мн.

1983. Аналіз рамана І. Мележа «Людзі на балоце» ў святле праграмных патрабаванняў па тэорыі літаратуры // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры. Мн.; Вывучэнне паняцця «літаратурны герой» // Шляхі ўдасканалення літаратурнай адукацыі ў школе. Мн.

1984. Идейно-нравственное и эстетическое воспитание учащихся // Педагогические проблемы идейно-нравственного воспитания учащихся в процессе обучения и внеурочной работы. Мн.; Изучение понятия партийности литературы в школе // Преподавание русской литературы. Мн.

1985. Пытанні ўдасканалення методыкі аналізу мастацкага твора ў школе // Методыка аналізу літаратурнага твора ў школе. Мн.; Воспитание патриотизма на уроках литературы // Патриотическое воспитание на уроках литературы и во внеклассной работе. М.; Роль урока в коммунистическом воспитании учащихся // Нар. асвета. № 6; Класавасць мастацкай літаратуры // Там жа. № 11.

1.6.

Шляхі ўдасканалення літаратурнай адукацыі ў школе: Зб. навук. прац. Мн., 1983 / Рэд. з М. Лазаруком.

2.3.

На беларускай мове. Канаш В., Ціханчук М. Шчодры плён // Наст. газ. 1984. 11 ліп.

М. П. Барташэвіч.

ЛЕТКА ІВАН

Летка Іван Антонавіч (н. 14.6.1935, маёнтак Масаляны Гродзенскага пав. Беластоцкага ваяв., цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл.), паэт. Член СП Расіі з 1978.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Антон Васілевіч, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, ваяваў на франтах першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. У 1919 калчакаўцамі быў прыгавораны да расстрэлу, але ў апошні момант прысуд адмянілі. У Расію з Гродзеншчыны Летка ўцёк разам са сваёй будучай жонкай Соф'яй Васілеўнай, каб там ажаніцца. У 1925 сям'я А. Леткі вярнулася на Гродзеншчыну, у в. Бадзюкі. Хаты ўласнай не было, жылі ў зямлянцы. З паўгектара ўласнай зямлі сям'я, у якой на той час было васьмёра дзяцей, пракарміцца не магла, таму бацька

наймаўся парабкам. Бацькі былі адукаваныя, шмат чыталі, мелі сваю бібліятэку, якая ў час вайны разышлася па людзях. У Масалянах нарадзіўся апошні ў іх сям'і сын Іван. Маці, якой тады ўжо было 44 гады, пасля родаў хварэла і неўзабаве памерла. У 1941 загінуў бацька. Хлопчык застаўся сіратой. У 1944 пайшоў у першы клас Масалянскай сямігодкі. У 5-м класе захварэў рэўматызмам, цэлую чвэрць лячыўся ў шпіталі і быў пакінуты на другі год. За лета падрыхтаваўся самастойна, здаў экзамены за 5-ы клас і ў 6-ы пайшоў разам з усімі. У 1954 скончыў Масалянскую СШ і паехаў у Маскву да брата. Вучыўся ў медыцынскім вучылішчы, адтуль прызваны ў Савецкую Армію. Дэмабілізаваўшыся, працаваў грузчыкам на бетонным заводзе ў Маскве, мулярам-дэкаратарам у Цэнтральным тэатры Савецкай Арміі, кавалём на аўтазаводзе імя Ліхачова. У 1961 паступіў на завочнае аддзяленне Літаратурнага інстытута і ў 1967 паспяхова абараніў дыплом. Вучобу сумяшчаў з працай на заводзе. З 1971 працаваў майстрам, намеснікам начальніка цэха па вытворчасці, начальнікам участка, інжынерам па кадрах. З 1985 на пенсіі. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы, медалём.

Цяга да паэтычнага слова, да народнай песні абудзілася ў І. Леткі ў раннім маленстве. Першы яго верш «На радзіме» апублікаваны ў газеце «Чырвоная змена» (1959), пасля чаго яго вершы сталі часта з'яўляцца на старонках беларускіх перыядычных выданняў, гучаць па радыё. У 1960 у часопісе «Полымя» надрукавана падборка вершаў з прадмовай Р. Бярозкіна. Аўтар зборнікаў паэзіі «Тры крокі ад сонца», «Тры верасні», «Грамы на зімоўцы» і інш. Харство прыроды, паэтызацыя стваральнай працы, гісторыя і сучаснасць — асноўныя матывы лірыкі паэта. Яркая метафарычная вобразнасць спалучаецца ў яго з апавядальна-спакойным рытмічным ладам. У паэме «Каліноўцы» створаны вобразы гераічных удзельнікаў паўстання 1863—64.

Жыве ў Маскве.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Тры крокі ад сонца: Вершы. Мн., 1967. Рэц.: Бярозкін Р. Чалавек пры агні // Беларусь. 1968. № 4; Кляўко Г. Путы і пратуберанцы // ЛіМ. 1968. 6 лют.; Марціновіч А. // Чырв. змена. 1968. 6 лют.; Мысліве ц В. // Вяч. Мінск. 1968. 21 сак.; Шаховіч М. Паэзія моцных рук // Мін. праўда. 1968. 7 чэрв.

Тры верасні: Вершы. Мн., 1970. Рэц.: Семашкевіч Р. На подступах // ЛіМ. 1970. 2 кастр.

Грамы на зімоўцы: Вершы і паэма. Мн., 1974.

Агні ў пралётах: Вершы. Мн., 1991.

1.3.

1959. На радзіме: [Верш] // Чырв. змена. 12 лют.; Голас мой: [Верш] // Там жа. 17 мая; Лётаюць сэрцы: [Верш] // Там жа. 20 ліп.; «Край васільковага лета...»: [Верш] // Там жа. 26 жн.

1960. Сокал; «Буты»; «Млявы дзень...»; Чалавеку: [Вершы] // Полымя. № 7.

1961. Полымя: [Верш] // Полымя. № 10; Насуплюся часам...: [Верш] // ЛіМ. 17 студз.

1962. Нашы рукі; Маленькі гаспадар: [Вершы] // Маладосць. № 5; Бульба: [Верш] // Полымя. № 12; Не ўзрывайце вышыні: [Верш] // ЛіМ. 19 чэрв.; Шапоча вецце: [Верш] // Чырв. змена. 16 чэрв.

1963. Афрыка: [Верш] // Знамя юности. 5 нояб.; Равеснікі: [Верш] // ЛіМ. 1 сак.; Моўчкі...: [Верш] // Там жа. 12 ліст.; Сіні дзень: [Верш] // Сел. газ. 10 февр.; Мядзведзь: [Верш] // Чырв. змена. 31 кастр.

1964. Пейзажы: [Верш] // Гродн. правда. 26 сент.

1965. Дарогі; Ля домнаў; Ціхія; Трывога; «Каласамі ўпёрлася жыта ў сіні...»: [Вершы] // Маладосць. № 7; «Каласамі ўперлася жыта...»: [Верш] / ЛіМ. 9 ліп.

1966. Ільіча я ведаю жывога: [Верш] // Чырвоныя лісткі календара. Мн.; Полымя. № 4.

1967. Лявоніха: [Верш] // Дзень паэзіі — 67. Мн.; Ільіча я ведаю жывога: [Верш] // Мы славім Леніна, мы славім партыю. Мн.; Сынок; Гром: [Вершы] // Беларусь. № 6; Гавораць, нібы сэрца не празрыстае: [Верш] // Маладосць. № 7; З кнігі «Тры крокі ад сонца»: Мая праўда; Тры крокі ад сонца; Апошняя электрычка; Дарога з гор; Чорны колер; Рукі; «Сціснецца сэрца да слёз...»; «Крапіва ў маленстве...»; Харты; Дзеці вайны; Паўлюк Багрым; Вясна ў кузні; «Руду здабывалі ў балотах багі...»; «Жывуць драпежныя звяры...»; «Трэба крычаць...»: [Вершы] // Полымя. № 6; Калі на фронт...: [Верш] // ЛіМ. 11 жн.

1969. Ільіча я ведаю жывога: [Верш] // Жыве між нас геній. Мн.

1970. Мастаўляны: [Верш] // Беларускі каляндар. 1971. Беласток; Ільіча я ведаю жывога: [Верш] // Чырв. змена. 21 студз.

1976. Я зайздрошчу майстрам, што ўстаюць на зары: Малое шчасце; Майстра, ціха!: [Вершы] // ЛіМ. 26 сак.; Ільіча я ведаю жывога: [Верш] // Чырв. змена. 18 сак.

1977. Рукавіцы: [Верш] // Дзень паэзіі — 77. Мн.; Урачысты будзень; Добры дзень, Масаляны!; Восень: [Вершы] // Полымя. № 10; Субботник; «Светает... На работу тороплюсь...»; Характеристика: [Вершы] // Рабочая смена. № 4.

1980. Сябрам юнацкае пары; Стома; «У дзень зарплаты кавалі...»; «Над густою калінай...»; «Пад сцежку даў ныpца ручай...»; Надзея; Гусі-лебедзі: [Вершы] // ЛіМ. 18 студз.

1981. Бераставіцкі бальшак: [Верш] // ЛіМ. 7 жн.

1982. Спадчына: [Верш] // Полымя. № 6.

1984. Вячэрняя змена; «Дым. Кузня. Горкае гарэнне...»; На глыбах бетону; Лясы; Балада пра Паўлюка Багрыма; Першы снег: [Вершы] // ЛіМ. 31 жн.

1.5.

На рускую мову. Энергия; Сокол: [Вершы] / Пер. Г. Рябчиков // Техника — молодежи. 1964. № 9; Две руки: [Верш] / Пер. Г. Рябчиков // Там жа. 1966. № 9; Знаю Ильича живым: [Верш] / Пер. А. Шарапов // Сов. Бел. 1966. 1 мая; Где молоты бьют: [Верш] / Пер. В. Эльхин // Соц. индустрия. 1972. 26 июля; Горячий цех: Тополя; В ночную смену; «Я все могу...»; «Светает...»; Субботник; Характеристика: [Вершы] / Пер. В. Гуринович // Неман. 1975. № 11; Характеристика: [Верш] / Пер. В. Гуринович // Рабоче-крестьян. кор. 1979. № 2; Сокол: [Верш] / Пер. И. Василевский // Извечной песни голоса. Мн., 1980; Корни: «Время, погоди маленько...»; Дядьки; «А у нас в октябре...»; Металл и слово; «Тороплюсь...»: [Вершы] / Пер. В. Гуринович // Неман. 1981. № 1; «Светает...»; Характеристика: [Вершы] / Пер. В. Гуринович // Аврора. 1983. № 1; Красная суббота: [Верш] / Пер. Н. Котенко // Гудок. 1983. 16 апр.

На ўкраінскую мову. Бульба: [Верш] / Пер. М. Сингаївський // Прапор. 1963. № 1; Молода гвардія. 1966. 5 груд.

2.3.

На беларускай мове. Бярозкін Р. У добры час // Полымя. 1960. № 7; Вялюгін А. Вершы моцных рук // Летка 1. Тры крокі ад сонца. Мн., 1967; Грахоўскі С. Крытэрый патрабавальнасці // Полымя. 1971. № 4.

М. П. Барташэвіч.

ЛЕЎ КРЭЎЗА

Леў (Лявон) Крэўза Жавускі (дата і месца нараджэння невядомы — 1638, Смаленск), пісьменнік-палеміст 1-й паловы 17 ст., смаленскі уніяцкі архіепіскап.

Паходзіў з дробнай беларускай шляхты на Падляшшы (па мянушцы Бэйда). Будучы чалавекам бедным, пастрыгся ў манахі віленскага манастыра св. Тройцы і прыняў імя Леў. У 1617 без ведама і санкцыі мітрапаліта Іосіфа Вельяміна-Руцкага паслушнікамі быў выбраны архімандрытам. Бачачы здольнасці і стараннасць Льва Крэўзы, мітрапаліт не аспрэчваў гэта рашэнне. І новы архімандрыт апраўдаў давер. Ён стаў падтрымліваць палітыку Руцкага, скіраваную на сцвярджэнне уніяцтва, наладзіў у Вільні публічны дыспут з антыуніятамі. Каб даказаць гістарычную заканамернасць і пераемнасць традыцый Фларэнційскага сабора 1439, удзельнікі якога заклікалі да аб'яднання праваслаўных патрыярхаў з папай рымскім, Леў Крэўза ўзяўся за пяро, імкнучыся знайсці ў далёкай гісторыі, пачынаючы ад часоў хрышчэння Кіеўскай Русі, факты, якія б сведчылі пра адзінства хрысціянскай царквы. Ён напісаў на польскай мове палемічны твор «За сінодам Фларэнцкім» (не збярогся), накіраваны супраць ананімнага праваслаўнага апалагета Клірыка Астрожскага (паводле сведчання М. Возняка, пад гэтым псеўданімам схаваў сваё імя Гаўрыіл Дарафеевіч), які ў 1598 надрукаваў антыуніяцкую «Гісторыю аб разбойніцкім Фларэнційскім саборы». У абарону Брэсцкай уніі 1596 скіраваны таксама яго польскамоўны апалагетычна-палемічны твор «Абарона царкоўнай еднасці, або Доказы, якія сведчаць, чаму грэчаская царква павінна быць аб'яднана з лацінскай». Рэкамендаваная да друку па загаду мітрапаліта І. Вельяміна-Руцкага, «Абарона...» выдадзена ў 1617 у Вільні ў друкарні Л. Мамоніча. У гэтым творы Леў Крэўза пераказаў гісторыю уніі, змясціў звесткі пра ўсіх кіеўскіх мітрапалітаў і выказаў думку, што многія з іх імкнуліся да адзінства з Рымам. Друкуючы «Абарону...» на польскай мове, аўтар абяцаў у хуткім часе перавыдаць яе на старабеларускай. Але невядома, ці ажыццявіў сваё абяцанне, бо такое выданне не знойдзена. Апрача двух вышэй названых твораў Леў Крэўза пакінуў пасля сябе польскамоўны рукапіс «Абарона манастыра св. Тройцы», які надрукаваны толькі ў 1702. Гэты рукапіс, рэкамендаваны мітрапаліту і ордэну базыліян, паслужыў у свой час падставай выбрання Льва Крэўзы протаархімандрытам (генералам) ордэна базыліян на кангрэгацыі 1621 у Лаўрышаве. Праз 4 гады мітрапаліт Руцкі прызначыў яго архіепіскапам смаленскім і чарнігаўскім. У Смаленску Леў Крэўза пражыў каля 15 гадоў і пэўны час быў уніяцкім канкурэнтам праваслаўнага епіскапа Ісайі Капінскага. Але канкурэнцыя была нядоўгай: калі ў 1631 памёр праваслаўны мітрапаліт Іоў Барэцкі, І. Капінскі, выбраны кіеўскім мітрапалітам, пакінуў Смаленск. Леў Крэўза застаўся тут адзін і прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх справах уніяцкай царквы. Адсюль у 1629 ён ездзіў на сінод у Львоў, дзе меркавалася прымірыць праваслаўных з уніятамі.

А. Ф. Коршунаў.

Бібліяграфія

1.2.

Obrona jedności cerkiewnej abo dowody, ktoremi się pokazuie, iż Grecka cerkiew z Łacińką ma być ziednoczona. Wilno, 1617.

Kazanie o światobliwym żywocie... oyca Iosaphata Kuncewicza... [Połock?], 1625 / Аўт. спрэчнае.

Obrona monasteru św. Troicy. Wilno, 1702.

Lev Krevza's „Obrona iedności cerkiewney" and Zaxarija Kopysteńskyis „Palinodija": Harvard library of Early Ukrainian literature: Texts. Vol. 3. Harvard, 1988.

1.3.

1878. Obrona jedności cerkiewnej // Памятники полемической литературы в Западной Руси. Спб., 1878. Кн. 1 (РИБ. Т. 4).

2.3.

На рускай мове. Говорский К. Иосафат Кунцевич полотский униятский архиепископ // Вестн. Юго-Зап. и Зап. России. 1862. Т. 2; М. П. Древняя рукописная Палинодия // Лит. епарх. вед. 1898. № 21; Сокол С. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI — первой половины XVII в. Мн., 1984. С. 117.

Т. М. Махнач.

ЛЕЎЧЫК ГАЛЬЯШ

Леўчык Гальяш [сапр. Ляўковіч Ілья Міхайлавіч; інш. псеўд. Гальяш Л.,. Гля-гля Бач, З-пад Мігоўскі, крыпт. Г. Л., Га-Ле; 29.7(7.8).1880, Слонім — 1944, Варшава], паэт, празаік, перакладчык.

Нарадзіўся ў сям'і вясковага каваля, які з роднай вёскі Шэйпічы, што ля Ружанаў, пераехаў у Слонім. Г. Леўчык скончыў Слонімскае павятовае вучылішча, служыў у Слоніме пісарчуком у каморніка, у канцылярыях з'езда міравых суддзяў, судовага следчага. З маленства выявіліся яго здольнасці маляваць, іграць на скрыпцы і гітары, спяваць. На курсах у родным горадзе набыў прафесію чарцёжніка. У 1904 выехаў у Варшаву, дзе да пачатку першай сусветнай вайны служыў чарцёжнікам. У пачатку 1920-х гадоў спрабаваў перабрацца на сталае жыхарства ў Вільню, але не ўладкаваўшыся тут на службу, вярнуўся ў Варшаву, дзе часам таксама даводзілася быць беспрацоўным. У Слонім прыязджаў кожнае лета, на бацькавым пляцы пабудаваў невялікі домік. На радзіме яму добра адпачывалася, добра думалася, плённа пісалася. Адарванасць ад радзімы абвастрыла патрыятычныя пачуцці, выклікала патрэбу служыць свайму народу. У 1908—12 рэгулярна супрацоўнічаў з газетай «Наша ніва», дасылаў туды творы, падпісаныя псеўданімам Гальяш Леўчык. Па заданні патрыятычна настроеных сяброў-аднадумцаў збіраў сродкі на пасмяротнае выданне твораў Сяргея Палуяна, яго ж памяці прысвяціў верш «Мне трэба ўмярці», да якога, паводле сведчання сучаснікаў, сам напісаў музыку і які любіў спяваць. Часта са свайго сціплага бюджэту выкройваў сродкі на розныя культурныя і выдавецкія мерапрыемствы, быў актыўным збіральнікам матэрыялаў для Беларускага музея ў Вільні. Г. Леўчык збіраў беларускія друкаваныя выданні (у яго асабістай бібліятэцы, як сведчаць сучаснікі, былі некаторыя нумары «Мужыцкай праўды» К. Каліноўскага, кнігі «Дудка беларуская» Ф. Багушэвіча, «Вянок» М. Багдановіча і інш.). Як жыхар Варшавы аказваў таварыскія паслугі сябрам і знаёмым з Беларусі, якія траплялі ў Польшчу, гуртаваў іх у зямляцтва, падтрымліваў асабістыя сувязі з Я. Купалам і Я. Коласам, быў пад непасрэдным уплывам іх творчасці.

Першыя вершы Г. Леўчык апублікаваў у 1908. У 1912 выдаў у Вільні зборнік вершаў «Чыжык беларускі». Творы яго пераважна настраёвыя, сумныя. Лірычны герой цесна звязаны з народам і пакутуе разам з ім. Пратэст супраць сацыяльнага зла ў гэтага героя выліваўся ў бунт сумлення. Паэт асуджаў адшчапенцаў і прыстасаванцаў («Хто адрокся сваіх»). У зборніку сустракаюцца журботна-меланхалічныя вобразы — адарванага ці засохлага лістка, пустых разор, замшэлых хат, спаленага жалем сэрца. Імперыялістычная вайна і разуменне яе сапраўдных прычын зрабілі значны ўплыў на станаўленне светапогляду і ідэалаў Г. Леўчыка як грамадзяніна і паэта. У яго творчасці з'явіліся антываенныя матывы («Восень», «Стогнуць, енчаць лес і горы» і інш.). У вершах Г. Леўчыка 20-х гадоў важнае месца заняла тэма Заходняй Беларусі. Ад імя суайчыннікаў паэт асуджаў усталяваны тут польскімі ўладамі рэжым. Стварыў шэраг вершаў у жанры палітычнай сатыры (некаторыя з іх змяшчаліся ў часопісе «Маланка»). Творы Г. Леўчыка гэтага часу арганічна ўліваліся ў рэчышча рэвалюцыйнага заходнебеларускага рамантызму, які прадстаўлялі яго сучаснікі У. Жылка, Л. Родзевіч, І. Канчэўскі («Дзіка бура загудзела», «Цень беларускага лірніка», «Волат», «Груганы», «Не нам беларусам» і інш.). У 20-я гады ён напісаў філасофска-медытацыйныя паэмы ў прозе «Харaство» і «Чалавек», у якіх абвяшчаў харaством усеагульную гармонію быцця і праўду мастацкага пазнання, прызваннем чалавека лічыў вечнае ўдасканаленне. У гэты ж час ім створаны празаічныя і публіцыстычныя творы. Г. Леўчык быў непасрэдна звязаны з вызваленчым рухам Заходняй Беларусі, што паступова прыўносіла ў яго творы аптымістычныя матывы. Ён быў актыўным карэспандэнтам дзіцячага часопіса «Заранка», спецыяльна для яго пісаў вершы, вершаваныя загадкі, прозу. Перакладаў для заходнебеларускага чытача лепшыя творы польскай і сусветнай паэзіі. Захавалася эпісталярная спадчына паэта, якая выяўляла яго грамадзянскую актыўнасць (прыкладаў намаганні адкрыць у Вільні выдавецтва «Кніжніца»; грамадскасць прасіла яго ў 1928 даць згоду балаціравацца ў паслы сей-

ма, але ён, бачачы ўзмацненне дыктатуры санацыі, адмовіўся). У 1930-я гады жыў у Слоніме (на вул. 3-га Мая, пазней Чырвонаармейскай у доме 73); у 1939 яго тут наведалі Я. Купала і М. Лынькоў. Г. Леўчык шчыра вітаў вызваленне Заходняй Беларусі і прыезд вядомых пісьменнікаў у сваёй прамове на мітынгу ў грамадскім клубе. Клапоцячыся пра лёс сваёй унікальнай варшаўскай бібліятэкі, ён у тым жа годзе выехаў у Польшчу. У слонімскім доміку засталася жыць жонка Зося, якую ў 1942 расстралялі фашысты. У 1944 варшаўскі дом Г. Леўчыка, дзе ён жыў тады, быў разбураны бомбай, а ў верасні ў акупіраванай польскай сталіцы памёр і ён сам.

Індывідуальную своеасаблівасць паэзіі Г. Леўчыка надаюць шчырасць і высакароднасць аўтарскага пачуцця. Знамянальны ў гэтых адносінах апошні з вядомых нам яго вершаў «Маё ўвасабленне», датаваны 1938. У гады Вялікай Айчыннай вайны верш Г. Леўчыка «Хто адрокся сваіх» быў вельмі папулярны сярод партызан. Перапрацаваны ў асяроддзі народных мсціўцаў, ён выкарыстоўваўся як лістоўка. Гэты варыянт верша змешчаны ў зборніку «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны» (Мн., 1961). *З. П. Мельнікава.*

Бібліяграфія

1.1.

Доля і хлеб: Выбр. тв. Мн., 1980. Рэц.: Зингер Д. За счастье народа // Гродн. правда. 1980. 11 нояб.; Клімуць Я. З кагорты першых // Полымя. 1981. № 7; Sielicki F. // Sl. Orient. 1983. Nr 3.

1.2.

Čyžyk biełaruski: (Wieršy). Wilnia, 1912.

1.3.

1908. «Хоць цэлы дзень цябе смех браў...»: [Верш] // Н. н. 15 лют.; Іх шкада мне: [Верш] // Там жа. 15 жн.

1909. Ой, цяжка: [Верш] // Н. н. 1 студз.; «Нашай Ніве» ў трэцюю гадаўшчыну: [Верш] // Там жа. 26 ліст.

1910. «Смешна часам баеш, дзядзька...»: [Верш] / Н. н. 8 сак.; Шэрая гадзіна: [Верш] // Там жа. 10 чэрв.; Зламайце дудку: [Верш] // Там жа. 8 ліп.

1911. «Усё пераходзе, ўдалі знікае...»; «Я чайка слабая...»: [Вершы] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1911 год. Вільня; Цяжка часам...: [Верш] // Н. н. 7 ліп.; Дружна брацця!..: [Верш] // Там жа. 18 жн.; Сірата: [Верш] // Там жа. 15 снеж.

1912. Дружна, брацця!..: [Верш] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1912 год. Вільня; Пры калысцы: [Верш] // Н. н. 2 лют.; «Жальбай зноў спатыкаю вясну...»: [Верш] // Там жа. 21 чэрв.

1913. «Жальбай зноў спатыкаю вясну...»; Пры калысцы: [Вершы] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1913 год; Вільня; Малітва каня // Саха. № 15; Мы жывем надзеяй!..: [Верш] // Беларус. 21 лют.; Вечны батрак жыцця: [Верш] // Н. н. 10 кастр.

1914. «Жальбай зноў спатыкаю вясну...»: [Верш] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1914 год. Вільня; Без працы: (Казка) // Беларус. 2 крас. / Пад крыпт. Л. Аўт. спрэчнае.

1919. Мы жывём надзеяй: [Верш] // Бел. жыццё. 5 чэрв.; Проці — усерасійскі фронт // Беларусь. 16 ліст. / Пад крыпт. Г. Л.; У табары «единой, неделимой» // Там жа. 18, 19 ліст. / Пад крыпт. Г. Л.

1920. Дажынкі на Беларусі ў 1920 г.: [Верш] // Бел. слова (Гродна). 22 кастр. / Пад псеўд. Гальяш Л.; Гдзе выхад? // Беларусь. 25 крас. / Пад крыпт. Г. Л.

1921. Нічога не хочу; Хто адрокся; Дажынкі на Беларусі ў 1920 г.: [Вершы] // Дэкляматар. Вільня; Мы не дбаем (Пераробка з Міцкевіча): [Верш] // Сялян. доля. № 3 / Пад крыпт. Г. Л.; «Стогнуць, енчаць лес і горы...»: [Верш] // Бел. звон. 28 крас.; Следам за дзедам: [Верш] // Там жа. 16 вер.; Восень: [Верш] // Там жа. 18 ліст.; Нічога не хочу...; Хто адрокся сваіх: [Вершы] // Бел. ведамасці. 23 кастр.; Дажынкі на Беларусі ў 1920 г.: [Верш] // Там жа. 25 снеж.

1922. Прысяга незалежнасці: [Верш] // Наш шлях. № 4 / Пад крыпт. Г. Л.; Поп Іван: (Апавяданне) // Бел. вёска / Пад крыпт. Л. Аўт. спрэчнае; «Жаваранкаў хоры цешаць нашу ніву...»: [Верш] // Бел. звон. 22 крас. / Пад псеўд. Гальяш Л.

1923. З індускіх пагаворак: [Вершы] // Наша будучыня. 14 лют.

1924. Пры калысцы: (Пасвячаю Язэпу Гапановічу): [Верш] // Беларускі дэкламатар. Мн.; Беларусь — мой край: [Верш] // Заходняя Беларусь. Вільня.

1925. «Сваю родну зямлю хто чужынцу прадаў...»; «Мову родную хто пазабыў, асьмеяў...»: [Вершы] // Беларускі Гаспадарскі Каляндар на 1926 год. Вільня; Восень: [Верш] // Правасл. беларус № 17—18; Галгофа: (З Зм. Бядулі): [Апавяданне] // Там жа. № 19—20. / Пад крыпт. Г. Л.; Сон на Нёмане каля Шчары: [Верш] // Студэнцкая думка. № 3; Праф. Карскі аб беларускай мове; Следам за дзедам: (Беларуская прыказка): [Верш] // Там жа. № 4; Сон аб бацькаўшчыне мілай: [Верш] // Крыніца. 26, 31 ліп.

1926. На следстве: [Гумарэска] // Маланка. № 5. / Пад крыпт. Г. Л.; Людзі жывуць і на месяцы...: [Жарт] // Там жа. № 11 / Пад крыпт. Г. Л.; Палітыкі; Кепская пара; Абрабіў бы зямлю: [Жарты] // Там жа. № 13 / Пад крыпт. Г. Л.; Калыханачка: (Песня аб вастрожнай долі); Афарызм цяперашняга часу: [Верш]; Сам-бы не ўтапіўся: [Жарт] // Там жа. № 14. / Пад крыпт. Г. Л.; Мы жывём з надзеяй!: [Верш] // Бел. крыніца. 16 мая; Падарожны: [Верш] // Там жа. 30 мая; «Не нам, беларусам, не нам...»: [Верш] // Там жа. 18 ліп.; «Праўды яснай агні не патухнуць табе!..» [Верш] // Там жа. 1 кастр.; Беларускі сцяг: [Верш] // Там жа. 15 кастр.; Дзед лірнік над Шчарай: [Верш] // Там жа. 19 ліст.

1927. Мая прадмова; Чыжык; Падаюць лісці: (Ноктурно); «Ніхто маіх не знае слёз...»; «Калі ка мне смерць набрыдзе...»; «Каб усе так слёзы нашага народу...»; «Хто адрокся сваіх...»; Дудачка: (Пасвячаю Р. Зямкевічу); Льецца дожджык; Годзі; Дружна, брацця!..; «Усё, праходзе, ўдалі знікае...»; «Жальбай зноў спатыкаю вясну...»; Мы жывём надзеяй; Я багат, багаты; Восень; На дзяды; Конь-ратай; Сон на Нёмне каля Шчары: [Вершы] // Дварчанін І. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры. Вільня; Сёмуха: [Верш] // Заранка. № 4; Бяда: [Верш] // Маланка. 1 ліп.; Трыялет: [Верш] // Наша праўда. 27 жн. / Пад крыпт. Га-Ле; Праклён бядам і ліхам: [Верш] // Сялян. ніва. 16 сак. / Пад крыпт. Г. Л.; «Мудра прыгаворка — салодка і горка!»: [Вершы] // Там жа. 2 ліп.

1928. Хто адрокся?: [Верш] // Беларускі дэкламатар. Вільня; Пры калысцы: [Верш] // Дэкламатар. Мн., Годзі!: [Верш] // Страха. 12 лют.

1929. «Жальбой зноў спатыкаю вясну...»: [Верш] // Беларускі каляндар на 1929 год. Вільня.

1931. О, сэрца, ты не плач: [Верш] // Бел. думка. 12 крас.

1932. Харaство: (Абразок) // Нёман. № 3 / Пад крыпт. Г. Л.

1933. Вясна ідзе!: [Верш] // Хрысціянская думка. № 9 / Пад крыпт. Г. Л.

1961. Чыжык; Дружна, брацця!..; Я багат, багаты; Восень: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 1.

1962. Я багат, багаты: [Верш] // Ніва. 15 ліп.

1965. Беларуская калыханка; Душыцелям слова: [Вершы] // Сцягі і паходні. Мн.

1967. Зламайце дудку; «Каб усе так слёзы нашага народа...»; Пры калысцы: [Вершы] // Беларуская дакастрычніцкая паэзія. Мн.

1968. «Ніхто маіх не знае слёз...»; Браце Беларусе!: [Вершы] // Голас Радзімы. № 40.

1970. Чыжык; Ніхто маіх не знае слёз...: [Вершы] // ЛіМ. 24 ліп.

1980. «Я багат, багаты...»: [Верш] // Беларускі каляндар. Беласток; Чыжык; «Ніхто маіх не знае слёз...»; «Хто адрокся сваіх...»: [Вершы] // Ніва. 20 ліп.

1.4.

1921. Тувім Ю. Прабіўшы неба грозным вокам...: [Верш] / З пол. // Бел. звон. 19 жн.; Тэтмаер К. «Ты не гінь, як зране ў бою...»: [Верш] // Там жа. 4 ліст.; Яго ж. У чайцы на вадзе жыцця: [Верш] / З пол. // Бел. ведамасці. № 7; Зборнік «Бел. ведамасцей». № 2.

1923. Лесаўчыкі: З паэмы «Władysław IV król Polski i Szwedzki». Leszno, 1649. / З пол. // Крывіч. № 1 / Пер. пад крыпт. Л. Аўт. пер. спрэчнае; Білюнас Ю. Смерць Брыся / З літ. // Там жа. № 5 / Пер. пад крыпт. Г. Л. Аўт. пер. спрэчнае.

1926. Лянге А. Аддай царам усё!: [Верш] / З пол. // Бел. справа. 14 ліп.

1927. Дзед Мароз: [Верш] / З рус. // Заранка. № 8—9; Сыракомля У. Лялька: [Верш] / З пол. // Родныя гоні. № 6; «Мудра прыгаворка — салодка і горка!»: [Верш з паметай «Са зборніка трыялетаў»] / З кіт. // Сялян. ніва. 9 ліп.; «Мудра прыгаворка — салодка і горка»: [Верш з паметай «Са зборніка трыялетаў Гальяша Леўчыка»] / З араб. // Там жа. 13 жн.; «Мудра прыгаворка — соладка і горка»: [Вершы з паметай «Са зборніка трыялетаў Гальяша Леўчыка»] / З хіндзі // Там жа. 20 жн.

1.5.

На польскую мову. Hej, bracia!; Jesień / Tł. J. Huszcza // Antologia poezji białoruskiej. Wrocław etc., 1978.

На ўкраінскую мову. Ой, тяжко...: [Верш] / Пер. М. Шаповал // Літ.-науковий вісник. 1909. № 10.

2.3.

На беларускай мове. Верас З. Гальяш Леўчык: [Успаміны] // Леўчык Г. Доля і хлеб. Мн., 1980; Войцік Л. [Зоська Верас]. Сустрэчы з Гальяшам Леўчыкам // ЛіМ. 1977. 30 вер.; Вірзоўскі С. [Біябібліяграфічная нататка да 105-годдзя нараджэння] // Полымя. 1985. № 7; Гарэцкі М. Леўчык Г. // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня. 1920; Гісторыя беларускай літаратуры: XIX — пачатак XX ст. Мн., 1981. С. 162; Іверс А. Гальяш Леўчык у «Нашай ніве» // Беларусь. 1973. № 2; Яго ж // Далёкі ўспамін // Леўчык Г. Доля і хлеб. Мн., 1980; Калеснік У. Ветразі Адысея. Мн., 1977. С. 71—73; Яго ж. Гальяш Леўчык // Калеснік У. Лёсам пазнанае. Мн., 1982; Яго ж. Даніна сэрца // Леўчык Г. Доля і хлеб. Мн., 1980; Яго ж. Зорны спеў. Мн., 1975. С. 173; Лойка А. Плеяда старэйшых адраджэнцаў // Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1980. Ч. 2; Мархель У. Лірнік вясковы. Мн., 1983. С. 185—186; Новік-Пяюн С. Гальяш Леўчык // Ніва. 1980. 20 ліп.; Яго ж. Дзядзька Гальяш: [Успаміны] // Леўчык Г. Доля і хлеб. Мн., 1980; Яго ж. Незабыўная сустрэча // Народны паэт Беларусі. Мн., 1962; Яго ж. Паэт-нашанівец // Голас Радзімы. 1968. № 40; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Рылко М. Лёс паэта // Голас Радзімы. 1970. № 31; Саламевіч Я. Голас высакароднай душы // ЛіМ. 1980. 25 ліп.; Туронак Ю. Пра Гальяша Леўчыка // Беларускі каляндар. 1980. Беласток. 1980; Хмара С. Гальяш Леўчык // Шлях моладзі. 1938. № 25; Шаховіч М. Гальяш Леўчык // Ніва. 1980. 28 вер.; Ф-ко Ю. Беларусь у песнях // Бел. эхо. 1918. 30 сент.; Ярош М. Янка Купала і беларуская паэзія. Мн., 1971. С. 147—148.

На польскай мове. ex. [Abramowicz Z. P.] H. Leuczykowi nic nie grozi // Prż Wileński, 1926. Nr 14; Haliasz Leŭczyk // Antologia poezji białoruskiej. Wrocław etc., 1978; Smreczyński K. Twórczość poetycka Białorusinów wileńskich // Słowo. 1931. Nr 220; W obronie poety białoruskiego // Prz. Wileński. 1926. Nr. 13.

На рускай мове. Карский Е. Илья Левкович // Карский Е. Белорусы. Пг., 1922. Т. 3. Вып. 3; Рылко М. Верный своей лире // Гродн. правда. 1976. 27 нояб.; Яго ж. Судьба «Чижика белорусского» // Гродн. правда. 1970. 1 авг.; Шундрик В. Поэт Гальяш Левчик: (О жизненном и творческом пути белорус. поэта) // Гродн. правда. 1963. 30 июля.

На Югаславіі мове. Dren J. O Belorusih in beloruskem slovstvu // Luč. 1933. Nr 9.

2.4.

На беларускай мове. Бічэль-Загнетава Д. Гальяш Леўчык: [Верш] // Бічэль-Загнетава Д. Загасцінец. Мн., 1985.

3.1.

ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 193; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 261—264.

В. У. Смольская.

ЛЕЦКА ЯЎГЕН

Лецка Яўген Рыгоравіч (псеўд. Я. Варанец; н. 20.4.1944, в. Пабрэззе Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), празаік, крытык, літаратуразнавец, перакладчык. Член СП Беларусі з 1977. Кандыдат філалагічных навук (1980).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Рыгор Іванавіч, маці, Надзея Сільвестраўна, мелі складаную радаслоўную. Паводле сямейнага падання, мужчыны з іх роду пасля разгрому паўстання пад кіраўніцтвам Шаміля былі перабіты, а малых дзяцей са старымі бабулямі выселілі ў Налібоцкую пушчу. А адтуль, пасля паражэння паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага, род быў перасе-лены на Навагрудчыну. На грамадзянска-патрыятычныя і маральныя пачуцці пісьменніка вялікі ўплыў меў бацька, у мінулым член Беларускай сялянска-работніцкай грамады. У 1951 Я. Лецка пайшоў у першы клас сямігадовай школы, якая размяшчалася ў будынку былога панскага маёнтка Косы Двор. Скончыў Нягневіцкую СШ (1962). У 1962 паступіў на беларускае аддзяленне філфака БДУ. У першы навучальны год трэба было «зарабляць» працоўны стаж, таму адначасова працаваў электракаршчыкам на падшыпнікавым заводзе, грузчыкам на станцыі Мінск-пасажырскі, потым працаваў у складзе будаўнічага атрада, ездзіў гідам-перакладчыкам з турысцкімі групамі па краіне і многае пабачыў. Хоць і лічыўся студэнтам стацыянара, у час вучобы на пятым курсе працаваў настаўнікам Ушанскай школы Бярэзінскага р-на, выкладаў там беларускую мову і літаратуру і нямецкую мову, вёў 4-ы клас, меў гадзіны ў вячэрняй школе. Скончыўшы ў 1967 БДУ, працаваў у Карэлічах інструктарам райкома камсамола, карэспандэнтам-арганізатарам раённага радыёвяшчання. Тут, у раённай газеце «Полымя», упершыню выступіў (1968) як журналіст. У 1968 паступіў у аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры БДУ. Потым працаваў у Інстытуце літаратуры АН БССР (1971—86). З 1986 у выдавецтве «Мастацкая літаратура» — старшы рэдактар рэдакцыі прозы, загадчык рэдакцыі крытыкі, літаратуразнаўства, драматургіі. Старшыня Рады згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» (з 1990).

Першая публікацыя Я. Лецкі ў рэспубліканскім друку — рэцэнзія ў газеце «Літаратура і мастацтва» (1972). Аўтар аповесцей «Па цаліку», «Дарога ў два канцы», манаграфіі «Выхаваўчая роля літаратуры». Кола інтарэсаў Я. Лецкі даволі шырокае. Аўтар сцэнарыя дакументальнага фільма пра Я. Купалу, перакладае з украінскай мовы, выступае ў перыядычным друку з нарысамі і артыкуламі па вострых праблемах сучаснасці — экалогіі, адносін да роднай мовы і інш.

Жыве ў Мінску. *Л. М. Гарэлік, А. М. Пяткевіч.*

Бібліяграфія

1.2.

Беларуская літаратура за гады савецкай улады: Метадычныя парады лектарам. Мн., 1973.

Па цаліку: Аповесць. Мн., 1977. (Першая кніга празаіка). Рэц.: Атрашкевіч В. Добрага шляху // ЛіМ. 1977. 9 снеж.; Васілевіч А. Багацее проза, багацее... // Полымя. 1978. № 7; Марцінавіч А. Азбука Васіля Травеня // Вяч. Мінск. 1978. 16 лют.; Петкевич А. Слово о людских судьбах // Гродн. правда. 1978. 17 февр.; Юрэвіч У. «Я чалавекам быць хачу...» // Маладосць. 1978. № 8.

Вялікая Айчынная вайна ў беларускай прозе. Мн., 1979. (Матэрыял у дапамогу лектару).

Выхаваўчая роля літаратуры. Мн., 1980. Рэц.: Бугаёў Д. Пафас патрабавальнасці // Полымя. 1981. № 11; Марцінавіч А. Літаратура, чытач, выхаванне // Звязда. 1981. 23 ліп.; Няхай М. Прынцыпова, перакананўча // ЛіМ. 1980. 26 снеж.; Піскун Л. Пошукі духоўных каштоўнасцей // Наст. газ. 1981. 23 снеж.

Современная белорусская проза: (Проблемы идейно-нравственного воспитания личности): Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1980.

Дарога ў два канцы: Аповесць. Мн., 1981. Рэц.: Далідовіч Г. Дарогі дадому і ў свет // Полымя. 1982. № 9; Жук І. Калі вяртаемся да сябе // Маладосць. 1982. № 10; Хорсун С. Усе мы з хат... // ЛіМ. 1982. 5 сак.

Харство і боль жыцця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка. Мн., 1985.

1.3.

1972. Ад «Маладняка» да «Узвышша» // Весн. БДУ. Сер. 4. № 2; Роўная сярод роўных: (Беларуская савецкая літаратура да 50-годдзя СССР) // Весці АН БССР. Серыя грамад. н. № 6; Второе рождение: [Рэц. на кн.: Бядуля З. Соловей; В дремучих лесах. Мн., 1971] // Неман. № 6; Ад вытокаў да сучаснасці: [Рэц. на кн.: Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы. Мн., 1972] // Полымя. № 10; Лірык нашага рання // ЛіМ. 4 лют.; Перажытае і надуманае: [Рэц. на кн.: Няхай Р. Туман над стэпам. Мн., 1971] // Там жа. 29 вер.

1973. У дні сённяшнім // Маладосць. № 6; [Рэц. на кн.: Жук А. Асеннія халады. Мн., 1972] // Неман. № 7; Вокам руплівым гаспадара: [Рэц. на кн.: Левановіч Л. Зялёны трохкутнік. Мн., 1973] // ЛіМ. 2 ліст.

1974. Талент, які многа абяцаў... // Калюга Л. Ні госць, ні гаспадар. Мн.; На трывалым грунце класікі // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 1; Пафас ягонага жыцця: [Рэц. на кн.: Гусак С. Пафас праўды. Мн., 1973] // Маладосць. № 5; Свежы подых дажджоў: [Рэц. на кн.: Далідовіч Г. Дажджы над вёскай. Мн., 1974] // Там жа. № 12; Эхо войны: [Рэц. на кн.: Федотов В. Сорок дней. Мн., 1973] // Неман. № 6; Пераадоленне інертнасці: Літаратурна-мастацкая крытыка на старонках «Полымя» // Звязда. 7 жн.; Роздум над мастацкім словам: [Рэц. на кн.: Шкраба Р. Скарбы. Мн., 1973] // Там жа. 10 снеж.; «...Кто уж начал — тот не начинающий!» // Лит. газ. 11 дек.

1975. Неўміручы подзвіг народу: (Гераічная тэма ў беларускай прозе) // Полымя. № 5; Сцвярджэнне майстэрства: [Рэц. на кн.: Міськo П. Калянае лісце. Мн., 1974] // Звязда. 24 вер.

1976. Вопыт пройдзеных пуцявін: [Рэц. на кн.: Мушынскі М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 20—30-я гады. Мн., 1975] // Полымя. № 4; Сугучнасць паэзіі і жыцця: [Рэц. на кн.: Калеснік У. Зорны спеў. Мн., 1975] // Звязда. 31 сак.; Жывыя абрысы часу: Па старонках апавяданняў часопіса «Полымя» // Там жа. 25 крас.; Цяпло чалавечнасці: [Рэц. на кн.: Кудравец А. Дзень перад святам. Мн., 1975] // Там жа. 21 вер.; Перакосы тэмы мяшчанства // ЛіМ. 9 крас.; У калаўроце вясёлай фантазіі: [Рэц. на кн.: Семашкевіч Р. Бацька ў калаўроце. Мн., 1976] // Там жа. 19 ліст.; Шлях да свайго героя. [Рэц. на кн. Жук А. Паляванне на старых азёрах. Мн., 1975] // Чырв. змена. 6 студз.

1977. Па цаліку: Аповесць // Маладосць. № 5; Паміж вайной і домам: [Рэц. на кн.: Пташнікаў І. Найдорф. Мн., 1976] // Полымя. № 1; Шлях да сталасці: [Рэц. на кн.: Наўроцкі А. Валун. Мн., 1976] // Там жа. № 2; Чалавек і вайна // Вяч. Мінск. 16 лют.; Мудрае слова крытыкі: [Рэц. на кн.: Андраюк С. Вывяраючы жыццём. Мн., 1976] // Там жа. 19 мая; Зашчымела сэрца болем: [Рэц. на кн.: Міськo П. Мора Герадота. Мн., 1976] // Там жа. 15 ліст.; Асваенне новых далягляда ў: [Рэц. на кн.: Асіпенка А. Два дні і дзве ночы. Мн., 1977] // Звязда. 25 мая; Пра крытыка і грамадзяніна: [Рэц. на кн.: Конан У. Адам Бабарэка. Мн., 1976] // ЛіМ. 17 чэрв.; Маладосць вітаецца з жыццём // Там жа. 26 жн.; Памятай: ты чалавек // Там жа. 30 вер.; Пругкі вецер жыцця: [Рэц. на кн.:

Воранаў М. Ветраны дзень. Мн., 1976] // Чырв. змена. 6 вер.

1978. Крыніцы пульсуюць з зямлі // Маладосць. № 3; На блакітных дарогах Беларусі: [Рэц. на кн.: Кірэенка К. Вандроўнае шчасце. Мн., 1977] // Вяч. Мінск. 27 чэрв.; З пазіцый сучаснасці: Беларуская проза: асэнсаванне эпохі, часу, чалавека // Звязда. 8 мая; Цяпло «Халоднай птушкі»: [Рэц. на кн.: Жук А. Не забывай мяне. Мн., 1978] // ЛіМ. 13 кастр.

1979. Пачынаецца ўсё з даверу: [Рэц. на кн.: Варановіч А. Высокі падмурак. Мн., 1978] // Маладосць. № 10; Постигая бытие народа: [Рэц. на кн.: Адамчык В. Чужая бацькаўшчына. Мн., 1978] // Неман. № 4; Вайна стукае ў сэрца: [Рэц. на кн.: Казько В. Суд у Слабадзе. Мн., 1978] // Полымя. № 11; Харство і боль жыцця: [Рэц. на кн.: Адамчык В. Чужая бацькаўшчына. Мн., 1978] // Звязда. 30 сак.; Запавет яго жыцця: [Рэц. на кн.: Мележ І. Завеі, снежань. Мн. 1978] // ЛіМ. 2 лют.; Пайсці і застацца: [Рэц. на кн.: Быкаў В. Пайсці і не вярнуцца. Мн., 1979] // Там жа. 4 мая.

1980. Тепло активного добра // Дружба народов. № 2; Меж войною и миром // Там жа. № 10; [Рэц. на кн.: Миськo П. Море Геродота. М., 1979] // Лит. обозрение. № 10; Гордасць і сумленне народа // Маладосць. № 6; Дарога ў два канцы: Аповесць // Там жа. № 10; Ён побач з намі // Голас Радзімы. 3 ліп.; Урокі крытыка // ЛіМ. 11 крас.; Спатканне: Урывак з аповесці // Там жа. 11 ліп.

1981. Первооснова добра: [Рэц. на кн.: Гігевіч В. Жыціва. Мн., 1980] // Лит обозрение. № 5; Дарогай пошуку: [Рэц. на кн.: Гігевіч В. Жыціва. Мн., 1980] // Полымя. № 2; Даследчык роднага слова: Да 50-годдзя Інстытута літаратуры імя Я. Купалы // Вяч. Мінск. 18 чэрв.; Высакароднасць мэты // Голас Радзімы. 28 мая; Спадчына абавязвае // ЛіМ. 16 студз.; Дзеля супольнай карысці // Там жа. 6 сак.; Падараная радасць // Там жа. 21 жн.; Вяртанне ў перажытае: [Рэц. на кн. Ялоўчык Л. Дзе яно, шчасце... Мн., 1981] // Там жа. 25 вер.; Талент мужны і шчыры // Чырв. змена. 27 кастр.

1982. «Выше знамя борьбы за свободу и независимость» // Беларусь. № 2; [Рэц. на кн.: Киреенко К. Счастье странствий. Мн., 1981] // Неман. № 12; Скразное прачытанне пісьменніка: [Рэц. на кн.: Пяткевіч А. Сюжэт. Кампазіцыя. Характар. Аб прозе Кузьмы Чорнага. Мн., 1981] // Полымя. № 5; Балючая праўда вайны // ЛіМ. 24 вер.; Пад знакам таленту і працы // Там жа. 8 кастр.; З глыбінь народнага жыцця // Чырв. змена. 7 кастр.

1983. Вернасць роднаму краю // Братэрства. Мн.; Шырыня інтарэсаў мастака // Звязда. 14 студз.; Вернасць бацькаўшчыне // ЛіМ. 28 кастр.

1984. Душы празрыстае свячэнне // Маладосць. № 6; Ответственность критика: [Рэц. на кн.: Андраюк С. Жыць чалавекам. Мн., 1983] // Неман. № 6; Каб цякла жывая вада: Нарыс // ЛіМ. 6 студз.; Балючыя старонкі жыцця // Там жа. 16 сак.; Каласы прарастаюць з зярнятак // Там жа. 13 ліп.; Пярэдадзень эпапеі: (Над старонкамі «Знака бяды») // Там жа. 30 ліст.

1985. Балючыя старонкі жыцця: Штрыхі да творчага партрэта Міколы Аўрамчыка // Вобраз — 85. Мн.; «...І ва ўспрыняцці крытыкі» // ЛіМ. 11, 18 студз.; 8 лют.; Вернасць літаратуры // Там жа. 11 сак.; «Юны літаратар» запаліў паходню // Наст. газ. 20 сак.; Экзамены ў ВНУ: знаходкі і страты // Там жа. 19 кастр.

1.4.

Дрозд У. Крык птушкі ў прыцемку: Аповесць, раман, апавяданні / З укр. Мн., 1989. (Проза народаў СССР).

1983. Айліслі А. Дзесьці свяціліся вербы: Аповесць / З азерб. // Братэрства. Мн.

1984. Салаухін У. Вывадак; Камбінаваны вагон; Пад адным дахам; Мокры снег: Апавяданні / З рус. // Салаухін У. Пад адным небам. Мн.

1985. Герлоўскі А. Сівыя валасы; Дрэва яго сына: [Апавяданні] / З пол. // Далягляды. Мн.

1.5.

На рускую мову. Дорога в два конца: Повести / Пер. Т. Золотухина. М., 1984. Рэц.: Тычко Г. О неизбежности выбора // Неман. 1985. № 3.

Дорога в оба конца: Повесть / Пер. В. Машков // Неман. 1982. № 9, 10. Рэц.: Цейтлина Т. И мир вседневный многоцветен... // Знамя юности. 1983. 2 марта.

1.6.

Вобраз — 81. Мн., 1981 / Скл.

Пестрак П. Зб. тв.: У 5 т. Т. 4. Серадзібор: Раман. Мн., 1985 / Рэд.

Цяпло на першацвет: Апавяданні маладых беларускіх пісьменнікаў. Мн., 1985 / Скл.

Першыя сцежкі. Мн., 1987 / Скл.

Акно ў зялёны сад: Апавяданні. Мн., 1988 / Скл.

Дзяшкевіч М. Ад вытокаў радаводных...: Літ.-крытыч. арт., нарысы, успаміны аўт. Мн., 1991 / Скл.

Мрый А. Записки Самсона Самосуя: Роман, рассказы. М., 1991 / Скл.

Яўменаў Л. Зямлі беларускай прыцяжэнне // Голас Радзімы. 1980. 4 вер. / Зап.

2.3.

На беларускай мове. Андраюк С. Жыць чалавекам. Мн., 1983. С. 78—81; Гігевіч В. Па дарозе творчасці // ЛіМ. 1982. 12 ліст.; Кавалёнка В. Вечная веліч праўды жыцця: (Палемічныя нататкі) // Вобраз — 83. Мн., 1983; Яго ж. Сучаснасць і літаратура: герой, ідэйнасць, майстэрства // Полымя. 1985. № 7; Канэ Ю. Плынь. Мн., 1983. С. 124—125; Яго ж. Якімі мы былі — якімі станем // Полымя. 1981. № 8; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Савік Л. Каб не астыла цяпло зямлі. Мн., 1984. С. 53—55; Сініца П. Вобраз нашага сучасніка // ЛіМ. 1973. 13 ліп.; Тычына М. На службе часу // Там жа. 1978. 17 лют.

На рускай мове. Тычина М. Координаты поиска: Заметки о молодой белорусской прозе // Неман. 1979. № 4.

Я. А. Гарадніцкі.

ЛЁСІК ЯЗЭП

Лёсік Язэп Юр'евіч (Іосіф Ягоравіч, Іосіф Юр'евіч; псеўд. Я. Л. Апалчэнец, Л-к., Я. Л., Я. Л-к; 6.11.1883, в. Мікалаеўшчына Мінскага пав., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл.— 1.4.1940, Саратаў), празаік, публіцыст, мовазнавец, літаратуразнавец, палітычны дзеяч. Акадэмік АН Беларусі (1928, пазбаўлены звання ў 1930, адноўлены ў 1990).

Бацькі былі арандатарамі ў кн. Радзівілаў. У сям'і было дзесяцёра дзяцей, самы малодшы з іх Язэп скончыў 2 класы Мікалаеўскага народнага вучылішча. У 1897 спрабаваў паступіць у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, але на іспытах «зрэзаны» з-за беларускага акцэнту. У 1898 паступіў у Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю, але праз год выключаны «за непакорлівасць» без права паступлення ў іншыя навучальныя ўстановы. Адукацыю ўдалося атрымаць у Ноўгарад-Северскім (Чарнігаўшчына), дзе настаўнічаў яго брат Антон і куды ён пераехаў у 1900. Там Я. Лёсік скончыў гарадское вучылішча (1902), здаў экзамен пры гімназіі на званне настаўніка народнай школы і хатняга настаўніка пачатковай школы. Вярнуўшыся на Беларусь, настаўнічаў у Бабруйскай сельскагаспадарчай школе, выкладаў рускую мову. З 1903 Я. Лёсік працаваў у Грамячанскай школе Ноўгарад-Северскага пав. Там ён актыўна ўключыўся ў нелегальны рух, у 1905 арыштаваны за чытанне сялянам газет і каменціраванне тагачасных падзей. Зняволены ў Ноўгарад-Северскую турму. У 1907 меўся быць суд у м. Старадуб, аднак Я. Лёсік уцёк з-пад варты, перахаваўся нейкі час у сваякоў і знаёмых у Стоўбцах. Спрабаваў уцячы за мяжу. Потым 2 гады жыў у старэйшага брата Міхала, які працаваў начальнікам станцыі Красноўка недалёка ад Луганска. У 1911 зноў прыехаў у Ноўгарад-Северскі да брата Антона. Тут ён зноў арыштаваны і асуджаны на пажыццёвае пасяленне ў Сібіры (каля г. Кірэнск Іркуцкай губ., потым Бадайбо). Там ён пазнаёміўся і пасябраваў з А. Гаруном, працягваў самаадукацыю і падтрымліваў сувязь з цэнтрамі тагачаснага беларускага культурна-нацыянальнага адраджэння ў Вільні і Пецярбургу, дасылаў карэспандэнцыі, апавяданні і вершы ў газету «Наша ніва».

З Сібіры на Беларусь Я. Лёсік вярнуўся пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917. Пасяліўся ў Мінску. Уступіў у Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ), увайшоў у Беларускі нацыянальны камітэт, рэдагаваў яго газету «Вольная Беларусь» (1917—18). Адзін з арганізатараў беларускіх курсаў. 28.7.1917 выставіў сваю кандыдатуру ад БСГ у гласныя Мінскай гарадской думы. Пад час працы 2-га з'езда беларускіх нацыянальных арганізацый (21—23.7.1917) удзельнічаў у арганізацыі Беларускага вучыцельскага хаўруса, выбраны старшынёй Выканаўчага камітэта Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый (ЦРБА). Улетку пазнаёміўся з дачкой пісьменніка Ядвігіна Ш. В. Лявіцкай, з якой увосень 1917 узяў шлюб. Удзельнічаў у рабоце I сесіі ЦРБА (18—19.8.1917), увайшоў у Вялікую Беларускую раду, створаную на II сесіі ЦРБА (28—30.10.1917). Прымаў удзел у Беларускім навуковым з'ездзе (28.12.1917) і ў працы Усебеларускага з'езда (28—30.12.1917). У лютым 1918 удзельнічаў у працы Народнага сакратарыяту Беларусі і абвяшчэнні Беларускай народнай рэспублікі, увайшоў у склад яе Рады і некаторы час з'яўляўся старшынёй прэзідыума Рады БНР. Удзельнічаў у стварэнні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. Адначасова выкладаў на курсах беларусазнаўства і беларускіх курсах. Пры часе акупацыі Беларусі польскімі войскамі (1919—20) супрацоўнічаў у газетах «Звон» і «Беларусь» (апошнюю пэўны час рэдагаваў). Уваходзіў у склад Найвышэйшай беларускай рады. Тады ж пачаў працу над «Практычнай граматыкай беларускай мовы» і хрэстаматыяй па беларускай літаратуры «Наша крыніца». З устанаўленнем савецкай улады летам 1920 Я. Лёсік арыштаваны, але па хадайніцтву У. Ігнатоўскага вызвалены з турмы. У наступныя гады, адыйшоўшы ад палітыкі, прысвяціў сябе педагагічнай і навуковай дзейнасці. З ліпеня 1921 чытаў курс беларускай мовы ў БДУ і на 10-месячных беларускіх лектарскіх курсах. У 1922 абраны сапраўдным членам Інбелкульта, удзельнічаў у рабоце Тэрміналагічнай камісіі. Чытаў лекцыі ў Белпедтэхнікуме. У лістападзе 1926 выступіў з прамовай на Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе правапісу і азбукі. У 1928 зацверджаны правадзейным членам Беларускай Акадэміі навук (БАН). З'яўляўся дырэктарам Інстытута навуковай мовы. У пачатку 1930 пры-

значаны старшынёй Тэрміналагічнай камісіі. У 1920-я гады стварыў некалькі падручнікаў па беларускай мове: для школ — «Школьную граматыку», для тэхнікумаў — «Фанетыку», «Марфалогію» і «Сінтаксіс». Апрача гэтага ў перыядычным друку публікаваліся ягоныя публіцыстычныя артыкулы, пераклады, папулярна выкладзеныя навуковыя працы, апавяданні.

Летам 1930 Я. Лёсік паехаў у Мацэсту (Каўказ), каб падлячыцца ад ішыясу, набытага ў Сібіры. Там 17.7 быў арыштаваны па справе неіснаваўшага «Саюза вызвалення Беларусі». У адпаведнасці з прысудам калегіі ОГПУ ад 10.4.1931 высланы на 5 год у г. Камышын над Волгай. Там працы не знайшоў, таму жыў у г. Нікалаеўскім, выкладаў у педтэхнікуме. Летам 1933 да яго пераехала сям'я. У лістападзе 1934 пастановай УЦВК амністыраваны. Улетку 1935 прасіў дазволу на вяртанне ў Мінск, але атрымаўшы катэгарычную адмову, пераехаў з сям'ёй на Браншчыну. Год працаваў настаўнікам у Малавышкаўскай школе (ст. Злынка), адкуль наведваўся ў Гомель. Потым яму і тут адмовілі ў працы. Летам 1936 перасяліўся ў в. Дубаўка Саратаўскай вобл., дзе выкладаў у школе. Праз год яму зноў адмовілі ў працы. Восенню 1937 з сям'ёй пераехаў у г. Аткарск, дзе выкладаў у педтэхнікуме рускую мову і літаратуру. У час ссылкі напісаў сваю апошнюю працу — «Сінтаксіс рускай мовы» для педвучылішчаў. Рукапіс забраны ў час вобыску пры апошнім арышце (25.6.1938). Спачатку Я. Лёсік адбываў зняволенне ў Аткарскай турме, потым пераведзены ў саратаўскую турму. Апошнюю звестку сям'я атрымала ад яго 16.7.1938 (гэта была паштоўка, у якой ён развітваўся з сям'ёй). Я. Лёсіка расстралялі ў саратаўскай турме адразу пасля абвяшчэння пастановы так званай Асобай нарады пры НКУС СССР ад 31.3.1940. Справа 1938 спынена Саратаўскім абласным судом у 1958. Справа 1931 спынена судовай калегіяй Вярхоўнага суда БССР у 1988. У Стаўрапальскім краі жывуць дачка Я. Лёсіка Алеся, хросніца Я. Купалы, і сын Юры.

Літаратурную дзейнасць Я. Лёсік пачаў як празаік. Першы яго апублікаваны твор — пераклад даўнейшай грэчаскай казкі «Геркулес і селянін» (змешчаны ў «Нашай ніве» за 1912). Неўзабаве там жа з'явіліся яго допісы і карэспандэнцыі, а ў канцы 1912 — апавяданне «Ня ўсе ж разам, ягамосьці!» і публіцыстычныя нататкі «Пра лёс беларускага народа і яго мовы». У далейшым Я. Лёсік найболей праявіў сябе як публіцыст, хаця яго прыроджаная адоранасць і разуменне асветніцка-адраджэнцкіх задач тагачаснай беларускай літаратуры выяўляліся то ў вершаваных спробах (вершы друкаваў пад псеўд. Апалчэнец і крыпт. Я. Л.), то ў больш характэрных для яго празаічных жанрах. У 1921 рыхтаваўся да друку зборнік яго мастацкай прозы «Родныя вобразы», але быў забаронены. Кнігі Я. Лёсіка ў 20-я гады падвяргаліся значным цэнзурным праўкам.

Прозе Я. Лёсіка ўласціва эпічнасць, імкненне даць разгорнутую характарыстыку тыпажу, багатая палітра вобразна-маляўнічых сродкаў, псіхалагічная праўдзівасць. Асобую ўвагу звяртаў на канкрэтыку, дэталі быту, пейзажу, аднак Я. Лёсіка нельга назваць бытаапісальнікам. Ён па-мастацку выяўляў душу простага беларуса, пазбягаючы пры гэтым тэндэнцыйнасці. Пераклаў на беларускую мову «Маніфест Камуністычнай партыі», перарабіў на сучасную мову «Пінскую шляхту» В. Дуніна-Марцінкевіча. Публіцыстычны талент Я. Лёсіка асабліва яскрава раскрыўся ў 1917—20, калі ён шмат выступаў у друку па нацыянальным пытанні, якое найбольш востра хвалявала яго ў той час. Менавіта публіцыстыку ставіў Я. Лёсіку ў галоўную заслугу М. Гарэцкі, аднак з жалем дадаваў, што публіцыст у ім, магчыма, міжволі зашкодзіў белетрысту. Гарэцкі падкрэсліваў талент Лёсіка-апавядальніка (асабліва адзначаў яго «Апавяданне без назвы»), вылучаў нацыянальны характар яго творчасці. Праз цяжкія напластаванні доўгатэрміновых рэпрэсіўных забарон і агавораў усё ж прабіліся прарочыя словы М. Гарэцкага пра Я. Лёсіка: «Гэтага слаўнага пісьменніка чакае яшчэ слаўнейшая будучыня».

І. Э. Багдановіч, А. У. Жынкін.

Бібліяграфія

1.2.

«Ня ўсе ж разам, ягомосці!..». Вільня, 1914. Вільня, 1924.

Аўтаномія Беларусі. Мн., 1917; 2 выд., ксеракап. Мн., 1990.

Як Мікіта бараніў сваіх. Мн., 1917 / Сааўт. М. Міцкевіч.

Практычная граматыка беларускае мовы: Курс першы. Мн., 1921. Рэц.: Аглядальнік // Вестн. Наркомпроса ССРБ. 1921. № 2; Шукевич-Третьяков. Под фирмой патриотизма // Звезда. 1922. 26 сент.; 2 выд. Практычная граматыка беларускае мовы: Часць I. Мн., 1922; Практычная граматыка беларускае мовы: Часць II: Кароткі курс этымалогіі і сінтаксісу. Мн., 1922; 3 выд. Пачатковая граматыка. Мн., 1925; 4 выд., нанава напіс. Школьная граматыка беларускае мовы. Мн., 1926. Рэц.: Замбржыцкі С. // Асвета. 1927. № 2; Цвяткоў Л. // Там жа. 1927. № 2; 5 выд. Мн., 1927; 6 выд. Мн., 1927; 7 выд. Мн., 1928; 8 выд. выпр. Мн., 1929.

Беларуская мова: Пачатковая граматыка. Мн., 1924. Рэц.: А-нік // Асвета. 1924. № 2.

Беларуская мова: Правапіс. Мн., 1924. Рэц.: А-нік // Асвета. 1924. № 1; 2 выд., перапрац. і дап. Беларускі правапіс. Мн., 1925; 3 выд. Мн., 1926; 4 выд., нанава перапрац. і дап. Мн., 1927; Рэц.: Цвяткоў Л., Астроўскі Р. // Асвета. 1927. № 3; 5 выд. Мн., 1927; 6 выд., папр. і дап. Мн., 1928; 7 выд. Мн., 1928; 8 выд., выпр. Мн., 1929.

Сінтаксіс беларускае мовы. Мн., 1925; 2 выд., перапрац. Мн., 1926. Рэц.: Цвяткоў Л. // Асвета. 1926. № 8.

У справе рэформы нашае азбукі. Мн., 1925.

Спрашчэнне правапісу. Мн., 1926.

Да рэформы беларускага правапісу. Мн., 1926 / Сааўт. А. Лёсік.

Граматыка беларускае мовы: Фанетыка. Мн., 1926. Рэц.: Цвяткоў Л. // Асвета. 1926. № 8.

Граматыка беларускае мовы: Марфалогія. Мн., 1927.

1.3.

1912. Геркулес і селянін: (Даўнейшая грэцкая казка) // Зборнік «Нашае нівы». Вільня. № 2; Н. н. 26 ліп.; Сібір, г. Кірэнск, Іркуцкай губ. [Карэспандэнцыя] // Н. н. 23 лют.; Не ўсё ж разам, ягомосці!: [Апавяданне] // Там жа. 2, 9 ліст.; 1906—1912 // Там жа. 16 ліст. / У сааўт.

1913. Украінска-беларуская вечарынка ў Сібіры // Н. н. 10 студз. / Пад крыпт. Я. Л.

1914. Віншаванне з салдатаў: [Верш] // Беларус. 24 снеж. / Пад псеўд. Я. Л. Апалчэнец; Ці

запраўды мы ніколі не будзем мець свайго Міцкевіча, Пушкіна, Сенкевіча, Талстога? // Н. н. 7 лют. / Пад крыпт. Я. Л.; Першынка: [Апавяданне] // Там жа. 27 сак.

1916. Геркулес і селянін: (Даўнейшая грэцкая казка) // Беларускі каляндар на 1916 г. Вільня.

1917. Апавяданне без назвы: Яўхім-Плашка // Літаратурны зборнік «Вольнае Беларусі». Мн. Сш. 1 / Пад крыпт. Я. Л-к.; Як учынілася рэвалюцыя / Пад крыпт. Я. Л.; Апавяданне без назвы: Яўхім-Плашка // Вольная Беларусь. 28 мая; Нацыянальны ўціск // Там жа. 11 чэрв. / Пад крыпт. Я. Л-к; Настаўніцкі з'езд // Там жа. 20 чэрв. / Пад крыпт. Я. Л-к; Вялікі дзень на Украіне // Там жа. 24 чэрв. / Пад крыпт. Я. Л-к; Цёмныя сілы заварушыліся // Там жа. 1 ліп. / Пад крыпт. Я. Л-к; Хто вінавайца вайны // Там жа. 1, 26 ліп.; 3 жн.; Эканамічны заняпад Дзяржавы Расійскай // Там жа. 7 ліп. / Пад крыпт. Я. Л.; Пара звярнуць увагу // Там жа. 21 ліп. / Пад крыпт. Я. Л-к; Беларуская Рада // Там жа. 3 жн. / Пад крыпт. Я. Л-к; Наша культурнае свята // Там жа. 8 жн. / Пад крыпт. Я. Л-к; Што рабіць? // Там жа. 17 жн. / Пад крыпт. Я. Л-к; Сон рэдактара: (Маленькі фельетон) / Пад крыпт. Я. Л.; Няма веры; «Чаму гэта так?» // Там жа. 23 жн.; Граматыка і родная мова // Там жа. 30 жн. / Пад крыпт. Я. Л-к; Цэркаў і дэмакратыя // Там жа. 6 вер. / Пад крыпт. Я. Л-к; Апавяданне без назвы: Гаронім-ляснік // Там жа. 6, 11 вер.; Нашы патрэбы // Там жа. 11, 17 вер.; 4, 9 кастр. / Пад крыпт. Я. Л-к; Расійская рэспубліка // Там жа. 29 вер. / Пад крыпт. Я. Л.; Расійскае бязладдзе // Там жа. 15 кастр. / Пад крыпт. Я. Л-к; Устаноўчы Сойм // Там жа. 19 кастр. / Пад крыпт. Я. Л-к; Савет Расійскай Рэспублікі // Там жа. 26 кастр.

Пад крыпт. Я. Л-к; Вялікая Беларуская Рада // Там жа. 30 кастр. / Пад крыпт. Я. Л-к; Паўстанне і нашы заданні // Там жа. 8 ліст. / Пад крыпт. Я. Л-к; Сучасны момант / Пад крыпт. Я. Л-к; Падзеі апошняга часу: Хто такія бальшавікі? / Пад крыпт. Я. Л. // Там жа. 14 ліст.; Шлях паратунку; Падзеі апошняга часу: Скуткі бальшавіцкага паўстання // Там жа. 19 ліст. / Пад крыпт. Я. Л-к; Украінская Рэспубліка і этнаграфічныя граніцы / Пад крыпт. Я. Л-к; На што нам федэрацыя? / Пад крыпт. Я. Л. // Там жа. 23 ліст.; Нашыя адносіны да агульна-дзяржаўнага Сойму: Тлумачэнне // Там жа. 30 ліст. / Пад крыпт. Я. Л.; «Антось Лата»: «Сцэнічныя творы» Тараса Гушчы // Там жа. 8 снеж.; Вайна і мір; Кручаныя // Там жа. 21 снеж. / Пад крыпт. Я. Л-к.

1918. Што трэба ведаць кожнаму беларусу // Выданне «Вольнае Беларусі». Мн.; Сяло Мікалаеўшчына, Мінск[ага] павету // Вольная Беларусь. 7 студз; Наш правапіс // Там жа. 28 студз., 21 крас. / Пад крыпт. Я. Л-к; Родная мова і яе значэнне // Там жа. 24 лют.; 3, 10 сак. / Пад крыпт. Я. Л-к; Мір і Беларусь; Памятка беларусам маскоўскай прыхільнасці // Там жа. 10 сак. / Пад крыпт. Я. Л-к; Паўночныя Балканы // Там жа. 17 сак. / Пад крыпт. Я. Л.; Гісторыя Вялікага княства Літоўска-Беларускага: (Павэдлуг летапісаў) // Там жа. 24 сак. / Пад крыпт. Я. Л-к; Устаўная Грамата да народаў Беларусі // Там жа. 31 сак. / Без подпісу; Нёман: (Абразок) // Там жа. 14 крас.; Гісторыя вялікага княства Літоўска-Беларускага: (Павэдлуг летапісаў) // Там жа. 21 крас. / Пад крыпт. Л-к; Беларусь і Украіна // Там жа. 28 крас. / Пад крыпт. Я. Л-к; Рабочы стан пануючых і прыгвалчаных нацый // Там жа. 23 чэрв. / Пад крыпт. Я. Л-к; Памяткі старасвецкай беларускай мовы і пісьменства // Там жа. 30 чэрв. / Пад крыпт. Я. Л.; Апавяданне без назвы: Наша гаспода; Каля карчмы; Дома // Там жа. 6 ліп.; Нашы масты: (Гістарычныя нарысы павэдлуг кнігі Сямёнава «Живописная Россия») // Там жа. 6 ліп., 4 жн., 3, 15, 22, 29 вер., 20 кастр. / Пад крыпт. Я. Л-к; [Рэц. на кн.: Гарун А. Матчын Дар. Мн., 1918] / Пад крыпт. Я. Л-к; [Рэц. на кн.: Луцкевіч А., Станкевіч Я. Беларускі правапіс. Вільня, 1918] / Пад крыпт. Я. Л. // Там жа. 14 ліп.; Апавяданне без назвы: Падарож да навукі // Там жа. 11 жн. / Пад прозв. Я. Ліосік; [Рэц. на кн.: Гарэцкія М. і Г. Руска-Беларускі слоўнік. Смаленск, 1918; Карский Е. Белорусская речь: Очерки народного языка с историческим освещением. Пг., 1918] // Там жа. 18 жн. / Пад крыпт. Я. Л.; Апавяданне без назвы: «Панскія дзяўчаты», або Юзікава натура // Там жа. 6 кастр.

1919. Байка Багдана Хмяльніцкага: [Апавяданне] // Беларусь. 22 кастр.; Да агульнага ведама // Там жа. 18 ліст.; Апавяданне без назвы // Там жа. 20, 21 ліст.; Па валачобнаму: [Апавяданне] // Там жа. 2—4 снеж.; «Мой ты краю, родны, мілы...»: [Верш] // Звон. 25 жн. / Пад крыпт. Я. Л.; Чаму мы пішам Менск, а не Мінск // Там жа. 27 жн. / Пад крыпт. Я. Л-к; Кароткая гісторыя культурнага жыцця беларускага народу // Там жа. 27 жн., 1, 3 вер. / Пад крыпт. Я. Л-к; Каму гэта патрэбна? // Там жа. 29 жн. / Пад крыпт. Я. Л-к; Чытанне абвестак: (Кароткі фельетон) // Там жа. 1 вер. / Пад крыпт. Я. Л-к.

1920. Беларускія прыказкі // Рунь № 9—10; Некалькі слоў беларускім свяшчэннікам // Беларусь. 9 чэрв.; Прадмова Яна Чачота да яго зборніка «Сялянскія песні з-пад Нёмна і Дзвіны, некаторыя прыказкі і ідыятызмы [ідыёмы] у мове славяна-крывіцкай, з увагамі над ёю зробленымі», выданага ў Вільні ў 1846 г. // Там жа. 13 чэрв. / Пад крыпт. Я. Л.; Польска-літоўскія адносіны і Беларусь // Там жа. 20 чэрв. / Пад крыпт. Я. Л-к; З жыцця Менску // Н. н. 29 ліст. / Пад крыпт. Я. Л.

1921. Беларуская «Энеіда навыварат»; Значэнне «Энеіды» // Вольны сцяг. № 5; «Літва-Беларусь»: (Гістарычныя выведы) // Шк. и культура Сов. Бел. № 1—2.

1922. Бітва пад Грунвальдам у апісанні хронікі Быхаўца, Длугаша Бельскага і інш.; Нацыянальны элемент у творчасці Я. Коласа // Адраджэнне. № 1; [Прамова на магіле А. Бурбіса] // Сав. Бел. 21 сак.

1923. «Не ўсё ж разам, ягамосьці»: (Адрывак); Апавяданне без назвы: (Яўхім Плашка): [Апавяданні] // Выпісы з беларускае літаратуры. Мн.; З прадмовы перакладчыка да «Камуністычнага Маніфесту» // Сав. Бел. 15 сак; У справе рэформы нашай азбукі // Там жа. 6, 7 ліп.

1924. Культурны стан Беларусі к моманту Лютаўскае рэвалюцыі // Беларусь. Мн.; [Рэц. на кн.: Некрашэвіч С. Роднае слова. М.; Пг., 1923. Ч. 1] // Полымя. № 1; Некаторыя ўвагі да беларускай літаратурнай мовы // Там жа. № 2, 3.

1925. Кепска рабілі нашыя продкі... // Беларускі Гаспадарскі Каляндар на 1926 год. Вільня; Неўстаноўленыя выпадкі нашага правапісу // Полымя. № 2; Некаторыя ўвагі да беларускай літаратурнай мовы // Там жа. № 5.

1926. Да «рэвізіі» беларускага правапісу // Асвета. № 5; Да рэформы беларускага правапісу // Полымя. № 6 / Сааўт. А. Лёсік; Да рэформы беларускае азбукі // Звязда. 17 ліст.; Заключнае слова тав. Лёсіка // Там жа. 18 ліст.; Спрашчэнне беларускага правапісу // Там жа. 19 ліст.; Спрашчэнне правапісу // Сав. Бел. 9, 11, 18, 21, 22 вер.

1927. «Ня ўсе ж разам, ягамосці»; Апавяданне без назвы; Гаронім у дарозе: [Апавяданні] // Дварчанін І. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры (ад 1905 году). Вільня; Тэрміналагічная работа ў Інбелкульце і на мясцох // Асвета. № 8 / Сааўт. А. Цвяткоў; Тэрміналагічная работа ў Інбелкульце і збіранне народных тэрмінаў // Наш край. № 12; [Рэц. на кн.: Байкоў М., Некрашэвіч С. Беларускі слоўнік. Мн., 1926] // Узвышша. № 2; Граматычныя нататкі // Там жа. № 5; Да рэформы беларускай азбукі: (З дакляда члена Інбелкульта Я. Лёсіка) // Голас Беларуса. 23 лют.

1928. Граматычны склад мовы Ц. Гартнага // Полымя. № 10; **1929.** № 5, 7; Цікавішся — прачытай: («Лекцыі па гісторыі беларускай мовы» О. Левановіча) // Сав. Бел. 2, 3 лют.; Лісты ў рэдакцыю // Там жа. 24 лют.; Дзесяцігоддзе беларускае граматыкі (1918—1928) // Там жа. 6 мая; Беларуская Акадэмія навук і яе метад работы // Там жа. 1 ліст.

1929. Графіка, правапіс і мова ў тэстаменце кн. Саломерацкага і ў двух другіх дакументах з папер Са-

ломерацкіх XVI ст. // Зап. аддзелу гуманіт. н. Кн. 9 Працы клясы філёлёгіі. Т. 2.

1.4.

1918. Дунін-Марцінкевіч В. Залёты: [Пераклад польскага тэксту] // Вольная Беларусь. 24 сак.; Яго ж. Пінская шляхта: [Пер. з «пінчуцкай гаворкі»] // Там жа. 3, 15 вер.

1922. Баршчэўскі Я. Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях: Ваўкалак, беларуская легенда / З пол. // Адраджэнне. № 1.

1923. Сафронаў. Нацыянальнае пытанне і пралетарыят / З рус. // Сав. Бел. 17, 24, 25, 30 студз.; Маркс К., Энгельс Ф. Маніфэст Камуністычнай партыі // Там жа. 7—11 сак.

1.6.

Наша крыніца: Другое чытанне для пачатковых беларускіх школ. (З рысункамі). Мн., 1919 / Скл.

Наша крыніца: Чытанне для беларускіх школ. Ч. 1. Мн., 1920; Ч. 2. Мн., 1920; Ч. 3 і 4. Мн., 1920. Рэц.: // Вольны Сцяг. 1926. № 1; 2 выд. Берлін, 1922; 3 выд. Рыга, 1927 / Скл.

Дзе і чаго і як пішуцца прыгаворы пра навучэнне ў роднай мове // Вольная Беларусь. 1917. 30 жн. / Публ.; Беларускія прыказкі // Рунь. 1920. № 9—10 / Публ.; З папераў К. Каганца; З Багдана Залескага // Вольны сцяг. 1921. № 2 / Публ.; Каганец К. Нашыя птушкі // Зоркі. 1921. № 2 / Публ.; Нясканчаныя творы К. Каганца // Адраджэнне. 1922. № 1 / Публ.

2.3.

На беларускай мове. Байкоў М. Да пытання аб метадах і прыёмах нашае крытыкі // Полымя. 1928. № 1; Гарэцкі М. Лёсік Язэп // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920; 2 выд. Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; 4 выд. Мн., 1926; Дубоўка У. Да пытання аб рэформе нашае азбукі // Сав. Бел. 1923. 24 ліп.; Жылуновіч З. [Гартны Ц.]. «Нацыянал-дэмакраты за працай» // Маладняк. 1930. № 11, 12; Ксяневіч Я. Адкрыццё курсаў для павятовых настаўнікаў // Беларусь. 1919. 24 кастр.; Лімановўскі Я. За два гады класавай барацьбы ў літаратуры // Маладняк. 1931. № 6, 7; Луцкевіч А. Аб наш правапіс // Гоман. 1918. 9 крас.; Некрашэвіч С. Да пытання аб рэформе нашага правапісу // Звязда. 1926. 19 ліст.; Сачанка Б. Дазволю сабе нагадаць... // ЛіМ. 1989. 16 чэрв.; Шчэрбін В. Класавы дальтанізм: Каму патрэбна рэанімацыя «навуковых» поглядаў Язэпа Лёсіка? // Звязда. 1987. 20 вер.

На рускай мове. Клейнборт Л. [Я. Лесик] // Молодая Белоруссия. Мн., 1928; Сидоревич А. Долгий путь к истине: [Інтэрв'ю] / Зап. Г. Айзенштадт // Знамя юности. 1988. 10 нояб.

2.4.

На беларускай мове. Гарун А. З песняў няволі: [Верш] // Гарун А. Матчын дар. Мн., 1918.

3.1.

ЦДАКР Беларусі, ф. 42, воп. 1, спр. 516, л. 17—18; ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, спр. 194—195, ф. 30, воп. 1, адз. зах. 475, 490, 105б, 1311, 1346; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 266, 267; ЦДАМЛіМ Беларусі, ф. 66, воп. 1, адз. зах. 1409; ЦДГА Беларусі, ф. 24, воп. 1, адз. зах. 3666, спр. 36, 42. *З. У. Драздова, А. У. Жынкін.*

ЛІМАНОЎСКІ ЯНКА

Лімановўскі Янка (Іван Міхайлавіч; н. 1896, Дзісеншчына), празаік, крытык, літаратуразнавец, тэатральны дзеяч.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыўшы рэальнае вучылішча, вучыўся на агракурсах. У 1915 прызваны ў царскую армію. У сакавіку 1918 уступіў у РСДРП(б). На баку Чырвонай Арміі ўдзельнічаў у баях супраць нямецкіх і белапольскіх войскаў, быў ваенным камісарам дывізіі. Потым на розных ваенных і савецкіх пасадах. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Быў намеснікам дырэктара Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. У час нямецкай акупацыі працаваў у Мінску ў беларускім тэатры. У 1944 выехаў у Германію. Потым перасяліўся ў ЗША, дзе нейкі час быў лесарубам, потым узначальваў управу Беларускага інстытута навукі і мастацтва (Нью-Йорк). Уваходзіў у эмігранцкі ўрад (БНР), але потым выйшаў з яго. Некалькі разоў прыязджаў у СССР, бываў у Мінску.

Друкавацца пачаў у 1920. Першае апавяданне апублікаваў у 1925 («Полымя», № 1). Аўтар аповесцей «Вецер з Усходу», «Знойдзены клад», «Два шляхі», рамана «Над абрывам» і іншых празаічных твораў. Асноўная іх тэматыка — станаўленне савецкай улады на Беларусі, першыя сацыялістычныя пераўтварэнні. Аднак паказаны яны спрошчана, схематычна, учынкі герояў недастаткова псіхалагічна матываваны, моўная культура невысокая. Пасля вайны адыйшоў ад літаратурнай творчасці. *А. В. Мальдзіс, Б. І. Сачанка.*

Бібліяграфія

1.2.

Вецер з усходу: [Аповесць]. Мн., 1929. (Мастацкае слова — масам). Рэц.: Мікуліч Б. // Маладняк. 1929. № 11, 12; Сярэдні Ф. // Чырв. Бел. 1930. 25 студз.

Над абрывам: [Апавяданні]. Мн., 1929. Рэц.: Кабакоў Н. // Маладняк. 1929. № 10; Яго ж. Над абрывам // Штэрн. 1929. № 10 / Яўр. 2 выд. Мн., 1932.

1.3.

1920. Последние дни Борисова: [Нарыс] // Звезда. 10 июня.

1925. Адшуканы скарб: Апавяданне // Полымя. № 1, 3; У Савецкай і Заходняй Беларусі // Витеб. крест. газ. 16 дек.

1926. «Маладняк» і грамадская праца // Сталёвы ўзлёт. Мн.; Дзве пуціны: Апавяданне // Полымя. № 1, 3, 4; На парозе шостага году // Сав. Бел. 25 снеж.

1927. Бронемашына № 046: [Апавяданне] // Звязда. 13 ліст.; Гвалт над дыялектыкай і дыялектычнымі метадамі крытыкі // Сав. Бел. 1 студз.; Аб нацыянальным складзе насельніцтва Зах. Беларусі // Там жа. 25—27 лют.

1928. На разведцы: [Апавяданне] // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». № 3; Вецер з усходу: Апавяданне // Маладняк, № 12; Над абрывам: Аповесць // Полымя. № 5—8; Кроўю і нагайкаю: [Апавяданне] // Бел. вёска. 5 крас.; «Маладняк» перад з'ездам БелАППу // Звязда. 25 ліст.

1929. Прамова на першым з'ездзе БелАПП // Маладняк. № 1; Аб чарговых задачах БелАПП'у: Пераказ даклада Ліманоўскага на агульным сходзе Мінскай філіі БелАПП (22 лют. 1929) // Там жа. № 3; Гутарка з карэспандэнтам «Маладняка» // Там жа. № 7; В борьбе за белорусское напостовство // ЛГ. 9 янв.

1930. Задачы і перспектывы БДТ-2 // Маладняк. № 2; Аб культурнай арыентацыі // Там жа. № 5; Акуляры // Чырв. Бел. № 10; Дэкларацыя аргбюро Беларускага літаб'яднання Чырвонай Арміі і Флоту // Сав. Бел. 6 кастр.; Чырвонаарм. праўда. 8 крас. / У саўт.

1931. Бронемашына № 046: [Апавяданне] // Рытмы перамогі. Мн.; Прамова на X Усебеларускім з'ездзе Саветаў // Маладняк. № 3; На прарыве: Апавяданне; За два гады класавай барацьбы ў літаратуры // Там жа. № 6, 7; Маўклівая вымоўнасць: Апавяданне // Чырв. Бел. № 7; Разам з камсамолам — да новых перамог // Чырв. змена. 12 мая.

1932. Карчы на полі: Нарыс // Беларусь калгасная. № 6—7; На рыштаваннях суцэльнай: Нарыс // Полымя рэвалюцыі. № 1; Адным фронтам // ЛіМ. 28 сак. / У сааўт.; У секцыі літаратуры // Там жа. 15 снеж.

1933. Бронемашына № 046: [Апавяданне] // 11 ліпеня. Мн.; Заблытаная гісторыя // Полымя рэвалюцыі. № 1; Увага да мастацкай спецыфікі // Там жа. № 5; Аб творчасці Кузьмы Чорнага // ЛіМ. 13 чэрв.; Аб творчасці Міхася Зарэцкага // Там жа. 9 ліп.

1934. Ад Бабруйска — да Варшавы: Нарыс // ЛіМ. 12, 22 ліп.; На вялікай інтэрнацыянальнай магістралі // Там жа. 18 жн.; Равеснік герояў: Апавяданне // Там жа. 24 вер.

1935. Ад Бабруйска да Варшавы: [Нарыс] // Атака. Мн. Альманах 2; Камдыў Беларускай: Нарыс // Полымя рэвалюцыі. № 2; Майстры агня: Нарыс // ЛіМ. 23 лют.

1.4.

1931. Л і л я н а ў С. Таямніцы Дунаю: Апавяданне / З балг. // Маладняк. № 2.

1936. Л е о н М. Т. Карабель: Апавяданне / З ісп. // ЛіМ. 9 жн.

1.5.

На ўкраінскую мову. Білоруська література сьогодні // Плуг. 1930. № 11—12; Лист до редакції // Там жа. 1931. № 5—6.

На яўрэйскую мову. Над абрывам. Мн., 1932.

Аб творчасці Кузьмы Чорнага // Штэрн. 1933. № 8.

2.3.

На беларускай мове. А л я х н о в і ч М. На аванпостах пралетарскай літаратуры (1920—1930) // Маладняк. 1930. № 6—7; Г а р э ц к і М. «Маладняк» за пяць гадоў: 1923—1928. Мн., 1928. С. 86—89; Я г о ж. Творчасць маладнякоўцаў // Полымя. 1928. № 9; К л і м к о в і ч М. Нацдэмаўскае і трацкісцкае ахвосце — вон з літаратуры: (Да пытання аб прабыванні ў Саюзе савецкіх пісьменнікаў БССР Я. Ліманоўскага) // ЛіМ. 1937. 23 ліп.

Т. М. Махнач.

ЛІПНЁВЫ АЛЕСЬ

Ліпнёвы Алесь (сапр. А ш а р о в і ч Абрам Восіпавіч; 1909, г. Дзвінск, цяпер Даўгаўпілс, Латвія — 31.3.1933, Мінск; пахаваны на Вайсковых могілках), празаік, нарысіст.

З сям'і служачага. У 1927 разам з бацькамі пераехаў у Мінск. Працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет «Чырвоная змена» (у аддзеле па рабоце сярод камсамольскай і несаюзнай моладзі), «Звязда», адказным сакратаром часопіса «Напагатове». Арганізоўваў літаратурныя выступленні і вечары ў вайсковых часцях. Збіраў матэрыялы для дакументальных твораў пра герояў грамадзянскай вайны (Г. Гай, Мелік Шах Назараў), але цяжкая хвароба сэрца не дазволіла закончыць гэтую работу.

Першыя выяўленыя публікацыі А. Ліпнёвага (нататкі, артыкулы) адносяцца да 1930 (апублікаваны ў газеце «Чырвоная змена»). Там жа ў 1931 надрукавана і першае яго апавяданне «Ленінскае сэрца». Некалькі апавяданняў з'явіліся ў 1932 у рэспубліканскіх часопісах, у тым ліку «Маці», прысвечанае маці Веры Харужай. Асноўная тэматыка твораў А. Ліпнёвага — класавая барацьба ў перыяд грамадзянскай вайны, выхаваўчая роля камсамола ў працэсе сацыялістычнага будаўніцтва. Тэмы гэтыя празаік распрацоўваў з ідэйна-палітычных пазіцый свайго часу. *І. Э. Багдановіч.*

Бібліяграфія

1.3.

1930. Ідзе вясна // Чырв. змена. 6 крас.; Вароўскага, 52 // Там жа. 19 крас.; Разважанні аб «Чырвонай змене» // Там жа. 26 крас.; Пралетарскі падарунак партыйнаму з'езду // Там жа. 30 мая; Рапарт будняў // Там жа. 10 жн.; Правыя апартуністы ў камсамоле // Там жа. 23 кастр.

1931. І па густым павуцінні электраправадоў пацяклі электрычныя токі...; [Нарыс] // Чырв. змена. 5 студз.; Зацiскачам самакрытыкі — штраф у 25 рублёў // Там жа. 19 студз.; Ленінскае сэрца: [Апавяданне] // Там жа. 21 студз.

1932. Ліст пану Гартынгу: Апавяданне // Маладняк. № 5—6; Дырэктар Штэйнберг: Апавяданне // ЛіМ. 20 жн.; Маці: Навела // Чырв. Бел. № 23—24.

1933. Ліст пану Гартынгу: [Апавяданне] // 11 ліпеня. Мн.; Радасць інжынера Ланчэ: Апавяданне // Заклік. № 2.

1969. Маці: Навела // Маладосць. № 1.

2.3.

На беларускай мове. Е с а к о ў А. Камсамольскі пісьменнік // ЛіМ. 1979. 30 ліст.; П а м я ц і таварыша, камсамольца, пісьменніка: [Некралог] // ЛіМ. 1933. 31 сак.; П і с ь м е н н і к і Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981.

На рускай мове. Р о м Л. Писатель — рядовой боец социалистической стройки // Рабочий. 1931. 25 июля.

2.4.

Ш у ш к е в і ч С. Над магілай: [Верш] // Шушкевіч С. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1978. Т. 1. *М. П. Барташэвіч.*

ЛІПСКІ УЛАДЗІМІР

Ліпскі Уладзімір Сцяпанавіч (псеўд. У. Р а д з ю к е в і ч; н. 6.5.1940, в. Шолкавічы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), празаік, публіцыст. Член СП Беларусі з 1979.

Нарадзіўся ў шматдзетнай сям'і. Бацька, браты і сёстры ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. У. Ліпскі скончыў Вузнажскую сярэднюю школу. У 1957 паступіў у Мінскі тэхнікум харчовай прамысловасці. Пасля заканчэння яго (1960) накіраваны на Гарадзейскі цукровы завод Нясвіжскага р-на, дзе працаваў слесарам, брыгадзірам, інжынерам, старшынёй заводскага камітэта прафсаюза. У 1960 завочна паступіў у БДУ на аддзяленне журналістыкі, якое скончыў у 1966. У 1964—67 працаваў загадчыкам аддзела пісем і масавай работы рэдакцыі нясвіжскай газеты «Чырвоны сцяг». З 1967 першы сакратар Нясвіжскага РК ЛКСМБ, у апараце ЦК ЛКСМБ: інструктар аддзела прапаганды і культурна-масавай работы, загадчык сектара інфармацыі, намеснік загадчыка, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі. З 1976 адказны сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. З 1978 галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка». Прэзідэнт Беларускага дзіцячага фонду, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі дзіцячых фондаў. Узнагароджаны медалём, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Друкавацца У. Ліпскі пачаў з 5 класа на старонках рэчыцкай раённай газеты «Зара камуны». З карэспандэнцыямі і артыкуламі ў рэспубліканскім друку выступае з 1964. Пачаткам літаратурнай творчасці лічыць апавяданні, апублікаваныя ў 1970 на старонках часопіса «Вясёлка». Аўтар кніг публіцыстыкі «Райкомаўскія будні», «Дзень за днём», «Знайдзі сябе», нарысаў «Прыдзвінскі цуд», «Высокія зоркі». Яго нарысы змяшчаліся ў калектыўных зборніках «Кавалеры ганаровага знака», «Вышыня», «Сучаснік» і інш. Складальнік і член рэдкалегіі кніг «Памяць сэрца», «На галоўных рубяжах», «У працы і ў баі», «Вяснянка», напісаў дакументальную аповесць пра Героя Савецкага Саюза З. Тусналобаву-Марчанка «Крутыя вёрсты», на матэрыяле якой пастаўлена радыёп'еса (1978).

Аўтар кніг аповесцей, апавяданняў і казак для дзяцей: «Рыгоркавы прыгоды», «Марынчына казка», «Якое яно, шчасце?», «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска», «Лаўрэнавы працадні».

Жыве ў Мінску.

Г. П. Харошка.

Бібліяграфія

1.2.

Райкомаўскія будні. Мн., 1971. (Юнацтва ў вялікім паходзе). Рэц.: Потемкин М. Юность в большом походе // Знамя юности. 1971. 21 апр.

Рады БНР. На пасяджэнні Народнага Сакратарыяту (урада) ён выступіў з прапановай абвясціць незалежнасць БНР, што і было зроблена 25.3.1918. Пасля распаду БСГ на некалькі палітычных арганізацый А. Луцкевіч стаў відным дзеячам Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. Як старшыня Рады Народных Міністраў БНР і міністр замежных спраў вёў перагаворы з урадам Украінскай Народнай Рэспублікі і вядомым бальшавіком Х. Ракоўскім у Кіеве (кастрычнік 1918). У лістападзе таго ж года з візітам у Маскве. З дзённіка А. Луцкевіча, які ён вёў у той час, вынікала, што ён быў не супраць саюза з РСФСР і ўвядзення савецкай канстытуцыі на Беларусі пры ўмове, што Савецкая Расія прызнае незалежнасць Беларусі. У некаторых публікацыях сцвярджаецца, што А. Луцкевіч вёў перагаворы непасрэдна з У. І. Леніным. У канцы 1918 Луцкевіч разам з урадам БНР пераехаў у Вільню, потым у Гродна. У нотах польскаму ўраду ён пратэставаў супраць анексіі беларускіх паветаў, прызыву беларусаў у Войска Польскае. З просьбай абараніць Беларусь ад польскіх акупантаў звярнуўся да дыпламатычных прадстаўнікоў ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, да ўрада Германіі. На перагаворах з прадстаўнікамі польскага Міністэрства замежных спраў адмовіўся ад супрацоўніцтва з польскім урадам на Версальскай мірнай канферэнцыі і стварэння супольнага антыбальшавіцкага фронту. На мірнай канферэнцыі ў Версалі быў супраць рашэння Антанты аб прызнанні юрысдыкцыі Калчака ў дачыненні да Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны і іншых былых уладанняў Расійскай імперыі. Настойваў на прызнанні незалежнасці БНР, дамогся яе прызнання Чэхаславакіяй, Францыяй і Латвіяй. У Парыжы А. Луцкевіч вёў перагаворы з міністрам-прэзідэнтам Польшчы І. Падэрэўскім і быў запрошаны ў Варшаву. У 1919 пераехаў у польскую сталіцу, дзе быў практычна інтэрніраваны. Толькі 22.10.1919 яго прыняў Ю. Пілсудскі. Сустрэча з начальнікам Польскай дзяржавы не дала практычных вынікаў, бо Пілсудскі не прызнаў права Беларусі на дзяржаўную самастойнасць. Расказваючы пра сустрэчы з кіраўніком Польскай дзяржавы ў інтэрв'ю газеце «Кур'ер Польскі», А. Луцкевіч завяршыў яго словамі: «У любым выпадку Белая Русь павінна быць створана як асобная дзяржаўная адзінка» (1.11.1919). Хутка ў Радзе БНР адбыўся расколː утварыліся Народная Рада і Найвышэйшая Рада. А. Луцкевіч узначаліў урад Найвышэйшай Рады БНР. Зразумеўшы, што дабіцца ад Польшчы прызнання ёю беларускай дзяржаўнасці не ўдасца, у пачатку 1920 ён падаў у адстаўку і пераехаў у Вільню. Там напісаў і выдаў брашуру «Польская акупацыя на Беларусі», аднавіў выданне газеты «Наша ніва» (выйшла 9 нумароў), склаў зборнікі «Наша ніва» і «Памяці Івана Луцкевіча». Для зборніка «Наша Ніва» падрыхтаваў артыкул «Палітычныя лозунгі беларускага руху», дзе пазнаёміў чытачоў з гісторыяй барацьбы за незалежнасць Беларусі, а таксама некалькі рэцэнзій. У зборніку «Памяці Івана Луцкевіча» яму належаць прадмова і нарыс пра жыццё і працу І. Луцкевіча. У 1921 А. Луцкевіч апублікаваў свае працы «Пуцяводныя ідэі беларускай літаратуры» і «Жыдоўскае пытанне ў беларускай літаратуры». Прывёўшы ў парадак калекцыі свайго брата, у 1921 аднавіў і стаў дырэктарам Беларускага музея імя І. Луцкевіча. У тым жа годзе заснаваў у Вільні Беларускую школьную раду, якая пазней злілася з Таварыствам беларускай школы. А. Луцкевіч адмоўна ставіўся да мірнага дагавору паміж РСФСР і Літвой (12.7.1920), паводле якога частка беларускіх зямель перадавалася Літве. Негатыўна ацаніў ён і Рыжскі трактат, паводле якога заходняя частка Беларусі пераходзіла пад уладу Польшчы. Калі ў кастрычніку 1920 Віленскі край захапілі войскі польскага генерала Л. Жалігоўскага, А. Луцкевіч назваў гэта новай акупацыяй. Беларускі нацыянальны камітэт пад кіраўніцтвам А. Луцкевіча байкатаваў прызначаныя Л. Жалігоўскім выбары ў Віленскі сойм. Сойм прагаласаваў за ўключэнне т. зв. Сярэдняй Літвы ў склад Польшчы. Супраць акупацыйнай улады А. Луцкевіч змагаўся легальнымі сродкамі. Пасля таго, як на лістапад 1922 былі прызначаны выбары ў сойм Польскай Рэспублікі, ён узначаліў Беларускі выбарчы камітэт, у які ўвайшлі прадстаўнікі амаль усіх беларускіх партый. Дзейнасць камітэта дала плён: паслامі на сойм былі абраны 10 беларусаў, сенатарамі — 3. Быў створаны Беларускі пасольскі клуб. У 1923 польская разведка перахапіла ліст старшыні ЦВК і СНК БССР А. Чарвякова да А. Луцкевіча, які сведчыў аб выкананні апошнім заданняў Масквы, атрыманні грошай з Беларускай ССР.

Наступленне польскіх улад на беларускую школу, на правы нацыянальных меншасцяў, з аднаго боку, палітыка беларусізацыі ў БССР, вяртанне ёй зямель Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў, нэп, агульны гаспадарчы і культурны ўздым на ўсходзе Беларусі — усё гэта спрыяла радыкалізацыі нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі. У чэрвені 1925 левыя паслы ўтварылі ў сойме фракцыю Беларускай работніцка-сялянскай грамады (БСРГ). Пачалося стварэнне масавай палітычнай арганізацыі. Да канца 1926 БСРГ налічвала 100 тысяч чалавек. А. Луцкевіч у яе не ўступіў, хоць і супрацоўнічаў у цэнтральнай рэдакцыі грамадаўскіх газет. Яго насцярожваў нерэалістычны пункт праекта праграмы пра тое, што ўсе беларускія землі павінны аб'яднацца ў адзіную незалежную рэспубліку сялян і рабочых. Такой мэты, на яго думку, нельга было дасягнуць ані шляхам плебісцыту, ні шляхам паўстання. Ва ўмовах санацыйнага рэжыму Ю. Пілсудскага не стаяла пытанне «сацыялізм ці капіталізм?», а пытанне «дэмакратыя ці дыктатура?». Насцярожвалі А. Луцкевіча і падзеі ў СССР і БССР: прапановы «левых» весці індустрыялізацыю за кошт сялян, курс на фарсіраваную калектывізацыю, згортванне нэпа, выступленні супраць дзеячаў беларускай культуры, у якіх выявіліся першыя адхіленні ад нацыянальнай палітыкі. У пачатку 1927 былі арыштаваны кіраўнікі БСРГ, а потым і А. Луцкевіч, які ўзначальваў прэсу гэтай арганізацыі. Пры допыце называў сябе няверуючым, «па перакананню марксістам». Улады абвінавацілі яго ў макіявелізме, у тым, што ён быў кайзераўскім, а потым і бальшавіцкім агентам, атрымліваў грошы ад Камінтэрна, супрацоўнічаў з КПЗБ. Такім чынам яны хацелі скампраметаваць беларускія культурна-асветныя арганізацыі і ўстановы, у якіх працаваў Луцкевіч. Суд, аднак, прызнаў яго невінаватым. У канцы мая 1928, прабыўшы ў турме 8 месяцаў, ён выйшаў на волю. У тым жа годзе пачаўся самы драматычны перыяд у яго жыцці. Паколькі рашэннем VI кангрэсу Камінтэрна сацыял-дэмакраты былі абвешчаны сацыял-фашыстамі, да іх быў аднесены і А. Луцкевіч, які заставаўся верны сацыял-дэмакратычным прынцыпам. Яго нежаданне салідарызавацца з лявацкімі сіламі разглядалася як здрада. На А. Луцкевіча, чый партрэт

і станоўчую характарыстыку раней змясціла «Праўда» (1928. № 51, 53), пра каго з сімпатыяй і спачуваннем пісалі ў СССР і БССР, пасыпаліся абвінавачанні ў супрацоўніцтве з пілсудчыкамі. Асаблівую раздражнёнасць выклікала ягоная публіцыстыка. У газетах «Наперад», «Беларускі звон», «Родны край» А. Луцкевіч крытыкаваў І. Сталіна і яго акружэнне за парушэнне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай і аграрнай палітыкі («Цень Азефа» і інш.), што ацэньвалася як антыкамуністычная і антысавецкая прапаганда. Пазней А. Луцкевіча вінавацілі ў тым, што ён супрацоўнічаў з будучымі фашыстамі Р. Астроўскім і Ф. Акінчыцам. Але на самай справе ён парваў адносіны з гэтымі дзеячамі яшчэ да таго, як яны сталі нацыянал-сацыялістамі. Больш таго, у 1932 разам з У. Самойлам і А. Трэпкам выклікаў Астроўскага на грамадскі суд чэсці. Атрымалася так, што А. Луцкевіча адначасова крытыкавалі і камуністы, і фашысты. Таварыства беларускай школы выключыла яго са сваіх радоў, а польскія ўлады звольнілі яго з працы ў Віленскай беларускай гімназіі. Адышоўшы ад актыўнай палітычнай дзейнасці, ён заставаўся дырэктарам Беларускага музея імя І. Луцкевіча і, нягледзячы на тое, што польскія ўлады пазбавілі тую ўстанову датацый, не дапусціў яе закрыцця. У 20—30-я гады А. Луцкевіч актыўна працаваў у Беларускім навуковым таварыстве, быў яго старшынёй, супрацоўнічаў з часопісамі «Родныя гоні», «Студэнцкая думка», «Калоссе», друкаваўся ў «Беларускім календары», «Гадавіку (Запісах) Беларускага навуковага таварыства», газетах «Беларуская думка», «Наперад», «Беларускі звон», «Родны край», «Пшэглёнд Віленьскі», двухтыднёвіку «Сыгналы» (Львоў і інш.). Яго артыкул «Дваццатыя ўгодкі ў газеце «Змаганне», кніга «За дваццаць пяць гадоў» — крыніцы па гісторыі беларускага вызваленчага руху ў пачатку 20 ст. У 1934 А. Луцкевіч вітаў у Вільні дэлегатаў 10 з'езда Саюза музеяў, у 1935 выступіў на VI Усеагульным з'ездзе польскіх гісторыкаў з дакладам «Беларусы-нарадавольцы і іх орган «Гоман». Ён даследаваў таксама мову скарынаўскіх выданняў, пісаў пра першы Статут Вялікага княства Літоўскага, жыццё і творчасць У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча, іншых беларускіх пісьменнікаў. Яму належаць артыкулы «Вільня ў беларускай літаратуры», «Эвалюцыя беларускай адраджэнчай ідэалогіі і яе адлюстраванне ў літаратуры», рэферат «Аб беларускай літаратуры «нашаніўскай пары» і інш. Найбольш поўны зборнік літаратурна-крытычных прац А. Луцкевіча — «Адбітае жыццё» (1929). Ён займаўся і перакладчыцкай дзейнасцю. Пераклаў падручнік па алгебры, працу М. Доўнар-Запольскага «Асновы дзяржаўнасці Беларусі», Новы Запавет і Псалтыр (Хельсінкі, 1931; 2 выд. ў 1948).

Пасля прыходу Чырвонай Арміі ў Вільню А. Навіна выступіў на сходзе культурна-асветных работнікаў-беларусаў з заклікам да адраджэння беларускай школы, культуры, мастацтва. 30.9.1939 быў арыштаваны па абвінавачанні ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Рашэннем Асобай нарады пры НКУС СССР асуджаны на 6 гадоў зняволення, у час якога і памёр. Згодна адной версіі, гэта здарылася ў чэрвені 1941, калі эвакуіравалася на ўсход Вілейская турма, дзе яго трымалі, па другой — больш верагоднай — у 1946 у Казахстане. Рэабілітаваны ў 1989.

А. М. Сідарэвіч.

Бібліяграфія

1.2.

Белорусы. Пб., 1909 (Адб. з кн. Формы национального движения в современных государствах. Пб., 1909). Рэц.: Шаповал М. // Українська хата. 1909. № 10.

На дарозе да новага жыцця. Пб., 1912. Рэц.: Czeczott W. Około kwestji białoruskiej // Litwa i Ruś. 1913. Z. 6.

Ekonomičnaja ewolucja i biełaruski ruch. Wilnia, 1917.

Jak prawilna pisać pa-biełarusku. Wilnia, 1917.

Biełaruski prawapis. Wilnia, 1918 / Сааўт. Я. Станкевіч. Рэц.: В. // Бел. шлях. 1918. 6 ліп.; Я. Л. [Лёсік Я.] // Вольная Бел. 1918. № 26.

Нашы песняры: (Літ.-сацыяльныя нарысы). Вільня, 1918. Рэц.: т р. // Гоман. 1918. 15 лют.

Польская акупацыя на Беларусі. Вільня, 1920.

Жыдоўскае пытанне ў беларускай літаратуры. Вільня, 1921.

Пуцяводныя ідэі беларускае літаратуры. Вільня, 1921.

Вязніца Адама Міцкевіча. Вільня, 1923.

Як вучыць у новай школе: Увагі для вучыцялёў бел. сярэдніх школ. Вільня, 1923.

Prawda o celi Konrada: W setną rocznicę procesu filomatów. Wilno, 1923. Рэц.: Erka // Prz. Wileński. 1924. Nr 2.

Вільня ў беларускай літаратуры. Вільня, 1925. (Адб. з час. «Студэнцкая думка». 1925. № 5).

За дваццаць пяць гадоў (1903—1928): Успаміны аб працы першых бел. палітычных арганізацый: Бел. рэв. грамада, Бел. сац. грамада. Вільня, 1928. Рэц.: Č. A. [Černy A.] // Slovansky přehled. 1929. R. 21.

Адбітае жыццё: Лекцыі і стацці з беларускае адраджэнскае літаратуры. Вільня, 1929. Кн. 1. Рэц.: Касцяровіч М. // Полымя. 1929. № 6; Hr. F. [Hryškewič F.] // Slovanský přehled. 1930. R. 22.

Янка Купала як прарок адраджэння: Публічная лекцыя, чытаная ў Вільні, Рызе і Дзвінску. Вільня, 1932.

Беларускі музей імені Івана Луцкевіча. Вільня, 1933. (Адб. з «Гадавіка БНТ». Кн. 1).

Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі. Вільня, 1933. (Адб. з «Гадавіка БНТ». Кн. 1).

Narodowolcy Białorusini i ich organ «Homan». Lwów, 1935.

За дваццаць пяць гадоў (1903—1928): Успаміны аб працы першых бел. палітычных арганізацый: Бел. рэв. грамада, Бел. сац. грамада. Мн., 1991.

1.3.

1906. Што будзе? // Наша доля. № 1 / Без указ. аўт.

1909. Белорусы // Формы национального движения в современных государствах. Пб.; Национальное возрождение белорусов // Моск. еженедельник. № 9; Odrodzenie narodowe Białorusinów. Litwa. Nr 4.

1910. Аб эміграцыі // Н. н. 14 студз. / Пад крыпт. Г. Б.; «Кароткая гісторыя Беларусі» // Там жа. 23 вер. / Пад крыпт. Г. Б.; Родная мова і яе культурнае значэнне // Там жа. 14 кастр. / Пад крыпт. Г. Б.; З газет // Там жа. 21 кастр. / Пад крыпт. Г. Б.; Справа аб беларускай школе ў Думе // Там жа. 18 ліст. / Пад крыпт. Г. Б.; Наш шлях // Там жа. 9 снеж. / Пад крып. Г. Б.

1911. Родная мова і яе культурнае значэнне // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1911 год. Вільня / Пад крыпт. Г. Б.; З газет // Н. н. 6 студз. / Пад крыпт. Г. Б.; З газет // Там жа. 13 студз. / Пад крыпт. Г. Б.; Pro domo sua // Там жа. 27 студз. / Пад крыпт. Г. Б.; Расія і Кітай // Там жа. 10 лют. / Пад крыпт. Г. Б.; У вялікую гадаўшчыну // Там жа. 17 лют. / Пад крыпт. Г. Б.; З газет // Там жа. 21 крас. / Пад крыпт. Г. Б.; Страшная байка // Там жа. 28 крас. / Пад крыпт. Г. Б.; З нашага жыцця: Вёска і горад // Там жа.

12 мая / Пад крыпт. Г. Б.; Государственные доходы Расеі // Там жа. 2 чэрв. / Пад крыпт. Г. Б.; З газет // Там жа. 16 чэрв. / Пад крыпт. Г. Б.; З газет // Там жа. 11 жн. / Пад крыпт. Г. Б.; Што чуваць за граніцай? // Там жа. 1 вер. / Пад крыпт. Г. Б.; Школы і грамотнасць у Беларусі // Там жа. 1 вер. / Пад крыпт. А. Н-а; Нашы перасяленцы ў Сібіры // Там жа. 8 вер. / Пад крыпт. А. Н-а; Гдзе прычына // Там жа. 22 вер. / Пад крыпт. Г. Б.; Даўгі двароў // Там жа. 29 вер. / Пад крыпт. Г. Б.; Рэвалюцыя ў Кітаі / Пад крыпт. Г. Б.; З газет / Пад крыпт. А-н-а // Там жа. 6 кастр.; Што чуваць за граніцай // Там жа. 13, 20, 27 кастр.; 3, 10 ліст. / Пад крыпт. Г. Б.; З нашага жыцця; Маладая Беларусь // Там жа. 3 ліст. / Пад крыпт. а-н-а; Бел. мова ў апошнім пяцілецці // Там жа. 10 ліст. / Пад крыпт. а-н-а; Памяці Вінцука Тубіса // Там жа. 15 снеж.; Наш доўг // Там жа. 22 снеж. / Пад крыпт. Г. Б.

1912. Навагоднія думкі; Вёска і горад // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1912 год. Вільня / Пад крыпт. В. Г. Аўт. спрэчн.; На дарозе да новага жыцця // Маладая Бел. Сер. 1. Сш. 1; К пытанню аб нацыянальных адносінах у Беларусі і Літве // Там жа. Сер. 1. Сш. 2; Развитие взаимного кредита // Веч. газ. (Вильно). 16 нояб. / Пад крыпт. Г. Б.; Евреи в Польше // Там жа. 17 нояб. / Пад крыпт. Г. Б.; Национальное воспитание // Там жа. 18 нояб. / Пад крыпт. Г. Б.; Хулиганство // Там жа. 19 нояб. / Пад крыпт. Г. Б.; Поучительный пример // Там жа. 23 нояб. / Пад ккрыпт. Г. Б.; Против нравственного разложения // Там жа. 24 нояб. / Пад крыпт. Г. Б.; Почему? // Там жа. 7 дек. / Пад крыпт. А. Н.; 27 самоубийств в один день // Там жа. 10 дек. / Пад крыпт. А. Н.; Театр и музыка: «Отец» Стринберга в польском театре // Там жа. 12 дек. / Пад крыпт. А. Н.; Новый устав // Там жа. 13 дек. / Пад псеўд. А. Иванов. Аўт. спрэчн.; Кровавый предрассудок // Там жа. 18 дек. / Пад псеўд. А. Иванов. Аўт. спрэчн.; Что ж будет дальше / Пад крыпт. Г. Б.; Маленькая статья / Пад псеўд. А. Иванов. Аўт. спрэчн.; Театр и музыка: «Седьмая заповедь» Гейерманса — в польском театре / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 24 дек.; За образование женщин // Там жа. 30 дек. / Пад крыпт. Г. Б.; З заграніцы // Там жа. 5 студз. / Пад крыпт. Г. Б.; З заграніцы // Там жа. 9 лют. / Пад крыпт. Г. Б.; Правінцыя будзіцца / Пад крыпт. Г. Б.; Думкі аб школьнай справе / Пад крыпт. а-н-а // Там жа. 15 сак.; Новы хаўрус нацыяналістаў // Там жа. 22 сак. / Пад крыпт. Г. Б.; З газет // Там жа. 5 крас. / Пад крыпт. Г. Б.; Яніш-ская справа / Пад крыпт. Г. Б.; Нячыстая палітыка / Пад крыпт. а-н-а // Там жа. 19 крас.; З газет // Там жа. 26 крас. / Пад крыпт. Г. Б.; Наш адказ газеце «Kur. Lit.» // Там жа. 3 мая / Пад крыпт. Г. Б.; З газет // Там жа. 10 мая / Пад крыпт. Г. Б.; Першы крок // Там жа. 24 мая / Пад крыпт. а-н-а; З жыцця нямецкіх вучыцялёў // Там жа. 14 чэрв. / Пад крыпт. Н. Аўт. спрэчнае; Работы Трэцяй Думы // Там жа. 21 чэрв. / Пад крыпт. Г. Б.; За апошні тыдзень з Расеі // Там жа. 28 чэрв. / Пад крыпт. Г. Б.; Чаму ў нас цукер дорага / Пад крыпт. Г. Б.; З жыцця Англіі / Пад крыпт. Н. Аўт. спрэчнае // Там жа. 5 ліп.; Край і народ / Пад крыпт. а-н-а; Новы закон аб арэндзе зямлі пад будоўлі / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 19 ліп.; Цікавы цыркуляр / Пад крыпт. Г. Б.; За межамі школы / Пад крыпт. Н. Аўт. спрэчн.; Аб грамадскай працы // Там жа. 9 жн. / Пад крыпт. Н. Аўт. спрэчн.; Фальшывая дарога // Там жа. 16 жн. / Пад крыпт. Н. Аўт. спрэчн.;... (Да выбараў) // Там жа. 23 жн. / Пад крыпт. Г. Б.; Граматнасць і заработкі // Там жа. 30 жн. / Пад крыпт. А. Н.; Фальшывы страх // Там жа. 6 вер. / Пад крыпт. Г. Б.; З павета — у губерню // Там жа. 13 вер. / Пад крыпт. Г. Б.; Пашкадуйце дзяцей / Пад крыпт. Г. Б.; Пустыя словы / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 20 вер.; Серба-харваты / Пад крыпт. А.; Аб прадажы сялянскай зямлі за даўгі / Пад крыпт. Г. Б.; «Тоже белорусы» / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 29 ліст.; За родную мову // Там жа. 14 снеж. / Пад крыпт. А.; U Źródeł odrodzenia Białorusinów // Świat Słow. T. 11.

1913. Наш доўг; Родная мова і яе культурнае значэнне / Пад крыпт. Г. Б.; За межамі школы / Пад крыпт. Н. // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1913 г. Вільня; Наш шлях // Маладая Бел. Сш. 3; Переселенческая волна // Веч. газ. 21 янв. / Пад псеўд. А. Иванов. Аўт. спрэчн.; Театр и музыка: «Хромая Гульда» Бьернстьерн — Бернсона у «Передвижников» // Там жа. 10 марта / Пад крыпт. А. Аўт. спрэчн.; Совещание польских реалистов // Там жа. 13 марта / Пад псеўд. А. Иванов. Аўт. спрэчн.; На новы год // Н. н. 4 студз. / Пад крыпт. А.-н-а; Што трэба рабіць? // Там жа. 10 студз. / Пад крыпт. а-н-а; Змаганне з чужаземнымі эмігрантамі // Там жа. 18 студз. / Пад крыпт. Г. Б.; Скінулі скуру! // Там жа. 25 студз. / Пад крыпт. А-н-а; Змаганне з хваробай // Там жа. 1 сак. / Пад крыпт. а-н-а; Старая работа // Там жа. 8 сак. / Пад крыпт. а-н-а; Шляхам жыцця: [Рэц. на кн.: К у п а л а Я. Шляхам жыцця. Пб., 1913] // Там жа. 26 крас. / Пад крыпт. а-н-а; Новы закон аб школах // Там жа. 31 мая / Пад крыпт. А-н-А; Дарэмныя страхі // Там жа, 20 чэрв. / Пад крыпт. А-н-а; Данос // Там жа. 16 жн. / Пад крыпт. А-н-А; Справа Бейліса // Там жа. 17 кастр. / Пад крыпт. Г. Б.; Канец справы Бейліса // Там жа. 31 кастр. / Пад крыпт. Г. Б.; Да супольнай працы! // Там жа. 5 снеж. / Пад крыпт. А-Н-А; На адпачынак // Там жа. 12 снеж. / Пад крыпт. а-н-а; Сяўцы асветы / Пад крыпт. а-н-а; Для роднага краю / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 21 снеж.

1914. Яшчэ год... / Пад крыпт. А.; Што трэба рабіць? / Пад крыпт. Н-а-А // Беларускі каляндар на 1914 год. Вільня; Аграрная реформа в Белоруссии // Веч. газ. 15 янв. / Пад крыпт. А. Н.; Голас праўды // Н. н. 4 студз. / Пад крыпт. а-н-а; Новая напасць // Там жа. 17 студз. / Пад крыпт. а-н-а.; Да сумленных вучыцялёў // Там жа. 24 студз. / Пад крыпт. а-н-а; Пясняр чыстай красы // Там жа. 21 лют. / Пад крыпт. Г. Б.; Пуцяводная ідэя // Там жа. 20 сак. / Пад крыпт. а-н-а.; Важная справа // Там жа. 27 сак. / Пад крыпт. Г. Б.; Слова і дзела / Пад крыпт. а-н-а; У зашчыту прэсы «недзяржаўных нацый» / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 25 крас.; Дарэмная праца // Там жа. 1 мая / Пад крыпт. а-н-а.; На добрай дарозе / Пад крыпт. Г. Б.; Кудой ісці / Пад крыпт. а-н-а // Там жа. 26 чэрв.; Адвечная пропасць / Пад крыпт. а-н-а.; Рабочы рух / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 17 ліп.; Вайна пачалася // Там жа. 25 ліп. / Пад крыпт. а-н-а; У добры час // Там жа. 21 жн. / Пад крыпт. а-н-а.; Наша павіннасць // Там жа. 2 кастр. / Пад крыпт. а-н-а; Памажыця! // Там жа. 16 кастр. / Пад крыпт. Г. Б.; Не дамося // Там жа. 16 ліст. / Пад крыпт. Г. Б.; Сіла еднасці // Там жа. 18 снеж. / Пад крыпт. а-н-а; На мяжы двух гадоў // Там жа. 25 снеж. / Пад крыпт. а-н-а.

1915. Польские настроения // Веч. газ. 2 янв. / Пад крыпт. Г. В.; Театр и музыка: Концерт Смирнова // Там жа. 27 апр. / Пад крыпт. А. Аўт. спрэчн.; Памяці Юзюка Пашкевіча // Н. н. 21 лют. / Пад крыпт. а-н-а; Новыя напасці // Там жа. 27 лют. / Пад крыпт. а-н-а; Вайна і дэпутаты / Пад крыпт. Г. Б.; Дзякуй за шчырасць / Пад крыпт. а-н-а // Там жа. 7 сак.; Кліч да згоды // Там жа. 14 сак. / Пад крыпт. а-н-а; Першы крок // Там жа. 19 сак. / Пад крыпт. а-н-а; Іх адказ // Там жа. 2 крас. / Пад крыпт. а-н-а; Зблізку і здалёку // Там жа. 9 крас. / Пад крыпт. а-н-а.; Наша павіннасць // Там жа. 16 крас. / Пад крыпт. а-н-а.; Ваўкі ў авечай скуры // Там жа. 24 крас. / Пад крыпт. Г. Б.; Рэдкае здарэнне // Там жа. 1 мая / Пад крыпт. а-н-а; Напамінанне // Там жа. 29 мая / Пад крыпт. Г. Б.; Да працы! // Там жа. 5 чэрв. / Пад крыпт. а-н-а; Чаго вучыць вайна? // Там жа. 19 чэрв. / Пад крыпт. а-н-а; Перад адкрыццём Гас. думы / Пад крыпт. Г. Б.; Жыццё дужэй за смерць / Пад крыпт. а-н-а // Там жа. 25 чэрв.; На новай дарозе / Пад крыпт. Г. Б.; Пісьмо філосафа / Пад крыпт. а-н-а // Там жа. 2 ліп.; Год вайны / Пад крыпт. а-н-а; Падмога працай / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 17 ліп.; Найвялікшая ахвяра // Там жа. 31 ліп. // Пад крыпт. а-н-а.; Чародная справа // Там жа. 7 жн. / Пад крыпт. а-н-а.

1916. 400-лецце Беларускай літаратуры 1517—1917;

Сіла наша — у нас саміх; Вызваленне школы; Народ і рэлігія; 10-летні юбілей беларускай прэсы / Пад псеўд. І. Мялешка; Да адной мэты; Унутраная работа; Эканамічны стан Беларусі; Аснова еднасці; Беларускі тэатр / Пад крыпт. А. Н. // Беларускі каляндар на 1917 год. Вільня; Уздоўж крывавай мяжы / Пад крыпт. Г.; Для роднага краю / Пад псеўд. І. Мялешка // Гоман. 15 лют.; Перамены; Алаіза Пашкевіч-Кейрысовая // Там жа. 18 лют. / Пад псеўд. І. Мялешка; «Старая песня» / Пад псеўд. І. Мялешка; Эканамічны стан Беларусі / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 22 лют.; Без ніякіх перамен // Там жа. 29 лют. / Пад псеўд. І. Мялешка; Места і вёска / Пад крыпт. А. Н.; Ліхая спадчына / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 3 сак.; «Тутэйшыя» / Пад псеўд. І. Мялешка; Эканамічная праца (I) / Пад крыпт. А. Н.; Народ і рэлігія / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 7 сак.; Запаведзь буры / Пад псеўд. І. Мялешка; Эканамічная праца (II) / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 10 сак.; Самі сабе // Там жа. 14 сак. / Пад псеўд. І. Мялешка; Народ і рэлігія // Там жа. 17 сак. / Пад псеўд. І. Мялешка; Святая павіннасць / Пад псеўд. І. Мялешка; Расійская палітыка ў Беларусі / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 21 сак.; З-за мяжы // Там жа. 28 сак. / Пад псеўд. І. Мялешка; Дзеля хлеба для ўсіх // Там жа. 31 сак.; Да адной мэты // Там жа. 7 крас. / Пад крыпт. А. Н.; На зваротным пункце // Там жа. 11 крас. / Пад псеўд. І. Мялешка; Гістарычныя словы // Там жа. 14 крас. / Пад псеўд. І. Мялешка; Змаганне за школу // Там жа. 18 крас. / Пад крыпт. А.; Максім Кавалеўскі: Пасмертны ўспамін // Там жа. 26 крас. / Пад крыпт. А. Л.; Да новай будучыні // Там жа. 28 крас. / Пад псеўд. І. Мялешка; За волю Украіны / Пад крыпт. А. Н.; Пазнаймо сваё імя! / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 2 мая; Прылучэнне Сувальшчыны да Вільні // Там жа. 5 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; Пералом // Там жа. 9 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; Грахі мінуўшчыны // Там жа. 16 мая / Пад крыпт. А. Н.; «Трайны саюз» // Там жа. 19 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; Мудрая рада // Там жа. 26 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; Народнае свята; Нашы суседзі // Там жа. 2 чэрв. / Пад псеўд. І. Мялешка; З чужыны — дамоў / Пад крыпт. А. Н.; Народнае свята / Пад крыпт. І. Мялешка // Там жа. 6 чэрв.; Вайна і мір / Пад крыпт. А. Н.; «Унутраная» справа / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 13 чэрв.; На з'езд у Лазанне // Там жа. 16 чэрв. / Пад псеўд. І. Мялешка; Вялікая задача // Там жа. 20 чэрв. / Пад псеўд. І. Мялешка; Тарговыя дарогі // Там жа. 27 чэрв. / Пад крыпт. А. Н.; Новае праступленне / Пад псеўд. І. Мялешка; Гутарка і шрыфт / Пад крыпт. А. Н.; На выстаўку / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 30 чэрв.; Погляд у будучыню // Там жа. 4 ліп. / Пад крыпт. А. Н.; Кліч да згоды // Там жа. 7 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Вызваленне школы // Там жа. 11 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Скарбы хараства / Пад крыпт. А. Н.; Нашы дэпутаты / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 14 ліп.; Непапраўная крыўда / Пад псеўд. І. Мялешка; З-прад двух гадоў / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 18 ліп.; Першыя выступленні // Там жа. 21 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Да працы / Пад псеўд. І. Мялешка; Перад сумнай гадаўшчынай / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 25 ліп.; З-прад двух гадоў // Там жа. 28 ліп. / Пад крыпт. А. Н.; Грамадскія арганізацыі // Там жа. 1 жн. / Пад псеўд. І. Мялешка; Кс. Ян Курчэўскі: [Некралог] // Там жа. 4 жн. / Пад крыпт. А.; Павіннасць грамадзянства / Пад псеўд. І. Мялешка; Цёмная пляма / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 8 жн.; Аснова еднасці / Пад крыпт. А. Н.; Мучанікі за мову / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 11 жн.; Патрэба школ / Пад крыпт. А. Н.; На сучасныя тэмы / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 15 жн.; Самачыннасць вёскі // Там жа. 18 жн. / Пад псеўд. І. Мялешка; Структура краю // Там жа. 22 жн. / Пад крыпт. А. Н.; З літоўскага жыцця / Пад крыпт. Г. Б.; Адгалоскі жыцця / Пад псеўд. І. Мялешка; Аб кніжках для школы / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 25 жн.; Да еднасці / Пад псеўд. І. Мялешка; З мястэчка жыцця: Кватэрніцкае пытанне / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 1 вер.; Г. Ландсберг-Жэмкальніс // Там жа. 8 вер. / Пад крыпт. А. Н.; З апошніх дзён расійскага панавання: (Успамін) // Там жа. 8, 11, 15 вер. / Пад крыпт. Г. Б.; Сіла наша — у нас саміх // Там жа. 15 вер. / Пад псеўд. І. Мялешка; Падумайце аб дзецях // Там жа. 22 вер. / Пад псеўд. І. Мялешка; Да родных ніў... // Там жа. 26 вер. / Пад псеўд. І. Мялешка; Аляксандр Ельскі: [Некралог] / Пад крыпт. А. Н.; «Аружны народ» / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 29 вер.; Людзі без веры // Там жа. 3 кастр. / Пад псеўд. І. Мялешка; Заплата работнікам / Пад крыпт. Г. Б.; Фальшывыя «прыяцелі» / Пад псеўд. І. Мялешка; Лекарская помач / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 6 кастр.; Беларускі тэатр // Там жа. 10 кастр. / Пад крыпт. А. Н.; За акіянам // Там жа. 17 кастр. / Пад крыпт. Г. Б.; Наша задача // Там жа. 20 кастр. / Пад псеўд. І. Мялешка; 10-летні юбілей беларускай прэсы // Там жа. 24 кастр. / Пад псеўд. І. Мялешка; На правільнай дарозе // Там жа. 31 кастр. / Пад псеўд. І. Мялешка; Шануйце роднае слова // Там жа. 3 ліст. / Пад крыпт. А. Н.; Становішча работнікаў // Там жа. 7 ліст. / Пад крыпт. Г. Б.; Проці бясчыннасці / Пад псеўд. І. Мялешка; «У зімовы вечар» / Пад крыпт. А. // Там жа. 10 ліст.; Аб нашых мястэчках / Пад крыпт. Г. Б.; Аснова быту / Пад псеўд. Я. Мялешка // Там жа. 14 ліст.; Без пасрэднікаў // Там жа. 17 ліст. / Пад псеўд. Я. Мялешка; Генрык Сянкевіч: [Некралог] // Там жа. 21 ліст. / Пад крыпт. А. Н.; Воля — няволя // Там жа. 24 ліст. / Пад псеўд. І. Мялешка; Прычыны неспакойства // Там жа. 28 ліст. / Пад псеўд. І. Мялешка; Праз 77 гадоў / Пад крыпт. Г. Б.; Літоўская прэса / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 1 снеж.; Туман развяваецца / Пад псеўд. І. Мялешка; Прызыў знізу / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 12 снеж.; Напамінанне // Там жа. 19 снеж. / Пад псеўд. І. Мялешка; Змаганне за ўласць / Пад крыпт. Г. Б.; Наша інтэлігенцыя / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 22 снеж.; Дзеля патрэб Краю // Там жа. 29 снеж. / Пад псеўд. І. Мялешка.

1917. Міхайла Грушэўскі // Гоман. 1 студз. / Пад крыпт. А. Н.; Чародная задача / Пад крыпт. А. Н.; Голас суседзяў / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 9 студз.; Перамена фронту / Пад псеўд. І. Мялешка; Дзеля бурнай работы / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 12 студз.; Не запужаюць! / Пад псеўд. І. Мялешка; Без веры / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 16 студз.; Патрэба выбару // Там жа. 19 студз. / Пад псеўд. І. Мялешка; «Аддзяка» // Там жа. 23 студз. / Пад псеўд. І. Мялешка; У чым наша сіла? // Там жа. 30 студз. / Пад псеўд. І. Мялешка; Да мора // Там жа. 2 лют. / Пад крыпт. А. Н.; Памяці «Цёткі»: (У гадаўшчыну смерці) // Там жа. 6 лют. / Пад крыпт. А. Н.; Літоўская газета / Пад крыпт. Г. Б.; Разбітая традыцыя / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 9 лют.; У адкрытыя карты / Пад крыпт. А. Н.; Двайная задача / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 13 лют.; Добрыя весці // Там жа. 16 лют. / Пад псеўд. І. Мялешка; «Добрыя весці»; Трайны пратэст / Пад псеўд. І. Мялешка; «У іх нічога німа!» / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 20 лют.; Цікавае выступленне // Там жа. 23 лют. / Пад крыпт. А. Н.; «Гістарычная місія» // Там жа. 27 лют. / Пад псеўд. І. Мялешка; Добрая навука // Там жа. 2 сак. / Пад псеўд. І. Мялешка; На фальшывай дарозе // Там жа. 6 сак. / Пад псеўд. І. Мялешка; Разбітае недаразуменне // Там жа. 27 сак. / Пад псеўд. І. Мялешка; З агня ды ў полымя // Там жа. 3 крас. / Пад псеўд. І. Мялешка; «Вясна народаў» // Там жа. 10 крас. / Пад псеўд. І. Мялешка; Недальнавідныя; Супольная дарога // Там жа. 13 крас. / Пад псеўд. І. Мялешка; «У Купальскую ноч» / Пад крыпт. А. Аўт. спрэчн. // Там жа. 24 крас.; Нашы песняры: 1. Якуб Колас // Там жа. 1 мая; Воля Краю // Там жа. 4 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; На розных дарогах // Там жа. 11 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; Да нашых палонных / Пад псеўд. І. Мялешка; Нашы песняры: 2. Янка Купала // Там жа. 16 мая; Мэты вайны // Там жа. 18 мая / Пад крыпт. Г. Б.; Новая трыбуна // Там жа. 29 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; Нашы песняры: 3. Цішка Гартны // Там жа. 1 чэрв.; Стары план // Там жа. 5 чэрв. / Пад псеўд. І. Мялешка; Палітыка «вольнай рукі» / Пад псеўд. І. Мялешка; Нашы песняры: 4. Максім Багдановіч // Там жа. 12 чэрв.; Каля зямельнай справы // Там жа. 15 чэрв. / Пад крыпт. Г. Б.; Pro memoria // Там жа. 19 чэрв. / Пад псеўд. І. Мялешка; Новы цэнтр // Там жа. 29 чэрв.

/ Пад псеўд. І. Мялешка; Натуральныя саюзнікі // Там жа. 6 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Ад слоў — да дзела // Там жа. 10 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Польшча і Украіна // Там жа. 17 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Suum cuique (Кожнаму сваё) // Там жа. 20 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Расейская праблема // Там жа. 27 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Дарэмныя жальбы // Там жа. 7 жн. / Пад псеўд. І. Мялешка; Беларуская справа і студэнцкі рух // Там жа. 28 жн. / Пад псеўд. І. Мялешка; На два фронты // Там жа. 11 вер. / Пад крыпт. І. М.; Крызіс рэвалюцыі / Пад крыпт. І. М.; Хто вінават? / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 14 вер.; Цэннае адкрыццё // Там жа. 18 вер. / Пад крыпт. А. Н.; «Краёвая Рада Літвы» // Там жа. 28 вер. / Пад псеўд. І. Мялешка; Бела-ляхі // Там жа. 2 кастр. / Пад псеўд. І. Мялешка; Памяці Максіма Багдановіча: [Некралог] / Пад крыпт. А. Н.; Край будзіцца / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 9 кастр.; Урадавая мова ў Літве // Там жа. 19 кастр. / Пад крыпт. Г. Б.; Эканамічная эвалюцыя і беларускі рух // Там жа. 6, 9 ліст.; Рэвалюцыя ідзе далей // Там жа. 13 ліст. / Пад крыпт. Г. Б.; Настаў час // Там жа. 16 ліст. / Пад крыпт. Г. Б.; Важны крок // Там жа. 28 снеж. / Пад крыпт. А. Н.

1918. Беларуская работа ў 1917 гаду ў межах акупацыі / Пад псеўд. І. Мялешка; Цэннае адкрыццё / Пад крыпт. А. Н. // Беларускі каляндар. Вільня; Аб дзяржаўным будаўніцтве // Варта. № 1; Литва, Белоруссия и поляки в районе старой оккупации: (Беседа с председателем Виленской Белорусской Рады А. И. Луцкевичем) // Чырв. шлях. № 7—8; З цяжкім возам на гнілой грэблі // Бел. шлях. 13, 15, 16 крас. / Пад крыпт. А. Н.; Аб нас: З прэсы // Там жа. 25 крас. / Пад крыпт. А. Н.; Расцярушанае багацце // Там жа. 16 чэрв. / Пад крыпт. А. Н.; Асновы еднасці // Бел. эхо. 30 сент.; «Беларусь за Познаншчыну» // Гоман. 1 лют. / Пад псеўд. І. Мялешка; Марнаванне сіл / Пад крыпт. Г. Б.; На беларускую гімназію / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 15 лют.; Ігнат Буйніцкі: (Пасмяротны ўспамін) // Там жа. 22 сак. / Пад крыпт. А. Л.; Будаванне дзяржаўнага жыцця / Пад псеўд. І. Мялешка; Справа шрыфту / Пад крыпт. А. Л.; Два цэнтры / Пад крыпт. А. Н. // Там жа. 3 крас.; Аб даўняй Расіі / Пад крыпт. Г. Б.; Аб наш правапіс // Там жа. 9 крас.; На тэмы дня // Там жа. 16 крас. / Пад псеўд. І. Мялешка; Пасівізм ці акцівізм / Пад крыпт. Б. Г.; Яшчэ аб тым жа / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 19 крас.; Важная справа // Там жа. 23 крас. / Пад крыпт. Г. Б.; Будаванне Бацькаўшчыны // Там жа. 26 крас. / Пад псеўд. І. Мялешка; Беларуская тэрміналогія // Там жа. 3 мая / Пад крыпт. А. Л.; На новыя павевы // Там жа. 7 мая; Барацьба не спыняецца // Там жа. 17 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; Польская сіла на Украіне // Там жа. 29 мая / Пад псеўд. І. Мялешка; Перад развязкай польскае справы // Там жа. 4 чэрв. / Пад псеўд. І. Мялешка; Каганец: (Пасмертны ўспамін) // Там жа. 7 чэрв. / Пад крыпт. А. Л.; Да родных ніў // Там жа. 11 чэрв. / Пад псеўд. І. Мялешка; [Рэц. на кн.: Прасты спосаб стацца ў кароткім часе граматным. Брэслаў, 1918] / Пад крыпт. А. Л.; Напярэдадні развязкі / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 14 чэрв.; [Рэц. на кн.: Аляхновіч Ф. Базылішк. Вільня, 1918] // Там жа. 21 чэрв. / Пад крыпт. А. Н.; Новы фронт // Там жа. 3 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Усход ці Захад? // Там жа. 5 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Новая Беларусь // Там жа. 19 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; [Рэц. на кн.: Гарун А. Матчын дар. Мн., 1918] // Там жа. 23 ліп. / Пад крыпт. А. Н.; Беларускае музыкальнае таварыства // Там жа. 26 ліп. / Пад крыпт. А. Н.; Адбудова Расіі // Там жа. 26 ліп., 2 жн. / Пад псеўд. І. Мялешка; [Рэц. на кн.: Карский Е. Белорусская речь: Очерк народного языка с историческим освещением. Пг., 1918] / Пад крыпт. А. Н.; Да працы! / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 30 ліп.; Беларусь і Расея / Пад псеўд. І. Мялешка; Беларускі універсітэт / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 6 жн.; Унутраны фронт / Пад псеўд. І. Мялешка; Расійскія справы / Пад крыпт. Г. Б. // Там жа. 13 жн.; З усходняй Беларусі // Там жа. 17 жн. / Пад крыпт. Г. Б.; Палякі і жыды // Там жа. 20 жн. / Пад крыпт. Г. Б.; Ратуйце дзяцей! // Там жа. 23 жн. / Пад псеўд. І. Мялешка; Аб супольную платформу // Там жа. 24 жн. / Пад псеўд. І. Мялешка; Жыды на Беларусі // Там жа. 30 жн. / Пад псеўд. І. Мялешка; Падсіленая Беларусь / Пад крыпт. Г. Б.; Беларусы — «нямецкая інтрыга» / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 3 вер.; Да дзяржаўнай еднасці // Там жа. 6 вер. / Пад псеўд. І. Мялешка; Аб Більшчыне // Там жа. 13 вер. / Пад крыпт. Г. Б.; «Светач мінуўшчыны» // Там жа. 17 вер. / Пад псеўд. І. Мялешка; Штрэйкбрэхеры // Там жа. 20 снеж. / Пад псеўд. І. Мялешка.

1919. Нашы песняры: Змітрок Бядуля // Бел. жыццё. 29 вер.; Алёізья з Пашкевічаў Кейрысовая («Цётка») // Там жа. 7 ліст.; З Горадні // Грамадзянін. 28 лют. / Пад крыпт. А. Н.; У чым наша сіла? // Там жа. 18 сак. / Пад крыпт. Г-бэ; Яны наступаюць! // Там жа. 25 сак. / Пад крыпт. Г-бэ.

1920. Ад выдавецтва; «Дзве душы» М. Гарэцкага / Пад крыпт. А. Л.; Палітычныя лозунгі беларускага руху // Зборнік «Наша ніва». 1920. Вільня; Прадмова; Жыццё і праца Івана Луцкевіча // Памяці Івана Луцкевіча... Вільня; Правакатары / Пад псеўд. І. Мялешка; Трэці раздзел Беларусі // Н. н. 28 кастр.; На «Дзяды» // Там жа. 1 ліст.; Палітычныя разважанні // Там жа. 12 ліст. / Пад псеўд. І. Мялешка; «Гісторыя беларускае літаратуры»: [Рэц. на кн.: Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920] // Там жа. 22 ліст.; Жыццё вучыць // Там жа. 29 ліст. / Пад псеўд. І. Мялешка; Самі сабе // Там жа. 13 снеж. / Пад псеўд. І. Мялешка; Тры заявы / Пад крыпт. Г. Б.; Кудой ісці? / Пад псеўд. І. Мялешка // Там жа. 20 снеж.; Адраджэнне нацыі // Наша думка. 31 снеж.

1921. Літаратурна-выдавецкая праца ў 1920 г. // Наша думка. 7 студз. / Пад крыпт. А. Л.; Наш культурны стан // Там жа. 22 студз.; Пуцяводныя ідэі беларускае літаратуры // Там жа. 29 студз., 4, 18, 25 лют., 4 сак.; Адраджэнне беларускага мастацтва // Там жа. 18 сак.; Эвалюцыя краёвае культуры // Там жа. 1 крас.; Максім Багдановіч: У чацвёртыя ўгодкі смерці яго / Пад крыпт. А. Л.; Жыдоўскае пытанне ў беларускай літаратуры / Там жа. 27 мая; Праф. Рудольф Абіхт: (Жалобны ўспамін) // Там жа. 1 ліп.

1922. Песні: (Памяці Ядвігіна Ш.): [Вершы] / Пад крыпт. Н. А.; Вялікае свята // Наш шлях. № 1; Ідэолаг народнай інтэлігенцыі (Максім Гарэцкі): Літ.-сацыяльны нарыс // Бел. звон. 24 лют., 4 сак.; Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) // Там жа. 11 сак.; Аляксандр Бурбіс // Там жа. 22 крас.; Песняру зямлі нашай // Там жа. 28 вер.; Чей путь правильней: (Из записной книжки белорусского интеллигента) // Звезда. 23 янв. / Пад псеўд. Антон Беларус. Аўт. спрэчн.

1923. Дваццатыя ўгодкі БРГ // Змаганне. № 21 / Пад крыпт. Г. Б.; Нязнаныя творы М. Багдановіча // Наша будучыня. 6 студз.; Бібліяграфія: [Рэц. на кн.: Дубоўка У. Строма. Вільня, 1923] // Там жа. 14 лют.; Памяці Ігната Канчэўскага: [Некралог] // Новае жыццё. 27 крас. / Пад крыпт. А. Л.

1924. Крызіс ідэі ці крызіс грамадзянства?; Новае ў беларускай паэзіі; Вязніца Адама Міцкевіча // Заходняя Беларусь. Вільня; Кудой ісці?// Студэнцкая думка. № 1 / Пад крыпт. А. Н.; Наш культурны рост // Змаганне. 4 студз.; Не калечце мовы! // Сын беларуса. 30 чэрв.; Беларусы ў польскіх партыях // Там жа. 23 ліп. / Пад псеўд. І. Мялешка; Успамін аб Мацею Бурачку // Там жа. 27 ліп.; Эканамічнае нішчэнне краю // Там жа. 30 ліп. / Пад псеўд. Ів. Мялешка; Вялікая вайна ў беларускай літаратуры // Там жа. 1 жн.; Праз галовы нашых паслоў // Там жа. 17 жн. / Пад псеўд. Ів. Мялешка; Фантастычны данос / Пад псеўд. Ів. Мялешка; Абмылкі ў выданнях твораў Багушэвіча: Пісьмо ў рэдакцыю // Там жа. 27 жн.; Літаратурны плагіят // Там жа. 5 вер.; Ключ усходу // Там жа. 10 вер. // Пад псеўд. Ів. Мялешка; Вярніце Беларусі культурны скарб // Сялян. праўда. 26 ліст. / Пад крыпт. А. Л.; Забытая кніга // Там жа. 30 ліст.; Z powodu sporu o «Celę Konrada»: (List do Redakcji) // Prz. Wileński. Nr 6; Jeszcze jedna napaść: (List do Redakcji) // Prz. Wileński. Nr 7; Podświadome i świadome w «duszy białoruskiej» Syrokomli // Prz. Wileński. Nr 18.

1925. «Мы верым, што наша маладая народная інтэ-

лігенцыя...» Беларускі Гаспадарскі Каляндар на 1926 год. Вільня; Дваццацілецце Беларускай Сацыялістычнай Грамады // Бел. ніва. 5 снеж. Пад крыпт. Г. Б.; Вільня ў беларускай літаратуры // Студэнцкая думка. № 5; Вінцук Дунін-Марцінкевіч // Бел. доля. 21 лют.; Да гісторыі народнага мастацтва: Крашаніна // Жыццё беларуса. 22 жн. / Пад крыпт. Н-а А.; «Сымон Музыка» // Там жа. 24, 29 кастр., 4 ліст.; Апошні верш М. Багдановіча // Іскра. 31 мая / Пад крыпт. А. Н.; [Рэц. на кн.: Купала Я. Безназоўнае. Мн., 1925] // Там жа. 24 чэрв.; Дзмітро Дарашэнка: (К 25-летняму юбілею яго працы) // Новы шлях. 4 студз.

1926. Сымон Музыка // Якуб Колас у літаратурнай крытыцы. Мн.; Эвалюцыя беларускае адраджэнскае ідэалогіі і адбіцце яе ў літаратуры // Студэнцкая думка. № 1; Новы дакумент аб [І.] Луцкевічу // Бел. слова. 27 чэрв.; Казімір Сваяк // Бел. справа. 14, 19 мая; «Цётка»: (У дзесятыя ўгодкі смерці яе) // Нар. справа. 3 ліст.; Якуб Колас: (Жыццё і творчасць) // Там жа. 19, 23 ліст.; Metropolita Szeptycki a ruch białoruski // Prz. Wileński. Nr 9 / Пад крыпт. A. N.

1927. Уступнае слова да другога выдання // Багдановіч М. Вянок. Вільня; Зямля і сялянства // Беларускі каляндар. Вільня / Пад крыпт. Г. Б.; Жыццё і творчасць Якуба Коласа // Колас Я. Выбр. тв. Вільня; Антон Лявіцкі (Ядвігін Ш.): (У пятыя ўгодкі смерці яго) // Родныя гоні. № 1; Істота літаратуры і яе грамадскае значэнне // Там жа. № 2; Роля моладзі ў пачатках адраджэнцкага руху // Там жа. № 5; Проці маральнага бруду: (Пісьмо ў рэдакцыю) // Наш водгук. 16 сак.; З выдавецкае нівы // Наша праўда. 12 крас.

Пад крыпт. Н-а А.; «Пад сінім небам»: [Рэц. на кн.: Арсеньева Н. Пад сінім небам, 1927] // Там жа. 3 жн.

1929. З усходніх загонаў: (Літ. агляд) / Пад крыпт. А. Н.; Чатырохсотлецце першага кодэксу беларускага права / Пад крыпт. А. Л.; Скарбы Беларускага музея ім. Івана Луцкевіча ў Вільні // Беларускі каляндар на 1929 год. Вільня; Крыху аб праграме лектуры / Пад крыпт. А. Н.; Пра беларускую ўрадавую школу — да апалячывання // Сям'я і шк. № 2.

1930. Статут В. кн. Літоўскага на фоне эвалюцыі нацыянальных адносінаў у Беларусі // Шк. і жыццё. № 1.

1931. Крыху аб філёлёгіі і «філёлёгіі» // Бел. звон. № 9; List do redakcji // Prz. Wileński. Nr 17.

1932. Крытычныя моманты ў жыцці Купалы і Коласа (паводле іх твораў) // Новая варта. № 2; **1934.** № 3; [Рэц. на кн.: Gołąbek I. Wincenty Dunin-Marcinkiewicz — poeta polsko-białoruski. Wilno, 1932] // Бел. звон, 13, 27 крас.; Беларускія культурныя арганізацыі і ўстановы ў Латвіі // Там жа. 13, 27 мая, 4 чэрв.; Ян Луцэвіч — Янка Купала // Там жа. 30 ліп.; Янка Купала як прарок адраджэння // Там жа. 11, 19, 27 жн., 13 вер.; 50-лецце Якуба Коласа // Там жа. 19 ліст.

1933. Пячаткі полацкіх князёў у Беларускім музеі; Да гісторыі беларускага дрэварытніцтва; Беларускі гутарнік Піліп Смуры; Фрагмент з жыцця В. Дуніна-Марцінкевіча; Праўда аб «Мужыцкай праўдзе» / Пад крыпт. А. Л.; Пятнаццаць гадоў працы Беларускага навуковага таварыства; Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі; З недрукаванае спадчыны па М. Багдановічу; Беларускі музей імя Ів. Луцкевіча ў Вільні // Гадавік БНТ у Вільні; Muzeum białoruskie im. Jana Łuckiewicza w Wilnie // Balticoslavica. Wilno. T. 1; Idea niepodległościowa w poezji białoruskiej // Prz. Wileński. Nr 1—3; Główne kierunki poezji białoruskiej // Żagary. Nr 2.

1935. Narodowolcy-Białorusini i ich organ «Homon» // Pamiętnik VI powszechnego zjazdu historyków polskich w Wilnie. Lwów; Czy zrozumieją? // Prz. Wileński. Nr 1 / Пад крыпт. H. B.; Powracająca fala // Prz. Wileński. Nr 3—4 / Пад крыпт. H. B.; Dwudziestopięciolecie teatru białoruskiego // Prz. Wileński. Nr 6 / Пад крыпт. H. B.; Niezbędne poprawki: (List do Redakcji) // Prz. Wileński. Nr 9; Klasyczne wzory kaligrafji politycznej // Prz. Wileński. Nr 11—12 / Пад крыпт. H. B.; Z dawnych anegdot: (List do Redakcji) // Prz. Wileński. Nr 13—14; Stulecie katechizmu białoruskiego // Prz. Wileński. Nr 18 / Пад крыпт. A. Ł.; Wolna trybuna: Względy polityczne, a interes gospodarczy // Prz. Wileński. Nr 19; Poza parlamentem // Prz. Wileński. Nr 20 / Пад крыпт. H. B.; Jubileusz szkolnictwa białoruskiego: (W dwudziestą rocznicę) / Пад крыпт. H. B.; «Kałośsie» za trzy kwartały / Пад крыпт. A. Ł. // Prz. Wileński. Nr 22—23.

1936. «Kałośsie» // Prz. Wileński. Nr 1—2 / Пад крыпт. A. Ł.; Błędna terminologia // Prz. Wileński. Nr 3; Niema czemu się dziwić // Prz. Wileński. Nr 4 / Пад крыпт. H. B.

1937. Праблемы сфарміравання нацыянальнай душы Максіма Багдановіча // Калоссе. № 4; Z historii walki o język wykładania historii i geografii w gimnazjach mniejszościowych // Prz. Wileński. Nr 1 / Пад крыпт. H. B.; Japońska agentura // Prz. Wileński. Nr 2; Rok 1936 w pracy kulturalnej Białorusinów // Prz. Wileński. Nr 3 / Пад крыпт. H. B.; Nieoczekiwany cios / Пад крыпт. H. B.; Zygmunt Nagrodzki: (Wspomnienie pośmiertne) // Prz. Wileński. Nr 4; Ze wspomnień o Ferdynandzie Ruszczycu // Prz. Wileński. Nr 5; O «zmarnowanym dziedzictwie» słów kilka / Пад крыпт. H. B.; Tempora muntantur... / Пад крыпт. A. Ł. // Prz. Wileński. Nr 6; Wspomnienie o prezydencie Masaryku // Prz. Wileński. Nr 7; Warszawska rewelacja o skarbach Wileńskich / Пад крыпт. A. Ł.; O duszy białoruskiej Syrokomli: (Wrażenia z obchodu 75-lecia śmierci poety) // Prz. Wileński. Nr 9.

1938. Палітычны працэс Якуба Коласа; Прызнанне правоў беларускай мовы падчас сусветнай вайны / Пад крыпт. А. Л.; Жыццё і творчасць Фр. Багушэвіча ў успамінах ягоных сучаснікаў // Запісы БНТ. Вільня. Т. 1; Monarchizm operetkowy // Prz. Wileński. Nr 1 / Пад крыпт. A. Ł.; Z dziejów stosunków Czechów z Litwą i Białorusią / Пад крыпт. H. B.; Po co oni to robią / Пад крыпт. A. Ł. // Prz. Wileński. Nr 2; Białorusini we Francji / Пад крыпт. H. B.; Etsi movetur... / Пад крыпт. A. Ł.// Prz. Wileński. Nr 3; Nakaz chwili // Prz. Wileński. Nr 4—5 / Пад крыпт. H. B.

1939. Абдзіраловіч і Барыка: Літ. паралель / Пад крыпт. А. Н.; Людвік Абрамовіч // Калоссе. № 1; Да крыніцаў творчасці М. Багдановіча // Там жа. № 3; Цяжкім быў лёс працоўнага беларуса // Віленская праўда. 26 вер.; Odrodzeniowa literatura białoruska; Współczesna dramaturgia białoruska; Muzeum białoruskie im Jana Łuckiewicza // Sygnały. 15 sierp.

1.4.

Кісялёў А. Элементарная алгебра / З рус. Вільня, 1921. Рэц.: Круталевіч // Вестн. НКП ССРБ. 1922. № 11—12.

Остэрлёф В., Шустэр Я. Сусветная гісторыя. Ч. 2. Сярэднявечная гісторыя / З ням. Вільня, 1921.

Новы запавет і псальмы. Гэльсінгфорс, 1931; Лёндан, 1948; [Stockholm], 1991.

1922. Герцэн А. Кніга: [Фрагмент] / З рус. // Маладое жыццё. № 2 / Пер. пад крыпт. А. Н.

1.5.

На беларускую мову. Падсвядомае і свядомае ў «душы беларускай» Сыракомлі / Пер. з пол. Фр. Гр[Грышкевіч Ф.] // Студэнцкая думка. 1925. № 1.

На нямецкую мову. Die weissruthenische Literatur in der Vergangenheit und Gegenwart // Jahrbücher für Kultur und Geschichte der Slaven. 1931. H. 4.

На ўкраінскую мову. Білоруський національний рух // Літ.-науковий вістник. К., 1911. № 3.

На чэшскую мову. Národni probuzeni Bělorusi // Slov. Přehled. 1909. R. 11.

На яўрэйскую мову. Беларусы. Вільня, 1924.

2.3.

На беларускай мове. Антон Навіна // Варта. 1918. № 1; Арышт беларускага дзеяча // Н. н. 1920. 12 ліст.; Арышт Антона Луцкевіча // Пагоня. 1920. 5 жн.; Асмольскі А. Хочуць быць лепшымі // Слова праўды. 1931. 21 ліст.; Бабарэка А. Максім Багдановіч у літаратурных ацэнках // Узвышша. 1927. № 2; Багдановіч М. Пану [Антону Навіне] на спамін ад аўтара // Багдановіч М. Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1; Бергман А. Антон Луцкевіч // Ніва. 1984. 29 студз.; Весткі з Вільні // Пагоня. 1920. 2 вер.; Вуха. Цікавы «Сход» // Свет. 1929. 6 ліп.; Гарэцкі М. Навіна Антон // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня. 1920; Дзве лекцыі // Слова працы. 1928. 20 кастр.; Жылка У. Антону Навіне // Звязда. 1927. 30 кастр.; Зарэцкі М. Чым А. Луц-

кевіч хацеў прыслужыцца бальшавікам // Слова праўды. 1931. 21 ліст.; Калеснік У. Ветразі Адысея. Мн., 1977. С. 85—88; Корчык П. Нацыянал-фашызм — нацыянал-дэмакратызм // Звязда. 1930. 17 снеж.; Новая спроба камасацыі Беларускага музея // Шлях моладзі. 1938. № 15; Новы дакумент аб А. Луцкевічу // Бел. слова. 1926. 26 лют.; Святкаванне 10-х угодкаў смерці М. Багдановіча ў Вільні // Бел. крыніца. 1927. 3 чэрв.; Станкевіч Я. Адказ маім «крытыкам» // Неман. 1932. № 4; Сутнасць рэформы беларускага правапіса // Звязда. 1934. 10 студз.; Ф. Я. Кампартыя Заходняй Беларусі ў барацьбе за рэвалюцыйны выхад з крызісу // Звязда. 1934. 20 студз.; Яновіч С. Антон Луцкевіч // Ніва. 1975. 30 сак.

На польскай мове. Bergman A. Antoni Łuckiewicz // Bergman A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1984; Kaj [Jaworski K.] Noty // Kamena. 1934. Nr 5; Przebieg procesu «Hromady» // Orka. 1928. 3 marca.

На рускай мове. Сидоревич А. Антон Луцкевич: Главы из книги // Неман. 1990. № 7; Сташкевич Н. Приговор революции. Мн., 1985. С. 31, 32, 34, 41.

На ўкраінскай мове. Байков М. Новітня білоруська література // Нова Білорусь. К., 1929.

3.1.

ЦБ АН Літвы, ф. 21, адз. зах. 221—226, 260, 277—308, 321—356, 2176—2178; ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 197—199.

Г. І. Рэут.

ЛУЦКЕВІЧ ІВАН

Луцкевіч Іван Іванавіч (псеўд.: Ян Міхальчук, Нашанівец, Шчасны, Palissander Нев.; крыпт.: І. Л.; 28.5.1881, Шаўлі Ковенскай губ., цяпер Шаўляй, Літва — 20.8.1919, Закапанэ, Польшча, перахаваны ў 1991 на могілках Роса ў Вільнюсе), празаік, публіцыст, археолаг, краязнавец, грамадска-палітычны дзеяч, адзін з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння пачатку 20 ст.

Нарадзіўся ў сям'і служачага, які працаваў на чыгунцы. Бацька паходзіў са збяднелай беларускай шляхты старажытнага роду (яго сямейны герб «Навіна» вядомы з канца 14 ст.). Зямельнай маёмасці не меў, служыў вайскоўцам (дайшоў да капітана), удзельнічаў у Крымскай вайне, дзе атрымаў высокія ўзнагароды. Затым быў арандатарам на Бабруйшчыне, дзе пасябраваў з В. Дуніным-Марцінкевічам, які прысвяціў яму адзін са сваіх вершаў. Брат бацькі Сцяпан удзельнічаў у паўстанні 1863, за што быў расстраляны царскімі ўладамі.

У 1890 І. Луцкевіч пачаў вучыцца ў Лібаўскай гімназіі. Пасля смерці бацькі (1897) сям'я пераехала ў Мінск, дзе І. Луцкевіч працягваў вучыцца ў гімназіі. У 1902, пасля яе заканчэння, паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта і адначасова — у Археалагічны інстытут, які скончыў у 1904. Для далейшай вучобы накіраваны ў Вену (універсітэт скончыў у 1905). Грамадская актыўнасць І. Луцкевіча выявілася яшчэ ў школьныя гады — ёй спрыялі сямейныя традыцыі. Ён цікавіўся гісторыяй, калекцыянаваў манеты і старасвецкія рэчы, частка якіх пазней трапіла ў заснаваны ім у Вільні Беларускі музей. У Мінскай гімназіі ўдзельнічаў у гуртку прагрэсіўнай беларускай моладзі, якім апекаваўся К. Кастравіцкі (К. Каганец). Апынуўшыся ў асяроддзі пецярбургскіх студэнтаў, сярод якіх было нямала выхадцаў з Беларусі, імкнуўся аб'яднаць іх на грунце патрыятычных пачуццяў. Створаны там гурток народнай асветы па ініцыятыве І. Луцкевіча выдаў «Калядную пісанку» і зборнік Я. Лучыны «Вязанка». Ва ўмовах актывізацыі апазіцыйнага руху супраць царскага рэжыму, напярэдадні рэвалюцыі 1905 стаў адным з ініцыятараў стварэння падпольнай беларускай палітычнай партыі Беларускай рэвалюцыйнай грамады (пазней Беларуская сацыялістычная грамада, БСГ). За сваю палітычную дзейнасць у Пецярбургу ў 1903 упершыню трапіў у астрог. Выйшаўшы на волю, актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях у Мінску ў радах БСГ. Пад пагрозай арышту ў пачатку 1906 вымушаны быў выехаць у Вільню, дзе знаходзіўся на нелегальным становішчы да 1908. Тады ж па яго ініцыятыве ў Вільні былі створаны беларускія газеты «Наша доля» (1906) і «Наша ніва» (1906—15), а таксама кнігавыдавецкія суполкі «Наша хата», Беларускае выдавецкае таварыства, Беларускі музычна-драматычны гурток. У пачатку першай сусветнай вайны на тэрыторыі, з якой адступілі царскія войскі, узнікла магчымасць арганізаваць беларускае школьніцтва. Ужо ў 1915, па ініцыяты-

«нам вораг усюды куе перашкоды», і на традыцыйнае ў той час супрацьпастаўленне старога («смяротнай іржы») «новаму будынку». У гэтым творы, напісаным пад уплывам яўнага сацыяльна-палітычнага заказу, ёсць, аднак, і пранікнёна-лірычныя мясціны. Апошнія выяўленыя публікацыі Б. Люгоўскага датуюцца 1940 годам.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.3.

1926. На лыжах; Вясна: [Вершы] // Пачатак. Віцебск; Вясна: [Верш] // Малады араты. № 9; Конь сталёвы: [Верш] // Там жа. № 17; За цапом: [Верш] // Віцеб. сял. газ. 28 ліст.

1927. Я хачу; Горад; Тут касілі не касою; Дзесяты год: [Вершы] // Світанне. Віцебск. № 1; Горад: [Верш] // Віцеб. сял. газ. 29 студз.; Якубу Коласу: [Верш] // Там жа. 13 сак.; На руінах меж: [Верш] // Там жа. 5 мая; «Гэй, нясіся, конь сталёвы!»: [Верш] // Заря Запада. 8 июля; Тут касілі не касою: [Верш] // Там жа. 29 июля; За трактарам: [Верш] // Чырв. змена. 5 чэрв.

1928. У гэты час: [Верш] // Віцеб. сял. газ. 24 студз.; «Я не махаю ў задуменні...»: [Верш] // Там жа. 4 сак.; У вянок: [Верш] // Там жа. 18 сак.; Аб каменні: [Верш] // Заря Запада. 24 июня; На будаванні: [Верш] // Там жа. 7 нояб.; Новыя песні: [Верш] // Там жа. 25 нояб.

1929. Песня будавання: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 27 кастр.; Мае прабачуць: [Верш] // Там жа. 8 снеж.

1930. На рыштаванні: Паэма // Рытмы будавання. Віцебск; Шасцяронка: [Верш] // Узвышша. № 9—10; Ліст дзяўчыне: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 21 крас.; Ранне на заводзе: [Верш] // Там жа. 21 кастр.; На рыштаваннях: [Верш] // Там жа. 8 ліст.; Трывога: [Верш] // Там жа. 19 ліст.; Тэмп: [Верш] // Там жа. 28 ліст.

1931. Больш металу: [Верш] // Узвышша. № 2; Ідзем пераможна ў 15-ы год: [Верш] // Штурм. № 1; «Там, дзе трубы лесам...»: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 1 студз.; Могілкі прагульшчыкаў: (Урыўкі з паэмы) // Там жа. 29 снеж.

1932. Мітынг у сталоўцы: (З паэмы «Могілкі прагульшчыкаў» // Віцеб. пралетарый. 18 крас.; Мы пазыкай дамо мільёны!..: [Верш] // Там жа. 9 ліп.; На кроквах: [Верш] // Там жа. 21 ліп.; Балада аб салдацкіх касцях: [Верш] // Там жа. 11 кастр.; Больш металу: [Верш] // Там жа. 18 сак.

1933. Першы вытап: Вершы // Люгоўскі Б., Жалязняк Р. Першы вытап. Віцебск. Рэц.: Галубок Э. Старонка літаратурнага Віцебска // ЛіМ. 1933. 31 снеж.; Крытыка-бібліяграфічны зборнік. Мн., 1934. С. 58; Ларчанка М. Першы вытап // ЛіМ. 1934. 16 лют.; Мікуліч Б. «Першы вытап» — збор вершаў Люгоўскага і Жалязняка // Полымя рэвалюцыі. 1933. № 11; Пра хлеб і матулю: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 4 крас.

1934. Зотаўцы: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 10 мая; Недакурак: [Верш] // Там жа. 26 мая; У гасцёх у брыгадзіра: [Верш] // Там жа. 20 ліп.; Ранне Рэспублікі: [Верш] // Там жа. 1 жн.; Памяці Кірава: [Верш] // Там жа. 6 снеж.

1935. Вясна: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 1 крас.; Чырв. змена. 24 мая; Ранне: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 10 мая; Сонечны савецкі дзень: [Верш] // Там жа. 15 чэрв.; Маці: [Верш] // Там жа. 29 жн.; ЛіМ. 27 вер.; Нашы дні: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 15 кастр.

1936. Чапаеў: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 1 лют.; Арганічная сувязь з народам // Там жа. 15 кастр.; Кахецінскае віно: [Верш] // Там жа. 19 ліст.

1938. Светлы дзень: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 5.

1939. Штодзённа і ўпарта вучыцца: (Агляд пісем пачынаючых аўтараў) // Віцеб. рабочы. 8 жн. / Сааўт. Р. Жалязняк; Уважліва выхоўваць літаратурныя кадры // Там жа. 29 жн. / Сааўт. Р. Жалязняк.

1940. Вера ў сілы народа // Віцеб. рабочы. 8 снеж.

1.4.

1931. Ф-цкі. Будні героя Рабікава / З пол. // Віцеб. пралетарый. 19 вер.

1933. Песня Омскай Чырвонасцяжнай / З рус. // Віцеб. пралетарый. 30 ліп. / Сааўт. пер. Я. Мазуркевіч.

2.3.

На беларускай мове. Василёнак Я. За перабудову работы АПП // Віцеб. пралетарый. 1932. 18 крас.; Мазуркевіч Я. Пралетарская літаратура ў Віцебску // Там жа. 1930. 8 ліст.; Насустрач з'езду пісьменнікаў БССР: Віцебскія пісьменнікі ў Гомелі // Палес. праўда. 1934. 23 мая; Раскін С. Віцебскія пісьменнікі // Віцеб. пралетарый. 1937. 12 крас.

М. П. Барташэвіч.

ЛЮТАВА ВЕРА

Лютава Вера Сяргееўна (10.8.1912, в. Каськова Дарагабужскага пав., цяпер Дарагабужскі р-н Смаленскай вобл.— 25.5.1954, Мінск), паэтэса, празаік. Член СП Беларусі з 1946. Пісала на рускай мове.

З сям'і саматужніка. Закончыўшы ў 1927 сярэднюю школу ў Дарагабужы, працавала ў Смаленску бібліятэкарам, статыстам. У 1940 завочна закончыла Смаленскі педінстытут і працавала настаўніцай на Смаленшчыне, з 1941 у Тамбоўскай вобл. З 1942 працавала бібліятэкаркай у Яраслаўлі, з 1943 на журналісцкай рабоце. Пасля вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пераехала сюды разам з рэдакцыяй акружной ваеннай газеты. З-за хваробы пакінула працу ў газеце і перайшла да літаратурнай творчасці. Узначальвала секцыю рускай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі. Рэдагавала кнігі маладых пісьменнікаў, выступала як перакладчык і прапагандыст твораў беларускіх паэтаў. Узнагароджана медалямі. Памерла ў росквіце творчых сіл.

Першыя вершы В. Лютавай змешчаны ў смаленскім друку ў 1930. Потым яе творы сталі з'яўляцца ў «Комсомольской правде», у часопісах «Смена», «Огонек» (раннія яе публікацыі не выяўлены). Вершы маладой паэтэсы ведаў М. Ісакоўскі, творча дапамагалі ёй А. Твардоўскі і М. Рыленкоў. Першы невялічкі зборнік яе вершаў «Воля да жыцця» выдадзены ў гады Вялікай Айчыннай вайны Яраслаўскім абласным выдавецтвам. З вершаў гэтага зборніка паўсталі вобразы простых, нічым не прыкметных людзей, поўных, аднак, жадання і волі да перамогі над гітлераўцамі. У вершах, публіцыстычных артыкулах, газетных нарысах, якія яна друкавала ў гады вайны, таксама расказвалася пра барацьбу з ворагам, пра гераічную працу народа ў імя перамогі. «Зарава над лесам» — адзіная аповесць В. Лютавай. Гэта простае, сардэчнае апавяданне пра моладзь, якая ў цяжкіх умовах пасляваенных гадоў на руінах старога завода будавала Мінскі трактарны завод-гігант. *З. А. Суднік.*

Бібліяграфія

1.2.

Воля к жизни. Ярославль. 1943.

Зарево над лесом: Повесть. Мн., 1951. Рэц.: Клешчанка В. У адрыве ад сучаснасці // Мін. праўда. 1951. 23 вер.; Украинец П. Молодые строители коммунизма // Полес. правда. 1952. 20 янв.; Цітоў К. Аповесць аб трактаразаводцах // Беларусь. 1951. № 9; 2 изд. Мн., 1957.

1.3.

1945. Обмолот: [Верш] // Сталин. молодежь. 21 дек.

1947. Москва; Счастье; Обмолот: [Вершы] // Сов. Отчизна. № 3; Голос Кремля: [Верш] // Заря. 16 нояб.; Счастье: [Верш] // Там жа. 30 дек.; Каменщики // Сов. Бел. 16 авг.; Несокрушимый бог войны: [Верш] // Сталин. молодежь. 23 нояб.; Чудесная книга: [Верш] // Там жа. 5 дек.

1948. О девушках; Награда: [Вершы]; Минский тракторный: [Нарыс] // Сов. Отчизна. № 4; В этот день: [Верш] // Заря. 11 янв.; Сов. Бел. 11 янв.; Счастье: [Верш] // Там жа. 3 янв.; Первый день: [Верш] // Там жа. 1 сент.; Новогодний тост: [Верш] // Сталин. молодежь. 31 дек.

1949. Праздник Победы: [Верш] // Сталин. молодежь. 8 мая.

1950. Зарево над лесом: (Глава из повести) // Сов. Отчизна. № 8; Биография вождя: [Верш] // Сталин. молодежь. 7 июля.

1951. Часовой: [Верш] // Сов. Отчизна. № 9.

1.4.

1949. Калачинский М. Яблоко: [Верш] / С бел. // Сов. Отчизна. № 6.

1973. Бровка П. Проснулся я рано: [Верш] / С бел. // Бровка П. Дума о бессмертии. М.

1.5.

На беларускую мову. Узнагарода: [Верш] / З рус. // Работніца і сялянка. 1948. № 4; Беларусі: [Верш] / З рус. // Там жа. 1949. № 1; Гаспадары завода: Урывак з аповесці «Зарава над лесам» / З рус. // Беларускі трактарны. Мн., 1950; Жанчыны Савецкай Беларусі. Мн., 1954.

2.3.

На беларускай мове. Абмеркаванне новай аповесці // ЛіМ. 1950. 30 крас.; Броўка П. За новы творчы ўздым беларускай савецкай літаратуры // Полымя. 1952. № 5; Карпаў У. Герой нашага часу // ЛіМ. 1952. 16 лют.; Яго ж. За глыбокае вывучэнне жыцця // Там жа. 1952. 2 лют.; Яго ж. Умова творчага росту // Там жа. 1952. 12 студз.; Кудраўцаў І. На павароце // Там жа. 1948. 13 сак.; Кулакоўскі А. Тэма і наш абавязак // Там жа. 1952. 8 сак.; Наш каляндар // Там жа. 1982. 13 жн.; Вера Лютава: [Некралог] // Там жа. 1954. 29 мая; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Пісьменнікіў заходніх абласцях Беларусі // ЛіМ. 1949. 29 кастр.; Садоўскі Я. Чалавек з добрым сэрцам // Там жа. 1980. 15 жн.

На рускай мове. Карасев Ю. Образы наших современников // Сов. Отчизна. 1953. № 4; Климкович М. Редактирование первой книги писателя // Там жа. 1952. № 1; Миронов А. Вера Лютова // Лютова В. Зарево над лесом. Мн., 1957.

М. П. Барташэвіч.

ЛЯВІЦКАЯ ВАНДА

Лявіцкая (па мужу Лёсік) Ванда Антонаўна [псеўд. Вясёлка, Адам Шкіляр, крыпт. Ванда Л-а, В. Л-к., Вандзя Л-я, Ванда Лев-ая, Wanda L-a; 13(25).9. 1895, мяст. Радашковічы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. — 8.12.1968, пас. Татарка Стаўрапольскага краю, пахавана там жа], паэтэса, празаік.

В. Лявіцкая — адзіная дачка пісьменніка Ядвігіна Ш. (А. Лявіцкага). Маці яе, Люцыя Гнатоўская, была швачкай у Радашковічах, бацька — памочнікам аптэкара. Мела трох малодшых братоў: Лявона, Вацлава, Казіміра. З 1897 сям'я жыла ў в. Карпілаўка (20 км ад Радашковіч). Чытаць і пісаць па-польску В. Лявіцкую ў сямігадовым узросце навучыў бацька. Беспаспяхова спрабавала паступіць у Марыінскую гімназію ў Вільні. Скончыла вышэйшае пачатковае вучылішча ў Радашковічах (1914). Рыхтавалася здаваць экзамены на настаўніцу сельскай школы, але гэтаму перашкодзілі каталіцкае веравызнанне і імперыялістычная вайна. З 1914 жыла ў Мінску, працавала ў «Беларускай кнігарні», гарадской бібліятэцы імя А. Пушкіна, куды яе рэкамендавала паэтэса Цётка, чытала карэктуру часопісаў «Саха» і «Лучынка». Летам 1916 працавала выхавацелем дзяцей з Беларускага прытулку ў в. Карпілаўка. З восені 1916 і да Лютаўскай рэвалюцыі працавала ў дзіцячым прытулку пры Беларускім таварыстве дапамогі пацярпелым ахвярам вайны, які знаходзіўся ў в. Ратамка пад Мінскам. Летам 1917 вучылася на Беларускіх курсах, а потым працавала ў Першай мінскай беларускай школе. Выйшаўшы замуж за пісьменніка і вучонага Я. Лёсіка (1917), жыла ў Мінску, выхоўвала дзяцей, часам брала ў выдавецтвах выпадковыя пераклады. Пасля арышту мужа (1930) працавала пасудамыйкай, разносчыцай тэлеграм. З 1933 дзяліла ўсе нягоды з ссыльным Я. Лёсікам. Нейкі час працавала настаўніцай, карэктарам у выдавецтвах. Страціўшы мужа, жыла ў дзяцей — старэйшай дачкі Люцыі ў Ліпецку, малодшай Алесі ў пас. Татарка Стаўрапольскага краю, сына Юрыя ў Армавіры.

Першае апавяданне «Бацькаўшчына» апублікавана ў 1909 у «Нашай ніве». Друкавалася ў газетах «Вольная Беларусь» і «Беларусь», у савецкі час — у часопісах для дзяцей «Зоркі» і «Іскры Ільіча». У сваіх паэтычных і празаічных творах апявала прыгажосць прыроды роднага краю, выказвала патрыятычныя пачуцці («Як люблю цябе я, Беларусь ты мая!») Напісала ўспаміны пра свайго бацьку.

А. У. Жынкін, У. А. Лебедзеў.

Бібліяграфія

1.3.

1909. Бацькаўшчына: Апавяданне // Н. н. 21 мая / Пад крыпт. Ванда Л-а.

1913. Майскія ночы: [Верш] // Н. н. 31 мая / Пад крыпт. Ванда Лев-ая.

1914. «Сумна, сумна шуміць старушка ліпа...»: [Абразок] // Лучынка. № 4 / Пад крыпт. Вандзя Л-я.

1917. Чужая: [Апавяданне] // Вольная Беларусь. 20 чэрв. / Пад псеўд. Вясёлка.

1919. Задушкі // Беларусь. 5 ліст. / Пад псеўд. Вясёлка.

1922. Пасмертныя ўспаміны: Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) // Адраджэнне. № 1; Мімавольная віна: (Апавяданне) // Зоркі. № 1 / Пад псеўд. Вясёлка.

1929. Як згубіўся Кастусь: Апавяданне / // Іскры Ільіча. № 3 / Пад псеўд. Вясёлка.

1933. Лыжы: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 4 / Пад псеўд. Вясёлка.

1965. Бацькаўшчына: (Апавяданне) // Беларуская дакастрычніцкая проза. Мн. / Пад крыпт. Ванда Лев-ая.

1967. Майскія ночы: [Верш] // Беларуская дакастрычніцкая паэзія. Мн. / Пад крыпт. Ванда Лев-ая; Незабыўнае // У сэрцы народным. Мн.

1.4.

1918. Чайчэнка В. Сястрычка Галя: [Апавяданне] / З укр. // Вольная Беларусь. № 39—40 / Пер. пад псеўд. Вясёлка.

1919. Канапніцкая М. Крыста: [Апавяданне] / З пол. // Беларусь. 17, 18, 23, 31 снеж. / Пер. пад псеўд. Вясёлка.

1.6.

Казкі // Зоркі. 1921. № 6 / Публ. пад крыпт. В. Л-к; Народныя казкі // Там жа. 1922. № 4 / Апрац. пад псеўд. Вясёлка.

3.1.

ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 196; ф. 30, воп. 1, адз. зах. 490, 1056; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 253. *Т. М. Махнач.*

ЛЯВОНЫ ЮРКА

Лявоны Юрка [сапр. Юркевіч Леанід Мікалаевіч; інш. псеўд.: Леанідаў, Леонидов, Ю. Лявоны, Юр. Лявоны, крыпт. Ю. Л., Л-ны, Юр. Л-ны, Юр. Ля-ны; 16(29).7.1908, г. Чавусы Магілёўскай губ., цяпер Магілёўская вобл.— восень 1937, Мінск], паэт. Член СП Беларусі з 1934.

Нарадзіўся ў сям'і служачага. Вучыўся ў Чавускай сямігодцы, Магілёўскім педтэхнікуме, Беларускім вышэйшым педагагічным інстытуце (г. Мінск), літаратурны факультэт якога скончыў у 1934. Працаваў у рэдакцыях газет «Магілёўскі селянін», «Звязда», часопісе «Работніца і калгасніца Беларусі». Часта ездзіў у камандзіроўкі па рэспубліцы. Восенню 1936 беспадстаўна арыштаваны. Паводле сведчання С. Грахоўскага, прыкладна праз год расстраляны, магчыма, у Курапатах пад Мінскам. Пасля была арыштавана і жонка Ю. Лявоннага Яўгенія, актрыса тэатра рабочай моладзі. Яе саслалі на 8 гадоў у лагер, разлучыўшы з маленькай дачкой.

Друкавацца пачаў у 1924 (першыя публікацыі не выяўлены). У другой палове 20-х гадоў вершы Ю. Лявоннага змяшчаліся ў многіх беларускіх газетах і часопісах, магілёўскіх альманахах «Дняпроўскія ўсплёскі» і «Ранне». Першыя зборнікі паэзіі «Камсамольскія вершы» і «Штурм» выйшлі ў 1930. Пры жыцці Ю. Лявоннага выйшла 6 яго паэтычных зборнікаў, у якіх аўтар апяваў сацыялістычнае будаўніцтва, дружбу народаў у савецкай краіне, інтэрнацыяналізм працоўных усяго свету. Ад зборніка да зборніка ў яго творах умацоўваўся палітычна-агітацыйны пачатак, у чым можна бачыць як уплывы У. Маякоўскага, так і тагачаснай рэчаіснасці. У некаторых творах паэта пераважала рытарычнасць. Выступаў Ю. Лявонны таксама як празаік і як крытык. Разам з С. Грахоўскім пераклаў на беларускую мову раман Жуля Верна «80 000 кіламетраў пад вадой». На словы Ю. Лявоннага напісалі песні Я. Гелер («Баявая чырвонаармейская») і А. Туранкоў («Маладое», «У паход»).

В. І. Атрашкевіч.

Бібліяграфія

1.1.
Выбранае. Мн., 1960.

1.2.
Камсамольскія вершы. Мн., 1930. Рэц.: Галубок Э. Гэта сёння..., а заўтра ў паход... за авалоданне мастацкай культурай // Маладняк. 1931. № 2.
Штурм: Вершы. Мн., 1930.
Жалезныя віхуры: Вершы. Мн., 1931.
Крок пяцігодкі: [Нарысы]. Мн., 1931.
Разбег: Вершы. Мн., 1931. (Мастацкае слова — масам).
Стала і мужна: Вершы. Мн., 1932. Рэц.: Васілеця А. Давайце аб сценку не стукаць ілбамі // Кніга масам. 1932. № 4—5.

1.3.
1925. «Мёртвые» па «жывых»: [Верш] // Маг. селянін. 17 вер. / Пад сваім прозв.; З святам Ураджаю — прывітанне ў будучыню!: [Верш] // Там жа. 1 кастр. / Пад псеўд. Леанідаў; Частушачкі: (Юбілейныя) // Там жа. 11 кастр. / Пад псеўд. Леанідаў; Там, дзе куецца новая беларуская культура; З цемры! // Там жа. 29 ліст. / Пад псеўд. Леанідаў; Маладое: [Верш] // Сав. Бел. 29 ліст. / Пад псеўд. Леанідаў; Успаміны: [Верш] // Чырв. змена. 28 ліп. / Пад сваім прозв.
1926. У спевах замеці: Апавяданне // Маладняк. № 6 / Пад сваім прозв.; Без крылляў: Апавяданне // Там жа. № 7—8; Восень: [Верш] // Там жа. № 9; З рынку: Апавяданне // Там жа. № 10; [Рэц. на: Маладняк Калініншчыны. 1926. № 3—4] // Маладняк Калініншчыны. № 5—6; Сав. Бел. 12 вер.; Змітрок з Загоранкі: Апавяданне // Малады араты. № 6; Маем сонечным...; Вечарам; Вясной; Зімовая дарога: [Вершы] // Там жа. № 7 / Пад сваім прозв.; Музыка жыцця: Апавяданне // Там жа. № 9; Нечаканае: Жарт з 1-й дзеі // Там жа. № 10; Перамога: Апавяданне/ // Там жа. № 13; Ураджай: [Верш] // Маг. селянін. 6 кастр.; «Маладняк» — кастрычніку: [Верш] // Там жа. 3 ліст.; Якубу Коласу: [Верш] // Там жа. 24 ліст. / Пад крыпт. Л. Ю.; Колас — пясняр сярмяжнай Беларусі // Там жа. 24 ліст.; З паэмы «Камсамолка»; Крок за крокам: (З кароценькай гісторыі нашай Маладняцкай філіі] // Там жа. 1 снеж.; Падарожнае: [Верш] // Сав. Бел. 14 лют. / Пад сваім проза.; У цягніку: [Верш] // Там жа. 14 сак. / Пад псеўд. Леанідаў; Камунары (1871 г.): [Верш] // Там жа. 18 сак.; Вясной: [Верш] // Там жа.

21 сак. / Пад сваім прозв.; Срэбралітая песня вясны...: [Верш] // Там жа. 11 крас.; Калі...: [Верш] // Там жа. 25 крас.; «Захавалась мінуўшчына цесная...»: [Верш] // Там жа. 18 ліп.; [[Рэц. на кн.: П у ш ч а Я. Вершы. Мн., 1926] // Там жа. 18 ліп.; Асенняй ранню: Асанансы // Там жа. 22 жн.; З поўдню: [Верш] // Там жа. 29 жн.; «З глыбіні маёй сумоты»: [Верш] // Там жа. 19 вер.; [Рэц. на кн.: М а р а к о ў В. Пялёсткі. Мн., 1926] // Там жа. 25 снеж.; Развітанне: [Верш] // Чырв. змена. 17 кастр.; «Вецер жоўтае лісце ўзьмёў...»: [Верш] // Там жа. 31 кастр.; Якубу Коласу: [Верш] // Там жа. 21 ліст.; «Ой, пыталась дзяўчына ў зор...»: [Верш] // Там жа. 26 ліст.; Снежань: [Верш] // Там жа. 19 снеж.

1927. Выпадак; З рынку: Апавяданні; Маці; Развітанне: [Вершы]; [Рэц. на: М а л а д н я к. 1926. № 10] // Дняпроўскія ўсплёскі. Магілёў; «Мне казалі ў плакучую восень...»: [Верш] // Маладняк. № 1; Выпадак: Апавяданне // Там жа. № 3; Пад млынны скрып: Апавяданне // Там жа. № 7—8; Зімовая радасць: [Верш] // Полымя. № 2; Успаміны; [Верш] // Там жа. № 4; Роднае: [Верш] // Там жа. № 6; На тым баку: Апавяданне // Чырв. сейбіт. № 8—9; Мы гатовы: [Верш] // Звязда. 2 кастр.; Нашай жанчыне: [Верш] // Там жа. 9 кастр.; Партз'езду: [Верш] // Там жа. 4 снеж.; На вуліцы: [Верш] // Там жа. 25 снеж.; Перамога: (Малюнак) // Маг. праўда. 29 мая; У цягніку; Падарожнае: [Вершы] // Маг. селянін. 5 студз.; 21 студзеня: [Верш] // Там жа. 19 студз.; Аб гармошцы: [Верш] // Там жа. 9 лют.; На прадвесні: [Верш] // Там жа. 20 лют.; 9 гадоў «Армія Чырвоная ўсіх мацней»: [Верш] // Там жа. 23 лют.; Яны ішлі...: [Камунарам 1871 году]: [Верш] // Там жа. 17 сак.; Брату — кавалю: [Верш] // Там жа. 20 сак.; З'езду саветаў: [Верш] // Там жа. 27 сак.; Кітаю: [Верш] // Там жа. 31 сак.; На матыў «Кірпічыкаў»: [Верш] // Там жа. 17 крас.; Вялікодны перазвон: [Верш] / Пад крыпт. Л. Ю.; Змітрок з Загоранкі: (Апавяданне) // Там жа. 24 крас.; Наш май: [Верш] // Там жа. 28 крас. / Пад крыпт. Л. Ю.; Вясновая рунь: (Агляд творчасці пачынаючых паэтаў) / Пад крыпт. Л. Ю.; Маладое: [Верш]; На сваёй старане: [Нарыс] // Там жа. 5 мая; Дзе што робіцца: [Вершы] // Там жа. 6, 8, 12, 15, 19, 22, 26, 29 мая, 2, 9 чэрв. / Пад псеўд. Юрачка; Аўт. спрэчнае; Пад лапцем «Селяніна»: (Лясная вандроўка Юрачкі — дзе ў лясох вялікія дзюрачкі, пра лясныя шумы таемныя, пра леснікоўскія справы цёмныя): [Вершы] // Там жа. 8, 12, 22 мая / Пад псеўд. Юрачка; Аўт. спрэчнае; Над гранкай: (З цыкла «Спатканні»): [Вершы] // Там жа. 15 мая; Украіне: [Верш] // Там жа. 22 мая; Максіму Багдановічу: [Верш] // Там жа. 5 чэрв.; Вясковая рунь: (Аб творчасці пачынаючых паэтаў) // Там жа. 9 чэрв. / Пад крыпт. Л. Ю.; Мы на варце: [Верш] / Пад крыпт. Ю. Л.; На варце: (Апавяданне) // Там жа. 12 чэрв.; Там, дзе Ліповіч...: (Маленькі фельетон) // Там жа. 16 чэрв. / Пад псеўд. Юрачка; Пажартаваў: (Апавяданне) // Там жа. 19 чэрв.; Тварыць без плачу!: [Верш] // Там жа. 26 чэрв.; На вятры: (Эскізы) // Там жа. 26 чэрв., 3, 10 ліп.; Вясковая рунь: (Аб творчасці нашых пачынаючых паэтаў) // Там жа. 3 ліп.; 25 жн. / Пад крыпт. Л. Ю.; Чатыры: (З паэмы «Змаганне») // Там жа. 7 ліп.; Краіне Саветаў: [Верш] // Там жа. 10 ліп.; Украінскія матывы: [Верш] // Там жа. 17 ліп.; Памяці Дзяржынскага: [Верш] / Пад крыпт. Юр. Л.; Вясковая рунь: (Аб творчасці нашых «пачынаючых») / Пад крыпт. Л. Ю.; Дзявочае: [Верш] // Там жа. 24 ліп.; Не цяпер было...: [Верш] // Там жа. 31 ліп.; Добры дзень!: [Верш] // Там жа. 7 жн.; Адзвінелі пяшчотаю струны: [Верш] // Там жа. 14 жн.; Правады: [Верш] // Там жа. 21 жн.; З мінулага; Прыдзе час...: [Вершы] // Там жа. 28 жн. / Пад крыпт. Л. Ю.; У гэты дзень: [Верш] // Там жа. 1 вер.; Асеннія напевы: [Верш] // Там жа. 4 вер.; Бярозка: [Верш] // Там жа. 11 вер.; Анціп: (Апавяданне) // Там жа. 18, 29 вер.; На манеўры: (Абразок) // Там жа. 22 вер.; Трыялет: [Верш] // Там жа. 29 вер.; Аленін пачын: (Апавяданне) // Там жа. 2 кастр.; Там...: [Верш] // Сав. Бел. 8 мая; «— Распляскалася ў прасторы сонца...»: [Верш] // Там жа. 24 мая; На Басфоры: [Верш] // Там жа. 28 жн.; Сярод поля...: [Верш] // Там жа. 4 вер.; «Я хачу ня шмат чаго...»: [Верш] // Там жа. 18 вер.; За літаратурны будынак // Там жа. 5 кастр.; У падшэфную!: [Верш] // Чырв. змена. 21 студз.; Лілёвыя матывы: [Верш] // Там жа. 30 студз.; На прадвесні: [Верш] // Там жа. 22 лют.; Камунары: З паэмы // Там жа. 27 сак.; Галя: [Верш] // Там жа. 3 крас.; Наша вясна: [Верш]; На прадвесні: Верш у прозе // Там жа. 5 мая; «Быццам стала варта на шырокім...»: [Верш] // Там жа. 5 чэрв.; Малання: [Верш] // Там жа. 1 снеж.; Краіне саветаў: [Верш] // Там жа. 23 снеж.

1928. Акцябрыны: [Верш] // Вясна. № 6; Вершы ў прозе: Горад; Вясна ідзе // Літ. дад. да газ. «Савецкая Беларусь». № 1; Па дарозе...: [Верш] // Там жа. № 2; Калі напаўзалі хмары...: Імпрэсія // Там жа. № 4; Вось таму...: [Верш] // Там жа. № 9; Травень: [Верш] // Там жа. № 10; Рэбэ: [Верш] // Там жа. № 11; На Валыні, там...: [Верш] // Там жа. № 12; Пажартаваў: [Апавяданне] // Там жа. № 13; Свята ў Замойску: Гумарэска // Там жа. № 17; Цішку Гартнаму: [Верш] // Там жа. № 20; «Ходзіць вецер пакінутым садам...»: [Верш] // Маладняк. № 1; Зажурыўся ў цвецень...: [Верш] // Там жа. № 4; Крымскае: [Верш] // Там жа. № 6; Ветры каляровыя: (З Марыэты Шагінян): [Верш] // Полымя. № 10; На вятры: Фрагменты // Росквіт. № 2; Крыштальнай цвеценню заружавелі далі: [Верш] // Узвышша. № 1; Паўставала сонейка: [Верш] // Чырв. сейбіт. № 3; У той дзень: [Верш] // Звязда. 22 студз.; Паходні клічуць: [Верш] // Там жа. 19 лют.; БДТ 1-му: (Санет) // Там жа. 6 мая; Маг. селянін. 22 крас.; Ты глядзіш...: [Верш] // Там жа. 8 студз.; 21 студзеня: [Верш] // Там жа. 22 студз.; Мястэчка: [Верш] // Там жа. 5 лют.; Кастусь Каліноўскі: [Верш] // Там жа. 29 сак.; З пекароў — у найвялікшыя мастакі слова // Там жа. 1 крас.; Ой, ды на ўзгорку...; Травень цвіў: [Вершы] // Там жа. 20 мая; Мой май: [Верш] // Там жа. 3 чэрв.; Беларусь мая...: [Верш] // Там жа. 17 чэрв.; Пад белым арлом: [Верш] // Там жа. 8 ліп.; У калгас: [Верш] // Там жа. 29 ліп.; Вакзал: [Верш] // Там жа. 12 жн.; На новых сцежках: (Апавяданне) // Там жа. 18 жн.; Крыжы гавораць: (Апавяданне) // Там жа. 26 жн.; Леў Талстой // Там жа. 13 вер.; Парубка: [Верш] // Там жа. 23 вер.; Дзесяць год: [Верш] // Там жа. 28 кастр.; За другі заём!: [Верш] // Там жа. 1 ліст.; Над картай: [Верш] // Там жа. 4 ліст.; Шугавейныя шчырыя дні: [Верш] // Там жа. 18 ліст.; Чыгуначнік: [Верш] // Сав. Бел. 1 студз.; Вёска: [Верш] // Там жа. 8 студз.; Праз парог: [Апавяданне] // Там жа. 22 студз.; Ранне: [Верш] // Там жа. 22 крас.; Бліскавіцы; Украіне: [Вершы] // Там жа. 17 чэрв.; Човен у моры: [Апавяданне] // Там жа. 19 чэрв.; Маладосць: [Нарыс] // Там жа. 26 чэрв.; Лагі: [Нарыс] // Там жа. 5 ліп.; Змаганне: [Паэма] // Там жа. 11 ліп.; На варце: Эскіз // Там жа. 19 ліп.; Млын: [Верш] // Там жа. 24 ліп.; «Маладняку» (Да 5-ціголддзя): [Верш] // Там жа. 28 ліст.; Чавусы растуць: (З блакноту падарожніка) // Там жа. 5 снеж.; Па дарозе: [Верш] // Чырв. змена. 5 лют.; Травень цвіў: [Верш] // Там жа. 11 ліп.; [Рэц. на кн.: Д у д а р А. Вежа. Мн., 1928] / Пад крыпт. Юр. Ляв.; Пад белым арлом: [Верш] // Там жа. 26 жн.; Спявалі разам: Апавяданне // Там жа. 12 вер.; У краіне працы: [Верш] // Чырв. Полаччына. 17 сак.

1929. Балада аб чырвонай сястры; Беларусь мая; Ідзём; «Захавалась мінуўшчына цесная...»; Мястэчка; Сёмка — беспрытульны; Дзявочае; Вёска; Трыялет: [Вершы]; Дзень паэта Ганарлюбава: (Гумарэска) // Ранне. Магілёў; Тая восень: [Ліст] // Вясна. № 8; Лётнік: [Верш] // Там жа. № 11; Далёкі рэйс: Паэма // Полымя. № 8—9; Дванаццатыя ўгодкі: [Верш] // Камунар Магілёўшчыны. 6 ліст.; Экскурсія ў Ленінград // Там жа. 15, 17 ліст.; Кімаўскі марш: [Верш] // Там жа. 20 ліст.; Калгас «Най лэбн»: (З яўрэйскіх матываў) // Там жа. 11 снеж.; Прэч званы: [Верш] // Там жа. 25 снеж.; 20-ці гадовы юбілей Дзям'яна Беднага // Маг. селянін. 6 студз.; Перавыбарны верш // Там жа. 13 студз.; Юбілейная песня: [Верш] // Там жа. 22 лют.; Пяць год Мопр'а: [Верш] // Там жа. 17 сак.; Канферэнцыі бязбожнікаў: [Верш] // Там жа. 31 сак.; Рамантычны герой: [Верш] // Там жа. 5 чэрв.; Падарожжа ў Асінаўку: 1-ая раённая электрастанцыя імя Сталіна // Там жа. 18 чэрв.; Дзень вызвалення...:

[Верш] // Там жа. 10 ліп.; Крок небяспекі: [Верш] // Там жа. 28 ліп.; Жніво: [Верш] // Там жа. 11 жн.; Баявая — манеўраная: [Верш] // Там жа. 18 вер.; У Рагачэве: (Нататкі з манеўраў) // Там жа. 29 вер.; У громе аркестраў, у чырвані сцягоў...: (Нарыс) // Там жа. 2 кастр.; У Дзень Калектывізацыі: (З цыкла «Саха і трактар») // Там жа. 13 кастр.; Тэатральныя нататкі // Там жа. 18 кастр.; Багі ў нумарах: («гасцініца Саваофа»): (Маленькі фельетон) // Там жа. 20 кастр. / Пад крыпт. Юрка Л-ны; Рэбэ, якому шанцуе... Мракабесы ў чырвонаполлі: (Маленькі фельетон) // Там жа. 27 кастр. / Пад крыпт. Юрка Л-ны; Чахарда на заводзе: (Маленькі фельетон) // Там жа. 30 кастр. / Пад крыпт. Юрка Л-ны: Чысцільшчык — грэк: [Верш] // Сав. Бел. 3 лют.; Вакзал: [Верш] // Чырв. змена. 6 студз.

1930. Энтузіясткі калектыўных палеткаў: Нарыс // Бел. работніца і сялянка. № 29—30; Заява: [Верш] // Вясна. № 3; Над аркушамі: [Верш] // Маладняк. № 1; [Рэц. на кн.: Жаров А. Великое состязание. М., 1930] // Там жа. № 6—7; Пераклічка паравозаў: [Верш] // Полымя. № 9—10; Букініст.: [Верш] // Там жа. № 11—12; «Най лэбн»: [Верш] // Чырв. Бел. № 3; Юбілейная чырвонаармейская: [Верш] // Там жа. № 4; У дзень вызвалення: [Верш] // Там жа. № 13—14; Усяго адно прайшло дзесяцігоддзе: [Верш] // Звязда. 10—11 ліп.; Друкарня: [Верш] // Там жа. 5 кастр.; Ленінскія дні: (Абразкі) // Камунар Магілёўшчыны. 21 студз.; Сормаўцам: [Верш] // Там жа. 2 лют.; Юбілейная чырвонаармейская: [Верш] // Там жа. 23 лют.; Вольгін шлях: (Апавяданне) // Там жа. 7 сак.; Мастакі пралетарскага слова // Там жа. 16 сак.; Парыж у вагні (18 сакавіка): [Верш] // Там жа. 19 сак.; Быхаўскія спартанцы і Японія: (Фельетон) // Там жа. 21 сак. / Пад крыпт. Юрка Л-ны; На вуліцы: [Верш] // Там жа. 23 сак.; Кавалак разьбітага ў дрэбезгі: (Маленькі фельетон) // Там жа. 28 сак.; На смерць Маякоўскага: [Верш] // Там жа. 18 крас.; У агні народжаная // Там жа. 20 крас.; Баявая чырвонаармейская: [Верш] // Сав. Бел. 19 студз.; Сягоння — гонар павільёнаў: [Верш] // Там жа. 10 жн.; Юбілейная чырвонаармейская: [Верш] // Чырвонаарм. праўда. 23 лют.; Яны павінны быць вольны: [Верш] // Чырв. змена. 10 ліп.; Сон Пуанкарэ: [Верш] // Там жа. 2 снеж.

1931. Лагі: Апавяданне // Бел. работніца і сялянка. № 5; На хвалі сталінскіх прыбояў: [Верш] // Там жа. № 9; Першамай у Заходняй Беларусі: [Верш] // Там жа. № 14; Гудуць ратацыі: Нарыс // Там жа. № 18; Вясна 1931 года: [Верш] // Маладняк. № 9; Нязнань: Нарыс // Там жа. № 10; Размова з народным паэтам: [Верш] // Полымя. № 4; Размова з паэтамі-ўдарнікамі: [Верш] // Там жа. № 8; Брыгадзір Марцін Байдылевіч: [Верш] // Там жа. № 9; Дзень у Ратамцы: Нарыс // Чырв. Бел. № 4; Інжынер Гехт; Ноч на пагрузцы торфу: [Вершы] // Там жа. № 22—23; Два тыдні: [Верш] // Звязда. 26 студз.; Мы не аддзелім героя ад клясы!: [Верш] // Там жа. 5 лют.; Новаму сябру: [Вершы] // Рабселькор. 13 лют.; Увага Жлобінскага райкому КП(б)Б невыстарчальная // Там жа. 18 лют.; Першамай у Заходняй Беларусі: [Верш] // Сав. Бел. 1 мая; Дзесятаму: [Верш] // Чырв. змена. 5 студз.; Песня пра дырыжабль: [Верш] // Там жа. 20 студз.

1932. У паход; Маленькі камунар; Выйдзі на паўзмежак: [Вершы] // Партыя, слухай. Мн.; Партрэт ілжэўдарніка: [Верш] // Маладняк. № 5—6; Ударніцы камінтэрнаўскай СТФ: Нарыс // Работніца і калгасніца Бел. № 14; Тайс, Трайс і іншыя: Нарыс; Кастрычніцкая песня [Верш] // Там жа. № 30; Бабскі калгас: Апавяданне // Там жа. № 33; Радкі нянавісці: [Верш] // Чырв. Бел. № 10; Той жуды не пазбыць, не закрэсліць: [Верш] // Там жа. № 13; Творчая вучоба, ці звычайны плагіят...? // ЛіМ. 28 сак. / Сааўт. П. Ананьцеў; Тэрор: [Верш] // Там жа. 27 чэрв.; Трывожныя сімптомы // Там жа. 10 ліп. / Сааўт. З. Піваваў; Спатканне з тав. Андрыеску // Там жа. 19 ліст.; «Тармазом на перакор!» // Сав. Бел. 14 мая; З вершаў пра «камуну БВА» // Чырвонаарм. праўда. 4 кастр.

1933. А. С. Серафімовіч // Работніца і калгасніца Бел. № 7; Дэлегатка з Юравіч // Там жа. № 15; «Вока ўдарніцы» глядзіць пільна // Там жа. № 23; Таварыш Клара на трыбуне: [Верш] // Там жа. № 24; Рунь на пясках: [Нарыс] // Звязда. 30 крас.; 1 мая; Пра каня: [Верш] // Там жа. 6 вер.; Чычыкавы з «Перамогі»: [Фельетон] // Там жа. 4 кастр.; Жыццё Кузьмы Баярына: [Нарыс] // Там жа. 24 кастр. / Сааўт. С. Грахоўскі; Камандзір-бальшавік: [Нарыс] // Там жа. 6—7 ліст.; Апавяданне камандора // Там жа. 24 ліст.; Беларусізацыя пад пячаткай // Там жа. 1 снеж.; Савецкія пісьменнікі ў тав. Гікала // Там жа. 6 снеж. / Пад крыпт. Юр. Л-ны; Каток // Там жа. 16 снеж.; Жыццё ў рамонце: [Нарыс] // Там жа. 24 снеж. / Сааўт. С. Грахоўскі; На новую зямлю: Урывак з аповесці «Агні над балотам» // Камунар Магілёўшчыны. 9 вер.; Пісьменнікі і крытыкі ў 1933 г. // ЛіМ. 28 студз.; Два вершы: Новыя Т'еры; Нямецкая вуліца // Там жа. 26 чэрв.; На эстрадзе ня ўсё ў парадку // Там жа. 15 ліп.; Чаму 5 раёнаў апынуліся ў паласе прарыву // Сав. Бел. 4 студз.; Камуна БВА: [Верш] // Там жа. 23 лют.; Адна з «Жалезнага патоку»: (Пра бальшавічку Варвару Данілаву): [Нарыс] // Там жа. 8 сак.

1934. Растуць новыя Батвіннікі: [Нарыс] // Звязда. 3 студз.; 1.300.000...: [Нарыс] // Там жа. 8 студз.; Загудуць турбіны ЦЭЦ: [Нарыс] // Там жа. 11 студз. / Сааўт. М. Нікіцін; «Недарасль» // Там жа. 17 студз. / Сааўт. Т. Такарчук; Брыгада пісьменнікаў заходняй вобласці ў Менску // Там жа. 8 лют.; У палоне ў кулакоў і чарнасоценцаў: [Нарыс] // Там жа. 25 лют. / Сааўт. С. Галкін; Юныя таленты: [Нарыс] // Там жа. 5 сак.; Мастакі БССР за 15 год: [Нарыс] // Там жа. 9 сак.; «Паручык Кіжэ» // Там жа. 16 сак. / Пад крыпт. Юр. Л.; Калгасная радасць: [Нарыс] // Там жа. 19 мая / Сааўт. М. Кін; Думкі мастака-рэвалюцыянера // Там жа. 25 мая / Пад крыпт. Юр. Л-ны; Юбілейны вечар Л. М. Літвінава // Там жа. 4 чэрв. / Пад крыпт. Юр. Л-ны; Асабняк на Пушкінскай... // Камуніст. 23 кастр.; Стараверы: [Верш] // Там жа. 15 ліст.; У новай школе // Там жа. 21 ліст.; Дзе арганізаваны глядач? // Там жа. 24 ліст. / Пад крыпт. Юр. Л-ны; Юбілей М. Ф. Рафальскага // Там жа. 28 ліст.; «Хорошая жизнь»: Тэатр // Там жа. 29 ліст.; Гартаючы старонкі барацьбы...: [Верш] // Там жа. 30 ліст.; Фільм выключнай якасці // Там жа. 4 снеж.; Творчы шлях Міх. Шолахава // Там жа. 10 снеж. // Пад крыпт. Юр. Л-ны; Экскурсіі дэлегата // Там жа. 15 снеж.; Рэйд Дуні Нікітка // Там жа. 18 снеж.; У чым сакрэт поспеху: «Рэкрут» і «Вольпанэ»? // ЛіМ. 28 лют. / Пад крыпт. Юр.; «Пагібель эскадры» ў Рускім дзяржаўным тэатры БССР // Там жа. 30 ліст.; Літгурткі Бабруйска за работаю // Там жа. 12 снеж.; «Прыгожае жыццё» ў Рускім дзяржаўным тэатры // Там жа. 25 снеж.; Піянерскі марш: [Верш] // Піянер Бел. 9 студз.

1935. Кіеў: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 11; [Рэц. на кн.: Атака: Альманах 4. Мн., 1935] // Там жа. № 12; Свабоду Тэльману: [Верш] // Работніца і калгасніца Бел. № 11; Мая рэспубліка: [Верш] // Там жа. № 15; Парашутысткі: Нарыс // Там жа. № 16; Равесніца Кастрычніка: [Верш] // Там жа. № 20; Жыве, як гімн, неўміручы Ленін!: [Верш] // Калгаснік Бел. 22 студз.; У чырвонаармейскім літгуртку // ЛіМ. 27 лют.; Першамай у Чырвонай арміі // Там жа. 1 мая / Пад крыпт. Юр. Л-ны; У паходзе за літаратурны мінімум // Там жа. 6 мая; Літаратурны Смаленск // Там жа. 21 ліп.; Паездка на Беларусь творча ўзбагаціла нас: Гутарка з Б. Буачыдзе // Там жа. 24 ліп. / Пад крыпт. Юр. Л-ны; Кампазітар-педагог // Там жа. 22 жн.; Чаму ў нас няма зборніка народных песень? // Там жа. 16 кастр.; [Рэц. на кн.: Ушаков Н. Избранные стихи. М., 1935] // Там жа. 12 ліст.; Першае жніўня: [Верш] // Чырв. фронт. 3 жн.

1936. Жонка капітана: (Нарыс) // Работніца і калгасніца Бел. № 4; Дзяўчына з возера: [Апавяданне] // Там жа. № 19; Высокаякасны, баявы часопіс // ЛіМ. 6 лют.; Рабочыя эсперантысты пра пленум (Лісты з-за мяжы) // Там жа. 10 лют.; Сустрэча на вакзале // Там жа. 11 лют.; Літаратурны Варонеж // Там жа. 16 крас.; Рабочыя літгурткі па-за ўвагай газеты // Там жа. 11 мая / Пад крыпт. Ю. Л.; Аздаравіць эстраду // Там жа. 21 вер.; Рускі драматычны тэатр Малдавіі ў БССР // Там жа. 27 вер.; Песня абаронцы //

Піянер Бел. 23 лют.; Незабыўныя дні: Нарыс // Чырв. змена. 23 лют.

1959. Малання; Пераклічка паравозаў; Далёкі рэйс: [Вершы] // ЛіМ. 30 мая.

1961. Крыштальнай цвеценню заружавелі далі; Горад вятроў; Размова з марсіянамі: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 2; Пад штандарам ленінскага гарту...; Зарадка: [Вершы] // Маг. праўда. 3 вер.

1968. Роднае; Пад штандарам ленінскага гарту...: [Вершы] // Маг. праўда. 30 ліп.

1977. Зашалясцяць шаўкі: [Нарыс] // Беларускі савецкі нарыс: У 2 т. Мн. Т. 1.

1978. Беларусь; Кастрычніцкая песня; Мая рэспубліка: [Вершы] // Маг. праўда. 29 ліп.

1.4.

Фурманаў Д. Чырвоны дэсант: Апавяданне / З рус. Мн., 1929 / Пер. пад крыпт. Ю. Л.

Ольбрахт І. Ганна пралетарка: Раман / З чэш. Мн., 1932.

1927. Слесарэнка А. Штаны: [Апавяданне] / З укр. // Сав. Бел. 19 крас.; Жараў А. Смейся, вецер!..: [Верш] / З рус. // Чырв. змена. 5 чэрв. / Пад крыпт. Ю. Л.

1928. Масэнка Т. Ліра будняў: [Верш] / З укр. // Літ. дад. да газ. «Савецкая Беларусь». № 9; Кавальчук М. Вуліца: [Верш] / З укр. // Там жа. № 11; Банкоў П. Усе выйгралі: (Апавяданне) / З рус. // Маг. селянін. 5 лют. / Пер. пад крыпт. Юр. Л.

1929. Грымайла Я. Сельбудаўскія вечары; Сасюра В. На вуліцы; «Смехам, жаркай песняю...»: Масэнка Т. Ліст / З укр. // Ранне. Магілёў; Паўлюк А. Францыя: [Верш] / З укр. // Полымя. № 1.

1930. Уштуні А. Рай: [Верш] / З арм. // Полымя. № 9—10.

1931. Кірсанаў С. Анёлы: [Верш] / З рус. // Чырв. змена. 23 лют.

1932. Кавынёў Б. Першамай: [Верш] / З рус. // Сав. Бел. 4 мая.

1933. Лахуці Г. Ангельская калонія ў Афрыцы / З тадж. // ЛіМ. 9 ліп.

1934. Маякоўскі У. Бюлетэнь: [Верш] / З рус. // Звязда. 22 студз.; Рыленкоў М. Твой шлях: [Верш] // З рус. // ЛіМ. 28 лют.

1935. Рыленкоў М. Твой шлях; Зялёны цэх; Свята: [Вершы] / З рус. // Паэты заходняй вобласці. Мн.; Маякоўскі У. Два маі: Урывак з верша / З рус. // ЛіМ. 1 мая; Тарахоўская Е. Метрапалітэн: [Верш] / З рус. // Піянер Бел. 3 кастр.

1936. Ішэмгулаў Б. Правадыр; Юлтый Д. Начное спатканне: [Вершы] / З башк. // Полымя рэвалюцыі. № 2; Маякоўскі У. Два маі: [Верш] / З рус. // Там жа. № 5.

1.5.

На польскую мову. Rozpoczęto obrady plenum komit. Organizac. Zw. Pisarzy Radzieckich // Orka. 1934. 26 kwiet. / Пад крыпт. Jur. L-ny.

На ўкраінскую мову. Сонет: [Верш] / Пер. А. Панів // Нова Білорусь. К., 1929.

2.3.

На беларускай мове. Аношкін І. І сёння ў страі: Да 60-годдзя з дня нараджэння Ю. Лявоннага // Маг. праўда. 1967. 16 снеж.; Яго ж. Сэрца паэта білася песняй... // Там жа. 1978. 29 ліп.; Яго ж. Пішучай арміі радавы // ЛіМ. 1978. 21 ліп.; Атрашкевіч В. Пад штандарам ленінскага гарту... // Маг. праўда. 1983. 30 ліп.; Бандылевіч Л. Першая патуга адкрытага крытычнага ліста // ЛіМ. 1932. 5 жн.; Беларуская савецкая проза: Апавяданне і нарыс. Мн., 1971. С. 278—279; Ваўчок З. Не скажаце гісторыі піянерскай арганізацыі: Аб вершах Ю. Лявоннага // Піянер Бел. 1932. 19 мая; Глебка П. Маладая паэзія // Ударнікі. Альманах 3. Мн., 1934; Грахоўскі С. Савецкая, № 68: Трыццатыя гады...: Успаміны // Дзень паэзіі. Мн., 1978; Есакоў А. Вершы Юркі Лявоннага // ЛіМ. 1959. 30 мая; Куніцкі С. За ідэйна-мастацкі рост рабочых-ударнікаў // Маладняк. 1931. № 11; Макарэвіч А., Усікаў Я. Натхненае слова паэта // Маг. праўда. 1961. 3 вер.; Матэвушаў В. Поплеч з намі // Там жа. 1968. 30 ліп.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Смальянава Л. Шляхі паэтычнага эпасу: З гісторыі беларускай савецкай паэмы. Мн., 1977. С. 62, 73—74; Сядура У. Камсамол у беларускай паэзіі // Маладняк. 1932. № 1; Яго ж. Супраць буржуазнага рэстаўратарства і «левага» ліквідатарства // ЛіМ. 1932. 30 крас.; Шушкевіч С. З маладнякоўскага племя: Да 60-годдзя з дня нараджэння Юркі Лявоннага // ЛіМ. 1968. 30 ліп.; Яго ж. Кавалачак з аўтабіяграфіі паэта Разекі // Маладняк. 1932. № 7; Яго ж. «Хто ўзімку жыве, як вясной...» // Голас Радзімы. 1968. № 34.

Т. М. Махнач.

ЛЯВОНЦІЙ КАРПОВІЧ

Лявонцій Карповіч (свецкае імя Лонгін, Логін; каля 1580, Пінскі пав.— верагодна 1620, Вільня), пісьменнік-палеміст, царкоўна-палітычны дзеяч. Архімандрыт праваслаўнага Свята-Духаўскага манастыра ў Вільні (1613).

Нарадзіўся ў шляхецкай сям'і на Піншчыне. Адукацыю атрымаў у Астрожскай школе на Валыні. Што прымусіла яго стаць манахам, як праходзіла яго жыццё да з'яўлення ў віленскім Свята-Духаўскім манастыры, будаўніком і першым архімандрытам якога ён з'яўляўся,— сёння невядома. Дакладныя звесткі пра яго грамадска-палітычную дзейнасць пачынаюцца толькі са студзеня 1609, калі ў ліку іншых віленскіх паслоў ён знаходзіўся ў Варшаве і выступаў там на вальным сейме як абаронца інтарэсаў праваслаўнага насельніцтва Беларусі і Украіны. Лявонцій Карповіч крытыкаваў дзеянні тагачаснага уніяцкага мітрапаліта Іпація Пацея, які незадоўга да гэтага адабраў у віленскіх мяшчан 12 праваслаўных цэркваў і праваслаўны брацкі Свята-Троіцкі манастыр. У 1610, будучы рэктарам брацкай школы, кіраўніком і старшым друкаром брацкай друкарні, адрэдагаваў і выдаў на польскай мове славуты «Фрынас» М. Сматрыцкага, за што па распараджэнні караля Сігізмунда III Вазы быў арыштаваны і пасаджаны ў турму, дзе правёў 2 гады як дзяржаўны злачынца Рэчы Паспалітай. Выйшаўшы з турмы, узначаліў барацьбу віленскага праваслаўнага брацтва супраць дзейнасці католікаў і уніятаў. Незадоўга да смерці быў вылучаны кандыдатам у епіскапы — на Уладзімірскую і Брэсцкую кафедру, але смерць не дазволіла заняць гэтай пасады.

Яго памяці прысвечаны ананімны паэтычны твор «Лямант у свеце ўбогіх на жаласную смерць Лявонція Карповіча». На яго пахаванні выступіў Мялеці Сматрыцкі.

Пяру Лявонція Карповіча належаць творы: «Казанне двое...» і «Казанне на пахаванне князя В. Галіцына» (у перакладзе на польскую мову), прадмовы да кнігі інака Фікарыя «Вертаград душэўны» і да перакладу тлумачэнняў Златавуста да «Ойча наш» (1620). З яго рукапісных твораў вядома павучанне «У нядзелю перад Раством Хрыстовым», некалькі лістоў ад імя членаў віленскага брацтва львоўскаму брацтву і манахам на Афон (1619). Казанні Карповіча вызначаюцца ўзнёслым тонам, барочнай квяцістасцю. У іх шырока выкарыстаны рытарычныя фігуры, вобразныя параўнанні, анафары, рэлігійная сімволіка. Усё гэта прыдавала ім выключную дынамічнасць, сілу эмацыянальнага ўздзеяння на чытача і слухача. Нягледзячы на абмежаванасць і непаслядоўнасць, яго літаратурная і прапаведніцкая дзейнасць мела прагрэсіўнае значэнне, таму што была скіравана супраць іншаземнага засілля, абуджала народную самасвядомасць.

А. Ф. Коршунаў.

Бібліяграфія

1.2.

Казанье двое... Евье, 1615.

1.3.

1620. К правоверному читателю // Фикара Святогорец. Вертоград душевный. Вильно.

1894. Честному священноинокови, господину отцу Кириллу (Пафнутию, Иелисею) о Господе нашем Иисусе Христе радоватися // Лит. епарх. вед. № 26.

1922. З кнігі «Казанне двое...»: [Урывак] // Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. Вільня.

1959. Казанье на преображение господа Бога и Спаса нашего Исуса Христа; В неделю пред Рожеством Христовым наука // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн.

1.5.

На польскую мову. Kazanie na pogrzebie kniazia Wasila Haliczyna... w roku 1619... pogrzebionego / Z rus. Wilno, 1619.

2.2.

На старажытнабеларускай мове. «Лямент...» на смерть Леонтия Карповича. Вильно. 1620.

Мелетий Смотрицкий. Казанье на честный погреб... Леонтия Карповича. Вильно, 1620.

На рускай мове. Леонтий Карпович, церковный вития православной Юго-западной Руси в XVII ст. и его два слова. М., 1878.

2.3.

На беларускай мове. Гарэцкі М. Казанне // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня. 1920; 2 выд. Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 307; Дабрынін М. Беларуская літаратура: Старажытны перыяд. Мн., 1952. С. 226—231; Кароткі У. Слова, звернутае да народа: (Да 400-годдзя з нараджэння Л. Карповіча) // Вяч. Мінск. 1981. 31 студз.; Коршунаў А. [Уступны артыкул] // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн., 1959; Ларчанка М. Літаратура канца XVI — першай паловы XVII ст. // Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968. С. 98—99; Прашковіч М. «Лямент...» на смерць Лявона Карповіча // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. 1974. № 1; Помнікі гіст. і культ. Бел. 1973. № 2.

На рускай мове. Брянцев П. Виленский Свято-Духовский монастырь // Виленский календарь на 1898 год. Вильна, 1897; Василенок С. Фольклор и литература Белоруссии эпохи феодализма. М., 1961. С. 216—217; Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. М., 1972. С. 92—94; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 173—174; 224—225; Карский Е. Белорусы. Пг., 1921. Т. 3. Вып. 2. С. 135—139; Леонид, арх. Два слова, которые сказывал отец Леонтий Карпович... // Чтения в Обществе истории и древностей российских. 1878. № 1; Макарий. История русской церкви. Спб., 1881. Т. 10; Спб., 1882. Т. 11; Маслов С. Казанье Мелетия Смотрицкого на честный погреб о. Леонтия Карповича // Чтения в историческом обществе Нестора летописца. К., 1908. Кн. 20. Вып. 2, 3; Миловидов А. Виленский первопечатник и первые издания виленских типографий // Лит. епарх. вед. 1903. № 6; Молчанов Н. Леонтий Карпович, церковный вития православной Юго-западной Руси в XVII столетии и два его слова // Православное обозрение. 1880. № 11; Нечаенко П. Леонтий Карпович, русский проповедник 1615 года // Маяк. 1843. Т. 2; Пашкевич М. Князь Богдан Матвеевич Огинский, защитник православия в первые времена унии // Лит. епарх. вед. 1903. № 26—27; Петров Н. Послание настоятеля Виленского Свято-Духова монастыря и братства Леонтия Карповича к Афонским подвижникам, 1619 года // Там жа. 1894. № 26; Сцепуро Д. Виленское св. духовское братство в XVII и XVIII столетиях // Труды Киевской духовной академии. 1899. № 6; Т-ч. А. Виленский Свято-Духовский монастырь: (Исторический очерк) // Виленский календарь на 1892 год. Вильна, 1891.

На ўкраінскай мове. Маслов С. Наука Леонтія Карповіча в неділю перед Різством // Записки Укр. наукового товариства в Київі. К., 1908. Кн. 2.

Т. М. Махнач.

ЛЯЖНЕВІЧ АЛЕСЬ*

Ляжневіч Алесь [ініцыялы А. Ф., псеўд.: А. Бяздольны; Алесь Бяздольны, Язэп Церабеж; 1890, в. Сенцяняты Ашмянскага пав. Віленскай губ. цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.— —1937(?)], драматург.

З сялян. Бацька меў 8 дзесяцін зямлі і 6 дзяцей. З дзяцінства А. Ляжневіч працаваў на гаспадарцы. Скончыў пачатковую народную школу. Марыў працаваць ў тэатры. Пачаў удзельнічаць у розных аматарскіх гуртках, займаўся самаадукацыяй. У 1914 мабілізаваны ў царскую армію. Знаходзіўся ў Туркестане, дзе працаваў у перасоўных аматарскіх тэатрах артыстам драмы. У 1914—17 — у арміі, радавы. У час лютаўскай рэвалюцыі 1917 з Румынскага фронту прыбыў у Адэсу, пачаў працаваць у абласным тэатры, акторам бежанскай суполкі «Беларускі гай». Адначасова паступіў у Адэскую тэатральную прыватную школу дзеля далейшай адукацыі. У 1919 уступіў у Камуністычную партыю, быў на савецка-польскім фронце. Захварэў на тыфус. Пасля працаваў у палітаддзеле 16-й арміі ў Магілёве. У 1919 накіраваны ў Мінск. У 1920 — акцёр беларускага тэатра. У 1921 — дырэктар БДТ-1. З 1922 — у Маскве, дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва. У 1924 у Маскве пры партыйнай чыстцы выключаны з партыі з прычыны «адарванасці ад мас і палітычнай няграматнасці». З 1927 на кінафабрыцы Белдзяржкіно. У 1929 працаваў там кансультантам, у 1930 асістэнтам рэжысёра. Арыштаваны 29.7.1930 і асуджаны на 5 гадоў высылкі за межы Беларусі. У 1937 зноў арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 15.11.1957.

Першая выяўленая публікацыя А. Ляжневіча — драма «З дымам-пажарам» датуецца 1924. Яна вызначалася слабасцю драматургічнай распрацоўкі канфлікту, перавагай дзеяння над псіхалагічнай праўдай характараў. Аднак пры ўсіх недахопах гэта быў адзін з першых узораў беларускай героіка-рэвалюцыйнай драмы. «З дымам-пажарам» ставілася на сцэнах самадзейных тэатраў. А. Ляжневіч апрацоўваў для пастановак п'есы рускага рэпертуару. Разам з Я. Купалам і Ц. Гартным уклаў анталогію «Беларускі дэкламатар Чырвоны Дудар». У 1927 у друку з'явілася некалькі яго вершаў. Выступаў з нататкамі пра сялянскі тэатр, з парадамі для клубных драмгурткоў. У пачатку 1930 на ўсебеларускім конкурсе п'ес атрымаў 2-ю прэмію за п'есу «Навала» (пад псеўд. Язэп Церабеж). Публікацыя яе не выяўлена.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

Новыя ўсходы: П'еса ў 6-ці актах / Паводле Я. Задыхіна. Мн., 1927. (Сялянскі тэатр).

Таміла: Меладрама ў 5-ці дзеях / Па раману Ф. Дзюшэна; Паводле апрац. на ўкр. М. Ю. Смоліча. Мн., 1927. (Сялянскі тэатр).

З дымам-пажарам: Рэвалюцыйная п'еса ў 3-х дзеях. Мн., 1928. (Сялянскі тэатр). Рэц.: Я з - в і ч А. [Пальчэўскі А.] // Чырв. сейбіт. 1928. № 4—5.

Сялянскі тэатр: Парады ў пытаннях тэатральнай тэхнікі і методы пастаноўкі п'ес сялянскімі і гарадскімі клубнымі драмгурткамі. Мінск, 1928.

1.3.

1924. З дымам-пажарам: Драма // Змаганне. Сш. 1. / Пад псеўд. А. Бяздольны.

1926. Сялянскі тэатр на Беларусі // Чырв. сейбіт. № 5.

1927. Я чую плач: [Верш] // Чырв. сейбіт. № 15 / Пад псеўд. Алесь Бяздольны; Скарга дзядзькі: [Верш] // Камуніст. 28 вер. / Пад псеўд. Алесь Бяздольны.

1928. Як дэкламаваць вершы, апавяданні, байкі // Дэкламатар. Мн.

1.6.

Б е л а р у с к і дэкламатар Чырвоны Дудар. Мн., 1924 / Скл. з Я. Купалам, Ц. Гартным.

Б э н І. Цудадзеі: Камедыя ў 4-х дзеях. Мн., 1927 / Апрац.

М а р к а ў В. Варажба: П'еса ў 2-х дзеях. Мн., 1927 / Апрац. з рус. Рэц.: М а р к а ў В. «Варажба». П'еса ў 2-х дзеях / Апрацавана з расійскае мовы А. Ляжневічам // Звязда. 1927. 18 снеж.

Дэкламатар. Мн., 1928 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Л а ў ш у к С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі. Мн., 1984. С. 124—126.

З. У. Драздова.

* Фотаздымак узяты з архіва КДБ.

ЛЯЛЬКО ХРЫСЦІНА

Лялько Хрысціна Аляксееўна (н. 30.3. 1956, в. Хадзюкі Лідскага р-на Гродзенскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1983. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1986, за кнігу прозы «Дарога пад гару»).

Нарадзілася ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Тарноўскай СШ працавала ў Радзівонішкаўскім сельсавеце Лідскага р-на бухгалтарам (1973—74). З 1974 вучылася на філалагічным факультэце БДУ (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры). З 1979 працавала навуковым супрацоўнікам у Літаратурным музеі Я. Купалы, з 1983 карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва», з 1984 — рэдактар аддзела літаратуры часопіса «Беларусь». Член Рады СП Беларусі.

Літаратурную дзейнасць пачынала ў 1971 з вершаў, апублікаваных на старонках лідскай раённай газеты «Уперад». Падборка вершаў была змешчана ў зборніку «Дзень паэзіі». Першае апавяданне «Груган» апублікавана ў газеце «Літаратура і мастацтва» ў 1979, затым яе апавяданні рэгулярна друкаваліся на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў («Звязда», «ЛіМ», «Полымя», «Маладосць», «Неман», «Беларусь»). Першы зборнік апавяданняў «Дарога пад гару» выйшаў у 1985. Асноўная тэматыка творчасці — жыццё людзей старэйшага пакалення — працаўнікоў вёскі, маральна-этычныя праблемы, духоўны змест маладога чалавека, яго пачуцці, перажыванні, пошукі адказу на складаныя пытанні сучаснасці. Асобныя апавяданні перакладзены на рускую і ўкраінскую мовы. Апошняя значная публікацыя — аповесць «Лес» («Маладосць». 1989.№ 7).

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Дарога пад гару: Апавяданні. Мн., 1985. (Першая кніга празаіка).

Світанак над бярозамі: Аповесць, апавяданні. Мн., 1989.

1.3.

1977. «Трухлеюць пні на могілках старых...»: [Верш] // Полымя. № 7.

1979. Груган: Апавяданне // ЛіМ. 18 мая; Свята Купалавай песні // Там жа. 15 чэрв.; Кветкі народнаму песняру // Там жа. 6 ліп.; Ідуць сюды людзі... // Там жа. 17 жн.; Творчая справаздача паэта // Там жа. 2 ліст.; Адзін верш Янкі Купалы // Там жа. 16 ліст.; Вечар паэзіі // Там жа. 7 снеж.

1980. Вечар памяці пісьменніка // ЛіМ. 18 студз.; Блокаўская пятніца // Там жа. 8 лют.; Памяццю сейбіта, салдата // Там жа. 4 крас.; Вечар юбіляра // Там жа. 25 крас.; У школе імя Янкі Купалы // Там жа. 13 чэрв.; Дом песняра // Там жа. 19 вер.; Юбілею насустрач // Там жа. 7 ліст.

1982. Мурза: Апавяданне // Беларусь. № 9; «Трывожны сон ці прыпамін...»; «Убачыць Вас. І зноў адчуць...»: [Вершы] // Полымя. № 4; З паездкі ў Акопы: [Верш] // Звязда. 9 ліп.

1983. З паездкі ў Акопы: [Верш] // Дзень паэзіі — 83. Мн.; Бярэзнік на загонах; Лёгкі хлеб; Блізка вясна: [Апавяданні] // Маладосць. № 7; Выяўляць таленты // ЛіМ. 23 снеж.

1984. [Адказы на анкету «Маладосці»] // Маладосць. № 11; Цыба; Фэлькавы яблыкі; За ноччу раніца: Апавяданні // Полымя. № 10; «Вятры вяртаюцца дамоў» // Звязда. 2 жн.; Светлая рунь: Апавяданне // ЛіМ. 28 вер.

1985. Лёгкі хлеб; Мурза; Касцы: Апавяданні // Цяпло на першацвет. Мн.; Тварыць харaство // Маладосць. № 11; Белыя брады: Апавяданне // Полымя. № 3; Слова Шолахава // Там жа. № 5; Собственный голос в хоре стремятся обрести молодые белорусские прозаики / Зап. Т. Сотникова // Знамя юности. 28 мая; Прыходзяць надзеі, выспяваюць задумы... // ЛіМ. 27 снеж.

1.4.

Арлоў Г. Расказы дзядзькі Трывіма / З чув. Мн., 1988.

1984. Мікелінскас І. Наша школа: Апавяданне / З літ. // Бурштынавыя пацеркі. Мн.

1.5.

На рускую мову. Белые броды: Рассказы / Пер. В. Щедрина. М., 1989. (Б-ка журн. «Молодая гвардия»).

Лёгкий хлеб: Рассказ / Пер. Л. Каминская // Гродн. правда. 1982. 20 нояб.; Лёгкий хлеб; Косцы; Мурза: Три рассказа / Пер. И. Климашевская // Неман. 1983. № 8.

1.6.

Залатое пяро: Бел. нар. казка. Мн., 1990 / Апрац.

Цвірка В. Прызваны тварыць прыгажосць // Звязда. 1983. 13 лют. / Зап.
2.3.
На беларускай мове. Скрыган Я. Няхай шырэ далячынь // Лялько Х. Дарога пад гару. Мн., 1985; Яго ж. Шчаслівай дарогі // Беларусь. 1982. № 9.
На рускай мове. Тычина М. Притяжение реальности // Неман. 1984. № 8.
2.4.
Янішчыц Я. Верш Хрысціне Лялько // Янішчыц Я. Пара любові і жалю. Мн., 1983.

Т. М. Махнач.

ЛЯЛЬЧУК СЯМЁН



Ляльчук Сямён Абрамавіч (25.9.1918, мяст. Калінкавічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер горад Гомельскай вобл.— 1941), паэт. Пісаў на яўрэйскай мове.

Паходзіў з сям'і служачага (бацька працаваў сакратаром Калінкавіцкага гарсавета, затым галоўным бухгалтарам школы жывёлаводаў). Скончыўшы школу ў Калінкавічах, С. Ляльчук у 1935 паступіў у Мінскі пединстытут, які скончыў у 1939. Восенню гэтага ж года ён прызваны ў армію і накіраваны ў палкавую школу, пасля заканчэння якой служыў у Прыбалтыйскай ваеннай акрузе (Рыга). Там яго застала Вялікая Айчынная вайна. Прапаў без вестак у ліпені 1941.

Першыя публікацыі С. Ляльчука ў газеце «Юнгер ленінец» («Юны ленінец») не выяўлены. У 1938 друкаваўся ў часопісе «Штэрн». З гэтага часу да 1941 яго вершы рэгулярна змяшчаліся ў яўрэйскіх перыядычных выданнях Беларусі. У 1940 разам з маладымі паэтамі І. Баруховічам, Х. Гурэвічам, П. Плоткіным выдаў калектыўны «Зборнік вершаў». Перад адыходам у армію С. Ляльчук перадаў сястры папку з рукапісамі, але пры эвакуацыі яны згубіліся. Збярогся толькі рукапіс гумарыстычнай паэмы «Успаміны. К гадавіне нашай разлукі», прысвечанай студэнцкім сябрам паэта (захаваўся ў А. І. Фарбера, рыхтуецца да друку). У кнізе «Ліра» (на яўрэйскай мове) змешчана падборка твораў С. Ляльчука. У Калінкавічах, у школе, дзе вучыўся С. Ляльчук, афармлены прысвечаны яму мемарыяльны стэнд. Матэрыялы пра паэта захоўваюцца таксама ў Музеі баявой славы ў СШ № 150 г. Мінска.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.
Зборнік вершаў. Мн., 1940 / Яўр. Сааўт. І. Баруховіч, Х. Гурэвіч, П. Плоткін. Рэц.: Стральцоў К. Зборнік маладых паэтаў // ЛіМ. 1941. 15 лют.
1.3.
1938. Песня пра бусла: [Верш] // Штэрн. № 1 / Яўр.; Песня пра Сож: [Верш] // Там жа. № 10 / Яўр.; Песня пра Чкалава: [Верш] // Там жа. № 12 / Яўр.
1939. Песня пра хлеб: [Верш] // Штэрн. № 12 / Яўр.
1940. Вершы // Штэрн. № 7—8 / Яўр.
1941. Леніну: [Верш] // Штэрн. № 1 / Яўр.
1985. [Вершы] // Ліра. М. / Яўр.
1.5.
На беларускую мову. Песня пра Сож: [Верш] / Пер. з яўр. А. Вялюгін // Полымя. 1947. № 2; Песня пра Сож: (Урывак); Жаўрук: [Вершы] / Пер. з яўр. А. Вялюгін // Мы іх не забудзем. Мн., 1949.
2.3.
На беларускай мове. Гасман Н. Творчасць маладых паэтаў // Звязда. 1941. 30 мая; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Сямён Ляльчук // Радзіме — радок і жыццё. Мн., 1986.

Т. М. Махнач.

ЛЯПЁШКІН УЛАДЗІМІР

Ляпёшкін Уладзімір Ігнатавіч (н. 8.11.1928, в. Церабель Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1962. Заслужаны настаўнік Беларусі (1976).

Нарадзіўся ў сям'і настаўніка. Пасля вызвалення Беларусі сям'я пераехала ў г. Рудзенск, бацька працаваў у райкоме партыі (памёр у 1974), маці — у калгасе (памерла ў 1973). Пасля заканчэння Рудзенскай сярэдняй школы (1947) У. Ляпёшкін паступіў на літаратурны факультэт Мінскага пед-інстытута, які скончыў у 1951. У 1951—53 выкладаў беларускую мову і літаратуру, у 1953—57 загадваў навучальнай часткай у 4-й, у 1957—58 — у 2-й сярэдняй школе г. Мінска, з 1958 — дырэктар гэтай школы. З 1970 дырэктар выдавецтва «Народная асвета», з 1979 дырэктар сярэдняй школы № 23 у Мінску. З 1987 на пенсіі. Узнагароджаны медалямі.

З першымі вершамі выступіў у друку ў 1949 у газеце «Бальшавіцкі сцяг» б. Рудзенскага р-на. Выдаў кнігі паэзіі «Ранішнія росы», «Рупнасць», «Роднае», «Вусце», «Перадлецце». Сувязь пакаленняў, выхаванне маладой змены, жыццё і праца людзей і незабыўныя старонкі гістарычнай памяці — такі асноўны змест твораў паэта. Кніга «Званкі-званочкі» адрасуецца дзецям.

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Ранішнія росы: Вершы. Мн., 1961. Рэц.: Кацюшын М. // Мін. праўда. 1961. 28 ліп.; Скапараў І. Вершы Уладзіміра Ляпёшкіна // Маладосць. 1961. № 8; Стральцоў М. Дубы, крыніцы, росы і старыя ісціны // ЛіМ. 1961. 30 чэрв.; Шаўня А. Пошукі свайго шляху // Беларусь. 1961. № 9.

Рупнасць: Вершы. Мн., 1966. Рэц.: Блатун С. А рупнасці мала // ЛіМ. 1967. 4 ліп.; Пруднікаў П. Лірычная споведзь // Наст. газ. 1967. 21 студз.

Роднае: Вершы. Мн., 1970. Рэц.: Каваленка В. Роднае і знаёмае // ЛіМ. 1971. 5 лют.

Званкі-званочкі: [Вершы]. Мн., 1972. Рэц.: Чаплаводская І. Пра роднае і блізкае // Наст. газ. 1972. 28 кастр.; Шушкевіч С. Лепш, чым для дарослых... // Чырв. змена. 1973. 14 сак.

Вусце: Вершы. Мн., 1973. Рэц.: Зяньковіч М. Вытокі // Чырв. змена. 1974. 29 студз.; Пысін А. Побач з незвычайным // Полымя. 1974. № 2; Фамін У. Вытокі любові // ЛіМ. 1974. 24 мая.

Перадлецце: Вершы. Мн., 1978. Рэц.: Кірпічэнкаў А. З любоўю да Радзімы // Наст. газ. 1979. 31 сак.

1.3.

1951. Пшаніца: [Верш] // Полымя. № 6; Маяк: [Верш] // Там жа. № 12; Ля карты: [Верш] // Работніца і сялянка. № 5; Сакратар; Ворыва: [Вершы] // Чырв. змена. 22 мая; «Рэпартаж» Фучыка: [Верш] // Там жа. 24 мая; Заранка: [Верш] // Там жа. 9 чэрв.

1952. Заранка: [Верш] // На сонечных сцежках. Мн.; Дзяўчына: Балада // Работніца і сялянка. № 2; Расставанне: [Верш] // Там жа. № 9; Агні: [Верш] // ЛіМ. 19 крас.; Бяссмертны Ільіч: [Верш] // Піянер Бел. 17 студз.; Хлапчукі: [Верш] // Там жа. 13 сак.; Мы ідзем у першы клас: [Верш] // Там жа. 28 жн.; Радзіма: [Верш] // Чырв. змена. 22 крас.

1953. Ворыва; «Рэпартаж» Фучыка; Агні; Радзіма; Дзяўчына: (Балада); Дарога; Маяк; Ля карты; Сакратар; Пшаніца: [Вершы] // На сонечных сцежках. Мн.; Старожка: [Верш] // Беларусь. № 9; Ля Свіслачы: [Верш] // Работніца і сялянка. № 2; Дарога; Сустрэчы: [Вершы] // Там жа. № 9; У бары: [Верш] // Піянер Бел. 13 жн.; Сад: [Верш] // Там жа. 24 вер.; Перадавая: [Верш] // Чырв. змена. 1 сак.; Мінскі самаскід: [Верш] // Там жа. 21 ліп.

1954. Чайкі: [Верш] // Беларусь. № 12; Зоры Радзімы: [Верш] // Полымя. № 1; Песня: [Верш] // Там жа. № 10; Бярозка: [Верш] // Работніца і сялянка. № 10; «Перагружаны»: (Фельетон) // Звязда. 24 кастр.; Рыбакі: [Верш] // Піянер Бел. 29 ліп.

1956. Зіма; Крыніца; Каля млына; Хваля; Страданне: [Вершы] // Беларусь. № 3; Вартавы: [Верш] // Работніца і сялянка. № 2; Золата [Верш] // Там жа. № 3; Бярозка: [Верш] // Там жа. № 12; Дождж: [Верш] // Чырв. змена. 25 сак.

1957. Загрукаў гром; Змена: [Вершы] // Беларусь. № 9.

1958. Крыўда: [Верш] // Полымя. № 2; Шчасце: [Верш] // ЛіМ. 2 крас.

1960. Каменьшчык; Землянкі; Аэрастат; Баравік; Маці; Лянок; На шашы: [Вершы] // Беларусь. № 6; Бабкі: [Верш] // Там жа. № 12; Церабель: [Верш] // Голас Радзімы. № 39; Царабель; Бяроза: [Вершы] // ЛіМ. 18 мая.

1961. Маці: [Верш] // Вершы, аднаактовыя п'есы. Мн.; Плыве салаўіная песня...; Святочная вуліца; Калі цвітуць пралескі; Алеська: [Вершы] // Беларусь. № 3; Ветэран вайны; Асенняй парою; На лесараспрацоўках: [Вершы] // Там жа. № 12; Наказ конніка: [Верш] // Голас Радзімы. № 40; «Вясновы дзень прасторы высініў...»; Спёка: [Вершы] // Полымя. № 5; Факел: [Верш] // Ленінська молодь. 21 трав.; Факел дружбы; Размова пра курорт; Наказ конніка: [Вершы] // ЛіМ. 7 сак.; Прывіваем любоў да паэзіі // Наст. газ. 6 вер.; Выпадак у паходзе: [Верш] // Піянер Бел. 4 жн.

1962. Першага верасня: [Верш] // Беларусь. № 9; Рэха маленства; Жыты; Па песні; Маёвы дождж; Зачапіўся туман...: [Вершы] // Маладосць. № 8; Пасля выпускнога вечара; На пярэднім краі; Касьба: [Вершы] // Наст. газ. 1 вер.; Дзесяць год пражылі...: [Верш] // Там жа. 20 кастр.; Чыстае, яе крышталь // Там жа. 24 кастр.; Жыццёвы след: [Верш] // Там жа. 22 снеж.; Вялікі настаўнік // Чырв. змена. 3 ліст.

1963. Пра дарогу; Рака: [Вершы] // Беларусь. № 4; У капцёрцы; «Я ізноў у бары...»: [Вершы] // Маладосць. № 10; На першы ўрок: [Верш] // Наст. газ. 31 жн.; Аднавясковец; Ля возера; Матулі; Гаючая студня: [Вершы] // Там жа. 7 вер.; Ад спякоты глуха ў палях...; Густаў Эйфель: [Вершы] // Чырв. змена. 21 жн.

1964. Я зноўку тут...: [Верш] // Работніца і сялянка. № 2.

1965. Птушыныя прозвішчы: [Верш] // Беларусь. № 4; Пакінуўшы ўспамін: [Верш] // Наст. газ. 6 студз.

1966. Таганы; Чаканне; Туманы: [Вершы] // Дзень паэзіі — 66. Мн.; Брыгадзір; Вінтоўка; Думка; На дарозе ў Вільнюс; Кактус: [Вершы] // Беларусь. № 5; Вясновы дзень: [Верш] // Бярозка. № 5; Партызанскі хлеб; Каменне; Лісцём вызвоньваюць асіны...»: [Вершы] // Полымя. № 5; Тут моцным сном...; Ты нямнога са мной пабыла...; Зубчаты лес за вёскаю сінеў...: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 9; Лясная цішыня; Самае дарагое: [Вершы] // ЛіМ. 24 мая; Чатыры вершы: «Паглушэла, прыціхла наўкол далячынь...»; «Разышліся па вадзе кругі...»; «Гаварыла не раз перад людзямі...»; «Вецер хмары ў моры напаіў...» // Наст. газ. 31 жн.; У паходзе: [Верш] // Піянер Бел. 23 вер.

1967. Добрае імя — настаўнік // Родная наша ўлада. Мн.; Туманы: [Верш] // Голас Радзімы. № 3; «Галіны гнуткія ўніз...»; «Мяшкі, нібы вярблюжыя гарбы...»; «Дзе хістаецца голле ляшчын...»; «Шумяць бярозы жоўтым лісцем...»: [Вершы] // Маладосць. № 9; «Шуміць слаўны Леніна горад...»: [Верш] // Там жа. № 11; «Дзе хістаецца голле ляшчын...»: [Верш] // ЛіМ. 5 вер.

1968. Яшчэ адзін мужчына; Рыбачы сум; Па маліну; Шэйк: [Вершы] // Вожык. № 6; «Рухавым чоўнам месяц плыў здалёк...»; Вёска Дудзічы; Возера: [Вершы] // Полымя. № 8; Мінулае ў гасцях; Роздум пра багаж; Свабода: [Вершы] // Вяч. Мінск. 22 жн.; Вёска Дудзічы: [Верш] // ЛіМ. 6 жн.; Павеў бацькаўшчыны: [Верш] // Мін. праўда. 20 крас.; Малюнак маленства: [Верш] // Там жа. 31 мая.

1969. Многа песень ля кастроў прапета: [Верш] // Наст. газ. 30 жн.

1970. Першая школа; Пад бацькоўскай страхой...; На ўзлеску; Ракуцёўшчына: [Вершы] // Вяч. Мінск. 14 вер.

1972. Мара: [Верш] // Залацінкі. Мн.; «Мова матчына! Родная, звонкая...»; «Маразяна. Золка. Ветрана...»; «Зашарэла далеч...»; «Б'е цяплынь у твар, нібыта з печы...»; Воўк: [Вершы] // Полымя. № 3; Восень у Хатыні; «А над Нагасакі асеннія хмары...»; Газетная фота ўстрывожыла раны...: [Вершы] // Звязда. 17 снеж.; «Менш сяброў кожны год...»; «Выразалі бор у сорак пятым...»: [Вершы] // ЛіМ. 14 студз.; Снягі пакрылі плёс; Сорак пар дапытлівых вачэй; Ты ў тых мясцінах пабываеш; Сіняя града: [Вершы] // Наст. газ. 1 сак.; Бацькаўшчыне; Славяне; Хоць шчасце людское не знае граніцы...: [Вершы] // Там жа. 13 вер.; «Мова матчына! Родная, звонкая...»: [Верш] // Ніва. 23 крас.

1973. Позірк назад // Вытокі песні. Мн.; Ля Вераб'ёўкі; Апанасаўна: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 10; «Я твой сын і рупны гаспадар...»: [Вершы]: Родныя бярозы і асіны; Рута-мята; «Промень сонца праз голлі праглянуў...»; Будапешт; Укрыў Дунай туман...; І Свіслач у шкле; Адгрымелі, змоўклі ледаставы // Вяч. Мінск. 21 лют.; У раёне любым; Апусцелі пушчы; Ракіты ля берага; Зарыпелі асверы ў студнях; Шумяць высозныя таполі: [Вершы] // Наст. газ. 20 студз.; Па журавіны; Як вучыла маці; Калі зара гарыць: [Вершы] // Там жа. 28 ліп.; А мы ўсё чакалі...; Ласі; Рос: [Вершы] // Там жа. 13 кастр.; З нясвіжскага сшытка: [Вершы] // Чырв. змена. 28 студз.

1974. Адкуль бяруцца пусткі // Родная прырода. № 6; Будаўнік; Свіслач і Вілія; Стара-Віленскі тракт: [Вершы] // Вяч. Мінск. 30 мая; Горад-воін, горад-працаўнік // Звязда. 27 чэрв.; «Калі ты згубіў...»; «Ты кажаш...»; Славянскі пагорак; «Гярун з дубровай...»; На вайсковых вучэннях: [Вершы] // ЛіМ. 25 студз.; З зямной глыбіні; Снягі; Ля вясковай насоснай станцыі; Вугляпалы; Сёстры і браты: [Вершы] // Наст. газ. 20 лют.; Мост: [Верш] // Там жа. 1 мая.

1975. Восень у Хатыні: [Верш] // Слухайце — Хатыны!.. Мн.; Ля былых зямлянак; Маёр; Вогнішча ў пушчы: [Верш] // Вяч. Мінск. 7 мая; Зязюлі; Даўні вечар; Блакада; Пушкін: [Вершы] // ЛіМ. 6 чэрв.; Подвиг ратный, подвиг трудовой // Львов. правда. 26 янв.; Мае вучні; Што за гарызонтам; Збіральнік зброі; Галубы; Клікала далеч; Гаспадар: [Вершы] // Наст. газ. 15 лют.; Кавалёва гара; Мае птушкі; БАМ; Шчасце; Сябар; У гаі: [Вершы] // Там жа. 28 чэрв.; З новых вершаў: Пра пачуццё; Коні; Па дарозе; Мой край; Усць-Ілім // Чырв. змена. 25 студз.; Айчына; Гімн працы; Упрочкі: [Вершы] // Там жа. 16 крас.; Ліпа; Цётка Гата: [Вершы] // Там жа. 20 ліп.

1976. Платонавіч: [Верш] // Люблю будзённы дзень... Мн.

1977. Пад бацькоўскай страхой...: [Верш] // Дзень добры, мама! Мн.; Радзіма; Жанчыны; Успамін: [Вершы] // Наст. газ. 30 сак.

1978. Арбіта зялёных трывог: [Верш] // Сэрцам табе прысягаю. Мн.

1980. Арбіта зялёных трывог: [Верш] // Такія сэрцы ў нас. Мн.; Сустрэча: [Верш] // Наст. газ. 18 кастр.

1981. Лівень: [Верш] // Наст. газ. 15 жн.

1982. Самае дарагое: [Верш] // На сцягу і ў сэрцы. Мн.; Купала: [Верш] // Нам засталася спадчына. Мн.

1985. Партызанская сяўба: [Верш] // Партызаны, партызаны... Мн.

1.4.

1974. Гулія Д. Песня пастуха; Юным сябрам; Таварышу; Навагодняе; Нараджэнне гары; Юны год: [Вершы] / З абх. // Гулія Д. Выбранае. Мн.

1975. Загул Д. Іншы раз...; Сонца на ранку; Букавіна мая: [Вершы] // Украінская савецкая паэзія: У 2 т. Мн. Т. 1.

1.5.

На ўкраінскую мову. Зозулі: [Верш] / Пер. В. Марко // Прапор юності. 1975. 26 черв.

1.6.

Родная літаратура: Хрэстаматыя для X класа сярэдняй школы. Мн., 1966; 2 выд. Мн., 1967; 3 выд. Мн., 1968 / Скл. з У. Боганам, В. Каваленкам.

Родная літаратура: Хрэстаматыя для 9-га класа сярэдняй школы. Мн., 1969; 2 выд. Мн., 1970; 3 выд. Мн., 1970; 4 выд. Мн., 1972; 5 выд. Мн., 1973; 6 выд. Мн., 1974; 7 выд. Мн., 1976; 8 выд. Мн., 1977; 9 выд. Мн., 1978; 10 выд. Мн., 1980; 11 выд. Мн., 1983; 12 выд. Мн., 1986; 13 выд. Мн., 1988 / Скл. з У. Боганам, В. Каваленкам.

Родная літаратура: Хрэстаматыя для X класа сярэдняй школы. Мн., 1970; 2 выд. Мн., 1971; 3 выд. Мн., 1972; 4 выд. Мн., 1973; 5 выд. Мн., 1974; 6 выд. Мн., 1975; 7 выд. Мн., 1977; 8 выд. перапрац. Мн., 1979; 9 выд. Мн., 1981; 10 выд. Мн., 1983; 11 выд. Мн., 1985; 12 выд. Мн., 1987 / Скл. з У. Боганам, В. Каваленкам.

Родная літаратура: Хрэстаматыя для 11-га класа сярэдняй школы. 13 выд. Мн., 1989 / Скл. з У. Боганам, В. Каваленкам.

2.3.

На беларускай мове. [Віншаванне з 50-год-

дзем] // Беларусь. 1978. № 2; Гарулёў М. Без належнай патрабавальнасці // ЛіМ. 1953. 27 чэрв.; Данілевіч Л. Што сэрца ўзрушвае // Наст. газ. 1978. 8 лют.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі; Кароткі даведнік. Мн., 1981; Уладзіміру Ляпёшкіну — 50 // ЛіМ. 1978. 3 лют.; Федаровіч М. Сустрэча з маладосцю // Вяч. Мінск. 1970. 25 чэрв.

Т. М. Махнач.

ЛЯПІЧ РАМАН

Ляпіч Раман Фёдаравіч (1.7.1906, в. Бор Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл.— 9.1.1977, Мінск, пахаваны на Чыжоўскіх могілках), крытык, перакладчык. Пісаў на беларускай і рускай мовах.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. З дзяцінства парабкаваў, у вольны час зімой наведваў царкоўна-прыходскую школу. Каб дапамагчы сям'і, працаваў рабочым у аграномічным пракатным пункце (1922). У пачатку 1923 прыехаў у Мінск, адкуль яго накіравалі рабочым у саўгас «Трасцянец». У 1923—26 курсант школы міліцыі ў Мінску. У 1926—28 вучыўся на вячэрнім рабфаку, у 1928—31 — на літаратурным факультэце БДУ. Працаваў літработнікам у рэдакцыях газет «Звязда», «Рабочий». У 1931—35 у аспірантуры АН БССР. Пасля яе заканчэння да 1938 малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы. Адначасова выкладаў у Мінскім пединстытуце (у сакавіку — ліпені 1938 дэкан філалагічнага факультэта). У 1938 быў беспадстаўна рэпрэсіраваны, 10.10.1938 асуджаны і высланы на Калыму, дзе адбываў тэрмін у Паўночна-Усходніх працоўных лагерах. Працаваў забойшчыкам на прыіску Дускан'я. З 1946 намеснік начальніка базы забеспячэння горна-прамысловага ўпраўлення, з 1951 прараб-геолаг Дзетрынскага геолага-разведвальнага камбіната Верхне-Калымскага раённага горна-руднага ўпраўлення, з 1955 геолаг Пенжынскай комплекснай экспедыцыі Паўночна-Усходняга горнага ўпраўлення (Магаданская вобл.). Доўгія гады, праведзеныя на Калыме, канчаткова падарвалі яго здароўе. З 1965 інвалід 2-й групы. У 1968 вярнуўся ў Мінск. Рэабілітаваны ў 1969. Апошні год перад смерцю быў паралізаваны.

Друкавацца пачаў у 1929 у газеце «Рабочий» як перакладчык. У 1931 змешчаны яго першы артыкул «На барыкадах барацьбы за сусветную гегемонію пралетарскай літаратуры» — аб першым Усесаюзным з'ездзе польскіх пралетарскіх пісьменнікаў. Набылі вядомасць яго крытычныя артыкулы, прысвечаныя творчасці народных пісьменнікаў Беларусі — Я. Коласа і Я. Купалы. Аналізуючы творчасць І. Гурскага, А. Кучара, Р. Ляпіч нярэдка паказваў памылковасць іх спрошчаных поглядаў на жывы літаратурны працэс. Аднак і яго выказванні не былі пазбаўлены характэрнага для свайго часу вульгарызатарства («Нацыянал-дэмакратычная фальсіфікацыя беларускай літаратуры», у сааўтарстве з Э. Галубком). Пісаў рэцэнзіі, перакладаў на рускую мову паасобныя творы З. Бядулі, П. Галавача, М. Лынькова.

Г. М. Уруліна.

Бібліяграфія

1.3.

1931. На барыкадах барацьбы за сусветную гегемонію пралетарскай літаратуры (Першы Усесаюзны з'езд польскіх пралетарскіх пісьменнікаў) // Маладняк. № 10.

1932. «Новы горад» у Белдзяржтраме // Мастацтва і рэвалюцыя. № 3—4.

1933. У палоне памылак // Заклік. № 1 / Сааўт. Л. Фіглоўская, І. Кобер; Некалькі заўваг аб «Новым горадзе» І. Гурскага // Там жа. № 2; Пісьменнікі і крытыкі ў 1933 годзе // ЛіМ. 28 студз.; Уроки еще не извлечены // Рабочий. 5 апр.

1934. П'есы бадзёрага пралетарскага аптымізма: (Аб творчасці тав. І. Гурскага) // Драматургія. Мн.; Паэма камсамольскай маладосці // ЛіМ. 24 ліст.

1936. Нацыянал-дэмакратычная фальсіфікацыя беларускай літаратуры: (Крытычны агляд артыкулаў па беларускай літаратуры, змешчаных у «Литературной Энциклопедии» і «БСЭ») // Літаратура і мастацтва.

Мн. Кн. 4—5 / Сааўт. Э. Галубок; Якуб Колас: Народны паэт рэспублікі // Віцеб. пралетарый. 10 лют.; Народная мудрасць і прастата // Звязда. 11 кастр.; «Заштопаўшы душы прарэхі...»: [Рэц. на кн.: Звонак А. Мая радзіма. Мн., 1935] // ЛіМ. 11 лют.

1937. Песні будаўніцтва // Полымя рэвалюцыі. № 9—10: Аповесць пра класавую нянавісць: [Рэц. на: Галавач П. Носьбіты нянавісці // Полымя рэвалюцыі. 1936. № 5] // ЛіМ. 17 сак.; Талантливейший поэт советской эпохи // Рабочий. 14 апр.; Творчество Якуба Коласа // Там жа. 11 окт.

1.4.

1929. Бядуля З. Три крестика: Рассказ / С бел. // Рабочий. 27 нояб.

1931. Головач П. Переполох на загонах: Отрывок из повести / С бел. // Рабочий. 5 июня; Лыньков М. Последний звереедавец: [Урывак з аповесці] / С бел. // Там жа. 20 июня.

2.3.

На беларускай мове. Бярозкін Р. Аб «бадзёрых рытмах» Р. Ляпіча // ЛіМ. 1938. 6 студз.; Самуйлёнак Э. Супраць аглабельнай крытыкі // Там жа. 1936. 22 сак.

Т. М. Махнач.

ЛЯСКОЎСКІ ЮЛЬЯН

***Ляскоўскі Юльян** (псеўд. Бандурыст Карабіч, Ю. Карабіч, Марцін Мізэра; 1826, в. Новая Жосна Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл.— пасля 1888), польскі і беларускі пісьменнік, журналіст.*

Біяграфія Ю. Ляскоўскага ўзнаўляецца фрагментарна. Паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду герба «Кораб» (адсюль псеўданім). Першапачатковую адукацыю атрымаў у адной з бернардзінскіх школ (відаць, у Будславе). Працаваў канцылярыстам у Вільні. Удзельнічаў у вызваленчым руху, у сувязі з чым у 1849 быў вымушаны эмігрыраваць і перажыць шмат нягод. У адным з вершаў з сумам згадваў «гэтыя вандроўкі і прыгоды, што зламалі век мой малады» («Мая ўява», 1858). Тэкст твора «Гетманская магіла» (1858), прысвечанага гетману С. Жулкеўскаму, які загінуў у 1620 у бітве з туркамі, можа сведчыць пра бытнасць пісьменніка на Украіне (у Галіцыі?) і ў Румыніі. Нейкі час жыў у Лондане, дзе ў 1855 напісаў паэму «На чужой стране». У гэты ж час у Лондане знаходзіўся яго зямляк з Віцебшчыны А. Рыпінскі — можна меркаваць пра іх знаёмства, узаемны ўплыў. Паметкі пад творамі 1856—60 (Шчучын, Карсы, Осек, Зелюнь, Елень) не падаюцца з пэўнасцю прывязцы да канкрэтнага рэгіёна, але хутчэй за ўсё іх трэба звязаць з Пазнанскім княствам. З эміграцыі Ю. Ляскоўскі вярнуўся паводле агульнай амністыі ў 1860. Пасяліўся ў Вільні, знаходзіўся пад наглядам паліцыі. У 1861 удзельнічаў у антыўрадавых дэманстрацыях (спяваў патрыятычны гімн). Тады ж сваім коштам у друкарні А. Кіркора выдаў кнігу паэтычных твораў на польскай мове «Беларускі бандурыста. Зборнічак вандроўны». Для змешчаных там твораў (паэма «На чужой стране» і інш.) характэрны сувязь з беларускім фальклорам (выкарыстоўваецца часткова і ўкраінскі фальклор), шматлікія беларусізмы і беларускія рэаліі (рэкі Дзвіна, Бярэзіна, Сергуч, вёска Жаркі), патрыятычныя пачуцці, пратэст супраць сацыяльнага прыгнёту. Як паэт-рамантык Ю. Ляскоўскі складваўся пад моцным уплывам заснавальніка «ўкраінскай школы» ў польскай паэзіі Б. Залескага (у творах Ю. Ляскоўскага ёсць адпаведныя прызнанні). Пра зборнік «Беларускі бандурыста» выказвалася думка («Наша ніва». 1913. № 37), што ён быў спачатку напісаны на беларускай мове. У 1870—80-я гады выступаў (часта пад псеўданімам) у польскім друку. На пачатку 80-х гадоў у Варшаве дапамагаў вядомаму педагогу К. Прушынскаму (родам з Беларусі) у рэдагаванні папулярнага выдання для народа «Gazeta Świąteczna», на яе старонках агітаваў супраць эміграцыі сялян у Амерыку. Нейкі час рэдагаваў газету «Echo Łomżyńskie». Аўтар аповесці «У Амерыку па золата» (1888) пра цяжкае жыццё сялян-эмігрантаў з Польшчы і Беларусі, паасобных вершаў у перыёдыцы, брашур і артыкулаў на эканамічныя і сельскагаспадарчыя тэмы, напісаных з клопатам пра народны дабрабыт. У артыкуле «Слова пра песню» выявіў добрае веданне беларускай мовы і фальклору, падкрэсліваў іх багацце і самабытнасць, прывёў тэксты беларускіх (мяркуецца, уласных) вершаў «Зямелька мая» і «Пад дуду». У пісьме А. Рыпінскага А. Плугу (1883) названы ў ліку беларускіх пісьменнікаў.

Г. В. Кісялёў.

Бібліяграфія

1.2.

Białoruski bandurzysta: Zbiorek wędrowny wierszem. Wilno, 1861.

O służebnościach. Warszawa, 1873 / Пад псеўд. J. Korabicz.

Jak przysporzyć ziemi i chleba, dla użytku sąsiadów... Warszawa; Kraków, 1883 / Пад псеўд. Marcin Mizera.

Do Ameryki po złoto, z opowiadania wędrowca, Macieja Świdra. Warszawa, 1888 / Пад псеўд. Marcin Mizera.

1.3.

1871. Odmiana losu // Jana Jaworskiego Kalendarz illustrowany na r. 1871. S. 142 / Пад псеўд. J. Korabicz.

1882. Słówko o piešni // Nowiny. Nr 287—288 / Пад псеўд. J. Korabicz.

1971. Пад дуду; Зямелька мая... [Вершы] // Бела-

руская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. Мн. Надрукаваны як ананімныя творы.

1988. Пад дуду; Зямелька мая... [Вершы] // Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. 2 выд. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Александровіч С. Ручаёк, які ніколі не перасыхаў // Александровіч С. Па слядах паэтычнай легенды. Мн., 1965; Яго ж. Два невядомыя вершы // ЛіМ. 1965. 16 лют.; Власт [Ластоўскі В]. Памажыцяі // Н. н. 1913. 12 вер.; Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / Скл. Г. Кісялёў. Мн., 1977. С. 177, 180, 328, 340, 508.

На польскай мове. Gołąbek J. Wincenty Dunin-Marcinkiewicz, poeta polsko-białoruski. Wilno, 1932. S. 19; Kmiecik Z. Z dziejów pism dla ludu w latach 1866—1905; «Zorza» i «Gazeta świąteczna» // Rocznik historii czasopiśmiennictwa polskiego. 1966. T. 5. Z. 1.

На рускай мове. Карский Е. Белорусы. Пг., 1922. Т. 3. Вып. 3. С. 76; Сборник документов музея графа М. Н. Муравьева. Вильна, 1906. Т. 1. С. 37.

Г. В. Кісялёў.

ЛЯЎДАНСКІ УЛАДЗІМІР

Ляўданскі Уладзімір Аляксандравіч [25.1(7.2).1911, в. Гудавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. — 18.9.1973, Мінск; пахаваны на Паўночных могілках], празаік, дзіцячы пісьменнік, перакладчык. Член СП Беларусі з 1967.

З сям'і селяніна-батрака. У дзяцінстве дапамагаў бацькам па гаспадарцы. Скончыў Пухавіцкую сямігодку (1926), працаваў на лесараспрацоўках у Лапіцкім лясніцтве. У 1929 прыехаў у Мінск. Працаваў карэктарам у Белдзяржвыдавецтве (1930—33). Адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні Мінскага педтэхнікума. Служыў у Чырвонай Арміі (1933—35). Пасля дэмабілізацыі вярнуўся да ранейшай працы ў выдавецтве. У 1935 паступіў на вячэрняе аддзяленне філалагічнага факультэта Мінскага педінстытута, які скончыў у 1938. Працаваў у выдавецтве рэдактарам палітычнай літаратуры. У час Вялікай Айчыннай вайны жыў у роднай вёсцы ў бацькі. Быў партызанскім сувязным, з сакавіка 1943 камісарам партызанскага атрада «Полымя», рэдактарам падпольнай газеты «Партизан Белоруссии». Пасля вызвалення Беларусі працаваў рэдактарам Пухавіцкай раённай газеты «Сцяг камунізма». З 1945 загадчык вучэбна-педагагічнай літаратуры ў выдавецтве. У 1949—63 загадчык сектара перакладаў у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ. З 1963 дырэктар выдавецтва «Народная асвета». У 1969—73 — старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1938 як перакладчык. Пераклаў з рускай мовы п'есу Г. Мамліна «Цуды ў поўдзень» (ставілася ў Мінску ў 1966). Уласныя празаічныя творы пачаў пісаць у сярэдзіне 50-х гадоў. Першае апавяданне «Пёстры язь» і казка «На аднаго жыўца — два шчупакі» надрукаваны ў 1957. З гэтага часу У. Ляўданскі рэгулярна выступаў у друку як белетрыст. Яго апавяданні звычайна грунтаваліся на канкрэтных жыццёвых фактах і здарэннях. Аўтар выкарыстоўваў свой вопыт паляўнічага і рыбалова (кнігі дзіцячых апавяданняў «Адкрыццё сезона», «На беразе ракі» і інш.), імкнуўся надаць сваім творам займальнасць, прыгодніцкі каларыт.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

Буквар і першая кніга для чытання / Для школ дарослых. Мн., 1947 / Сааўт. А. Севярнёва; 2 выд. Мн., 1950; 3 выд. Мн., 1958; 4 выд. Мн., 1963.

Адкрыццё сезону: Апавяданні. Мн., 1960.

На беразе ракі: [Апавяданні]. Мн., 1962. Рэц.: Бугрын М. Проста і шчыра // Беларусь. 1963. № 2.

На прывале: Апавяданне. Мн., 1966. Рэц.: Нях ай М. Вачыма шчырага сябра // Чырв. змена. 1967. 11 ліп.

Ноч над Нёманам: Апавяданні і замалёўкі. Мн.,

1969. Рэц.: Жук А. Сцежка да жывое крыніцы // ЛіМ. 1970. 9 кастр.

Пад старым дубам: Апавяданні і замалёўкі. Мн., 1971.

Яшка прыляцеў: Апавяданні. Мн., 1973.

1.3.

1957. Пёстры язь: Апавяданне // Беларусь. № 9; На аднаго жыўца — два шчупакі: Казка // Бярозка, № 7; Той самы: Апавяданне // Там жа. № 10.

1958. Дзве сустрэчы: З успамінаў партызана // Беларусь. № 5; Адкрыццё сезону: Апавяданне // Там жа. № 9; Простая біяграфія: Апавяданне // Там жа. № 12; Люська: Апавяданне паляўнічага // Бярозка. № 2; Рачны доктар: Апавяданне // Там жа. № 6; Паядынак: Апавяданне // Там жа. № 8; Паляванне на вугроў: Апавяданне // Там жа. № 11.

1959. Першы цецярук: [Апавяданне] // Бярозка. № 5; Усёзнайка: Апавяданне // Там жа. № 7; Вялікі пешаход: Апавяданне // Вясёлка. № 5; За вяртанне на Радзіму. № 48; Жучок: Апавяданне // Вясёлка. № 9; Чорнае балота: Апавяданне // Полымя. № 10.

1960. Першы эшалон: Апавяданне // Беларусь. № 6; Шчаслівы дзень: Апавяданне // Там жа. № 12; Лясны разбойнік: Апавяданне // Бярозка. № 8; Вавёрчын склад: Апавяданне // Вясёлка. № 3; Бабровы слёзы: Апавяданне // Там жа. № 8.

1961. Мечаная гільза: Апавяданне // Беларусь. № 3; У Якубавай затонцы: Апавяданне // Там жа. № 8; Лапці: Апавяданне // Там жа. № 11; Прырода — наш лепшы сябар // Бярозка. № 2; Першы ўрок: Апавяданне // Там жа. № 3; Горкая ўдача: Апавяданне // Там жа. № 12.

1962. Засада: Апавяданне // Бярозка. № 3; Нечаканая сустрэча: Апавяданне // Там жа. № 6; Першы акунь: Апавяданне // Вясёлка. № 7.

1963. Здарэнне каля Ліповай грады: Апавяданне // Беларусь. № 1; На прывале: [Апавяданне] // Бярозка. № 3; Дзядулева тайна: Апавяданне // Там жа. № 7; Дарэмная трывога: [Апавяданне] // Вясёлка. № 8; Звычайная заканамернасць: Апавяданне // Наст. газ. 29 чэрв.; Мацярынскае сэрца: [Апавяданне] // Ніва. 9 чэрв.; Крылаты язь; Незвычайныя слёзы: [Апавяданні] // Там жа. 14 ліп.; Лясны разбойнік: [Апавяданне] // Там жа. 4 жн.; Жучок: [Апавяданне] // Там жа. 11 жн.

1964. На прывале: [Апавяданне] // Ніва. 17 мая; Дзядулева тайна: [Апавяданне] // Там жа. 12 ліп.; Дарэмная трывога: [Апавяданне] // Там жа. 13 вер.

1965. Дзедаў кажушок: Апавяданне // Бярозка. № 12; Балету: [Апавяданне] // Ніва. 4 ліп.; Шрам на шчацэ: [Апавяданне] // Там жа. 19 вер.; Шчаслівы дзень: [Апавяданне] // Там жа. 26 вер.

1966. Ля рыбацкага кастра: Апавяданне // Беларусь. № 11; Мацней за страх: Апавяданне // Бярозка. № 3; З выраю: [Апавяданне] // Вясёлка. № 5.

1967. Дзядулева тайна: [Апавяданне] // Арлянятам: У 2 т. Мн. Т. 2; Сэрца чалавека: Апавяданне // Беларусь. № 6; Машка: Апавяданне // Бярозка. № 1; Ноч над Нёманам: Апавяданне // Там жа. № 6; Страчанае давер'е: [Апавяданне] // Вясёлка. № 4; Каля старога дуба: [Апавяданне] // Там жа. № 6.

1968. Раніца ў лесе: Апавяданне // Бярозка. № 1; Рагачык: (Расказы аб прыродзе) // Там жа. № 5; Незвычайныя танцоры: (Расказы аб прыродзе) // Там жа. № 6; У засадзе: (Расказы аб прыродзе) // Там жа. № 11; Рыгорку стала горка: [Апавяданне] // Вясёлка. № 4; Рыбакі: [Апавяданне] // Там жа. № 7; Ціхім ранкам: [Апавяданне] // Наст. газ. 1 мая.

1969. Асечка: Апавяданне // Беларусь. № 12; Паядынак: (Расказы аб прыродзе) // Бярозка. № 4; На начлезе: Апавяданне // Там жа. № 7; Жывы помнік: Апавяданне // Там жа. № 10; Жаўтушка: [Апавяданне] // Вясёлка. № 7; Калі зацвіталі верасы // Там жа. № 9.

1970. Чаму Рыгорку стала горка; Незвычайныя слёзы; Лясны разбойнік; Пад старым дубам: [Апавяданні] // Крынічка. Мн.; Шрам на шчацэ: [Апавяданне] // Наша рэспубліка. Мн.; Гусарыкі: Апавяданне // Бярозка. № 7; Чысцёха: Апавяданне // Там жа. № 11; Не разгубіўся: [Апавяданне] // Вясёлка. № 6.

1971. Дзе цякла Вусцянка: Апавяданне // Беларусь. № 2; Сапраўдны паляўнічы: Апавяданне // Бярозка. № 3; Дарэмны страх: Апавяданне // Там жа. № 11.

1972. Бывала і такое: Апавяданне // Бярозка. № 10.

1973. Сёе-тое з біяграфіі // Вытокі песні. Мн.; Лясныя будаўнікі: Апавяданне // Вясёлка. № 3.

1978. Чаму Рыгорку стала горка: [Апавяданне] // Ручаінкі. Мн.

1979. Дзядулева тайна: [Апавяданне] // Ніва. 21 кастр.

1983. Дзядулева тайна: [Апавяданне] // Вясянка. Мн.

1.4.

Сінклер Э. No passaran!: (Яны не пройдуць): Раман / З англ. Мн., 1938.

Талстой А. Хлеб: (Абарона Царыцына): Аповесць / З рус. Мн., 1938. 2 выд. Мн., 1949. (Б-ка школьніка).

Заля Э. Пастка / З фр. Мн., 1939.

Херндон Э. Я буду жыць / З англ. Мн., 1939.

Рыд М. Коннік без галавы / З англ. Мн., 1941

Талстой Л. Апавяданні для дзяцей / З рус. Мн., 1946.

Тургенеў І. Выбр. апавяданні / З рус. Мн., 1947.

Салтыкоў-Шчадрын М. Выбр. апавяданні / З рус. Мн., 1948.

Мсціслаўскі С. Грак, птушка вясенняя: Аповесць аб Н. Э. Баўмане / З рус. Мн., 1949. (Б-ка школьніка).

Талстой Л. Каўказскі палоннік / З рус. Мн., 1951. (Школьная б-ка).

1954. Талстой Л. Каўказскі палоннік: Апавяданне / З рус. // Талстой Л. Аповесці і апавяданні. Мн., 1954.

1.5.

На рускую мову. Чудесное утро: Рассказы / Пер. В. Идельсон, Н. Мещерякова. Мн., 1975.

2.3.

На беларускай мове. Віншуем! // ЛіМ. 1971. 19 лют.; Навуменка І. Кніга адкрывае свет. Мн.; 1978. С. 113—114; Наш каляндар // ЛіМ. 1981. 6 лют.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Уладзіміру Ляўданскаму — 60 гадоў // ЛіМ. 1971. 5 лют.; Уладзімір Аляксандравіч Ляўданскі: Некралог // Там жа. 1973. 21 вер.

3.1.

ЦДАМЛіМ Беларусі, ф. 69, воп. 1, спр. 1—31.

М. П. Барташэвіч.

ЛЯЦКІ ЯЎГЕН

Ляцкі Яўген Аляксандравіч [крыпт. Е. Л., Е в г. Л., Л., Е в г. Л..., Е. Л- и й, Е в г. Л-и й, Е. Л...и й, Е.; 3(15).3.1868, Мінск — 7.7.1942, Прага; пахаваны на Альшанскіх могілках], крытык, гісторык літаратуры, даследчык рускага і беларускага фальклору. Апрача рускай, пісаў на чэшскай, нямецкай, італьянскай і іншых мовах.

Нарадзіўся ў старадаўняй дваранскай сям'і, чый маёнтак Гайна знаходзіўся ў Барысаўскім павеце. Тут прайшлі яго дзіцячыя гады. Вучыўся ў Мінскай гімназіі. Пасля заканчэння гісторыка-філалагічнага факультэта Маскоўскага універсітэта (1893) пакінуты пры універсітэце ў якасці кандыдата для падрыхтоўкі да навуковай дзейнасці. У 1901 Я. Ляцкага прызначылі захавальнікам этнаграфічнага аддзела Рускага музея (Пецярбург), дзе ён працаваў да 1907. Падрыхтаваў «Сістэматычны паказальнік этнаграфічнай літаратуры аб народах Расіі» (нявыдадзены). У 1912 арганізаваў кааператыўнае таварыства «Огни». У 1912—13 перапісваўся з М. Горкім. У 1917 выехаў у Фінляндыю. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на радзіму не вярнуўся. У 1918 пераехаў у Швецыю, стварыў там новае выдавецтва «Северные огни», у якім друкаваў у асноўным творы рускіх дарэвалюцыйных паэтаў. Там жа выдаваў часопіс «Около России» (Стакгольм). З 1922 у Чэхаславакіі, дзе адкрыў выдавецтва «Пламя» (Прага). На філасофскім факультэце Карлава універсітэта ўзначальваў кафедру рускай мовы і літаратуры. Чытаў лекцыі ў Бялградскім універсітэце (1933—35). Беларусь цікавілася жонка Я. Ляцкага, Відавіса Паўлаўна, якая жывучы ў Празе, сустракалася з Л. Геніюш.

Творчую дзейнасць распачаў з напісання вершаў і апавяданняў, якія не былі заўважаны крытыкай. У сталым узросце зноў вярнуўся да літаратуры — напісаў раман «Тундра» (1925) аб рускай эміграцыі. Больш паспяхова дэбютаваў фальклорна-этнаграфічнымі даследаваннямі, напісанымі на падставе сабраных ім матэрыялаў падчас экспедыцый на Беларусь, Літву, поўнач Расіі, Паволжа. Вывучаў творчасць А. Пушкіна, Л. Талстога, І. Ганчарова, Ф. Дастаеўскага, А. Чэхава, В. Верасаева, А. Белага і інш. Выдаў кнігі «Чарнышэўскі ў Сібіры. Перапіска з роднымі». Падрыхтаваў і выдаў «Пісьмы В. Р. Бялінскага» ў 3 тамах. Прымыкаў да культурна-гістарычнай школы, змяшчаў свае працы галоўным чынам у прагрэсіўных рускіх дарэвалюцыйных часопісах («Вестник Европы», «Познание России», «Современный мир», «Современник», «Голос минувшего», «Известия Отделения русского языка и словесности», «Русская старина», «Русское богатство», «Этнографическое обозрение» і інш.; не ўсе з гэтых публікацый выяўлены). Знаходзячыся ў эміграцыі, многа зрабіў для прапаганды сярод замежных народаў рускай і беларускай літаратуры і фальклору. У манументальнай манаграфіі «Слова аб палку Ігаравым» значнае месца адвёў беларускаму элементу гэтага помніка. У 1927—28 у чэшскім часопісе «Slavia» апублікаваў цыкл артыкулаў «Нататкі па беларусазнаўству», у італьянскім часопісе «Risista di eite literature slave» («Часопіс славянскай літаратуры», 1927) — артыкул пра творчасць Якуба Коласа. Каштоўнымі ў яго навуковай спадчыне з'яўляюцца даследаванні пра беларускі фальклор (друкаваліся на старонках часопіса «Этнографическое обозрение»). Важнае навуковае значэнне маюць ненадрукаваныя працы вучонага: фальклорныя запісы (беларускія казкі, паданні, легенды, песні, прыпеўкі, прыказкі, прымаўкі, загадкі і інш.; захоўваюцца ў Пушкінскім доме, Санкт-Пецярбург), перапіска з В. Брусавым, дакументы, звязаныя з навучаннем у Маскоўскім універсітэце, а таксама літаратурна-фальклорныя артыкулы, якія захоўваюцца ў Літаратурным архіве ў Празе.

І. К. Цішчанка.

Бібліяграфія

1.2.

Несколько замечаний к вопросу о пословицах и поговорках. Спб., 1897 [Ч.] 1—5.

Материалы для изучения творчества и быта белорусов. 1. Пословицы, поговорки, загадки. М., 1898. Отд. отт. из «Чтений в имп. О-ве истории и древностей российских при Моск. ун-те» за 1898 г.

И. А. Гончаров: Критический очерк. Спб., 1904.

И. А. Гончаров: Жизнь, личность, творчество: Критико-биографический очерк. Спб., 1912.

И. А. Гончаров: Жизнь и творчество. Прага, 1925.

Роман и жизнь: Развитие творческой личности И. А. Гончарова. Прага. 1925.

Тундра: (Роман). Прага, 1925.

Слово о полку Игореве: Повесть о князьях Игоре, Святославе и исторических судьбах Русской земли; Очерк из истории древнерусской литературы; Композиция, стиль. Прага, 1934.

Заметки к «Слову о полку Игореве». Прага, 1936. Вып. 1; Белград, 1941. Вып. 2.

1.3.

1890. [Рэц. на кн.: Календарь Северо-Западного края. М., 1890] // Этногр. обозрение. № 1; Представления белоруса о нечистой силе // Там жа. № 4.

1891. Бедный Саша: [Апавяданне] // Мин. листок. 11 янв. / Пад. крыпт. Евг. Л...ий.

1892. Роза и соловей: Литовская легенда: (Посвящается моим вилейским друзьям) // Альманах Северо-Западного календаря на 1893 г. Мн.; Могилевский историко-этнографический музей // Этногр. обозрение. № 1; Болезнь и смерть по представлениям белорусов // Там жа. № 2—3; Ольховецкие письма // Мин. листок. № 47, 68; Из области заговоров // Там жа. № 95.

1893. К вопросу о заговорах от трясовиц // Этногр. обозрение. № 4; К объяснению слова Днепр // Вилен. вестник. № 32.

1894. Сказитель И. Г. Рябинин и его былины // Этногр. обозрение. № 23.

1895. [Рэц. на кн.: Довнар-Запольский М. Песни пинчуков. Спб., 1895] // Этногр. обозрение. № 3.

1896. [Рэц. на кн.: Никифоровский Н. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обихода. Витебск, 1895] // Этногр. обозрение. № 1.

1897. [Рэц. на кн.: Никифоровский Н. Простонародные приметы и поверья... Витебск, 1897] // Этногр. обозрение. № 4.

1898. Материалы для народного снотолкования // Этногр. обозрение. № 1; [Рэц. на кн.: Никифоровский Н. Простонародные загадки. Витебск, 1898] // Там жа. № 3.

1899. А. С. Пушкин и его письма // Сборник «Русского богатства». Спб.; Скоморошина наших дней: (Из записок этнографа) // Ист. вестник. № 11.

1900. Апостол мира (В. М. Гаршин): Характеристика // Журнал для всех. № 9—10; В вагоне: (Из записок этнографа) // Ист. вестник. № 4; Заметки о дуэли А. С. Пушкина // Русская старина. № 1.

1901. Максим Горький и его рассказы // Вестник Европы. № 11.

1903. И. А. Гончаров в его произведениях // Вестник Европы. № 3, 4; Новая пьеса М. Горького («На дне») // Там жа. № 4; Чужая жизнь в произведениях И. А. Гончарова // Там жа. № 7; Н. В. Гоголь в новом освещении // Там жа. № 12.

1904. А. П. Чехов и его рассказы // Вестник Европы. № 1; [Рэц. на кн.: Карский Е. Белорусы. Варшава. 1903. Т. 1] // Там жа. № 2; По поводу рассказов Вересаева // Там жа. № 7; Новая повесть г. Леонида Андреева // Там жа. № 11; На Печору. Путевые заметки // Там жа. № 12; Материалы по белорусской словесности и языку // Изв. ОРЯС. Т. 9. № 4.

1906. Вопросы жизни и творчества гр. Л. Н. Толстого // Вестник Европы, № 12.

1908. Пути и перепутья Валерия Брюсова // Современный мир. № 4; Н. Г. Чернышевский в годы учения и на пути в университет // Там жа. № 5, 6; Н. Г. Чернышевский в университете // Там жа. № 12.

1909. И. А. Гончаров: Очерк // История русской литературы. М.; Юношеская любовь Н. Г. Чернышевского (По «Дневнику» 1848—1850 гг.) // Познание России. № 1; Н. Г. Чернышевский в университете // Современный мир. № 3; Н. Г. Чернышевский и Ш. Фурье // Там жа. № 11.

1910. Н. Г. Чернышевский и учителя его мысли (Гегель, Белинский, Фейербах) // Современный мир. № 10, 11.

1911. Вступительное слово // Былины. Старинки богатырские. Спб.

1912. Вступительное слово // Стихи духовные. Спб.

1927. Il poeta della Russia Bianca rinascente: Jakub Kolas // Rivista di Letterature Slave. Marzo, Fasc. I—II. Рэц. Haertel E. // Jahrbücher für Kultur und Geschichte der Slaven. 1928. H. 1.

1938. «Слово о полку Игореве» // Српски књижевни гласник. Нова серја. LV. Бр. 3.

1939. Неудачный поход на «Слово о полку Игореве» // Slavia (Praha). 1939. Seš. 1—3.

1988. [Перапіска Я. Ляцкага з М. Горкім. 1912—1913 гг.] // Лит. наследство. (М.). Т. 9.

1.6.

Стихи духовные: Сборник. Спб., 1912 / Скл.

Чернышевский в Сибири. Переписка с родными. Спб., 1912—1913. Вып. 1—3 / Рэд.

Письма Белинского: В 3 т. Спб., 1914 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Гілевіч Н. З клопатам пра песні народа. Мн., 1970. С. 107—108; Цішчанка І. Я. А. Ляцкі. Фальклярыстычная дзейнасць (1868—1942) // Беларуская фальклярыстыка. Мн., 1989.

На рускай мове. Оксман Ю. Переписка Белинского // Лит. наследство. (М.). 1950. Т. 56; Словарь членов Общества любителей российской словесности при Московском университете. М., 1911. С. 175—176.

На чэшскай мове. Horak J. E. A. Ljackij // Časopis pro moderni filologii. 1938. Č. 4.

3.1.

Дзярж. б-ка Расіі, аддз. рукап., ф. 386, воп. 93, адз. зах. 14; ІРЛІ (Пушкінскі дом) Расійскай АН, ф. 163, воп. 1, адз. зах. 3, 13, 14, 16, 57, 347, л. 10, 11; 374, л. 2—3; 383, л. 18; ЦДА (Масква), ф. 418, воп. 303, адз. зах. 449.

Т. М. Махнач.

ЛЯШУК ВЕРА

Ляшук Вера Якаўлеўна (н. 1.11.1933, в. Марозавічы Брэсцкага р-на), літаратуразнавец. Заслужаны работнік вышэйшай школы (1987). Кандыдат філалагічных навук (1975). Прафесар (1991).

Нарадзілася ў сялянскай сям'і. Бацька, Якаў Рыгоравіч, ведаў шмат казак, загадак, песень, быў цікавым апавядальнікам, добра спяваў. Маці, Аляксандра Васілеўна, ведала на памяць вершы рускіх і ўкраінскіх класікаў, заахвочвала дзяцей да чытання мастацкай літаратуры. Вучылася В. Ляшук у пачатковай школе ў роднай вёсцы, у Малазаводскай сямігодцы (скончыла ў 1950), у Брэсцкім педвучылішчы (1950—54). З адзнакай скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага педінстытута (1959). Настаўнічала ў Дамачаўскай СШ Брэсцкага р-на (1959—61). Працу завучам Тамашэўскага дзіцячага дома сумяшчала з выкладаннем рускай і беларускай мовы і літаратуры ў Камароўскай СШ (1961—63). З 1963 — на кафедры беларускай літаратуры Брэсцкага педінстытута. Абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме: «Краязнаўства як сродак павышэння эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчай работы на ўроках літаратуры ў школах Беларусі». Дэкан філалагічнага факультэта (1980—85). З 1988 на пасадзе прафесара кафедры беларускай літаратуры, з 1991 загадчык гэтай кафедры. Узнагароджана медалём, граматай.

Друкавацца В. Ляшук пачала ў студэнцкія гады ў брэсцкай абласной газеце «Заря» (з 1957). Сістэматычна яе артыкулы і рэцэнзіі публікуюцца ў абласным і рэспубліканскім друку з 1964. Кола яе творчых інтарэсаў — літаратурнае краязнаўства Брэстчыны, даследаванне твораў беларускай дзіцячай літаратуры, пытанняў методыкі выкладання беларускай і рускай моў у школе, праблем педагогікі вышэйшай школы. Аўтар вучэбных дапаможнікаў і манаграфій.

Жыве ў Брэсце.

Г. М. Малажай.

Бібліяграфія

1.2.

Матэрыялы для пазакласнай работы па беларускай літаратуры. Мн., 1971 / Сааўт. Л. Смальянава.

Использование краеведческого материала на уроках русской литературы в школах Брестчины. Брест, 1972.

Краеведение как средство повышения эффективности учебно-воспитательной работы по литературе в школах Белоруссии: Автореф. дис. .. канд. филол. н. Мн., 1974.

Краязнаўчы матэрыял на ўроках літаратуры. Мн., 1980. Рэц.: Лебедев В., Каленкович И. Слово о родном крае // Заря. 1981. 27 февр.

Іван Мележ у школе: Дапаможнік для настаўніка. Мн., 1981. Рэц.: Лугоўскі А. Да глыбінь творчасці // Чырв. змена. 1981. 5 снеж.; Смыкоўская В. Адрасавана настаўніку // Наст. газ. 1981. 21 ліст.; Шкраба Р. Ісці за пісьменнікам // Полымя. 1981. № 8; Шчыракоў М. // Наст. газ. 1981. 19 жн.

Урокі пазакласнага чытання: IV—VII класы. Мн., 1984. (Б-ка настаўніка бел. мовы і літ.). Рэц.: Бощук А., Каленкович И. Чистый родник чтения // Заря. 1984. 29 нояб.; Валынец Ю. Пазакласнае чытанне // Наст. газ. 1984. 19 студз.; Шарамет Г. Літаратура — сродак выхавання // ЛіМ. 1984. 14 снеж.

Вывучэнне эпічных твораў: 5—8-я кл.: Для школ з бел. і рус. мовамі навучання: Дапаможнік для настаўніка. Мн., 1987.

Лабараторныя заняткі па методыцы выкладання беларускай літаратуры. Мн., 1988.

Літаратурнае краязнаўства ў школе. Мн., 1991.

1.3.

1964. Учителя-словесники в поисках // Заря. 15 нояб. / Сааўт. У. Калеснік; У гады студэнцкія // ЛіМ. 29 снеж. / Сааўт. Л. Смальянава.

1965. Александр Блок на Брестчине: (К 85-летию со дня рождения) // Заря. 27 нояб.

1966. Певец синеокой Белоруссии // Заря. 9 дек.

1967. Вывучэнне загадак у VI класе // Нар. асвета. № 8; Слово о Полесье // Заря. 10 марта; Элиза Ожешко // Там жа. 24 мая; Якуб Колас // Там жа. 3 нояб.

1968. Літаратурныя дыспуты і канферэнцыі // Нар. асвета. № 4 / Сааўт. Л. Смальянава; Чародей души детской // Заря. 14 мая; С Лениным рядом // Там жа. 17 нояб.

1969. Друг детей: [Рэц. на кн.: Вітка В. Казкі. Мн., 1968] // Заря. 19 нояб.

1970. Вывучэнне крытычных артыкулаў у 8-м класе // Нар. асвета. № 8; Не дапускаць спрашчэнства // Наст. газ. 20 мая; Па вялікаму рахунку // Там жа. 22 чэрв.

1971. Падрыхтоўка студэнтаў да літаратурна-краязнаўчай работы ў школе // Беларуская мова і літаратура ў ВНУ. Брэст; Літаратурнае краязнаўства як форма творчых сувязей ВНУ са школамі // Совершенствование взаимосвязей вузов и школ. Гродно; Краеведческие материалы на уроках в школах Брестчины // Литература в школе. № 3; Вывучэнне крытычных артыкулаў у 9 класе: (Беларуская літаратура) // Нар. асвета. № 1; Паустовский и Брестчина // Заря. 26 марта; Творчая лучнасць // Наст. газ. 24 сак. / Сааўт. Л. Смальянава).

1972. Краеведческие материалы на вступительных занятиях в школах Брестчины // Всесоюзная научная конференция по проблемам обучения русскому языку как средству межнац. общения народов СССР. Кишинев; В полесской глуши // Заря. 27 сент.; В глубине Полесья // Там жа. 26 окт.; Души прекрасные порывы // Там жа. 1 нояб.; Шчодрасць душы // Наст. газ. 16 вер. / Сааўт. А. Майсейчык.

1973. Пазакласная работа па беларускай літаратуры ў школах Беларусі (20-я гады) // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн. Вып. 1; Роля краязнаўчых матэрыялаў у патрыятычным выхаванні моладзі // Рэгіянальныя асаблівасці беларускай мовы, літаратуры, фальклору. Гомель; «Отсюда появился род Достоевских» // Лит. в школе. № 5; Вывучэнне пейзажнай лірыкі ў 4-м класе // Нар. асвета. № 7.

1974. Школьнае краязнаўства Беларусі 20—30-х гадоў // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн. Вып. 2; Слова боли и гнева // Заря. 5 июня / Сааўт. В. Лебедзеў.

1975. Краязнаўчая работа ў школах Беларусі пасляваенных гадоў // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн. Вып. 3; Приобщение к подвигу // Лит. в школе. № 2; Урокі пазакласнага чытання ў VIII—X класах // Нар. асвета. № 8.

1976. Падрыхтоўка студэнтаў-філолагаў да вывучэння эпічных твораў вялікай формы ў школе // Совершенствование методической подготовки учителя. Гродно; Урокі-экскурсіі // Нар. асвета. № 7.

1978. Вывучэнне рамана «Будучыня» // Нар. асвета. № 3.

1979. Некаторыя аспекты ўзаемасувязі ў вывучэнні рускай і беларускай літаратуры ў школах Беларусі // Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе. Мн.; Успрыманне рамана І. Мележа «Людзі на балоце» школьнікамі // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 7; Жывапіс на ўроках беларускай літаратуры // Нар. асвета. № 6; Вывучэнне прыказак у V класе // Педагогіка. Вып. 14; Литературная Брестчина // Заря. 10 марта.

1980. Пазакласная работа па беларускай літаратуры // Вывучэнне літаратуры: Пытанні методыкі. Мн.; Выкарыстанне рэгіянальных матэрыялаў пры вывучэнні творчасці Якуба Коласа // Рэгіянальныя традыцыі ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і фальклоры. Гомель; А. А. Блок в Полесье // Лит. в школе. № 5; Вывучэнне аповесці «Салавей» // Нар. асвета. № 6, 9; Остановиться, оглянуться: [Рэц. на кн.: Янкоўскі Ф. Прыпыніся на часіну. Мн., 1979] // Заря. 19 янв. / Сааўт. Г. Малажай; Цэльнасць аналізу: Разважанні аб сістэме ўрокаў па вывучэнню трылогіі Я. Коласа «На ростанях» // Наст. газ. 3 снеж.

1981. Нравственное воспитание учащихся при изучении стихотворения Н. А. Некрасова «Памяти Добролюбова» // Художественная литература в идейном и нравственно-эстетическом воспитании школьников. М.; Межпредметные связи в IV—VII классах // Русский язык и литература в школах Украины. № 4 / Сааўт. С. Каралевіч; Грані творчасці Максіма Танка: [Рэц. на кн.: Калеснік У. Максім Танк. Мн., 1981] // Наст. газ. 25 ліст.

1982. Гуказапіс на ўроках беларускай літаратуры // Нар. асвета. № 1 / Сааўт. Г. Аксюцік; Слова пра настаўніка // Наст. газ. 18 вер. / Сааўт. Г. Малажай; ...І пафас творчасці адчуць // Там жа. 17 ліст.

1983. Подготовка учащихся IV—VII классов к работе с учебником историко-литературного типа // Лит. в школе. № 5; Міжпрадметныя сувязі на ўроках літаратуры // Нар. асвета. № 1—2; Урок пазакласнага чытання па аповесці Я. Маўра «Палескія рабінзоны» (V кл.) // Там жа. № 5; У реки по имени детство // Заря. 11 мая; Жывы воблік Ільіча: Урок пазакласнага чытання ў IV класе // Наст. газ. 26 студз.; Каб харашэць душой: Урок пазакласнага чытання ў 4-м класе па цыклу апавяданняў Я. Брыля «Шчасце маленства» // Там жа. 7 вер.

1984. Праблемны аналіз мастацкага твора ў VIII—X класах // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 12; Приписываются Павлюку Багрыму // Заря. 5 окт.; Слова, якое клікала ў бой: Урок пазакласнага чытання ў 7 класе па беларускай ваеннай паэзіі // Наст. газ. 21 студз.

1985. Наша гордость и наша боль // Патриотическое воспитание на уроках литературы и во внеклассной работе: Из опыта работы словесников Белоруссии. М.; Никто не забыт, ничто не забыто (С. Смирнов «Брестская крепость», Б. Васильев «В списках не значится») // Произведения о Великой Отечественой войне на уроках литературы и во внеклассной работе. М., Далучэнне да чалавечнасці і гераізму: Урокі па апавяданню Я. Брыля «Маці» // Наст. газ. 30 сак.; Урокі дабраты і патрыятызму: Вывучэнне апавядання І. Навуменкі «Мяшок белага наліву» // Там жа. 9 кастр.

1.6.

Методыка выкладання беларускай літаратуры.: Вучэб. дапаможнік для філал. фак. пед. ін-таў. Мн., 1986 / Рэд. з А. Рагуляй.

Методыка выкладання беларускай літаратуры: Праграма для педінстытутаў па спецыяльнасці № 2102 «Беларуская мова і літаратура». Мн., 1986 / Скл.

Родная літаратура: Падручнік-хрэстаматыя для VI класа. Мн., 1988 / Скл. з А. Майсейчыкам.

Родная літаратура. Падручнік-хрэстаматыя для VII класа. 2 выд. Мн., 1989; 3 выд. Мн., 1991 / Скл. з А. Майсейчыкам.

2.3.

На беларускай мове. Прэміі часопіса «Полымя» // ЛіМ. 1982. 1 студз.

Т. М. Махнач.

М

МАЕЎСКАЯ НІНА

Маеўская Ніна Васілеўна (н. 4.12.1938, г. Любань Мінскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1983.

Нарадзілася ў сям'і служачага. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1956) працавала ст. піянерважатай у Сасноўскай СШ Любанскага р-на (1956—58). Скончыла БДУ (аддзяленне журналістыкі, 1963), Мінскую вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1980). Працавала літсупрацоўнікам газеты «Шлях камунізма» Мінскага р-на (1963—65), адказным сакратаром шматтыражнай газеты «За технический прогресс» (1965—67), загадчыкам аддзела, адказным сакратаром часопіса «Промышленность Белоруссии» (1968—78), літсупрацоўнікам у газеце «Літаратура і мастацтва» (1980—81), старшым рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва» (1981—85), з 1985 рэдактар аддзела публіцыстыкі часопіса «Беларусь». Узнагароджана медалём, Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Першыя вершы М. Маляўкі «Мой сусед» і «Вясенні час» былі надрукаваны ў газеце «Чырвоная змена» ў 1957. З таго часу яго вершы, балады, байкі, казкі, апавяданні, нарысы, рэцэнзіі змяшчаюцца на старонках часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Беларусь», «Вожык», «Вясёлка», газет «Літаратура і мастацтва», «Ніва» і інш., у штогодніках «Дзень паэзіі», калектыўных зборніках «Узлёт», «Залацінкі», «Зорка Венера», «На сцягу і ў сэрцы», «Вяснянка» і інш. Ён аўтар зборнікаў паэзіі «Едуць маразы», «Жалеза», «Лотаць», «Круг» і інш. Увагу паэта прыцягваюць родны Наднёманскі край, запаветныя коласаўскія мясціны. Шчыра, з добрай усмешкай ён умее расказаць пра паўсядзённыя справы землякоў, пра жыццё вёскі ў святы і будзённыя дні. Старонкі гераічнага мінулага свайго краю, услаўленне чалавека працы і хараства прыроды, студэнцкі побыт, маладосць і каханне — асноўныя матывы лірыкі М. Маляўкі. Вершы яго вылучаюцца напеўнасцю, меладычнасцю. Дасціпную размову з маленькімі чытачамі паэт вядзе ў кнігах «Дзед і ўнучка», «Як дом будавалі». Апошні раздзел кнігі «Аднавяскоўцы» склалі байкі, сатырычныя і гумарыстычныя творы. Паэма «Радзіны», балады, казкі, апавяданні, нарысы і рэцэнзіі вызначаюць жанравую разнастайнасць яго творчасці. Займаецца перакладам. Творы М. Маляўкі перакладзены на рускую і ўкраінскую мовы. Кампазітары К. Цесакоў, А. Казачкоў напісалі на яго вершы песні.

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Едуць маразы: Вершы. Мн., 1966. Рэц.: Гнілам ё д а ў У. У сувязях з жыццём // Маладосць. 1966. № 9; К у д р а ў ц а ў І. У дарозе, у пошуках // Звязда. 1966. 15 кастр.; М а к а л ь П. Сваё і ўзятае на павер // ЛіМ. 1966. 18 ліст.; Ш п а к о ў с к і І. Пошукі і знаходкі // Беларусь. 1966. № 9.

Жалеза: Лірыка. Мн., 1970. Рэц.: Г р а ч а н і к а ў А. І да нашчадкаў вернемся // ЛіМ. 1970. 9 кастр.; Д з е л я н к о ў с к і М. Герой вам спадабаецца // Мін. праўда. 1970. 21 кастр.; Д у к с а М. Выпрабаванне глыбіні // Маладосць. 1971. № 2; П а ў л ю к о ў П. Свежы струмень // Наст. газ. 1971. 1 студз.; Х в е д а р о в і ч М. Пра рамантыку будняў // Вяч. Мінск. 1971. 13 студз.; Ч а п л а в о д с к а я І. Высокае напружанне // Чырв. змена. 1971. 7 студз.

Лотаць: Лірыка. Мн., 1973. Рэц.: Б а р а в і к о в а Р. Каб не завяла лотаць... // ЛіМ. 1973. 18 мая; Д з е л я н к о ў с к і М. «Баюся спакою, як здрады» // Мін. праўда. 1973. 30 мая; Р а к а ў В. Адкрываць людскія душы // Полымя. 1974. № 6; С а п о ж к о в Ю. Золотой запас // Знамя юности. 1973. 14 авг.; Х в е д а р о в і ч М. Хада да сталасці // Беларусь. 1974. № 12; Я ф і м а ў Ф. Адкрываць людскія душы // Маладосць. 1974. № 4.

Круг: Вершы. Мн., 1977. Рэц.: Б я л е в і ч А. Задушэўная споведзь // Полымя. 1978. № 4; М я т л і ц к і М. «За лёс Зямлі ў адказе» // ЛіМ. 1978. 18 сак.

Эстакада: Вершы і паэмы. Мн., 1982.

Дзед і ўнучка: Вершы. Мн., 1983.

Дар: Вершы і паэма. Мн., 1985. Рэц.: Д з е л я н к о ў с к і М. Праўда роднай зямлі // Наст. газ. 1985. 14 жн.; Р у б і н І. Шчыры дар душы // ЛіМ. 1985. 9 жн.; Т у р а й к е в і ч Я. Пад песню матчыну // Мін. праўда. 1985. 11 ліп.

Салодкі лядзяш: Вершы і казкі. Мн., 1986.

Як дом будавалі. Мн., 1987. (Працу кожную шануй).

Аднавяскоўцы: Вершы; Балады; Байкі. Мн. 1988.

Зімні дождж: Вершы; Балады; Байкі. Мн., 1991.

1.3.

1957. Мой сусед; Вясенні час: [Вершы] // Чырв. змена. 13 лют.

1958. Па загаду сэрца; Хлеб: [Вершы] // Калг. праўда. 18 вер.; А такіх было мільёны...: [Верш] // Чырв. змена. 19 студз.; Папараць-кветка: [Верш] // Там жа. 19 жн.; Каханне: [Верш] // Там жа. 25 вер.

1960. У паходзе: [Верш] // Чырв. змена. 10 вер.

1961. Ля помніка Леніну; У дзень атрымання атэстата сталасці; Не раз другім сынам; Зіма; Гарачыня; Бярозы: [Вершы] // Маладосць. № 7; Радзіме; Пуцёўку мне, райком!; Стоўбцы; Лесаруб: [Вершы] // Там жа. № 10; Альбуць; Атэстат сталасці: [Вершы] // Мін. праўда. 28 студз.; Карэлія; Гарачыня: [Вершы] // Чырв. змена. 10 студз.; Суёкі: З вершаў аб Карэліі // Там жа. 9 крас.; Чарніцы ў малацэ: [Верш] // Там жа. 26 ліст.

1962. У стэпе; Колькі верасняў; Вясна; Хай жа ўсе студэнты; На поўначы; Канцэрт на лузе; Мне соромна; Чую галасы: [Вершы] // Маладосць. № 4; Музеі ў Альбуці; Балада пра песню; Калі на бальнічны ложак; Без вестак прапаўшым; Дарожная брыгада; Яго не разбудзім крыкам; Не спіцца дажджам уначы: [Вершы] // Там жа. № 10; Мікалаеўшчына: [Верш] // Там жа. № 11; Чырв. змена. 31 кастр.; Пісьмо ў Карэлію: [Верш] // Чырв. змена. 10 чэрв.

1963. Папы; Паштовыя пераводы; Раённыя класікі: [Вершы] // Маладосць. № 8; Сесія: [Верш] // Чырв. змена. 7 мая.

1965. Калыскі: [Верш] // Дзень паэзіі — 65. Мн.; Ля помніка Леніну; «Не раз другім...»; «Паэтам, якія...»; Вераб'іная ноч; Хай жа ўсе студэнты...; Стоўбцы: [Вершы] // Узлёт. Мн.; Гады; Пакуль для нас не адцвілі акацыі; Не для песень, не для бронзавай славы; Косы, якія не сівеюць; Танцы; Алёнцы на карціне Васняцова; Чаму я люблю навальніцы; Казка: [Вершы] // Маладосць. № 2; Чаму я люблю навальніцы: [Верш] // ЛіМ. 23 лют.

1966. Малакасос: [Верш] // Дзень паэзіі — 66. Мн.

1968. «Зрывалі з дрэў і дахаў...»; «Іх падымалі арэлі...»; Лаўровы ліст; «Апаіла маці макам...»: [Вершы] // Маладосць. № 1; У дваццаць год мы ўсе прарокі...: [Верш] // ЛіМ. 9 студз.; Ніва. 24 сак.

1969. Мне соромна, я вінаваты...: [Верш] // Беларускі каляндар на 1970 год. Беласток; Трыдзевятае царства: [Верш] // Беларусь. № 3; Будзёнаўцы: [Верш] // Там жа. № 11.

1970. Свежыя барозны: Апавяданне // Бярозка. № 6; Брыгадзір: Апавяданне // Там жа. № 9; «Мы не загорнуты ў вату...»; Атланты; Слава; «А прывалы толькі зрэдку...»: [Вершы] // Маладосць. № 2.

1971. Хай жа ўсе студэнты...; «Усё далей —...»: [Вершы] // Універсітэт паэтычны. Мн.

1972. Жывіца; Дажджы: [Вершы] // Дзень паэзіі — 72. Мн.; Без вестак прапалі: [Верш] // Залацінкі.

Мн.; Ты паўтарыся яшчэ раз: [Верш] // Зорка Венера. Мн.; Роўны пульс: Нарыс // Беларусь. № 5; Дажджы: [Верш] // Голас Радзімы. № 33; «Не час перунам загрымець...»; «Я ў свет выплываў...»; Рана на Івана; Зялёны шум: [Вершы] // Маладосць. № 7; Каласок: [Верш] // Там жа. № 11; Ля вечнага агню; «Адзін чалавек не з горшых...»: [Вершы] // Звязда. 6 лют.; Зямныя сокі: Нарыс // Там жа. 26 мая; Продкі: [Верш] // Там жа. 18 чэрв.; Ля вытокаў была казка: Нарыс // ЛіМ. 7 крас.; Крыніца: [Верш] // Мін. праўда. 7 ліп.; Дубкі: [Верш] // Там жа. 3 ліст.

1973. «У жыцці спатыкаемся зрэдку...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 73. Мн.; Ля вытокаў была казка: [Нарыс] // Кім быць? Мн.; Пры святле ліўняў: [Рэц. на кн.: Карызна У. // Святло ліўня. Мн., 1972] // Звязда. 8 сак.

1974. «Зноў гавораць па радыё...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 74. Мн.; Працалюб: [Нарыс] // Беларусь. № 4; Жураўліная песня: Нарыс // ЛіМ 15 ліст.; Бацьку; «На памылках вучацца...»; Пакуль грымеў пярун; «Калыша жыта...»: [Вершы] // Там жа. 20 снеж.

1975. Першы гром!..; «Імгла. Туман сыры над рэчкай...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 75. Мн.; Зорны год; Першы праспект; Не заблудзіцеся ў блакіце; Вада ў азярынах, як лёд; Завару я чаю; Асколкі: [Вершы] // Маладосць. № 1; Школьны званок; «Разбудзіла цішыня за сценамі...»; «Мама, помню ўсё...»; «Люблю глядзець на чыстую ваду...»: [Вершы] // Маг. праўда. 22 ліст.

1976. Жывіца; Першы праспект: [Вершы] // Люблю будзённы дзень... Мн.; «Першы гром!..: [Верш] // Гродн. правда. 19 ферв.

1977. Млечны шлях: [Нарыс] // Сучаснік. Мн.; «Лісце, лісце...»: [Верш] // Родная прырода. № 6; Вершы з кнігі «Круг»; «Шкада і лютых завірух...»; Каліна; Над калыскай дачкі; Хлеб: [Вершы] // ЛіМ. 18 лют.

1978. Раб: [Верш] // Адданасць. Мн.; Балада пра лісцік; Міна: [Балады] // Беларуская балада. Мн.; Пальнік // Чырв. змена. 13 жн.

1979. Рэквіем; Князь; Помнік; «Прыязджаем дамоў, прыязджаем...»; Падае снег на ўспаміны...: [Вершы] // Маладосць. № 8.

1980. Як Вася Вясёлкін памог дзеду Марозу: [Верш] // Вясёлка. № 12; Мы родам з рэвалюцыі; Валасы Веранікі; Коні: [Вершы] // ЛіМ. 15 жн.

1981. Кот-казачнік: [Верш] // Вясёлка. № 3; Тут нараджаюцца «зубры»: [Апавяданне] // Там жа. № 5; Першая настаўніца: [Верш] // Там жа. № 10; Акопныя вершы // ЛіМ. 18 вер.

1982. Святочны касцюм; Поле; «Якая дата стане днём спакою?..»; Замак: [Вершы] // Дзень паэзіі — 82. Мн.; Свята паэзіі ў Мікалаеўшчыне; Белыя ночы: [Вершы] // На сцягу і ў сэрцы. Мн.; Музеі ў Альбуці: [Верш] // Нам засталася спадчына. Мн.; Атэлье «Прамень»: Казка // Вясёлка. № 2; Млечны шлях; Забітая вёска; Дамоклаў меч; Гадзіннік з зязюляй; Сваты: [Вершы] // Маладосць. № 4; Повязь з роднай зямлёй // Там жа. № 10; Юбіляры: [Верш] // ЛіМ. 29 кастр.; Першая настаўніца: [Верш] // Ніва. 10 кастр.

1983. Атэлье «Прамень»: [Казка] // Вяснянка. Мн.; Спяваюць пеўні ў космасе: [Верш] // Дзень паэзіі — 83. Мн.; Родам з рэвалюцыі: [Верш] // Заўсёды з Леніным. Мн.; Як зайцы з тушканчыкамі ў футбол гулялі // Казкі беларускіх пісьменнікаў. Мн.; Вясёлка. № 7; Сустракайце госця дарагога: [Верш] // Бярозка. № 1; Усе пяцёркі — нашы!: [Верш] // Там жа. № 9; Дамоклаў меч: [Верш] // Голас Радзімы. 24 лют.; Спяваюць пеўні ў космасе; «Як даўно мы выйшлі з дому»; Зямная прапіска; Дзяўчынка ў белым плашчы; Дзеці на стрэльбішчы; Весны яблык; «Я гляджу праз часу дымку»: [Вершы] // ЛіМ. 14 кастр.

1984. Дарога, вецер, любоў; Апошні аўтограф: [Вершы] // Дзень паэзіі — 84. Мн.; Млечны шлях: [Верш] // За цябе, радзіма! Мн.; Хлапчуку, які запусціў папяровага змея; Падарунак; Прыгоды: [Вершы] // Бярозка. № 10; Балярына: Байка. // Вожык. № 15; Калійны хлеб: [Апавяданне] // Вясёлка. № 5; Разумная варона: З народнага: [Верш] // Там жа. № 9; Адпачывай, зямля; «Пакуль бацькі жывуць на свеце...»; Тайны; Звоніць тэлефон; Блакітныя аканіцы: [Вершы] // Маладосць. № 2; Падарунак: [Верш] // Работніца і сялянка. № 12; Зязюльчын лён; Чарамша: А. Кашароўскаму; Метэаролагі крылатыя; Ваза; «Палі бягуць на небасхіл...»: [Вершы] // Родная прырода. № 3; «І гэты дзень вясковы...»; Гледзячы на здымак: [Вершы] // Звязда. 4 ліст.; Чырвоная кніга: [Верш] // Там жа. 12 снеж.; Спадчына; Крылатыя ракеты; На вайсковых зборах; Старая яблыня; «Успамінаюцца ночы...»: [Вершы] // ЛіМ. 7 снеж.; Палі бягуць за небасхіл // Чырв. змена. 14 кастр.

1985. Крылатыя ракеты: [Верш] // Воляй азорыцца свет. Мн.; Лясныя сцежкі; Алея герояў: [Вершы] // Партызаны, партызаны... Мн.; Жалеза: [Верш] // Твой зорны час. Мн.; Марак; Крапіва смяецца: [Вершы] // Бярозка. № 9; Разумны дурань: [Верш] // Вожык. № 19; Шэры госць: З народнага: [Верш] // Вясёлка. № 8; Страцім-лебедзь; Дар; Да сустрэчы, сонца!; «Вітаешся яшчэ...»; Рутка; Зорка ўпала: [Вершы] // Маладосць. № 1; Балада пра вечнага марака: [Верш] // Полымя. № 5; Родам з рэвалюцыі: [Верш] // Вяч. Мінск. 6 ліст.; [Рэц. на кн.: Деленковский Н. Красота — рядом. Мн., 1984] // Голас Радзімы. 1 жн.; Малюнак; Голуб міру; Дзіцячая асамблея; Суд народаў; Касманаўты; Сустрэча з лесавозам; Хачу пабыць адзін...; Жывіце доўга, дзядзькі!; Чарніцы; Смага: [Вершы] // ЛіМ. 15 ліст.

1.4.

1972. Мірзоеў Г. Гаспадар: [Верш] / З тадж. // Дзень паэзіі — 72. Мн.

1973. Нуры З. «Зямля мая...»: [Верш] / З тат. // Нуры З. Радасць сустрэч. Мн.; Джуналаліяў К. Горы: [Верш] / З каз. // ЛіМ. 19 кастр.

1974. Маўленаў С. Тэлеграфныя стужкі; Сулейменаў А. Яблыкі: [Вершы] / З каз. // Дзень паэзіі — 74. Мн.

1975. Сідарэнка М. Памяць: [Верш] / З рус. // ЛіМ. 26 снеж.

1976. Алейнік Б. Песня: [Верш] / З укр. // Звязда. 23 мая; Стэльмах М. Маці: [Верш] / З укр. // Там жа. 1 чэрв.; Кароціч В. «На подзвіг ідучы...»: [Верш] / З укр. // ЛіМ. 6 лют.; Вінграноўскі М. Першая калыханка; Кароціч В. Канец змены: [Вершы] / З укр. // Там жа. 28 мая; Квлівідзе М. «Што мне рабіць?..»: [Верш] / З груз. // Там жа. 18 чэрв.

1977. Зайвый А. Праз далячынь гадоў: [Верш] / З укр. // Звязда. 16 снеж.; Дуднік П. Марак / З малд.; Камісарава М. Пярэдні край / З рус.: [Вершы] // ЛіМ. 29 крас.; Петэрс Я. Святло ў далонях: [Верш] / З лат. // Там жа. 2 вер.; Фатулаеў Г. Камуніст: [Верш] / З азерб. // Там жа. 23 вер.

1978. Таццянічава Л. Шчасце: [Верш] / З рус. // ЛіМ. 6 студз.; Алейнік Б. «Тры бярозы растуць...»: [Верш] / З укр. // Там жа. 28 крас.

1980. Арамян Р. Фатаграфіі: [Апавяданне]; Мілітанян Э. Ветразь: [Верш]; Шараян Р. Сяло баязліўцаў: Казка; Чарэнц Е. Акцябронку: [Верш] / З арм. // Вясёлка. № 11 / Сааўт. пер. Т. Пагасян; Саакян А. Клянуся хлебам: [Верш] / З арм. // ЛіМ. 28 ліст.

1981. Берулава Х. «Пад небам ясным...»: [Верш] / З груз. // ЛіМ. 20 лют.

1982. Мурадзян С. Песенька паштальёна: [Верш] / З арм. // Вясёлка. № 3; Мішын А. Самалёт; Уюны: [Вершы] / З рус. // Там жа. № 8; Хакімава М. Старт; Храбры Далер; Рака: [Вершы] / З тадж. // Там жа. № 10 / Сааўт. пер. К. Камейша; Мамур С. Апора / З тадж.; Тангрыкуліеў К. Наша дружба / З туркм.: [Вершы] // ЛіМ. 31 снеж.

1983. Бараўскас В. У-та-та: [Верш] / З літ. // Вясёлка. № 2; Міхалкоў С. Песенька сяброў: [Верш] / З рус. // Там жа. № 3; Юшчанка А. Прыязджайце на Дзясну: [Верш] / З укр. // Там жа. № 6.

1984. Руданскі С. Ці да Кіева далёка?; Не свае ногі; Добра таргавалася: [Вершы] / З укр. // Ад круч дняпроўскіх. Мн.; Шырвіс П. Помнік салдату; Жаваранкі-пеюны: [Вершы] / З літ. // Бурштынавыя пацеркі. Мн.

1985. Абашыдзе І. Дзе ні вандраваў бы я...; Абашыдзе Г. Вышыня: Урывак з паэмы; Чычы-

надзе Г. Чый яблык?; Застанься з намі, ёлачка; Зайцу холадна ў завею; Берасцянка: [Вершы] / З груз. // Дружная з сонцам. Мн.; Рашкоўскі Л. Майскі жук; Спагада: [Вершы] / З рус. // Вясёлка. № 7 / Сааўт. пер. К. Камейша; Бараўскас В. Карагод: [Верш] / З літ. // Там жа. № 11.

1.5.

На рускую мову. «Быстро в поезд сядем...»: [Верш] / Пер. А. Николаев // Мол. гвардия. 1967. № 5; Салаги: [Верш] / Пер. Н. Кислик // Родины сыновья. Мн., 1975; Зажинки: [Вершы] / Пер. Г. Бубнов // Неман. 1975. № 11; В голубизне не заплутайте...: [Верш] / Пер. И. Василевский // Извечной песни голоса. Мн., 1980; Тишина: [Вершы] / Пер. А. Дракохруст // Неман. 1980. № 9; В грозу; Павлинка: [Вершы] / Пер. А. Дракохруст // Биробидж. звезда. 1980. 4 мая; Рано на Ивана; Белый билет: [Вершы] / Пер. А. Дракохруст // Там жа. 1980. 1 июня; Родом из революции: Млечный Путь; Падает снег на воспоминанья; Реквием: [Вершы] / Пер. А. Аквилёв // Беларусь моя. Л., 1983.

На ўкраінскую мову. «Мені не сховать сорому...»: [Верш] // Комс. гарт. 1968. 18 лип.; Пробач; Зима; На лісосіці вночі; Завії: [Вершы] / Пер. М. Петренко // Калинові мости. К., 1969; «Ми не загорнуті ватою...»: [Верш] / Пер. І. Малюта // Комс. іскра. 1972. 19 серп.; Творчість: [Верш] / Пер. І. Низовий // Молодогвардієць. 1977. 13 вер.; Колосок: [Верш] / Пер. В. Гей // Молодий ленінець. 1978. 21 вер.; Зима: [Верш] // Вільна Укр. 1981. 10 жовт.; Лисички: [Верш] / Пер. Г. Кирпа // Барвінок. 1983. № 6.

2.3.

На беларускай мове. Грахоўскі С. Крытэрый патрабавальнасці // Полымя. 1971. № 4; Мартыненка Т. Творчая справаздача паэта // ЛіМ. 1985. 27 вер.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Прыняты ў Саюз пісьменнікаў // ЛіМ. 1971. 1 студз.; Федзюковіч М. Мера адказнасці // Чырв. змена. 1976. 28 студз.; Хвалей Я. Што хвалюе цябе, паэт? // ЛіМ. 1974. 18 студз.

2.4.

На беларускай мове. Камейша К. «...Жывём з табой не на выгодзе...» (М. Маляўку): [Верш] // Камейша К. Сябрына. Мн., 1978. *У. М. Ларчанка.*

МАНЬКОЎСКІ ІГНАТ

Манькоўскі Ігнат Антонавіч [крыпт. С. С. и К. М.....; каля 1765, Віцебшчына — 30.12.1831 (11.1.1832), в. Мазалава Віцебскага пав.], публіцыст, асветнік, удзельнік літаратурнага жыцця на Віцебшчыне першай трэці 19 ст.

Паходзіў з беларускай шляхты. Ранні перыяд біяграфіі нявысветлены. Ёсць звесткі, што юнацкія гады правёў у беднасці, вучыўся «ў езуітаў» (мабыць, у адным з езуіцкіх калегіумаў). Меў значныя здольнасці, пастаянна папаўняў свае веды і стаў па-еўрапейску адукаваным чалавекам. У 1783 паступіў на службу ў адну з канцылярый усходняй Беларусі, праз 4 гады — у штат беларускага генерал-губернатара перакладчыкам «па замежнай экспедыцыі». У 1793 прызначаны старшынёй дэпартамента Магілёўскага губернскага магістрата. Ва ўзросце больш за 30 гадоў рамантычнае пачуццё звязала яго лёс з зусім юнай дачкой мясцовага вяльможы А. Макавецкага — Рахіль Антонаўнай (каля 1780—1814). Ганарлівыя бацькі былі супраць яе шлюбу з бедным чыноўнікам. І. Манькоўскі паехаў у Пецярбург з пісьмом сваёй абранніцы да цара, здолеў выклікаць цікавасць і прыхільнасць імператара Паўла I, які ўзяўся быць яго сватам і апекуном. Як вясельны падарунак паводле царскіх указаў І. Манькоўскі атрымаў у 1797 у пажыццёвае ўладанне казённы маёнтак Буева пад Віцебскам, пазачарговы чын і даволі высокую пасаду саветніка ў Беларускім губернскім праўленні. Праз некаторы час набыў па суседству з маёнткам в. Мазалава і сваім разумным гаспадараннем ператварыў яе ва ўзорны маёнтак, які атрымаў назву Мілае. У 1799—1801 быў камянец-падольскім губернскім пракурорам на Украіне, потым на той жа пасадзе ў Віцебску. Памятнымі былі для яго падзеі Айчыннай вайны 1812. Сын яго, Антон, па сутнасці яшчэ падлетак, пайшоў добраахвотна ў армію з прывілеяванага пажаскага корпуса. Пры падыходзе французаў да Віцебска І. Манькоўскі эвакуіраваўся з губернскімі ўстановамі ўглыб Расіі (Вялікія Лукі, Луга). Жонка ж яго на працягу ўсёй акупацыі заставалася ў Віцебску. Маёмасць іх, як і іншых землякоў, была разрабавана акупантамі. Вярнуўшыся ў вызвалены Віцебск, І. Манькоўскі з-за адсутнасці губернатара і віцэ-губернатара ўзначаліў губернскую адміністрацыю, прыняў усе захады, каб хутчэй наладзіць жыццё ў спустошаным краі. У красавіку 1813 ён стаў віцебскім віцэ-губернатарам. Пра вынікі акупацыі Віцебска І. Манькоўскі расказаў у лісце ў рэдакцыю пецярбургскага часопіса «Сын Отечества», дзе асуджаў напалеонаўскую агрэсію і наогул усе захопніцкія войны, уславіў подзвіг расійскіх воінаў у барацьбе з ворагам. Як віцэ-губернатар узяў пад сваю абарону герояў вайны — сялян в. Жарцы на Полаччыне, якіх праследавала жорсткая памешчыца. Пасля адстаўкі (1817) жыў у сваім маёнтку Мілае, займаўся гаспадаркай, літаратурай і навукамі. Паводле сваіх поглядаў быў блізкі да дзеячаў Асветніцтва. У 1830 прыняў удзел у конкурсе, абвешчаным пецярбургскім Вольным эканамічным таварыствам, напісаў вялікі твор, які быў адзначаны залатым медалём і надрукаваны ў часопісе таварыства. У ім І. Манькоўскі падсумаваў свой шматгадовы вопыт сельскага гаспадара і глыбокага знаўцы народнага жыцця, патрабаваў паляпшэння бытавых умоў сялянства, выказаў каштоўныя думкі па пытаннях сельскага будаўніцтва, жывёлагадоўлі, ветэрынарыі, санітарыі,

аховы прыроды і г. д. Гэты публіцыстычны дакумент быў накіраваны супраць кансерватызму і цемрашальства. І. Манькоўскі быў адным з тых беларускіх дваранскіх інтэлігентаў, якія арыентаваліся на супольнасць гістарычнага лёсу Беларусі і Расіі, у яго творах шмат цікавых этнаграфічных назіранняў. Ён захапляўся жывым беларускім словам, папулярызаваў паэму «Энеіда навыварат», трэба думаць, сам пісаў па-беларуску, у сувязі з чым многія землякі і сучаснікі лічылі яго аўтарам беларускай «Энеіды». *Г. В. Кісялёў.*

Бібліяграфія

1.3

1813. Письмо из Витебска // Сын отечества. Ч. 6 / Пад крыпт. С. С. и К. М.....

1833. Ответ на задачу, предложенную императорским Вольным экономическим обществом: «Каким образом легко и дешево исправить крестьянские сельские строения или сделать в оных полезные усовершенствования» // Труды 67-го года существования императорского ВЭО. Спб.

2.3

На беларускай мове. Гарэцкі М. Беларуская «Энеіда» // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920. С. 58—59; 2 выд. Вільня, 1921. С. 58—59; 3 выд. Вільня, 1924. С. 58—59; Кісялёў Г. Манькоўскі // Загадка беларускай «Энеіды». Мн., 1971

На рускай мове. Маньковский К. Император Павел и Игнатий Маньковский: 1797 г. // Русская старина. 1882. № 8.

На ўкраінскай мове. Дорошенко Д. Білоруси і їх національне відродження // Рада. 1908. 10 груд.; Яго ж. Відроджене Білоруси // Руслан. 1909. 29 лип.

3.1.

ЦДГА Расіі ў Санкт-Пецярбургу, ф. 1349, воп. 3, спр. 1377, л. 7—8; воп. 4, 1817 г., спр. 179, л. 392—394.

Т. М. Махнач.

МАРАКОЎ ВАЛЕРЫЙ

Маракоў Валерый Дзмітрыевіч [псеўд. В. Армак (з А. Мардвілкам), В. Армар (з А. Мардвілкам); крыпт. С. Ш. і В. М. (з С. Шушкевічам), 14(27).3.1909, в. Акалонія Мінскага пав., цяпер у межах Мінска — 29.10.1937, Мінск (?)], паэт, перакладчык. Член СП Беларусі з 1934.

Нарадзіўся ў сям'і былога салдата, муляра і цеслі па прызванні, які пасяліўся каля чыгуначнай лініі на паўднёвай ускраіне Мінска (Калоніі — так яна называлася спачатку), пабудаваў там часовую хатку, а потым і даволі прыстойны дом. Пазбавіўшыся працы на чыгунцы, бацька рабіў у навакольных вёсках печы. Пасля сканчэння сямігодкі В. Маракоў нейкі час памагаў бацьку ў гэтай справе. Потым, скончыўшы Мінскі белпедтэхнікум і літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Мінскага педінстытута, 2 гады працаваў настаўнікам у Бабруйску. Яшчэ ў студэнцкія гады выязджаў на творчую практыку ў Любанскую камуну, на Рэчыцкую запалкавую фабрыку, Асінаўскую электрастанцыю. У 1927 разам з С. Шушкевічам, П. Галавачом, В. Кавалём, М. Нікановічам, І. Барашкам і некаторымі іншымі знаходзіўся ў двухтыднёвай паездцы, арганізаванай наркаматам асветы і рэдакцыяй газеты «Чырвоная змена», у Ленінград — пабачыў Царскае Сяло, Кранштат, Волхаўскую гідрастанцыю, наведаў музеі, сустракаўся з ленінградскімі пісьменнікамі і вучонымі. У 1926 прыняты ў літаратурную арганізацыю «Маладняк». Яго хутка заўважылі і высока ацанілі М. Чарот, К. Чорны, Я. Пушча. Вельмі падтрымліваў творчыя пошукі В. Маракова Я. Купала, які запрашаў да сябе ў госці, слухаў у аўтарскім выкананні вершы. У 1937 В. Маракоў быў незаконна рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1957.

Першыя вершы В. Маракова надрукаваны ў 1925 у часопісах «Чырвоны сцяг» і «Малады араты». Потым яго вершы змяшчаліся на старонках газет «Беларуская вёска», «Савецкая Беларусь», «Звязда», часопісах «Полымя», «Маладняк» і інш. Аўтар кніг паэзіі «Пялёсткі», «На залатым пакосе», «Вяршыні жаданняў», «Права на зброю». Вядомы як перакладчык на беларускую мову паасобных твораў М. Галоднага, П. Тычыны, А. Новікава-Прыбоя. Лірык паводле сутнасці свайго дараванння, ён у 30-я гады вымушаны быў аддаць данiну голай публіцыстычнасці. Змест творчасці В. Маракова вызначаецца пафасам маладосці, вітання жыцця, героікай рэвалюцыі і апяваннем новай явы.

І. П. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.2.

Пялёсткі: Вершы. Мн., 1926. Рэц.: Адамовіч А. А дзе ж грамадскасць? // Чырв. сейбіт. 1926. № 4; Баркоўскі С. Пойдзем піць прыгожасць сонца і вясны // Там жа. 1926. № 4; Лявонны Ю. // Сав. Бел. 1926. 25 снеж.; Янчук. «Душу я выпяваю да дна» // Маладняк. 1927. № 1.

На залатым пакосе: Вершы. Мн., 1927. Рэц.: А. М. // Чырв. сейбіт. 1928. № 1; Адамовіч А. // Узвышша. 1927. № 6; Баг // Сав. Бел. 1928. 10 студз.; Верас В. // Полымя. 1928. № 1; Замбржыцкі С. Не «плакаць і гарэць», а працаваць і вучыцца // Сав Бел. 1928. 15 студз.; Лясны А. На залатым пакосе // Звязда. 1928. 15 студз.; Райд І. // Маладняк. 1928. № 2.

Вяршыні жаданняў. Паэзія. Мн. 1930. Рэц.: Галубок Э. // Полымя. 1931. № 1; Сядура У. Пра «Вяршыні жаданняў» Вал. Маракова // Маладняк. 1931. № 1.

Права на зброю: Вершы. Мн., 1933. Рэц.: Клімковіч М. Пра кніжку В. Маракова «Права на зброю» // ЛіМ. 1934. 12 студз.

Лірыка. Мн., 1959. Рэц.: Васільеў К. Моваю сэрца // ЛіМ. 1960. 1 ліст.

Вяршыні жаданняў: Вершы, паэмы. Мн., 1989. (Спадчына).

1.3.

1925. Піянерыя: [Верш] // Бел. піянер. № 8; Піянерская восень: [Верш] // Там жа. № 11; Гораду: [Верш] // Малады араты. № 12; Чырв. змена. 22 кастр.; «Толькі раніцай сонца як гляне»: [Верш] // Чырв. сцяг. № 5—6; «Зялёны месяц над ракой...»: [Верш] // Там жа. № 7; А цяпер...: [Верш] // Бел. вёска. 3 ліст.; Тыя дні: [Верш] // Там жа. 10 ліст.; «Ой, не радасна шуміць дуброва»: [Верш] // Сав. Бел. 1 ліст.; З вёскі: [Верш] // Там жа. 19 ліст.; «Б'ецца вецер над далінай...»: [Верш] // Там жа. 29 ліст.; «Белае зімняе поле...»: [Верш] // Там жа. 6 снеж.; «Песні, песні юнацкага слова...»: [Верш] // Там жа. 22 снеж.; У лесе: [Верш] // Чырв. змена. 12 кастр.; Гораду: [Верш] // Там жа. 22 кастр.

1926. Па бярозавым шляху: [Верш] // Маладняк. № 2; Я верыў тады: [Верш] // Там жа. № 3; «Над сінім лесам, шэрым полем...»: [Верш] // Там жа. № 4; «Пеў пякучыя песні свае салавей...»: [Верш] // Там жа. № 6; «Нашто глядзіш так мне ў вочы...»: [Верш] // Малады араты. № 14; Кастрычнік: [Верш] // Там жа. № 18; Чырв. Полаччына. 6 ліст.; «Над прасторам ніў і над квяцістым лугам...»: [Верш] // Полымя. № 3; «Зноў прыйшла, прыйшла ты...»: [Верш] // Там жа. № 4; «Тут так хораша, свету так многа...»; «Палюбіў я асенняе ранне...»; «Помніш ты, быў ціхі, ціхі вечар...»: [Вершы] // Там жа. № 7; Ноч запаліла...: [Верш] // Сав. Бел. 22 жн.

1927. «Была восень у роднай краіне...»: [Верш] // Маладняк. № 1; «О, вясна...»: [Верш] // Там жа. № 2; «Мне хочацца любіць...»: [Верш] // Там жа. № 3; Маці: [Верш] // Там жа. № 7—8; З цыкла «Гудкі»: [Верш] // Полымя. № 1; Маўрытанка; «У гэтай цемры бязрадаснай ночы...»: [Вершы] // Там жа. № 3; На прыволлі: [Верш] // Чырв. сейбіт. № 6—7; «Мой родны край, ізноў я тут...»: [Верш] // Там жа. № 8—9; Памяці Сака і Ванцэці: [Верш] // Звязда. 24 жн.; Дзесяць год: [Верш] // Сав. Бел. 11 вер.; Кастрычнік: [Верш] // Чырв. Палессе. 7 ліст.; «Цяпер у грудзях другія словы...»: [Верш] // Чырв. змена. 21 студз.; Маладнякоўская ўдзячнасць // Там жа. 1 чэрв. / Сааўт. М. Нікановіч, В. Каваль.

1928. «Мой родный край, ізноў я тут!..: [Верш] // Дэкламатар. Мн.; Цыганка: [Верш] // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». № 19; Працаўнік асветы. № 19; Новыя вершы // Маладняк. № 4; [Рэц. на кн.: Кулік І. Антологія «Американської поезії» К., 1928] / Пад псеўд. В. Армар. Сааўт. А. Мардвілка; «Мне не забыць былыя вечары...» // Там жа. № 8; «Адсумаваўшы маладосць сваю...»: [Верш] // Там жа. № 11; Адноўленая зямля: Да дзесяцігоддзя Сав. Беларусі: Паэма // Там жа. № 12; Чуеш, Беларусь?: [Верш] // Полымя. № 7; «За чужое шчасце і любоў...»: [Верш] // Там жа. № 8; «Ён адчыніў акно...»: [Верш] // Там жа. № 9; Беларусі; Цішку Гартнаму: [Вершы] // Там жа. № 10; «Доўга, доўга стаяў над вакном я і марыў...»: [Верш] // Узвышша. № 1; Пры дагараючым кастры: [Верш] // Заря Запада. 15 янв.; За 12 дзён: (З падарожжа маладнякоўцаў па Украіне) // Звязда. 25 ліп.; «Ёсць лепшы свет...»: [Верш] // Чырв. змена. 18 ліст.; З «рабінавай ночы»: Уступ да паэмы // Там жа. 25 ліст.

1929. Камсамолу Мазыршчыны: [Верш] // Маладняк. № 4; Муляр: Паэма; Гутарка з карэспандэнтам «Маладняка» // Там жа. № 7; «Жыццё, як мараакіян...»: [Верш] // Там жа. № 10; «На гэтых пройдзеных шляхах...»: [Верш] // Паляўнічы Бел. № 11—12; Мая паэма: Паэма // Полымя. № 1, 4, 5; Урывак з паэмы «Муляр» // Прафрух на Бел. № 15—16; Паўлюку Трусу: [Верш] // Звязда. 3 вер.; Сав. Бел. 3 вер.; Восень: [Верш] // Сав. Бел. 8 снеж.; Я веру: [Верш] // Чырв. змена. 7 крас.

1930. «Пракрычалі пеўні ў ночы...»: [Верш] // Вясна. № 4; Заяц: [Верш] // Паляўнічы Бел. № 1; «Калі растрачаны пачуцці...»: [Верш] // Там жа. № 2; [Рэц. на кн.: Барбюс А. Розныя факты. Мн., 1929] // Полымя. № 3 / Пад псеўд. В. Армак. Сааўт. А. Мардвілка; Янку Купалу: [Верш] // Там жа. № 5—6; Калгасная песня: [Верш] // Калгаснік Бел. 10 вер.; «Гукі мацераў і радыё...»: [Верш] // Сав. Бел. 5 студз.; Парогі паміраюць: [Урывак з паэмы] // Там жа. 12 студз.; Хроніка Белдзяржкіно кульгае // Там жа. 17 студз. / Сааўт. Ч. Барысевіч; Чуеце голас антэн...: [Верш] // Там жа. 21 студз.; «Там дзесьці ў цемры туманных вякоў...»: [Верш] // Там жа. 28 студз.

1931. «Шануй, мой голуб, маладосць...»: [Верш] // Маладняк. № 2; «Страшныя сны навеяла гісторыя...»; «Я помню, яблыні цвілі...»: [Вершы] // Там жа. № 5; «Сінімі шляхамі на ружовы шлях»: [Верш] // Полымя. № 3; Леніну: [Верш] // Чырв. Бел. № 1; Адтуль, дзе палыхаюць домны: [Верш] // Там жа. № 3; «Горад грыміць і грыміць»; «Стаю прад Пушкіным адзін...»: [Вершы] // Там жа. № 11—12.

1932. Ля кастра чалавечага ўсходу падзей: [Верш] // Беларусь калгасная. № 8; Новыя вершы: Лірычны цыкл // Маладняк. № 1; Мой дзень пачынаецца на фабрыцы: [Верш] // Там жа. № 4; Расплачваецца за маладосць: [Верш] // Чырв. Бел. № 14; Мой сябра Мікола Капусцін: [Верш] // ЛіМ. 15 чэрв.; Ліст паэту Петрусю Броўку: [Верш] // Там жа. 10 ліп.; Дарогаю ў штаб: Максіму Горкаму: [Верш] // Сав. Бел. 25 вер.

1933. Мая каханая — рэдактар газеты: [Верш] // Заклік. № 2; Пісьменнікі і крытыка ў 1933 годзе //

ЛіМ. 28 студз.; Адна партыя ў валейбол: [Верш]; Пра паэзію // Там жа. 26 чэрв.; На варце; Камісар; Пачастунак: [Вершы] // Там жа. 13 жн.

1934. Першы снег: [Верш] // Іскры Ільіча. № 12 / Сааўт. Т. Кляшторны, А. Дудар; Майскім маршам: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 9; Віцеб. пралетарый. 2 кастр.; Калгаснік Бел. 1 мая; Жыццё за нас: [Верш] // Работніца і калгасніца Бел. № 4; Героі краіны Саветаў: [Верш] // Там жа. № 9; Слова беларускай савецкай рэспублікі: [Верш] // ЛіМ. 31 студз.; Мы ўключаем сваю маладосць: [Верш] // Там жа. 6 сак.; Маладыя сэрцам: На алімпіядзе самадзейнага мастацтва // Там жа. 18 крас.; Жыццё ў цвеце: [Верш] // Там жа. 13 жн.; Голас паэта: [Верш] // Там жа. 18 жн.; Пілот: [Верш] // Там жа. 25 жн.; Памяці тав. Кірава: [Верш] // Там жа. 30 снеж.; «Б'ецца мора аб бераг круты...»; «Ляжу і слухаю ўночы...»; «Было кругом, як у прыгожай байцы...»: (Вершы з цыкла «Пальмы даліны») // Там жа. 31 снеж.; За край камуны: [Верш] // Піянер Бел. 26 лют.; Насустрач ветру: (Урывак з новай паэмы) // Чырв. змена. 5 студз.; Маладая кроў рэспублікі: [Верш] // Там жа. 1 сак.; На варце: [Верш] // Там жа. 23 сак.; Мы дзён шчаслівых кавалі: [Верш] // Там жа. 13 крас. / Сааўт. Т. Хадкевіч.

1935. Байка пра Мішу і Зайку: [Верш] // Іскры Ільіча. № 1 / Сааўт. Т. Кляшторны, А. Дудар; На дарозе: [Верш] // ЛіМ. 16 вер.; Песня перамог: [Верш] // Піянер Бел. 6 лют. / Сааўт. Т. Кляшторны.

1958. Ля кастра чалавечага ўсходу надзей...; [Верш] // ЛіМ. 26 лют.

1961. «Белае зімняе поле...»; Леніну; Першы дзень на запалкавай фабрыцы: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 2.

1969. Леніну: [Верш] // Жыве між нас геній. Мн.

1970. Леніну: [Верш] // З Леніным заўсёды Беларусь. Мн.

1.4.

Новікаў-Прыбой А. Па-цёмнаму: Апавяданні / З рус. Мн., 1931.

1932. Эмі Сяо. Нанкін Род: [Верш] / З кіт. // Маладняк. № 4; Чырвонаарм. праўда. 26 ліп.

1933. Эмі Сяо. Памяці Кантонскай камуны: [Верш] / З кіт. // ЛіМ. 22 лют.; Бранеўскі В. На смерць таварыша: [Верш] / З пол. // Там жа. 2 чэрв. / Пер. пад крыпт. С.Ш. і В. М. Сааўт. пер. С. Шушкевіч.

1934. Тычына П. Песня Чырвонай Арміі: [Верш] / З укр. // Полымя рэвалюцыі. № 9; Ціханаў М. Вясна ў Дэнау, або начное ворыва трактарамі «Вілліс»: [Верш] / З рус. // Звязда. 15 жн. Грачыл Х. Маё дзяцінства: [Верш] / З арм. // Там жа. 1 вер.; Гідаш А. Калоніі крычаць: Два ўрыўкі: [Вершы] / З венг. // ЛіМ. 6 сак.; Сулейман з Ашуга Сталі [Стальскі С.] «Праз гор, цяснін бяскрайніх шыр...»: [Верш] / З лезг. // Там жа. 31 жн.

1935. Дудзін М. Мы адыходзім; Краеў С. Песня пра вінтоўку: [Вершы] / З рус. // Атака. Мн. Альм. 1; Галодны М. Навальніца; Я пра цябе: [Вершы] / З рус. // Полымя рэвалюцыі. № 11.

1936. Пушкін А. Помнік: [Верш] / З рус. // ЛіМ. 6 студз.; Бедны Д. Чырвонаму байцу: [Верш] / З рус. // Там жа. 27 мая; Ягож. Савецкі вартавы: [Верш] / З рус. // Там жа. 1 жн.

1.5.

На рускую мову. Слышишь, Беларусь...; «Хрипло гудок просвистел...»; «Думы с тенями, а с думами тени...»; «Зеленый месяц над рекой...»; «Белое зимнее поле...»: [Вершы] / Пер. Л. Лавров // Сборник белорусской поэзии. М.; Л., 1930.

На ўкраінскую мову. Чуеш, Білорусь?: [Верш] / Пер. С. Голованівський // Гарт. 1928. № 12; Біле зимове поле: [Верш] / Пер. Т. М. // Молодняк. 1928. № 2; Знову холод і вечір, і синя пітьма...: [Верш] / Пер. М. Хмарка // Там жа. 1928. № 9; Над рікою / Пер. Т. Масенко; Знову холод і вечір / Пер. М. Хмарка: [Вершы] // Нова Білорусь. К., 1929; Леніну: [Верш] / Пер. Ю. Петренко // Білоруська радянська поэзія. 1971. Т. 1.

На яўрэйскую мову. Тыдзень: [Верш] / Пер. Ліўшыц // Паэзія БелАПП. Мн., 1931.

2.3.

На беларускай мове. Баркоўскі С. Валеры Маракоў // Маракоў В. Лірыка. Мн., 1959; Ягож. Лірыка Валерыя Маракова // ЛіМ. 1958. 26 лют.; Вясновы А. Бываюць і такія крытыкі // Сав. Бел. 1929. 31 сак.; Гарэцкі М. «Маладняк» за пяць гадоў. 1923—28 // Максім Гарэцкі. Мн., 1984. С. 282—284; Гілевіч Н. Акрыленая рэвалюцыяй. Мн., 1962. С. 115—117, 122; Звонак А. «Запісаны ў полк Акцябра...» // Звонак А. Неспакойныя сэрцы. Мн., 1973. С. 145—150; Кучар А. Валеры Маракоў: Літ. партрэт // Маладняк. 1929. № 7; Левін С. Нататкі пра творчасць Валерыя Маракова // ЛіМ. 1933. 26 ліст.; Лужанін М. Думкі пра паэзію Валерыя Маракова // Узвышша. 1930. № 8; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Сядура У. Камсамол у беларускай паэзіі // Маладняк. 1932. № 1; Хатулёў П. Супраць безадказных адносін да класікі // ЛіМ. 1936. 26 крас.; Шушкевіч С. З Велікаморскай вуліцы // Шушкевіч С. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1978. Т. 2; Ягож. Залаты пакос паэта // ЛіМ. 1979. 23 сак.; Ягож. На залатым пакосе // Там жа. 1984. 30 сак.;

На рускай мове. Празднование 40-летнего юбилея М. Горького в Минске // Рабочий. 1932. 28 сент.; Творческая работа // Рабочий. 1929. 22 окт.

2.4.

На беларускай мове. Хведаровіч М. Сябру: [Верш] // Хведаровіч М. Пасля навальніцы. Мн., 1965.

Г. І. Рэут.

МАРАХОЎСКІ ІЛЬЯ

Марахоўскі Ілья (свецкае імя Ірахім Стафанавіч, каля 1576, Львоў — 1631, Уладзімір Валынскі), пісьменнік-палеміст, палітычны і царкоўны дзеяч, уніяцкі ўладзіміра-брэсцкі мітрапаліт.

З сям'і львоўскага шляхціца герба Корчак, жанатага з гараджанкай. У канцы 1595, магчыма, з ганаровай світай уніяцкіх епіскапаў, уладзіміра-брэсцкага Іпація Пацея і луцкага Кірылы Тарлецкага, быў накіраваны ў Рым на вучобу ў папскі калегіум, куды быў залічаны ў 1596 паводле хадайніцтва кардынала Севярына. У Рыме займаўся на працягу 7 гадоў, вывучаў тэалогію і філасофію. У красавіку 1603 прыбыў у Польшчу з рэкамендацыйнымі лістамі да епіскапа Бернарда Мацяеўскага і папскага нунцыя Ранганега. Дзякуючы ім пасля прыезду ў Кракаў ён прадстаўлены каралю Жыгімонту III Вазе і мітрапаліту Іпацію Пацею. Відаць, тады ж Ілья Марахоўскі працаваў у канцылярыі мітрапа-

літа, выконваў функцыі сакратара. У 1608—09 па даручэнні Іпація ён займаўся вырашэннем спрэчкі паміж Іосіфам Руцкім і архімандрытам віленскага манастыра св. Троіцы Самуілам Сянчылам, які не прымаў царкоўнай уніі 1596. Звязаўшы свой лёс з мітрапалітам, Ілья Марахоўскі ў 1612 стаў членам уніяцкага ордэна св. Базыля. Мяркуюць, што ён у сааўтарстве з Іпаціем напісаў кнігі «Гармонія» і «Рэляцыя», выдадзеныя ў Вільні ў 1608 і 1609. У 1609 кароль прызначыў Ілью Марахоўскага сваім сакратаром на Вялікае княства Літоўскае, а потым зрабіў яго пераемнікам мітрапаліта на Уладзіміра-Брэсцкім епіскапстве. Пасля смерці Іпація (1613) кароль выдаў Ільі Марахоўскаму свой прывілей на гэтае епіскапства. Валынская шляхта, незадаволеная дзеяннямі епіскапа, на сейме 1616 дамагалася ад караля яго замены. Ілья Марахоўскі, калі быў епіскапам, прымаў актыўны ўдзел ў з'ездзе уніятаў у Навагрудку (1624), дзе стаяла пытанне аб пашырэнні царкоўнай уніі за кошт далучэння да яе праваслаўных, а таксама ў рабоце Кобрынскага сінода 1626, на якім абяцаў выдаць 2000 злотых на ўтварэнне уніяцкай семінарыі. Разам з езуіцкім епіскапам Ераміяй Пачапоўскім напісаў рэляцыю каралю і папскаму нунцыю ў Варшаву.

Як абаронца уніі выступіў супраць палемічна-публіцыстычнага твора Мялеція Сматрыцкага «Трэнас». У кнізе «Парэгорыя...», выдадзенай у Вільні на польскай мове ў 1612, асудзіў ідэалогію брацкага руху. У 1622 выдаў у Замосці (таксама на польскай мове) «Размову аб пачатку разарвання грэчаскай царквы з рымскім касцёлам і хто быў таго прычынаю...» А праз два гады ў тым жа Замосці надрукаваў пераклад з грэчаскай мовы «Жыцця св. Ігнація, патрыярха царгародскага». Яму ж прыпісваецца «Рэляцыя аб жорсткім забойстве Іасафата Кунцэвіча, полацкага архіепіскапа» (Замосце, 1624). Пакінуў завяшчанне, паводле якога кіраванне епархіяй даручалася Іосіфу Руцкаму.

А. Ф. Коршунаў.

Бібліяграфія

1.2

Paregoria, albo Utulenie uszczypliwego łamentu mniemanej cerkwie wschodniej zmyslonego Theophila Ortologa. Wilno, 1612.

Dyskurs o początku rozerwania cerkwi greckiej od kościoła rzymskiego. Wilno, 1622.

De nece Rev. Patri J. Kuncewicz, archiepiscopo Polocensi, Vitebsci, atrociter illata. Zamosci, [1624].

Relacya o zamordowaniu Jozaf(ata) Kuncewicza archiepiskopa połockiego... Zamość, 1624.

2.3.

На беларускай мове. Г і с т о р ы я беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Мн., 1968. Т. 1. С. 320, 324.

На рускай мове. И с т о р и я белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 173, 175, 187.

Т. М. Махнач.

МАРАШЭЎСКІ КАЯТАН

Марашэўскі Каятан (гады нараджэння і смерці невядомыя), беларускі і польскі драматург 2-й паловы 18 ст., выкладчык рыторыкі і паэтыкі Забельскай дамініканскай калегіі (цяпер в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.). Біяграфічных звестак не захавалася.

К. Марашэўскі — аўтар беларуска-польскай «Камедыі», пастаўленай у 1787 у Забельскім школьным тэатры. Гэта тыповая драма-маралітэ. Напісана яна ў адпаведнасці з эстэтыкай класіцызму, у ёй праўдзіва паказваецца сялянскае жыццё, праводзіцца асветніцкая думка, што шчасце чалавека залежыць не ад боскага наканавання, а ад уласных учынкаў. Нягледзячы на сваю рытарычнасць і зададзенасць, «Камедыя» мае несумненныя мастацкія вартасці, якія ставяць яе ля вытокаў новай беларускай літаратуры. Напісана яна жывой гутарковай мовай. У творы адчуваецца моцны ўплыў барочных інтэрмедый, якія ўпершыню ў беларускай літаратуры 18 ст. сінтэзуюцца ў камедыю. Ідэі Асветніцтва знайшлі адлюстраванне і ў польскамоўнай трагедыі К. Марашэўскага «Свабода ў няволі», галоўны герой якой, рымскі палкаводзец Велізарый, вышэй асабістых інтарэсаў ставіць інтарэсы радзімы. Абодва творы захаваліся ў рукапісным зборніку, які зберагаецца ў бібліятэцы Літоўскай АН. Упершыню поўны тэкст «Камедыі» апублікаваў (у адпаведнасці з арыгіналам — лацінкай) акадэмік У. Ператц (1911). У наш час перадаецца кірыліцай. Сюжэт «Камедыі» выкарыстоўваўся беларускімі драматургамі (Ф. Аляхновіч і інш.). Яна ставілася ў Мінску (1991).

А. Ф. Коршунаў.

Бібліяграфія

1.3.

1911. Камэдыа // Известия ОРЯС. Т. 16. № 3.

1920. «Камэдыя» // Беларусь. 20 мая.

1923. З «Камедыі» Марашэўскага: [Урывак] // Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. Вільня.

1925. Камедыя // Выпісы з беларускай літаратуры. М; Л. Ч. 1.
1959. Камедыя // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн.
1975. Камедыя // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн. Т. 1.
1978. Камедыя // Беларуская дакастрычніцкая драматургія. Мн.
1979. З «Камедыі» К. Марашэўскага: [Урывак] // Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах. Мн.
2.3.
На беларускай мове. Аляхновіч М., Тамашэвіч Т. Фразеалагізмы ў камедыі К. Марашэўскага // Слова, фразеалагізм і кантэкст. Мн., 1979; Ахрыменка П. Развіццё драматургіі: Школьныя драмы, інтэрмедыі, камедыі і батлейка // Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968. С. 153—155; Гарэцкі М. Літаратурныя творы ў XVII—XVIII веку // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. 4 выд. Мн., 1926. С. 98—99; Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Мн., 1983. Т. 1. С. 170—176; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 427—429; Зарэмба Т. Ці камедыя «Камедыя», альбо З радаводнай нацыянальнага характару: Да 200-годдзя «Камедыі» Каятана Марашэўскага // Мастацтва Бел. 1987. № 12; Карскі Я. // Беларусь. 1920. 12 мая; Колас Г. «Чы гараст, сподару?» // ЛіМ. 1988. 1 студз.; Майхровіч С. Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV—XVIII ст. Мн., 1980. С. 218—223; Мальдзіс А. Вакол Парнаса Забельскай калегіі // Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974; Яго ж. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. С. 329—335; Семяновіч А. Аб вытоках беларускай драматургіі // Беларуская літаратура: Даследаванні і публікацыі. Мн., 1958. Вып. 1; Яго ж. «Камедыя» К. Марашэўскага // Семяновіч А. Гісторыя беларускай драматургіі: XIX — пачатак XX ст. Мн., 1985; Усікаў Я. Беларуская камедыя. Мн., 1979. С. 72—110; Яго ж. Беларуская камедыя: (Ля вытокаў жанру). Мн., 1964. С. 129—130, 150—195; Ціванова Г. Дзеяслоўныя формы ў творах беларускай драматургіі XVIII ст. // Бел. мова. 1983. Вып. 11.
На польскай мове. K. S.: Zaczątek białoruskiego teatru // Słowo. 1935. Nr 12; Sołoduch A. Bibliografia // Prz. Wileński. 1923. Nr 7.
На рускай мове. Барышев Г. Театральная культура Белоруссии эпохи феодализма: (Историко-хронологич. очерк) // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1983. Вып. 2; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 309—312; Карский Е. Белорусы. Пг., 1921. Т. 3. Вып. 2. С. 228—231; Конон В. От Ренессанса к классицизму. Мн., 1978. С. 145—146; Перетц В. К истории польского и русского народного театра // Известия ОРЯС. 1911. Т. 16. № 3.
2.4.
На беларускай мове. Аляхновіч Ф. Птушка шчасця: П'еса ў 3 акт. Вільня, 1922. *Т. М. Махнач.*

МАРДВІЛКА АРКАДЗЬ

Мардвілка Аркадзь Пятровіч [псеўд. В. Армак (з В. Мараковым), В. Армар (з В. Мараковым), А. Вясковы, А. Лясны, Андрэй Лясны, Аркадзь Лясны; крыпт. А. Л., А. М., А. М-ка; 24.8.1905, в. Языль Бабруйскага пав., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл.— 27.10.1986, Ташкент, пахаваны на Дамбрабадскіх могілках № 2], празаік, крытык, перакладчык.

Бацька А. Мардвілкі быў народным настаўнікам, а потым святаром. У першую сусветную вайну лёс закінуў сям'ю ў г. Уладзімір, дзе ў студзені 1916 А. Мардвілка паступіў у гімназію. Вярнуўшыся на Беларусь, працягваў вучобу ў слуцкай гімназіі. Філалагічныя схільнасці і жаданне займацца літаратурнай справай прывялі А. Мардвілку ў Мінск, дзе ён стаў сябрам «Маладняка», потым членам БелАПП. Адукацыю набыў спачатку на Фанетычных курсах новых моў у Ленінградзе (1926—27), на педфаку БДУ (1927—29) і на Вышэйшых курсах новых моў пры 2-м Маскоўскім дзяржаўным універсітэце (1929—30). З 1931 выкладаў англійскую мову ў Беларускім аўтадарожным інстытуце. У 1933 незаконна рэпрэсіраваны і асуджаны да трох год пазбаўлення волі. У той перыяд (1933—35) працаваў перакладчыкам англійскай тэхнічнай літаратуры ў Тэхнічным аддзеле Масквоволгабуда. Рэабілітаваны ў 1988. З 1935 жыў у Ташкенце. Быў выкладчыкам англійскай мовы ва Усесаюзным НДІ бавоўнаводства, потым ва Узбекскім універсітэце (Самарканд, 1939—41). З 1942 да 1946 выкладчык Ташкенцкага сельскагаспадарчага інстытута.

У 1944—45 служыў у Савецкай Арміі. У 1946—48 выкладаў англійскую мову ў АН Узбекскай ССР. Экстэрнам скончыў у Ташкенце Сярэднеазіяцкі універсітэт (1950, аддзяленне раманагерманскай філалогіі). Працаваў рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве Узбекскай ССР (1950—51), на кафедры рускага мовазнаўства філфака Сярэднеазіяцкага універсітэта (1951—57), а пасля абароны ў 1956 кандыдацкай дысертацыі — у Ташкенцкім пединстытуце. Калі ў 1960 з гэтага Інстытута вылучыўся і стаў самастойным Рэспубліканскі інстытут рускай мовы і літаратуры, А. Мардвілка да выхаду на пенсію (1985) працаваў там дацэнтам. З Ташкента часта прыязджаў у Мінск. Паралельна з педагагічнай работай займаўся навукова-даследчымі пошукамі ў галіне выкладання і вывучэння англійскай мовы. Распрацаваў параўнальна-этымалагічны метад запамінання замежных слоў, напісаў шэраг навуковых прац па пытаннях методыкі выкладання і вывучэння англійскай мовы. Некаторыя яго працы апублікаваны ў 1938 у часопісе «Иностранный язык в школе». Займаўся таксама рускай філалогіяй. Выдадзены яго «Нарысы рускай фразеалогіі» (1964), кніга «Як хутчэй засвоіць значэнне англійскіх слоў» (1968). Перакладаў на рускую мову узбекскія народныя казкі.

У беларускім рэспубліканскім друку першы верш А. Мардвілкі «Малацьба» надрукаваны ў 1924. У далейшым выступаў і як празаік, і як крытык. Друкаваўся ў часопісах «Маладняк», «Чырвоны сейбіт», газеце «Савецкая Беларусь» і інш. Вядомы ён як перакладчык з англійскай, рускай і узбекскай моў. Крытычным працам А. Мардвілкі ўласцівы эстэтычны падыход і філалагічныя крытэрыі. Актыўная дзейнасць А. Мардвілкі на ніве беларускай літаратуры працягвалася да 1932, калі ён атрымаў разгромны водгук Л. Бэндэ на празаічны рукапіс «Маланчына смерць» (пад псеўд. Аркадзь Лясны, БДАМЛіМ). Пасля вымушанага перапынку ў творчай рабоце А. Мардвілка да беларусазнаўства ўжо не вярнуўся, а з 1938 займаўся пераважна англійскай і рускай лінгвістыкай.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

Вялікае нараджэнне: Эскізы. Мн., 1932 / Пад псеўд. Аркадзь Лясны. Рэц.: Куніцкі С. Мяшчанскае аплёўванне сацыялістычнага будаўніцтва // ЛіМ. 1932. 6 сак.

Глагольно-именные описательные выражения в современном русском литературном языке: Автореф. дисс... канд. филол. н. М., 1956.

Очерки по русской фразеологии. М., 1964.

Как скорее усвоить значение английских слов. М., 1968.

1.3.

1924. Малацьба: [Верш] // Бел. вёска. 15 кастр. / Пад крыпт. А. Л.

1925. Вёска ў радасці: [Верш] // Сав. Бел. 22 ліст. / Пад псеўд. А. Вясковы; Памылка: Апавяданне // Там жа. 15 снеж.; У зімовы вечар: Малюнак з натуры // Там жа. 22 снеж. / Пад псеўд. А. Лясны.

1926. Бяздонне: Апавяданне // Асвета. № 1 / Пад крыпт. А. М.; Яна: Абразок // Маладняк. № 2 / Пад псеўд. А. Лясны; [Рэц. на кн.: Чорны К. Па дарозе. Мн., 1926] // Там жа. № 3 / Пад псеўд. Лясны; [Рэц. на кн.: Гарэцкі М. Ціхія песні. Мн., 1926] // Там жа. № 5 / Пад псеўд. А. Лясны; Вечар у горадзе: Урывак з апавядання // Чырв. сейбіт. № 4 / Пад псеўд. А. Лясны; Новы шлях: Апавяданне // Сав. Бел. 15 студз. / Пад псеўд. А. Лясны; Падарожнае: Малюнак з натуры // Там жа. 31 студз. / Пад псеўд. А. Лясны.

1927. [Рэц. на кн.: Каваль В. Як вясну гукалі. Мн., 1927] // Чырв. сейбіт. № 16. / Пад крыпт. А. М-ка; [Рэц. на кн.: Маракоў В. На залатым пакосе. Мн., 1927] // Там жа. № 20—21 / Пад крыпт. А. М.; Пад шэрым небам: [Апавяданне] // Сав. Бел. 1927. 20, 21 крас. / Пад псеўд. А. Лясны; Дзесяты Кастрычнік: [Верш] // Там жа. 18 вер. / Пад псеўд. А. Лясны; Станіслаў Пшыбышэўскі // Там жа. 18 снеж. / Пад крыпт. А. Л.

1928. [Рэц. на: Узвышша. 1927. № 3] // Арш. малад. № 7 / Пад псеўд. А. Лясны; Крык працы: [Рэц. на кн.: Нікановіч М. Крык працы. Мн., 1928] // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». № 11 / Пад псеўд. А. Лясны; Дзве ночы: Абразок // Там жа. № 12 / Пад псеўд. А. Лясны; [Рэц. на кн.: Кулік І. Антологія американськоі поезіі 1855—1925 гг. Харків, 1928] // Маладняк. № 8 / Пад псеўд. В. Армар. Сааўт. В. Маракоў; [Рэц. на кн.: Маракоў В. На залатым пакосе. Мн., 1927] // Чырв. сейбіт. № 1 / Пад крыпт. А. М.; [Рэц. на кн.: Маракоў В. На залатым пакосе. Мн., 1927] // Звязда. 15 студз. / Пад псеўд. А. Лясны; Максім Горкі // Камуніст. 1 крас. / Пад крыпт. А. Л. Аўт. спрэчнае; «Женитьба Белугина» // Рабочий. 6 июня / Пад крыпт. А. М.; Раніца // Сав. Бел. 22 крас. / Пад псеўд. А. Лясны; Нашы рыбныя багацці // Там жа. 25 крас. / Пад псеўд. А. Лясны; Культавая беларусізацыя // Там жа. 1 чэрв. / Пад псеўд. А. Лясны; Пад паўночнымі ўзорамі // Там жа. 16 чэрв. / Пад псеўд. А. Лясны; Жанчына ў абароне краіны // Там жа. 20 ліп. / Пад псеўд. А. Лясны; Сельсавет у руках заможнікаў: [Нарыс] // Там жа. 14 ліст. / Пад псеўд. А. Лясны.

1929. [Рэц. на кн.: Молчанов А. Пылающая земля. М., 1929] // Маладняк. № 9 / Пад псеўд. А. Лясны; Шляхі лясной гаспадаркі Магілёўшчыны // Сав. Бел. 20 студз. / Пад псеўд. А. Лясны; Пад шэрым небам: [Апавяданне] // Там жа. 20, 21 крас. / Пад псеўд. А. Лясны; Думы старога Арцёма: [Нарыс] // Там жа. 7 ліп. / Пад псеўд. Аркадзь Лясны.

1930. [Рэц. на кн.: Бядуля З. Язэп Крушынскі. Мн., 1929] // Полымя. № 1 / Пад псеўд. Аркадзь Лясны; [Рэц. на кн.: Купала Я. Сборник стихов. М.; Л., 1930; Скрыган Я. Затока ў бурах. Мн., 1929] // Полымя. № 2 / Пад псеўд. А. Лясны; [Рэц. на: «Маладняк». 1930. № 1] / Пад псеўд. А. Лясны; [Рэц. на кн.: Барбюс А. Розныя факты. Мн., 1929] / Пад псеўд. В. Армак. Сааўт. В. Маракоў // Там жа. № 3; [Рэц. на: «Узвышша». 1930. № 1] // Там жа. № 4 / Пад псеўд. Аркадзь Лясны; [Рэц. на кн.: Гладкоў Т. Галаваногі чалавек. Мн., 1930; Шпілеўскі І. Браття. Мн. 1930] // Там жа. № 5—6 / Пад псеўд. А. Лясны; [Рэц. на кн.: Лыньковў М. Андрэй Лятун. Мн., 1930; Фусао Хаясі. Кніга з малюнкамі, у якой няма малюнкаў; Сэйкіці Фудзіморы. Уцякач. Мн., 1930] / Пад псеўд. А. Лясны; Шлях пралетарскай перамогі: Нарыс // Там жа. № 7 / Пад псеўд. Аркадзь Лясны; Беларусь індустрыяльная: (Эскізы) // Там жа. № 8 / Пад псеўд. Аркадзь Лясны; [Рэц. на кн.: Голд М. Праклятый агітатар. Мн., 1930] // Там жа. № 11—12 / Пад псеўд. А. Лясны; Падпал: Апавяданне // Чырв. змена. 27 студз. / Пад псеўд. Лясны.

1932. Жанчына на фабрычнай трубе: Апавяданне // Работніца і калгасніца Бел. № 25 / Пад псеўд. А. Лясны.

1938. О родственных элементах английской и русской лексики // Иностранный язык в школе. № 5—6.

1940. Об овладении техникой чтения на английском языке // Иностранный язык в школе. № 6.

1941. Сравнительно-этимологический метод изучения лексики иностранных языков // Труды Узбекского гос. ун-та: Новая серия (Самарканд). № 24.

1943. Лексические сопоставления как средство се-

мантизации иностранных слов // Иностранные языки в школе. № 2.

1953. Правила спряжения русских глаголов в настоящем и простом будущем времени // Труды Среднеазиатского гос. ун-та им. В. И. Ленина (Ташкент). Вып. 49.

1961. Глагольно-именные описательные выражения как особый тип устойчивых словосочетаний // Русский язык в школе. № 4.

1964. Основные черты лексико-семантической структуры глагольно-именных описательных выражений // Уч. зап. Ташкентского гос. пединститута им. Низами. Т. 45. Вып. 3.

1976. Глагол // Современный русский язык: Морфология. Ташкент.

1.4.

Лондан Д. Незвычайны адрывак: [Апавяданне] З англ. Мн., 1926.

Тагор Р. Садоўнік: Апавяданне-імпрэсія / З англ. Мн., 1927.

Ляшко М. Доменная печ: Раман / З рус. Мн., 1931.

1926. Лондан Д. Незвычайны адрывак: Апавяданне / З англ. // Маладняк. № 3; Ягo ж. Чайнэго: Апавяданне / З англ. // Там жа. № 4 / Пер. пад крыпт. А. М.; Уэлс Г. Зорка: Апавяданне / З англ. // Там жа. № 5 / Пер. пад крыпт. А. М.; Лангфела Г. Песня аб Гайаваце: «Сватанне Гайаваты» / З англ. // Там жа. № 7—8 / Пер. пад псеўд. А. Лясны; Тагор Р. Садоўнік: Апавяданне-імпрэсія / З англ. // Там жа. № 10.

1927. Лангфела Г. З песні аб Гайаваце: Голад / З англ. // Маладняк. № 2 / Пер. пад крыпт. А. М.; Уітмен У. Песня пра вольны шлях: [Верш] / З англ. // Там жа. № 6 / Пер. пад крыпт. А. М.; Тагор Р. Гітанджалі: Урывак з кнігі / З англ. // Там жа. № 7—8; Вільямс А.-Р. Уся ўлада Саветам: Нарыс-рэпартаж / З англ. // Там жа. № 10 / Пер. пад крыпт. А. М.; Уітмен У. Песня пра радасць: [Верш] / З англ. // Росквіт. № 1 / Пад крыпт. А. М.; Тагор Р. Абразкі / З англ. // Чырв. сейбіт. № 10—11 / Пер. пад крыпт. А. Л.; Лангфела Г. Дзень прайшоў: [Верш]; Тагор Р. Чаму пагасла лямпа? / З англ. // Там жа. № 15.

1928. Гейнэ Г. Ларэляй: [Верш] / З ням. // Арш. малад. № 7; Фалькоўскі Э. Дзеці вуглякопаў: Апавяданне / З англ. // Бел. піянер. № 24; Панів А. Дняпрабуд: [Верш] / З укр. // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». № 13 / Пер. пад псеўд. А. Лясны; Тычына П. Закучаравіліся хмары: [Верш] / З укр. // Маладняк. № 8 / Пер. пад псеўд. А. Лясны; Уітмен У. Песня пра радасць: [Верш] / З англ. // Росквіт. № 1 / Пер. пад крыпт. А. М.

1931. Голд М. 120 мільёнаў: [Верш] / З англ. // Полымя. № 4; Ягo ж. Дзівосныя хаўтуры ў Брэддоку...: [Верш] / З англ. // Там жа. № 10.

1932. Крудэн Д. Людзі патрэбны: Апавяданне / З англ. // Чырв. Бел. № 11—12; Гідаш А. Язмінавая вуліца пяе: [Верш] / З венг. // ЛіМ. 20 жн. / Пер. пад крыпт. А. М.; Голд М. Трэцяя ступень: [Верш] / З англ. // Там жа. 24 кастр.; Лангфела Г. Сон нявольніка: [Верш] / З англ. // Там жа. 28 снеж.

1967. Кахар А. Светлыя вяршыні; Назір Х. Чаму адклалі вяселле?: [Апавяданне] / З узб. // Полымя. № 5.

2.3.

На беларускай мове. Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць. Мн., 1971. С. 85—87; Кенька М. Майстэрства Аркадзя Куляшова-перакладчыка. Мн., 1983. С. 91; Шушкевіч С. Аркадзю Мардвілку — 80 // ЛіМ. 1985. 23 жн.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 66, воп. 1, спр. 1433.

У. М. Ларчанка.

МАРКАВА НАЛЯ

Маркава Наля [Анастасія Паўлаўна (у замужастве Хмара); н. 25.12.1906, в. Хатоўня Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл.], паэтэса.

Бацькі займаліся земляробствам. Выхоўвалася ў рэлігійнай сям'і дзеда, ад якога змалку чула шмат апавяданняў пра розныя страхі і чарадзействы. Пачатковую школу скончыла ў Прапойску (цяпер Слаўгарад). Жыла там у цёткі. Потым вярнулася ў Хатоўню і вучылася ў школе 2-й ступені, неўзабаве пераўтворануюў сямігодку. Працягвала вучобу ў Рагачоўскім педтэхнікуме, у 1924 перавялася на 2-гі курс Магілёўскага педтэхнікума, які скончыла ў 1927. Працавала загадчыцай цэнтральнага піянерскага клуба пры Магілёўскім абкоме камсамола, выхавацелем у Магілёўскай дзіцячай камуне, а пасля пераезду ў Ленінград да мужа (1929) — выхавацелем дзіцячага сада пры заводзе «Электрык». У 1934 скончыла Ленінградскі пединстытут. Выкладала рускую мову і

літаратуру ў Ваенна-артылерыйскім тэхнічным вучылішчы, загадвала там жа агульнаадукацыйным цыклам. Напярэдадні вайны працавала дырэктарам інтэрната Куйбышаўскага р-на Ленінграда. У гады Вялікай Айчыннай вайны разам з 200 выхаванцамі інтэрната эвакуіравана ў Чалябінскую вобл. Пасля вяртання адтуль у 1944 працавала дырэктарам школ № 201, 84 і 38-й школы працоўнай моладзі Ленінграда. З 1952 настаўніца рускай мовы і літаратуры ў школе працоўнай моладзі № 35 Петраградскага р-на. З 1962 — на пенсіі. Узнагароджана медалямі.

Паводле анкеты «Маладняка», Н. Маркава пачала пісаць вершы ў 1921 пад уплывам захаплення містычнай творчасцю С. Надсана, якая знаходзіла водклік у душы дзяўчыны, выхаванай у рэлігійнай атмасферы. Уступленне ў камсамол, знаёмства з творчасцю Д. Беднага, М. Горкага, аб'яднанне маладых літаратурных сіл Беларусі ў арганізацыю «Маладняк» спрыялі напаўненню паэзіі Н. Маркавай грамадзянскімі і патрыятычнымі матывамі. У 1925 яна ўступіла ў Магілёўскую філію «Маладняка», удзельнічала ў працы І-га з'езда «Маладняка». Першы надрукаваны верш Н. Маркавай «У вёску» з'явіўся ў 1925 у газеце «Магілёўскі селянін». Яе лірыку напаўняла пачуццё радасці і захаплення, выкліканае рэвалюцыйным абнаўленнем жыцця ў краіне, што было ўласціва ў цэлым маладнякоўскай паэзіі. Яе творчасць сціплай, але арганічнай старонкай увайшла ў паэтычны летапіс свайго часу, аддаючы пэўную даніну рыторыцы і дэкларацыям. Найбольш натуральна лірычны талент паэтэсы раскрыўся ў вершах інтымнага плану, у якіх яна ідзе ад фальклору, ад асабістых уражанняў і ўзрушанасці пачуццяў. Адзін з найбольш дасканалых узораў яе інтымнай лірыкі верш «У сэрцы аганькі».

Жыве ў Санкт-Пецярбургу. *І. Э. Багдановіч.*

Бібліяграфія

1.3.

1925. У вёску: [Верш] // Маг. селянін. 29 ліст.; Да першага з'езда: [Верш] // Сав. Бел. 29 ліст.

1926. «Сінь васільковая...»: [Верш] // Маладняк. № 10; «Сіні зялёнай вясны...»: [Верш] // Чырв. сейбіт. № 5.

1927. У сугучнасці слоў...; Маяк; Адна; «Сінь васільковая...»: [Вершы] // Дняпроўскія ўсплескі. Магілёў; Ціха...: [Верш] // Полымя. № 8; «Усё новыя, новыя дні...»: [Верш] // Полымя. № 8; Аб кучаравай Беларусі: [Верш] // Маг. селянін. 5 мая; У сугучнасць песень: [Верш] // Там жа. 5 чэрв.; Памяці тав. Войкава: [Верш] // Там жа. 26 чэрв.; «Тут Дняпро,— там матулька Волга...»: [Верш] // Там жа. 14 жн.; «У беларусі, мілай Беларусі...»: [Верш] // Там жа. 21 жн.; На камсамольскіх манеўрах: [Верш] // Там жа. 18 вер.; Прыхадзі: [Верш] // Там жа. 29 вер.; Над прасторам балот: [Верш] // Чырв. змена. 30 студз.

1928. «Восенню мігаюць...»: [Верш] // Маладняк. № 1; «Ружавеюць маладосці дні...»: [Верш] // Там жа. № 5; У сэрцы аганькі...: [Верш] // Полымя. № 6; Маг. селянін. 5 лют.; «Сціхае дождж...»: [Верш] // Там жа. 4 ліст.

1829. Аб кучаравай Беларусі; Знікае снег; У сэрцы аганькі; Усё новыя дні; У грудзях не плач...; На камсамольскіх манеўрах: [Вершы] // Ранне. Магілёў.

1.4.

1927. С а с ю р а [У.]. Іду: [Верш] / З укр. // Дняпроўскія ўсплескі. Магілёў. *Т. М. Махнач.*

МАРКЕВІЧ ІВАН

Маркевіч Іван Мікалаевіч (15.6.1936, в. Восава Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.— 14.9.1981, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках), паэт.

З сялянскай сям'і. Пасля сканчэння сярэдняй школы (1954) працаваў у калгасе на радзіме, брыгадзірам жывёлагадоўлі ў саўгасе «Уша», старшынёй Ушанскага сельсавета. З 1964 супрацоўнічаў у раённай газеце «Сцяг Леніна» (Беразіно), з 1973 у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Завочна скончыў аддзяленне журналістыкі БДУ (1970). У 1978—81 метадыст Мінскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці.

У рэспубліканскім друку І. Маркевіч упершыню выступіў у 1961 (газета «Чырвоная змена», верш «Навальніца»). Вершы яго друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Маладосць», «Беларусь», «Работніца і сялянка», у рэспубліканскіх газетах. У 1973 выйшаў першы зборнік яго вершаў «Камандзіроўка». Другая кніга паэзіі «Васількі» (1984) выдадзена ўжо пасля смерці аўтара. Шчырыя радкі яго вершаў прысвечаны Радзіме, роднай зямлі, працавітым людзям, землякам, у лёс якіх уварвалася трагедыя 7 студзеня 1943, калі фашысты спалілі суседнюю в. Калюжыцы. Асноўны змест іх — смутак з прычыны ранняй страты маці, яе нялёгкі лёс удавы, урокі дзяцінства, юнацкі свет, пачуцці кахання. У вершах І. Маркевіча знайшлі адлюстраванне рэальныя падзеі, нярэдка ў лірычных персанажах пазнаюцца іх жыццёвыя прататыпы.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Камандзіроўка: Вершы. Мн., 1973. (Першая кніга паэта). Рэц.: Бусел В. След сосновой живицы // Сел. газ. 1974. 18 янв.; Вішнеўскі І. Ручайком праб'юся да зямнога // Беларусь. 1974. № 2; Яўсееў Р. Крок у краіну паэзіі // Вяч. Мінск. 1973. 8 жн.

Васількі: Вершы. Мн., 1984. Рэц.: Макарэвіч В. Родныя карані // ЛіМ. 1984. 14 снеж.

1.3.

1961. Навальніца: [Верш] // Чырв. змена. 17 вер.

1962. «Быць наперадзе...»; «Дні ідуць...»: [Вершы] // Мін. праўда. 25 мая; Табе я песню складаю: [Верш] // Чырв. змена. 30 вер.

1963. Камандзіроўка: [Верш] // Чырв. змена. 29 мая; Браты: [Верш] // Там жа. 25 ліп.; Бурштынны лівень: [Верш] // Там жа. 21 жн.

1964. Як ранак росы рассыпае; Летняя раніца: [Вершы] // Мін. праўда. 13 снеж.; Родны край: [Верш] // Чырв. змена. 2 лют.; 17 мая.

1965. Дома: [Верш] // Мін. праўда. 24 студз.; Камандзіроўка: [Верш] // Там жа. 16 чэрв.; Асколкі: [Верш] // Там жа. 7 вер.

1966. Начлег: [Верш] // Мін. праўда. 11 лют.; Рыбацкі касцёр: [Верш] // Там жа. 29 крас.

1967. Сэрца маці: [Верш] // Работніца і сялянка. № 6; Начлег: [Верш] // Сел. х-во Бел. № 5.

1968. Над Бярозай; У сценах Цытадэлі; Дрэва стагоддзя; Памяць — не проста памяць: [Вершы] // Беларусь. № 5.

1969. Родны край; «Каса пад страхой іржавее...»: [Вершы] // Мін. праўда. 16 жн.

1970. Партыі; Крэйсер «Аўрора»: [Вершы] // Беларусь. № 10; «Бусел пералётны па-над лугам...»; Камандзіроўка: [Вершы] // Маладосць. № 10; Партыі: [Верш] // Мін. праўда. 18 крас.; «Чэрпаю са дна людской крыніцы...»: [Верш] // Там жа. 29 крас.; Дзям'янава града: [Верш] // Там жа. 15 чэрв.

1971. Незабыўнае: [Верш] // Звязда. 19 ліст.; Сасна: [Верш] // Мін. праўда. 26 студз.

1972. Завочнікі: [Верш] // Беларусь. № 9; Партызанская зямлянка; Мой родны лес: [Вершы] // Звязда. 17 снеж.; Баравікі; Спіць жанчына; «Без прычыны не кукуй...»; Хірург: [Вершы] // ЛіМ. 9 чэрв.; Браты: [Верш] // Там жа. 8 вер.; Піянер Бел. 28 снеж.; Ясныя зоры: [Верш] // Мін. праўда. 5 ліст.

1973. «І мы гатовы з бураю змагацца...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 10 студз.; Над Дастоевым зерні... // ЛіМ. 16 сак.; Празорлівасць крытыка; «Крычыць...»; І сушыць, і варушыць: [Вершы] // Там жа. 28 вер.; Беларусі: [Верш] // Там жа. 16 ліст.; Слаўлю жыццё; Дарогі: [Вершы] // Мін. праўда. 4 лют.; Новыя вершы // Там жа. 25 жн.; Новыя вершы // Там жа. 24 кастр.

1974. Салдату-вызваліцелю: [Верш] // Заря. 9 мая; Мая вёска; «Дзядзькі праекціроўшчыкамі самі...»; «Дваццаты век, трымай тугія лейцы...»: [Вершы] // Звязда. 28 мая; Слаўлю серп і молат; Пабрацімы; Плаўка; Трактар на абкатцы; Наждачніцы: [Вершы] // ЛіМ. 8 сак.; «Абпаленае вогненнай вайной...»: [Верш] // Мін. праўда. 20 крас.; «Нас дзядзька дакараў...»; «Выйшлі мы пад вечар...»: [Вершы] // Там жа. 17 ліп.; «Была ты сумнаю учора»: [Верш] // Чырв. змена. 21 ліп.

1975. «Ярчэй палае той агонь...»: (Вершы з кнігі «Гарачае вуголле») // Вяч. Мінск. 8 жн.; Гарачае вуголле: (Урывак з паэмы) // Мін. праўда. 13 ліп.

1976. «Дарогай еду, што танюткай стужкай...»; «Цябе не зацікавіў, мусіць, так...»; «Ляці, цягнік, насустрач дню і сонцу...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 16 вер.; Сыну-будаўніку; Вялікая сям'я: [Вершы] // Звязда. 11 жн.; «Яшчэ зямля там-сям ільдамі...»; «Праз цвёрды і ўтоптаны асфальт...»: [Вершы] // Чырв. змена. 1 мая.

1977. «Абпаленае вогненнай вайной...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 7 ліп.; Сонца над Нявою: [Верш] // Мін. праўда. 22 кастр.; «Паверце мне...»; «Пачуццяў радасных танцы...»: [Вершы] // Чырв. змена. 6 крас.

1978. Мой горад — завод: [Вершы] // Мін. праўда. 1 кастр. / Сааўт. М. Вяршынін.

1980. Святло Кастрычніка: [Верш] // Полымя. № 11; У гэты дзень: [Верш] // Вяч. Мінск. 8 мая; Зара над лесам вечаруе; Дубы: [Вершы] // Мін. праўда. 17 мая; Мой родны гарадок: [Верш] // Там жа. 9 вер.; «Абпаленае вогненнай вайной...»: [Верш] // Там жа. 27 снеж.

1981. Святло Кастрычніка: [Вершы] // Голас Радзімы. 12 ліст.

1.4.

1972. Кутаў М. Маім равеснікам: [Верш] / З рус. // ЛіМ. 15 снеж.

1973. Ільін К. Я — камуніст: [Верш] / З бурац. // ЛіМ. 16 ліст.

1974. Мацкявічус Б. Ленін; Ода рабочаму класу: [Вершы] / З літ. // ЛіМ. 1 сак.; Рэймерыс В. Параход з сярпом: [Верш] / З літ. // Там жа. 22 сак.

1.5.

На рускую мову. Мы братья; Дерево века: [Вершы] / Пер. А. Сергеев // Красное знамя (Даугавпилс). 1972. 26 авг.

2.3.

На беларускай мове. Прыходзька П. Песня з апаленым крылом // Маркевіч І. Васількі. Мн., 1984.

Г. І. Рэут.

МАРОЗІК МІКАЛАЙ

Марозік Мікалай Фёдаравіч [псеўд. А. Шункевич; каля 1852, в. Лаўрышава Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл.— пасля 1913], паэт-самавук, народны прапаведнік-мараліст.

М. Марозік меў невялікую адукацыю (відаць, скончыў пачатковую школу). Усё жыццё займаўся гаспадаркай у роднай вёсцы, вылучаўся цвярозасцю і набожнасцю. Пісаў на мяшанай беларускай мове, на невысокім мастацкім узроўні творы дыдактычнага і кансерватыўнага зместу. Працаваў у традыцыйным для беларускай вёскі жанры гутарак, бічаваў агульна-чалавечыя заганы, п'янства, гультайства, распусту, выкрываў карчмароў. Карыстаючыся кожнай нагодай (храмавыя святы і г. д.), выступаў перад народам у Навагрудскім і суседніх паветах з чытаннем сваіх твораў, якія разыходзіліся ў спісах і вуснай перадачы. Некаторыя яго выразы цытаваліся ў народзе са спасылкай: «Як кажа Мікола Марозік».

У 1889 у газеце «Минский листок» быў надрукаваны яго дыдактычны верш «Сцяпан і Таццяна». Творчасцю М. Марозіка як пэўным народным феноменам цікавіліся беларускія пісьменнікі і калекцыянеры А. Ельскі, Г. Татур, этнограф М. Нікіфароўскі. Сярод папераў Ельскага (Варшава, Галоўны архіў старажытных актаў) захаваўся сшытак 1890 з вялікім па памерах (каля 400 радкоў) вершаваным творам М. Марозіка «Сачыненне пад рыфму на п'янства і гультайства», у канцы якога аўтар паведамляў: «Усіх сачыненняў маю больш пятнаццаці на розныя тэмы». У 1892 Ельскі ў сваім энцыклапедычным артыкуле «Беларуская літаратура і бібліяграфія» ў якасці характэрнага прыкладу пашырэння цягі да пісання на беларускай мове сярод сялянства назваў імя М. Марозіка. Рукапісы твораў М. Марозіка «Чыгунка», «П'янлівага развага...», «Заключэнне для павучання», «Чытайце або слухайце, як хочаце», «Вясковыя дзяды, або памінальныя дні» і інш. зберагліся сярод папераў Віленскага беларускага музея ў Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы. З прыкладзенага да іх пісьма відаць, што М. Марозік спадзяваўся на дапамогу Татура ў друкаванні гэтых твораў. У 1902 этнограф Нікіфароўскі надрукаваў прыхільны артыкул пра прапаведніцкую дзейнасць М. Марозіка ў пецярбургскім часопісе «Живая старина», апублікаваў для прыкладу дзве яго гутаркі (супраць курэння тытуню і схільнасці сялян да сварак). Першым сялянскім паэтам назваў М. Марозіка польскі літаратар Б. Жыранік у сваім «Нарысе беларускай літаратуры» (1921). Царскія ўлады і царкоўнікі, мясцовыя чарнасоценцы выкарыстоўвалі папулярнасць паэта ў пэўным асяроддзі для ўздзеяння на народ у манархічным і праваслаўным духу. Вядомы, напрыклад, яго выступленні з вершамі 1889 на сходах Віленскага праваслаўнага брацтва. У 1890 бясплатна падарожнічаў па чыгунках Расіі. У 1898 выступіў з вершамі з нагоды адкрыцця ў Вільні помніка Мураўёву-вешальніку. Ёсць аналагічныя звесткі пра яго выступленне на адкрыцці ў Вільні помніка Кацярыне II. У 1911—13 яго прамовы ў Мінску з нагоды 50-гадовага юбілею сялянскай рэформы, стагоддзя Айчыннай вайны 1812 і 300-годдзя дынастыі Раманавых друкаваліся па рэкамендацыі мясцовых улад асобнымі брашурамі. Ён імкнуўся таксама ўстанавіць кантакты з «Нашай нівай», заходзіў у яе рэдакцыю (Гадавік БНТ. Вільня, 1933. Кн. 1). Далейшы лёс М. Марозіка невядомы.

Г. В. Кісялёў.

Бібліяграфія

1.2.

Празднование в г. Минске 300-летнего юбилея царствования дома Романовых. Мн., б. г.

Речь на 50-летний юбилей освобождения крестьян от крепостной зависимости. Мн., б. г.

Речь на столетний юбилей об изгнании французов из России. Мн., б. г.

Речь на трехсотлетний юбилей об избрании царя из дома Романовых Михаила Федоровича. Мн., б. г.

Речь об оставлении Наполеоном Москвы, 1812 года 11 октября и переходе французов через реку Березу 14 ноября. Мн., б. г.

1.3.

1887. Памяти Александра Сергеевича Пушкина: 1837—1887: [Верш] // Мин. листок. 30 янв. / Пад псеўд. А. Шункевич.

1889. Родине: [Верш] // Мин. листок. 6 янв. / Пад псеўд. А. Шункевич; Сцяпан і Таццяна: (Из бел. жизни): [Паэма] // Там жа. 7 марта / Пад псеўд. А. Шункевич.

1891. «Проснись, народ!..»: [Верш] // Мин. губ. вед. 20 марта / Пад псеўд. А. Шункевич; «Радуйся, друг мой! Весна наступает...»: [Верш] // Там жа. 10 апр. / Пад псеўд. А. Шункевич; Моя молитва: [Верш] // Там жа. 28 апр. / Пад псеўд. А. Шункевич.

1902. «Рифма» о курении и нюхании табаку; «Стих» о семейных и соседских неладах // Живая старина. Вып. 3—4.

2.3.

На беларускай мове. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Мн., 1969. С. 81—82; Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969. С. 165—166; Танк М. Лісткі календара. Мн., 1970. С. 47.

На польскай мове. A. J. [Jelski A.] Białoruska literatura i bibliografia // Wielka encyklopedya powszechna ilustrowana. Warszawa, 1892. T. 7. S. 657, 658.

На рускай мове. История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 359—360; Н. Я. Н. [Нікіфароўскі М.] Глашатаи добрых начал в сельской среде // Живая старина. 1902. Вып. 3—4.

3.1.

Галоўны архіў старажытных актаў (Варшава), ф. Прозараў і Ельскіх, с. 140; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 385.

Т. М. Махнач.

МАРТЫНАВА ЭЛЬВІРА

Мартынава Эльвіра Міхайлаўна (н. 12.2.1923, Звенігародка Кіеўскай вобл., цяпер Чаркаскай вобл., Украіна), літаратуразнавец. Піша на беларускай, украінскай і рускай мовах.

Нарадзілася ў сям'і служачых. Бацька працаваў аграномам, маці — настаўніцай. У 1947 Э. Мартынава скончыла філалагічны факультэт Адэскага універсітэта. Працавала карэктарам выдавецтва таго ж універсітэта (1949—51), старшым лабарантам кафедры ўкраінскай літаратуры (1951—60). Пасля пераезду ў Мінск у 1960 працавала малодшым, потым старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР. З 1979 на пенсіі.

Друкуецца з 1958 у беларускай і ўкраінскай перыёдыцы. У 1970 абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Паэтычны пераклад як форма беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемасувязей». Яе працы і даследаванні прысвечаны праблемам тыпалагічнай роднаснасці рускай, беларускай і ўкраінскай літаратур, міжлітаратурным сувязям і, у прыватнасці, мастацкаму перакладу, сучаснаму апавяданню. Апублікавала звыш 60 артыкулаў, рэцэнзій. Аўтар кніг «Беларуска-ўкраінскі паэтычны ўзаемапераклад», «Мастацкая дэталь у літаратурным творы».

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Поэтический перевод как форма белорусско-ўкраинских литературных взаимосвязей: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1970.

Беларуска-ўкраінскі паэтычны ўзаемапераклад. Мн., 1973. Рэц: Бондар Л. Взаемозв'язки братні, творчі // Жовтень. 1974. № 5; Дорошенко В. Із досвіду поетичного взаемоперекладу // Прапор. 1974. № 6; Гольберг М. Перевод и взаимодействие литератур // Вопр. лит. 1974. № 4; Лемешівська Л. // Рад. літ.-знавство. 1975. № 1; Пашковская Н. // Неман. 1975. № 3.

Мастацкая дэталь у літаратурным творы: На матэрыяле сучаснай беларускай прозы. Мн., 1977. Рэц.: Шамякіна Т. Прырода мастацкай дэталі // Полымя. 1978. № 11.

1.3.

1958. Шевченківські мотиви в романі А. Головка «Мати» // Збірник праць четвертої наукової шевченківської конференції. К.; Портретна характеристика Катрі в романі А. Головка «Мати» // Праці Одеського держ. ун-ту ім. І. І. Мечнікова. Одеса. Т. 148.

1960. Соціально-психологична та портретна характеристика Юхима Гармаша в романі А. Головка «Мати» // Праці Одеського держ. ун-ту ім. І. І. Мечнікова. Одеса. Т. 150.

1961. Головко і Коцюбинський // Коцюбинський. Одеса; Багрицкий о Пушкине // Пушкин на Юге. Кишинев. Вып. 1.

1963. Паэзія служэння народу // Маладосць. № 8.

1964. Шаўчэнка і Жалігоўскі // Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура. Мн. / Сааўт. А. Мальдзіс; Пісьменнік, грамадзянін, змагар // Маладосць. № 9; Творча співдружність революційних демократів // Рад. літ-знавство. № 2 / Сааўт. А. Мальдзіс; Побач з Шаўчэнкам // ЛіМ. 3 сак.; Пясняр народнага гневу // Там жа. 10 сак.

1965. Ён прыйдзе яшчэ не аднойчы...: Да 70-годдзя з дня нар. М. Рыльскага // ЛіМ. 19 сак.; З невичерпних криниць Кобзаря: (До 60-річчя Петруся Бровки) // Літ. Укр. 25 черв.

1967. Рэха на Украіне // ЛіМ. 4 жн.; Майстар украінскай прозы // Там жа. 5 снеж.

1968. Мастацкі пераклад як форма беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемасувязей // Садружнасць літаратур. Мн.

1969. Беларуская літаратура на старонках украінскага друку пачатку XX ст. // Матэрыялы першай навуковай канферэнцыі па вывучэнню беларуска-ўкраінскіх літаратурных і фальклорных сувязей. Гомель; Неўміручая сіла слова // Звязда. 9 вер.; Кветкі з усіх палёў // ЛіМ. 29 ліп. / Сааўт. А. Мажэйка; Твор неўміручы, жывы, малады // Там жа. 9 вер.

1970. Некаторыя рысы блізкасці і своеасаблівасці развіцця беларускай і ўкраінскай літаратур пачатку XX ст. // Старонкі літаратурных сувязей. Мн.; Пра

ўяўную лёгкасць і сапраўдныя цяжкасці // ЛіМ. 2 кастр.

1971. Проблеми білорусько-українського та українсько-білоруського поетичного перекладу // Українська культура в інтернаціональних зв'язках. К.; Кветка Украіны // Маладосць. № 2.

1972. Шевченко білоруською мовою // Тези доповідей і повідомлень другої наукової конференції по вивченню білорусько-українських литературних зв'язків, присвяченої 50-річчю утворення СРСР. Львів; Із спостережень над білорусько-українським поетичним взаемоперекладом // Рад. літ.-знавство. № 12; Моваю вялікага Кабзара // ЛіМ. 17 сак.

1973. Леся Украінка на беларускай мове // Тыпалогія і ўзаемадзеянне славянскіх моў і літаратур. Мн.

1975. Пераклічка дзвюх літаратур // ЛіМ. 12 жн.; Яшчэ адно сведчанне сяброўства: [Рэц. на кн.: Украінская савецкая паэзія: У 2 т. Мн., 1975] // Там жа. 17 кастр.

1977. Художественная деталь в «малой» прозе // Жыццёвая праўда і сучаснае мастацкае мысленне. Мн., 1977; Мастацкі пераклад і ўзаемаўзбагачэнне нацыянальных літаратур: (П. Тычына на бел. мове) // Тыпалогія славянскіх моў і ўзаемадзеянне славянскіх літаратур. Мн.; На шляхах літаратурнага яднання: [Рэц. на кн.: Кабржыцкая Т., Рагойша В. Карані дружбы. Мн., 1976] // Полымя. № 1; Вялікае ў малым: Мастацкая дэталь у прозе // Там жа. № 7.

1978. Неба паэзіі і дружбы: [Рэц. на кн.: Браўн М. Ленінградскае неба. Мн., 1977] // Полымя. № 8.

1979. Слово Шевченка у Білорусії // Збірник праць двадцять третьої наукової шевченківської конференції. К.

1980. Мастацкі пераклад і ўзаемаўзбагачэнне нацыянальных літаратур // Адзінства і ўзаемаўзбагачэнне. Мн.; Шчодрае сэрца паэта // Полымя. № 5; Моваю братнього народу // Рад літ.-знавство. № 11.

1981. Щедре серце поета // Нагнибіда М. Твори в трьох томах. К. Т. 1; Заўсёды ў дарозе // Полымя. № 6; Щедре серце поета // Укр. мова і л-ра в шк. № 9; Друг читача. 17 вер.

1982. Українські переклади поезії Янки Купали // Янка Купала та Якуб Колас і Україна. Суми; Сельский мир и рассказ // Неман. № 2; Доброта души, твердость воли...: [Рэц. на кн.: Жук А. Идти долго. М., 1981] // Там жа. № 8.

1983. Единство и многообразие // Неман. № 7; Украінская паэтычная купаліяна // Полымя. № 6; Паэзія дружбы і адзінства // Там жа. № 7; Едність поезії і поезія єднання // Літ. Укр. 3 лют.

1984. «Душа звініць нацятай цецівою»: [Рэц. на кн.: Варанько П. Калыска памяці. Мн., 1983] // Полымя. № 6; Янка Купала в українських перекладах // Рад. літ.-знавство. № 1; Кацюбінскі па-беларуску // ЛіМ. 28 вер.

1985. Поеми Шевченка в перекладах Янки Купали // Збірник праць двадцять шостої наукової шевченківської конференції. К.; Стежинами дружби: [Рэц. на кн.: Варанько П. Калыска памяці. Мн., 1983] // Вітчизна. № 1.

1.6.

Рыльскі М. Світальная зара. Мн., 1985 / Скл. Шаўчэнка Т. Вершы. Паэмы. Мн., 1989 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Рагойша В. І нясе яна дар... Мн., 1977. С. 261—266; Яго ж. Па шляху ўзаемаперакладу // ЛіМ. 1974. 14 чэрв.

На ўкраінскай мове. Рагойша В. Шляхом взаемоперекладу // Літ. Укр. 1974. 12 ліп.

Г. І. Рэут.

МАРУК УЛАДЗІМІР

Марук Уладзімір Антонавіч (н. 6.1.1954, в. Гута Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), паэт, перакладчык. Член СП Беларусі з 1984.

З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Гуценскай і Нацкай сярэдніх школах. У 1970 скончыў Моўчадскую санаторную школу-інтэрнат Баранавіцкага р-на. Вучыўся ў Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме (1970—72). З 1972 працаваў у бібліятэках Ганцавіцкага р-на: у раённай, потым у сельскай (в. Шашкі), раённай дзіцячай, потым загадчыкам аўтаклуба (Ганцавічы). У 1975 паступіў на філалагічны факультэт БДУ, які скончыў у 1980. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе № 106 Мінска (1980—81). Працаваў карэспандэнтам, загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда» (1981—86). З 1986 — загадчык рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва».

Друкавацца пачаў з 1972. Першыя вершы апублікаваны ў «Магілёўскай праўдзе». У 1974 у ча-

сопісе «Маладосць» змешчаны цыкл вершаў, якія вылучаліся лірычнасцю, сталасцю думкі, шчырасцю. Верай у дабрыню, у чалавека прасякнуты вершы яго першага зборніка «Зоркі ў кронах» (1982). Паэт з захапленнем піша пра прыгажосць роднага краю, яго гістарычнае мінулае. Яго непакояць і сённяшні дзень роднага Палесся, і лёс усяго чалавецтва. Узаемасувязь чалавека і прыроды — адна з галоўных тэм новага зборніка «Ліст рабіне» (1987). Выступае і як публіцыст. У артыкулах «Паслухайце: спяваюць у Лебедзеве», «Высокія меркі часу», «Свет дзівосны з-пад разца», «Мядзведзі, ласі... і кветкі» ён узнімае маральна-этычныя праблемы нашага часу, разважае пра культуру вёскі, народныя традыцыі. Ён складальнік зборніка вершаў і апавяданняў беларускіх пісьменнікаў «Пра каханне» (на рускай мове). Вершы У. Марука перакладаліся на рускую, украінскую мовы.

Жыве ў Мінску. *Г. М. Урупіна.*

Бібліяграфія

1.2.

Зоркі ў кронах: Вершы. Мн., 1982. (Першая кніга паэта). Рэц.: Кірылава А. Слоў выкрасаючы святло // Чырв. змена. 1983. 12 лют.; Клімко І. Крок да адкрыцця // Маладосць. 1983. № 4; Лойка А. «...Яшчэ не зведана Палессе» // ЛіМ. 1983. 30 снеж.; Мартинович А. Зажег поэт звезду... // Знамя юности. 1983. 8 июля; Ягоўдзік У. Першы вянок // Голас Радзімы. 1983. 20 студз.

Ліст рабіне: Вершы. Мн., 1987.

1.3.

1972. Беларусі; «Працаваць і гаспадарыць...»; «Пазаслалі хмары ўсе шляхі...»: [Вершы] // Маг. праўда. 16 чэрв.

1974. Беларусі; «Скажыце, сёстры, маці, любыя...»; Леснічоўка; Вясна; «На возеры шырокім...»; Жнівень; Ласі; «Вось і сонейка запала...»; «Над вадою звісала...»; Дарога на Палессе; «Вуліцы зацесна...»: [Вершы] // Маладосць. № 9; «Дачакаюся ранніх вішань...»; «У змроку выціхлі лясіны...»: [Вершы] // Знамя юности. 29 нояб.

1975. «Я з тых, хто не вякуе...»; «Па каліўцу багацце на зямлі...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 75. Мн.; Зорка; «Мой сад уночы поўня апраменіць...»; «Маладое рэха...»: [Вершы] // Чырв. змена. 2 вер.

1976. «Непаслухмяны твой жыхар, прырода...»; Пралескі; «Не, яшчэ не зведана Палессе...»; «Дачакаюся ранніх вішань...»; «Край лясны...»: [Вершы] // Маладосць. № 6; Жнівень; «На возеры шырокім...»: [Вершы] // Знамя юности. 14 сент.; «Я з тых, хто не вякуе...»; Грыбы на сняданак: [Вершы] // Чырв. змена. 19 вер.

1977. «Цвярдзее вера ў людзей...»; Маці; «Дачакаюся ранніх вішань...»; «Ёсць шлях наперад і назад...»; «Да віно ж, віно-зеляно...»; «Я з тых, хто не вякуе...»; «Вось і сонейка запала...»; «Месяц зорцы-весялушцы...»; «А лісцяў ранніх звонкі шкробат...»; «Час ідзе. І лес стары радзее...»; «Як пайду я дарогаю...»: [Вершы] // Вёсны. Мн.; «Ёсць шлях наперад і назад...»: [Верш] // Мін. праўда, 13 крас.

1979. «Час бывае невыказна шчыры...»; «Час ідзе. І лес стары радзее...»; Раскопкі; «Не знойдзеш тут грыбоў...»: [Вершы] // Маладосць. № 2; Снег у Брэсце: [Верш] // Чырв. змена. 4 ліп.

1981. Свет дзівосны з-пад разца // Звязда. 11 ліп.; Высокія меркі часу // Там жа. 14 кастр.; Паслухайце: спяваюць у Лебедзеве // Там жа. 30 кастр.; «Сыходзіць стрыжань лета...»; «І лістота стамілася падаць...»; «Стаміліся цені вячэрнія...»; «Тут у хвалях прасцяг сасновы...»; «Выплыў туман за ваколіцу...»: [Вершы] // ЛіМ. 13 ліст.

1982. Мядзведзі, ласі... і кветкі // Голас Радзімы. 29 ліп.; «Зборнік лірыкі лядашчы...»: [Рэц. на кн.: Стрыгалёў М. Кола фартуны. Мн., 1981] // ЛіМ. 4 чэрв.; З кнігі «Зоркі ў кронах»: [Вершы] // Там жа. 20 жн.; «Грукат ранняе сякеры...»; Грыбы на сняданне: [Вершы] // Чырв. змена. 18 лют.

1983. «Прыйшоў я на бераг...»; Сябрам; Сустрэча; Вернасць; «Б'е лісток аб лісток — авацыі...»; «Блакітнае марознае святло...»; «Мы селі зноў на мель...»; Садоўнік: [Вершы] // Маладосць. № 2; «На казённых ложках спаць прыйшлося...»; «Бабулю сціпла пахавалі...»; «Ажывае кветка зверабою...»; «Старажытнасць вячэрняга неба...»; «На ціхай заснежанай хвоі...»; Дзень; Свіслач; Ранеты: [Вершы] // Полымя. № 10: «Траў цвіценне. Мурог. Шчамяліца...»; «Як ціха за лесам, на Случчыне...»; «Пацяплела. Возеру ж спіцца...»; «Не бываем з табой каля дрэў...»; «Я прыпыніўся...»; «Прашу, глядзіце ў вочы, дрэвы...»; «Пазнаю дарогу чыстую...»; Асенняе: [Вершы] // ЛіМ. 21 кастр.

1984. «Баба Паланея. Дзед Міхась...»; «Гута — крыштальнае дно...»: [Вершы] // Полымя. № 10; Узбагачаць духоўнае жыццё // Звязда. 11 снеж.; «Лес і поле. Роўнае святло...»; «Любуюся сасновым борам...»; «Гаю зялёны крык...»; «Шмат забыла душа мая цёмная...»; «Сяльцо пад крыламі буслоў...»; «Ля помніка сцяганосцу...»; «Рэчак гордая плынь...»; «О, як недалёка змярканне...»: [Вершы] // ЛіМ. 24 жн.

1985. «Я з тых, хто не вякуе...»: [Верш] // Беларусь. № 1; «Памяць таго берага...»; «Не адзываецца мой лёс...»; «Вецер ходзіць ля акна...»; «Раскашуе лета, раскашуе...»; «Шчырасць яе спытала...»; Старыя таполі; «Сціплы водар вечаровай мяты...»; «Лета маленькія дрэўцы абдыме...»; «У позні час...»; «Водгулле гадоў...»: [Вершы] // ЛіМ. 26 ліп.

1.4.

Мальсагаў А. Прымі падарожніка, дарога: Аповесць / З рус. Мн., 1989.

1983. Ананьеў А. Канец Дугава: Апавяданне / З рус. // Звязда. 7 ліст.

1.5.

На рускую мову. Сторожка; Август: [Вершы] / Пер. А. Шевелев // Аврора. 1976. № 1; Снег в Бресте: [Верш] / Пер. М. Александров // Молодая гвардия. 1982. № 12.

На ўкраінскую мову. «Ще його не звідано, Полісся...»; Космонавтам: [Вершы] / Пер. В. Коротич // Дніпро. 1977. № 6; Палессе: [Верш] / Пер. М. Шевченко // Молодь Укр. 1982. 11 вер.

1.6.

О любви: Стихи, рассказы. Мн., 1988 / Скл.

Глебаў Я. Дарогамі «Маленькага прынца» // Звязда. 1982. 27 лют. / Зап.; Бураўкін Г. «...Не даваць спаць чалавеку ў чалавеку...» // Там жа. 1983. 10 снеж. / Зап.; Грахоўскі С. Шчасце тварыць дабро // Там жа. 1984. 18 мая / Зап.; Дудараў А. Дыягназ: драматургія // Там жа. 1983. 27 сак. / Зап.; Лужанін М. Права на верш // Там жа. 1984. 2 ліст. / Зап.; Навуменка І. Знайсці свайго героя // Там жа. 1985. 16 лют. / Зап. *У. М. Ларчанка.*

МАРХЕЛЬ УЛАДЗІМІР

Мархель Уладзімір Іосіфавіч (псеўд. С. Мамонька; н. 20.4.1940, в. Жыгалкі Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.), літаратуразнавец, перакладчык. Кандыдат філалагічных навук (1982). Член СП Беларусі з 1988.

З сям'і служачых. Бацькі працавалі ў сістэме гандлю, цяпер — на пенсіі. У 1957 У. Мархель скончыў сярэднюю школу імя Я. Коласа ў в. Мікалаеўшчына. Працаваў малатабойцам у калгасе, рабочым ачышчальнага забою на шахце ў Новашахцінску Растоўскай вобл. (1957—59). У 1959 паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта БДУ, пасля сканчэння якога (1964) выкладаў рускую мову і літаратуру ў школах Беларусі (в. Стадолічы Лельчыцкага р-на, Валожын, Мінск), супрацоўнічаў у газеце «Мінская праўда» (1966), быў старшым рэдактарам у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа АН БССР (1969—71). Актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы першай бібліяграфіі па развіцці навукі ў БССР і навуковых зборнікаў, прысвечаных гісторыі кнігі Беларусі. З 1971 працаваў у Аддзеле навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках АН БССР, рыхтаваў навукова-інфармацыйныя бюлетэні па беларускаму літаратуразнаўству і мовазнаўству. З 1978 працуе ў Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы АН Беларусі. Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «У. Сыракомля ў беларуска-польскім літаратурным узаемадзеянні (сярэдзіна 19 — пачатак 20 ст.)». Распрацоўвае праблемы гісторыі беларускай літаратуры 19 ст., беларуска-польскіх літаратурных узаемасувязей.

Друкавацца пачаў у 1954 у стаўбцоўскай раённай газеце «Голас селяніна». У час вучобы ў школе і пазней яго вершы змяшчаліся ў газетах «Чырвоная змена», «Знамя шахтёра», часопісе «Маладосць», зборніку «Дзень паэзіі» і інш. Ён укладальнік «Твораў» В. Каратынскага (1981), «Твораў» Я. Лучыны (1988) і інш. З польскай мовы на беларускую пераклаў вершы Я. Купалы, творы У. Сыракомлі, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Лучыны, Я. Каханоўскага, Ю. Тувіма і інш.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2

Владислав Сырокомля в белорусско-польском литературном взаимодействии (середина XIX — начало XX в.): Автореф. дис. ...канд. филол. н. Мн., 1982.

Лірнік вясковы: Сыракомля ў бел.-польскім літ. узаемадзеянні. Мн., 1983. Рэц.: Салавей Л. Кніга пра лірніка вясковага // ЛіМ. 1984. 6 ліп.; Ciechanowicz J. O lirniku wioskowym // Czerw. szt. 1983. 13 sierp.; Sielicki F. // Slavica Wratislaviensia. 1986. Z. 39.

Вяшчун славы і волі: Уладзіслаў Сыракомля. Мн., 1989. (Нашы славутыя землякі).

Крыніцы памяці: Старонкі бел.-пол. літаратурнага сумежжа. Мн., 1990.

Прадвесце: Беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. Мн., 1991.

1.3.

1957. Юнкор: [Верш] // Чырв. змена. 5 мая; Грыбы: [Верш] // Там жа. 17 ліст.

1958. Жаданне: [Верш] // Чырв. змена. 19 студз.; Мае апладысменты: [Верш] // Там жа. 15 чэрв.

1960. Травінка: [Верш] // Чырв. змена. 18 чэрв.

1961. Фальшывая маска: [Верш] // Чырв. змена. 16 снеж.

1966. Глыбіня; «Я ведаў: ты ўперадзе недзе...»: [Вершы] // Чырв. змена. 21 жн.

1967. Транспарцёр; Звяздар; Венера Мілоская; Патрэбнае слова знайсці не проста; Спыняю вочы прад вачыма: [Вершы] // Маладосць. № 3.

1968. Каток; Бабёр: [Вершы] // Вясёлка. № 5; Можа таму...; «Калі мне турботы нясеш непатрэбныя...»: [Вершы] // Чырв. змена. 19 ліст.

1969. «Неашчаджанасць песні!..»: [Верш] // Дзень паэзіі — 69. Мн.; Знаходка сярод рэдкіх кніг // Наст. газ. 23 жн.

1970. [Рэц. на кн.: Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969] // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 3; Перапіска літаратараў // Вяч. Мінск. 14 вер.; Лёс аднаго альманаха // Там жа. 5 кастр.; Друг Монюшко // Знамя юности. 22 нояб.; Загадка автографа // Сов. Бел. 4 марта.

1971. Звяздар: [Верш] // Універсітэт паэтычны. Мн.;

«Просьба № 1» // Маладосць. № 5; Адрасавана Сыракомлю // ЛіМ. 2 крас.

1972. «Кур'ер Віленьскі» як крыніца для вывучэння гісторыі культуры Беларусі (1860—62 гг.) // Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии. Мн. Вып. 2; Міналі гады... // ЛіМ. 11 лют.; Два лісты Сыракомлі // Там жа. 4 жн.

1973. Выказнік дум народа // Беларусь. № 9; «Слова аб палку Ігаравым» у ацэнцы Ул. Сыракомлі // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 6; Сыракомлю перакладае Лучына // Маладосць. № 9; Непрочитанные переводы из Сырокомли // Неман. № 10; Новае слова пра Сыракомлю // Полымя. № 9; З эпісталярнай спадчыны Сыракомлі // Ніва. 30 вер.

1974. Літаратура пра Ул. Сыракомлю // Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Мн.

1975. Другі жыццёвы працяг // Дзень паэзіі — 75. Мн.; Сырокомля и Дмоховский // Неман. № 2; Па слядах мінулага: [Рэц. на кн.: Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974] // Полымя. № 8.

1976. Рэдкае выданне нот С. Манюшкі // Из истории книги в Белоруссии. Мн.; У прасторы і часе: [Рэц. на кн.: Studia polono-slavica-orientalia. Acta Literaria I. Wroclaw etc., 1974] // Полымя. № 1; Ад спадчыны Сыракомлі: [Рэц. на кн.: Цвірка К. Слова пра Сыракомлю. Мн., 1975] // Там жа. № 9; Братэрская пераклічка: [Рэц. на кн.: Канановіч М. Імёны любові. Мн., 1976] // ЛіМ. 15 кастр.

1977. Кнігазбор Сыракомлі // Книговедение в Белоруссии. Мн.; Беларуская творчасць Сыракомлі // Тыпалогія славянскіх моў і ўзаемадзеянне славянскіх літаратур. Мн.

1978. Дакумент дасягненняў: [Рэц. на кн.: Пачынальнікі. Мн., 1977] // Полымя. № 3.

1979. Нататкі А. Шэмеша для У. Сыракомлі // Из истории книги в Белоруссии. Мн.

1980. Творчасць Вінцэся Каратынскага ў ацэнцы сучаснікаў і нашчадкаў // Белороссика: Книговедение, источники, библиография. Мн.; Нічога такога я не пісаў...» // Голас Радзімы. 29 мая.

1981. Чым хата багата... // Каратынскі В. Творы. Мн.; З эпісталярнай спадчыны Вінцэся Каратынскага // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 4; Да 150-годдзя з дня нараджэння [Вінцэся Каратынскага] // Полымя. № 8; «Цёплым сэрцам прыгарнуты...»: [Інтэрв'ю] // Голас Радзімы. 16 ліп.; Верыў у шчасце людское // ЛіМ. 14 жн.

1982. Беларускі фальклор у творчасці Сыракомлі // Узроўні фальклорных уплываў. Мн.; «Доля» // Беларусь. № 5; [Уступны арт. да вершаў Я. Купалы на польскай мове] // Полымя. № 6; З думай аб родным краі // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 1.

1983. Жадаў зрабіць усіх шчаслівымі // Голас Радзімы. 29 вер.; Сельский лирник // Сов. Бел. 20 янв.

1984. Янка Лучына // Дзень паэзіі — 84. Мн.; Рамантычны фальклярызм паэтаў-філаматаў // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 4; Руплівы збіральнік: Да 150-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага // Голас Радзімы. 30 жн.; [Уступны арт. да перакл. вершаў Яна Каханоўскага] // ЛіМ. 17 жн.; Запаўненне прагалу // Там жа. 23 ліст. / Пад псеўд. С. Мамонька.

1985. Уладзіслаў Сыракомля і Якуб Колас // Тэзісы дакладаў і паведамленняў навуковай канферэнцыі з нагоды дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Мн.; Ян Каханоўскі ў Беларусі (XVI—XIX стст.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 3.

1.4.

1973. Сыракомля У. Вячорная; З палацаў, пыхлівых адвечна...: [Вершы] / З пол. // Беларусь. № 9; Яго ж. «Нас пабраталі, народзе...»: [Верш] / З пол. // ЛіМ. 28 вер.

1974. Тувім Ю. Палітычныя ямбы; Красавіцкая бярозка; Трава: [Вершы] / З пол. // ЛіМ. 13 вер.

1976. Канановіч М. Шукаў я грыбы: [Верш] / З пол. // ЛіМ. 1 кастр.

1981. Каратынскі В. Прытулак шчасця; Два каханні; Пасля сватання; Бярозка; Уладзіславу Сыракомлю: «Хочаш вялікае штось сатварыць...»: [Вершы]; Таміла: Выбраныя раздзелы; З каментарыяў да паэмы «Таміла»; Некалькі падрабязнасцяў пра сям'ю, месца нараджэння і маладосць Адама Міцкевіча; Саламон Рысінскі; Віцебск; Канстанцін Тышкевіч; Яўстафій Тышкевіч; Карціны з берагоў Нёмана; Дзве будоўлі / З пол. // Каратынскі В. Творы. Мн.; Яго ж. Да А. Кіркора: (Пісьмо ад 21 жн. 1858 г.); З пісьмаў да жонкі Уладзіслава Сыракомлі — Паўліны Кандратовіч (ад 25 ліст. 1871 г. і 3 крас. 1886 г.) / З пол. // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 4; Яго ж. Бярозка; Уладзіславу Сыракомлю: [Вершы] / З пол. // Полымя. № 8; Яго ж. Вяселле: Урывак з паэмы «Таміла» / З пол. // Голас Радзімы. 16 ліп.; Яго ж. З паэмы «Таміла» / З пол. // ЛіМ. 14 жн.

1982. Купала Я. Ляці, песня...; З успамінаў; Бадзяга; Люблю я цябе, зямля...; У свет!..; З песень сіраты; Учора; Фрагмент: [Вершы] / З пол. // Полымя. № 6; Яго ж. У маёвую ноч; Восень; Беларус; Не для вас...; Вясна; У змроку; Быццам весну...; «Сны адлюдна, неразбудна...»: [Вершы] / З пол. // Там жа. № 8; Каратынскі В. Карціны з берагоў Нёмана: Фрагмент; Дзве будоўлі / З пол. // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 1.

1983. Сыракомля У. Урывак з паэмы «Ян Дэмбарог»; Колас; Жніўная; Хвоя; Свавольным дзецям: [Вершы] / З пол. // Далягляды. Мн.

1984. Лучына Я. Курс літаратуры канца XIX стагоддзя; Прадвесне; Май; «Як мора, хвалююцца з ветрам прыгожа...»; Спёка перад навальніцай; Даўно мінулы час; Развітанне; Змрочныя думкі: [Вершы] / З пол. // Дзень паэзіі — 84. Мн.; Дунін-Марцінкевіч В. Фантазія, прысвечаная Антонію Концкаму: [Верш]; Ул. Сыракомлю. Чэрвень 1855 г. (?); Ул. Сыракомлю. Чэрвень 1855 г. (?): Лісты / З пол. // Дунін-Марцінкевіч В. Творы. Мн.; Каханоўскі Я. Фрашкі з «Кнігі першай»: 52. На гаспадара; 87. Аб фрашках; 88. Каханню; 97. Паненцы; Песні: Песня III; Песня XXII / З пол. // ЛіМ. 17 жн.

1985. Драздоўскі Б. Студня; Пытанне; Мы; Паказальнае выступленне гімнастаў; Самотнасць; Мая любасць; Пакаленне; Ёсць адно дрэва; Аб паркеце; Сын мяне абмінае здалёку; Калі б можна было; Тое, што люблю: [Вершы] / З пол. // Далягляды. Мн.

1.5.

На польскую мову. Nieznane listy Syrokomli / Tł. F. F. // Gaz. Poznańska. 1972. Nr 287; Władysław Syrokomla w przekładach białoruskich // Syrokomli w 150 rocznicę urodzin: Materiały sesji popularnonaukowej. Kraków, 1974; Nad wspólnym dziedzictwem / Rozm. J. Ciechanowicz // Czerw. szt. 1983. 31 maja; Białoruska spuścizna literacka Władysława Syrokomli / Tł. W. Stochel // Studia polono-slavica-orientalia: Acta Literaria. 1985. T. 9.

1.6.

Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии. Мн., 1970 / Рэдкал.

Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии. Мн., 1972. Вып. 2 / Рэдкал.

Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Мн., 1974 / Рэдкал.

Библиотечное дело и библиография в системе библиотек Академии наук БССР. Мн., 1976 / Рэдкал.

Из истории книги в Белоруссии. Мн., 1976 / Рэдкал.

Книговедение в Белоруссии. Мн., 1977 / Рэдкал.

Библиотечное дело и библиографоведение в БССР. Мн., 1978 / Рэдкал.

Из истории книги в Белоруссии. Мн., 1979 / Рэдкал.

Белороссика: Книговедение, источники, библиография. Мн., 1980 / Рэдкал.

Каратынскі В. Творы. Мн., 1981 / Скл., прадм. і камент. Рэц.: Верабей А. Святло забытай зоркі // Полымя. 1982. № 4; Sielicki F. // Sl. Orient. 1983. Nr 3.

Книга в Белоруссии: Книговедение, источники, библиография. Мн., 1981 / Рэдкал.

Працы Інстытута літаратуры АН БССР: (1931—

80): Бібліягр. даведнік. Мн., 1981 / Скл. з М. Барташэвіч. Рэдкал.

История книги, источниковедение и библиотечное дело. Мн., 1984. / Рэдкал.

История книги, книжного дела и библиографии в Белоруссии. Мн., 1985 / Рэдкал.

Аляхновіч Р. Беларуская літаратура ў 8 класе: Дапаможнік для настаўніка. Мн., 1987 / Рэд.

Лучына Я. Творы. Мн., 1988 / Скл., прадм. і камент.

Вечна жывое «Слова» — Вечно живое «Слово»: Зб. матэрыялаў навук. канф. «Слова пра паход Ігаравы» — выдат. літ. помнік усходнеславян. культуры». Мн., 1989 / Скл.

Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб. Мн., 1990 / Скл. 2.3.

На польскай мове. Białokozowicz B. Polonistyka i poloniści w Kraju Rad // Przyjaźń. 1984. Nr 8.

Г. І. Рэут.

МАРЦІНКЕВІЧ ГЕРАНІМ

Марцінкевіч Геранім Францавіч [2(14).7.1816, в. Тулава Віцебскага пав.— пасля 1864, Віцебск (?)], паэт, празаік, драматург. Пісаў на польскай і беларускай мовах.

Паходзіў са збяднелага шляхецкага роду Марцінкевічаў герба Лебедзь (да іншага адгалінавання гэтага роду належаў **В. Дунін-Марцінкевіч**). Вучыўся ў Віцебскім базыльянскім вучылішчы, адкуль у 1832 перайшоў у губернскую гімназію. Паводле архіўных звестак, у 1834 віцебскі павятовы маршалак шляхты прасіў уладкаваць бедных вучняў гімназіі — Гераніма Марцінкевіча і яго брата Аляксандра (нар. ў 1817) — на казённы кошт, але ў гэтым было адмоўлена «за недастатковасцю законных дакументаў аб дваранстве». У 1835 Г. Марцінкевіч паспяхова скончыў гімназію і ў тым жа годзе паступіў на юрыдычны факультэт Маскоўскага універсітэта. Колькі ён там правучыўся — невядома, але закончанай універсітэцкай адукацыі не атрымаў. Каб зарабляць сабе на хлеб, перайшоў на службу ў Віцебскае губернскае праўленне, потым па невядомых прычынах звольніўся. У канцы 1849 «адстаўны канцылярскі служыцель» Г. Марцінкевіч атрымаў ад віцебскага губернатара дазвол зноў паступіць на службу — на гэты раз у дваранскую дэпутацкую зборню. За 11 гадоў даслужыўся да невысокага чыну губернскага сакратара. На пачатку 1860-х гадоў разбіты паралічом. У 1864 у віцебскіх установах вялася перапіска аб афармленні яму пенсіі. Далейшых біяграфічных звестак няма. Падтрымліваў прыяцельскія адносіны са сваім земляком і равеснікам **А. Вярыгам-Дарэўскім** і яго братам Сымонам, арганізатарам публічнай чытальні ў Віцебску, у 1843 прысвяціў ім верш «Захад сонца».

Літаратурнай дзейнасцю Г. Марцінкевіч пачаў займацца ў 1830-я гады. Супрацоўнічаў у «Рубоне» і іншых рэгіянальных выданнях. У 1845 надрукаваў у віленскага выдаўца Ю. Завадскога тыражом каля 500 экз. томік сваіх польскамоўных паэтычных твораў. У 1848 выдаў другі том, куды ўвайшлі драма «Час над Дзвіной», паэма «Першае падзенне чалавека», пераклады з Гётэ і Лермантава. Трэцяя яго кніга — стракаты ў жанравых адносінах зборнік «Творы, напісаныя між іншым» (нарысы, замалёўкі, вершы) — выйшла ў 1858. Драма «Падарожны» не была апублікавана. Г. Марцінкевіч быў прагрэсіўным правінцыяльным літаратарам, актыўным удзельнікам літаратурна-культурнага жыцця Віцебска. У сваіх творах выказваў трывогу за лёс народа, надзеі на лепшую будучыню, сатырычнымі фарбамі маляваў добра знаёмае яму чыноўніцкае асяроддзе. Ад глыбокай цікавасці да народнай культуры (вядомы яго пераклады на польскую мову беларускіх песень) ён сам перайшоў да творчасці на беларускай мове (камедыя «Аказія падпалкоўніцам» або «Аказія пры палкоўніцах», якая нібыта ставілася на віцебскай аматарскай сцэне А. Вярыгам у 1861—62 і захоўвалася ў маёнтку Селігоры на Лепельшчыне). Даследчыкі ідэнтыфікуюць гэты твор з п'есай «Адвячорак. Аказія ў карчме пры Фальковічах» (1858), тэкст якой складанымі шляхамі (праз А. Рыпінскага, М. Піятуховіча і інш.) у копіі дайшоў да нашага часу і зберагаецца цяпер у БДАМЛіМ. Асобныя аўтографы Г. Марцінкевіча захоўваюцца ў Вільнюсе (ЦБ АН Літвы, ДГА Літвы). *Г. В. Кісялёў.*

Бібліяграфія

1.2.

Poezye. Wilno, 1845.

Poezye. Wilno, 1848.

Pisemka dorywcze. Wilno, 1857.

1.3.

1843. Popas nad morzem w okolicach Narwy; Młodzian; Burza // Rubon. T. 3.

1845. Bo W. Z.; Do młodego Pielgrzyma // Rubon. T. 5; Zachod słonca; Do W. W. // Rubon. T. 6.

1846. Biekieszowa Góra: Dumka z podróży (Na pamiątkę Tomaszowi i Antoniemu Kłodnickim) // Rubon. T. 7.

1961. Kwiecień na Bialorusi w r. 1839 // Zbiór poetów polskich XIX w. Warszawa. Ks. 2.

1988. Адвячорак (Аказія ў карчме пад Фальковічамі): [П'еса] // Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Мн.

1990. Атвечэрак (Аказія ў карчме пад Фальковічамі) // Шляхам гадоў. Мн.

1.4.

1843. Piosnki gminne Białoruskie // Rubon. T. 3.

2.3.

На беларускай мове. Кісялёў Г. Загадка беларускай «Энеіды». Мн., 1971. С. 161—163; Мальдзіс А.

Пісьмы наводзяць на след // Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969; Яго ж. Пісьмы расказваюць // ЛіМ. 1962. 9 лют.

На польскай мове. Adolf z pod Bielska. Gawęda krytyko-literacka № 5 // Pamiętnik naukowo-literacki. 1850. T. 2. Z. 6.

3.1.

Нац. архіў РБ, ф. 1430, воп. 1, спр. 18165; ф. 2512, воп. 1, спр. 601; РДГА Літвы, ф. 1135, воп. 7, спр. 434, л. 80—95; РДГА у Маскве, ф. 458, воп. 105, спр. 158; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 7, адз. зах. 742.

Т. М Махнач.

МАРЦІНОВІЧ АЛЕСЬ

Марціновіч Алесь Андрэевіч (псеўд. А. Вішнеўскі, н. 18.8.1946, в. Казловічы Слуцкага р-на Мінскай вобл.), літаратуразнавец, крытык, публіцыст. Член СП Беларусі з 1987. Піша на рускай і беларускай мовах.

Нарадзіўся ў сям'і настаўнікаў. Бацька, Андрэй Рыгоравіч, выкладаў гісторыю, маці, Вішнеўская Яўгенія Аляксандраўна, настаўніца малодшых класаў. З 1953 А. Марціновіч вучыўся ў Комсіцкай васьмігодцы, потым у Навасёлкаўскай сярэдняй школе. У 1963 паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ, з 3-га курса перавёўся на факультэт журналістыкі, які скончыў у 1968. У 1968—69 — загадчык аддзела пісем і масавай работы ў драгічынскай раённай газеце «Запаветы Леніна». Пасля службы ў Савецкай Арміі (1969—71, камандзір мотастралковага ўзвода, г. Улан-Удэ) працаваў загадчыкам аддзела пісем і масавай работы капыльскай раённай газеты «Слава працы». З 1972 — карэспандэнт аддзела сельскай гаспадаркі слуцкай раённай газеты «Шлях Ільіча», карэспандэнт аддзела крытыкі і бібліяграфіі, з 1981 загадчык аддзела інфармацыі газеты «Літаратура і мастацтва».

Упершыню ў рэспубліканскім друку заявіў пра сябе ў 1964 невялікім допісам «Быў бы надта рады» («Літаратура і мастацтва»). Рэгулярна друкуецца з 1966. Рэцэнзія, артыкул, літаратурны партрэт, агляд, нарыс, рэпартаж, інтэрв'ю — асноўныя жанры творчай дзейнасці А. Марціновіча. У цэнтры яго ўвагі — пытанні сучаснай беларускай літаратуры. Даследуе творчасць З. Бядулі, П. Галавача, С. Грахоўскага, А. Куляшова, П. Пестрака, М. Ракітнага, І. Шамякіна і інш. Як крытык выступае з рэцэнзіямі на кнігі многіх пісьменнікаў. Складальнік брашуры «Мастацкі летапіс сучаснасці», паэтычных зборнікаў «Мы і яны», «Слова міру і праўды» і інш.

Жыве ў Мінску.

Г. М. Урупіна.

Бібліяграфія

1.2.

Далучанасць: Літ.-крытычныя артыкулы, рэцэнзіі, эсэ. Мн., 1990.

Пад небам вечнасці: [Нарысы] Мн., 1990.

Дарога ў запаветнае: Нарысы, артыкулы. Мн., 1992.

Ля Каменкі бруістай. Мн., 1992. (Па родным краі).

1.3.

1966. Жыў-быў хлапчук...: [Рэц. на кн.: Малочка М. Жил-был мальчик. Мн., 1965] // ЛіМ. 18 сак.; Жыццё — подзвіг // Там жа. 19 крас.

1967. Жыццё ў мастацтве: [Рэц. на кн.: Сяргейчык У. Нататкі акцёра. Мн., 1967] // Беларусь. № 7; Даніна часу: [Рэц. на кн.: Дарожны С. Выбр. вершы. Мн., 1966] // Там жа. № 10; Няходжаныя сцежкі паэзіі: [Рэц. на кн.: Паўлаў У. Светацені. Мн., 1967] // Вяч. Мінск. 13 ліст.; Земля, где мы живем // Знамя юности. 16 июля; Четыре слова о людях и жизни // Там жа. 25 окт.; Вецер эпохі: [Рэц. на кн.: Бураўкін Г. Дыханне. Мн., 1966] // Чырв. змена. 4 студз.; Песні і перапевы: [Рэц. на кн.: Мыслівец В. Дубы не маўчаць. Мн., 1967] // Там жа. 12 кастр.; Легенда, гартаваная ў агні // Там жа. 21 ліст.

1968. Сваім рэчышчам: [Рэц. на кн.: Пташнікаў І. Сцяпан Жыхар са Сцешпу. Мн., 1966] // Беларусь. № 3; Сваёй дарогай: [Рэц. на кн.: Міська П. Калодзеж. Мн., 1967] // Вяч. Мінск. 11 студз.; Трывож-

ная маладосць: [Рэц. на кн.: Юнацтва баявое. Мн., 1967] // Там жа. 4 сак.; Неспакойнае сэрца паэта: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. Перазовы. Мн., 1967] // Там жа. 27 чэрв.; Поэзия — его держава: [Рэц. на кн.: Пысін А. Твае далоні. Мн., 1967] // Знамя юности. 20 сент.; Праўды і сэрца голас: [Рэц. на кн.: Бічэль-Загнетава Д. Запалянкі. Мн., 1967] // Мін. праўда. 3 крас.; На подступах: [Рэц. на кн.: Шымук В. Свіцязянскія хвалі. Мн., 1968] // Там жа. 10 ліп.; Абнаўленне: [Рэц. на кн.: Тармола Р. Абнаўленне. Мн., 1968] // Там жа. 25 вер.; З вышыні пражытых гадоў: [Рэц. на кн.: Грамовіч І. Выбранае. Мн., 1968] // Там жа. 22 кастр.; Белыя пісьмы: [Рэц. на кн.: Вярба В. Белыя пісьмы. Мн., 1967] // Наст. газ. 14 лют.; Родная зямля: [Рэц. на кн.: Ермаловіч Я. Родная зямля. Мн., 1967] // Сел. газ. 19 янв.; С чистой совестью: [Рэц. на кн.: Свірка Ю. Баравінка. Мн., 1967] // Там жа. 7 марта; О людях труда: [Рэц. на кн.: Палтаран В. Ключы ад Сезама. Мн., 1967] // Там жа. 24 окт.; Сыны розных народаў // Чырв. змена. 18 студз.; Тры крокі ад сонца: [Рэц. на кн.: Стрыгалёў М. Белая Русь. Мн., 1967]; [Рэц. на кн.: Летка І. Тры крокі ад сонца. Мн., 1967] // Там жа. 6 лют.; Першая кніга крытыка: [Рэц. на кн.: Яскевіч А. Карані маладога дрэва. Мн., 1967] // Там жа. 1 жн.

Херсонам: [Нарыс] // Там жа. № 8; Паўдзённыя зоркі: Урывак з аповесці // Бярозка. № 8; Качуркі: [Апавяданне] // Вясёлка. № 4; Зямлю слухаю: [Нарыс] // Полымя. № 6; З узбекскіх далячынь: Нарыс // Там жа. № 11; І старасць поўна асалоды...: [Рэц. на кн.: Панасюк М., Татун В., Літвінчук С. Шчодрае даўгалецце. Мн., 1980] // ЛіМ. 20 сак. / Пад псеўд. В. Цімафееў; Святло і цені [Рэц. на кн.: Прокша Л. Пакуль жывеш на свеце... Мн., 1980] // Там жа. 24 ліп. / Пад псеўд. В. Цімафееў; З гушчыні народнай // Там жа. 21 жн.; Вартавы ракі // Там жа. 4 вер.; Сіла жыццёвай праўды // Чырв. змена. 8 лют.; Плысці ў рэвалюцыю далей // Там жа. 5 ліст.

1982. З узбекскіх далячынь; Сонца ў Бурштыне: [Нарысы] // Вечная крыніца. Мн.; Дарогай мужнасці: Да 70-годдзя з дня нараджэння У. Карпава // Беларусь. № 3; У братняй згодзе і дружбе // Бярозка. № 4; Сонца ў Бурштыне: Нарыс // Полымя. № 3; Якуб Колас на Пухаўшчыне // Там жа. № 10; Горад трох рэвалюцый // Там жа. № 11; З радаслоўнай братэрства: [Рэц. на кн.: Рагойша В. Кантакты. Мн., 1982] // Там жа. № 12; Пра сучасных «флібусцераў»: [Рэц. на кн.: Шыловіч Г. Сустрэча з сонейкам... Мн., 1981] // ЛіМ. 16 крас.; Памяць аднаўлення: [Рэц. на кн.: Цябут Д. На вызваленай зямлі. Мн., 1982] // Там жа. 16 ліп.; Тэлевізійны тэатр Уладзіміра Забелы // Там жа. 24 вер.; Отсчет от пулевой отметки? // ЛГ. 29 сент.

1983. Счастливцы: [Очерк] // Ступени. Мн.; Расплата за хцівасць: Роздум пісьменніка // Беларусь. № 2; Сучасная вясельная: [Верш] // Вожык. № 2; Прыліпалы: Расказ боцмана // Вясёлка. № 8; Адказнасць гаспадароў: Нарыс // Полымя. № 6; Спасцігаючы глыбіні душы: [Рэц. на кн.: Рыбак А. Што пасееш... Мн., 1982] // Вяч. Мінск. 22 ліст.; Вяртанне да жыцця: [Рэц. на кн.: Кругавых Н. Звезды во мгле. Мн., 1982] //ЛіМ. 3 чэрв.

1984. Горны воск: [Нарыс] // Сучаснік. Мн.; Глафіра: Расказ боцмана // Вясёлка. № 9; Па дарогах праўды і мужнасці // Вяч. Мінск. 20 снеж.; Среди своих людей // Сел. газ. 25 сент.

1985. Валодзька з «Бездакорнага»: З расказаў боцмана Краба // Бярозка. № 5; Ластаўкі: З расказаў боцмана Краба // Вясёлк вясёлка. № 11; Духмяны водар хлеба // Мін. праўда. 7 жн.; Даследуецца эпас народа: [Рэц. на кн.: Грамадчанка Т. Жывая памяць народа. Мн., 1984] // Наст. газ. 19 снеж.

1.4.

1974. Нарачоніс Р. Наваселле: [Апавяданне] / З літ. // Звязда. 20 сак.; Талвір А. Пігаліца: [Апавяданне] / З чув. // ЛіМ. 1 ліст.

1.5.

На марыйскую мову. Гумын йукшо: [Апавяданне] / Г. Зайниев кусарна // Марий коммуна. 1972. 9 июль.

На рускую мову. Рабочие люди: Повести, очерк / Пер. Р. Ветошкина. М., 1974. Рэц.: Мартинович А. Черты современника // Неман. 1975. № 10.

Крылатый конвейер: Очерки / Пер. Р. Ветошкина. М., 1978. Рэц.: Вішнеўскі І. Кніганіс // ЛіМ. 1979. 26 студз.; Мартинович А. // Неман. 1979. № 10.

Над селом воронье...: [Апавяданне] / Пер. В. Викторов // Неман. 1968. № 1; Наддвинская летопись: [Аповесць] / Пер. А. Белов // Белорусские повести. Л., 1971; Дубы не молчат: [Апавяданне] / Пер. Н. Татур // Белорусские рассказы. М., 1971; Горячая сталь: [Аповесць] / Пер. Б. Антонов // Неман. 1972. № 12; Конвертор: Рассказ // Рабочая смена. 1972. № 5; Последний страх: Рассказ / Пер. Н. Круговых // За тебя, Беларусь. Мн., 1974; Усадьба: [Апавяданне] / Пер. А. Кейзаров // Неман. 1978. № 8.

1.6.

Сименем Ленина в сердце. Мн., 1967 / Літ. зап.

Сучаснік: Нарысы. Мн., 1977 / Скл.

Вытокі: Нарысы. Мн., 1978 / Скл.

Сучаснік: Нарысы. Мн., 1978 / Скл.

Чарвякоў А. «Я ніколі не быў ворагам: Выбр. артыкулы і прамовы. Мн., 1992 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Брыль Я. Непарадны агляд // Брыль Я. Трохі пра вечнае. Мн., 1978; Букчын С. Нарыс: практыка і крытыка // ЛіМ. 1977. 29 ліп.; Герцовіч Я. Нашы заводчыкі // Там жа. 1976. 13 лют.; Глушакоў У. Героя трэба ўбачыць // Там жа. 1974. 27 вер.; Дубоўскі М. Не фатаграфаваць, а раскрываць // Там жа. 1974. 29 сак.; Ермаловіч М. Яго вялікасць — працаўнік // Там жа. 1974. 15 лют.; Лысенка А. На хвалі сучаснасці // Там жа. 1977. 3 чэрв.; Яго ж. Сучасны беларускі нарыс. Мн., 1978. С. 123—130; Марціновіч А. Трывожныя дні Верамеек // Звязда. 1980. 8 чэрв.; Мележ І. У нашым семінары // Мележ І. Жыццёвыя клопаты. Мн., 1975; Няхай М. Даследуючы рэчаіснасць // ЛіМ. 1973. 30 сак.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Стральцоў Б. Дзесятая пяцігодка ў беларускім нарысе. Мн., 1980. С. 67—70; Юрэвіч. У. На быстрыні жыцця // На арбіце часу. Мн., 1974; Яго ж. Нарыс — гэта даследаванне; Разведка характараў // Юрэвіч У. Абрысы. Мн., 1976; Ялугін Э. Эпахальнага не было. Аднак... // ЛіМ. 1976. 16 крас.

На рускай мове. Бечик В. Молодым идти вперед // Знамя юности. 1969. 9 апр.; Рагуля А. Время и его герои // Неман. 1972. № 12; Стрельцов М. Первое знакомство // Неман. 1968. № 1; Тюрина Т. ..А рожь сей! // Знамя юности. 1980. 1 июня.

2.4.

На беларускай мове. Маляўка М. Пчолка: [Верш] // Маляўка М. Круг. Мн., 1977.

В. І. Козіч.

МЯДЗЁЛКА ПАЎЛІНА

Мядзёлка Паўліна Вінцэнтаўна [псеўд. Паўлінка; крыпт. М.; 12(24).9.1893, в. Будслаў Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл.— 13.2.1974, Будслаў, пахавана там жа], мемуарыстка, артыстка. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1966).

Нарадзілася ў шматдзетнай сялянскай сям'і. Захавалася паданне, што прадзеда Паўліны Тамаша Мядзёлку будслаўскі памешчык выйграў у карты ў нейкага мядзельскага памешчыка і прывёз у свой маёнтак. Бацька ў маладыя гады служыў арганістам, потым стаў перакананым атэістам. Паводле ўспамінаў П. Мядзёлкі, бацька «любіў чытаць, выпісваў нейкія брашуры, асабліва па прыродазнаўству, чытаў Льва Талстога, Рэнана і пакрысе займаўся самаадукацыяй» (Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. Мн., 1974. С. 8). Дзяцінства Паўліны прайшло ў Глыбокім, куды сям'я пераехала ў 1898. Паўліна самастойна навучылася чытаць па польскіх выданнях, потым скончыла Глыбоцкае царкоўнапрыходскае вучылішча. Вялікае ўражанне на яе зрабілі падзеі рэвалюцыі 1905—07, знаёмства з нелегальнай літаратурай, газетай «Наша доля» і зборнікам Ф. Багушэвіча «Дудка беларуская». Ужо тады выступала з дэкламацыяй твораў Багушэвіча. У 1907 з дапамогай спагадлівых людзей уладкавалася на прыватныя вячэрнія курсы для дарослых у Рызе. З 1909 у Вільні, вучылася ў прыватнай жаночай гімназіі Няздзюравай і Райсмілер (адразу паступіла ў 6 клас), зблізілася з віленскімі беларусамі, пазнаёмілася з Я. Купалам, А. Бурбісам, Ядвігіным Ш., Цёткай, З. Бядулем, К. Каганцом, стала ўдзельніцай сацыялістычных гурткоў. Увосень 1912, пасля заканчэння гімназіі, паехала ў Пецярбург на Вышэйшыя камерцыйныя курсы, якія скончыла ў 1914. Прымала ўдзел у вечарах беларускай моладзі на кватэры Б. Эпімах-Шыпілы, з вялікім поспехам сыграла ролю Паўлінкі ў вядомай пецярбургскай прэм'еры п'есы Я. Купалы (1913). Падчас канікулаў удзельнічала ў рабоце Беларускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні (Паўлінка ў п'есе Я. Купалы, Пронка ў «Хаме» Э. Ажэшкі). Калі пачалася сусветная вайна, паехала да бацькоў у Глыбокае. Вясной 1915 сям'я перабралася ў Даўгінава. З надыходам кайзераўскіх войск П. Мядзёлка з малодшымі братамі паехала на Волгу ў Царыцын да сваякоў. Працавала выхавацелькай у дзіцячым прытулку, дзе было шмат дзяцей з Беларусі. Увосень 1916 запрошана ў Петраград на пасаду сакратара Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны. У сувязі з падрыхтоўкай Беларускага з'езду ў Кіеве атрымала даручэнне аб'ехаць шэраг гарадоў. У Мінску сустрэлася з М. Багдановічам, у Полацку з Я. Купалам. У 1917 працавала ў Кіеве, у Саюзе гарадоў, у аддзеле дапамогі ахвярам вайны па арганізацыі дзіцячых прытулкаў. У кастрычніку 1917 па дамоўленасці з княгіняй М. Радзівіл арганізавала беларускую школу ў в. Жорнаўка Ігуменскага пав. У сакавіку 1918 школа была закрыта. Мядзёлка перабралася ў Мінск, працавала там настаўніцай, адначасова ўдзельнічала ў пастаноўках Першага таварыства беларускай драмы і камедыі (Пронка ў «Хаме» Э. Ажэшкі, Зоська ў «Раскіданым гняздзе» Я. Купалы). З лета 1918 настаўнічала ў беларускай школе ў в. Мядзведзічы Слуцкага пав., праводзіла асветна-палітычныя гутаркі з народам. У сувязі з ускладненнем ваенна-палітычнай абстаноўкі вымушана была пакінуць Мядзведзічы і разам з братам пяшком дабралася да Вільні. Вясной 1919 у школьным аддзеле так званай Сярэдняй Літвы атрымала прызначэнне ў Гродна інспектарам беларускіх школ. Кіравала ў Гродне Грамадой беларускай моладзі, драмгуртком. 20.7. 1919 арыштавана польскімі акупацыйнымі ўладамі за ўдзел у выданні газеты «Родны край». З пачатку 1920 у Мінску, занятым польскімі акупантамі, кіравала 4-класнай жаночай беларускай школай, удзельнічала ў беларускіх спектаклях, была звязана з падполлем. У маі 1920 разам з мужам (вядомы беларускі грамадскі дзеяч эсэр Тамаш Грыб; пасля П. Мядзёлка з ім разышлася) арыштавана польскай дэфензівай. Перад вызваленнем Мінска Чырвонай Арміяй разам з іншымі палітвязнямі вывезена ў Варшаву, потым сядзела ў вядомай турме Вронкі на Познаншчыне. Пасля вызвалення з турмы накіравана на жыхарства ў Лодзь з забаронай выезду на «крэсы всходне». Праз некаторы час па падробленых дакументах выехала ў Вільню. У лютым 1921 праз Глыбокае, Нова-Свянцяны трапіла ў Літву. У Каўнасе разам

з Т. Грыбам занялася выданнем агітацыйна-прапагандысцкай літаратуры, накіраванай супраць польскіх акупантаў у Заходняй Беларусі. З восені 1921 па прапанове Ц. Гартнага працавала ў выдавецкім аддзеле пры савецкім пасольстве ў Берліне, дзе кіраўнікамі Савецкай Беларусі было наладжана выданне беларускіх кніг. У 1922 перабралася ў Латвію, выкладала ў беларускай гімназіі ў Дзвінску (Даўгаўпілсе), арганізавала там хор і драматычны калектыў, які паставіў «Паўлінку». Разам з некаторымі іншымі выкладчыкамі беларускіх гімназій была арыштавана латышскімі ўладамі за «падрыўную дзейнасць». Цэлы год ішло следства. У красавіку 1925 суд апраўдаў П. Мядзёлку і яе таварышаў. Да гэтага часу ў яе наспела рашэнне выехаць у Савецкую Беларусь. 20.5.1925 пасля афармлення адпаведных папер у савецкім пасольстве ў Рызе П. Мядзёлка з братам прыехала ў Савецкі Саюз. Адразу ж уключылася ў культурнае жыццё Беларусі. Спачатку працавала ў Мінску навуковым супрацоўнікам сектара мастацтва Інбелкульта. У 1927—30 выкладала родную мову ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, адначасова шмат сіл аддавала культурнай рабоце са студэнтамі. У 1930 беспадстаўна арыштавана і выслана за межы Беларусі, з восені 1932 стала выкладчыцай рускай мовы і літаратуры ў адной з маскоўскіх школ. Улетку 1947 пакінула Маскву і пераехала да адзінокай маці ў Будслаў. Працуючы настаўніцай у родным Будславе (1947—58), зноў арганізавала харавы і драматычны калектывы, якія з поспехам выступалі на абласных і рэспубліканскіх конкурсах.

П. Мядзёлка мае значныя заслугі перад беларускай культурай, нацыянальным тэатральным мастацтвам. Мела рознабаковыя здольнасці. У маладыя гады (з 1918) выступала ў друку з вершамі, артыкуламі, рабіла спробы ў драматургіі. Але найбольшы яе ўклад у літаратуру — мемуары «Сцежкамі жыцця». Іх фрагменты друкаваліся ў перыядычным друку з 1958, асобнае выданне выйшла ў 1974, пасля смерці аўтара. Успаміны П. Мядзёлкі, напісаныя жыва, з добрым адчуваннем слова, насычаныя багатай інфармацыяй, па праву займаюць пачэснае месца ў беларускай дакументальнай прозе. У ліку блізкіх Я. Купалу людзей выведзена ў рамане-эсэ А. Лойкі «Як агонь, як вада...». У 1980 на яе магіле ў Будславе пастаўлены помнік. Асобныя рукапісы і дакументы П. Мядзёлкі захоўваюцца ў Літаратурным музеі Я. Купалы, Архіве інстытута гісторыі АН Беларусі, краязнаўчым музеі ў Маладзечна і іншых сховішчах, а таксама ў прыватных асоб.

Г. В. Кісялёў.

Бібліяграфія

1.2.

Сялянская доля: Паэма. Б. м., 1921 / Адб. з час. «Сялян. доля» / Пад псеўд. Паўлінка.

Сцежкамі жыцця. Мн., 1974. Рэц.: Л а ў ш у к С. // Неман. 1975. № 10; Ш а х о в і ч В. Слова пра перажытае // ЛіМ. 1975. 24 кастр.

1.3.

1918. Беларускі тэатр // Бел. шлях. 31 мая / Пад крыпт. П.

1921. Сялянская доля: [Паэма] // Сялян. доля. № 1 / Пад псеўд. Паўлінка; Растуць сілы: (1-ы акт са сцэнічнага твору «За волю Бацькаўшчыны») // Там жа. № 2; Песня змагання: [Верш] // Там жа. № 3.

1922. У выгнанні: (Імпрэсіі) // Наша будучыня. 8 снеж.

1923. Песня змагання: [Верш] // Сялян. доля. № 3.

1926. Прамень культурнага адраджэння // Заря Запада. 21 нояб.

1958. Пастаноўка Паўлінкі ў Пецярбургу: [Успаміны] // Янка Купала ў беларускім мастацтве. Мн.

1959. Сцежкамі жыцця: [Успаміны] // Полымя. № 5—7; Фактычныя папраўкі // ЛіМ. 18 крас.

1960. Маці // ЛіМ. 6 ліст.

1975. «Павлинка» в моей жизни // Люди Нарочанского края. Мн.; Пастаноўка «Паўлінкі» ў Пецярбурзе // Такі ён быў. Мн.

1979. На роднай мове // Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Е р м а л о в і ч М. Першая выканаўца // Наст. газ. 1973. 15 вер.; [Л і с А.] Святло доўгага дня // Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. Мн., 1974.

2.4.

На беларускай мове. К у п а л а Я. Снілася дзяўчыне: [Верш] // Купала Я. Зб. тв.: У 7 т. Т. 3. Мн., 1973.

3.1.

БДА, ф. 883 с., воп. 1, с. 18; Інстытут гісторыі АН Беларусі, архіў, ф. 21, спр. 8; Літаратурны музей Янкі Купалы, КП 4081—4108; ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1.

М. П. Барташэвіч.

МЯЖЭВІЧ УЛАДЗІМІР

Мяжэвіч Уладзімір Навумавіч (23.5.1907, в. Крывушча Аршанскага пав. Віцебскай губ., цяпер пас. Якаўлевічы Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 1.7.1982, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках), празаік, журналіст. Член СП Беларусі з 1971.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька памёр у 1918. У. Мяжэвіч як старэйшы ў сям'і (6 дзяцей) пасля двух гадоў вучобы ў царкоўнапрыходскай школе вымушаны быў пайсці працаваць. Працаваў загадчыкам хаты-чытальні (1925), загадваў аддзелам прапаганды ў Копыскім, Горацкім райкомах камсамола (1926—27), быў сакратаром Горацкага райкома камсамола (1928). Займаўся самаадукацыяй. Паступіў на вячэрняе аддзяленне літаратурна-гістарычнага факультэта БДУ, адначасова накіраваны на працу ў Мінск у газету «Звязда», быў літсупрацоўнікам, потым загадчыкам аддзела культуры (1929—33). Удзельнічаў у рабоце Аршанскай філіі «Маладняка». У 1933 рэдагаваў бягомльскую раённую газету «Калгасны змагар». Працаваў карэспандэнтам газеты «Известия» па Беларусі (1934—37). У 1937 У. Мяжэвіч быў беспадстаўна арыштаваны і прыгавораны да 10 гадоў пазбаўлення волі. Пры вобыску ў яго забралі і не вярнулі рукапісы новых мастацкіх твораў. Каля 20 гадоў жыў за межамі Беларусі. Працаваў лесарубам, брыгадзірам у Канскім леспрамгасе Краснаярскага краю, у 50-я гады працаваў галоўным інжынерам, дырэктарам леспрамгаса. 26.1.1955 рэабілітаваны, вярнуўся ў Мінск, працаваў у часопісах «Вожык», «Вясёлка», «Бярозка», карэспандэнтам газеты «Лесная промышленность» (1956—67). Узнагароджаны медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Літаратурную дзейнасць пачаў як юнкор у 1924. У 1931—32 выдадзены яго першыя кнігі нарысаў і апавяданняў («Крок у будучыню», «Шляхам герояў»), у якіх паказваліся працоўныя дасягненні Беларусі. Друкаваўся ў часопісе «Беларуская работніца і сялянка», газетах «Звязда», «Чырвоная змена». У складзе выязных рэдакцый часта бываў на будоўлях (Крычаўскі цэментны завод, БелДРЭС), па гарачых слядах пісаў нарысы, фельетоны, гумарэскі, артыкулы, якія публікаваліся ў рэспубліканскай перыёдыцы. У 60—70-я гады выйшлі яго кнігі нарысаў «Землякі», «Спатканні на дарогах. Запіскі карэспандэнта», зборнікі апавяданняў «Шляхам герояў», «Яны былі першымі», «Аксамітны бляск», прысвечаныя надзённым пытанням рэчаіснасці. Шмат пісаў для дзяцей (кнігі апавяданняў «Медунічкі», «Выдумшчыцы», аповесць «Стрэлы на зялёнай палянцы»).

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Крок у будучыню: Нарыс. Мн., 1931.

Шляхам герояў: Апавяданні. Мн., 1932.

Медунічкі: Апавяданні. Мн., 1966.

Землякі: Нарысы. Мн., 1969. Рэц.: Мікалаевіч Д. Дарагі мой чалавек // Беларусь. 1970. № 4.

Лясныя знаходкі: Апавяданні і нарысы. Мн., 1969.

Яны былі першымі: Нарысы і апавяданні пра першых камсамольцаў. Мн., 1970.

Аксамітны бляск: Апавяданні, гумарэскі. Мн., 1971 (Б-ка «Вожыка»).

Выдумшчыцы: Апавяданні. Мн., 1971.

Стрэлы на зялёнай палянцы: Аповесць. Мн., 1973.

Спатканні на дарогах: Запіскі карэспандэнта. Мн., 1978. Рэц.: Досін М. // Звязда. 1979. 18 жн.

На ўсходзе сонца: Апавяданне. Мн., 1982.

1.3.

1925. Па камсамольскай Беларусі // Малады араты. № 15; Газетные частушки: От нашего юнселькора // Красная смена. 12 февр.

1926. «Новы акцівіст»: Як бы фельетон // Чырв. змена. 27 студз.

1931. У баях за калгасы: Апавяданне // Бел. работніца і сялянка. № 19.

1932. Новыя песні спявае Палессе: [Нарыс] // Звязда. 6—7 ліст. / Сааўт. Э. Кіпер.

1933. У гасцях у кулака...: [Нарыс] // Звязда. 11 студз.

1957. Партызанскія сёстры: [Нарыс] // Маладосць. № 9; На Дняпры: Рэпартаж // Сел. гасп. Бел. № 8; Зусім не фантазія: Фельетон // Звязда. 24 лют.; Хвоелістагрызучыя наезнікі // Калг. праўда. 1957.

12 ліп.; Пяюць плытагоны: Нарыс // ЛіМ. 13 сак.; У абарону зялёнага друга: Нарыс // Там жа. 3 крас.; Не дело, только мука // Сов. Бел. 2 июня.

1958. Сціпласць: Нарыс // Беларусь. № 3; Кантрасты: Дарожныя нататкі // Там жа. № 10; Дзе лес, а дзе кантора!..: Апавяданне // Вожык. № 13; Колькі каштуюць скрыні?..: Апавяданне // Там жа. № 23; Народная песня звініць на Дняпры // Сел. гасп. Бел. № 11.

1959. Дубава сястра: [Апавяданне] // Бярозка. № 8; Чырвоны бант: Апавяданне // Вясёлка. № 5; У баптысцкай пастцы: Нарыс // ЛіМ. 4 крас.; На савецкай зямлі: Нарыс // Там жа. 29 крас.; З карэспандэнцкага блакнота: Нататкі // Там жа. 18 ліп.; З блакнота журналіста: У налібоцкай пушчы; Сляза радасці; Зварот да жыцця // Там жа. 29 жн.; Радаснае расчараванне: Нарыс // Там жа. 31 кастр.; Порцыя радасці: Нарыс // Там жа. 12 снеж.; Чаго не ведаеш — не пішы: Рэпліка чытача // Там жа. 19 снеж.

1960. Даўнія сябры // Беларусь. № 3; Як пазнаюцца людзі: Апавяданне // Там жа. № 8; У сваю кішэнь: Апавяданне // Вожык. № 23; Шчодры дзядзечка: Нарыс // Звязда. 9 чэрв.; Кубаметр ліха: Фельетон // Там жа. 17 вер.; Четко, ритмично... // Лесная пром-сть. 15 марта; Новые письма Веры Хоружей // Там жа. 2 апр.; И сердцу можно приказать // Там жа. 28 июня; Герои минского подполья // Там жа. 26 июля; Большая семья // Там жа. 1 окт.; Частная контора «Вольпер и К^0» // Там жа. 22 нояб.; Решение вынесли... А дальше? // Там жа. 29 дек.; «Жартаўнікі» // ЛіМ. 3 лют.; Ён працаваў з Леніным: Успаміны // Там жа. 10 лют.; Сямёра ў адной машыне // Там жа. 12 мая; Давер'е акрыляе чалавека: [Пра лёс Міколы Стракатага]: Нарыс // Там жа. 5 ліп.; З першага позірку: Апавяданне // Там жа. 29 ліп.; Горад цудоўнай явы // Там жа. 10 чэрв.; Побач з намі: Нарыс // Там жа. 6 ліст.; Справа павінна быць перагледжана: Нарыс // Там жа. 2 снеж.; Святочны госць: Нарыс // Там жа. 30 снеж.; Адзін супраць трохсот: Фельетон // Мін. праўда. 14 вер.

1961. Сляды на вадзе: [Фельетон] // Вожык. № 21; «Наш аргенцінец»: [Нарыс] // Голас Радзімы. № 38; Слонімскія алхімікі // Звязда. 10 сак.; Жывая легенда // Там жа. 18 мая; І швагер, і сват, і кум, і брат // Там жа. 4 чэрв.; Прыватнік на ватмане // Там жа. 8 вер.; Вспоминая годы грозовые...: [Апавяданне] // Лесная пром-сть. 3 янв.; Заслуженный рационализатор республики // Там жа. 7 янв.; Трудовые успехи белорусских деревообработчиков // Там жа. 24 янв.; Во власти предрассудков: На бытовые темы // Там жа. 11 марта; Нина ждет отца: На бытовые темы // Там жа. 14 марта; Продолжение некрасивой истории // Там жа. 16 марта; «Невмешатели»: Фельетон // Там жа. 21 марта / Сааўт. А. Міхайлаў; ... И нос в табаке: Фельетон // Там жа. 28 марта / Сааўт. А. Міхайлаў; Литва — Белоруссия: Соревнование // Там жа. 11 апр.; Слово за Совнархозом // Там жа. 1 авг.; С этажа на этаж // Там жа. 25 нояб.; История с недописанным концом. Что тормозит модернизацию бумагопрядильных машин в Белоруссии // Там жа. 28 нояб.; Инициатива борисовских лесоводов // Там жа. 5 дек.; В профгруппе Раисы Чикуновой // Там жа. 16 дек.; Хойзингера — на скамью подсудимых // Там жа. 21 дек.; Па волі хваль // ЛіМ. 31 студз.; Гэта выклікае трывогу: Нарыс // Там жа. 24 лют.

1962. Сэнс жыцця: Нарыс // Маладосць. № 1; Крыніца радасці, крыніца багацця // Полымя. № 3; Калідорная баталія: Нарыс // Звязда. 22 лют.; Уласнік на арбіце // Там жа. 11 мая; У другім крэсле: Нарыс // Там жа. 30 мая; Ход каровай: [Фельетон] // Там жа. 15 ліп.; Замкнутыя дзверы: Нарыс // Там жа. 5 жн.; Ведамасны паркан // Там жа. 8 жн.; Пыл у вочы: [Фельетон] // Там жа. 6 вер.; Прыватнік на ватмане: Нарыс // Там жа. 8 вер.; Счастье // Лесная пром-сть. 1 янв.; Подвиг новоборисовских дружинников // Там жа. 4 янв.; О том, как поссорились // Там жа. 9 янв.; Директор во гневе // Там жа. 23 янв.; Николай Васильков и другие // Там жа. 13 февр.; Использовать резервы производства // Там жа. 3 марта; Не числом, а умением // Там жа. 24 марта / Сааўт. Г. Серабракоў; Почину Николая Василькова — широкую поддержку // Там жа. 3 июля / Сааўт. І. Осіпаў; Цвести Полесью // Там жа. 4 авг.; Корнеев и в ус не дует // Там жа. 6 сент.; Омела // Там жа. 6 окт.; Человек красив трудом // Там жа. 16 окт.; Дело чести лесозаготовителей Белоруссии // Там жа. 27 окт.; Директор именинник // Там жа. 17 нояб.; Чалавек блукаў крывымі сцежкамі: Нарыс // ЛіМ. 14 вер.; Жанчына ў чорнай хустцы // Там жа. 11 снеж.; Васіль Каляда // Мін. праўда. 1 студз.

1963. Хватаў мяняе кватэру: Апавяданне // Вожык. № 14; Абы грошы: З блакнота журналіста // Там жа. № 20; Як нарадзіўся той сшытак: Апавяданне // Вясёлка. № 1; Сустрэча з марай: [Нарыс] // Звязда. 5 сак.; Бар'ер — раўнадушнасць // Там жа. 22 ліст.; Гарантаваныя мільёны // Там жа. 26 ліст.; Сорам вачэй не выесць: Нарыс // ЛіМ. 29 сак.; Купяць — не купяць // Там жа. 21 мая; «Дрэнны хлопчык»: Гумарыстычнае апавяданне // Мін. праўда. 1 снеж.; На лесных делянках: Заметки из передового леспромхоза // Сов. Бел. 2 марта.

1964. Пастка: Апавяданне // Бярозка. № 6; Хамелеон: [Апавяданне] // Вожык. № 8; Бабуліна пісьмо: Гумарэска // Там жа. № 15; Каб раслі буйныя каласы: [Верш] // Вясёлка. № 4; Крылатая мужнасць // Там жа. № 6; Осень в Миловидах: [Нарыс] // Неман. № 1; Дарагі мой чалавек: Нарыс // Полымя. № 12; Дегустация по-гомельски: Фельетон // Лесная пром-сть. 23 июня; Припять — река труженица // Там жа. 30 июня; Древесная масса заменяет целлюлозу // Там жа. 9 июля; Станет ли лесом белорусская топь? // Там жа. 29 авг.; Настоящая родина семьи Лоллини // Там жа. 5 дек.; Клапатлівыя людзі // Наст. газ. 19 вер.

1965. Дактары: Апавяданне // Бярозка. № 9; Пралескі і дзяцел: Апавяданне // Вясёлка. № 4; Живые помнят // Лесная пром-сть. 11 марта; Лучше руководить социалистическим соревнованием // Там жа. 13 мая; Лиственная древесина идет на в... дрова // Там жа. 8 июля; И снова поиск // Там жа. 11 июля; Когда труд — радость // Там жа. 24 июля; Вздымщик Феликс Нитиевский // Там жа. 7 авг.; Забыли о главном // Там жа. 28 авг.; Причины настоящие и мнимые // Там жа. 25 сент.; Не попустительствовать бракоделам // Там жа. 21 окт.; Последний рэйс «Шефа» // Там жа. 7 нояб.

1966. Бабуліна пісьмо: Гумарэска // Вожык у дарозе. Мн.; Дактары: [Апавяданне] // Чырвоныя лісткі календара. Мн.; Цецярукі: Апавяданне // Вожык. № 7; Сынкі: [Гумарэска] // Там жа. № 9; Жывіца: Апавяданне // Вясёлка. № 8; Творческие бригады за работой // Пром-сть Бел. № 8; Дочь краснодеревщика // Лесная пром-сть. 22 авг.; Резервы белорусских лесоводов. Больше древесины от рубок ухода // Там жа. 18 окт.

1967. Гаспадары лёсу: Нарыс // Беларусь. № 7; Метрантаж і рэдактар: Быль // Там жа. № 8; Гуз: [Гумарэска] // Вожык. № 18; У каго ён урадзіўся?: Гумарэска // Там жа. № 22; Пушчык дома: [Апавяданне] // Вясёлка. № 4; Падпольшчык: [Апавяданне] // Там жа. № 8; Когда сосуществуют с баптистами // Лесная новь. № 12; Адплата: Быль // Маладосць. № 7; Жывіца: З блакнота журналіста // Там жа. № 12; Рядом с Ильичом // Сов. Бел. 7 апр.

1968. Звяздоўцы гадоў першай пяцігодкі // Наша «Звязда»: 1917—1967 гг. Мн.; Паядынак; Родная сястра таленту: [Нарысы] // Пройдуць гады. Мн.; Лягчэй знайсці, чым згубіць...; Перавыхаваў: [Гумарэскі] // Вожык. № 4; Штраф; Калі ласка: [Гумарэскі] // Там жа. № 13; Цана білета — два яйкі: З нататак былога камсамольца // Там жа. № 20; Беларускія асілкі: [Апавяданне] // Вясёлка. № 4; У суніцы: [Апавяданне] // Там жа. № 6; Волат на Дняпры: Апавяданне // Там жа. № 7; Из партизанских былей // Лесная новь. № 2; Не ў адстаўцы: Фотарэпартаж // Маладосць. № 5; С компасом Октября: [Нарыс] // Неман. № 11; Разам з людзьмі: Успаміны // Полымя. № 5.

1969. Апошняя ўсяночная; Стрэл у спіну: Былі // Беларусь. № 4; Спадчына // Бярозка. № 6; Грыбнікі: Апавяданне // Там жа. № 7; Дзівосы па блату: Апавяданне // Вожык. № 15; Штуршок мазгам: Апавяданне // Там жа. № 17; Лядзянка: [Апавяданне] //

Вясёлка. № 3; Весялуха: Казка // Там жа. № 8; Тэлеграфіст Леніна: [Апавяданне] // Там жа. № 10; Наброски к портрету // Лесная новь. № 5.

1970. Тэлеграфіст Леніна: [Апавяданне] // З Леніным заўсёды Беларусь. Мн.; Весялуха; Казка; У суніцы; Бобрыная лядзянка; Жывіца: [Апавяданні] // Крынічка. Мн.; Лясныя красуні: (Расказы аб прыродзе) // Бярозка. № 8; Пільнасць: З камсамольскіх быляў // Там жа. № 9; Небяспечнае заданне: Апавяданне // Там жа. № 12; Чырвоны сцяг: [Апавяданне] // Вясёлка. № 2; Сюрпрыз: [Апавяданне] // Там жа. № 6; Па заслугах: [Апавяданне] // Там жа. № 8; Чацвёра Маковічаў: [Апавяданне] // Там жа. № 10; Выдумшчыцы: [Апавяданне] // Там жа. № 12; А курка і рыбка — крадзеныя! // Звязда. 25 сак.; Праз гады: З блакнота журналіста // Там жа. 15 мая; Крывёю сэрца // Там жа. 20 жн.; Вішнёвыя костачкі // Там жа. 6 вер.; У незабыўныя дваццатыя...: Урывак з кнігі «Яны былі першыя» // ЛіМ. 25 вер.; Навагодняя сітуацыя: Гумарэска // Там жа. 18 снеж.; Янка не Лойд...: [Апавяданне] // Наст. газ. 23 вер.; Отплата: Из блокнота комсомольца 20-х годов // Сел. газ. 25 сент.

1971. Піянерская дынастыя: Апавяданне // Бярозка. № 3; Схватка: Аповесць // Там жа. № 6, 7; А маці чакала: [Апавяданне] // Вясёлка. № 4; Даследчыца: [Апавяданне] // Там жа. № 8; «Пераначуем — болей пачуем» // Звязда. 10 студз.; Нехта сказаў...: Жарт // ЛіМ. 28 мая; Вартасць у рублях: Жарт // Там жа. 11 чэрв.; Навошта чалавеку газета? // Там жа. 24 снеж.

1972. Разгаданая тайна: Маленькая аповесць // Бярозка. № 7; Уздых з палёгкам: [Апавяданне] // Вожык. № 8; Скарб: [Апавяданне] // Вясёлка. № 5: Ад дзесяці і далей // Звязда. 26 вер.; З пакункам пад пахай // Там жа. 24 кастр.

1973. Чыё дрэва цікавейшае: Апавяданне // Бярозка. № 9; Свістун: [Апавяданне] // Вясёлка. № 2; Дзік, лось і вожык: [Апавяданне] // Там жа. № 12; Белорусские микроны // Неман. № 5; Самае дарагое: Нарыс // Звязда. 18 лют.

1974. Строгі індык: Казка // Вясёлка. № 6; Ідзе, гудзе зялёны шум...: Нарыс // Полымя. № 5; Колькі каштуе капейка? // Звязда. 30 ліп.; Што за адпіскай // Там жа. 14 ліст.

1975. Гамоняць лясы: Нарыс // Бярозка. № 6; Перад поўднем: Апавяданне // Там жа. № 12; Талент слухаць чалавека // Полымя. № 1.

1976. Лясная быль: [Нарыс] // Беларусь. № 10; Два апавяданні // Там жа. № 12; Дубок ля дарогі: [Апавяданне] // Вясёлка. № 11; Жаніх з Чыкага: З кнігі «Час, людзі, характары» // Звязда. 8 мая.

1977. Рысы характару: [Нарыс] // Беларускі савецкі нарыс: У 2 т. Мн. Т. 1; Як я гуляў з Ласкерам...: З запісной кніжкі пісьменніка // Беларусь. № 5; Пасылка з Афрыкі: Апавяданне // Бярозка. № 1; Жыві кніга // Там жа. № 3; Пакрыўджаная барада; Душу адвесці: [Гумарэскі] // Вожык. № 9; Пяцёрка: [Апавяданне] // Вясёлка. № 5; Юнацтва камсамольскае маё: Абразкі // Маладосць. № 5; Фітанцыды: Апавяданне // Полымя. № 1; Вядровічы: Апавяданне // Там жа. № 5; У тыя далёкія далі: Нарыс // ЛіМ. 25 ліст.; Даражэй за Дэмакрыта // Чырв. змена. 24 мая.

1978. Чыё дрэва цікавейшае: [Апавяданне] // Ніва. 12 ліст.

1979. Репортажи с берегов Ипути: [Нарыс] // Первая строка. Мн.; Чонаўскі экзамен: Апавяданне // Бярозка. № 6.

1980. Бабуля і ўнучка: [Апавяданне] // Вясёлка. № 3; Равеснікі Кастрычніка: [Апавяданне] // Там жа. № 11; Кветкі для Купалы: [Успаміны] // ЛіМ. 5 снеж.

1981. Цяцерка: [Апавяданне] // Вясёлка. Мн.; «Іскраць залатой завірухай кастры»: Успаміны // Дзень паэзіі — 81. Мн.; Таямніца старога акопа: Апавяданне // Бярозка. № 11; Першыя радасці: Апавяданне // Маладосць. № 4.

1982. Камандзір: [Апавяданне] // Бярозка. № 5; Плата за каханне: Гумарэска // Вожык. № 10; Будаўнікі: [Апавяданне] // Вясёлка. № 5; На лямпачку Ільіча: Быль // Полымя. № 5; Паэт і газета: Успаміны (Пра Якуба Коласа) // Там жа. № 10; Горкі мёд: Раздзел з аповесці «На ўсходзе сонца» // ЛіМ. 5 лют.

1983. Тэлеграфіст Леніна: [Апавяданне] // Вяснянка. Мн.

1984. Дактары: [Апавяданне] // Чырвоныя лісткі календара. Мн.; Парк у Грыднічах: [Апавяданне] // Вясёлка. № 5.

1.5.

На польскую мову. Nad brzegami Dźwiny // Orka. 1932. 13 lipca.

На рускую мову. Ошибка: Рассказ // Сов. Бел. 1957. 14 сент.; Строки на стене / Пер. М. Досин // Во славу Родины. 1978. 16 апр.

На татарскую мову. Мэхэббэт хакы: [Гумарэска] // Ленин байрагы (Бугульма). 1982. 12 окт.

2.3.

На беларускай мове. Кухараў С. «І ўсё ж я шчаслівы...» // ЛіМ. 1982. 21 мая; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Уладзімір Мяжэвіч: [Некралог] // ЛіМ. 1982. 9 ліп.; Уладзіміру Мяжэвічу — 75 // Там жа. 1982. 21 мая.

В. М. Грышкевіч

МЯЛА ІВАН

Мяла Іван Ільіч (н. 3.7.1918, в. Сцяпок Старадубскага р-на Бранскай вобл.), празаік, вучоны ў галіне пратазаалогіі. Кандыдат ветэрынарных навук (1957). Член СП Беларусі з 1967. Піша на рускай і беларускай мовах.

Нарадзіўся ў сям'і селяніна. Бацька, Ілья Якаўлевіч, працаваў на сельскай гаспадарцы, рабочым на чыгунцы ў Хабараўскім краі. У 1935 І. Мяла скончыў Левенскую школу рабочай моладзі і паступіў у Асташкаўскі ветэрынарны тэхнікум (скончыў у 1939). Служыў у Чырвонай Арміі намеснікам палітрука, ваенветфельчарам (1939—40), начальнікам армейскага ветэрынарнага склада (1941—42). У 1943—47 вучыўся ў Ваенна-ветэрынарнай акадэміі. Дэмабілізаваны з 4-га курса ў сувязі з расфарміраваннем акадэміі. Паступіў у Маскоўскі зоаветэрынарны інстытут на 5-ы курс, у 1947 атрымаў дыплом ветэрынарнага ўрача. Працаваў эпізаатолагам (ветэрынарны ўрач па заразных хваробах) у Старадубскім раёне (1947—48), выкладчыкам, дырэктарам Старадубскай міжраённай калгаснай школы (1949—52). Вучыўся ў аспірантуры (1952—56) у Маскве пры Усесаюзным інстытуце эксперыментальнай ветэрынарыі, абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці пратазаалогія (1957). Працаваў старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыі ў Далёкаўсходнім навукова-даследчым ветэрынарным інстытуце ў Благавешчанску (Амурская вобл.;1958—62). У 1962 абраны старшым навуковым супрацоўнікам Беларускага ветэрынарнага навукова-даследчага інстытута, працаваў у лабараторыі энтамалогіі і пчалярства Беларускага навукова-даследчага інстытута эксперыментальнай ветэрынарыі (1962—79). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1945. Па рэкамендацыі В. Катаева быў прыняты ў Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага на аддзяленне прозы. Аднак навуковая і вытворчая праца па ветэрынарыі не далі магчымасці скончыць Літінстытут. Пісаў нарысы, замалёўкі. Першае апавяданне («Белы конь») апублікавана ў 1947 у часопісе «Огонек». Друкаваў нарысы ў бранскім альманаху «Край родной», часопісе «Дальний Восток», аповесці і раманы ў часопісах «Неман», «Наш современник». Аўтар раманаў, аповесцей, прысвечаных гістарычнаму мінуламу («Прынада», «Аўсяны бунт»), грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнам («Раскол», «Паўстанцы», «Нізаўскія партызаны», «Вернасць»), праблемам сучаснасці, калгаснаму жыццю («Настаччыны агледзіны», «Спакушэнне Гарпіны», «Адлучка», «Засуха»). У 1989 надрукаваў («Нёман», № 1) аўтабіяграфічную аповесць «Каранцін», дзе расказаў пра свае сустрэчы з В. Катаевым, Ю. Алешам, В. Шклоўскім. Пісаў п'есы («Справа гонару»), апублікаваў 47 навуковых прац па пытаннях ветэрынарыі і заалогіі.

Жыве ў пас. Кунцаўшчына (Мінскі р-н).

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Нижневские животноводы. Брянск, 1951.

Стародуб: Историко-экономический очерк о г. Стародубе и Стародубском районе. [Брянск], 1951.

Защита животных от гнуса. Благовещенск-на-Амуре, 1961 / Сааўт. К. Андрэеў.

Горит в степи маяк. Благовещенск, 1962.

Низовские партизаны: Роман. Благовещенск, 1962.

Дело чести: [П'еса]. М., 1963.

Как бороться с наружными паразитами птиц. Мн., 1964.

Слепни и защита скота от них. Мн., 1968.

Верность: Роман. М., 1969. Рэц.: Климашевская И. Верность и доверие // Неман. 1970. № 2.

Настенькины смотрины; Повести; Рассказы. Мн., 1969. Рэц.: Климашевская И. Верность и доверие // Неман. 1970. № 2.

Раскол: Роман. Мн., 1972. Рэц.: Бурносов В. В вихре революции // Сел. газ. 1972. 23 июля; Дмитриев В. Кровавые перекрестки // Знамя юности. 1972. 30 июля; Егарэнкава Г. Пра час, пра чалавека // ЛіМ. 1972. 27 кастр.; Егоренкова Г. О времени, о человеке // Лит. обозрение. 1973. № 3.

Искушение Гарпины: Роман. Мн., 1975. Рэц.: Пары-

гин В. Про наших современниц // Брянский рабочий. 1976. 16 мая.

Повстанцы: Роман. Мн., 1980.

Принада: Роман. Мн., 1982. Рэц.: Парыгин В. «Принада» // Брянский рабочий. 1983. 29 окт.

Овсяный бунт: Исторический роман. Мн., 1986.

Разбранница: Роман. М., 1992.

1.3.

1947. Белый конь: Рассказ // Огонек. № 41.

1949. Беспокойные сердца // Беспокойные сердца. Брянск; Мои земляки: Очерк // Край родной. Брянск.

1952. Анна Максимовна: Очерк // Край родной. Брянск.

1957. Материалы по изучению анаплазмоза и бабезиемеза овец при смешанной инвазии // Тр. ВИЭВ. Т. 21.

1959. Как вести борьбу с гнусом // Амурская правда. 11 июня.

1960. Прибор для отлова летающих насекомых и контактирования их с инсектицидами // Медицинская паразитология и паразитарные болезни. № 3.

1961. О полиморфизме вида Babesiella ovis Babes // Зоологич. журнал. № 10; Полихлорпинен для борьбы с мухами // Медицинская паразитология и паразитарные болезни. № 5.

1962. Автожижеразбрызгиватель АНЖ — 2 для борьбы с гнусом // Ветеринария. № 6 / Сааўт. Ю. Фамін; Механизация борьбы с гнусом на Дальнем Востоке // Тр. ВНИИВС. Т. 20; Дезоустановка на электротоке; Слепни Зейско-Буреинской низменности и защита от них скота // Тр. Дальневосточного НИВИ. Т. 4.

1963. Простой опрыскиватель // Ветеринария. № 10 / Сааўт. І. Ганчароў, М. Гарадовіч.

1964. К вопросу инсектицидных опрыскиваний животных // Ветеринария. № 7; Настенькины смотрины: Рассказ // Наш современник. № 4; Передний край: Повесть // Неман. № 2. Рэц.: Браілоўскі А. Сяргей Чабатар здае экзамен... // ЛіМ. 12 мая; Марушкевич Н. // Сел. газ. 28 июня.

1966. Бытень: Повесть // Наш современник. № 6; Выборочная обработка инсектицидами коров черной масти // Сел. х-во. Бел. № 7; Из опыта оздоровления птицеферм Белоруссии от куриных клещей; Новое о сирингофилезе кур // Тр. Бел. НИВИ. Т. 5.

1967. О предосторожности при применении трихлорметафоса — 3 // Ветеринария. № 6; Верность: [Роман] // Неман. № 1—3; Удобный опрыскиватель // Сел. х-во Бел. № 12; Инсектицидные свойства гербицидов 2, 4 — Д; дикотекс — 40, дикотекс — 80; Масти скота и окраски предметов, привлекающие слепней // Тр. Бел. НИВИ. Т. 6.

1968. Быль с тюльпанами: [Апавяданне] // Ашхабад. № 1; Мы тебе верим: (Из рассказов о Юрии Олеше) // Неман. № 2; Дома: Старонкі з рамана «Раскол» // ЛіМ. 5 ліп.

1969. Чертово беремо: (Повесть) // Неман. № 1; Здрада: [Нарыс] // ЛіМ. 21 сак.

1970. Раскол: (Роман) // Неман. № 4—6; Настенькины смотрины: Рассказ // Сел. жизнь. 28 февр.

1971. Искушение Гарпины: [Раман] // Неман. № 8, 9.

1973. Повстанцы: Роман // Неман. № 11, 12. Рэц.: Егарэнкава Г. Рытмы эпохі // ЛіМ. 1974. 1 сак.

1976. «Пазнаю праз здзіўленне» // ЛіМ. 23 крас.; Пярэдні край: Дарожныя нататкі // Там жа. 20 жн.

1977. Отлучка: [Аповесць] // Неман. № 5.

1979. Жывёлаводы: Нарыс // ЛіМ. 27 ліп.

1983. На родине: Очерк // Брянский рабочий. 9 окт.

2.3.

На беларускай мове. [Віншаванне з юбілеем] // Беларусь. 1978. № 7; Вучоны і пісьменнік: Івану Мялу — 50 гадоў // ЛіМ. 1968. 5 ліп.; Івану Мялу — 60 // Там жа. 1978. 30 чэрв.; Кудзінаў У. Слова пра старэйшага таварыша // Там жа. 1978. 30 чэрв.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981.

На рускай мове. Из почты «Немана» // Неман. 1978. № 9; Парыгин В. Писатель И. И. Мяло // Блокнот агитатора Брянского обкома КПСС. 1978. № 12.

В. І. Козіч.

МЯЛЕЦІ СМАТРЫЦКІ

Мялеці Сматрыцкі (свецкае імя Максім Герасімавіч, псеўд. Теophil Ortolog; 1577, мяст. Смотрыч, цяпер г. п. Дунаявецкага р-на Хмяльніцкай вобл.— 27.12. 1633, с. Дзермань, цяпер с. Усценскае Другое Ровенскай вобл., Украіна, пахаваны там жа), беларускі і ўкраінскі пісьменнік-палеміст, вучоны, грамадска-палітычны і рэлігійны дзеяч. Пісаў на старажытных беларускай і ўкраінскай, а таксама польскай і лацінскай мовах.

Нарадзіўся ў сям'і камянецкага пісара, пісьменніка-палеміста, рэктара Астрожскай калегіі Герасіма Данілавіча Сматрыцкага. Першапачатковую адукацыю атрымаў пад непасрэдным кіраўніцтвам бацькі і грэка Кірылы Лукарыса, будучага канстанцінопальскага патрыярха. Пасля смерці бацькі накіраваны князем К. Астрожскім на філасофскі факультэт Віленскай езуіцкай акадэміі, дзе вучыўся ў 1594—1600 (паводле іншых звестак — у 1601—04). З 1601, пасля Лаўрэнція Зізанія, стаў настаўнікам маладога беларускага магната Б. Саламярэцкага. З ім паехаў у Зах. Еўропу для ўдасканалення ведаў у Лейпцыгскім і Вітэнбергскім універсітэтах, дзе ў тыя гады панавалі ідэі Лютэра, Кальвіна, Цвінглі. Пабываў таксама ў Нюрнбергу, Вроцлаве, Вюрцбургу. Каля 1607 вярнуўся на радзіму, некаторы час жыў у маёнтку Саламярэцкіх недалёка ад Мінска; потым адправіўся ў Вільню, дзе ў віленскім праваслаўным брацтве зблізіўся з Лявонціем Карповічам.

Пра пачатак літаратурнай дзейнасці Мялеція Сматрыцкага дакладных звестак няма. Першы друкаваны твор палеміста, які дайшоў да нашага часу, «Антыграфі» (1608) накіраваны супраць кніг І. Пацея «Ерасі» і «Гармонія». Праз два гады пад псеўданімам Тэафіла Арталога з брацкай друкарні пры манастыры Святога духа ў Вільні выйшла яго кніга «Трэнас». Каля 1615 напісаў на польскай мове «Трактат пра зыходжанне Святога духа», а таксама «Палінодыю». Першы твор часткова ўвайшоў у палемічнае сачыненне Льва Крэўзы «Абарона еднасці» (1617).

Прыкладна з 1615 да 1617 Мялеці знаходзіўся ў Кіеве. У 1617 вярнуўся ў Вільню, быў настаўнікам у мяст. Еўе (цяпер г. Вевіс, Літва) недалёка ад Вільні, выкладаў там «свабодныя навукі» і славянскую мову, у тым самым годзе пастрыжаны Лявонціем Карповічам пад імем Мялеція. З 1618 да 1620 быў рэктарам кіеўскай брацкай школы. Вынікам яго педагагічнай дзейнасці была надрукаваная ў 1618—19 гг. у Еўі «Граматыка славянская, або Сінтагма». У гэтай працы ён упершыню ў гісторыі славянскай мовазнаўчай навукі даў вычарпальныя для таго часу тлумачэнні чатырох асноўных частак граматыкі — арфаграфіі, этымалогіі, сінтаксісу і прасодыі.

У пісьменніцкай дзейнасці Мялеція асабліва плённымі былі 1620—23. У 2-й палавіне 1620 іерусалімскі патрыярх Феафан узнавіў праваслаўную мітраполію ў Рэчы Паспалітай. Мялеці атрымаў тытул полацкага архіепіскапа і епіскапа віцебскага і мсціслаўскага. 2.11.1620 ён сказаў памінальнае слова пры пахаванні Карповіча, выдадзенае пад назвай «Казань на пачэснае пахаванне... пана Лявонція Карповіча» (1620). Яму належаць таксама эпіграмы на герб Саламярэцкіх і прадмова (магчыма, усе 5 рэдакцый) да «Евангелля вучыцельнага патрыярха Каліста» (1616). Двойчы, у красавіку і чэрвені 1621, Мялеці выдаў «Апраўданне невінаватасці», на што уніяцкі мітрапаліт І. Руцкі адказаў «Двайною віною» з «Дапаўненнем». У тым жа годзе Мялеці напісаў і выдаў «Абарону апраўдання», на якую уніяты адказалі «Выпрабаваннем абароны». Мялеці асудзіў гэты твор у «Выкрыцці» (1622). Завяршыў літаратурную палеміку пачатку 20-х гадоў паміж двума апазіцыйнымі лагерамі А. Сялява «Антыэленхусам» (1622). Мялеці Сматрыцкі з'яўляецца таксама аўтарам «Юсціфікацыі» (1623) і сааўтарам «Суплікацыі» (1623), адрасаваных сенату і каралю — абедзве былі своеасаблівым працягам славутай прамовы Л. Дравінскага на сейме 1620 у абарону праваслаўных Беларусі і Украіны.

Напалоханы ўзмацненнем нацыянальна-вызваленчага руху беларусаў і ўкраінцаў, Мялеці адышоў ад барацьбы і пасля забойства І. Кунцэвіча ў 1623 назаўсёды пакінуў Вільню. З 1624 да 1625 быў на Блізкім Усходзе. У 1627 тайна, а ў 1628 адкрыта перайшоў на бок уніятаў. У працах «Апалогія» і «Разважанні» (абедзве 1628) ён не толькі адрокся ад сваіх антыуніяцкіх твораў, але і асудзіў дзейнасць Стафана Зізанія, Хрыстафора Філалета, Клірыка Астрожскага і іншых праваслаўных пісьменнікаў-палемістаў. З уніяцкіх пазіцый напісаны і яго творы «Пратэстацыя» (1628), «Паранесіс», «Экзатэсіс» (абедзве 1629). Праваслаўныя пісьменнікі-палемісты асудзілі гэтыя творы як у публічных адказах [«Антыдотум» (1629) Андрэя Мужылоўскага, «Антапалогія» (1631) Геласія Дзіпліца (Яўстафія Кіселя) і інш.], так і ў асабістай перапісцы.

Творчасць Мялеція была своеасаблівым кандэнсатам супярэчнасцей той эпохі, у якую ён жыў. Як у першы, так і ў другі перыяд сваёй творчасці ён займаў выразную класавую пазіцыю — абараняў інтарэсы буйных магнатаў і шляхты. Аднак творы першага перыяду маюць больш выразны народны характар, бо, змагаючыся за правы і прывілеі шляхты, ён адначасова адстойваў і інтарэсы шырокіх слаёў беларускага і ўкраінскага народаў.

Мялеці шырока выкарыстоўваў прыказкі, прымаўкі, народна-паэтычную славянскую і хрысціянскую сімволіку. Шмат зрабіў для станаўлення і развіцця барока на ўсходнеславянскіх землях. Яго творы, стыль сталі ўзорам для Лявонція Карповіча, Захарыя Капысценскага, Андрэя Мужылоўскага і іншых пісьменнікаў-палемістаў. Больш як два стагоддзі «Граматыка» Мялеція Сматрыцкага была адным з самых аўтарытэтных падручнікаў па славянскаму мовазнаўству. З некаторымі зменамі яна двойчы перавыдавалася ў Маскве. У Галандыі І. Капіевіч выдаў вытрымкі з «Граматыкі» пад назвай «Уводзіны ў граматыку Славяна-Расійскую» (1706), «Граматыка» Мялеція зрабіла значнае ўздзеянне на стварэнне граматык Г.-В. Лудольфа (1696), Ф. Максімовіча (1723), В. Ададурава (1738—40). У 18—1-й палове 19 ст. «Граматыка» паслужыла ўзорам для стварэння сербскай, харвацкай, румынскай і балгарскай граматык.

У 1991 на будынку Святатроіцкай царквы Дзерманскага манастыра, дзе пахаваны Мялеці Сматрыцкі, адкрыта мемарыяльная дошка.

У. Г. Кароткі.

Бібліяграфія

1.2.

Antigrafe, abo Odpowiedź na script uszczypliwy... Wilno, [1608].

Threnos, to jest Lament jedynej ...wschodniey cerkwie z objaśnieniem dogmat wiary... Wilno, 1610 / Пад псеўд. Teophil Ortolog.

Instytiones linguae grecae libri 2. Colonia, 1615. [Выданне вядома толькі па бібліягр. апісаннях].

Грамматики славенския правилное Синтагма... Еве, 1618; Еве, 1619; Вильно, 1621 [Не выяўлена]; Вильно, 1629 [Не выяўлена]; Кременка, 1638; М., 1648; Варшава, 1651; М., 1721; Спб, 1723; Рымник, 1755; М., 1782.

Казанье на погреб... Леонтия Карповича... Вильно, 1620.

Obrona Verifikaciey od obrazy króla... honor i reputacie ludzi zacnych duchownych i świeckich zachowującey... Wilno, 1621.

Verificatia niewinności y omylnych po wszyskiej Litwie y Białey Rusi rozsianych nomin... [Wilno], 1621.

Elenchus pism uszczypliwych przez zakonniki zgromadzenia wileńskiego świętej Trójce wydanych. Wilno, 1622.

Justificatia niewinności... [Wilno], 1623.

Suplicacia do przeoświeconego Korony Polskiej i Wiel(kiego) X(ięstwa) Lit(ewskiego) oboiego stanu Duchownego (swietskiego) senatu: 1623... [Wilno], 1623.

Apologia peregrinatiey do krajów wschodnich przez archiepiskopa połockiego... 1623 y 1624... Lwów, 1628.

Protestatia przeciwko soborowi w tym roku 1628... w Kijowie, monasterzu Pieczarskim obchodzonemu... do przezacnego narodu Ruskiego. Lwów, 1628.

Exethesis, albo Expostulatia, to jest rozprawa między Apologią i Antidotem o ostanek błędów, haeresie i kłamstw Zyzaniowych, Philaletowych, Orthologowych i Klerykowych uczyniona przez M. Smotryckiego. Lwów, 1629.

Paraenesis, abo Napomnienie... do bractwa wileńskiego s. ducha 12/XII 1628, a w osobie jego do wszystkiego tej strony narodu Ruskiego uczyniona. Kraków, 1629.

Граматика. К., 1979 [Факсімільнае выд. 1618].

Collected works of Meletij Smotryckyj: Harvard Library of Early Ukrainian Literature: Texts. Vol. 1. Harvard, 1988. [Тэксты падаюцца на мове арыгінала].

1.3.

1847. Послание Мелетия Смотрицкого 28 августа 1629 г. к могилевскому братству // Мог. губ. вед. № 17.

1859. Письмо Мелетия Смотрицкого к тому же богоявленному братству 1629 года // Мог. губ. вед. № 84.

1860. Письмо Полоцкого православного архиепископа Мелетия Смотрицкого, в котором он благодарит Могилевское братство за ревность... (1629 г.) // Мог. губ. вед. № 81; Письмо Мелетия Смотрицкого 28 августа // Там жа. № 84.

1887. Obrona Verifikaciej... // Архив Юго-Западной России. Т. 7. Ч. 1.

1923. З «Казання на хаўтурах Л. Карповіча» (1620 г.): [Урывак] // Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. Вільня.

1959. Фрынас: (Урыўкі); Казанье на честный погреб пречестного и превелебного мужа, господина и отца, господина отца Леонтия Карповича // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн.

1962. [Урыўкі з твораў] // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мн.

1.5.

На рускую мову. Апология моему странствованию на Востоке. Лейпциг; Париж, 1863 (Кирилло-Мефодиевский сборник. Вып. I). Рэц.: Р.*** // Правосл. обозрение. 1864. № 7.

I. О шести разницах в учении Восточной и Западной церкви; II. Протест на Киевский собор 1628 г.; III. Послание к Кириллу Лукарису; IV. Письмо к Вельямину-Рутскому // Кирилло-Мефодиевский сборник. Париж; Лейпциг, 1867. Вып. II.

На ўкраінскую мову. Лямент у світа вбогих на жалісне перестовлення Леонтія Карповича...: (Уривки з поеми) / Пер. В. Крекотень // Антологія української поезії. К., 1984. Т. 1 [Аўт. крыніцы пераклада спрэчнае].

2.2.

На лацінскай мове. Susza J. Saulus et Paulus Ruthenae unionis sanguine B. Josaphat transformatus: Sive Meletius Smotriscius archiepiscopus polocensis. Romae, 1666; Bruselles, 1864.

На нямецкай мове. Horbatsch O. Die vier Ausgaben der kirchenslavischen Grammatik von M. Smotryćkyj. Wiesbaden, 1964.

На польскай мове. Diplic G. Antapologia, abo apologiey, ktorą do naroda ruskiego Meleciusz Smotrzycki rzeczony archiepiscop Połocki napisał, zniesienie. [S. L.] 1632.

Korciscius W. Widok potyczki wygraney, zawodu dopędzonego, wiary dotrzymanej ...Meletiusza Smotrickiego, archiepiskopa hieropolitanskiego... na jegoż pogrzebie... Wilno, 1634.

List do zakonnikow monastera cerkwie S. Ducha Wileńskiego na ich przedmowę w Verificatii... Wilno, 1621.

Morochowski J. Paregoria, abo Utulenie szczypliwego lamentu mniemanej cerkwie wschodniej zmyslonego Theophila Ortologa. Wilno, 1612.

Mużyłowski A. Antidotum przezacnemu narodowi Ruskiemu, abo Warunek przeciw Apologiey iadem napełnioney, ktorę wydał Melety Smotrzycki niesłusznie cerkiew ruską... w niey pomawiaiąc o haeresią y schyzmę... [S. L.], 1629.

Ostrowski A. List do Mielecyusza Smotrzyckiego. [S. L.], 1617.

[Rutski J.] Examen obrony, to jest Odpis na script Obrona Verificatii nazwany... Wilno, 1621.

[Rutski J.] Sowita wina, to jest Odpis na script... nazwany Verificatia niewinności... Wilno, 1621.

Sielawa A. Antelenchus, to jest Odpis na script uszczypliwy... Wilno, 1622.

Skarga P. Na Treny y lament Theophila Ortologa... Kraków, 1610.

На рускай мове. Засадкевич Н. Мелеций Смотрицкий как филолог. Одесса, 1883. Рэц.: Este. Gramatyka Słowiańska wydana w Polsce // Kraj. 1883. Nr 39.

Короткий В. Творческий путь Мелетия Смотрицкого. Мн., 1987.

Короткий В. Творчество Мелетия Смотрицкого: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1984.

Осинский А. Мелетий Смотрицкий, архиепископ Полоцкий. К., 1912.

Павловец Д. Основные тенденции развития и взаимодействия белорусского и книжно-славянского языков в XVI—XVII вв.: (На материале грамматик Л. Зизания, М. Смотрицкого, И. Ужевича): Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1985.

Прокошина Е. Мелетий Смотрицкий. Мн., 1966. Рэц.: Подокшин С. Трагедия мыслителя // Неман. 1966. № 9.

На ўкраінскай мове. Яременко П. Мелетій Смотрицький: Життя і творчість. К., 1986.

2.3.

На балгарскай мове. Атанасов П. Граматиката на Мелетий Смотрицкий и българските книжовници // Атанасов П. Българско-руски литературни връзки през XVII и XVIII в. София, 1986.

На беларускай мове. Віцьбіч Ю. Коўзанне на паверхні гісторыі // ЛіМ. 1939. 23 мая; Вольскі В. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізма. Мн., 1952. С. 134—141; Яго ж. «Фрынас» // Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Мн., 1956; Гарэцкі М. Палемічная літаратура // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920; 2 выд. Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 280—282, 309—310; Дабрынін М. Беларуская літаратура. Мн., 1952. С. 231—233; К-ч. Славяна-беларускія слоўнікі // Беларусь. 1920. 22 студз.; Кароткі У. Агляд літаратуры пра Мялеція Сматрыцкага // Книга в Белоруссии. Книговедение, источники, библиография. Мн., 1981; Яго ж. Калі ж памёр Мялецій Сматрыцкі? // ЛіМ. 1980. 5 вер.; Яго ж. Мялецій Сматрыцкі // Гісторыя беларускай літаратуры. Мн., 1985; Яго ж. Скрозь церні // Ніва. 1984. 26 лют.; Коршунаў А. Мялецій Сматрыцкі // Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1; Яго ж. [Уступны артыкул] // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн., 1959. С. 260—262; Ларчанка М. Літаратура канца XVI — першай паловы XVII ст. // Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968; Майхровіч С. Мялецій Сматрыц-

На беларускай мове. Адамовіч А. Апавяданні Івана Навуменкі // Адамовіч А. Літаратура, мы і час. Мн., 1979; Андраюк С. Жыццё. Літаратура. Героі. Мн., 1973. С. 85—89; Анікееў А. Грымасы фарысеяў // Чырв. змена. 1979. 4 кастр.; Атрашкевіч В. І была вайна // Полымя. 1981. № 10; Беларуская дзіцячая літаратура. Мн., 1980. С. 73—74; Беларуская літаратура: Дзень сённяшні. Мн., 1980. С. 219—220, 227—228, 261—262; Беларуская савецкая проза: Апавяданне і нарыс. Мн., 1971. С. 120—121, 138—139, 164, 191; Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць. Мн., 1971. С. 325—326; Бугаёў Д. Іван Навуменка // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. Мн., 1982. Ч. 2; Яго ж. Пра сучасную прозу: (Суб'ектыўныя нататкі); Здабыткі крытычнай думкі і яе зігзагі // Бугаёў Д. Чалавечнасць. Мн., 1985; Яго ж. Час падрахункаў // Бугаёў Д. Талент і праца. Мн., 1979; Вярцінскі А. Высокае неба ідэала. Мн., 1979. С. 44—49, 53—54; Гардзіцкі А. Я — за рамантыку // Гардзіцкі А. Сустрэчы. Мн., 1972; Герцовіч Я. Герой і сучаснасць. Мн., 1963. С. 94—113; Гілевіч Н. Пра сённяшніх студэнтаў // ЛіМ. 1964. 24 сак.; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 42—43; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1966. Т. 2. С. 106—107, 117; Гудовіч В. Сустрэча з пісьменнікамі // Наст. газ. 1965. 18 снеж.; Гурэвіч Э. Беларуская дзіцячая літаратура (1917—67). Мн., 1970. С. 253; Яго ж. Літаратура — памяць народа // ЛіМ. 1975. 25 крас.; Яго ж. Пафас гераізму. Мн., 1979. С. 95—97, 123—124; Гусак С. Пафас праўды. Мн., 1973. С. 68—77; Даніленка М. Таполі яго юнацтва // Гомел. праўда. 1975. 14 лют.; Наст. газ. 1975. 15 лют.; Дзень добры, муза Расіі! // Голас Радзімы. 1969. № 41; Дзюбайла П. Адзінства і разнастайнасць // Полымя. 1973. № 1; Яго ж. Беларускі раман аб Вялікай Айчыннай вайне. Мн., 1964. С. 146—151; Яго ж. Беларускі раман: Гады 70-я. Мн., 1982. С. 66—73; Яго ж. Вобраз нашага сучасніка ў беларускай прозе. Мн., 1978. С. 44—45, 53—54, 123—126; Яго ж. Герой, час рахункаў і выбару // Полымя. 1983. № 3; Яго ж. На парозе васьмідзесятых // Там жа. 1980. № 7; Яго ж. На шляху да сінтэзу // Там жа. 1978. № 12; Яго ж. Наш сучаснік — у жыцці і літаратуры. Мн., 1984. С. 42—43; Яго ж. Невычэрпная тэма // Полымя. 1970. № 5; Яго ж. Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе. Мн., 1973. С. 71—74; Яго ж. Праўда характару // Дзюбайла П., Жураўлёў В., Луфераў М. Праблемы сучаснай беларускай прозы. Мн., 1967. С. 127—130; Яго ж. Сталасць: І. Навуменку — 60 // Беларусь. 1985. № 2; Яго ж. Сумленна пражыць жыццё // Полымя. 1985. № 2; Яго ж. У вялікай дарозе. Мн., 1981. С. 145—146; Дзюбайла С. Аддзячыў зямлі сыне... // Чырв. змена. 1985. 16 лют.; Жук А. «Трымаюся бліжэй да перажытага...» // Нар. асвета. 1985. № 2; Жураўлёў В. Пра вайну пасля вайны // Полымя. 1969. № 10; Яго ж. Сюжэт і рэчаіснасць // Дзюбайла П., Жураўлёў В., Луфераў М. Праблемы сучаснай беларускай прозы. Мн., 1967. С. 244—246; Званарова Л. Прастор для духу... // ЛіМ. 1982. 9 крас.; Івану Навуменку — 50 // Там жа. 1975. 14 лют.; Івану Навуменку — 60 // Там жа. 1985. 15 лют.;Ісачанка А., Зубкоўскі Б. Што адбылося ў Кавальцах? // Там жа. 1975. 10 студз.; Іскрык У. Духоўны здабытак народа // Там жа. 1972. 27 кастр.; Каваленка В. Выспяванне подзвігу // Полымя. 1983. № 6; Яго ж. Дакладнасць пазіцыі

Каваленка В. Давер. Мн., 1967. С. 46—53; Яго ж. З пазіцый сучаснасці. 2 выд. Мн., 1982. С. 59—60, 161—163; Яго ж. Калі крылаюць сцягі // Полымя. 1981. № 5; Яго ж. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. Мн., 1981. С. 305—309; Яго ж. Памяць сэрца // Беларуская літаратура. Мн., 1980. Вып. 8; Яго ж. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі. Мн., 1977. С. 122—123; 129; Яго ж. Рэгіянальны каларыт прозы І. Навуменкі // Рэгіянальныя традыцыі ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і фальклоры. Гомель, 1980; Казыра Л. Замежнаму чытачу пра Купалу і Коласа // ЛіМ. 1985. 5 крас.; Камароўскі А. Высвечваючы новыя грані // Мін. праўда. 1972. 9 жн.; Канэ Ю. Спадарожнік у вялікі свет // Полымя. 1960. № 1; Карніловіч Л. Высокая духоўнасць героя // Нар. асвета. 1979. № 6; Яго ж. Героіка моладзі 40-х гадоў у творчасці Івана Навуменкі // Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе. Мн., 1979; Кароткая Л. Ад імя пакалення // Навуменка І. Зб. тв.: у 6 т. Мн., 1981. Т. 1; Яго ж. Крылы юнацтва // На арбіце часу. Мн., 1974; Куляшоў Ф. Аб чым шумелі сосны // На высокай хвалі. Мн., 1968; Яго ж. Маральны патэнцыял чалавека // Куляшоў Ф. Эцюды аб прозе. Мн., 1964. С. 21—43; Яго ж. Рамантыка мары і подзвігу // Навуменка І. Вераніка. Мн., 1968; Яго ж. Усё адолее чалавек // Полымя. 1963. № 4; Кухараў С. Летапісец пакалення // Вяч. Мінск. 1974. 14 лют.; Ламека Л. Коласаўскія традыцыі ў творчасці Івана Навуменкі // Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур. Мн., 1982; Яго ж. Прага высокай духоўнасці // Полымя. 1985. № 2; Лецка Я. Выхаваўчая роля літаратуры. Мн., 1980. С. 80—87, 94—95; Яго ж. Неўміручы подзвіг народа // Полымя. 1975. № 5; Літвінаў Р. Духоўны воблік героя ў творах І. Навуменкі для юнацтва // Беларуская літаратура. Мн., 1978. Вып. 6; Лойка А. Запрашэнне да трох соснаў // Маладосць. 1985. № 2; Луфераў М. Канфлікты і жыццё // Дзюбайла П., Жураўлёў В., Луфераў М. Праблемы сучаснай беларускай прозы. Мн., 1967. С. 81—83; Яго ж. Уклад землякоў // Гомел. праўда. 1978. 22 жн.; Лявонава П. Вывучэнне твораў пра Вялікую Айчынную вайну // Нар. асвета. 1979. № 4; Ляпіч А. Подзвіг нескаронай зямлі // ЛіМ. 1968. 20 вер.; Ляшук В. Зборнік апавяданняў Івана Навуменкі «Верасы на выжарынах» // Ляшук В. Урокі пазакласнага чытання: IV—VII класы. Мн., 1984; Яго ж. Урокі дабраты і патрыятызму // Наст. газ. 1985. 9 кастр.; Мартынава Э. Заўсёды ў дарозе // Полымя. 1981. № 6; Марціновіч А. Летапіс сучаснасці // Вяч. Мінск. 1985. 16 лют.; Яго ж. Сіла вытокаў // Полымя. 1982. № 4; Яго ж. Хлопцы самай вялікай вайны //Бярозка. 1982. № 5. Мішчанчук М. Літаратура, народжаная Кастрычнікам. Мн., 1983. С. 145—153; Мушынскі М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 40-я — першая палавіна 60-х гадоў. Мн., 1985. С. 181—182, 225—228, 296—297, 310—312, 327—328; Яго ж. Пісьменнік, вучоны, арганізатар навукі // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. 1985. № 1; Няхай З. Аб моладзі і для моладзі // ЛіМ. 1963. 27 снеж.; Няхай М. Жывая памяць сэрца // Беларуская літаратура. Мн., 1977. Вып. 5; Яго ж. Жывой памяццю сэрца // Маг. праўда. 1975. 4 вер.; Яго ж. На ніве душы чалавечай // Полымя. 1982. № 2; Пашкевіч Н. Сусветная драма ў «заштатным» мястэчку // Пашкевіч Н. На шырокіх шляхах жыцця. Мн., 1965; Петравец А. Крылы творчага натхнення // Звязда. 1975. 16 лют.; Піскун Л. З пазіцый народнасці і гуманізму // Беларуская літаратура. Мн., 1985. Вып. 13; Яго ж. Каларыт вясковага жыцця ў прозе І. Навуменкі // Рэгіянальныя традыцыі ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і фальклоры. Гомель, 1980; Яго ж. Коласаўскія традыцыі ў прозе Івана Навуменкі // Беларуская літаратура. Мн., 1982. Вып. 10; Яго ж. На пачатку літаратурнай дарогі: Раняя проза І. Навуменкі // Нар. асвета. 1982. № 4; Яго ж. Праблема характару ў «ваенных» апавяданнях Івана Навуменкі // Беларуская літаратура. М., 1984. Вып. 12; Яго ж. Творчае развіццё класічных коласаўскіх традыцый у прозе І. Навуменкі // Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур. Мн., 1982; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Поляк В. На шлях выпрабаванняў // ЛіМ. 1969. 30 вер.; Пруднікаў П., Юбко В. Таленавіты пісьменнік, выдатны вучоны // Наст. газ. 1985. 16 лют.; Пшыркоў Ю. Завяршэнне эпапеі // Звязда. 1975. 4 студз.; Яго ж. Летапісец свайго народа. Мн., 1982. С. 115—116; Савік Л. Адчуванне часу. Мн., 1981. С. 158—159; Собаль В. Водгулле семнаццатай вясны // Віцеб. рабочы. 1985. 15 лют.; Станкевіч Р. Астравы памяці: Штрыхі да творчага партрэта Івана Навуменкі // Беларусь. 1985. № 9; Тычына М. Год аповесці // ЛіМ. 1977. 25 лют.; Яго ж. Паглыбленне гістарызму ў сучаснай беларускай прозе // Жураўлёў В., Тычына М. Магчымасці рэалізму. Мн., 1982. С. 186—189; Усікаў Я. Змястоўна пра таленавітае // Звязда. 1972. 30 ліст.; Чэрнікава В. Голасам свайго пакалення // Мін. праўда. 1985. 16 лют.; Шамякін І. «Галубіны ўзлёт»; Вецер у соснах // Шамякін І. Размова з чытачом. Мн., 1973; Яго ж. Народны пісьменнік і вучоны // ЛіМ. 1985. 15 лют.; Шарахоўскі Я. Проста і запамінальна // Там жа. 1960. 16 жн.; Юрэвіч У. Вяртанне ў маладосць // Юрэвіч У. Абрысы. Мн., 1976; Яго ж. З крыніц юнацтва // Вяч. Мінск. 1975. 15 лют.; Яго ж. Па старонках новага часопіса // ЛіМ. 1953. 4 ліп.; Яго ж. Тэма пісьменніка — сацыяльная тэма // Полымя. 1974. № 6; Яскевіч А. На шляху росту і сталасці // Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы. Мн., 1972; Яго ж. Почырк пісьменніка // ЛіМ. 1958. 4 чэрв.; Яго ж. У свеце мастацкага твора. Мн., 1977. С. 177—179; Яфімава М. Шляхі развіцця беларускай савецкай дзіцячай літаратуры // Беларуская дзіцячая літаратура. Мн., 1966. С. 89—90.

На кітайскай мове. Навуменка Іван Якаўлевіч // Энцыклапедычны слоўнік савецкай літаратуры. Пекін, 1984.

На польскай мове. Iwan Nawumienka // Moje niedźwiedzie. Łódź, 1974.

На рускай мове. Адамович А. Память сэрца // Науменко И. Тополя нашей юности. М., 1978; Яго ж. Становление жанра. М., 1964. С. 294—295; Андрейюк С. Поиск будет продолжен // Знамя юности. 1968. 26 марта; Гаранин Л. Философские искания в белорусской литературе. Мн., 1984. С. 197—201; Гилевич Н. Рассказы Ивана Науменки // Знамя юности. 1957. 13 нояб.; Гуревич Э. Детская литература Белоруссии. М., 1982. С. 164—165, 181—183; Елисеев В. Дерзновению подобно // Знамя юности. 1968. 13 дек.; Яго ж. Наука ненависти и любви // Там жа. 1969. 15 окт.; Звонарева Л., Выборгина Д. Юноше, обдумывающему житье, помогают книги писателя Ивана Науменко // Там жа. 1985. 10 янв.; Из почты «Немана» // Неман. 1978. № 9; Ипатова О. Чувство Родины // Правда. 1979. 12 мая; История белорусской советской литературы. Мн., 1977. С. 194—195; Казека Я. Слово о ровесниках // Науменко И. Ветер в соснах. Мн., 1970; Канэ Ю. Герой и время // Неман. 1961. № 5; Яго ж. Его глазами // Там жа. 1960. № 1; Коваленко В. Главное направление — художественная правда // Там жа. 1970. № 6; Яго ж. Сплав мысли и чувств // Сов. Бел. 1985. 16 февр.; Кулешов Ф. Пора зрелости // Сел. газ. 1975. 16 февр.; Яго ж. Современная белорусская проза. М., 1970. С. 24—26; Курина Е. Слово белорусских писателей // Днепров. правда. 1975. 26 июня; Мартинович А. Четыре слова о людях и жизни // Знамя юности. 1967. 25 окт.; Мележ И. Жизненные заботы. М., 1980. С. 112—113; Мозольков Е. Поющая земля. М., 1972. С. 371—372; Овчаренко А. Послесловие // Науменко И. Сорок третий. М., 1977; Яго ж. Современный белорусский роман. М., 1978. С. 69—90; Пашкевич Н. «Сосна при дороге» И. Науменко // Пашкевич Н. На эпическом направлении. М., 1969; Перкин Н. В семье братских литератур. Мн., 1967. С. 141—143; Пискун Л. Региональная основа художественного характера в трилогии Науменко «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці» // Региональные особенности восточнославянских языков, литератур,

фольклора и методы их изучения. Гомель, 1985. Ч. 2; Савик Л. Память суровых дорог // Сел. газ. 1985. 16 февр.; Сапожков Ю. Верность семнадцатой весне // Сов. Бел. 1975. 16 февр.; Семенова А. Заметки о рассказах // Неман. 1967. № 6; Синенко Г. Духовные наследники Октября // Великий Октябрь и художественная литература. Мн., 1977; Яго ж. Жанровое и стилевое многообразие современной советской литературы (поэзия, проза) // Современные проблемы советской литературы. Мн., 1980; Тычина М. Народ и война. Мн., 1985. С. 258—262; Хромченко К. Летописец своего поколения // Заря. 1975. 15 февр.; Шамякин И. Твое поколение // ЛГ. 1977. 13 июля; Юревич В. Возвращение в юность // Юревич В. Испытание зрелостью. М., 1981.

На славацкай мове. Židlický V. Co zaznamenala Pamät srdca // Navumenka I. Návrat do mladosti. Košice, 1985.

На чэшскай мове. Židlický V. Ivan Navumenka // Současná sovětské literatura. III Ukrajinská a běloruská. Prahá, 1968.

2.4.

На беларускай мове. Верамейчык У. Урочышча Нехарань: [Верш] // ЛіМ. 1982. 18 чэрв.; Губернатараў М. Юбіляру: [Верш] // Наст. газ. 1975. 15 лют.; Жычка Х. Акадэмік ідзе ў грыбы: [Верш] // ЛіМ. 1983. 16 вер.

М. П. Барташэвіч.

НАВУМОВІЧ УЛАДЗІМІР

Навумовіч Уладзімір Аляксандравіч (н. 29.10.1943, в. Баўцічы Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.), літаратуразнавец, крытык. Кандыдат філалагічных навук (1974).

Нарадзіўся ў сям'і служачых. Маці, Марыя Гаўрылаўна, 30 гадоў працавала настаўніцай. Бацька, Аляксандр Раманавіч, працаваў будаўніком у роднай вёсцы; быў партызанам, удзельнічаў у баях за вызваленне Венгрыі, Югаславіі, перамогу сустрэў у Альпах (яму прысвечана дакументальная аповесць У. Навумовіча «Бацькаў сад», змешчаная ў карэліцкай раённай газеце «Полымя», 1985). У. Навумовіч вучыўся ў Скорыцкай сямігодцы (1950—57), Ярэміцкай сярэдняй школе (1957—60), працаваў настаўнікам у Беражэнскай васьмігадовай школе (1960—61). У 1961—66 — студэнт аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта БДУ. Пасля заканчэння універсітэта на камсамольскай рабоце ў Мінску: загадчык аргаддзела Ленінскага райкома ЛКСМБ (1965—66), загадчык сектара культмасавай работы Мінскага абкома ЛКСМБ (1966—69), лектар ЦК ЛКСМБ (1969—70). У 1970—73 — аспірант кафедры беларускай літаратуры БДУ. Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Проза «Маладняка» (1974). З 1973 выкладчык, з 1981 дацэнт гэтай жа кафедры. З 1991 узначальвае міжнародную летнюю школу беларусістаў пры БДУ.

Першае апавяданне У. Навумовіча «Навыраст» змешчана ў 1964 у навагрудскай раённай газеце «Новае жыццё», у тым жа годзе дэбютаваў у рэспубліканскім друку («Чырвоная змена»). Даследуе пытанні развіцця і перспектыўныя тэндэнцыі беларускай прозы 20-х гадоў, праблемы творчасці беларускіх пісьменнікаў, членаў літаб'яднання «Маладняк». Выдаў манаграфію «Шляхамі арлянят: Проза «Маладняка». Займаецца вывучэннем маральна-этычнай праблематыкі сучаснай беларускай прозы. Распрацаваў і вядзе спецсемінар для студэнтаў «Канцэпцыя чалавека ў беларускай савецкай прозе (маральна-этычныя асновы нацыянальнага характару)». Складальнік зборніка «Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур».

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Проза «Маладняка»: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1974.

Такое бывае аднойчы: Аповесць. Мн., 1982. (Першая кніга празаіка). Рэц.: Васючэнка П. Флірт без адрыву ад вытворчасці // ЛіМ. 1983. 24 чэрв.; Нікішын М. Ля вытокаў сталасці // Чырв. змена. 1983. 15 сак.; Погорелов С., Титенков М.

Такими они были // Знамя юности. 1983. 27 апр.

Шляхамі арлянят: Проза «Маладняка». Мн., 1984. Рэц.: Ульянко Н. Революцией открытыми путями // Гродн. правда. 1985. 23 апр.

1.3.

1964. На скразняку: Апавяданне // Чырв. змена. 28 кастр.

1965. Другое нараджэнне // ЛіМ. 13 кастр.

1968. Узаранае поле: Старонкі роздуму // Маладосць. № 10.

1970. З Лукомльскага сшытка: [Апавяданні] // Маладосць. № 11.

1971. Попел на сэрцы: Апавяданне // Маладосць. № 2.

1972. Атеистическое содержание прозы молодых белорусских писателей 20-х годов // Атеистическое воспитание молодежи. Мн.; З клопатам аб маладой змене // Народныя песняры. Мн.; Романтическая эпопея: [Рэц. на кн.: Зарецкий М. Стежки-дорожки. Мн., 1971] // Неман. № 2; З кагорты маладнякоўцаў: 70 год з дня нараджэння С. Хурсіка // ЛіМ. 10 сак.; Вернасць праўдзе жыцця // Чырв. змена. 16 сак.

1973. Крылатае племя // Чырв. змена. 28 ліст.

1975. Неабходнасць героя // ЛіМ. 4 кастр.

1977. Талент яркі, непаўторны // Чырв. змена. 4 жн.

1978. Маладыя гады аднаўлення // Маладосць. № 6.

1979. З рамантыкай рэвалюцыі ў сэрцы // Святло яго душы. Мн.; Маладыя гады абнаўлення: Успаміны // Маладосць. № 6; Найбольш поўны // ЛіМ. 8 чэрв.

1980. Поезд в завтрашний день // Знамя юности. 18 сент.

1981. Духоўны бацька «Маладняка»: Янка Купала і «Маладняк» // Песні беларускай валадар. Мн.; З днём заўтрашнім // Маладосць. № 5; Поплеч з арлянятамі // Там жа. № 10; Старонкі пра выдатнага празаіка: [Рэц. на кн.: Казека Я. Кузьма Чорны: Старонкі творчасці. Мн., 1980] // Полымя. № 6.

1982. Перспектыўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай савецкай прозы 20-х гадоў XX стагоддзя // Актуальныя праблемы грамадскіх навук. Мн.; На шырокую дарогу: (Якуб Колас і «Маладняк») // З глыбінь народных. Мн.; Маральна-этычныя асновы характару сялянскага тыпажу і свет кахання ў трылогіі Я. Коласа «На ростанях» // Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур. Мн.; На шырокую дарогу // Маладосць. № 5; Запрашаем у Вязынку! // ЛіМ. 14 мая.

1983. Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур // Веснік БДУ. Сер. 4. № 1.

1984. Быть голосом собственной совести: О положительном герое современной белорусской прозы // Коммунист Бел. № 11; Гражданином быть обязан // Сов. Бел. 7 сент.

1985. Партызанскае братэрства: Апавяданне // Беларусь. № 11.

1.5.

На рускую мову. Снова в Хатыни: [Апавяданне] / Пер. Б. Мескин // Смена. 1972. № 20.

На украінскую мову. З «Лукомльського зошита»: Земляки; Новий комсорг; Бригада семи Василів; Новолукомлянин / Пер. Г. Вігурська // Сузір'я. К., 1972. Вип. 6; Бригада семи Василів: [Навела] / Пер. Г. Вігурська // Друг читача. 1972. 4 січ.; З «Лукомльського зошита»: Земляки; Новий комсорг / Пер. Г. Вігурська // Сузір'я. К., 1976. Вып. 10.

1.6.

Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур. Мн., 1982 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Шамякіна Т. У імкненні да ідэалу // Полымя. 1983. № 7. *В. М. Грышкевіч.*

НАГРОДСКІ ЗЫГМУНТ

Нагродскі Зыгмунт Вікенцьевіч (1866, в. Зулова Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Швянчонскі р-н, Літва — 25.3.1937, Вільня), беларускі культурны дзеяч, паэт.

З сям'і арандатара, які працаваў у бацькоў польскага дзяржаўнага дзеяча Ю. Пілсудскага. З. Нагродскі меў уласны склад-краму сельскагаспадарчых машын у Вільні (вул. Завальная, 11). Праводзіў культурна-асветную работу сярод віленскіх рамеснікаў. У 1893 пазнаёміўся з «Дудкай беларускай» Ф. Багушэвіча. З яе нелегальнага распаўсюджвання распачаў актыўную прапаганду твораў беларускіх пісьменнікаў сярод сялян, што наведвалі яго склад-краму. У 1896 ахвяраваў сродкі на другое выданне «Дудкі беларускай» у Кракаве. Асабістае знаёмства З. Нагродскага з Ф. Багушэвічам, які працаваў у Вільні адвакатам судовай палаты, перайшло ў шчырае сяброўства. У 1898—1900 З. Нагродскі неаднойчы наведваў Ф. Багушэвіча ў Кушлянах (цяпер Смаргонскі р-н),

перапісваўся з ім, даваў тэмы для апавяданняў з беларускага сялянскага побыту («Сведка», «Дзядзіна» і інш.). Калі Ф. Багушэвіч памёр, З. Нагродскі арганізаваў дэлегацыю рамеснікаў, якія прыехалі ў Жупраны (цяпер Ашмянскі р-н) на пахаванне паэта (17(30).4.1900) з вянком, перавязаным беларускім ручніком з надпісам: «Змоўклі песні тыя, што іграў на дудцы». На смерць Ф. Багушэвіча напісаў верш «На памяць зычліваму для сям'і». У 1901 нейкі час быў пад арыштам у пецярбургскім астрозе, дзе напісаў верш «Да жонкі маёй у Вільні». Далучаўся да беларускага адраджэнскага руху, у цяжкія моманты матэрыяльна падтрымліваў выданне «Нашай нівы», удзельнічаў у віленскіх літаратурных вечарах, на якіх, пераапрануўшыся ў сялянскую світку, дэкламаваў вершы беларускіх аўтараў. У верасні 1899 выступіў з вершаванай прамовай «Пастароньцесь, мае братцы...» на адкрыцці памятнага каменя ў Барэйкаўшчыне (каля Вільні), пастаўленага ў гонар У. Сыракомлі. У 1920-я гады на ўласныя сродкі стварыў «Народнае выдавецтва», якое выпускала танныя кніжкі для масавага чытання, у іх ліку «Гутаркі і песенькі» У. Сыракомлі (1929). Арыентаваўся на традыцыі літаратуры Беларусі 19 ст. Сустракаўся з А. Луцкевічам і М. Танкам.

Адзін з буйных твораў З. Нагродскага — двухмоўная (беларуска-польская) п'еса «На каляды», напісана на беларускім фальклорна-этнаграфічным матэрыяле з падзагалоўкам «Народны абразок з ваколіц Зулова з 1876 года» (пастаўлена ў Вільні ў 1936, захавалася ў рукапісе ў ЦБ АН Літвы). У творах і ў грамадскай дзейнасці З. Нагродскі быў перакананым дэмакратам-асветнікам і гарачым прыхільнікам дружбы беларускага і польскага народаў.

У. І. Мархель.

Бібліяграфія

1.2.

Skład maszyn i narzędzi rolniczych, nasion i nawozów sztucznych. Wilno, 1928.

Ze wspomnień oświatowca. Wilno, 1929.

O maszynach do szycia. Wilno, [1930].

Moje wspomnienie i rozważania z powodu budowy pomnika Montwiłłowi. Wilno, 1931.

Wyprawa wileńska roku 1919 we wspomnieniach cywila. Wilno, 1933.

Rola duchowieństwa katolickiego w godzinie prób i cierpień na terenie Litwy i Białejrusi: (1863—1883). Wilno, 1935.

1.3.

1928. Kilka nieuporządkowanych wspomnień z lat przeszłych // Wilno — Legiony. Wilno.

1971. На памяць зычліваму для сям'і: [Урывак з верша] // Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Мн.

1977. З успамінаў пляменніцы паэта Ю. Радзевіч і З. Нагродскага // Пачынальнікі. Мн.

1978. На памяць зычліваму для сям'і; «Пастароньцесь, мае братцы...»: [Вершы] // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 2.

1982. «Пастароньцесь, мае братцы...»; На памяць зычліваму для сям'і: [Вершы] // Рагойша В. Кантакты. Мн.

1988. Нашым ён быў братам...; На памяць зычліваму для сям'і: [Вершы] // Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Глядзельнік. «На каляды»: (Народны абразок з беларускага жыцця з ваколіц Зулава) // Бел. фронт. 1936. 5 ліп.; Луцкевіч А. Жыццё і творчасць Фр. Багушэвіча ў успамінах яго сучаснікаў // Запісы БНТ. 1938. Сш. 1; Мальдзіс А. Сярод віленскіх рукапісаў // ЛіМ. 1971. 16 ліп.; Рагойша В. Зыгмунт Нагродскі і яго вершы // Рагойша В. Кантакты. Мн., 1982; Св. п. Зыгмунт Нагродскі: (Замест некралогу) // Калоссе. 1937. № 2; Семашкевіч Р. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе. Мн., 1971. С. 46—58; Содаль У. Зыгмунт Нагродскі — сябар Ф. Багушэвіча // ЛіМ. 1976. 30 студз.; Яго ж. Людзьмі звацца. Мн., 1977. С. 41—45; Танк М. Лісткі календара // Танк М. Зб. тв.: У 4 т. Мн., 1967. Т. 4.

На польскай мове. Archiwista. Nie dynaści, lecz pompadury: (W odpowiedzi p. Z. Nagrodzkiemu) // Prz. Wileński. 1936. Nr 5; **Archiwista.** W odpowiedzi p. Zygmuntowi Nagrodzkiemu // Prz. Wileński. 1937. Nr 1; Hass L. Nagrodzki Zygmunt // Polski Słownik Biograficzny. T. XXII/3. Z. 94; Huszcza J. Poeta Białej Rusi // Huszcza J. Opowieści w czarnych ramkach. Łódź, 1979; Łuckiewicz A. Zygmunt Nagrodzki: (Wspomnienie pośmiertne) // Prz. Wileński. 1937. Nr 4; Życka C. Krótki rys dziejów tajnej oświaty polskiej na ziemi Wileńskiej od 1880 do 1919. Wilno, 1932. S. 7, 11—13, 27.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 17, л. 5, Б-ка Асалінскіх у Вроцлаве (РП), аддз. рукап., адз. зах. 7180; ЦБ АН Літвы. аддз. рукап., ф. 138, адз. зах. 2184; ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 218.

Т. М. Махнач.

НАЛІВАЙКА АЛЕСЬ

Налівайка Алесь (Аляксандр Міхайлавіч; н. 20.10.1922, в. Вязычын Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.), літаратуразнавец, крытык. Кандыдат філалагічных навук (1954). Дацэнт (1961).

З сялянскай сям'і. Бацька, Міхаіл Лазаравіч, у 1914—18 працаваў шахцёрам у Данбасе, потым селянін-аднаасобнік, у 1930 быў рэпрэсіраваны «за антыкалгасную агітацыю» і высланы ў г. Салікамск на вугальныя шахты. Вярнуўшыся, у 1934 уступіў у калгас. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў у партызанскім атрадзе спецпрызначэння. А. Налівайка скончыў пачатковую школу ў в. Вязычын (1932), Свіслацкую сямігодку (1936). У 1937 паступіў на Бабруйскі педрабфак (у 1940 рэарганізаваны ў педкурсы), пасля заканчэння якога накіраваны ў Беластоцкую вобл. Працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры, загадчыкам навучальнай часткі ў Вышонкаўскай няпоўнай СШ (цяпер у Польшчы). У гады Вялікай Айчыннай вайны А. Налівайка разам з групай вясковай інтэлігенцыі і моладзі праз старэйшую сястру, якая жыла і працавала да вайны настаўніцай у Клічаўскім р-не, наладзіў сувязь з партызанскім атрадам І. Ізоха, распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро і паведамленні з газеты «Правда». У лістападзе 1942 стаў байцом, потым камандзірам разведгрупы Заходняга фронту (партызанскі атрад спецпрызначэння № 309 імя С. М. Кірава, потым гэты атрад перайшоў у падпарадкаванне разведадддзела 2-га Беларускага фронту). У студзені 1944 увайшоў у спецгрупу, якая выконвала заданні ў раёне г. Вільнюса, а 13 ліпеня 1944 злучылася з часцямі Савецкай Арміі. У кастрычніку 1944 накіраваны ў Арлоўскае ваеннае танкавае вучылішча, адкуль у 1945 дэмабілізаваны. У 1946—47 працаваў выкладчыкам гісторыі і канстытуцыі ў Свіслацкай сямігодцы. Паступіў і ў 1951 скончыў з адзнакай філалагічны факультэт Магілёўскага педінстытута і накіраваны ў аспірантуру пры Мінскім педінстытуце. Пасля заканчэння яе (1953) працуе выкладчыкам, дацэнтам на кафедры беларускай літаратуры гэтага ж інстытута. Абараніў кандыдацкую дысертацыю «Аповесць Якуба Коласа «Дрыгва». Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступені, медалямі і інш.

Першыя публікацыі А. Налівайкі з'явіліся ў 1956. Артыкулы «Стыль і мова аповесці Якуба Коласа «Дрыгва» і «Выяўленчыя сродкі аповесці Я. Коласа «Дрыгва» засведчылі настойлівае імкненне даследчыка разабрацца ў складаных літаратурных з'явах. Аўтар манаграфіі «Аповесць Якуба Коласа «Дрыгва», вучэбнага дапаможніка «Беларуская савецкая літаратура», адзін з аўтараў падручнікаў «Беларуская літаратура», «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» для студэнтаў педінстытутаў. Увага даследчыка скіравана да асноўных праблем беларускай савецкай літаратуры.

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Повесть Якуба Коласа «Трясина»: Автореф. дис. ... канд. филолог. н. Мн., 1954.

Аповесць Якуба Коласа «Дрыгва». Мн., 1959. Рэц.: Бугаёў Д. Першая манаграфія пра «Дрыгву» // Полымя. 1959. № 9; Манаграфія пра аповесць «Дрыгва» // ЛіМ. 1959. 4 ліп.

Жывыя рысы Ільіча. Вобраз У. І. Леніна ў бел. маст. літаратуры. Мн., 1960.

Тэматыка курсавых работ па беларускай літаратуры. Мн., 1961.

Проза Якуба Коласа. Мн., 1962.

Кантрольныя работы па беларускай літаратуры. Мн., 1962 / У сааўт. Рэц.: Кутневіч П. Не трэба шпаргалак // Полымя. 1962. № 11.

З Леніным у сэрцы. Мн., 1970. (Матэрыял у дапамогу лектару).

Беларуская літаратура. Мн., 1971 / Сааўт. Т. Бурэйка. Рэц.: Касабокава Я. З любоўю да роднай літаратуры // Вяч. Мінск. 1972. 13 вер.; Беларуская савецкая літаратура. 2 выд., перапрац. і дап. Мн., 1979.

1.3.

1956. Выяўленчыя сродкі аповесці Я. Коласа «Дрыгва» // Уч. зап. Мин. пед. ин-та. Вып. 4, юбилейный;

Стыль і мова аповесці Якуба Коласа «Дрыгва» // Полымя. № 4.

1959. У новым жанры: [Рэц. на: Сіўцоў І. «Нягоды і радасці» // Полымя. 1958. № 7—9] // ЛіМ. 21 лют.; Раман пра нашу сучаснасць: [Рэц. на кн.: Хадкевіч Т. Даль палявая. Мн., 1959] // Мін. праўда. 10 сак.; «Лясная песня»: [Рэц. на кн.: Пестрак П. Лясная песня. Мн., 1958] // Там жа. 6 мая; Летапіс гераізму і мужнасці: [Рэц. на кн.: Лыньков М. Векапомныя дні. Мн., 1958] // Там жа. 29 мая.

1960. Паэт-грамадзянін // Мін. праўда. 20 сак.; Вобраз У. І. Леніна ў беларускай мастацкай літаратуры // Наст. газ. 26 крас.

1962. Пясняр народнага лёсу // Нар. асвета. № 11; Мін. праўда. 26 вер.; Паэзія прозы: [Рэц. на кн.: Брыль Я. Працяг размовы. Мн., 1962] // Мін. праўда. 14 вер.; Пісьменнік-гуманіст // Там жа. 3 ліст.

1963. Пісьменнікі пра Янку Купалу; Творчасць Янкі Купалы савецкага часу; Янка Купала і ўсходнеславянскія літаратуры; Асноўныя выданні твораў Я. Купалы; Асноўныя дапаможнікі па семінарыю: (Артыкулы, бібліяграфічныя даведкі) // Семінарый. Мн.

1964. Жывыя, праўдзівыя вобразы // Нар. асвета. № 5.

1966. Замест прадмовы // Хрэстаматыя па беларускай дзіцячай літаратуры. Мн. / У сааўт.

1970. Паслявоенная беларуская драматургія // Нар. асвета. № 3.

1977. Паэма аб рэвалюцыі // Вялікі Кастрычнік і беларуская літаратура: Зб. артыкулаў. Мн.

1981. Якуб Колас // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры (1917—1940). Мн.; З любоўю да народа і верай у народ // Нар. асвета. № 2.

1982. Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» — шэдэўр беларускага нацыянальнага ліраэпасу // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 10; Паэма аб рэвалюцыі; Проза Якуба Коласа савецкага часу // Янка Купала і Якуб Колас: Некаторыя аспекты творчасці. Мн.; Аркадзь Куляшоў // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, 1941—1980. Мн.; Адзін з паэтычных шэдэўраў Якуба Коласа [«Сымон-музыка»] // Неўміручая спадчына: Матэрыялы рэсп. навук. канф. выкладчыкаў бел. літ. ВНУ БССР, прысвеч. 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа. 14—15 мая 1982 г. Мн.

1984. Ад складальніка // Хрэстаматыя па беларускай савецкай літаратуры. Мн.

1.6.

Хрэстаматыя па беларускай дзіцячай літаратуры. Мн., 1966 / Скл. з інш.

Хрэстаматыя па Беларускай савецкай літаратуры: (Для сярэд. спец. навуч. устаноў БССР). Мн., 1984. Ч. 1. Ч. 2 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Семяновіч А. Гады сталасці // Наст. газ. 1972. 18 кастр.

В. М. Грышкевіч.

НАСОВІЧ ІВАН



Насовіч Іван Іванавіч [26.9(7.10).1788, в. Гразівец Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл.— 25.7(6.8). 1877, г. Мсціслаў; пахаваны на могілках Тупічэўскага манастыра], літаратар, лексікограф, фальклярыст.

Нарадзіўся ў сям'і дзяка. Скончыў у Магілёве гімназію і духоўную семінарыю (1812). Працаваў выкладчыкам рускай славеснасці і інспектарам Аршанскага павятовага вучылішча, потым быў настаўнікам і рэктарам Мсціслаўскага духоўнага вучылішча (1813—22), загадчыкам, наглядчыкам, выкладчыкам Дынабургскай гімназіі (1822—32), Маладзечанскага (1832—34) і Свянцянскага (1834—43) дваранскіх вучылішчаў. У 1843 кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі нечакана прапанавала яму падаць у адстаўку, не маючы на гэта сур'ёзных падстаў. І. Насовіч пасяліўся ў Мсціславе і грунтоўна заняўся навуковай працай — наладзіў цесныя сувязі з Аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Пецярбургскай Акадэміі навук, Археаграфічнай камісіяй, Аддзяленнем этнаграфіі Рускага геаграфічнага таварыства. Па іх парадзе склаў першы гістарычны слоўнік беларускай мовы «Алфавітны паказальнік старажытных беларускіх слоў, выбраных з актаў, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі», які Акадэмія навук удастоіла Уваравскай прэміі (1865). Гэты слоўнік, які ўключае каля 13 тыс. слоў, застаўся ненадрукаваны (захоўваецца ў бібліятэцы АН Расіі ў г. Санкт-Пецярбургу). І. Насовіча справядліва называюць беларускім Далем — ён аўтар манументальнага, унікальнага па тым часе тлумачальна-перакладнога «Слоўніка беларускай мовы», у які ўвайшло

больш за 30 тыс. слоў, запісаных аўтарам ад насельніцтва Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губ., а таксама выбраных з фальклорных твораў, розных літаратурных помнікаў старажытнага беларускага пісьменства. У ім раскрыты сэнс кожнага слова і фразеалагізма, прыведзены прыкладныя рускія эквіваленты, часам даецца этымалогія слова, словы і словазлучэнні ілюструюцца багатым кантэкстам з дыялектнай, фальклорнай ці агульналітаратурнай мовы. За гэты слоўнік Акадэмія навук прысудзіла І. Насовічу Дзямідаўскую прэмію (1885). У 1881 выдадзены «Дадатак да беларускага слоўніка». «Слоўнік беларускай мовы» І. Насовіча, нягледзячы на шэраг слоўнікаў, выдадзеных беларускімі савецкімі лінгвістамі, застаецца выдатнай працай беларускай лексікаграфіі. І. Насовіч таксама надзвычай многа зрабіў у галіне збірання і публікацыі беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці. Упершыню ў гісторыі беларускай фальклярыстыкі ён выдаў асобнай кнігай «Зборнік беларускіх прыказак» (залаты медаль Рускага геаграфічнага таварыства), у які ўвайшло каля 3500 твораў гэтага малога празаічнага жанру, а таксама шэраг блізкіх да яго па форме прыгаворак, пажаданняў, прывітанняў, віншаванняў, праклёнаў і інш. Аўтар раскрыў семантыку прыказак, выявіў гісторыю іх узнікнення, даў паралелі з рускай і іншых моў. Здабыткам беларускай дарэвалюцыйнай фальклярыстыкі сталі зборнікі «Беларускія прыказкі і прымаўкі», «Беларускія прыказкі і загадкі». Што ж датычыць зборніка «Беларускія песні», то, як зараз устаноўлена, ён з'яўляецца працай несамастойнай: складальнік узяў тэксты (а іх там больш як 350) са зборнікаў Я. Чачота і А. Рыпінскага і выдаў іх, не пазначыўшы крыніц запазычання. Паводле ўспамінаў самога І. Насовіча, у свой час ім быў падрыхтаваны асобны том беларускай народнай прозы — казкі, легенды, паданні і інш.— і дасланы ў Акадэмію навук, аднак лёс яго склаўся няўдала: рукапіс згубіўся ў пецярбургскіх архівах. Многае з навуковай спадчыны вучонага і па сёння застаецца ненадрукаваным: «Успаміны майго жыцця» (рукапіс знаходзіцца ў Ін-це мовазнаўства імя Я. Коласа АН Беларусі), гістарычны нарыс «Аб плямёнах да часоў Рурыка, што засялілі беларускую тэрыторыю», некалькі абагульняючых даследаванняў аб беларускай мове, яе месцы сярод славянскіх моў, а таксама дыялектах (рукапісы захоўваюцца ў бібліятэцы АН Расіі ў Санкт-Пецярбургу).

Вялікую каштоўнасць маюць літаратурныя творы І. Насовіча. Амаль усё жыццё, з юнацкіх гадоў, ён пісаў вершы. Да нас дайшла толькі частка яго паэтычных твораў, напісаных на беларускай мове. Гэта нізка псалмаў і некалькі гутарак (напрыклад, каларытнае «Апісанне свянцянскага ігрышча»). Некаторыя са сваіх уласных твораў ён змясціў у зборніку «Беларускія песні», закамуфляваўшы аўтарства, што дало падставу пазнейшым даследчыкам аднесці іх да ліку ананімных паэм. Так здарылася з вядомай хрэстаматыйнай паэмай «Во цяпер які люд стаў» (у рукапісе яна называецца «Изображение развращения нравов»). Рукапіс паэмы «Іудзіяда» (прысвячаецца Я. К. Гроту) захоўваецца ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. Удалай трэба прызнаць спробу перакладу І. Насовічам на беларускую мову катэхізіса. Важнае навуковае і гістарычнае значэнне мае эпісталярная спадчына І. Насовіча — дзесяткі лістоў у Пецярбург вядомым рускім вучоным акадэмікам І. Сразнеўскаму і А. Быкаву. Матэрыялы пра І. Насовіча экспануюцца ў беларускіх музеях. Яго імем названа вуліца ў Мсціславе.

І. К. Цішчанка.

Бібліяграфія

1.3.

1848. Об ответном послании российских архиереев к сорбонским епископам // Мог. губ. вед. № 17, 18, 20, 21, 23—27.

1.4.

Псаломские песни, переложенные в стихотворную русскую речь. Спб., 1866.

1.6.

Белорусские пословицы и поговорки. Спб., 1852. Прибавл. к «Изв. второго отд-ния Акад. наук».

Сборник белорусских пословиц, составленный надворным советником И. И. Носовичем и удостоенный от императорского Русского географического общества Малой золотой медали. Спб., 1866. Отд. отт. из «Зап. РГО по отд-нию этнографии». 1867. Т. 1.

Белорусские пословицы и загадки: [Доп. к «Сборнику бел. пословиц», помещенному в т. 1 «Записок РГО по отд-нию этнографии»]. Спб., 1868 [На вокл.: 1869]. Отд. отт. из «Зап. РГО по отд-нию этнографии». Т. 2.

Словарь белорусского наречия. Спб., 1870 / Скл.

Белорусские песни, собранные И. И. Носовичем. Спб., 1874. Отд. отт. из «Зап. РГО по отд-нию этнографии». 1873. Т. 5.

Сборник белорусских пословиц, составленный надворным советником И. И. Носовичем. Спб., 1874. Отд. отт. из «Сборника ОРЯС Акад. наук». 1875. Т. 12. № 2.

Дополнение к белорусскому словарю И. И. Носовича. Спб., 1881. Отд. отт. из «Сборника ОРЯС Акад. наук». Т. 21. № 6.

Слоўнік беларускай мовы. Мн., 1983. (Факс. выд.). Спб. 1870.

2.2.

Шейн П. Иван Иванович Носович: Краткий биографический очерк. Спб., 1900. Отд. отт. из «Изв. ОРЯС Акад. наук». 1900. Т. 5. № 3.

2.3.

На беларускай мове. Абабурка М. Багатая душа народа... // Маг. праўда. 1977. 23 ліп.; Бандарчык В. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. Мн., 1964. С. 109—116; Бандарчык В., Ларчанка М. Развіццё беларускай фальклярыстыкі // Беларуская вуснапаэтычная творчасць. Мн., 1966. С. 39; Бандарчык В., Сабаленка Э. Этнограф, фальклярыст, мовазнаўца. Да 175-годдзя з дня нараджэння І. І. Насовіча // ЛіМ. 1963. 30 жн.; Гарэцкі М. Іван Іванавіч Насовіч // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня. 1920; 2 выд. Вільня, 1921. 3 выд. Вільня, 1924; Гілевіч Н. З клопатам пра песні народа. Мн., 1970. С. 44—46; Гуліцкі М. Нарысы гісторыі беларускай лексікаграфіі (XIX — пачатак XX ст.). Мн., 1978. С. 50—83; Дзейнасць беларускіх вучоных-этнографаў і асвета // Асвета і педагагічная думка ў Беларусі. Мн., 1985; Жураўскі А., Крамко І. Навуковы подзвіг // ЛіМ. 1962. 12 кастр.; Іх жа. Першы слоўнік старажытнай беларускай мовы // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. 1963. № 4; Ігнатоўскі У. І. Насовіч // Вольны сцяг. 1921. № 2; Камароўскі Я. І. І. Насовіч і яго слоўнік // Беларусь. 1957. № 7; Лепешаў І. Класічная праца айчыннай філалогіі // Помн. гіст. і культ. Бел. 1974. № 3; Ралько І. Вершаскладанне. Мн., 1977. С. 11—12; Скварцоў І. Слова роднае, беларускае // Маг. праўда. 1984. 11 мая; Суднік М. І. І. Насовіч // Беларусь. 1949. № 7;

Яго ж. Неапублікаваны рукапіс // Там жа. 1949. № 5; Яго ж. Слоўнік Насовіча // Там жа. 1950. № 9; Цішчанка І. Першапраходзец // Полымя. 1983. № 10; Яго ж. Хто аўтар ананімнай паэмы? // Помнікі гіст. і культ. Бел. 1984. № 3.

На рускай мове. Булахов М. Носович Иван Иванович // Булахов М. Восточнославянские языковеды: (Биобиблиограф. словарь). Мн., 1976. Т. 1; Пыпин А. История русской этнографии. Спб., 1892. Т. 4. С. 153; Столетие первого белорусского словаря // Сел. газ. 1971. 14 янв.; Судник М. И. И. Носович и современность // Новости ЮНЕСКО (Париж). 1977. № 11; Шейн П. И. И. Носович: (Краткий биографический очерк) // Изв. ОРЯС Акад. наук. Спб., 1900. Т. 5. Кн. 3.

3.1.

Б-ка АН Расіі (Санкт-Пецярбург), ф. 26, вып. 5, спр. 107; Дзярж. публічная б-ка (Санкт-Пецярбург), аддз. рэдкіх кніг і рукапісаў, ф. 120, адз. зах. 1012.

Т. М. Махнач.

НАЎРОЦКІ АЛЕСЬ

Наўроцкі Алесь (Аляксандр Піліпавіч; н. 12.2.1937, в. Давыдаўка Азарыцкага, цяпер Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.), празаік, паэт.

Бацькі, Ніна Афанасьеўна і Піліп Тарасавіч, былі настаўнікамі. Бацька, які выкладаў беларускую мову і літаратуру, садзейнічаў захапленню сына мастацкай літаратурай. У 1944 будучы пісьменнік пайшоў у 1-ы клас Давыдаўскай сямігодкі. Потым, у сувязі з пераездам бацькоў, вучыўся ў Вяжненскай сямігодцы. Скончыўшы яе, вучыўся ў Бабруйскай школе санфельчараў (1951—54). Працаваў фельчарам у в. Вышкава Мірскага (цяпер Карэліцкага) р-на Гродзенскай вобл. У 1956—62 вучыўся ў Мінскім медыцынскім інстытуце. Пасля атрымання дыплома быў урачом участковай бальніцы ў в. Аравічы Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. (1962—65). У 1965 пераехаў у Мінск, працаваў на станцыі хуткай медыцынскай дапамогі. У 1975 паступіў на Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Але скончыць іх не ўдалося па стану здароўя. У той час яго сталі праследаваць ахоўныя органы. «Пратэстуючы супраць прымянення псіхіятрыі ў палітычных мэтах», выйшаў з беларускай пісьменніцкай арганізацыі. З 1976, за невялікім выключэннем, нідзе не працуе. Паводле слоў самога А. Наўроцкага, «дабіваецца палітычнай рэабілітацыі».

Першы верш А. Наўроцкага «Ранак ідзе» надрукаваны ў 1954 у часопісе «Полымя». Потым надрукаваў у «Полымі» і «Маладосці» шэраг апавяданняў. Выдаў зборнікі паэзіі «Неба ўсміхаецца маланкаю», «Гарачы снег», кнігу апавяданняў «Валун». Паэтычным творам А. Наўроцкага ўласцівы глыбіня роздуму і свежасць вобразнага ўспрыняцця свету, смелая асацыятыўнасць і метафарычнасць, іронія і гратэск. Амаль усе апавяданні А. Наўроцкага, якія ўвайшлі ў зборнік «Валун», звязаны агульным героем. Гэта — наш сучаснік, малады спецыяліст, медык па прафесіі, які перайначвае жыццё ў вясковай глушы. Паэзію і прозу А. Наўроцкага высока ацэньвалі Я. Брыль, У. Караткевіч, М. Стральцоў.

В. У. Ярац.

Бібліяграфія

1.2.

Неба ўсміхаецца маланкаю: Паэзія. Мн., 1962. Рэц.: Арочка М. Арыгінальнасць і арыгінальнічанне // ЛіМ. 1962. 12 чэрв.; Бяроэкін Р. Маладосць шукае // Беларусь. 1962. № 12; Караткевіч У. З любоўю да чалавека // Маладосць. 1962. № 12; Кацюшын М. Змена маладая, таленавітая // Голас Радзімы. 1962. № 90; Клышка А. Натхнення табе, паэт! // Полымя. 1962. № 7.

Гарачы снег: Паэзія. Мн., 1968. Рэц.: Архіпаў Ф. Мера пачуцця // Беларусь. 1969. № 2; Казловіч А. Шлях да майстэрства складаны // Мін. праўда. 1969. 29 студз.; Хамянкоў М. // Гомел. праўда. 1968. 13 ліст.; Шпакоўскі Я. Між двух жорнаў // Маладосць. 1969. № 2; Яго ж. Душа, открытая людям // Дружба народов. 1969. № 6; Юрчанка Г. Пачатак і працяг // ЛіМ. 1968. 3 снеж.

Валун: Кніга апавяданняў. Мн., 1976. Рэц.: Ігна-

товіч Ф. Герой книги — фельдшер // Мед. газ. 1977. 16 нояб.; Лецка Я. Шлях да сталасці // Полымя. 1977. № 2.

Пакаленні і папялішчы: Кніга вершаў. Мн., 1990.

1.3.

1954. Ранак ідзе: [Верш] // Полымя. № 10.

1957. Рукі; Я хацеў засмяяцца; Малако; Расінка: [Вершы] // Полымя. № 6; Я хацеў засмяяцца; Расінка: [Вершы] // Ніва. 28 ліп.

1958. Каліна; Цішыня; Дзе ты?: [Вершы] // Полымя. № 5; З думкай пра мір: [Верш] // ЛіМ. 2 крас.

1959. Цаліннік; Чатырохгранная ваза; Елка: [Вершы] // Маладосць. № 1.

1960. На полі калгасным; Каханне; Нарэшце: [Вершы] // Маладосць. № 6.

1961. Акмолінскі стэп; Адгабляваная дошка: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 3; Размова з Уладзімірам Ільічом; «Ветры, буйныя ветры»; Акмолінскі стэп; Адгабляваная дошка: [Вершы] // Полымя. № 4; Радасць; Ноша: [Вершы] // Там жа. № 5; Размова з Уладзімірам Ільічом: [Верш] // Звязда. 22 крас.

1962. Пачатак; Маці мая і я: [Вершы] // Голас сэрца. Мн.; Размова з Уладзімірам Ільічом: [Верш] // Слаўце Радзіму. Мн.

1963. Размова з Уладзімірам Ільічом: [Верш] // Бяссмерце. Мн.; Я стэп шукаў...; «Хачу ў душы тваёй...»; Мелодыя працы; «Жалезны стол. Усё нязвыкла...»: [Вершы] // Полымя. № 8.

1964. Размова з Уладзімірам Ільічом: [Верш] // Чырв. змена. 7 сак.

1965. Палячыце нас, доктар; «Чуваць саланчаковай ночы крокі...»: [Вершы] // Маладосць. № 5; «Чуваць саланчаковай ночы крокі...»: [Верш] // ЛіМ. 18 мая.

1966. Вершы пра сябе; «Калі-небудзь у ясны летні дзень...»; «Я плыву»; «Месяца бледнага...»; «Не заўважаем мы, не заўважаем...»: [Вершы] // Маладосць. № 8; Валун: Апавяданне // Полымя. № 10; Вершы пра сябе // ЛіМ. 9 жн.

1967. Хвоя: [Верш] // Дзень паэзіі — 67. Мн.; Размова з Уладзімірам Ільічом: [Верш] // Мы славім Леніна, мы славім партыю. Мн.; Пагоня: [Верш] // Вясёлка. № 7; Саша: Апавяданне // Маладосць. № 5; Снежань: Апавяданне // Полымя. № 1; Імгненне; «Гузік белы, кругленькі, пластмасавы...»; «Як жа мне трэба мала-мала...»; «У вядры калыхаўся я, у вадзе...»; «Карэннем буду заўтра я...»; «Чорны вузел гальштука ён зашмаргнуў...»; «Па залітай жоўтым святлом дарозе...»: [Вершы] // Там жа. № 3; «Як жа мне трэба мала-мала...»: [Верш] // ЛіМ. 7 сак.

1968. У дажджыстым тумане; Пытанне; Снег з ветрам; Робім мы віткі; На лавачцы ў парку: [Вершы] // Маладосць. № 3; Акушэрка: Апавяданне // Полымя. № 1; «Снег з ветрам калючым шныраюць...»: [Верш] // ЛіМ. 12 сак.

1969. Размова з Уладзімірам Ільічом: [Верш] // Жыве між нас геній. Мн.; Рукі; Цішыня; Чатырохгранная ваза; «Ветры, буйныя ветры...»; Ты — мяцеліца; Просьба: [Вершы] // Мары юнацкія. Мн.; Зазімак: Апавяданне // Маладосць. № 6.

1970. Сустрэча; Інтэрнат: [Вершы] // ЛіМ. 7 жн.; Так і паляцеў бы...: Апавяданне // Там жа. 25 снеж.; «Снег з ветрам калючым шныраюць...»: [Верш] // Ніва. 1 сак.

1971. Некалькі згадак: Апавяданне // Маладосць. № 8; «Неба шэры меніск...»; На воблаку: [Вершы] // Полымя. № 2.

1972. Ліст да З.; Успамін: [Вершы] // Зорка Венера. Мн.

1973. Сустрэчы: Апавяданне // Полымя. № 1.

1976. Рукі: [Верш] // Люблю будзённы дзень... Мн.

1977. Маці мая і я: [Верш] // Дзень добры, мама! Мн.

1978. Успамін: [Верш] // Адданасць. Мн.; Рукі: [Верш] // Сэрцам табе прысягаю. Мн.

1980. Рукі: [Верш] // Такія сэрцы ў нас. Мн.

1.5.

На балгарскую мову. Зимна приказка; Дърво; От теб какво ще стане; Шепот: [Вершы] / Прев. С. Бакърджиев // Белоруски поети. Едно поколение. София. 1971.

На латышскую мову. Es gribeju smieties / Atdz. K. Skujenieks // Liesma. 1960. Nr. 10.

На польскую мову. Rudel; «Czym ty będziesz, drzewo...?» / Tł. T. Huszcza // Wiersze białoruskie. Łódź. 1971; Nadodrze. 1974. Nr 12.

На рускую мову. «Походил фуганок!»: [Верш] / Пер. Я. Хелемский // Дружба народов. 1963. № 1; В Акмолинской степи; Начало: [Вершы] // Неман. 1963. № 3; Руки: [Верш] // Сов. Бел. 1963. 22 окт.; Руки: [Верш] / Пер. Б. Спринчан // Знамя юности. 1965. 6 авг.; Руки; Тишина: [Вершы] / Пер. Я. Хелемский // Дружба народов. 1968. № 2; Валун: [Апавяданне] / Пер. В. Кудинов // Неман. 1968. № 1; Акушерка: Рассказ / Пер. Н. Кислик // Дружба народов. 1969. № 5; Баня: [Апавяданне] / Пер. О. Новожилов // Неман. 1970. № 6; Встреча: [Апавяданне] / Пер. В. Кудинов // Там жа. 1971. № 12.

На ўкраінскую мову. По степу Акмолінськім: [Верш] / Пер. В. Матчук // Жовтень. 1962. № 12; Чотиригранна ваза: [Верш] / Пер. В. Лучук // Там жа. 1964. № 9; Відро водою наповнене: [Верш] / Пер. В. Лучук // Вільна Україна. 1967. 22 січ.; Відстругана дошка; Вітри буйні: [Вершы] / Пер. М. Коцюбинська // Жовтень. 1967. № 1; Просто не віриться: [Верш] / Пер. В. Сидоренко // Сузір'я. К., 1968. Вип. 2; «По залитій жовтим світлом дорозі...»: [Верш] / Пер. А. Таран // Літ. Укр. 1968. 31 груд.; Відстругана дошка; Чим ти будеш, дерево? Павлюк Багрим; Мати моя і я; Початок; Вітри буйні; Заступ; Із циклу «Елегії»: Говорив з трибуни якось ніс; Не розбираючи, хто винний...; Другові; Води у відрі повнісінько; В душі твоїй пожити хочу потайки: [Вершы] / Пер. М. Коцюбинська, В. Лучук // Калинові мости. К., 1969; Твое ймення: [Верш] / Пер. В. Коломієць // Дніпро. 1969. № 4; Не помічаємі...; Росинка; Втрата; По степу під Акмолінськом; Просто не віриться: [Вершы] / Пер. Ю. Петренко, С. Литвин // Білоруська радянська поезія. К., 1971. Т. 2; Дерево, чим ти будеш?: [Верш] / Пер. И. Струцюк // Рад. Волинь. 1972. 17 берез.

2.3.

На балгарскай мове. Вълчев Г. Едно поетично поколение // Белоруски поети: Едно поколение. София. 1971; Вълчев Г. Алес Навроцки: [Партрэтны эцюд] // Вълчев Г. Приобщения. Лит. контакти и аналогии. София. 1971.

На беларускай мове. Андраюк С. Вывяраючы жыццём. Мн., 1976. С. 195; Бярозкін Г. Вершы Алеся Наўроцкага // ЛіМ. 1957. 27 ліп.; Гніламёдаў У. Традыцыі і наватарства. Мн. 1972. С. 54—55; 164; Яго ж. Чалавек і свет // Полымя. 1965. № 12; Каваленка В. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі. Мн., 1977. С. 129—130; Кенька М. За права малога жанру // ЛіМ. 1974. 1 ліст.; Лойка А. Сустрэчы з днём сённяшнім. Мн. 1968. С. 130—133; Рагуля А. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай маладой беларускай прозы // Беларуская літаратура на сучасным этапе. Мн. 1977; Шпакоўскі Я. Між двух жорнаў // Шпакоўскі Я. Узрушанасць. Мн. 1978; Яго ж. Структура вершаванага вобраза. Мн. 1972. С. 14—16, 27—29, 34—37; Ярош М., Бечык В. Беларуская савецкая лірыка. Мн. 1979. С. 282—283.

На польскай мове. Aleś Naurocki // Wiersze białoruskie. Łódź, 1971.

На рускай мове. Бойко В. Быть поэтом — мыслить // Знамя юности. 1962. 18 сент.; Семенова А. Заметки о рассказах // Неман. 1967. № 6; Стрельцов М. Первое знакомство // Неман. 1968. № 1.

В. У. Смольская.

НЕЗАБІТОЎСКІ СТАНІСЛАЎ

Незабітоўскі Станіслаў (24.9.1641, в. Ятра Навагрудскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл.— восень 1717, Навагрудак), кальвінскі грамадскі дзеяч, мемуарыст. Пісаў на польскай мове.

Паходзіў з засцянковай шляхецкай сям'і герба Любіч, якая выводзілася з Незабітова Люблінскага ваяв. (цяпер Польшча). Яго бацька — Мікалай Незабітоўскі, маці — Ганна Маскевіч, дачка мемуарыста Б. Маскевіча. Вядома, што ў 1649 С. Незабітоўскі вучыўся ў Навагрудскім езуіцкім калегіуме ў ксяндза А. Слёнскага. Верагодна, за заслугі бацькі, які служыў у войску кн. Б. Радзівіла і загінуў у бітве пад Прасткамі ў Прусіі (1656), быў прыняты на службу да князя. З 1661 знаходзіўся ў Крулеўцы (Кёнігсбергу), дзе здабыў давер Г. М. Радзівіл, якая даводзілася стрыечнай сястрой Б. Радзівілу. У 1662 выконваў ролю пасрэдніка паміж князем і каралеўскім дваром у Варшаве. Паступова Б. Радзівіл даверыў яму справы, звязаныя з адміністрацыяй сваіх маёнткаў у Жэмайціі, што вымагала ад С. Незабітоўскага часта бываць у Біржах, Коўне, Вільні і Слуцку (у апошнім ён жыў доўгі час). У 1666 ездзіў на варшаўскі вальны сейм па справах Б. Радзівіла. У 1668 ажаніўся ў Слуцку з Мар'янай, дачкой Рыгора Мірскага, і таму стаў сваяком уплывовых шляхціцаў Цадроўскіх, Чыжаў, Клакоцкіх і Аборскіх. У 1670 пасля смерці Б. Радзівіла (1669) разам з К. Клакоцкім і В. Сяніцкім стаў кіраваць вялікімі маёнткамі адзінай спадчынніцы нябожчыка Л. К. Радзівіл. Новыя абавязкі зблізілі С. Незабітоўскага з апекуном князёўны польскім паэтам З. Морштынам, з якім ён пасябраваў і пастаянна перапісваўся. Рэзідэнцыяй С. Незабітоўскага з таго часу стаў Слуцк, дзе ён жыў са сваёй сям'ёй. С. Незабітоўскі ўдзельнічаў у кальвінскіх сінодах Навагрудскай акругі, абараняў маёмасныя інтарэсы слуцкай абшчыны. Каля 1676 ён прызначаны каліскім падчашым, хоць і не валодаў маёмасцю ў той частцы Польшчы.

У рукапісах зберагліся шматлікія (каля 700) лісты С. Незабітоўскага да З. Морштына і іншых асоб, а таксама копія (пачатку 18 ст.) змястоўных і падрабязных успамінаў, у якіх апісаны падзеі 1682—1700 на Навагрудчыне і Случчыне. Гэтыя мемуары з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі грамадска-палітычнага і прыватнага жыцця Беларусі і Літвы канца 17 ст. Рукапіс мемуараў (944 старонкі) зберагаецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

А. Ф. Коршунаў.

Бібліяграфія

2.3.

На польскай мове. Łukaszewicz J. Dzieje kościołów wyznania helweckiego w Litwie. Poznań, 1843. T. 2. S. 70—78; Sajkowski A. Niezabitowski Stanisław // Polski Słownik Biograficzny. T. 23; Sajkowski A. Od Sierotki do Rybeńki. Poznań, 1965. S. 115—132; Sajkowski A. Staropolskie nekrologi // Opuscula Casimiro Tymieniecki dedicata. Poznań, 1959; S. 70—78; Syrokomla W. Pan Stanisław Leszczyński // Atheneum. 1846. T. 2.

На рускай мове. История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 273.

3.1.

Галоўны архіў старадаўніх актаў у Варшаве, ф. Радзівілаў, аддз. V, т. 229, спр. 10481, 10493 [Лісты]; Нацыянальная б-ка ў Варшаве, аддз. рукап., ф. ардынацыі Замойскіх, адз. зах. 911 [Дзённік].

А. Ф. Коршунаў.

НЕПАЧАЛОВІЧ ЯНКА

Непачаловіч Янка [Іван Данілавіч; 12(25).5.1917, в. Мінкавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл.— 3.7.1969, в. Дараганава Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., пахаваны на радзіме — у в. Мінкавічы], паэт. Член СП Беларусі з 1958.

З сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў загадчыкам хаты-чытальні ў в. Крываносава Старадарожскага р-на (1934). У 1935 паступіў на літаратурны ф-т Мінскага пед-інстытута. З трэцяга курса накіраваны Наркаматам асветы БССР настаўнікам у Дзяржынскую СШ Мінскай вобл., дзе працаваў у 1937—39, потым у Мар'інагорскай СШ (1939—41). У 1940 завочна скончыў пединстытут. У час вайны жыў у родных мясцінах (в. Мінкавічы). З 1942 быў сувязным партызанскай брыгады імя Кірава, выконваў яе заданні. Пасля вайны працаваў настаўнікам у Дзяржынску (1944—47), інспектарам школ Старадарожскага р-на (1947—48). З 1948 настаўнік у в. Дараганава Асіповіцкага р-на. У 1967 пераехаў у Мінск, працаваў у выдавецтве «Народная асвета». Трагічна загінуў у в. Дараганава. Узнагароджаны медалём.

Першыя вершы Я. Непачаловіча надрукаваны ў 1936 у часопісе «Полымя рэвалюцыі». Першая кніга паэта «Мера любві» выйшла ў свет у 1958, калі яе аўтар быў ужо далёка не пачаткоўцам. Блаславіўшы рукапіс у друк, А. Вялюгін адзначаў жыццёвую канкрэтыку твораў паэта, задушэўнасць інтанацый, адсутнасць «таннай траскатні». Другая прыжыццёвая кніга паэзіі, «Позні паром», выйшла ў 1967. Сярод яе асноўных матываў — любоў да роднай зямлі і прыроды, разуменне жыццёвых клопатаў чалавека-працаўніка, адчуванне сваёй крэўнай сувязі з ім. Характэрная рыса вершаў Я. Непачаловіча — прыглушанае выяўленне свайго лірычнага «я», якое раскрываецца часцей у адносінах да героя верша, у суперажыванні яму. Паводле жанру такія вершы маюць пераважна баладны характар. На словы Я. Непачаловіча Ю. Семяняка напісаў папулярную песню «Табе маё прызнанне».

Э. І. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.1.

Перад захадам сонца: Выбр. вершы. Мн., 1977. Рэц.: Кнігапіс // ЛіМ. 1977. 21 кастр.

1.2.

Мера любві: Вершы. Мн., 1958. Рэц.: Астапенка А. «Мера любви» // Знамя юности. 1958. 18 июля; Гілевіч Н. Сапраўднае і павярхоўнае // Полымя. 1958. № 8; Кудраўцаў І. Першая кніга // Беларусь. 1958. № 7; Піятухоўская Р. Роздум паэта // Маладосць. 1959. № 5; Усікаў Я. Сваім голасам // Звязда. 1959. 5 ліп.; Шавня А. Поиски и находки // Сов. Бел. 1958. 20 авг.

Позні паром: Вершы. Мн., 1967. Рэц.: Парахневіч М. Паром не прычаліў да берага // Мін. праўда. 1967. 20 чэрв.

1.3.

1936. Матчына гора; Зялёны сад: [Вершы] // Полымя рэвалюцыі. № 3; Марыула: [Верш] // Там жа. № 4. Рэц.: Багун М. У возеры шэрай вадзічкі... // ЛіМ. 18 ліп.; Вячэрняя сустрэча: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 6.

1937. Стары садоўнік: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 9—10; Песня над калыскай: [Верш] // Чырв. змена. 5 крас.

1938. Чаканне: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 4.

1946. Два ўрокі ў адным класе // Наст. газ. 31 кастр.

1952. Мой гадзіннік; Млынар; «Светлакудры хлопчык Мішка...»: [Вершы] // Полымя. № 12.

1953. Раённая газета; Вясна і маладосць: [Вершы] // Полымя. № 12.

1955. Само сэрца пяе; Сталасць; Спадчына; Паштальён: [Вершы] // Полымя. № 6; Мера любві; Даведкі; Ляснік; Этнограф на рынку; Стары халасцяк: [Вершы] // Там жа. № 10; Ля карты Радзімы: [Верш] // Там жа. № 12.

1956. Ты, як маці: [Верш] // Полымя. № 2; Вятрак; У навальніцу; Калючыя драты; «Пераношу я цябе праз лужы...»: [Вершы] // Там жа. № 11.

1957. Зрываючы лісток календара; Сонца і кропля вады: [Вершы] // Маладосць. № 8; У ролях закаханых: [Верш] // Там жа. № 12; Перад захадам сонца; Дараганава; Першыя крокі: [Вершы] // Полымя. № 7; Таварышу; Моцныя рукі: [Вершы] // Там жа. № 10;

1958. Падкова; З табою; «Гары, маё сонца, гары...»; Вернасць; «Можа праўду ты сказаць не хочаш?..»; Два сонцы: [Вершы] // Маладосць. № 4.

1959. Змена: [Верш] // Полымя. № 2; Прызнанне: [Верш] // Работніца і сялянка. № 4.

1960. Балада пра скрыпача і скрыпку: [Верш] // Наст. газ. 26 лют.; У час дажджу: [Верш] // Там жа. 4 сак.

1961. Мера любві; Этнограф на рынку; Калючыя драты: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 3.

1964. Мой абавязак і права: [Верш] // Наст. газ. 5 снеж.

1965. Мазалі: [Верш] // Полымя. № 1; Гады; Сібір; Нядзеля; Запаўняючы анкеты; Прызнанне; «О, павучаць людзей умелі...»; Сустрэча з Янкам Купалам: [Вершы] // Там жа. № 12; Гады; Прызнанне: [Вершы] // ЛіМ. 7 снеж.; З новай кнігі: [Вершы] // Маг. праўда. 17 ліст.; Вернаму другу: [Верш] // Чырв. змена. 6 мая.

1966. Роднай зямлі: [Верш] // Беларусь. № 1; ЛіМ. 7 студз.; Трывожнае сэрца; Маё крэда; У час дажджу; Жалезная гара; «Сонца заўсёды адб'ецца...»; «Жыццё не знае старасці...»; Дасціпная; «Перад табой, магутны геній...»: [Вершы] // Беларусь. № 3; Партыя: [Верш] // Полымя. № 3; ЛіМ. 8 сак.; Наст. газ. 30 сак.; Позні паром; Карэнні; «Дубы зямлю ўсыпаюць жалудамі...»; Магіла маёра; «О, як жа звязана трывала...»; Лета; Цень; Мінскім сябрам; «Банкет праз ноч гудзе...»; Успаміны: [Вершы] // Полымя. № 10.

1967. Аднагодкам Кастрычніка: [Верш] // Дзень паэзіі — 67. Мн.; З партыяй: [Верш] // Мы славім Леніна, мы славім партыю. Мн.; Роздум над паперай; Імя сыну; Рубель; «Хапае сонцу й прастору...»; Праўда; Скарга Пцічы; Развіхрылася віхура; «Не ўсімі аднолькава свет пазнаецца...»: [Вершы] // Беларусь. № 1; «Чалавекам пройдзена нямала...»; Жончын клопат: [Вершы] // Там жа. № 5; Зялёныя гады: [Верш] // Вожык. № 23; Месяц; Явачная кватэра; Сонца: [Вершы] // Полымя. № 5; У дарозе: [Верш] // Там жа. № 10; Імя сыну: [Верш] // ЛіМ. 6 студз.; Роднай зямлі: [Верш] // Маг. праўда. 27 мая; «Гары, маё сонца, гары...»: [Верш] // Там жа. 23 ліп.; Ляснік; Дараганава: [Вершы] // Там жа. 20 жн.

1968. Імёны герояў: [Верш] // Беларусь. № 7; Сустрэча партызан; Маці; «Дзень і ноч грукочуць паязды...»: [Вершы] // Полымя. № 3; «Дзень і ноч грукочуць паязды...»: [Верш] // ЛіМ. 12 сак.

1969. З партыяй: [Верш] // Жыве між нас геній. Мн.

1972. Роднай зямлі: [Верш] // Залацінкі. Мн.; «Можа праўду ты сказаць не хочаш?..»: [Верш] // Зорка Венера. Мн.

1973. Аўтабіяграфія // Вытокі песні. Мн.

1976. Застольнае слова; «А лясы прадаўжаюць радзець...»; Кірмаш; «Завітала маці да мяне...»; «Бацька акурак цыгаркі...»; «Свет пабачыць — ад здзіўлення...»; «Яму не больш як дваццаць пяць...»; Явачная кватэра; Запавет: [Вершы] // Полымя. № 12.

1978. Мера любві: [Верш] // Адданасць. Мн.

1982. Дружба: [Верш] // На сцягу і ў сэрцы. Мн.; Сустрэча з Янкам Купалам: [Верш] // Нам засталася спадчына. Мн.

1983. Ленінскай партыі слова: [Верш] // Заўсёды з Леніным. Мн.

1985. Сярнічка; Явачная кватэра; Сустрэча партызан: [Вершы] // Партызаны, партызаны... Мн.

1.5.

На рускую мову. Три стихотворения: Воскресенье; Корни; Поздний паром / Пер. Ф. Ефимов // Неман. 1968. № 6; «Когда домой вернулся батька...»: [Верш] / Пер. И. Василевский // Путь к победе. Мн., 1970.

На ўкраінскую мову. Етнограф на ринку; Колючі дроти; Коріння; Зустріч партизанів: [Вершы] / Пер. І. Гончаренко, С. Литвин // Білоруська радянська поезія. К., 1971. Т. 2; Таїна: [Верш] / Пер. В. Колодій // Колодій В. Братерство. Львів, 1985.

2.3.

На беларускай мове. Аношкін І. Паэт грамадзянскага гарту: Да 60-годдзя з дня нараджэння Я. Непачаловіча // ЛіМ. 1977. 27 мая; Маг. праўда. 1977. 25 мая; Бялевіч А. Слова пра юбіляра // Полымя. 1967. № 5; Васільеў А. «Залатое маё Дараганава» // ЛіМ. 1977. 3 чэрв.; Вялюгін А. Карэнне // Непачаловіч Я. Позні паром. Мн., 1967; Яго ж. Радкі пакідаем з жывымі // Непачаловіч Я. Перад захадам сонца. Мн., 1977; Жгут В. Насустрач раскрываюцца сэрцы // ЛіМ. 1959. 2 снеж.; Няхай Р. На родных берагах // Там жа. 1967. 23 мая; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Прыходзька П. Паэзія працы і змагання // Звязда. 1967. 25 мая; Пысін А. З новай кнігі: Памяці Янкі Непачаловіча // Маг. праўда. 1970. 17 кастр.; Усікаў Я. Сталасць // Там жа. 1967. 27 мая; Янка Непачаловіч: [Некралог] // ЛіМ. 1969. 8 ліп.

2.4.

На беларускай мове. Пысін А. «Ападае лісток на руку...»: [Верш] // Пысін А. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1980. Т. 2.

В. У. Смольская.

НЁМАНСКІ ЯНКА

Нёманскі Янка [сапр. Пятровіч Іван Андрэевіч; інш. псеўд. Нёманскі, Я. Нёманскі, Нёманский, крыпт. І. П., И. П., Я. Н-скі; 31.3(12.4).1890, в. Шчорсы Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл.— 30.10.1937], празаік, публіцыст, вучоны-эканаміст, грамадскі дзеяч. Акадэмік АН Беларусі (1928).

3 сялян. Рана памерла маці. Жыў з бацькам, Андрэем Мікалаевічам, і дзедам. Дзяцінства і юнацтва прайшло ў цяжкай працы. Вучыцца пачаў з шасці гадоў, настаўнікамі былі дзед, бацька, дзядзька. У 1909 скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю і нейкі час працаваў у вясковай школе. У 1914—16, 1918 вучыўся ў Петраградскім універсітэце на гісторыка-філалагічным факультэце. Побач з вучобай займаўся грамадскай дзейнасцю. У 1916 мабілізаваны ў царскую армію і пасля школы прапаршчыкаў адпраўлены на фронт у якасці малодшага афіцэра роты. Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў на фронце. У 1919—21 гадах служыў у Чырвонай Арміі — ваяваў на Карэльскім, Петраградскім, Польскім франтах, быў пад Нарвай і Варшавай, у Сібіры і на Далёкім Усходзе. Адразу пасля рэвалюцыі працаваў у Беларускім нацыянальным камісарыяце — сакратаром культурна-асветнага аддзела, загадчыкам выдавецкага аддзела. Актыўна ўдзельнічаў ва ўсерасійскім з'ездзе бежанцаў Беларусі ў ліпені 1918 (быў яго сакратаром). Разам з Ц. Гартным выдаваў першую беларускую савецкую газету «Дзянніца» (1918—19). На працягу 1918—20 з Я. Карскім, А. Сержпутоўскім, А. Шахматавым і інш. быў членам Беларускага вольна-эканамічнага таварыства, створанага ў Петраградзе з мэтай развіцця навукі, культуры, народнай гаспадаркі Беларусі. З 1921 жыў у Мінску. Працаваў у планава-эканамічных органах рэспублікі, вучоным сакратаром Інстытута эканомікі АН БССР, намеснікам старшыні Дзяржплана БССР. Быў членам Інбелкульта, членам праўлення літаратурна-мастацкага аб'яднання «Полымя» (1927—32). У 1927—36 член ЦВК. У 1933—36 працаваў у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі, узначальваў кафедру фінансавых дысцыплін. Сябраваў з Я. Купалам, Я. Коласам, Ц. Гартным. 26 красавіка 1937 беспадстаўна арыштаваны, 30 кастрычніка 1937 расстраляны. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1957.

Друкавацца пачаў у 1918 у газеце «Дзянніца». Першае апавяданне «Над Кроманню» апублікаваў у 1922 у часопісе «Полымя». Аўтар аповесці «Партызаны», рамана «Драпежнікі» (1928—30, няскончаны, рукапіс 2-й часткі загінуў пасля арышту). Вядучая тэма творчасці — жыццё працоўнага чалавека ва ўмовах рэчаіснасці дакастрычніцкага часу, кантрасты сацыяльнай і нацыянальнай несправядлівасці.

І. П. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.2.

На зломе: Апавяданні. Мн., 1925. Рэц.: Байкоў М. Полымя. 1926. № 1; 2 выд. Мн., 1928.

Творы. Мн., 1984. Рэц.: Ярош М. Вяртанне ў дзень сённяшні // Полымя. 1985. № 12.

1.3.

1918. Нацыянальныя задачы Беларусі // Зажынкі. М.

Пад псеўд. Нёманскі; К культурно-просветительным задачам Белоруссии // Дзянніца. 8 сак. / Пад сваім прозв.; К хозяйственно-экономическим задачам Русской Советской Республики // Там жа. 7 чэрв.

Пад псеўд. Нёманский; Адзіная Расія і падзел Германіі // Там жа. 24 снеж. / Пад псеўд. Нёманскі.

1919. Значнасць апавяшчэння Беларусі Радаваю рэспублікай / Пад псеўд. Нёманскі; Патрэбнасць прадстаўніцтва Беларусі пры Расейскай Радавай Рэспубліцы / Пад сваім прозв. // Дзянніца. 8 лют.

1922. Над Кроманню: Апавяданне // Полымя. № 1 / Пад псеўд. Нёманскі.

1923. Перечень статей, помещенных в журн. «Народное хозяйство Белоруссии» за 1923 г. // Нар. хоз-во Бел. № 6, 12 / Пад сваім прозв.; Рамэо і Джульета на Беларусі: Апавяданне // Полымя. № 2 / Пад псеўд. Нёманскі; Дэзерцір: Апавяданне // Там жа. № 7—8; Покупайте хлебный заем!: Письмо делегатам Волконференции: [Верш] // Бел. деревня. 3 июня / Пад крыпт. И. П. Аўт. спрэчнае.

1924. Маці: Апавяданне // Полымя. № 4.

1927. Партызан: Апавяданне // Полымя. № 7.

1928. Драпежнікі: Раман у трох частках // Полымя. № 1, 2, 4, 10; 1929. № 3, 8—9, 11—12.

1931. Партызан: [Апавяданне] // Рытмы перамогі. Мн.; Пясняр пралетарскай рэвалюцыі // Сав. Бел. 2 крас. / Пад крыпт. Я. Н-скі.

1933. Партызан: [Апавяданне] // 11 ліпеня. Мн.

1934. «Полымя рэвалюцыі». Кніга шостая-сёмая 1934 г. // ЛіМ. 27 кастр. / Пад крыпт. І. П.; «Спалох на загонах» Платона Галавача // Там жа. 31 снеж. / Пад крыпт. І. П.

1967. Над Кроманню: [Апавяданне] // Анталогія беларускага апавядання: У 2 т. Мн. Т. 1.

1973. Аўтабіяграфія // Вытокі песні. Мн.

1.4.

Кій. Радавая рэспубліка / З кіт. М., 1918.

Кій. Што такое сацыялізм / З кіт. М., 1918.

1918. Канчар Е. Патрэбы Беларусі / З рус. // Зажынкі. М.

1.5.

На нямецкую мову. Romeo und Julia in Belorussland / Übers. G. u. W. Tschepego // Störche über den Sümpfen. Berlin, 1971.

На польскую мову. Matka / Tł. I. Moszyńska-Heltmanowa. Mn., 1928.

Romeo i Julja na Bialorusi / Tł. Moszyńska-Heltmanowa. Mn., 1929.

На рускую мову. На изломе: Рассказы / Пер. К. Яковчик. М.; Л., 1930.

Над Кроманью: [Апавяданне] / Пер. Я. Густырь // Просторы. Мн., 1927; Дезертир: [Апавяданне] / Пер. авт. // Соки целины. М., 1928.

На ўкраінскую мову. Ромео і Джульета на Білорусі: [Апавяданне] / Пер. Л. Кардиналовська // Нова Білорусь. К., 1929.

2.3.

На беларускай мове. Байкоў М. Наша літаратура за 1925 г. // Полымя. 1926. № 1; Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць. Мн., 1971. С. 61—65; Гальмакоў З. Пісьменнік, вучоны, грамадскі дзеяч // Полымя. 1970. № 3; Гарэцкі М. Творчасць Я. Нёманскага // Сав. Бел. 1927. 8, 12 кастр.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Савік Л. Янка Нёманскі // Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20—30-х гадоў. Мн., 1985; Строева Т. Адзін з пачынальнікаў // ЛіМ. 1980. 4 крас.; Хомчанка В. Абавязак памяці // Там жа. 1985. 15 ліст.; Шулякоўскі А. [Біябібліяграфічная нататка да 95-годдзя нараджэння] // Полымя. 1985. № 4.

На нямецкай мове. Randow N. Über die Autoren // Störche über den Sümpfen. Berlin, 1971.

На рускай мове. Замбржицкий С. Янка Неманский // Неманский Я. На изломе. Рассказы. М.; Л., 1930; Клейнборт Л. Я. Нёманский (Я. Петрович) // Клейнборт Л. Молодая Белоруссия. Мн., 1928.

В. У. Смольская.

НІКАНОВІЧ МІКОЛА

Нікановіч Мікола [Мікалай Уладзіміравіч; псеўд. і крыпт. Селянін М. Н-іч, М. Н., М. Н-віч, М. Н-іч, Н., Н-іч, Н-ч, N.; 2(15).4.1902, в. Клянніки Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Смалявіцкі р-н — кастрычнік 1944], празаік, перакладчык.

З сялян. Вучыўся ў Кляннiцкай пачатковай школе, потым у гімназіі ў Ігумене (цяпер Чэрвень). Удзельнічаў у партызанскай барацьбе супраць польскіх акупантаў. Пасля грамадзянскай вайны настаўнічаў у роднай вёсцы, актыўна прапагандаваў усё новае — змагаўся супраць грамадскай пасіўнасці селяніна, супраць п'янства і забабонаў. У 1928 пераехаў у Мінск і стаў працаваць стылістам у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», затым у «Звяздзе». На працягу 1923—32 сістэматычна друкаваўся на старонках «Савецкай Беларусі», «Звязды», «Полымя», «Маладняка», «Аршанскага маладняка», «Маладога аратага», «Беларускага піянера», «Чырвонай змены», «Чырвонай Беларусі», «Беларусі калгаснай» і іншых перыядычных выданняў рэспублікі. У 1933 рэпрэсіраваны, асланы на тры гады на Урал. Працаваў у газетах «Уральский рабочий», «Советский Дон». У 1942 прызваны ў армію. Удзельнічаў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У кастрычніку 1944 на тэр. Чэхаславакіі прапаў без вестак. Рэабілітаваны ў 1956.

Першае апавяданне «Ахвяры цемры» надрукаваў у 1923 у газеце «Савецкая Беларусь», першы верш — у часопісе «Маладняк» за 1925. Першыя зборнікі апавяданняў «Золак» і «Радасць» выйшлі ў свет у 1926. Апрача гэтага пры жыцці пісьменніка асобным выданнем свет пабачылі яшчэ 4 кнігі прозы «Крык працы», «Вясновы прамень», аповесці «Мяцеліца» і «У паўстанцаў». Творы М. Нікановіча пафасныя, узнёслыя, рамантычныя; асноўная іх тэма — змены ў жыцці паслякастрычніцкай вёскі, будаўніцтва новага жыцця.

І. П. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.1.

Летнім днём: Выбранае. Мн., 1960. Рэц.:Перкін Н. Прыкметы часу // Полымя. 1961. № 7; Цараноў Л. Час і спадчына // ЛіМ. 1961. 10 лют.

1.2.

Золак: Апавяданні. Мн., 1926. Рэц.: Жарскі П. // Полымя. 1926. № 6; Ш.-Тр. Р. [Шукевіч-Траццякоў Р.]. Што прайшло і ніколі не вернецца // Чырв. сейбіт. 1926. № 5.

Радасць: Апавяданні. Мн., 1926. Рэц.: Шчасны Я. // Маладняк. 1926. № 6.

Крык працы: Апавяданні. Мн., 1928. Рэц.: Астаповіч // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». 1928. № 10; Грэскі М. // Полымя. 1928. № 4; Лясны Л. Крык працы // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». 1928. № 11; Савченко Ю. // Плуг. 1928. № 10.

Вясновы прамень: Апавяданні. Мн., 1929.

Мяцеліца: Аповесць. Мн., 1930. (Мастацкае слова — масам).

У паўстанцаў: Аповесць штрыхамі нарысаў. Мн., 1931.

Светлая даль: Апавяданні; Аповесці; Замалёўкі. Мн., 1985.

1.3.

1923. Беларуская школа як фактар культуры беларускага пралетарыяту // Полымя. № 3—4. / Пад крыпт. N.; Виссарион Григорьевич Белинский: (К 75-летию со дня смерти) // Красная смена. 15 июня / Пад крыпт. Н.: Нашы старажытнасці // Наш сцяг. 9 чэрв.; Культасветныя гурткі // Сав. Бел. 7 лют.; Мінуўшчына й музей: (Уражанні вяскоўца); Трэба шанаваць старажытнасці // Там жа. 16 лют.; Прыклад добрага загадчыка хаты-чытальні // Там жа. 31 мая / Пад крыпт. М. Н.; Ахвяра цемнаты: [Апавяданне] // Там жа. 19—21 ліп.

1924. Ці патрэбен пост?: Думкі й развагі ў «вялікі пост» // Бел. вёска. 16 крас.; Два мира: (Рассказ) // Там жа. 21 мая / Пад крыпт. М. Н.; Так часта бывае: Апавяданне // Сав. Бел. 4 крас.; Каштоўны падарунак: Апавяданне // Там жа. 8 крас.; Антон Чубарына: Абразок // Там жа. 27 ліп.; Не сцярпела: Малюнак // Там жа. 9 вер.

1925. Песні вясны: Імпрэсія; Вясковы камсамол: [Верш] // Арш. маладняк. № 2; Перарадзіліся: Апавяданне // Бел. піянер. № 6; «Малады Араты» зававяваў сімпатыю вясковай моладзі: Нарыс // Малады араты. № 9—10; У хвалях жыцця: Апавяданне // Там жа. № 9—12; Пераменнікі, возьмемся за працу // Бел. вёска. 21 лют.; Нядзеляй // Там жа. 25 жн.

1926. Пастушкі: Апавяданне // Бел. піянер. № 10; Крык працы: Апавяданне // Маладняк. № 7—8;

Амаладзіўся: Апавяданне // Малады араты. № 7; «Так бог даў!..»: Апавяданне // Полымя. № 3; На начлезе: Апавяданне // Там жа. № 6; Беларуская вёска дапамагла: Малюнак // Бел. вёска. 21 сак.; Вёска: [Урывак з аповесці] // Звезда. 16 февр.; Так часта бывае: [Апавяданне] // Там жа. 4 апр.; Вёска: Урывак з аповесці // Сав. Бел. 3 жн.

1927. Адплаціў: [Апавяданне] // Да дня вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Мн.; Напралом: Апавяданне // Бел. піянер. № 5; Залатыя званочкі: Апавяданне // Маладняк. № 6; Дзве баразны: Апавяданне // Полымя. № 3; На вёсцы: Апавяданне // Там жа. № 5; Сав. Бел. 27 мая; Помніцца... // Чырв. краіна. № 2; Казка жывая: [Урывак з аповесці] // Сав. Бел. 24 мая; На хутары: [Апавяданне] // Там жа. 20—22 жн.; Культура і мова бюракратызму // Там жа. 25 снеж. / Пад крыпт. М. Н.; У дарозе: [Нарыс] // Чырв. змена. 22 мая; На вуліцах горада Леніна: [Уражанні] // Там жа. 27 мая; Маладнякоўская ўдзячнасць // Там жа. 1 чэрв. / Сааўт. В. Каваль, В. Маракоў.

1928. Слёзы веснавыя: Апавяданне // Маладняк. № 2; К прасцягам новага: Апавяданне // Там жа. № 4; Аднаго разу вечарам: Апавяданне // Там жа. № 6; Кацярына: Апавяданне // Там жа. № 11; За плячамі гадоў: [Апавяданне] // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». № 9; Заклятае шчасце: [Урывак з рамана] // Там жа. № 19; На хутары: Апавяданне // Полымя. № 2; Дні мядовыя // Звязда. 15 студз.; Зімовымі досвіткамі // Там жа. 2 снеж.; Па цёмных кутках: [Апавяданне] // Сав. Бел. 20, 21 чэрв.; Абарваная сімфонія: Урывак з рамана «Цераз калдобіны» // Чырв. змена. 25 ліст.

1929. Вечарам: Эскіз // Моладзь — за новы быт. Мн.; Гутарка з карэспандэнтам «Маладняка» // Маладняк. № 7; У палявых дарогах: [Апавяданне] // Там жа. № 8; Рэц.: Кабакоў М. // Полымя. 1929. № 10; Віхура ночы: [Урывак з апавядання «На начлезе»] // На Беларусі. 15 жн.; Той дзень: [Урывак з рамана] // Сав. Бел. 27 студз.; Вочы: Апавяданне // Там жа. 21 крас.; Вяснянка: [Урывак з рамана] // Там жа. 28 ліп.; Вечарам: Эскіз // Чырв. змена. 3 сак.; У дні барацьбы: [Урывак з рамана] // Там жа. 11 жн.

1930. Звер: Апавяданне // Паляўнічы Бел. № 4; У паўстанцаў: Замалёўкі // Полымя. № 3, 5—6; Новай дарогаю: Апавяданне // Чырв. Бел. № 23—24; На мяжы загонаў: [Эскіз] // Камунар Магілёўшчыны. 9 сак.

1931. На світанні: Апавяданне // Паляўнічы Бел. № 12; 1932. № 1; Скарабея: Урывак з аповесці // Чырв. Бел. № 15.

1932. Ванька Гак: Нарыс // Іскры Ільіча. № 24; Залатая восень: Урыўкі з дзённіка на Дарбудзе // Чырв. Бел. № 23—24; Пра мову ДВБ // ЛіМ. 21 крас. / Пад крыпт. Н-ч; Кацярынінскі гасцінец: [Штрыхі] // Сав. Бел. 30 кастр.

1967. На мяжы загонаў: [Апавяданне] // Анталогія беларускага апавядання: У 2 т. Мн. Т. 1.

1.4.

Няверaў А. Ташкент — горад хлебны: Аповесць / З рус. Мн., 1930.

Дончанка А. Ударны атрад: Аповесць / З укр. Мн., 1933.

1.5.

На рускую мову. Соня из коммуны: [Апавяданне] / Пер. Л-на // Рабочий. 1929. 27 нояб.

На ўкраінскую мову. У вирі життя: Повість / Пер. О. Сорока. Харків, 1930.

Радість: [Апавяданне] / Пер. Л. Кардиналовська // Нова Білорусь. К., 1929.

2.3.

На беларускай мове. Аляхновіч М. Мікола Нікановіч // Нікановіч М. Мяцеліца. Мн., 1930; Ганчарык М. Так пачынаўся шлях: Да 80-годдзя з дня нар. М. Нікановіча // ЛіМ. 1982. 16 крас.; Гарэцкі М. «Маладняк» за пяць гадоў. 1923—1928. Мн., 1928. С. 101—103; Давідзюк А. Пад фальшыва-нацыянальным сцягам // Мастацтва і рэвалюцыя. 1933. № 1—2; Кракоцкі М. Пісаў жыццё народа // ЛіМ. 1977. 15 крас.; Мушынскі М. Творчасць, народжаная рэвалюцыяй // Нікановіч М. Светлая даль. Мн., 1985; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Скрыган Я. Мікола Нікановіч // Нікановіч М. Летнім днём. Мн., 1960; Яго ж. Прапаў без вестак // Скрыган Я. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1985. Т. 2; Яго ж. Творчасць М. Нікановіча // Маладняк. 1929. № 5—6; Струмінскі М. Крытыкі і лірыкі контррэвалюцыйнага нацдэмакратызму // Чырвонаарм. праўда. 1933. 5 сак.; Трыкліні Т. Казкі для малых і вялікіх // Узвышша. 1929. № 2; Услаўленне маладосці // Беларусь. 1972. № 4; Фомчанка А. Голас зямлі роднай // Вяч. Мінск. 1970. 12 жн.; Шушкевіч С. Сын незабыўных дзён // Шушкевіч С. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1978. Т. 2.

На рускай мове. Клейнборт Л. М. Никанович // Клейнборт Л. Молодая Белоруссия. Мн., 1928.

В. У. Смольская.

НІКІФАРОВІЧ ВАНКАРЭМ

Нікіфаровіч Ванкарэм Валяр'янавіч (н. 15.11.1934, Мінск), крытык, перакладчык. Член СП Беларусі з 1972.

Нарадзіўся ў сям'і настаўніка. У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Мічурынску, потым у г. Цяцюшы Татарскай АССР. Калі былі вызвалены першыя раёны Беларусі, разам з маці вярнуўся на радзіму, жыў у г. п. Церахоўка Гомельскай вобл., потым у г. Тарту (Эстонія), а з 1946 — у Мінску. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1952) паступіў на філалагічны факультэт БДУ, які скончыў у 1957. Працаваў рэдактарам мастацкай літаратуры ў выдавецтве «Беларусь» (1957—65). З 1965 старшы рэдактар, з 1976 загадчык аддзела Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання. Па напісаных В. Нікіфаровічам сцэнарыях прайшлі ў эфір больш за 50 перадач пра сучасную беларускую літаратуру і яе аўтараў, пра асобныя старонкі з гісторыі нашай літаратуры, культурныя і літаратурныя ўзаемасувязі Беларусі з іншымі рэспублікамі. У 1983—87 працаваў памочнікам галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Мінскага тэатра-студыі кінаакцёра. З 1987 памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Узнагароджаны балгарскім ордэнам Кірылы і Мяфодзія.

Літаратурнай працай пачаў займацца з 1958. Выступаў у друку як літаратурны крытык. Пісаў нарысы, рэцэнзіі, артыкулы па пытаннях развіцця беларускай літаратуры для дзяцей, сучаснай паэзіі і прозы, па праблемах тэлебачання. Асобнае месца ў творчасці займаюць праблемы мастацкага перакладу. Артыкулы, прысвечаныя літаратурным узаемасувязям Беларусі з замежнымі краінамі, сабраны ў кнігах «Усяму свету — свой дар», «Дарогі ў шырокі свет». Даследуе галоўным чынам беларуска-балгарскія літаратурныя ўзаемасувязі і ўзаемасувязі літаратур народаў СНД, выступае ў друку і як тэатральны крытык. Перакладае пераважна з балгарскай мовы на беларускую і рускую мовы. Аўтар сцэнарыяў дакументальных і тэлевізійных фільмаў, цыкла тэленарысаў «У сям'і адзінай», «Помнікі не маўчаць», «Дом Макаравых», «Такая ў зямлі песня» і інш., інсцэніровак для тэлеспектакляў Беларускага рэспубліканскага тэлебачання па творах А. Куляшова, І. Мележа, А. Кулакоўскага, І. Пташнікава, Р. Барадуліна, Я. Сіпакова і інш.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Усяму свету — свой дар: Пераклады твораў беларускай савецкай літаратуры за мяжой. Мн., 1973. (Б-чка газ. «Голас Радзімы»). Рэц.: На разных языках // Сел. газ. 1974. 9 июня.

Дарогі ў шырокі свет: Старонкі літаратурных узаемасувязей. Мн., 1979. Рэц.: Верабей А. Пра дружбу літаратур // Полымя. 1980. № 5; Казыра Л. Добра, ды не ўсё... // ЛіМ. 1980. 28 ліст.; Копиленко Л. Дороги у широкий світ // Літ. Укр. 1981. 14 лип.; Якаўлева Г. Дарогі ў шырокі свет // Голас Радзімы. 1979. 27 снеж.; Sielicki F. // Sl. Orient. 1981. Nr 2.

1.3.

1958. Літаратура барацьбы і перамог: Да адкрыцця канферэнцыі пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі // За вярт. на Радзіму. № 77 / Сааўт. С. Польскі; Аповесці аб лётчыках: [Рэц. на кн.: Алешка А. Іх першых вітае сонца. Мн., 1957] // Маладосць. № 6; Цікавае ў звычайным: [Рэц. на кн.: Рылько А. Цвіце чаромха. Мн., 1957] // ЛіМ. 12 крас.; Літаратура барацьбы і перамог // Там жа. 4 кастр. / Сааўт. С. Польскі.

1959. На пачатку стагоддзя // Маладосць. № 2; Паэзія маладосці, паэзія працы // Там жа. № 8; Женские судьбы: [Рэц. на кн.: Василевич А. Вечная тема. Мн., 1958] // Сов. Отчизна. № 4; Апавяданні пра сучаснікаў // ЛіМ. 9 мая; Голас супраць каланіялізму // Там жа. 4 ліп.

1960. Пра нашых сучаснікаў: [Рэц. на кн.: Данілёнка М. Майская навальніца. Мн., 1959] // Маладосць. № 3; Пясняр братняй Румыніі // Звязда. 5 ліст.; Аповесць напісаў журналіст: [Рэц. на кн.: Романов А. На исходе ночи. Мн., 1959] // ЛіМ. 10 чэрв.; Супраць «карычневай чумы»: [Рэц. на кн.: Брэдэль В. Ад Эбра да Волгі. Мн., 1960] // Там жа. 16 вер.; Подзвіг Петруся Каваля: [Рэц. на кн.: Савіцкі А. Кедры глядзяць на мора. Мн., 1960] // Чырв. змена. 27 крас.

1961. Герой паэта — наш сучаснік: [Рэц. на кн.: Пракоф'еў А. Прызнанне ў любві. Мн., 1961] // Звязда. 11 жн.

1962. На быстрыні жыцця: [Рэц. на кн.: Нядзведскі У. У лясной старане. Мн., 1962] // Полымя. № 5; Голас мільёнаў: [Рэц. на кн.: Голас сэрца. Мн., 1962] // Там жа. № 12; Мільён экземпляраў // Звязда. 3 ліст.; Народнае багацце // ЛіМ. 27 сак.

1963. Кніга аб нашай дружбе // Голас Радзімы. № 1; У гонар нашага краю... // Там жа. № 80; Ён быў камуністам: [Рэц. на кн.: Бяссмерце. Мн., 1963] // Полымя. № 5; Як і для дарослых, толькі яшчэ лепш... // Там жа. № 10; Кроў на пазалоце: [Рэц. на кн.: Лынькоў М. За акіянам. Мн., 1962] // Звязда. 28 лют.; Всегда с народом, всегда с партией // Знамя юности. 27 нояб.; У пошуках маладога героя // ЛіМ. 16 ліп.

1964. Наследники героя-комсомольца: (Очерк) // Люди высокого долга. Мн.; Хваляванне неспакойнага сэрца: [Рэц. на кн.: Мехаў У. Станцыя паблізу Тамбова. Мн., 1964] // Беларусь. № 11; О времени и о себе // Сов. Бел. 3 дек.

1965. У нашых перакладчыкаў // Голас Радзімы. № 29; Перакладчык «Гамлета» // Полымя. № 4; Падарожжа ў сучаснасць: [Рэц. на кн.: Пестрак П. Сярод чаротаў. Мн., 1964] // Там жа. № 7; Малому прынеслі новую кніжку... // ЛіМ. 13 ліп.; Нямецкая літаратура на беларускай мове // Наст. газ. 20 кастр.; Волнение за камерой и перед экраном // Сов. Бел. 27 янв.; Поэтическое наступление: Вам, книголюбы! // Там жа. 9 июля; И сокращаются большие расстояния // Там жа. 12 авг.; Жыватворная крыніца // Чырв. змена. 11 вер.

1966. Заўсёды з народам // Голас Радзімы. № 30; Працяг добрай традыцыі: [Рэц. на кн.: Ад стром балканскіх. Мн., 1965] // Полымя. № 4; Ад стром балканскіх // ЛіМ. 18 кастр.; Свет новой жизни // Сов. Бел. 9 окт.

1967. Песни новой жизни // Сов. Бел. 12 апр.

1968. Кніга і яе героі: [Рэц. на кн.: Стральцоў М. Сена на асфальце. Мн., 1966] // Беларусь. № 3; Ад хваляванняў да раўнавагі: [Рэц. на кн.: Блатун С. Раўнавага. Мн., 1968] // Полымя. № 9; У экрана — вся страна // Сов. Бел. 7 марта.

1969. Спросить себя: [Рэц. на кн.: Стрельцов М. Что будет сниться. М., 1968] // Неман. № 3; Падарунак сяброў // ЛіМ. 11 лют.; Правдиво, полнокровно, ярко // Сел. газ. 1 июня; Летапісец векапомных дзён // Чырв. змена. 30 ліст.

1970. За синим Дунаем: [Нарыс] // На перекрестках планеты. Мн.; У адным ключы // Беларусь. № 12; [Рэц. на кн.: Симанович Д. Минуты. Мн., 1969] // Неман. № 9; Радость, пережитая дважды // Сов. Бел. 2 сент.

1971. «Белоруссия — бяла балада»: Тры дні ў Балгарыі // ЛіМ. 15 кастр.; Наш госць — Андрэй Германаў // Там жа. 3 снеж.; Свята блакітнага экрана // Чырв. змена. 2 кастр.

1972. Літаратура збліжае народы // Голас Радзімы. № 22; Вачыма і сэрцам друга: [Рэц. на кн.:

Паптонев С. Белорусеня — бяла балада. София, 1971] // Полымя. № 5; Нашай дружбе мацнець // Вяч. Мінск. 27 мая; Наш общий праздник // Знамя юности. 23 мая; Дарогамі Магілёўшчыны // ЛіМ. 2 чэрв.

1973. Пераклад — зброя гуманізму, міру, прагрэсу: Нататкі пра ўзаемасувязі беларускай і нямецкай літаратур // Голас Радзімы. № 23; Алтайские встречи // Неман. № 10; Свет сялібы паэта: [Рэц. на кн.: Зуёнак В. Сяліба. Мн., 1973] // ЛіМ. 13 крас.; Свята непарушнай дружбы: Нарыс // Там жа. 29 чэрв.; «Загадкай не змяніць эпоху...»: [Рэц. на кн.: Семашкевіч Р. Субота. Мн., 1973] // Там жа. 10 жн.; Такая она, Америка // Сов. Бел. 20 янв.

1974. На блакітным экране — «Тартак» // Голас Радзімы. № 22; Праз прызму сучаснасці: [Рэц. на кн.: Андраюк С. Жыццё. Літаратура. Героі. Мн., 1973] // Маладосць. № 6; Перачытваючы серыю... // ЛіМ. 19 ліп.; Выбар Багдана Хацяноўскага: [Рэц. на кн.: Кулакоўскі А. Сцежкі зведаныя і нязведаныя. Мн., 1974] // Там жа. 6 вер.; Панорама жизни и борьбы // Сов. Бел. 23 марта; Трудные раунды // Сов. спорт. 6 сент.

1975. У жанры музычнага фільма: Штрыхі да творчага партрэта кінарэжысёра Юрыя Цвяткова // Голас Радзімы. № 13; Пачатак ёсць... Што далей? // ЛіМ. 4 ліп.; Радасць зямнога дотыку: [Рэц. на кн.: Макаль П. Дотык да зямлі. Мн., 1975] // Там жа. 8 жн.; Беларуская проза — на балгарскай мове // Там жа. 12 вер.; «Мы ўсе — будаўнікі, па сутнасці...»: Нататкі пра ўзаемасувязі беларускіх і балгарскіх маладых пісьменнікаў // Чырв. змена. 27 вер.

1976. У імя братняй супольнасці // Беларусь. № 5; Новая встреча с Гарсиа Лоркой: [Рэц. на кн.: Лорка Ф. Г. Блакітны звон Гранады. Мн., 1975] // Неман. № 10; Сугучнасць слоў і думак: [Рэц. на кн.: Германаў А. Касцёр на вяршыні. Мн., 1975] // Полымя. № 6; На мове сяброў // ЛіМ. 6 жн.; Чувство Родины великой: [Рэц. на кн.: Коротич В. Зеленый виноградник. М., 1975] // Сов. Бел. 23 мая; Калі прыходзіць сталасць...: [Рэц. на кн.: Кудравец А. Дзень перад святам. Мн., 1975] // Чырв. змена. 22 чэрв.

1977. Ад імя пакалення: [Рэц. на кн.: Голуб Ю. Векапомнае поле. Мн., 1976] // Маладосць. № 4; Заметкі аб сучаснай беларускай мастацкай літаратуры // Ніва. 4 вер.

1978. «Твой вечны помнік — мой сардэчны верш...» // Дзень паэзіі — 1978. Мн.; Тэлефільм пра Беларусь // Беларусь. № 2; Сын двух республик // Неман. № 8; Даследуецца балгарская паэзія: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. Верная вялікім запаветам: Сучасная балгарская паэзія. Мн., 1977] // Полымя. № 2; Цуд паэтычнага пераўвасаблення: [Рэц. на кн.: Семяжон Я. Сем цудаў свету. Мн., 1977] // Там жа. № 9; Беларуская проза на балгарскай мове // Голас Радзімы. 16 сак.; Беларусь у сэрцы // ЛіМ. 17 ліст.

1979. «Адамкнуў бы я лета» // Маладосць. № 6; Аб'ект даследавання — паэтыка: [Рэц. на кн.: Кабаковіч А. Паэзія Максіма Багдановіча. Мн., 1978] // Полымя. № 5; Наш госць — Стэфан Паптонеў // ЛіМ. 21 вер.

1980. Запрашэнне ў падарожжа // Адпачынак з байкапісцам. Мн.; Праўдзівая і чалавечная: (Водгукі на беларускую прозу ў Балгарыі) // Далягляды. Мн.; Роздум пра Беларусь: [Рэц. на кн.: Вълчев Н. Белоруска бреза. София, 1979] // Полымя. № 3; Вернасць баявой маладосці // Віцеб. рабочы. 1 мая; Героі — нашы сучаснікі: [Рэц. на кн.: Леванавіч Л. Якар надзеі. Мн., 1979] // ЛіМ. 11 студз.; Беларусь — у сэрцы горца // Там жа. 4 ліп.

1981. У адзінай сям'і літаратур // Беларусь. № 3; У пошуках сваёй спецыфікі // Там жа. № 4; Зброяй слова: [Рэц. на кн.: Лынькоў М. Публіцыстыка. Мн., 1980] // Полымя. № 5; Урокі майстэрства // Полымя. № 6.

1982. Дружная з сонцам краіна // Бярозка. № 6; В его книгах — эпоха // В мире книг. № 9; Дружная з сонцам: Нарыс // Полымя. № 5; Пад дахам свету, ля высокіх вяршынь: Нарыс // Там жа. № 11; Плён братняга супрацоўніцтва // ЛіМ. 5 сак.; У балгарскім друку // Там жа. 2 ліп.; Нашы класікі па-балгарску // Там жа. 16 ліп.; Судьба — к судьбе // Сов. Бел. 7 сент.

1983. Рэжысёр тэлевізійнага тэатра // Мастацтва Бел. № 5; Ад імя пакалення: [Рэц. на кн.: Някляеў У. Знак аховы. Мн., 1983] // Полымя. № 12; У пошуках свайго аблічча // Тэатр. Мінск. № 5; Жыць, як людзі // ЛіМ. 7 студз.; Сустрэча з сябрамі // Там жа. 29 ліп.; Героі Расіна на тэлеэкране // Там жа. 18 ліст.; Нести свой дар // Сов. Бел. 29 июня.

1984. Каб заўсёды было жыццё // Далягляды. Мн.; «Я вам ні слова не зманю...»: Язэпу Семяжону — 70 // Беларусь. № 11; Духовное величие подвига: В. Быкову — 60 // В мире книг. № 6; [Рэц. на кн.: Симанович Д. Солнечный хмель. Мн., 1982] // Неман. № 4; Святое слова — дружба // ЛіМ. 2 сак.; Вернасць ідэалам маладосці // Там жа. 21 вер.; Как боевой приказ... // Сов. Бел. 15 июня.

1985. Пазначана любоўю // Далягляды. Мн.; Достижение перевода: Формирование концепции // Майстарство превода — традиции и съвременни изискивания. София; У яго быў свой востраў // Маладосць. № 4; Такая ў яго прафесія // Вяч. Мінск. 15 кастр.; Возвращение к истокам // Знамя юности. 19 марта; Братэрскім сэрцам // ЛіМ. 8 лют.; Полдень его поэзии // Сов. Бел. 23 февр.

1.4.

Грыгораў К. Танча з Гарацвета: Аповесць / З балг. Мн., 1961.

Калчаў К. Закаханыя птушкі: Аповесць / З балг. Мн., 1964.

Караславаў Г. Нявестка: Аповесць / З балг. Мн., 1966.

Габровские улыбки / С болг. Мн., 1968.

Угараў Г. Кліча Радопскі бор: Аповесць / З балг. Мн., 1972.

Адпачынак з байкапісцам: Балгарскі гумар. Мн., 1980.

Мішаў Г. Матрыярхат: Аповесць / З балг. Мн., 1981. Рэц.: Гуліцкі Г. Кнігапіс // ЛіМ. 1981. 11 вер.

Улыбки друзей: Сборник болгарского юмора. Мн., 1981.

Калчаў К. Люба: Раман / З балг. Мн., 1984.

Усмешкі на старых здымках: Апавяданні, гумарэскі / З балг. Мн., 1990.

1962. Севярняк С. Слова каваля: Апавяданне / З балг. // Звязда. 25 вер.

1963. Шуміхін М. Вясна ў Цянь-Шані: [Нарыс] / З кірг. // Дружбай з'яднаны мы назаўжды. Мн.; Тодараў Й. На беразе Дуная: Аповесць / З балг. // Бярозка. № 6, 7; Пятроў І. У дарозе: Апавяданне / З балг. // Звязда. 14 ліст.; Васілеў О. Хісткае крэсла; Рамонт у раманіста-кібернетыста: Маленькія апавяданні; Агнеў Ж. На сходзе літаратараў: Выпадковыя запісы; Шывараў Д. Прозвішча: Апавяданне / З балг. // ЛіМ. 7 мая; Тодараў Й. Нечаканы стрэл: Апавяданне / З балг. // Там жа. 6 вер.; Пятроў І. Першая тайна; Адно імгненне волі: Апавяданні / З балг. // Там жа. 1 ліст.

1964. Мкрціч А. Дзяўчына, якая шукала мяне; Кочар Р. Сястра генерала; Тацікян Ш. Песня: [Апавяданні] / З арм. // Кветкі Арарата. Мн.; Гаранаў Н. Тайна атрада «Космас»: Апавяданне / З балг. // Бярозка. № 9; Калчаў К. Закаханыя птушкі: Урывак з аповесці / З балг. // ЛіМ. 2 чэрв.; Дэнеў М. Вясенні вецер: Апавяданне / З балг. // Там жа. 8 вер.; Вылчаў Г. Плады свабоды / З балг. // Наст. газ. 9 вер.

1965. Браты Мармаравы. Ружа; Іваноў М. Культурныя мерапрыемствы: [Успаміны] / З балг. // ЛіМ. 7 вер.; Станеў Э. Арлы: Апавяданне / З балг. // Там жа. 17 вер.; Остриков И. Разбитое окно: (Рассказ) / С болг. // Сов. Бел. 18 сент.

1966. Тодараў Й. Няёмкае становішча: Апавяданне / З балг. // Вожык. № 14.

1967. Грубешліева М. Дома; Каралійчаў А. Сокалава поле; Караславаў Г. Браты; Васілеў А. Любоўная гісторыя; Волен Г. Сіла жыцця; Станеў Э. Арлы; Даскалоў С. Апошні танец; Асенаў Д. Строгае выхаванне; Острыкаў І. Пятнаццаць мінут любві; Севярняк С. Слова каваля; Тодараў Й. Прамова ў абарону любві; Галі-

на Л. Восень у дубовых лясах: [Апавяданні] / З балг. // Скарб: Апавяданні балгарскіх пісьменнікаў. Мн.; Грубешліева М. Дома / З балг. // Маладосць. № 9; Габровские анекдоты / С болг. // Неман. № 3; Аўэзаў М. Паляўнічы з арлом: Апавяданне / З каз. // Полымя. № 11; Габраўскія анекдоты / З балг. // ЛіМ. 30 чэрв.

1968. Фучаджыеў Д. Бэз: Апавяданне / З балг. // Маладосць. № 10; Мишев Г. Матриархат: [Аповесць] / С болг. // Неман. № 10; Гуляшкі А. Навагодні вечар Авакума Захава: Апавяданне / З балг. // ЛіМ. 1 студз.

1969. Даскалов С. Глашатай: [Апавяданне] / С болг. // Неман. № 9; Паптонеў С. Помста: Апавяданне / З балг. // ЛіМ. 27 чэрв.; Папоў В. Быць птушкай: Апавяданне / З балг. // Чырв. змена. 9 вер.

1970. Вылчаў Г. Балгарскае ў беларускім літаратуразнаўстве / З балг. // Маладосць. № 6.

1971. Тодоров Й. Лунный свет: [Апавяданне] / С болг. // Сов. Бел. 9 сент.

1972. Паптонеў С. Беларусь — белая балада / З балг. // Голас Радзімы. № 27; Райнов Б. Бразильская мелодия: Роман / С болг. // Неман. № 3, 4; Даскалаў С. Невядомая: Апавяданне / З балг. // Вяч. Мінск. 27 мая; Папоў В. Птушкі: Апавяданне / З балг. // ЛіМ. 26 мая; Чалкаш. Варона; Асёл і Салавей: Старыя байкі на новы матыў / З балг. // Там жа. 2 чэрв.; Галина Л. Яркая лампочка: Рассказ / С болг. // Сов. Бел. 21 мая; Странджев К. У бетонщиков: [Навелы] / С болг. // Там жа. 25 мая.

1975. Пятроў І. Свой чалавек; Пеліцеў Х. Два мядзведзі: Гумарыстычныя апавяданні / З балг. // Беларусь. № 7; Цонеў В. Эх, каханне, каханне!: Апавяданне / З балг. // Там жа. № 9; Галіна Л. Начная змена; Агні на зямлі: [Апавяданні] / З балг. // ЛіМ. 18 крас.

1976. Джэркавіч М. Мост, які не разбураецца часам / З балг. // Далягляды. Мн., Геаргіеў К. Нелегальны; Асенаў Д. Сустрэча: [Апавяданні] / З балг. // Беларусь. № 9; Незнакомаў П. Апошні прытулак; Паптонеў С. Беражыце кветкі: [Апавяданні] / З балг. // ЛіМ. 10 вер.

1978. Уладзіміраў С. Чалавек народжаны для подзвігу / З балг. // Далягляды. Мн.; Іоўкаў І. Снег у маі: Апавяданне / З балг. // Беларусь. № 3.

1979. Жыдліцкі В. Два артыкулы аб творчасці Івана Пташнікава / З чэш. // Далягляды. Мн. / Сааўт. пер. В. Крайко; Паптонеў С. Беларусь — белая балада; Бярозы, я ў палоне ў вас!: Нарысы / З балг. // Паптонеў С. Беларусь — белая балада. Мн.; Ягож. Беларусь — белая балада / З балг. // Полымя. № 1; Ягож. Дзеля жыцця на зямлі: Урывак з кнігі «Кап'ё» / З балг. // Віцеб. рабочы. 20 кастр.; Уладзіміраў С. Зноў сустрэцца з сябрамі / З балг. // ЛіМ. 6 ліп.

1980. Поптонев С. Белоруссия — белая баллада: [Раздзелы з кнігі] // С болг. // Неман. № 11; Станилов В. В ожидании следующего; Цонев В. Как вести себя за столом; Челкаш. Вежливый; Антонов-Тонич А. Как я спасся от хулиганов: [Гумарэскі]; Незнамов П. Что это — юмор?; Ралин Р. Мысли вслух / С болг. // Знамя юности. 5 сент.; Тодараў А. Талеркі: [Гумарэска] / З балг. // ЛіМ. 12 вер.; Іваноў М. Цырульніцкая балада: [Гумарэска] / З балг. // Там жа. 24 кастр.

1981. Ралін Р. Паслядоўнасць: Апавяданне / З балг. // Вожык. № 17; Думбадзе Н. Алванары; Адкуль у горадзе ястраб?; Квіцарыдзе Д. Біклага; Бярозка ў жыце; Барада; Вясна; Гадэрдзішвілі Т. Чацвёрты гарызонт; Рэха; Чэйшвілі Р. Бзіянеці; Андронікашвілі Б. БМЖ; Інанішвілі Р. Мужчыны: [Апавяданні] / З груз. // Полымя. № 8.

1982. Баранга А. Дзеля агульнай карысці: Камедыя / З рум. // Далягляды. Мн.

1983. Мітоўска М. Наступным пакаленням / З балг. // Далягляды. Мн.; Уладзіміраў С. Шукальнік вечнага / З балг. // ЛіМ. 29 крас.

1984. Гадэрдзішвілі Т. Вясёлая арэна: Аповесць / З груз. // Братэрства. Мн.; Паптонеў С. Дзеля жыцця на зямлі / З балг. // Полымя. № 6; Ягож. У сэрцы маім — Беларусь // Там жа. № 7; Кынева П. Загадка мастацтва / З балг. // ЛіМ. 16 сак.; Уладзіміраў С. Два жыцці Максіма Багдановіча / З балг. // Там жа. 20 крас.; Мітоўска М. Афарбаваная памяць / З балг. // Там жа. 18 мая.

1985. Квіцарыдзе Д. Біклага; Інанішвілі Р. Тоція прыехаў; Іаселіяні О. Адзін дзень; Гадэрдзішвілі Т. Прыгоды Гігі; Петрыяшвілі П. Чалавек, які любіў дождж: Апавяданні / З груз. // Дружная з сонцам. Мн.; Паптонеў С. Беларусь — белая балада; Бярозы, я ў палоне ў вас!: Нарысы / З балг. // Паптонеў С. Беларусь — белая балада. Мн.

1.5.

На балгарскую мову. Изстрадано с душата и сърцето // Белоруски повести. Варна, 1978.

На чэшскую мову. Takie literatura sbližnje narody / Nova Svoboda. 1962. Nr 5.

1.6.

Адпачынак з байкапісцам. Мн., 1980 / Скл.

Дружная з сонцам: Творы пісьменнікаў Грузіі і грузінскага фальклору. Мн., 1985. (Б-ка дзіцячай літ. народаў СССР) / Скл. з Р. Інанішвілі.

Такая любоў: Сучасная балгарская аповесць. Мн., 1987 / Скл.

Гарбачоў І. Полюсы нашай дасягальнасці: [Інтэрв'ю] // Чырв. змена. 1971. 4 ліп. / Зап.; Шамякин И. ТВ — это человековедение: (Беседа) // Телевидение. Радиовещание. 1982. № 3 / Зап.

2.3.

На беларускай мове. Анісковіч У. Адказнасць перакладчыка: Заўвагі на палях // ЛіМ. 1967. 17 ліст.; Бугаёў Д. Здабыткі крытычнай думкі і яе зігзагі // Бугаёў Д. Чалавечнасць. Мн., 1985; Ванкарэму Нікіфаровічу — 50 // ЛіМ. 1984. 16 ліст.; Верабей А. Пра дружбу літаратур // Полымя. 1980. № 5; Лецка Я. Харство і боль жыцця. Мн., 1985. С. 13—14; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Рагойша В. В. Нікіфаровічу — 50 гадоў // Полымя. 1984. № 11.

В. У. Смольская.

НІКІФАРОЎСКІ МІКАЛАЙ

Нікіфароўскі Мікалай Якаўлевіч [крыпт. Н. Я. Н., N. N.; 5(17).5.1845, в. Вымна Віцебскага пав. Віцебскай губ., цяпер Віцебскага р-на — 28.5(10.6).1910, Віцебск], этнограф, фальклярыст, літаратар, педагог.

Нарадзіўся ў сям'і дзяка. Скончыў Віцебскае духоўнае вучылішча (1861) і Віцебскую духоўную семінарыю (1867). Педагагічную дзейнасць пачаў у кастрычніку 1867 у Лоўжанскім народным вучылішчы Віцебскай губ. У 1871 пераехаў у Віцебск для работы законанастаўнікам Першага прыходскага вучылішча, адначасова рыхтаваўся да экзамену на званне настаўніка рускай мовы павятовага вучылішча. Пасля здачы экзамена (1876) пераведзены настаўнікам падрыхтоўчага класа Свіслацкай настаўніцкай семінарыі Гродзенскай губ. У 1882 вярнуўся ў Віцебск, дзе з невялікім перапынкам (1900—02) да канца свайго жыцця працаваў настаўнікам падрыхтоўчага класа мужчынскай гімназіі.

Побач з педагагічнай дзейнасцю вёў вялікую працу па вывучэнні культуры і побыту беларускага народа, шырока прапагандаваў іх у сваіх навуковых публікацыях. Яшчэ ў час вучобы ў семінарыі ў 1860-я гады пачаў запісваць фальклорныя творы, а пазней па просьбе этнографа П. Шэйна, карэспандэнтам якога быў на працягу 20 год, апісаў асаблівасці побыту і культуры беларусаў. Сваёй папулярнасцю і навуковай каштоўнасцю працы П. Шэйна абавязаны апублікаванню ў іх матэрыялаў М. Нікіфароўскага. На самастойны навуковы шлях перайшоў у 1891. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала Маскоўскае таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, правадзейным членам якога М. Нікіфароўскі быў з 1890. У далейшым актыўна супрацоўнічаў з Рускім геаграфічным таварыствам (з 1897), Віцебскім царкоўна-археалагічным старажытным сховішчам (з 1895), Віцебскім губернскім статыстычным камітэтам (з 1895). За дваццацігадовы перыяд самастойнай навуковай работы выдаў і падрыхтаваў да друку каля 20 прац па этнаграфіі, фальклоры і гісторыі Віцебшчыны, якія з'яўляюцца і ў нашы дні каштоўнай крыніцай для вывучэння асаблівасцей побыту і культуры беларусаў дарэвалюцыйнага часу. Характарыстыцы грамадскага побыту і сацыяльна-эканамічнага становішча розных слаёў і груп сельскага насельніцтва Віцебшчыны М. Нікіфароўскі прысвяціў серыю публікацый у «Этнографическом обозрении» (1892—99) пад агульнай назвай «Нарысы Віцебскай Беларусі». Пытанні грамадскага побыту гарадскога насельніцтва ўпершыню закрануты ў яго гістарычнай працы «Старонкі з нядаўняй старыны горада Віцебска». М. Нікіфароўскаму належыць першая спецыяльная праца ў беларускай этнаграфічнай літаратуры па матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці сельскага насельніцтва. «Нарысы простанароднага жыццябыцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку». Першы раздзел гэтай кнігі дае грунтоўную характарыстыку харчавання і класіфікацыю страў, іх прыгатаванне (112 страў), гатункі хлеба. У асобных раздзелах апісваюцца адзенне і абутак, сельскія паселішчы, сядзібы, жыллё і гаспадарчыя будынкі, інтэр'еры жылых памяшканняў. Апошні раздзел дае падрабязную характарыстыку вытворчай дзейнасці сялян: земляробства, промыслаў і рамёстваў, прылад працы. З фальклорных прац М. Нікіфароўскага асаблівай увагі заслугоўваюць першы буйны зборнік «Беларускія песні-частушкі» (2356 частушак), «Простанародныя загадкі». Вераванням, забабонам, звычаям, абрадам, паданням прысвечаны працы «Простанародныя прыкметы і павер'і, забабоны і звычаі, легендарныя сказы аб асобах і месцах» (2307 запісаў) і «Нячысцікі». Даследаванні і публікацыі М. Нікіфароўскага вызначаюцца вобразнасцю апісанняў, сакавітасцю мовы, што надае ім літаратурна-мастацкую каштоўнасць. *В. К. Бандарчык.*

Бібліяграфія

1.2.

Очерки Витебской Белоруссии. I — V. М., 1892—1897. I. Старцы. М., 1892. II. Дудар и музыка. М., 1892. III. Пособники жихара. М., 1893. IV. Подданые пособники. М., 1893. V. Питущие и пропойцы. М., 1897.

Сельскошкольное обучение в юго-восточной окраине Витебской Белоруссии, каким застает его реформа 19 февраля 1861 г. Витебск, 1893. (Отд. отт. из «Витеб. губ. вед.». 1893. № 67, 68, 71—76).

Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности. Витебск, 1895; Рэц.: Карский Е. Новые труды по белорусской этнографии // ЖМНП. 1896. № 5; Ляцкий Е. // Этнограф. обозрение. 1896. № 1.

Гончарные терракоты Витебска по археологическим находкам. Витебск, 1897. (Отд. отт. из «Витеб. губ. вед.». 1897. № 135—138).

Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Витебск, 1897. (Отд. отт. из «Витеб. губ. вед.». 1896—1897). Рэц.: Карский Е. // ЖМНП. 1897. № 10; Ляцкий Е. // Этнограф. обозрение. 1897. № 4.

На почве простоты веры: (Бытовая картинка). Витебск, 1898. (Отд. отт. из «Витеб. губ. вед.». 1898. № 11, 12.)

Никольская церковь в Задвинской слободе м. Бешенковичи Лепельского уезда. Витебск, 1899. (Отд. отт. из «Полоц. епарх. вед.». 1899. № 3—5).

Странички из недавней старины города Витебска. Витебск, 1899. Рэц.: Стукалич В. Н. Я. Никифоровский: Странички из недавней старины города Витебска. Витебск, 1900. (Отд. отт. из «Витеб. губ. вед.». 1900. № 231, 232).

Освященные предметы и отношение к ним простонародья Витебской Белоруссии. Витебск, 1903. (Отд. отт. из «Полоц. епарх. вед.». 1903. № 10—20, 22).

Нечистики: Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Вильна, 1907.

1.3.

1874. Четыре листка из памятной книжки сельского учителя // Нар. школа. № 9.

1892. Очерки Витебской Белоруссии. I. Старцы // Этнограф. обозрение. № 1; Очерки Витебской Белоруссии. II. Дудар и музыка // Там жа. № 2, 3.

1893. Очерки Витебской Белоруссии. III. Пособники жихара // Этнограф. обозрение. № 2; Сельскошкольное обучение в юго-восточной окраине Витебской Белоруссии, каким застает его реформа 19 февр. 1861 г.: (Воспоминания бывшего ученика) // Витеб. губ. вед. № 67, 68, 71—76.

1894. Очерки Витебской Белоруссии. IV. Подданые пособники // Этнограф. обозрение. № 1.

1896. Очерки Витебской Белоруссии. V. Питущие и пропойцы // Этнограф. обозрение. № 4.

1897. Очерки Витебской Белоруссии VI. Игры и игроки // Этнограф. обозрение. № 3; Гончарные терракоты Витебска по археологическим находкам // Витеб. губ. вед. № 135—138.

1898. Материалы для народного снотолкователя // Этнограф. обозрение. № 1; Очерки Витебской Белоруссии. VII. Бабы або жонки // Там жа. № 2; На почве простоты веры: (Бытовая картинка) // Витеб. губ. вед. № 11, 12.

1899. Никольская церковь в Задвинской слободе м. Бешенковичи Лепельского уезда // Полоц. епарх. вед. № 3—5; Очерки Витебской Белоруссии. VIII. Сбяги, прочки, вонки, уходалы // Этнограф. обозрение. № 1—2.

1903. Освященные предметы и отношение к ним простонародья Витебской Белоруссии // Полоц. епарх. вед. № 10—20, 22.

1962. Біяграфія І. Буйніцкага, напісаная пасля яго смерці М. Нікіфароўскім // Бел. мастацтва. Вып. 3.

1.6.

Простонародные загадки: Собр. в Витеб. губ. Н. Я. Никифоровский. Витебск, 1898. (Отд. отт. из «Памятной книжки Витеб. губ.» за 1897 г.) / Скл. Рэц.: Ляцкий Е. // Этнограф. обозрение. 1898. № 3.

Белорусские песни-частушки, собранные Н. Я. Никифоровским. Вильна, 1911 / Скл. Рэц.: Карский Е. // РФВ. 1912. Т. 67.

Белорусские загадки // Памятная книжка Витебской губернии на 1898 год. Витебск, 1898 / Скл.; Полупословицы и полупоговорки, употребляемые в Витебской Белоруссии // Зап. Сев.-Зап. отдела Русского Географического Общества. 1910. № 1; 1911. № 2; 1912. № 3 / Скл.; Духоўныя песні // Гоман. 1917. 14, 17, 21, 24, 28, 31 жн., 4, 7 вер. / Скл.; Напаўпрыслаўкі, напаўпрыказкі // Крывіч. 1924. № 1 / Скл.; Напаўпрыказкі — напаўпрыслаўкі // Зап. аддзелу гуманіт. н. 1928. Кн. 4 / Скл.

2.2.

На рускай мове. Бондарчик В., Чигринов И. Николай Яковлевич Никифоровский: Очерк жизни и деятельности. Мн., 1960. Рэц.: Боган У. Для пачатку — добра // ЛіМ. 1961. 28 лют.; Бурносаў В. Нарыс пра выдатнага вучонага // Полымя. 1961. № 4; Корзун У. Буйнейшы беларускі этнограф // Беларусь. 1961. № 8; Янкоўскі Ф. Настаўнік, этнограф, фальклярыст // Наст. газ. 1961. 25 лют.

Стукалич В. Н. Я. Никифоровский. 1845—1910 г.: Крит.-биогр. очерк. Вильна, 1910. (Отд. отт. из «Зап. Сев.-зап. отд. РГО». 1910. Кн. 1).

2.3.

1937. Перасцярога: [Жарт] // Снапок. № 4.

1938. Ракі: [Верш] // Беларускі сялянскі каляндар на 1938 год. Вільня.

1957. Маладая гаспадынька; Рэцэпт; Бычок: [Вершы] // ЛіМ. 25 вер.

1961. «Працуй і пей»; Трывога; Ракі; Маладая гаспадынька: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 1.

1966. Пан і акуляры: [Верш] // Ніва. 4 вер.

1967. Мары; «У хаце светлай і прасторнай...»; Вясенняя пара; І плач не паможа; Няўмекі і лекі; Ноч на Івана Купалу; Родны край; Лепшая рада; «Гляджу на змены ў прыродзе...»; Родныя малюнкі: [Вершы] // Беларуская дакастрычніцкая паэзія. Мн.

1975. «Сялянка» В. Дуніна-Марцінкевіча на мінскай сцэне: Гістарычная даведка // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн. Т. 1; Пісьмо Якубу Коласу // ЛіМ. 14 ліст.

1979. Стракатлівая старына; Бычок: [Вершы] // Беларусь. № 9.

1.4.

1908. Канапніцкая М. «Мой Божа, мілы, твая воля...»: [Верш] / З пол. // Н. н. 22 мая.

1909. Ратгауз Д. «Паглядзі, якая хмара...»: [Верш] / З рус. // Н. н. 4 чэрв.; «Два майстры, знаць бацька з сынам...»: [Верш] / З укр. // Там жа. 1 кастр. / Паэз. пад крыпт. Альбэрт Паў-віч; «Што пяць вёрст, то ўжо вядома...»: [Верш] / З укр. // Там жа. 3 снеж.

1910. «Хатка схіліўшыся, шыбы пабітыя...»: [Верш] / З рус. // Н. н. 4 лют.; Сурыкаў І. «Не бядуй, што восень...»: [Верш] / З рус. // Там жа. 16 вер.

1913. «Хатка схіліўшыся, шыбы пабітыя...»: [Верш] / З рус. // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1913 г. Вільна.

1914. «Хатка схіліўшыся, шыбы пабітыя...»: [Верш] / З рус. // Беларускі каляндар на 1914 год. Вільня; Шаўчэнка Т. «Мінаюць дні, мінаюць ночы...»: [Верш] / З укр. // Лучынка. № 3.

1918. Сыракомля У. Чысты Чацвер: [Гутарка] / З пол. // Вольная Бел. 20 кастр.

1.5.

На польскую мову. Wiosenna pora; Spadek / Tł. J. Huszcza // Antologia poezji białoruskiej. Wrocław etc., 1978.

2.3.

На беларускай мове. Александровіч С. Альберт Паўловіч // Паўловіч А. Выбранае. Мн., 1975; Атрашкевіч В. Беларускі сатырык і гумарыст // Маг. праўда. 1975. 11 ліст.; Базарэвіч М. У свой час, працуючы... // Беларусь. 1979. № 9; Баршчэўскі А. Альберт Паўловіч // Ніва. 1976. 4, 11, 18, 25 ліп., 1, 8, 15, 22, 29 жн., 5, 12, 19, 26 вер., 3, 10, 17, 24, 31 кастр., 7, 14, 21, 28 ліст., 5, 12 снеж.; Гартны Ц. Дваццаць гадоў назад // Успаміны пра Цішку Гартнага. Мн., 1984; Гарэцкі М. Альбэрт Паўловіч // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920; 2 выд. Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; 4 выд. Мн., 1926; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1969. Т. 2. С. 226—227; Гісторыя беларускай літаратуры, XIX — пачатак XX ст. Мн., 1981; З літаратурнай спадчыны Альберта Паўловіча // ЛіМ. 1957. 25 вер.; Кабржыцкая Т., Рагойша В. Карані дружбы. Мн., 1976. С. 203—206; Казека Я. Беларуская байка. Мн., 1960. С. 84—87, 89—91; Яго ж. Няходжанай дарогай. Мн., 1973. С. 69—74; Каханоўскі Г. Ля вытокаў беларускай гумарыстыкі // Мін. праўда. 1975. 11 ліст.; Кл-іч [Кляновіч] Р. Думкі каля верша Альберта Паўловіча «Сон і вечнасць» // Беларус. 1914. 18 снеж.; Лаўшук С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі. Мн., 1984. С. 57—59; Лойка А. Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя. Мн., 1972. С. 146; Яго ж. Плеяда старэйшых адраджэнцаў // Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1980. Ч. 2; Лямешка Г. [Бібліяграфічная нататка да 110-годдзя нараджэння] // Полымя. 1985. № 11; Марцінковіч А. Век любіць Беларусь // Голас Радзімы. 1975. № 50; Паўловіч-Кліменка Т. Успаміны пра бацьку // Паўловіч А. Выбранае. Мн., 1975; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Селедзіеўскі А. Незабыўнае // ЛіМ. 1975. 14 ліст.; [Фарботка І.] Беларусь у песнях: [Нарыс] // Белорусское эхо. 1918. 30 вер.; Ярош М. Янка Купала і беларуская паэзія. Мн., 1971. С. 146—147.

На польскай мове. Paŭlowicz Albert // Antologia poezji białoruskiej. Wrocław etc., 1978.

На рускай мове. Карский Е. Альберт Павлович // Карский Е. Белорусы. Пг., 1922. Т. 3. Вып. 3; Клейнборт Л. Эпигоны народничества: Альберт Павлович, Ядвигин Ш. и пр. // Клейнборт Л. Молодая Белоруссия. Мн., 1928.

2.4.

На беларускай мове. Купала Я. Песняру Альберту Паў⟨лові⟩чу: «За пасвячэнне, вершык харошы...»: [Верш] // Купала Я. Зб. тв.: У 7 т. Мн., 1973. Т. 2; Леўчык Г. «Смешна часам баеш, дзядзька...»: [Верш] // Леўчык Г. Доля і хлеб: Выбр. тв. Мн., 1980; Чарнышэвіч Ф. Альберту Паўловічу: [Верш] // Дварчанін І. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры. Вільня, 1927.

3.1.

ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 227.

Г. І. Рэут.

ПАЎЛЮКОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ

Паўлюкоўскі Уладзіслаў [псеўд. У.-Ініцкі, Улад. Ініцкі, Уладз. Ініцкі, У. І. Ніцкі, Улад-Ініцкі, Улад.-Ініцкі, Унучак, Унучкаў Зямляк; крыпт. У. Паў-скі, Ул. Паў-скі, У. І., У.-І., Ў. П.; 1(13).5.1895, в. Ініца Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл.— 8.9(паводле іншых звестак 8.11).1955, Вільнюс, пахаваны на могілках Роса], паэт, празаік, этнограф, мастак.

Паходзіў з мнагадзетнай сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў Стоўбцах, пасля — гарадскую ў Навагрудку. Працаваў у канцылярыі маёнтка кн. Радзівіла. Вучыўся ў Харкаўскім мастацкім вучылішчы. У першую сусветную вайну служыў прапаршчыкам, быў палкавым пісарам у штабе 530-га пяхотнага Васіль-Сураўскага палка, франтавыя дзеянні якога канцэнтраваліся пераважна на Віленшчыне. Захаваўся альбом франтавых фотаздымкаў, зробленых У. Паўлюкоўскім (зберагаецца ў ЦНБ АН Беларусі). Удзельнік грамадзянскай вайны, меў баявыя ўзнагароды. У 1920 дэмабілізаваны, вярнуўся ў родную Ініцу. У сярэдзіне 20-х гадоў пераехаў у Вільню. Некаторы час быў звязаны з Грамадой, удзельнічаў у яе друку (1925—27). Супрацоўнічаў у часопісах «Маланка», «Шлях моладзі» (лёс аддадзенай туды працы «Тэхніка вершаў» сёння невядомы), «Авадзень» і інш. Як графік удзельнічаў у выданні календароў, кніжак, падручнікаў. Прырабляў рознымі выпадковымі работамі: фатаграфаваў, фарбаваў сцены і падлогі, рабіў маленькія абразкі, якія прадаваў на кірмашах. У 1926 арыштаваны польскімі ўладамі і зняволены ў віленскую турму на Лукішках. Апеляцыйны суд скасаваў яго судовую справу, і ў 1927 У. Паўлюкоўскі вызвалены з турмы. У 1939 арыштаваны другі раз і адпраўлены ў Картуз-Бярозаўскі канцлагер, адкуль выйшаў на волю пасля вызвалення Заходняй Беларусі. Сваё знаходжанне ў канцлагеры апісаў у 1940 ва ўспамінах «Арышты; Бяроза і воля». Вярнуўся ў Вільню. У 1940 стаў штатным супрацоўнікам Беларускага музея імя І. Луцкевіча. Пасля яго ліквідацыі працаваў дырэктарам Літаратурнага музея імя А. Пушкіна (1945—48). 29.8.1948 арыштаваны савецкімі органамі бяспекі і асуджаны ў Мінску на 10 гадоў лагернага рэжыму. Вярнуўся з лагера ў 1953 невылечна хворы, спаралізаваны.

Літаратурная спадчына У. Паўлюкоўскага — галоўным чынам гумарыстычныя і лірычныя вершы. У заходнебеларускім друку першыя яго творы пачалі з'яўляцца з 1926. Іх тэматыка — турэмнае зняволенне, жыццё за кратамі (вершы «Лукішкі», «Дзень у адзіночцы», «У вастрозе», «Відзежа ў вастрозе»). У канцы 20-х гадоў даволі часта выступаў у перыядычным друку («Наша справа», «Наша праўда», «Сялянская ніва», «Маланка», «Грамадзянін» і інш.); тады ж выйшлі ў Вільні асобнымі выданнямі яго кнігі «Сон Гаўрылы і розныя вершы», «Клім бабаю і іншыя жарты», «Апавяданні». У 30-я гады друкаваўся пераважна ў «Шляху моладзі», «Беларускай крыніцы». Асноўныя матывы яго вершаў — сацыяльная няроўнасць і нядоля, імкненне да свабоды і справядлівасці. У жартоўных і гумарыстычных вершах апісваў анекдатычныя жыццёвыя сітуацыі, камічныя здарэнні. Гэтыя вершы (хутчэй апавяданні вершам) добразычлівыя, хоць месцамі і маралізатарскія. Удалымі можна лічыць яго літаратурныя спробы ў прозе. Яго апавяданні напісаны каларытнай мовай, з гумарам і спачуваннем простаму чалавеку, у іх даволі дынамічны сюжэт. У лепшых з іх гучаць матывы пошуку літасці беспрытульнаму чалавеку, які гіне, не знайшоўшы падтрымкі і спагады ў чэрствым свеце («На сходцах касцёла», «Ля крыжа»). У жартоўных яго апавяданнях раскрываецца рахманы і шчыры характар беларуса («Жулікі», «Ня поўны беларус»). Найбольш вядомая праца У. Паўлюкоўскага ў 30-я гады — этнаграфічныя эцюды, прысвечаныя кожнаму месяцу года,— своеасаблівы народны каляндар, у якім апісваліся традыцыйныя народныя святы, звычаі, абрады, прыводзіліся народныя прыказкі, адпаведныя земляробчаму цыклу, тлумачыліся назвы месяцаў і іх першакрыніцы, а таксама назвы ў календарах іншых народаў, пачынаючы са старажытнарымскіх часоў і да пачатку 20 ст. Запісаныя У. Паўлюкоўскім народныя прыказкі і прымаўкі выкарыстаны ў акадэмічным томе «Прыказкі і прымаўкі» (1976). Быў вядомы і як перакладчык. Асобнымі выданнямі ў Вільні выйшлі апавяданні Л. Талстога ў яго перакладзе. Разам з мастакамі Я. Драздовічам і М. Васілеўскім ілюстраваў «Першыя зярняткі» — чытанку і лемантар, складзеныя С. Паўловічам. Рукапісы некаторых мастацкіх твораў У. Паўлюкоўскага, прац пра М. Багдановіча, І. Насовіча і інш. захоўваюцца ў бібліятэцы АН Літвы.

І. Э. Багдановіч, Л. А. Войцік.

Бібліяграфія

1.2.

Сон Гаўрылы і розныя вершы. Вільня, 1928 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

Апавяданні. Вільня, 1929 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

Клім бабаю і іншыя жарты. Вільня, 1929 (Гумарыст. б-ка. Сш. 1) / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

Aryšty; Biareza i vola: (Uspaminy aryštanta). Vilnius, 1940 / Пад псеўд. Ілад-Ініцкі.

1.3.

1926. Віншаванне; У школе: [Вершы] // Маланка. № 17 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Лукішкі: [Верш] // Нар. справа. 30 кастр. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Дзень у адзіночцы (на Лукішках): [Верш] // Там жа. 27 ліст. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; У вастрозе: [Верш] // Наша справа. 8 снеж. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1927. Відзежа ў вастрозе: [Верш] // Наша праўда. 14 мая / Пад псеўд. Улад. Ініцкі; Адзіночка на Лукішках: [Верш] // Там жа. 4 чэрв. / Пад псеўд. Улад. Ініцкі; Тры агні: [Верш] // Там жа. 15 чэрв. Пад псеўд. Улад. Ініцкі; Каўка: [Байка] // Там жа. 18 чэрв. / Пад псеўд. Улад. Ініцкі; Крыгалом; «Надыдзе час! Святая праўда...»: [Вершы] // Там жа. 2 ліп. / Пад псеўд. Уладз. Ініцкі; Ад чаго дрыжыць асіна: (Літоўская пагудка): [Паэма] // Там жа. 21 вер. / Пад псеўд. Улад. Ініцкі; Пачатак зімы: [Верш] // Сялян. ніва. 26 ліст. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Пані — свіння: (Жарт) // Там жа. 13 снеж. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1928. «Зязюльчыны слёзы»: (Легенда) // Грамадзянін. № 12 / Пад псеўд. Улад. Ініцкі; Стары спосаб: [Верш] // Маланка. № 1 / Пад псеўд. Улад.-Ініцкі; Жонка мужа пахавала; Кахала Міхала: [Вершы] // Там жа. № 7 / Пад псеўд. Улад.-Ініцкі; Па смерці; Евангельскі поп: [Вершы] // Там жа. № 8 / Пад псеўд. Улад.-Ініцкі; Як да дурня: [Верш] // Маланка. № 11 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Ні добра, ні дрэнна (з Руданьскага): [Верш] // Там жа. № 13 / Пад крыпт. У. І.; Праз вастрогі: [Верш] // Голас працы. 30 мая Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Захацеў я ажаніцца: [Верш] // Пякучая маланка. 22 кастр. / Пад псеўд. Улад.-Ініцкі; Мне сумна: [Верш] // Сцяг працы. 4 ліп. / Пад псеўд. Улад. Ініцкі; Ой, рана...: [Верш] // Сялян. ніва. 4 студз. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Не сумуйце: (Алегорыя) // Там жа. 11, 14 студз. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Разважанні: [Верш] // Там жа. 29 студз. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1929. Ах, чаму я не радзіўся; Не, ня згіне: [Вершы] // Беларускі каляндар на 1929 год. Вільня / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Кахала Міхала; «Гаварылі мне старыя...»; Пані — свіння: [Вершы] // Беларускі народны каляндар. Вільня / Пад псеўд. У.-Ініцкі; Тыдзень гультая; Тыдзень п'яніцы: [Вершы] // Авадзень. № 1 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; «Рай на Крэсах»: [Верш] // Грамадзянін. № 1 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Чую, кажуць...: [Верш] // Там жа. № 2 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Моладзі; Устанем ад сну векавога: [Вершы] // Шлях моладзі. № 1 / Пад крыпт. У. І.; Смела ідзі: [Верш] // Там жа. № 3 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1930. Дождж; Смех; Страшны суд: (Па Руд-у); Вёска: [Вершы] // Беларускі гаспадарскі каляндар «Рольнік» на 1931 год. Вільня / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Летняя ноч: [Верш] // Шлях моладзі. № 10 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1931. Вёска: [Верш] // Бел. думка (Гродна). 31 мая / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1933. Крызіс і ё-ё; Банадысь і Акуліна: [Вершы] // Авадзень. № 1 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Баравік і мухамор: [Байка] // Шлях моладзі. № 2 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Мы: [Верш] // Там жа. № 3 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Пралескі: (З паэмы «Крыжачка») // Там жа. № 4 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Да зоркі: [Верш] // Там жа. № 6 / Пад псеўд. Улад.-Ініцкі.

1934. Зімовая ноч: [Верш] // Шлях моладзі. № 1 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; На моры: [Верш] // Там жа. № 2 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Незалежнасць — наша зорка: [Верш] // Там жа. № 3 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Шлях моладзі: [Верш] Там жа. № 6 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Да брата: [Верш] // Там жа. № 9 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Ранняй восенню: [Верш] // Там жа. № 12 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1935. Зайцы: (Байка) // Пралескі. № 5 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; «Сонца ўзбегла на нябёсы...»: [Верш] // Шлях моладзі. № 7 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Трыялет: [Верш] // Там жа. № 8—9 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1938. Мяцеліца: [Верш] // Шлях моладзі. № 3 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Летам у лесе: [Верш] // Там жа. № 18 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1939. Арабская прыповесць: [Верш] // Шлях моладзі. № 2 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Шлях моладзі: [Верш] // Там жа. № 6 / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Да пагоні: [Верш] // Крыніца. 5 снеж. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Арышты, Бяроза і воля: (Успаміны арыштанта) // Там жа. 8, 12, 15, 19, 29 снеж.; 1940. 1, 9, 16, 19, 23, 26 студз. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі; Ноч мінула: [Верш] // Там жа. 22—25 снеж. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1965. Як на дурня: [Верш] // Ніва. 20 чэрв. / Пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1.4.

Талстой Л. Ці шмат чалавеку трэба зямлі і другія апавяданні / З рус. Вільня, 1928 / Пер. пад псеўд. Улад-Ініцкі.

Талстой Л. Ад чаго зло на свеце і другія апавяданні / З рус. Вільня, 1929 / Пер. пад псеўд. Улад-Ініцкі.

1928. Зошчанка М. Хамства: Апавяданне / З рус. // Грамадзянін. № 21 / Пер. пад псеўд. Улад-Ініцкі; Левін Б. Саша: (З радавой гумарыстыкі) / З рус. // Там жа. № 22 / Пер. пад псеўд. Улад-Ініцкі.

2.3.

На беларускай мове. «Сон Гаўрылы» // Слова працы. 1928. 27, 31 кастр.

3.1.

БДА, ф. 882 с., воп. 1, адз. зах. 60, л. 30; ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 228; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 158, 186, 455—457, 526, 707.

Т. М. Махнач.

ПАЎЛЮКЯВІЧУС (ДЖУГАС) БАНАВЕНТУРА

Паўлюкявічус (Джугас) Банавентура Казіміравіч (інш. псеўд. Bonplas, крыпт. B. P., Dž.; 1896, в. Будэжэрай Мар'ямпальскага пав. Ковенскай губ., цяпер Вілкавішскі р-н, Літва— 29.11.1938, Мінск), празаік, публіцыст, грамадскі дзеяч. Член СП Беларусі з 1934. Пісаў на літоўскай мове.

Нарадзіўся ў сям'і вясковага цесляра. У дзяцінстве быў пастушком, парабкаваў. З цяжкасцю, самавукам здабываў адукацыю. У 1922 паступіў на трэці курс настаўніцкай семінарыі ў Мар'ямпалі. Там удзельнічаў у рабоце марксісцкага гуртка (па сутнасці — камсамольскай арганізацыі). Закончыўшы семінарыю (1924), паступіў на прыродазнаўчы факультэт Каўнаскага універсітэта. У 1926, калі Літоўская Камуністычная партыя пачала выдаваць легальны часопіс «Skardas» («Водгук»), Б. Паўлюкавічус стаў яго афіцыйным рэдактарам. На другім нумары часопіс быў закрыты, а яго рэдактар апынуўся ў турме. Выйшаўшы на волю, паехаў працаваць настаўнікам літоўскай школы ў Рызе, адначасова сам вучыўся там ва універсітэце. Завязаў кантакты з газетай «Balsas» («Голас»), якая выходзіла ў Германіі як орган ЛКП, пасылаў туды артыкулы пра жыццё рыжскіх рабочых. У 1929 ЛКП запрасіла яго ў Германію (Кёнігсберг) працаваць у рэдакцыі гэтай газеты. Там жа ў 1930 Б. Паўлюкявічус стаў членам ЛКП. Пасылаў публіцыстычныя і крытычныя артыкулы ў літоўскія газеты ЗША «Laisve» («Свабода») і «Vilnis» («Надзея»), а таксама ў газету «Raudonasis artojas» («Чырвоны араты»), якая выдавалася ў Мінску. З 1932 працаваў у гэтай газеце загадчыкам культмасавага сектара. Друкаваў у ёй нарысы пра літоўскія калгасы і школы ў БССР, апавяданні. У 1934 прыняты ў СП БССР, увайшоў у яго літоўскую секцыю. З 1933 вучыўся ў аспірантуры АН БССР, пісаў дысертацыю пра творчасць літоўскага паэта І. Білюнаса (незакончана, пазней загінула). У час вучобы захапляўся музыкай, тэатрам, мастацкай самадзейнасцю. У 1938 арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання (прысуд, магчыма, быў выкананы ў Курапатах). У 1957 пасмяротна рэабілітаваны.

Друкавацца Б. Паўлюкявічус пачаў у 1926 у часопісе «Skardas». У сваіх апавяданнях, абразках і артыкулах паказваў цяжкае жыццё літоўскіх батракоў на сваёй радзіме («Пасяленец», «Аўкцыён», «Жніво»). Потым у яго творчасць увайшла рабочая тэматыка (апавяданні «Першае мая», «Забастоўка», рэпартаж «Свята барацьбы», незакончаная аповесць «Беспрацоўны»). У Мінску працаваў над аповесцю «Бядоты батрака», другая частка якой загінула. У 1936 пачаў пісаць новую аповесць «Сенакос» — з жыцця літоўскага калгаса ў БССР (в. Малькова). На старонках газеты «Raudonasis artojas» друкаваліся яго крытычныя артыкулы пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа і іншых беларускіх пісьменнікаў. Напісаны яны з добрым веданнем іх творчасці. Аднак на артыкулах адбілася захапленне Б. Паўлюкявічуса «белапаўскай» крытыкай: паэзію Я. Купалы, Я. Коласа і сваіх літоўскіх калег ён разглядаў з пазіцый вульгарнага сацыялагізму, шукаў у ёй праявы «дробнабуржуазнай, нацдэмаўскай» ідэалогіі. Перакладаў з латышскай, нямецкай і рускай моў. Артыкулы на беларускай мове змяшчаў у газеце «Літаратура і мастацтва». Лепшае з таго, што напісана Б. Паўлюкявічусам, увайшло ў пасмяротны зборнік «Бядоты батрака», выдадзены ў Вільнюсе ў 1960.

А. В. Мальдзіс.

Бібліяграфія

1.2.

Lietuvių kalbos vadovėlis: (Vadovelis pradžios mokykloms). Mn., 1933 / Сааўт. Ф. Вайшнарас.

Berno vargai. Vilnius, 1960.

1.3.

1926. Naujakurys // Musų skardas. Kaunas / Пад псеўд. Bonplas; Tegirdi // Skardas. Nr 11 / Пад крыпт. B. P.; Bedarbis // Skardas. Nr 2 / Пад псеўд. Bonplas.

1929. Latvijos socialdemokratai tarnauja Angleijos ir Lenkijos imperialistams; Provokatoriai bėga iš Latvijos // Balsas. Nr 1; Latvies buržuazijos ir socialdemokratų bendro 10 m. viešpatavimo balansas // Balsas. Nr 2; Latvijos fašizmas ir socialfašizmas // Balsas. Nr 6; Rugiapiūtė // Balsas. Nr 9; 1-oji Gegužes Latvijoje // Balsas. Nr 12.

1930. Smulkiaburžuazinės ziurkes // Balsas. Nr 6;

Varzatynės // Balsas. Nr 9; Nauja streikų banga Vokietijoj // Raud. artojas. Lapkr. 7.

1931. Gegužes Pirmoji // Priekalas. Nr 3–4; Streikas // Priekalas. Nr 5—6; Idiotas // Raud. artojas. Geg. 1; Kas dedas vokietijoj: (Nuo musų Korespondento iš Vokietijos) // Raud. artojas. Liep. 20, 27; Gruod. 11; Saus. 27.

1932. Svajones ir realybė: Iš apysakos «Naujakurys» // Raud. artojas. Saus. 21; Diskusijos: (Iš apysakos «Nedarbas») // Raud. artojas. Kov. 10; Daugiau realių Kovos vaizdų poezijoj // Raud. artojas. Kov. 15; Šešiasdešimt pirmosios Paryžiaus Komunos sukaktuvės // Raud. artojas. Nr 14 / Пад крыпт. Dž.; Kovos švente // Raud. artojas. Geg. 1.

1933. Паэзія рэвалюцыйнай барацьбы // ЛіМ. 27 жн.; Gegužes Pirmoji; Diskusijos // Lietuvių literatūros chrestomatija. Mn., D. 1; V. Žalonio «Audringosios jėgos» // Priekalas. Nr 1, 2; Grabes kasant: (Iš apysakos «Naujakurys») // Raud. artojas. Vas. 16; Susiderėjo: (Iš apysakos «Berno vargai») // Raud. artojas. Bal. 5; Svelkintinas žingsnis // Raud. artojas. Geg. 1; Janka Kupala — liaudies poetas // Raud. artojas. Nr 24; Jonas nori i sigyti žagrė: (Iš apysakos «Naujakurys») // Raud. artojas. Liep. 30.

1934. Nedarbas // Po raudonaja vėliava. Mn.; Lietuvių tarybinių rašytojų pasitarimas Minskė // Priekalas. Nr 1; Amerikos «Šviesa» ir jos poetai // Priekalas. Nr 3; Smalkėse // Priekalas. Nr 11; Kovokime už literatūros kokybė // Priekalas. Nr 12; Apie musų poeziją // Raud. artojas. Liep. 22.

1935. Juratos Juraitės apysakos // Priekalas. Nr 5; Malkova // Priekalas. Nr 10; Janka Kupala — liaudies poetas // Raud. artojas. Gruod. 11.

1936. Poezijos plenumas // Priekalas. Nr 4; Atsiminimai apie K. Požela Kauno kalejime // Priekalas. Nr 12; Apie BSSR sovietinių rašibojų lietuvių sekcijos poeziją // Raud. artojas. Vas. 10; Merginos valdomi sarčiai: (Ištrauka iš apysakos «Sienapiutė») // Raud. artojas. Geg. 1; Išgivendinkim musą poezijos trukumus // Raud. artojas. Birž. 30: V. Žalionio romanas «Jonas Stumbris» // Raud. artojas. Rugs. 29; Jakubo Kolaso 30 metų literatūrinio darbo sukaktuves minint // Raud. artojas. Spal. 11; Sovietų Baltarusijos lietuvių mokyklas belankant // Raud. artojas. Gruod. 22, 29.

1937. Nesažiningai atliktas darbas: Bibliografija ir kritika // Raud. artojas. Saus. 10; A. S. Puškino sukaktuvemis bestartinant // Raud. artojas. Saus. 15; Prieš chaltura // Raud. Artojas. Vas. 14; Keletas žodžių apie pradedančius poetus // Raud. artojas. Kov. 24; Geriausias Sovietų epochos poetas // Raud. artojas. Bal. 20.

1.4.

Laicens L. Klykiantieji korpusai: Romanas / Iš latv. Mn., 1935.

1932. Gorkij M. Daina apie Audros Pranaša / Iš rusų // Raud. artojas. Rugs. 29.

1933. Laicens L. Viens nakti bėldesi; Priednieks K. Sovietos Minske / Iš latv. // Raud. artojas. Geg. 1.

1935. Lordkipanidze K. Šalin kukuruzu respublika / Iš gruz. // Raud. artojas. Liep. 25; Ostrovskij N. Kaip grudimsi plienas / Iš rusų // Raud. artojas. Lapkr. 11.

1936. Jakimienko N. Partizanas ir jo motina / Iš rusų // Raud. artojas. Lapkr. 11.

1937. Bogdanovič L. Čemodanas: (Novele) / Iš rusų // Raud. artojas. Kov. 24; Gradov G. Menkniekiai: (Vieno veiksmo komedija) / Iš rusų // Raud. artojas. Bal. 20, 25; Altajski N. Parubežinis epizodas / Iš baltar. // Raud. artojas. Geg. 21; Iljenkov V. Asmenibė / Iš rusų // Raud. artojas. Geg. 31; Gorki M. Vaikai givens geriau / Iš rusų // Raud. artojas. Birž. 16.

1.5.

На беларускую мову. Пад павеццю: Урывак з аповесці «Беспрацоўе» / Пер. В. Віскар // ЛіМ. 1933. 27 жн.; Мары і сапраўднасць: Урывак з аповесці «Наваселец» / Пер. В. Віскар // ЛіМ. 1936. 17 жн.

2.3.

На беларускай мове. Мальдзіс А. Творчыя ўзаемасувязі беларускай і літоўскай літаратур у савецкі час // Старонкі літаратурных сувязей. Мн., 1970. С. 74—76.

На літоўскай мове. Lietuvių literatūros istorija. Vilnius, 1965. T. 3. D. 2. P. 163—167; Pranskus B. Bonaventūras Pauliukevičius // Pauliukevičius B. Berno vargai. Vilnius, 1960; Prėskienis B. Bonaventūros Pauliukevičius — literatūros kritikas // Literatūra. Vilnius, 1963. T. 6.

Т. М. Махнач.

ПАЧОПКА ЯНКА

Пачопка Янка [Іван Пятровіч; псеўд. Башкір, Праваслаўны, Я. Башкір, Янка Башкір, Я. Шкір-ба, Шкір-ба, крыпт. І. Р., І в. П-ка, Я. П.; 26.10(8.11).1890, в. Летнікі Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл.— 26.5.1977, пахаваны ў в. Малінаўка Глыбоцкага р-на], паэт, празаік, фалькларыст.

З сям'і лесніка. У 1913 скончыў Варанецкую сельскагаспадарчую школу (цяпер у Пастаўскім р-не). Працаваў у дэпартаменце земляробства Віленскай губ. Быў рэдактарам двухтыднёвіка «Праваслаўны беларус» (1925), які выдаваўся ў Варшаве. Працаваў аграномам (1939—58). Апошнія гады жыцця працаваў на зямлі, вырасціў траіх дзяцей.

Літаратурную працу Я. Пачопка пачаў з вершаў. Вёска Летнікі, дзе нарадзіўся пісьменнік, была ўся населена Пачопкамі, дзялілася на два «канцы», якія па-вулічнаму называліся Башкіры і Вушлакі, таму адзін з псеўданімаў Я. Пачопкі — Башкір. Першы яго верш «Дудар» надрукаваны ў «Нашай ніве» (1913). Яшчэ раней з'явіўся пераклад з рускай мовы («Наша ніва», 1912). Пісаў таксама прозу. Першае апавяданне «Злы лёс» апублікавана ў газеце «Савецкая Беларусь» (1921). У той жа газеце змяшчаліся яго «Абразкі жыцця». З малых гадоў Я. Пачопка збіраў і запісваў народныя казкі, паданні, з якіх потым нарадзілася кніга «Народная казка з Дзісеншчыны». Вершы, народныя паданні,

казкі, апрацаваныя Я. Пачопкам, друкаваліся на старонках дзіцячых часопісаў «Заранка», «Пралескі», у «Праваслаўным беларусе». Я. Пачопка стала супрацоўнічаў і ў часопісе «Маланка», дзе друкаваў свае вершы і байкі. Творы яго змяшчаліся таксама ў заходнебеларускіх часопісах «Калоссе», «Хрысціянская думка», газеце «Сялянская ніва». У 20-я гады ў Вільні выйшлі яго кнігі на сельскагаспадарчую тэматыку: «Малочная карова: як яе выбраць, карміць і даглядаць», «Гародніцтва: як трэба гаспадарыць на гародзе, каб мець добрае варыва», «Як выбраць добрага каня», «Пчолы і як вадзіць іх у рамовых вуллях». Я. Пачопка быў блізкім сябрам і земляком беларускага мастака Я. Драздовіча, які зрабіў яго разны партрэт і малюнкі да яго кніг «Пчолы...». Рукапісны сшытак з яго вершамі захоўваецца дачкой пісьменніка, Л. І. Павульскай, Дзяржаўнаму музею гісторыі беларускай літаратуры.

А. С. Лис.

Бібліяграфія

1.2.

Малочная карова: Як яе выбраць, карміць і даглядаць. Вільня, 1923 (Сельскагаспадарская б-ка № 1).

Пчолы і як вадзіць іх у рамовых вуллях. Вільня, 1923.

Гародніцтва: Як трэба гаспадарыць на гародзе, каб мець добрае варыва. Вільня, 1925 (Сельскагаспадарская б-ка № 2).

Гурток: Камедыя ў адной дзеі з сучаснага жыцця. Вільня, [1926] / Пад псеўд. Янка Башкір.

Дурнішча: Народная казка з Дзісеншчыны. Вільня, 1927.

Як выбраць добрага каня. Вільня, 1928 (Папулярная нар. б-ка, серыя гаспадарчая 21).

1.3.

1913. Дудар: [Верш] // Н. н. 23 мая; Вясна: [Верш] // Там жа. 7 чэрв.

1918. Дамагаюцца замірэння // Дзянніца. 1 кастр. / Пад крыпт. І. Р.

1921. Ноч: [Верш] // Бел. вед. 25 снеж.; Злы лёс: [Апавяданне] // Сав. Бел. 28 снеж. / Пад крыпт. Я. П. Аўт. спрэчнае.

1922. Зіма: [Верш] // Бел. вед. 1 студз.; Абразкі жыцця // Сав. Бел. 13 снеж. / Пад крыпт. Я. П. Аўт. спрэчнае.

1925. Салдатка: [Верш] // Правасл. Беларус. № 1 / Пад псеўд. Янка Башкір; 400-лецце беларускага друку // Там жа. № 2 / Пад крыпт. Ів. П-ко; Марылька: (Казка для дзяцей); Жабрак: (З Беранжэ): [Верш] // Там жа. № 4 / Пад псеўд. Янка Башкір; Над царамі цар: [Казка] // Там жа. № 5 / Пад псеўд. Я. Башкір; Адамка: Апавяданне для дзяцей // Там жа. № 8 / Пад псеўд. Янка Башкір; Адзін: [Верш] / Пад псеўд. Янка Башкір; Янка Купала: (Да 20-лецця яго паэтычнай творчасці) / Пад крыпт. Ів. П-ка // Там жа. № 9; Летам; Раніца; Поўдзень: [Вершы] // Там жа. № 11 / Пад псеўд. Я. Башкір; Бусел: (Бел. легенда): [Верш]; Тры прауды: Нар. апавяданне // Там жа. № 12 / Пад псеўд. Янка Башкір; Восень; «Лес аглох, спусцелі нівы...»; «Калі ты выйшаў на дарогу...»: [Вершы] // Там жа. № 13—14 / Пад псеўд. Я. Башкір; Сама вінавата: Нар. легенда: [Верш] // Там жа. № 15—16 / Пад псеўд. Янка Башкір; «Чаму, як чуткі Жук кудлаты...»: [Верш] // Там жа. № 17—18 / Пад псеўд. Я. Башкір; Прафесар Іван Агіенка // Там жа. № 19—20; Сасновыя боты: Казка для дзяцей // Там жа. № 22 / Пад крыпт. Я. П.

1926. Паправіў; Зняважыў: [Вершы] // Маланка. № 3 / Пад псеўд. Я. Башкір; Зняважыў: [Верш] // Там жа. № 4 / Пад псеўд. Я. Башкір; Дарадзіла: [Верш] // Там жа. № 5 / Пад псеўд. Я. Башкір; Дарадзіла: [Верш] // Там жа. № 6 / Пад псеўд. Я. Башкір; Добры сынок: [Верш] // Там жа. № 7 / Пад псеўд. Я. Башкір; Поп і клоп: [Верш] / Пад псеўд. Янка Башкір; Хто быў Адам?: [Байка] / Пад псеўд. Шкірба // Там жа. № 8; Самаўрад: Паэзія і проза: [Вершы] // Пад псеўд. Шкір-Ба; Жаночая любасць: [Верш] / Пад псеўд. Я. Башкір // Там жа. № 9; Сураежачка: [Верш] // Там жа. № 10 / Пад псеўд. Я. Башкір; Каб крыху раней: З цыкла «Нашы дзеткі»: Разважлівы. Цікавы: [Вершы] // Там жа. № 11 / Пад псеўд. Янка Башкір; З песняў пралетара: [Верш] // Сялян. ніва / Пад псеўд. Я. Башкір; Глядзі, браце!.. [Верш] // Там жа. 7 жн. / Пад псеўд. Я. Башкір.

1927. Два цары: [Казка] // Заранка. № 5—6 / Пад псеўд. Янка Башкір; Без галавы лепей: [Жарт] / Пад псеўд. Я. Шкір-Ба; Дабрахвочы; Усюды; «Грамада»: [Вершы] / Пад псеўд. Янка Башкір // Маланка. № 1; Адзін другога лепшы: [Верш] // Там жа. № 2, 3 / Пад псеўд. Янка Башкір; Нашы дзяўчаты; Нашы бабы: [Вершы] // Там жа. № 5 / Пад псеўд. Башкір; У нашай гміне: [Апавяданне] // Сялян. ніва. 1 студз. / Пад псеўд. Янка Башкір.

1928. Бялынкавіцкія благачынныя: [Апавяданне] // Працаўнік асветы. 23 снеж. / Пад крыпт. Я. П. Аўт. спрэчнае.

1935. Як баран ваўку парадзіў: Апавяданне // Пралескі. № 1; Дом-дамок; Апавяданне // Там жа. № 2.

1936. Смерць: [Верш] // Калоссе. № 2.

1937. Навучы мяне, божа!: [Верш] // Хрысціянская думка. № 18 / Пад псеўд. Праваслаўны.

1.4.

Вагнер Ю. Апавяданне аб жывёлах / З рус. Вільня, 1923.

1912. Іванова А. З дзіцячых разгавораў: [Верш] / З рус. // Н. н. 20 вер.

1924. З дзіцячых разгавораў (А. Іванова) / З рус. // Беларускі дэкламатар. Мн.

1925. Тан У. Дуб і віхор: [Верш] / З рус. // Правасл. Беларус. № 9.

В. М. Грышкевіч.

ПАШКЕВІЧ МІКАЛАЙ

Пашкевіч Мікалай Арсеньевіч (20.5.1936, в. Гарадзішча Вілейскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл.— 14.3.1972, в. Сваткі Мядзельскага р-на, пахаваны ля в. Гарадзішча), літаратуразнавец, педагог, краязнавец.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У час Айчыннай вайны бацька са старэйшым сынам былі на фронце, маці з шасцю меншымі дзецьмі ў час акупацыі жыла ў вёсцы. Пасля вайны бацькі працавалі ў калгасе. У 1945 М. Пашкевіч пайшоў у Халмянскую пачатковую школу, якую скончыў у 1949. Вучыўся ў Сваткаўскай СШ (1949—55). У 1955—58 служыў у Савецкай Арміі. Скончыў філалагічны факультэт БДУ (1963). Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Сваткаўскай СШ Мядзельскага р-на, працаваў намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай частцы той жа школы (1963—67). Быў старшынёй літаратурнага аб'яднання пры раённай газеце «Нарачанская зара». У школе ўзначальваў гурток паэзіі «Маладая рунь», выпускаў аднайменныя насценгазету і альманах. У 1967 паступіў у аспірантуру Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР, але не змог яе скончыць па стану здароўя.

Першыя вершы надрукаваў у мядзельскай раённай газеце. Друкаваўся ў рэспубліканскіх перыядычных выданнях. Вопыт кіраўніка школьнага гуртка беларускай літаратуры, у пасяджэннях якога прымалі ўдзел М. Танк, Я. Брыль, В. Быкаў, Н. Гілевіч, У. Караткевіч, І. Навуменка, М. Аўрамчык, Г. Бураўкін, А. Лойка, А. Вярцінскі, Р. Барадулін, В. Рагойша і інш. пісьменнікі, абагульніў у кнізе «З вопыту работы літаратурнага гуртка...». Памяці М. Пашкевіча прысвечаны аповесць В. Быкава «Абеліск», верш А. Лойкі «Каліны», карціна А. Пупко «Памяць», раздзел экспазіцыі ў Мядзельскім музеі народнай славы. *Л. С. Савік.*

Бібліяграфія

1.3.

1959. Адыходзіць навабранец: [Верш] // Чырв. змена. 8 кастр.

1962. Раніца: [Верш] // Чырв. змена. 15 сак.; Як сонца над зямлёю...: [Верш] // Там жа. 5 ліп.

1.5.

На англійскую мову. [Рэц. на кн.: Шамякин И. Снежные зимы. М., 1971] // Soviet Literature. 1971. № 12.

На польскую мову. [Рэц. на кн.: Шамякин И. Снежные зимы. М., 1971] // Lit. Radz. 1972. Nr 2.

1.6.

З вопыту работы літаратурнага гуртка Сваткаўскай сярэдняй школы Мядзельскага раёна: (Метад. дапаможнік для настаўнікаў). Мн., 1968 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Жук В. Сцежка застаецца людзям // Маладосць. 1981. № 9; Рагойша В. Зробленае застаецца // ЛіМ. 1972. 7 крас.

2.4.

Лойка А. Каліны: [Верш] // Лойка А. Пачуцці. Мн., 1976.

Т. М. Махнач.

ПАШКЕВІЧ НІЧЫПАР

Пашкевіч Нічыпар Еўдакімавіч (псеўд. П. Зелянькоўскі, А. Каліна, К. Кветка, А. Крушина, А. Крушына; н. 12.12.1924; в. Філістава Талачынскага р-на Віцебскай вобл.), крытык, літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1970). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1974). Член СП Беларусі з 1958. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1966, за кнігу «На шырокіх шляхах жыцця»).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Еўдакім Іванавіч, быў сельскім актывістам, у 1934 загінуў ад рук бандытаў. Маці, Марыя Барысаўна, працавала ў калгасе, памерла ў 1945. Пасля заканчэння сямігодкі Н. Пашкевіч паступіў у Мінскае педвучылішча (1939). Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, ён вярнуўся да маці ў в. Малыя Міхінічы Талачынскага р-на. Стаў байцом партызанскага атрада брыгады «Граза», якая дзейнічала на Віцебшчыне, потым памочнікам камісара атрада па камсамолу, камісарам атрада імя Катоўскага (1942—44). Удзельнічаў у выпуску талачынскай падпольнай газеты «Чырвоны хлебароб» як член рэдкалегіі (сакавік 1943 — чэрвень 1944). Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прызначаны рэдактарам талачынскай раённай газеты «Чырвоны хлебароб» (1944—45). Працаваў загадчыкам аддзела газеты «Віцебскі рабочы» (1945—46, 1948—51). Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1946—48), завочна — гістарычны факультэт Віцебскага педінстытута (1951). Быў загадчыкам аддзела, адказным сакратаром газеты «Звязда» (1951—56). Скончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (кафедра тэорыі літаратуры і мастацтва, 1956—60). Працаваў рэдактарам аддзела культуры і быту «Экономической газеты» (1960—61). У студзені 1961 вярнуўся ў Мінск і прызначаны галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва» (1961—69). Зноў пераехаў у Маскву, працаваў рэдактарам газеты «Правда» па аддзеле прэсы, крытыкі і бібліяграфіі (1969—72), першым намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Литературное обозрение» (1972—74). З 1974 у Мінску. Працаваў намеснікам дырэктара Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР (1974—76), рэктарам Мінскага інстытута культуры (1976—79), галоўным рэдактарам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм» (1979—87). З 1992 старшыня Праўлення Беллітфонда. У складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1975). Выбіраўся дэпутатам Мінскага гарсавета. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Друкаваць пачаў у 1943. Першая публікацыя (верш «Буря грянет») у раённай газеце «Чырвоны хлебароб» (1943). Пісаў артыкулы, рэцэнзіі пра творчасць беларускіх пісьменнікаў М. Лынькова, І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, П. Панчанкі, І. Навуменкі, А. Адамовіча, А. Зарыцкага, А. Васілевіч, А. Кулакоўскага, У. Карпава, А. Асіпенкі, А. Чарнышэвіча, В. Іпатавай. Аўтар кнігі «На шырокіх шляхах жыцця», у якой аналізуе развіццё сучаснага беларускага рамана, адлюстраванне беларускімі празаікамі подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Звяртаецца да сучасных праблем развіцця беларускай літаратуры, даследуе пытанні пісьменніцкага майстэрства.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

На шырокіх шляхах жыцця. Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1965. Рэц.: Бярозкін Р. Аб праблемах надзённых // Маладосць. 1966. № 7; Казека Я. З высокай патрабавальнасцю // Полымя. 1966. № 11; Крахмальникова З. Пути современного белорусского романа // Вопр. лит. 1967. № 1; Навуменка І. Шчырая, зацікаўленая размова // Беларусь. 1966. № 7. Оскоцкий В. На путях жизни и творчества // ЛГ. 1966. 12 мая.

1.3.

1945. На будаўніцтве торфабрыкетнага завода // Віцеб. рабочы. 30 мая; У калгасах Талачыншчыны // Там жа. 8 чэрв.; На хвалях самацёку // Там жа. 17 чэрв.; Тарфянікі: [Нарыс] // Там жа. 26 чэрв.; Саўгас «Рэканструктар»: [Нарыс] // Там жа. 21 ліп.; Дзень у калгасе: [Нарыс] // Там жа. 7 вер.; Ля роднае хаты: [Верш] // Там жа. 30 вер.; Планы і сапраўднасць // Там жа. 27 кастр.; Стаханаўцы // Там жа. 28 кастр.; Партыйна-палітычная работа на нізкім узроўні // Там жа. 31 кастр.; Пісьмы з Белдрэса. Час брацца за работу // Там жа. 2 ліст.; Вернутае жыццё: [Нарыс] // Там жа. 23 ліст.

1946. Мерачы гэтыя гоні...: [Верш] // Полымя. № 7; Віцеб. рабочы. 1 мая; Цяпер скажу: [Верш] // Там жа. 24 сак.; На чыгунцы: [Верш] // Там жа. 26 чэрв.; Ранак: [Верш] // Там жа. 8 жн.

1947. Ліст з трактарнага: [Верш] // Беларусь. № 3; Тэлефон: [Верш] // Вожык. № 3—4; Мерка ячменю: [Верш] // Там жа. № 8; Гастралёр: [Верш] // Там жа. № 10; На лініі найменшага супраціўлення: [Верш] // Там жа. № 11; Дзень у калгасе: Пародыя // Там жа. № 13; Бюракратычны шторм: [Гумарэска] // Там жа. № 14; Аляксандр Іванавіч Колышкін // Віцеб. рабочы. 25 студз.; Едуць камсамольцы ў сталіцу: [Верш] // Там жа. 9 лют.; Наваселле: [Верш] // Там жа. 9 мая; Ліст у рэдакцыю: [Верш] // Там жа. 7 ліст.

1948. Перакамсоўка: Апавяданне // Вожык. № 13; Канарэзы і іхнія апекуны: [Верш] // Там жа. № 17; Пяцігодку ў чатыры гады: [Верш] // Полымя. № 2; Віцеб. рабочы. 11 студз.; У залах гістарычнага музея Айчыннай вайны // Там жа. 15 лют.; Яны з Віцебшчыны // Там жа. 24 лют.; Звеннявая: [Верш] // Там жа. 20 чэрв.; Ты сказала...: [Верш] // Там жа. 26 вер.; Шляхам змагання // Там жа. 19 кастр.

1949. Мітынг на таку: Апавяданне // Віцеб. рабочы. 19 чэрв.; Райком партыі і друк // Там жа. 7 вер.; «Алазанская даліна» // Там жа. 2 кастр. / Сааўт. В. Хазанскі; За калючым дротам граніцы // Там жа. 28 кастр.; «Шчаслівага плавання» // Там жа. 7 ліст. / Сааўт. В. Хазанскі; Праўда аб Грэцыі // Там жа. 23 ліст.

1950. Ліст з трактарнага: [Верш] // На сонечных сцежках. Мн.; Галасы пачынаючых // Віцеб. рабочы. 15 студз.; «Свежы вецер» // Там жа. 18 лют. / Сааўт. В. Хазанскі; Я ля урны стаю: [Верш] // Там жа. 12 сак.; «Алёна Фаміна» // Там жа. 28 сак.; «Святло над зямлёй» // Там жа. 26 крас.; Фільм аб вялікім рускім вучоным-патрыёце // Там жа. 12 мая; Дарогай шчасця: Урывак з другой карціны п'есы // Там жа. 28 мая / Сааўт. В. Хазанскі; Дзеля паўнаты фразы // Там жа. 14 чэрв.; Перамогу трэба арганізаваць // Там жа. 14 ліст.; Ружы і церні: Фельетон // Там жа. 17 ліст.; «Пяюць жаваранкі» // Там жа. 26 ліст.; Народнаму абранніку: [Верш] // Там жа. 17 снеж.

1951. Соль: Байка // Вожык. № 20; Новыя арыенціры: Па слядах Някрасава Н. А.: [Верш] // Там жа. № 24; Мітынг у гумне: Апавяданне // Работніца і сялянка. № 12; Цікавы і патрэбны спектакль // Віцеб. рабочы. 25 сак.; Па зямлі ідзе вясна // Там жа. 1 мая; «Двайная ігра» // Там жа. 20 мая; Другое лета // Там жа. 22 жн.; Бітва за жыццё // ЛіМ. 21 крас.

1952. Апавяданні аб савецкіх людзях: [Рэц. на кн.: Кавалёў П. У новы дзень. Мн., 1952] // Беларусь. № 12 / Пад псеўд. А. Крушына; Нечаканы госць: Апавяданне // Вожык. № 7; Ды тут ён раптам папярхнуўся: Апавяданне // Там жа. № 13; Крах традыцыі: Апавяданне // Там жа. № 21; Проста і пераканаўча: [Рэц. на кн.: Брыль Я. У Забалоцці днее. Мн., 1951] // Полымя. № 4; Багатая спадчына // Звязда. 1 студз. / Сааўт. В. Грыгор'еў; Спектакль аб барацьбе за мір // Там жа. 31 студз. / Сааўт. Г. Шчарбатаў; Адлюстроўваць жыццё ва ўсёй яго паўнаце і шматграннасці: Аб сур'ёзным адставанні беларускай

драматургіі // Там жа. 17 ліп.; Настаўніца // Там жа. 14 снеж.

1953. Зямля маладзее: [Рэц. на кн.: Дуброўскі І. Зямля маладзее. Мн., 1952] // Беларусь. № 4; Быць на вышыні задач! На старонках альманаха «Советская Отчизна» // Звязда. 16 студз.; Жалоба і мужнасць // Там жа. 10 сак.; Клубы без свайго аблічча // Там жа. 9 чэрв.; «Васа Жалязнова» // Там жа. 13 чэрв.; Па старонках часопісаў // Там жа. 29 ліп.; Зброяй смеху // Там жа. 18 ліст.; Аб паэтычным асэнсаванні жыцця // ЛіМ. 1 студз.; Спектакль аб рабочым класе // Там жа. 28 сак.; Непатрабавальнасць паэта і рэдактара // Там жа. 26 вер.; Сумна аб паэтычным... // Там жа. 21 ліст.; Знішчальны смех // Там жа. 12 снеж.

1954. Мерка ячменю: [Верш] // Размова па шчырасці. Мн.; Творчая камандзіроўка аднаго пісьменніка; Песня: [Вершы]; У гародзе бузіна, а ў Кіеве дзядзька: Байка //Беларусь. № 6 / Пад псеўд. А. Каліна; Жанр патрабуе: [Рэц. на кн.: Корбан У. Байкі. Мн., 1953] // Полымя. № 4; «Новы Мінск» // Звязда. 23 лют.; «Верныя сябры» // Там жа. 30 крас.; Інструктар райкома // Там жа. 1 мая; Так выхоўвалася мужнасць // Там жа. 18 чэрв.; Подзвіг юнага героя // Там жа. 24 ліп.; «Багатыр» ідзе ў Марто» // Там жа. 13 ліст.; «Брэсцкая крэпасць» // ЛіМ. 10 ліп.

1955. Тры п'есы: [Рэц. на кн.: Губарэвіч К. П'есы. Мн., 1954] // Полымя. № 1; Апавяданні і замалёўкі фактаў // Звязда. 16 студз.; Паспяховыя пошукі // Там жа. 2 крас.; Без яснай ідэі // Там жа. 10 вер.; Характар і схемы: Апавяданні часопіса «Беларусь» // ЛіМ. 26 лют.

1956. З верай у чалавека // ЛіМ. 1 вер.

1957. У новым жанры: [Рэц. на кн.: Сабаленка Р. Жменя зярнят. Мн., 1957] // Полымя. № 12; Разговор о басне // Сов. Отчизна. № 2; У кнізе і на экране // Віцеб. рабочы. 26 ліп.; Свет юнацкіх пачуццяў // ЛіМ. 13 лют.; У добры час // Там жа. 7 жн.; Праўда характару // Там жа. 27 ліст.

1958. А. М. Горкі аб мастацкай тыпізацыі // Маладосць. № 10; Жизнь, конфликты, характеры // Сов. Отчизна. № 3; Галоўную ўвагу — сучаснай тэме! Па старонках часопіса «Маладосць» // Звязда. 22 чэрв.

1959. Самае галоўнае // ЛіМ. 11 лют.; Красота подвига во имя Родины // Сов. Бел. 10 февр.

1961. Народнасць і партыйнасць савецкага мастацтва // Камуніст Бел. № 2; Поиски ведут к новым открытиям // Неман. № 4; Героі ці ахвяры лёсу? // ЛіМ. 27 чэрв.; На скрыжаваннях ваенных дарог // Там жа. 11 ліп.; Вслед за бегущим днем // Сов. Бел. 13 дек.

1962. Шыракаплынная і шматгалосая // Звязда. 25 крас.; Замардаваныя пацалункамі: [Рэц. на кн.: Уксусов Д. Я — твой друг. Мн., 1962] // ЛіМ. 10 жн.

1963. Услед за імклівым днём // Літаратура нашых дзён. Мн.; Псіхалагічнае і эпічнае // Полымя. № 5; Пафас нараджаецца ў сэрцы: [Рэц. на кн.: Прошын С. Я забыўся пра цішыню. Мн., 1963] // Там жа. № 11; Сквозь огонь войны // Сов. Бел. 5 янв.

1965. Течение раздольное и глубокое // Коммунист Таджикистана. 24 нояб.; Ішоў сорак першы...: [Рэц. на: Асіпенка А. Вогненны азімут // Маладость. 1965. № 2—5] // ЛіМ. 13 ліп.; Мост в будущее // ЛГ. 28 авг.

1966. За тридевять исторических земель // Неман. № 10; Откуда мы родом // Известия. 11, 12 мая.

1967. Возмужали и мы, и напевы // ЛГ. 18 окт.

1968. Ключы таямніц // Максім Горкі і Беларусь. Мн.; Удакладнім крытэрыі // Маладосць. № 5.

1970. Шаг пятый, состоявшийся: [Рэц. на кн.: Новиков Н. Пять шагов жизни. Мн., 1970] // Правда. 13 нояб.

1972. Евгений Мозольков (1909—1969) // Мозольков Е. Поющая земля. М.; Адрасуецца масаваму чытачу // Звязда. 13 вер.

1973. Земли родной минувшая судьба // Лит. обозрение. № 1.

1974. Неравнодушной рукой // Осипенко А. Белый камень. М.; Возводя капитальную стену... // Лит. обозрение. № 1; Встречный огонь: [Рэц. на: Навуменка І. Сорак трэці // Маладосць. 1973. № 10—12] // Лит. обозрение. № 8; На высокой волне // Огонек. № 52.

1975. Чистое пламя: [Рэц. на кн.: Панченко П. При свете молний. М., 1974] // Правда. 5 авг.

1976. Кондрату Крапиве — 80 лет // ЛГ. 10 марта.

1978. Из чистой криницы // Далидович Г. Тепло на первоцвет. М.

1979. По азимуту долга и совести // Неман. № 9.

1980. Гэта наша з табой біяграфія: [Інтэрв'ю] / Зап. А. Стулава // Вяч. Мінск. 27 жн.

1981. Перадз'ездаўскі экран рэспублікі // Звязда. 23 студз.; Крытыка і літаратуразнаўства: Здабыткі і праблемы // ЛіМ. 24 крас.

1983. Перачытваючы п'есы // ЛіМ. 23 вер.

1984. Да сустрэчы на экране!: [Інтэрв'ю] / Зап. А. Бржазоўскі // Работніца і сялянка. № 9.

1.4.

Шашков А. Рассказы / С бел. М., 1965.

1970. Шашков А. Цветы в окопах: [Апавяданне] / С бел. // Путь к победе. Мн.

1.5.

На англійскую мову. Inspired by life // Shamyakin I. Snowtime. M., 1973.

На іспанскую мову. Tierra en llamas // Linkov M. Dias inolvidables. M., 1975.

На рускую мову. На эпическом направлении: Подвиг народа в белорусском романе / Пер. З. Крахмальникова. М., 1969. Рэц.: Бочаров А. На главном направлении // Вопросы лит. 1970. № 7; Гніламёдаў У. З пазіцыі сведкі і ўдзельніка // ЛіМ. 1970. 10 сак.; Коваленко В. Главное направление — художественная правда // Неман. 1970. № 6; Севрук В. Героика партизанского эпоса // ЛГ. 1970. 18 февр.

Письмо с тракторного: [Верш] / Пер. П. Волкодаев // Сталин. молодежь. 1950. 6 авг.

1.6.

Вобраз-81. Мн., 1981 / Скл., рэд.

Вобраз-83. Мн., 1983 / Скл., рэд.

Вобраз-85. Мн., 1985 / Скл., рэд.

Вобраз-86. Мн., 1986 /Скл., рэд.

Вобраз-88. Мн., 1988 / Скл., рэд.

Вобраз-89. Мн., 1989 / Скл., рэд.

Вобраз-90. Мн., 1990 / Скл., рэд.

2.1.

На беларускай мове. Смыкава І. Нічыпар Пашкевіч // Смыкава І. Беларускія пісьменнікі-лаўрэаты (1941—1970 гг.): Рэкам. бібліягр. паказальнік. Мн., 1973.

2.3.

На беларускай мове. Аб прысуджэнні дзяржаўных прэмій БССР 1966 года // ЛіМ. 1966. 7 ліст.; Анісковіч У. Проза і крытыка: На «франтах» зацішша? // Там жа. 1979. 16 сак.; Асіпенка А. Дарога без прыпынкаў // Полымя. 1974. № 12; Бураўкін Г. Ён прыйшоў з вайны... // ЛіМ. 1974. 13 снеж.; Бур'ян Б. У даўгу перад чытачом: Літаратурная крытыка ў часопісе «Полымя» // Там жа. 1954. 14 жн.; Вярцінскі А., Стук А. Пафас, народжаны ў сэрцы // Віцеб. рабочы. 1974. 13 снеж.; З жыццёвых крыніц // Беларусь. 1974. № 12; Каваленка В. Галоўны напрамак — мастацкая праўда // Каваленка В. Прага духоўнасці. Мн., 1975; Яго ж. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі. Мн., 1977. С. 121—122; Кавалёў Д. Аб тым, што набалела // ЛіМ. 1953. 26 снеж.; Казека Я. Аповесць і яе крытыкі // ЛіМ. 1955. 30 ліп.; Капусцін А. Размова шчырая, зацікаўленая // Там жа. 1976. 27 лют.; Клышка А. Плён пісьменніцкага жыццяпісу // Звязда. 1974. 11 снеж.; Крытыка: Набыткі, задачы// ЛіМ. 1977. 21 студз.; Марчанка С. Дыялог, непадуладны забыццю // Полымя. 1984. № 12; Мехаў У. Урокі галоўнага // ЛіМ. 1984. 7 снеж.; Мушынскі М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. Мн., 1985. С. 281—282; Нічыпару Пашкевічу — 60 // ЛіМ. 1984. 7 снеж.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981. С. 272—273; Саенка В. Аналіз і прапановы // ЛіМ. 1979. 4 мая; Стварацъ летапіс сучаснасці // Там жа.

1980. 19 снеж.; Тамарын Н. Аб пачынаючых // Віцеб. рабочы. 1946. 24 сак.

На рускай мове. Овчаренко А. Н. Е. Пашкевичу — 50 лет // ЛГ. 1974. 18 дек.

ПАШКЕВІЧ ЯН КАЗІМІР

Пашкевіч Ян Казімір, беларускі паэт 1-й паловы 17 ст.

Біяграфічныя звесткі пра Я. К. Пашкевіча не захаваліся. Мяркуюць, што паходзіў з каталіцкай, верагодна, шляхецкай сям'і. Магчыма, быў родам з Ашмяншчыны, бо меў герб «Радван». Аўтар адзінага вядомага нам верша «Полска квітнет лациною...» (1612), які быў адшуканы цывільным віленскім губернатарам А. Сямёнавым і апублікаваны ім у віленскім календары «Месяцаслоў гаспадарчы на 1842 г.». У гэтым творы паэт адзначае выдатную ролю роднай мовы («русчызны») у грамадскім і культурным жыцці Вялікага княства Літоўскага, ганарыцца міжнароднай славай свайго народа і верыць у яго неўміручасць. Змест, паэтычная форма і мова верша сведчаць пра тое, што яго аўтар быў чалавекам свецкім, высокаадукаваным, патрыятычна настроеным беларускім шляхціцам (або мешчанінам). Рукапіс гэтага верша, які лічыцца ўзорам грамадска-палітычнай лірыкі 17 ст., захаваўся ў Слуцкім спісе Статута Вялікага княства Літоўскага 1529 (цяпер захоўваецца ў Нацыянальнай публічнай бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу). Там жа змешчана яшчэ пяць аўтографаў паэта, а таксама запісы іншых асоб, якія сведчаць, што рукапіс бытаваў у Вільні (там, напэўна, быў напісаны і сам верш). *А. Ф. Коршунаў, В. А. Чамярыцкі.*

Бібліяграфія

1.3.

1842. «Полска квитнет лациною...»: [Верш] // Месяцеслов хозяйственный. Вильна.

1959. «Полска квитнет лациною...»: [Верш] // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн.

1979. «Полска квитнет лациною...»: [Верш] // Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Гарэцкі М. Верш Пашкевіча // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920; 2 выд. Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 361—362; Грынчык М. З гісторыі беларускай сілабікі // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн., 1973. Вып. 1; Яго ж. Зараджэнне і развіццё беларускай сілабічнай паэзіі // Беларуская літаратура. Мн., 1977. Вып. 5; Яго ж. Шляхі беларускага вершаскладання. Мн., 1973. С. 48—50; Кісялёў Г. Як знайшлі верш // Кісялёў Г. Героі і музы. Мн., 1982; Ралько І. Беларускі верш: Старонкі гісторыі і тэорыі. Мн., 1969. С. 30.

На рускай мове. История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 223—224.

Т. М. Махнач.

ПАШКОЎ ГЕНАДЗЬ

Пашкоў Генадзь Пятровіч (н. 23.3.1948, в. Ліпавічы Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.), паэт, перакладчык. Член СП Беларусі з 1977. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1980, за кнігі паэзіі «Чырвоны жаваранак» і «Дыстанцыя небяспекі»).

Нарадзіўся ў сям'і служачых. Бацька, Пётр Трафімавіч, быў старшынёй калгаса, маці, Уклейка Марыя Харытонаўна, працавала настаўніцай (цяпер на пенсіі). У 1953 сям'я пераехала на Гродзеншчыну, у в. Войстам Смаргонскага р-на. Там Г. Пашкоў скончыў сярэднюю школу і ў 1966 паступіў на факультэт журналістыкі БДУ. У час летніх студэнцкіх канікул працаваў на будоўлі ў Казахстане. Пасля заканчэння універсітэта (1971) быў рэдактарам галоўнай рэдакцыі вяшчання для дзяцей і юнацтва Беларускага радыё. З 1972 у часопісе «Полымя»: спачатку літсупрацоўнік аддзелаў публіцыстыкі і нарыса, паэзіі, пасля загадчык рэдакцыі, з 1975 адказны сакратар, з 1979 намеснік галоўнага рэдактара. З 1989 інструктар ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ. З 1991 намеснік гал. рэдактара часопіса «Тэатральная Беларусь». Быў дэпутатам Фрунзенскага раённага Савета народных дэпутатаў. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Першыя вершы Г. Пашкова «Затаіліся лес і зямля...», «Імчаць нас да ракі...» надрукаваны ў 1967 у калектыўным зборніку «Натхненне». Аўтар кніг паэзіі «Кляновік», «Гравюры дарог», «Зямлю слухаю», «Маналог на кастрышчы», «Люблю, спадзяюся, жыву», кнігі выбраных твораў «Крокі». Творчасць Г. Пашкова вызначаецца грамадзянскай страснасцю, шырынёй паэтычных абсягаў — ад інтымнай лірыкі да касмічных прастораў і падзей міжнароднай значнасці. Асноўная ўвага паэта звернута да лёсу Радзімы, гісторыі свайго краю, гераічных і культурных традыцый беларускага народа. У яго вершах гучыць роздум над складанымі праблемамі часу, месцам чалавека ў жыцці і нялёгкімі ўзаемаадносінамі паміж людзьмі. Для ўвасаблення творчай задумы ён знаходзіць разнастайныя жанрава-кампазіцыйныя формы, вобразныя і рытміка-інтанацыйныя прыёмы і сродкі. Выдаў кнігу нарысаў «Будзень як свята». Па сцэнарыі Г. Пашкова «Я так люблю зямлю...» у 1978 пастаўлены фільм. На беларускую мову пераклаў асобныя творы азербайджанскіх, армянскіх, латышскіх, рускіх, таджыкскіх, украінскіх паэтаў.

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.1.

Крокі: Вершы, паэма. Мн., 1988. (Б-ка бел. паэзіі).

1.2.

Кляновік: Вершы. Мн., 1975. (Першая кніга паэта). Рэц.: Хведаровіч М. Першаквецень паэта // Беларусь. 1975. № 11.

Будзень як свята: Нарысы. Мн., 1977. Рэц.: Говин С. Будни и праздники // Знамя юности. 1977. 16 дек.

Дыстанцыя небяспекі: Лірыка. Мн., 1979. Рэц.: Губернатараў М. Маладая нястрымная плынь // Маладосць. 1980. № 1; Камейша К. Калі ёсць пошук // ЛіМ. 1979. 20 ліп.; Марціновіч А. На вачах часу і сумлення // Чырв. змена. 1979. 17 ліп.; Хвалей Я. Жаваранак маладой трывогі // Беларусь. 1979. № 8.

Гравюры дарог: Лірыка. Мн., 1981. Рэц.: Хвалей Я. Жаваранак маладой трывогі // Маладосць. 1982. № 1.

Зямлю слухаю: Лірыка. Мн., 1983. Рэц.: Марціновіч А. Без заспакоенасці // Маладосць. 1984. № 4.

Дзяўчынка з блакітным мячыкам: Кніга паэзіі. Мн., 1986.

Маналог на кастрышчы: Кніга вершаў. Мн., 1986.

Люблю, спадзяюся, жыву: Лірыка. Мн., 1990.

Пціч: Вершы. Мн., 1992.

1.3.

1967. «Затаіліся лес і зямля...»; «Імчаць нас да ракі...»: [Вершы] // Натхненне. Мн.

1969. «І не так ужо...»: [Верш] // ЛіМ. 1 жн.

1971. Млын: [Верш] // Універсітэт паэтычны. Мн.

1972. [Рэц. на кн.: Міськo П. Зямля ў нас такая. Мн., 1971] // Неман. № 8; Абнаўленне: [Верш] // Чырв. змена. 10 снеж.

1973. Бульдазерыст: [Нарыс] // Кім быць? Мн.; Лірыка: «Зямля...»; «Пад Новы год завеі калядуюць...»; «За скрыжаваннем пуцявін...»; «Маладзічок...»; Зазімак; Верасень: [Вершы] // Полымя. № 1; Пачатак: [Верш] // Там жа. № 5; На перавале: Нарыс // Там жа. № 7.

1974. Светаяннік: [Верш] // Дзень паэзіі — 74. Мн.; Дома; «Вуліца начная...»; «Сусед мой кожны дзень на небе...»; Вясна: [Вершы] // Маладосць. № 11; Бацька;

«Задумліва прыціхлі хаты...»; «Аслепіць інеем...»; Светаяннік; «Сцяжынак прамураўленыя ніці...»; На партызанскім котлішчы; Соль; Лазня; Паром: [Вершы] // Полымя. № 4; Спадчына; «Шырэй...»; «У лёсу я не прашу спагады...»; «Разведаў...»; «Сахаты ў стоме...»; У госці да Чапаева; «Стыне ў ядраных кроплях расы...»; Украіна; Бярозка маёй Радзімы; «Ты паспрабуй адчуй мяне...»: [Вершы] // Там жа. № 10; Спадчына: [Верш] // Гроднен. правда. 18 окт.

1975. Бараўляне; Трамвай: [Вершы] // Беларусь. № 2; Спелае лета: [Верш] // Там жа. № 7; Слова: [Верш] // Там жа. № 11; Дарога трывожнай памяці // Бярозка. № 8; За восеньскай Лошыцай: Нарыс // Полымя. № 6; Спадчына [Верш] // Вяч. Мінск. 6 ліст.; Бацька; Светаяннік; «Зямля мая...»: [Вершы] // Голас Радзімы. № 31; Сэрца; «Я сустракаю сонца з напамінку...»: [Вершы] // Знамя юности. 4 сент.; Дзень добры, Масква // ЛіМ. 17 студз.; «Зямля мая...»; «Сагрэй дыханнем, сакавік...»; Укропенка; «Разведаў...»: [Вершы] // Там жа. 14 сак.; Парой сталасці мудрай // Там жа. 28 ліст.; Следам лета: [Верш] // Ніва. 17 жн.; Дзень малады; «Скрозь постаці...»: [Вершы] // Чырв. змена. 7 кастр.

1976. Перад партрэтам Ільіча: [Верш] // Полымя. № 2; Чырвоны жаваранак: [Вершы] // Там жа. № 7; Яравое калоссе: «Апякло мяне белым пажарам...»; Паводка; Навальніца; Высакагор'е: [Вершы] // ЛіМ. 10 снеж.

1977. Аэрадром; «Дрымотнага зацішку зона...»; Навальнічнае сонца; «Спешны час...»; Імгненне: [Вершы] // Беларусь. № 8; Крокі; Трывога; Журавіны ў шэрані: [Вершы] // Полымя. № 9; «Вечар сіверны, сіні...»: [Верш] // Голас Радзімы. 6 студз.; Адно пытанне: [Інтэрв'ю] // ЛіМ. 14 студз.; У адказ на клопаты // Там жа. 15 ліп.

1978. «Зямля, дзядоў маіх зямля...»: [Верш] // Адданасць. Мн.; Памяць чырвоных жаваранкаў: [Балада] // Беларуская балада. Мн.; На ласіных картах: Паэма // Полымя. № 11; Голас пушчы: Урывак з паэмы // Родная прырода. № 5; Разам з партыяй, разам з народам // ЛіМ. 28 крас.; Бацькоўская зямля: [Верш] // Там жа. 29 снеж.

1979. Беларусі: [Верш] // Полымя. № 1; Часопісы ў 1979-м // ЛіМ. 12 студз.; Дарогі праз сэрца: [Верш] // Там жа. 29 чэрв.; «Ці сінню ласкавай...»: [Верш] // Там жа. 2 ліст.

1980. Міжземнаморскія вёрсты: «Палахлівая ноч...»; Вясёлка над ракою По; Прабач, Неапаль: [Вершы] // Дзень паэзіі — 80. Мн.; «Зямля, дзядоў маіх зямля...»: [Верш] // Такія сэрцы ў нас. Мн.; Молада і завірушна; «Кадзілы бегуновыя балот...»; Нафтавая вахта ў Сібіры; Камсамольская песня; «Я разгубіўся ад такой прасторы!..»; «Юная... Юная!..»; Прадмесце Рыма: [Вершы] // Беларусь. № 9; «Старана мая лясная...»; Цішыня; «Лаўлю пазыўныя касмічных палёў...»; «З пясчанай кручы вярблюды...»; «Вяснеюць вачэй азёры...»; «Была ты такою маленькай...»; Жыццё; Я — яршысты: [Вершы] // Маладосць. № 5; Дзяўчынка з блакітным мячыкам: [Паэма] // Полымя. № 10. Рэц.: Аўруцін А. Усё зямным жыццём жыло // ЛіМ. 1981. 13 лют.; Бацькаўшчыне: [Верш] // Голас Радзімы. 2 кастр.; Ягонай песні не памерці... // ЛіМ. 28 сак.; Сібірскі мерыдыян: [Нарыс] // Там жа. 6 чэрв.: Петрусю Броўку: [Верш] // Там жа. 27 чэрв.; З кнігі «Гравюры дарог»: [Вершы] // Там жа. 12 вер.

1981. Сасна на выспе; «Даследавалі вучоныя...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 81. Мн.; Аснежыцы: [Верш] // Сучаснік. Мн.; Полымя. № 1; Шчасце быць песняром // Беларусь. № 4; Ляўкі; «Пульсуе вешчы запавет...»; «Імгненная юнацтва прыгажосць...»; «Крылаты катэр, пенна ўзмылены...»: [Вершы] // Там жа. № 10; Песня Праметэям // Там жа. № 11; Неапаль без сонца: [Верш] // Вожык. № 7; Радзіма: [Верш] // Там жа. № 20; Рыбалка; У лесе: [Вершы] // Вясёлка. № 11; «Мой век трывожны...»; У дарогу!; «Па-над Палессем верталёт...»; «Так ядрана...»; Хата; «Ажно звініць бруя...»: [Вершы] // Маладосць. № 4; Нурэк; Мінск. 14 крас.; Жураўліная пошта Максіма: [Верш] // ЛіМ. 4 снеж.

1982. Ляўкі; Купалаўскія гаі: [Вершы] // Дзень паэзіі — 82. Мн.; «Казахскі стэп, вятроў палынных край...»; Каракумскі канал: [Вершы] // На сцягу і ў сэрцы. Мн.; Купалаўскія гаі: [Верш] // Беларусь. № 7; «Мерайцеся, людзі, на лясы...»; З нас кожны мае...; «Ледзяное мора на Таймыры...»; Пераймаем грамы!; «Нешта песні сталі грамавыя...»; Навука слоў; Перад пераправай; Свята праталін; «Ты сказаў...»; Таёжны пасёлак; Пад сузор'ем строгі; «Як колас жытны ніва поіць...»: [Вершы] // Маладосць. № 12; Агні ў барханах: Нарыс // Полымя. № 9; Летапісец гераічнай явы // Работніца і сялянка. № 12; Жыву радзімы запаветам; «Млее спелае лета...» : [Вершы] // Родная прырода. № 6; Каракумскі канал: [Верш] // Звязда. 3 крас.; Арыенцір на сучаснасць // Там жа. 14 кастр.; Праменні дзён яго: Да 50-годдзя з дня нараджэння Генадзя Кляўко // ЛіМ. 30 крас.; Зялёная гравітацыя: Украінская песня; «Адкрычалі сваё перапёлкі...»; «Гушкаецца быццам...»; «Пад скляпеннем замшэлым...»; Прыгарадны лес; «Круцяць гадзіннікі час...»: [Вершы] // Там жа. 26 ліст.; Рыбалка; У лесе: [Вершы] // Ніва. 5 вер.; Сверяя с жизнью шаг // Сов. Бел. 28 дек.

1983. Марфін карабель: [Верш] // Дзень паэзіі — 83. Мн.; Перад партрэтам Ільіча; «Маладой і гарачай парой...»; [Вершы] // Заўсёды з Леніным. Мн.; Юнацтва; Лірычная раніца; Гарсія Лорка; Начная зорка; «Мы напачатку...»; «Ну, што ж і я пісаць пачаў...»; «За чаркаю ўсе мы...»: [Вершы] // Беларусь. № 7; Жывая повязь: [Успаміны] // Там жа. № 11; На сценах Калізея: [Верш] // Вожык. № 2; «Лясныя пагоркі...»; Дарога дадому; Маё неба; Дом Маякоўскага паблізу Кутаісі; Партрэт Скарыны ў Падуі; Сенакос; «Нібы ў шторме надзеі маяк...»; Неспазнаная песня; Маладая воля: [Вершы] // Маладосць. № 7; Легенда Прыпяці: Паляўнічае апавяданне // Родная прырода. № 5; Партрэт Скарыны ў Падуі; Сенакос: [Вершы] // Голас Радзімы. 11 жн.; Збалелых палёў васілёк (П. Панчанку); «Як ёсць цяпер...»; «Гартаючы аджылае лісце...»; Рукам малюся хлебадарным; Капаткевічы; Паўстанак; «Калі аплывае барвяны касцёр...»; Венерын чаравічак; «Вось і ўсё, адшумела лісце...»; «Верасовыя дасвецці...»: [Вершы] // ЛіМ. 18 сак.; Працуе на будучыню, працуе на камунізм // Там жа. 30 вер.

1984. Добраахвотнікі ў пекла; Снежная карта: [Вершы] // Дзень паэзіі — 84. Мн.; Пачатак: [Верш] // За цябе, Радзіма. Мн.; Па праву жывога: [Верш] // Маладосць. № 7; Імем барыкад; «Што пражыта...»; «Адшумела пара снегавая...»; «Адчуваю і чую радзей...»; «Пакуль першая смуга...»; «Адхмялеў, адбуяў медастой...»; «Глабальныя праблемы адгулі...»: [Вершы] // Там жа. № 9; Свае справы, сумленне сваё мы па ёй вывяраем і мераем // ЛіМ. 2 ліст.

1985. Мумін Канаат // Братэрства. Мн.; Мой век трывожны; Неапаль без сонца: [Вершы] // Воляй азорыцца свет. Мн.; Пачатак: [Верш]; З паэмы «Трывога» // Партызаны, партызаны... Мн.; Молада і завірушна: [Верш] // Твой зорны час. Мн.; «Я ўсім сэрцам вітаю...»; Скрыжалі Ленінграда; «Мы спасцігалі космас спакваля...»; «Усё пройдзе...»: [Вершы] // Маладосць. № 7; Формула шчасця // Звязда. 1 мая: Чалавек і стыхія; Гудзевічы: май, туман ад бэзу; «Над палямі сонца расцяклося...»; Начное акно Івана Шамякіна; Я рыбаком быў у арцелі; «Мітусімся...»: [Вершы] // ЛіМ. 1 лют.; Мой род — народ вялікі; Над глухатой, над мітуснёй, над страхам; Човен; Белая просека слоў над мітуснёй, над страхам; Човен; Белая просека слоў; Гушчарнікі і светлыя паляны...»: [Вершы] // Там жа. 29 ліст.

1.4.

1975. Ліхадзед М. «Я педалі круціў...»; «Песняй раніцу...»; «Як сіні выбух...»; «Яшчэ адну вясну пачаць...»: [Вершы] / З укр. // Украінская савецкая паэзія. Мн. Т. 2; Нуры З. Голас здалёку: [Верш] / З тат. // ЛіМ. 28 сак.; Ліхадзед М. Трое: [Верш] / З укр. // Сел. газ. 29 июня.

1977. Сцепанюк Б. У квітнёвым праменні: [Верш] / З укр. // Сцепанюк Б. Матчына слова. Мн.

1981. Герасіменка Ю. «Што там у хлопца?..»: [Верш] / З укр. // ЛіМ. 23 студз.

1982. Твардоўскі А. Слова пра зямлю; Кавалёў Д. Я праязджаю міма ўсё...; Шасцінскі А. Маме — сорак, а мне — трынаццаць; Рубцоў М. Бя-

ровы; Дмітрыеў М. «Я іду парою меданоснай...»: [Вершы] / З рус. // Беларусь. № 2; Абашыдзе І. Мігабо вечнасць / З груз.; Сафараў Р. На Нафтавых Камянях; Аліеў Ф. Ад Шамхора да Берліна; Гаджа Ф. У Бакінскім порце / З азерб.; Даўцян В. Арарацкая даліна; Эмін Г. «Час мінае. За годам-год...»; Парсамян А. «Калі мучаюць людзі мяне...» / З арм.: [Вершы] // Там жа. № 10; Абакіраў Б. На гэтай зямлі: [Верш] / З кірг. // ЛіМ. 31 снеж.

1983. Маякоўскі У. Вясновае пытанне: [Верш] / З рус. // ЛіМ. 22 ліп.

1984. Пурвс З. Трыадзінства; «Жыццё пякучае, як раніца...»; «Які твой час?..»; Радзіма; Хлеб; 1905; «Як бродзіць зямля...»; «О, жыццё маё, як вечка...»; «Не, любоў не выпраўляе нас...»; «Водсвет зарніцаў калінавы...»; «Разводдзе ночы. Суму боль...»; «Хоць адну квяцінку падары...»: [Вершы] / З лат. // Латышская савецкая паэзія. Мн. Т. 1; Воранаў Ю. На вуліцы Росі; Трое; «Непазбытны...»; Турыст; Белыя ночы; «Як раней...»: [Вершы] / З рус. // ЛіМ. 7 вер.; Дзмітрыеў М. «Я іду парою меданоснай...»; «Ціха кружыцца зорная сфера...»; Пісьмо маладога настаўніка: [Вершы] / З рус. // Чырв. змена. 2 вер.

1985. Канаат М. Галасы Сталінграда: Раздзелы з паэмы / З тадж. // Братэрства. Мн.; Шугай А. «Запомні...»; «Як шкарлупінне — скрозь снягі...»: [Вершы] / З укр. // Маладосць. № 12; Воранаў Ю. З пісьмаў на Вялікую зямлю: [Верш] / З рус. // Полымя. № 9; Яго ж. Брацкая магіла: [Верш] // З рус. // ЛіМ. 20 вер.

1.5.

На англійскую мову. Verse/Transl. V. Rich // J. of Byelorus. Studies. 1976. Nr 4.

На балгарскую мову. Земя: [Верш] / Прев. Н. Вълчев / Пулс. 1975. 23 септ.

На літоўскую мову. «Smalingas dūmas...» / Vert. V. Baltuškevicius // Kauno tiesa. 1975. Kovo. 21; Lit. ir menas. 1975. Kovo. 22.

На рускую мову. Красный жаворонок: Стихи / Пер. И. Бурсов. М., 1977. (Молодые голоса). Рэц.: Есютин И. Притяжение солнца // Во славу Родины. 1977. 14 сент.; Фёдараў І. Кнігапіс // ЛіМ. 1977. 9 вер.; Янішчыц Я. Скрозь «экран прателіны» // Вяч. Мінск. 1978, 1 жн.

Кредо; Гроза: [Вершы] / Пер. О. Скляр // Комсомолец Туркменистана. 1975. 23 сент.; «Земля, край ласки и тепла...»; Отец; «Где поднялись хлеба по грудь...»; Светоянник; «Погаснет в глазах...»; «Сосед мой...»: [Вершы] / Пер. И. Бурсов // Родники. М., 1976. Вып. 4; Колосья жизни: [Вершы] / Пер. В. Спринчан, И. Бурсов // Неман. 1977. № 8; Дистанция опасности: Баллада / Пер. И. Бурсов // Истоки. М., 1978; Возвращаются обратно мои пути: [Верш] / Пер. В. Коломиец // Созвездие. К., 1978. Вып. 12; Вечер сиверкий, синий...: [Верш] / Пер. И. Василевский // Извечной песни голоса. Мн., 1980; Весна; Последний снег: [Вершы] / Пер. А. Сизов // Студен. меридиан. 1980. № 4; В витрине отражалось небо...; Отчий край; Журавлиная пора; Диалог: [Вершы]; Дистанция опасности: (Баллада) / Пер. И. Бурсов // Слово по кругу. Мн., 1981; «Краны. Костры. Котлованы...»; «Обожгло меня белым пожаром...»; «Морозно. Лубенеют лозняки...»; Родство; Дома: [Вершы] / Пер. В. Липневич и др. // Комс. правда. 1981. 18 апр.; Последний снег: [Верш] / Пер. А. Сизов // Сов. Клайпеда. 1981. 29 марта; «Сторона моя лесная...»: [Верш] / Пер. Г. Морозов // Аврора. 1982. № 12; Революция — гордое слово; «Краны. Костры. Котлованы...»; «Обожгло меня белым пожаром...»: [Вершы] / Пер. В. Липневич // Сов. Бел. 1982. 25 марта; «Сторона моя лесная...»; «Отшумела листва, как ветра...»; Полесское половодье: [Вершы] / Пер. Г. Морозов // Беларусь моя. Л., 1983; Отец: [Верш] / Пер. И. Бурсов // Шел отец... М., 1985.

На таджыкскую мову. Рузи нав: [Верш] // Тарч. З. Абдулло // Комсомоли Точикистон. 1976. 24 нояб. / Пад прозв. Р. Пашкоў. Аўт. спрэчнае.

На туркменскую мову. Гуран жай хакында балада: [Верш] // Яш коммунист. 1977. 25 июнь.

На ўкраінскую мову. «Якось несміло пісня мене...»; «Завії із вітрами колядують...»: [Вершы] / Пер. Я. Ярош // Молодь України. 1975. 19 черв.; «Я думаю, стрічаючи світанок...» / Пер. В. Моруга // Дніпро. 1976. № 6; Джерела: [Верш] // Пер. М. Шевченко // Комсомолець Полтавщини. 1976. 14 груд.; «Моіх борів синьобородий дим...»: [Верш] / Пер. М. Шевченко // Дніпро. 1977. № 7; «Вертаються навспак моі шляхи...»: [Верш] / Пер. В. Коломієць // Сузір'я. К., 1978. Вип. 12; Серце: [Верш] / Пер. В. Моруга // Молодь України. 1978. 29 квіт.; «Лісовий мій любий краю...»; «Була ти тонка, як билина...»: [Вершы] // Пер. С. Пінчук // Дніпро. 1980. № 10; Укропенка: [Верш] / Пер. Ю. Герасименко // Ленін. зміна. 1980. 23 серп.; «Вертаються новспак моі шляхи...»: [Верш] / Пер. В. Коломієць // Дніпро. 1983. № 10.

2.3.

На беларускай мове. Арочка М. Пламенне і дым: Нататкі пра паэмы маладых // Полымя. 1980. № 9; Бондар Т. «Толькі б мне спявалася аб родным...» // ЛіМ. 1981. 7 жн.; Вішнеўскі І. Галоўны кірунак — грамадзянскасць // Там жа. 1976. 26 ліст.; Лойка А. Уваходзіны // Там жа. 1976. 31 снеж.; Марцінавіч А. Скласці б мне такую песню... // Мін. праўда. 1981. 15 вер.; Нікіфаровіч В. Пачатак ёсць... Што далей?: Агляд // Там жа. 1975. 4 ліп.; Народнае свята: Рэпартаж // Там жа. 1977. 14 кастр.; Панчанка П. Звонкі і чысты голас // Панчанка П. Зб. тв.: У 4 т. Мн. Т. 4; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн. 1981; Пісьмянкоў А. З думкай пра чытача // ЛіМ. 1981. 30 студз.; Скапа У. Змаганне за само жыццё // Віцеб. рабочы. 1981. 29 мая.

На рускай мове. Мартинович А. Судьба и песня // Знамя юности. 1981. 18 дек.

Г. І. Рэут.

ПЕЛЬГРЫМОЎСКІ ГАЛЬЯШ

Пельгрымоўскі (Пільгрымовіус) Гальяш (?—1604), грамадскі дзеяч, паэт, мемуарыст. Пісаў на польскай, старабеларускай і лацінскай мовах.

Нарадзіўся на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Вучыўся, верагодна, у кальвінскай школе, дзе атрымаў веды па старажытнай гісторыі, вывучыў лацінскую мову. Служыў каралеўскім сакратаром пры Стэфане Баторыі. Браў удзел у Лівонскай вайне, у тым ліку ў рэйдзе злучаных беларуска-літоўскіх войск на чале з Крыштафам Радзівілам і Філонам Кмітам у 1581. 24.6.1583 па дару-

чэнні Стэфана Баторыя прыбыў у Маскву да Івана IV Грозінага з лістом і дарамі. З 1586 пісар Вялікага княства Літоўскага. У 1588 садзейнічаў прыняццю прысягі каралю насельніцтвам Вялікага княства Літоўскага. Тады ж выконваў абавязкі каралеўскага камісара ў Лівоніі, куды быў пасланы з місіяй прывядзення жыхароў да прысягі Жыгімонту III (спроба аказалася няўдалай). У 1597 быў паслом ад Ашмянскага павета на Слонімскі шляхецкі з'езд, дзе абраны маршалкам, а пасля — на вальны сейм. Тады ж уваходзіў у склад камісіі па ўстанаўленні граніцы Курляндыі з Браслаўскім паветам. У ліпені 1599 стаў членам каралеўскай камісіі па арганізацыі ў Лівоніі польскай адміністрацыі. Увосень 1600 прызначаны сакратаром пасольства ў Маскву на чале з Львом Сапегам, якое было накіравана да Барыса Гадунова дзеля мірных перагавораў. Разам з рускімі дзякамі рыхтаваў і 11.3.1601 падпісаў заключны акт перагавораў, што скончыліся перамір'ем на 20 год. Падчас пасольства вёў штодзённыя запісы і ў 1603, па даручэнні Льва Сапегі, сабраў іх у дыярыуш (пісаны спярша прозай, а потым вершам), часткова апублікаваны ў 1846 у Гродне пад назвай «Пасольства Льва Сапегі ў 1600 годзе ў Маскву паводле дыярыуша Гальяша Пельгрымоўскага, сакратара пасольства, з рукапісу, выпадкова знойдзенага, Уладзіславам Трэмбіцкім апісанае» (вершаваны тэкст апублікаваны са скарачэннямі А. Брукнерам у 1896, арыгінал захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Польскай акадэміі навук у Кракаве). Апрача апісання падарожжа, у дыярыушы занатаваны ход перагавораў, прамовы паслоў, дыпламатычныя ноты і адказы на іх; частка тэкстаў (праект дагавора паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, пералік падарункаў кіраўнікоў дэлегацыі рускаму цару і царэвічу) напісана па-беларуску. У студзені 1602 Г. Пельгрымоўскі браў удзел у перагаворах з рускім пасольствам у Вільні.

Г. Пельгрымоўскі досыць плённа займаўся літаратурнай дзейнасцю. У 1583 ён апублікаваў ў Кракаве панегірык («Панегірычная апастрафа») у гонар гетманаў Мікалая і Крыштафа Радзівілаў. У 1585 выйшла яго «Кніга пра герояў Царквы Божай» з прысвячэннем Стэфану Баторыю, дзе часткова прозай, а часткова вершам выкладзены 36 жыццяпісаў старазапаветных павадыроў, суддзяў і цароў. У 1586 апублікаваны панегірык падскарбію Тэадору Скуміну Тышкевічу, а таксама панегірык на шлюб Альбрыхта Радзівіла з курляндскай князёўнай Ганнай. Г. Пельгрымоўскі — аўтар паэмы «Гутарка аднаго паляка з маскалём у Маскоўскім замку ў годзе 1601», напісанай на беларускай і польскай мовах (рукапіс зберагаецца ў Публічнай б-цы Рачынскіх у Познані, Польшча). Героі паэмы — прадстаўнік літоўскага пасольства Іван і рускі баярын Ігнат — дыскутуюць па праблемах, часткова звязаных з дыпламатычнай місіяй, прычым у іх дыялогах раскрываецца цэлая сістэма поглядаў на міжнароднае становішча, пытанні рэлігіі, веры і інш. Г. Пельгрымоўскаму прыпісваецца аўтарства дыялога аб Лівонскай вайне «Філапатр — да сената і народа літоўскага», напісанага вершам на лацінскай і польскай мовах, а таксама «Дыялога літоўскага шляхціца... са святаром маскоўскім», выдадзенага ў 1594 у Вільні пад псеўданімам Філалетэс (аўтарства Г. Пельгрымоўскага аспрэчваецца).

А. А. Мельнікаў.

Бібліяграфія

1.2.

Panegyrica Apostrophe. Cracoviae, 1583.

De heroibus in Dei Ecclesia. Cracoviae, 1585.

Epistola... Vilnae, 1586.

Dyalog litewskiego szlachcica prawdziwy woyny inflatsciey Króla... Stefana... z Księdzem Moskiewskim od początku do końca krótko zebrany. Wilno, 1594 / Пад псеўд. E. P. Philalethes. Аўт. спрэчнае.

Philopatris ad senatum populumque Lithuanum. S. l. 1597 / Аўт. спрэчнае.

Diariusz poselstwa Lwa Sapiehy do Borysa Godunowa w 1600: Fragment dochowany i ogłoszony W. Trębickim pt. «Poselstwo L. Sapiehy w 1600 do Moskwy». Grodno, 1845.

Poselstwa Lwa Sapiehy w Moskwie. 1600. Lwów, 1927.

1.3.

1846. Poselstwo Lwa Sapiehy w roku 1600 do Moskwy, podług dyaryusza Eliasza Pielgrzymowskiego sekretarza poselstwa // Ondyna Druskienickich zródeł. Z. 6.

1896. Deputacja L. Sapiehy w 1600 r. do Moskwy // Brückner A. Zródła do dziejów literatury i oświaty polskiej: Wiersze historyczne. Warszawa. T. 1.

А. А. Мельнікаў.

ПЕРКІН НАВУМ

Перкін Навум Саламонавіч [2(15).2.1912, м. Тураў Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Жыткавіцкі р-н Гомельскай вобл.— 2.10.1976, Мінск, пахаваны на Усходніх могілках], літаратуразнавец, крытык, празаік. Член СП Беларусі з 1954. Доктар філалагічных навук (1964), прафесар (1965). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа (1980; за ўдзел у 2-томным даследаванні «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры»). Пісаў на беларускай і рускай мовах.

Нарадзіўся ў сям'і саматужніка. У 1928 паступіў у Гомельскае педвучылішча, але з 2-га курса вымушаны быў пайсці працаваць настаўнікам сельскай школы. Летам 1931 пераехаў у Мінск і паступіў рабочым на абутковую фабрыку, адначасова хадзіў у вячэрнюю школу. У 1932 прыняты на вячэрняе аддзяленне Мінскага пединстытута. Вучобу спалучаў з работай на фабрыцы, затым у БелТА у якасці літсупрацоўніка, загадчыка прамысловага сектара. Пасля заканчэння пединстытута (1936) некаторы час працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў Полацкім педвучылішчы. У 1936—37 на ваеннай службе. Пасля дэмабілізацыі працаваў настаўнікам пры Мінскім пединстытуце. У чэрвені 1941 накіраваны на фронт. Камандаваў узводам, трапіў у акружэнне. Звязаўшыся з партызанамі ў Бранскіх лясах, стаў байцом, затым камандзірам узвода, начальнікам штаба атрада Рагнедзінскай партызанскай брыгады. У верасні 1943 брыгада злучылася з Савецкай Арміяй. Скончыўшы курсы пры Вышэйшай афіцэрскай школе, да канца вайны камандаваў артбатарэяй, прымаў удзел у баявых аперацыях, быў двойчы паранены. Дэмабілізаваўся ў снежні 1945. Са студзеня 1946 да апошніх дзён свайго жыцця працаваў у Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы АН БССР — навуковым супрацоўнікам, загадчыкам сектара ўзаемасувязей літаратур, у 1963—76 загадчыкам сектара тэорыі літаратуры. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Першая публікацыя Н. Перкіна ў рэспубліканскім друку датуецца 1935. Як літаратуразнавец пачаў выступаць у 1946. Яго шматлікія працы прысвечаны важным тэарэтычным пытанням беларускай літаратуры («Шляхі развіцця беларускай савецкай літаратуры 20—30-х гг.: Праблемы сацыялістычнага рэалізму»), творчасці асобных беларускіх пісьменнікаў («Аркадзь Куляшоў: Паэтычная творчасць», «Творчасць Петруся Броўкі», «Пятро Глебка»). Пад яго кіраўніцтвам праводзілася даследаванне ўзаемасувязей беларускай літаратуры з рускай, украінскай, польскай, балгарскай, чэшскай і інш. літаратурамі. У сваёй даследчыцкай дзейнасці спалучаў выкарыстанне дэталёвага, фактаграфічнага матэрыялу з асвятленнем агульных заканамернасцей працэсу станаўлення і развіцця беларускай літаратуры ва ўмовах міжнацыянальных сувязей («У сям'і брацкіх літаратур»). Навуковыя інтарэсы Н. Перкіна былі цесна звязаны з актуальнымі праблемамі жыцця, асабліва з пытаннямі развіцця нацыянальнай культуры («Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў літаратуры»). Яго кніга «Чалавек у савецкім рамане» выяўляе глыбокі погляд аўтара на гісторыю шматнацыянальнай савецкай літаратуры, павагу да яе лепшых традыцый, уменне шмат у чым па-новаму асэнсаваць класічную спадчыну і плён пошукаў сучасных пісьменнікаў, працэс развіцця рамана ў савецкую эпоху. Па складу свайго мыслення Н. Перкін быў вучоным-тэарэтыкам. Яго працы ў асноўным тэарэтычныя і ў значнай меры наватарскія. У іх абагульнены вялікі мастацкі вопыт беларускай і ўсесаюзнай літаратур, многія з'явы разглядаюцца ў дыялектычнай сувязі і прычынных суадносінах са з'явамі гісторыі, філасофіі, псіхалогіі, сацыялогіі. Ён адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1), «Гісторыі савецкай шматнацыянальнай літаратуры» (т. 1—2; кн. 1), падручніка «Беларуская савецкая літаратура» для 9—10-га кл. (разам з Ю. Пшыркоўым). Апублікаваў выразна аўтабіяграфічную аповесць «Хлопчык з мястэчка». Кніга «Я стаў партызанам» у значнай ступені таксама аўтабіяграфічная.

Імем Н. Перкіна названа вуліца ў Тураве.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.
Творчество Аркадия Кулешова: Автореф. дис... канд. филол. н. Мн., 1950.

Аркадзь Куляшоў: Паэтычная творчасць. Мн., 1951. Рэц.: Бур'ян Б. Навокал паэтычных твораў // Полымя. 1953. № 7.

Творчасць Петруся Броўкі: (Крытычны нарыс). Мн., 1952. Рэц.: Бур'ян Б. Навокал паэтычных твораў // Полымя. 1953. № 7; Шарахоўскі Я. / Звязда. 1952. 12 снеж.; Шкраба Р. Критик и поэт. Заметки о монографиях // Сталин. молодежь. 1953. 26 авг.; Шчарбатаў Г. З пазіцый халоднага акадэмізма / ЛіМ. 1952. 13 снеж.

Пятро Глебка. Мн., 1955.

Асноўныя асаблівасці развіцця сучаснай беларускай літаратуры. Мн., 1958 / Сааўт. В. Івашын.

Беларуская савецкая літаратура: Падручнік для IX—X класаў сярэд. школы. Мн., 1959 / Сааўт. Ю. Пшыркоў. Рэц.: Александровіч С. Новыя падручнікі па беларускай літаратуры // Полымя. 1959. № 10; Каваленка В. Якасці, якіх раней не было // ЛіМ. 1959. 7 кастр.; Наст. газ. 1959. 16 кастр.; 2 выд. Мн., 1960. Рэц.: Пятровіч М. Два падручнікі // Нар. асвета. 1960. № 3; 3 выд. Мн., 1962; 4 выд. Мн., 1964; 5 выд. Мн., 1965; 6 выд. Мн., 1966; 7 выд. Мн., 1967; 8 выд. Мн., 1968; 9 выд. Мн., 1969.

Шляхі развіцця беларускай савецкай літаратуры 20—30-х гг.: Праблемы сацыялістычнага рэалізма. Мн., 1960. Рэц.: Барсток М. Праблемнае даследаванне // Полымя. 1961. № 3; Коваленко В. Книга литературоведа // Неман. 1961. № 5.

Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў XIX ст. Мн., 1963 / Сааўт. А. Лойка. Рэц.: Мальдзіс А. У сям'і славянскіх літаратур // Полымя. 1963. № 9; Wróblewski M. // Sl. Orient. 1964. Nr 2.

В семье братских литератур. Мн., 1967. Рэц.: Бечык В. У братняй садружнасці // ЛіМ. 1967. 21 ліст.; Коваленко В. О поэзии и мужестве духа // Дружба народов. 1968. № 9; Суровцев Ю. Закономерности и «параллели» // Вопр. лит. 1968. № 8.

Беларуская савецкая літаратура. Мн., 1970 / Сааўт. Ю. Пшыркоў; 2 выд. Мн., 1971; 3 выд. Мн., 1972; 4 выд. Мн., 1973.

Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў літаратуры: Вопыт тэарэтычнага даследавання. Мн., 1971. Рэц.: Бармічаў В. Літаратура шматнацыянальная і адзіная // Мін. праўда. 1972. 19 крас.; Гольберг М. // Вопр. лит. 1972. № 8.

Человек в советском романе: Некоторые аспекты проблемы. Мн., 1975. Рэц.: Хайлов А. // Лит. обозрение. 1976. № 2; Юрэвіч У. Звернута да чалавека // Полымя. 1977. № 1.

Абсягі думкі: Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1980. Рэц.: Гольберг М. // Неман. 1981. № 12; Кенька М. Абсягі яго душы // ЛіМ. 1981. 5 чэрв.

Мальчик из местечка: Повесть. Мн., 1981. Рэц.: Сомаў З. Кнігапіс // ЛіМ. 1981. 20 ліст.

Я стал партизаном: Повести, рассказы. Мн., 1982. 1.3.

1935. За что мы любим Янку Купалу // Рабочий. 11 дек.

1946. Аб вывучэнні тэорыі літаратуры ў школе // У дапамогу настаўніку. № 3; Паэзія і жыццё // ЛіМ. 30 кастр.; «За тых, хто ў моры» // Там жа. 27 ліст.; Пясняр народнай барацьбы // Там жа. 30 ліст.; Зм. Бядуля: Да пяцігоддзя з дня смерці // Сав. селянін. 28 ліст.; Поэма Веры Инбер «Пулковский меридиан» // Сов. Бел. 21 июля; Повесть о советской женщине // Сталин. молодежь. 8 марта; Якуб Колас — лауреат Сталинской премии // Там жа. 7 июля; Два капитана // Там жа. 25 авг.

1947. Адам Міцкевіч і Ян Чачот // Беларусь. № 8. Рэц.: Барысенка В. Супроць нізкапаклонства перад буржуазнай культурай // Полымя. 1948. № 4; Гальперин В. О пережитках буржуазного национализма в белорусском литературоведении // ЛГ. 1948. 12 мая; Максім Багдановіч // Звязда. 25 мая; Пятрусь Броўка // ЛіМ. 18 студз.; Светлы вобраз Арджанікідзе жыве ў народзе // Там жа. 22 лют.; А. С. Новікаў-Прыбой: (Да 70-годдзя з дня нараджэння); Першыя крокі перабудовы // Там жа. 1 сак.; М. Багдановіч і культура славянскіх народаў // Там жа. 24 мая; Пафас працы ў творчасці Янкі Купалы // Там жа. 28 чэрв.; Поэзия патриотических чувств // Сов. Бел. 30 июля; Низами // Там жа. 21 сент.; Великая воля к жизни и победе // Сталин. молодежь. 5 мая: Поэт большого таланта: К 30-летию со дня смерти М. Богдановича // Там жа. 25 мая; «Ветер с юга» // Там жа. 31 окт.; Жизнь и творчество // Там жа. 23 нояб.

1948. Эстэтычныя погляды Максіма Багдановіча // Полымя. № 11; Творы для дзяцей // ЛіМ. 1 студз.; На шляху да высокамастацкіх твораў // Там жа. 8 мая; «Недаравальная безуважлівасць да памяці паэта»: Адказ у рэдакцыю // Там жа. 6 ліст. / Сааўт. В. Барысенка; Выдающийся белорусский детский писатель // Сов. Бел. 21 мая; Певец борьбы и труда // Сталин. молодежь. 27 июня.

1949. За правільную ацэнку спадчыны М. Багдановіча // ЛіМ. 20 жн.; А. С. Грибоедов // Сталин. молодежь. 11 февр.

1950. Аб новай паэме Аркадзя Куляшова // ЛіМ. 9 снеж.

1951. Вялікі пясняр беларускага народа // Калг. праўда. 27 чэрв.; А. М. Горький и белорусская литература // Сов. Бел. 17 июня.

1952. Эстэтычныя погляды Янкі Купалы // Мін. праўда. 5 ліп.; Пясняр дружбы народаў // Там жа. 15 ліст.

1953. Лепшы паэт нашай эпохі // Беларусь. № 7.

1954. Литература периода победы социализма и построения социалистического общества (1930—1941 гг.); Петрусь Бровка; Аркадий Кулешов // Очерк истории белорусской советской литературы. М.; Праблема тыповага ў сучаснай беларускай прозе // Полымя. № 7; Праўда жыцця і літаратурныя героі // ЛіМ. 4 снеж.; Раскрывать величие и красоту советского человека // Сталин. молодежь. 15 дек.

1955. Заўсёды з народам // Янка Купала. Мн.; Баявое слова паэта // Полымя. № 6; Маяковский и белорусская литература // Сталин. молодежь. 14 апр.

1956. Максім Багдановіч; Літаратура перыяду перамогі сацыялізма і пабудовы сацыялістычнага грамадства; Пятрусь Броўка; Аркадзь Куляшоў // Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Мн.; Думка і пачуццё // ЛіМ. 5 мая; Дапаможнік для літаратуразнаўцаў // Там жа. 23 чэрв. / Сааўт. Ю. Пшыркоў; «Наша доля» // Там жа. 15 вер.

1957. Максім Багдановіч // Багдановіч М. Творы. Мн.; Двухтомнік паэзіі П. Броўкі // Беларусь. № 9; Заметки о белорусской литературе наших дней // Дружба народов. № 1 / Сааўт. А. Адамовіч; Героика эпохи: Поэмы 20-х и начала 30-х гг. о революции и гражданской войне // Сов. Отчизна. № 3; Рамантыка рэвалюцыі // ЛіМ. 13 лют.; Наш жывы . сучаснік // Там жа. 25 мая; Пясняр сацыялістычнай явы // Там жа. 6 ліп.; Паэзія рэвалюцыйнай маладосці // Там жа. 13 ліп.; Творы аб рэвалюцыі // Там жа. 23 кастр.; Многогранный поэтический талант // Сов. Бел. 25 мая.

1958. Аб некаторых з'явах літаратурнага жыцця ў Беларусі ў 20 — пачатку 30-х гадоў // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 1; Міхась Чарот // Чарот М. Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1958. Т. 1; Народ и герой // Сов. Отчизна. № 5; Добрая ініцыятыва // ЛіМ. 2 ліп.; Асноўныя асаблівасці нашай літаратуры // Там жа. 10 вер. / Сааўт. В. Івашын; Творы Платона Галавача // Там жа. 18 кастр.; Літаратура народа // Там жа. 5 ліст.

1960. Асноўныя асаблівасці развіцця сучаснай беларускай літаратуры // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 3 / Сааўт. В. Івашын.

1961. Прыкметы часу: [Рэц. на кн.: Нікановіч М. Летнім днём. Мн., 1960] // Полымя. № 7; Першы зборнік — першыя пошукі: [Рэц. на кн.: Гроднеў М. За бацькоўскім парогам. Мн., 1960] // Там жа. № 10; Звычайнае і незвычайнае // ЛіМ. 23 чэрв.; Радасная падзея // Там жа. 11 жн.

1963. Об исторических путях белорусской литературы // Неман. № 6; Наш гуманизм — актыўны, наступальны // ЛіМ. 23 крас.

1964. Літаратура 20-х гадоў; Літаратура 30-х гадоў // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Мн. Т. 1; Ісці да самых глыбінь // ЛіМ. 25 вер.

1965. У Каменцы — танкі...: Урывак з успамінаў аб партызанскім жыцці // ЛіМ. 27 крас.

1967. Годы тридцатые // Неман. № 3; Па слядах

часу: [Рэц. на кн.: Палітыка Д. Сляды часу. Мн., 1967] // ЛіМ. 15 вер.; Мудрасць пазнання чалавека // Там жа. 10 кастр.; Октябрь в белорусской литературе // Сов. Бел. 5 окт.

1968. Народ — рэвалюцыя — эпас //ЛіМ. 6 ліст.

1970. Белорусская литература // История советской многонациональной литературы. М. Т. 1; Ленінскія прынцыпы інтэрнацыяналізму і беларуская савецкая літаратура // У. І. Ленін і літаратура. Мн.

1971. Белорусская литература // История советской многонациональной литературы: В 6 т. М. Т. 2. Кн. 1; Интернациональное и национальное в характере литературного героя и взаимодействие литератур // Научная конференция «Сравнительное изучение славянских литератур». М.; Герой белорусской советской литературы в свете проблемы национального и интернационального // Национальное и интернациональное в литературе, фольклоре и языке. Кишинев; Гэта радасць і гонар // ЛіМ. 12 сак.

1973. Штрыхі майго пакалення // Вытокі песні. Мн.; К вопросу об изучении литературного героя и взаимодействия литератур // Сравнительное изучение славянских литератур. М.; Пафас інтэрнацыяналізму // Полымя. № 3.

1974. Ад рэдактара // Жураўлёў В., Шпакоўскі І., Яскевіч А. Пытанні паэтыкі. Мн.; Адолець сілу інерцыі //ЛіМ. 22 лют.

1975. Проза 20-х г. // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Мн. Т. 12; Литература и воспитание нового человека // Коммунист Бел. № 10; Усеабдымны, жывы, сучасны // ЛіМ. 21 ліст.

1976. «І мастацтву тэорыя не вораг...» // ЛіМ. 23 студз.

1977. Введение; Литература 20-х годов; Литература 30-х годов // История белорусской советской литературы. Мн.; Ліда: Апавяданне // Беларусь. № 7; Шырыня пазнання свету: Працэс інтэрнацыяналізацыі і сучасная беларуская літаратура // Полымя. № 9; Трафейныя дакументы: Апавяданне // ЛіМ. 23 снеж.

1979. Я стал партизаном: [Аповесць] // Неман. № 5.

1980. Працэс інтэрнацыяналізацыі і сучасная беларуская літаратура // Адзінства і ўзаемаўзбагачэнне. Мн.

1.6.

Цімашкова Л. Беларуска-балгарскія літаратурныя сувязі. Мн., 1963 / Рэд.

Садружнасць літаратур. Мн., 1968 / Рэд.

Старонкі літаратурных сувязей. Мн., 1970 / Рэд. Рэц.: Białokozowicz B. Słowiańskie i litewskie związki literatury białoruskiej // Prz. Humanistyczny. 1973. Nr 5.

Адамовіч А. Маштабнасць прозы: Урокі творчасці Кузьмы Чорнага. Мн., 1972 / Рэд.

Шпакоўскі І. Структура вершаванага вобраза: Умоўная асацыятыўнасць у сучаснай савецкай паэзіі. Мн., 1972 / Рэд.

Жураўлеў В., Шпакоўскі І., Яскевіч А. Пытанні паэтыкі. Мн., 1974 / Рэд.

Мартынава Э. Мастацкая дэталь у літаратурным творы. Мн., 1977 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Аўгусцінавіч М. Наперадзе шмат працы // ЛіМ. 1962. 13 лют.; Барсток М. Вышыня // Там жа. 1972. 11 лют.; Яго ж. Тыповасць вобраза // Там жа. 1954. 21 жн.: Бугаёў Д. Здабыткі крытычнай думкі і яе зігзагі // Бугаёў Д. Чалавечнасць. Мн., 1985; Бур'ян Б. Прачытаўшы даследаванне пра паэта... // ЛіМ. 1952. 15 сак.; Яго ж. У даўгу перад чытачом // Там жа. 1954. 14 жн.; Ермаловіч М. У святле неўміручых ідэй // Полымя. 1970. № 11; З узнагародай! // ЛіМ. 1972. 18 лют.; Каваленка В. Шляхі барацьбы і пакут // Там жа. 1980. 29 жн.; Лазарук М. Разглядаючы літаратурны працэс... // Лазарук М. Часу непадуладнае. Мн., 1981; Ліпеньскі М. Даведкі з тандэтам: Нататкі // ЛіМ. 1947. 11 кастр.; Мушынскі М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 40-я — першая палавіна 60-х гадоў. Мн., 1985. С. 258—260; Мысліве ц В. Зразумець чалавека! // ЛіМ. 1974. 9 жн.; Навум Саламонавіч Перкін: [Некралог] // Там жа. 1976. 8 кастр.; «Наш каляндар» // Там жа. 1982. 5 лют.; Няхай Р. Некаторыя заўвагі аб падручніку па беларускай савецкай літаратуры // Там жа. 1949. 19 ліст.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Прывітанне юбіляру // Там жа. 1962. 13 лют.; Пшыркоў Ю. Адной дарогай: Да 60-годдзя з дня нараджэння Н. С. Перкіна // Полымя. 1972. № 2; Садоўскі Л. На старых пазіцыях // Там жа. 1947. 30 жн.; У гэтым месяцы...: // Беларусь. 1972. № 2.

На рускай мове. Адамович А. Искреннее слово // Перкин Н. Я стал партизаном. Мн., 1982.

Г. І. Рэут.

СУПРАЦОЎНІКІ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ» ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ, ЯКІЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ ГЭТАГА ТОМА

Заг. рэдакцыі — А. А. Дылейка, рэдактары першай катэгорыі — І. С. Александровіч, І. Д. Казека (да 1.2.1991), Л. А. Суднік, рэдактар другой катэгорыі — Р. Р. Блашко (да 2.3.1992).

У томе змешчаны фотаздымкі У. А. Крука, а таксама фотаздымкі з архіва БелЭн, Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны.

Даведачнае выданне

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

Біябібліяграфічны слоўнік

У 6 тамах

Том 4

Адказны за выпуск *А. А. Дылейка*
Мастацкі рэдактар *В. Г. Загародні*
Тэхнічныя рэдактары: *М. І. Грыневіч, І. І. Цыцаня, Н. М. Шэвель*
Карэктары: *В. І. Багдановіч, Г. Дз. Навіцкая, Т. Ф. Піліповіч, Т. Я. Радзевіч, Л. У. Сідарава, Л. В. Суцягіна, А. А. Федасеева*

Здадзена ў набор 28.07.92. Падпісана да друку 23.11.93. Фармат 70×100 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны. Гарнітура Тып таймс. Ум. друк. арк. 42,9. Ум. фарб.-адб. 96,2. Ул.-выд. арк. 81,12. Заказ 670. Тыраж 5600 экз.

Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 10. Рэспубліка Беларусь, 220072, Мінск, вул. Ф. Скарыны, 15а.

Мінская фабрыка каляровага друку. Рэспубліка Беларусь, 220015, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.

Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўнік. У 6 т.
Б 43 Лазарук — Перкін / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь, Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А. В. Мальдзіса; Рэдкал.: І. Э. Багдановіч і інш.— Мн.: БелЭн, 1994.— 524 с.: іл.

ISBN 5-85700-153-6.

Гэта выданне — настольны даведнік для ўсіх, хто цікавіцца і займаецца беларускай культурай. У ім змешчана больш за 1100 артыкулаў з поўнымі, усебаковымі і сістэматызаванымі звесткамі пра жыццё і дзейнасць усіх прадстаўнікоў беларускай літаратуры, якія пісалі на стараславянскай, беларускай, рускай, лацінскай, польскай і іншых мовах Беларусі. У бібліяграфіях прадстаўлена звыш 600 тысяч розных публікацый.

0160000000—016
Б ——————— 30—94
М 318(03)—94

ББК 91.9:83.3 Бел

Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя»
рыхтуе да друку 6-томную

ЭНЦЫКЛАПЕДЫЮ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Першая на Беларусі гістарычная энцыклапедыя найбольш поўна, на ўзроўні дасягненняў сучаснай навукі адлюстроўвае шматвяковы шлях беларускага народа ад сівой даўніны да нашых дзён у непарыўнай сувязі з гістарычным працэсам народаў іншых краін. Яна асвятляе ўсе значныя і важныя падзеі, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі. Апрача палітычных, грамадскіх, ваенных з'яў і падзей, на яе старонках змяшчаюцца матэрыялы пра адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, стан эканомікі, культуры, навукі і тэхнікі на розных этапах гісторыі. Шырока і па магчымасці поўна падаецца гісторыка-археалагічная, этнаграфічная, лепшая архітэктурная і літаратурна-мастацкая спадчына Беларусі. Важнае месца ў выданні займаюць геральдыка, нумізматыка, сфрагістыка, генеалогія, гістарычная картаграфія і іншыя прыкладныя гістарычныя дысцыпліны. Каля 5 тысяч біяграфічных артыкулаў будуць змяшчаць звесткі пра гістарычных асоб і іх радавод.

Шмат артыкулаў прысвячаецца ваеннай гісторыі і палкаводцам нашага народа, шматлікім войнам і бітвам эпохі сярэднявечча і навейшых часоў супраць розных заваёўнікаў, што спакушаліся на беларускую зямлю, а таксама гісторыі ваеннай тэхнікі і зброі.

На старонках энцыклапедыі асветлены нацыянальна-вызваленчая барацьба беларускага народа, падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, складаныя працэсы, сацыялістычнага пераўтварэння ў 1930—50-я гады. Будуць названы многія імёны ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

Будзе паказана і гісторыя народаў, якія здавён жывуць на Беларусі,— палякаў, літоўцаў, рускіх, украінцаў, яўрэяў, татараў і іншых, іх уклад у агуль-

ную скарбонку беларускай і еўрапейскай культур. Упершыню шырока асвятляецца культурна-гістарычнае жыццё беларускай эміграцыі розных часоў.

У шматтомнай ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ мяркуецца змясціць больш за 15 тысяч артыкулаў. У падрыхтоўцы гэтага выдання ўдзельнічаюць вядучыя вучоныя краіны. Выданне багата ілюстравана каляровымі і чорна-белымі здымкамі, у ім будзе змешчана вялікая колькасць карт і схем.

Першы том ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ выйшаў у свет у 1994 г.

Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» рыхтуе аднатомную энцыклапедыю «БЕЛАРУСЬ». Яе аб'ём 120 улікова-выдавецкіх аркушаў. У выданні плануецца змясціць больш за 5 тысяч артыкулаў, у тым ліку больш за тысячу біяграфічных. Кніга будзе ілюстравана каляровымі і чорна-белымі здымкамі, картамі.

Энцыклапедыя «БЕЛАРУСЬ» — гэта ўсебаковы, дакладны даведнік пра гісторыю, эканоміку, культуру, літаратуру, мастацтва, навуку, адукацыю і іншыя бакі жыцця сучаснай незалежнай Беларусі.